

І. А. Глухаў

ПРАВАСЛАЎНЫ КАТЭХІЗІС



І. А. Глухаў

ПРАВАСЛАЎНЫ КАТЭХІЗІС

Санкт-Пецярбург
Таварыства памяці ігуменні Таісіі
2013

УДК 271.2
ББК 86.372-42,088.1 =411.3
Г55

Пераклад з рускай мовы: Ждановіч Валерыя Валянцінаўна
Рэцэнзент: Дубянецкая Ірына Міхайлаўна, доктар філасофіі, доктар сакральнай тэалогіі.

Глухаў, Іван Аляксандравіч

Г55 **Праваслаўны катэхізіс / І. А. Глухаў ;** [Пераклад з рускай мовы: Ждановіч Валерыя Валянцінаўна]. – СПб : Таварыства памяці ігуменні Таісіі, 2013. – 520 с.

ISBN 978-5-91041-063-7

«Праваслаўны катэхізіс», які прапаноўваецца ўвазе сучаснага чытача, уяўляе сабой разгорнуты дапаможнік для спасціжэння праваслаўнага веравызнання і настаўляе ў вучэнні пра веру, надзею і любоў. Вучэнне аб хрысціянскай веры коратка выкладзенае ў Сімвале веры. У ім, як у фокусе, засяроджваюцца ўсе асноўныя праўды хрысціянства. Вучэнне аб хрысціянскай надзеі змяшчаецца ў малітвах, у прыватнасці, у малітве Гасподняй «Ойча наш», і ў Запаведзях найвышэйшага шчасця. Вучэнне аб хрысціянскай любові выкладаецца ў Законе Божым, або Дзесяцціслове.

Аснову гэтага «Катэхізіса» склаў канспект лекцый іераманаха Аляксандра (Фаут), прачытаных у Маскоўскай Духоўнай семінарыі дацэнтам Іванам Аляксандравічам Глухавым.

Усім, хто жадае далучыцца да праўд Праваслаўя, для слухачоў семінарыяў, духоўных вучылішчаў і ўсіх праваслаўных хрысціян.

На вокладцы – карціна Ф. Я. Аляксеева «Тройца-Сергіева лаўра. XVII ст.»

УДК 271.2
ISBN 978-5-91041-063-7 ББК 86.372-42,088.1 =411.3

© Таварыства памяці ігуменні Таісіі, 2013

ЗМЕСТ

Прадмова перакладчыка 25

АБ АЎТАРЫ 33

ПРАДМОВА 37

I. УВОДЗІНЫ

1. Склад прадмету Катэхізіса 43

2. Сутнасць рэлігійнага светапогляду 44

Рэлігія як повязь паміж пабожнасцю чалавека і Богам. Рух Бога да чалавека і чалавека да Бога.

3. Спрадвечнасць рэлігіі 46

Пра ўзаемную любоў Бога і чалавека ад моманту стварэння. Цесная лучнасць чалавека з Богам на розных этапах чалавечай гісторыі.

4. Паўсюднасць рэлігіі 48

Рэлігійнасць як глыбінная здольнасць душы, закладзеная ў чалавечай прыродзе. Старажытныя мысліцелі, а таксама сучасныя даследчыкі пра паўсюднасць рэлігіі.

5. Рэлігія Старога Запавету 49

Надзея на паяднанне чалавека з Богам ў Першаевангеллі. Непаўната ісціны ў рэлігіі Старога Запавету.

II. ВЕЛІЧ ЧАЛАВЕКА

1. Хрысціянскае вучэнне аб чалавеку як носьбіце вобразу Божага ў духу сваім 52

Дасканаласць розуму першаснага чалавека. Чысціня сэрца першаснага чалавека. Свабода волі першаснага чалавека.

2. Праявы свавольства з боку першаснага чалавека і яго адмова ад Божага кіраўніцтва 54

Парушэнне гармоніі паміж Богам і чалавекам праз свавольства самога чалавека. Грэхападзене, яго цяжар.

3. Наступствы грэхападзення 56

Сутнасць грэхападзення — адмова паслушэнства. Вынікі: духоўная смерць; азмрочанасць духоўных сіл; змены матэрыяльнага свету; цялесная смерць.

III. УЗНІКНЕННЕ ІЛЖЫВЫХ ВУЧЭННЯЎ ПРА БОГА І ЗАХАВАННЕ САПРАЎДНАЕ ВЕРЫ Ў ЯГО Ў ПАТРЫЯРХАЛЬНЫ ПЕРЫЯД

1. Ілжывыя вучэнні пра Бога. 59

Язычніцкія рэлігіі: сабеізм, антрапатэізм, заатэізм, фетышызм. Геаграфічныя мясціны, дзе распаўсюджваліся натуральныя рэлігіі.

2. Захавальнікі сапраўднай рэлігіі — патрыярхі 61

Захаванне веры і пабожнасці. Чаканне Месіі і абяцанні аб ім.

IV. МАРАЛЬНА-РЭЛІГІЙНЫ СТАН ЯЗЫЧНІЦКАГА СВЕТУ ПЕРАД ПРЫЙСЦЕМ НА СВЕТ ХРЫСТА

1. Усведамленне згубнасці свайго грэшнага стану і неабходнасці збаўлення 63

Надзвычайны маральны заняпад ў грамадстве. Прага адкуплення і збавення.

2. Чаканне збавення сярод праведнікаў Старога Запавету. 65

Прадбачанне прыходу Хрыста, месца і часу Яго Нараджэння, прыйсця Яго Папярэдніка — як развіццё першага прароцтва Першаевангелля. Жаль іўдзеяў, пераважна, з прычыны сацыяльнай няволі.

3. Чаканне збавення сярод іншых народаў. . 66

Чаканне збавення на Усходзе і на Захадзе. Паходжанне ерасяў і іх разнастайнасць.

4. Скажоныя паняцці аб Збаўцы сярод іудзеяў. 70

Іудаізм, як адзін з чатырох правобразаў ерасяў. Віды ерасяў у іудаізме.

V. ХРЫСЦІЯНСКАЯ РЭЛІГІЯ

1. Сутнасць хрысціянства 71

Сувязь хрысціянства з язычніцтвам і рэлігіяй Старога Запавету. Здзяйсненне ў хрысціянстве таго, што шукала язычніцтва і на што пакладала надзею іудзейства.

2. Неабходнасць і падстава рэлігійных ведаў у хрысціянстве:

а) паняцце аб Аб'яўленні [Адкрыцці] 74

Божае Аб'яўленне як крыніца багаслоўя і праваслаўнай веры. Прадвеснікі Аб'яўлення. Два шляхі спазнання Бога праз Аб'яўленне.

б) натуральнае Аб'яўленне 77

Сведчанні прыроды аб быцці Божым. Сумленне як натуральны маральны закон. Недастатковасць натуральнага Аб'яўлення.

в) звышнатуральнае Аб'яўленне 80

Неабходнасць звышнатуральнага Аб'яўлення. Два спосабы распаўсюджвання і захавання Божага Аб'яўлення ў сапраўднай Царкве: Святое Паданне і Святое Пісанне.

г) Святое Паданне — найстаражытнейшы спосаб перадачы праўд Аб'яўлення 83

Прычыны захавання Падання ў тым выглядзе, у якім Бог адкрываў праўду. Неабходнасць захавання Святога Падання.

VI. ПРЫКМЕТЫ БОГАНАТХНЁНАСЦІ БІБЛІІ, АБО СВЯТОГА ПІСАННЯ

1. Сведчанні з самога Святога Пісання. 85

Сведчанні пракокаў. Ісус Хрыстос як прадмет Святога Пісання. Сведчанні Апосталаў.

2. Меркаванні чалавечага розуму: 87

а) вышыня выкладзенага ў Бібліі вучэння 88

Перавага над лепшымі творамі чалавечага розуму. Адзінства апавядання на ўсім працягу Святога Пісання.

б) чысціня сапраўднага Слова Божага . . . 89

Мэта Слова Божага — падрыхтоўка чалавека да Неба і вечнасці. Маральныя падставы ў Слове Божым.

в) прароцтвы — прыкмета сапраўднасці Слова Божага. 91

Прадказанні на падставе чалавечых меркаванняў, якія грунтуюцца на веданні законаў прыроды і грамадства. Прароцтвы як прадбачанне падзей, што адбываюцца паводле волі Божай.

г) цуды 92

Адносіны рацыяналістаў да цудаў. Цуд як Божы знак, які часова перамагае законы прыроды.

д) магутнае ўздзеянне Слова Божага на сэрцы чалавечыя 86

Працягласць уплыву на чалавецтва. Жыццяздольнасць Святога Пісання.

3. Як чытаць Святое Пісанне 98

Мэта чытання Святога Пісання. Шляхі да яго разумення.

VII. ХРЫСІЯНСКАЕ ВУЧЭННЕ ПРА ЧАЛАВЕКА. ЗМЕСТ ХРЫСЦІЯНСКАГА ЖЫЦЦЯ

1. Мэта чалавечага быцця 99

Пошукі чалавекам шчасця ў часовым жыцці. Сапраўднае шчасце ў маральнай дасканаласці і сэнс быцця ў прыпадабненні да Бога. Апраўданасць часовага жыцця праз вечнае быццё.

2. Паняцце аб граху 104

Грэх як прычына страты сэнсу жыцця. Парушэнне суразмоўя з Богам і гармоніі быцця.

3. Паняцце аб збавенні........................ 105

Збавенне як ачышчэнне ад граху і маральнае адраджэнне чалавека. Немагчымасць збавення без Царквы.

VIII. ПРА ВЕРУ

Агульна пра сімвал веры 106

Гісторыя ўзнікнення Сімвалу веры. Імкненне пераадолець супярэчнасці ў Першаснай Царкве. Сімвал веры (тэкст) 108

1-ая частка Сімвалу веры. Пра Бога — Творцу свету

1. Вера і пабожнасць......................... 110

Вера як прыроджанае пачуццё. Вера як галоўная крыніца пазнання. Хрысціянская вера, якая здавальняе ўсе патрэбы чалавечага духу.

2. Адзінабожжа 112

Існаванне адзінага Бога. Яго імёны і ўласцівасці.

3. Траістасць Божых Асоб 114

Панаванне Траістага дагмату ў хрысціянскім веравучэнні. Прыхаваныя ўказанні на траістасць Іпатасяў Адзінага Бога ў Старым Запавеце. Відавочная траістасць Божых Асоб у Новым Запавеце.

4. Недасяжнасць Бога для розуму 116

Веліч і недасяжнасць Бога. Яго нябачнасць і святасць. Зыходжанне Ласкі праз Таінствы.

5. Духоўная сутнасць Бога 118

Бог як Дух. Умоўны антрапамарфізм ў апісанні ўласцівасцяў Бога. Духоўная мэта жыцця чалавека.

6. Усёведанне Божае 119

Самасвядомасць Бога. Яго веды пра свет рэчыўны і маральны. Боскае прадбачанне.

7. Праўда Божая. 121

Два віды адзінай праўды. Жыццё праведнікаў і грэшнікаў са знешняга і ўнутранага боку.

8. Усёмагутнасць Божая 122

Выяўленне ўсёмагутнасці Божай праз стварэнне свету і клопат пра чалавека. Маральная прырода ўсёмагутнасці Божай.

9. Усюдыіснасць Божая 123

Асаблівая прысутнасць Божая на Небе і ў храме. Прасторавая неабсяжнасць Бога.

10. Нязменнасць Божая 124

Зменлівасць створанага свету. Адсутнасць змен у Богу як вынік Яго самабытнасці. «Вонкавая зменлівасць».

11. Самадастатковасць і найвышэйшае шчасце Божыя 125

Бог як крыніца ўсіх даброт. Перажыванне чалавекам дабра падчас руху да Бога.

12. Вучэнне пра Бога — Творцу і Усеўладнага Гаспадара 127

Стварэнне Нябеснага і зямнога свету. Чалавек — вяршыня стварэння. Чалавек як вобраз і падабенства Божае ва ўласным жыцці.

13. Стварэнне нябачнага свету 130

Анёлы — бесцялесныя духі-пасланцы. Час стварэння анёльскага свету. Сведчанні быцця свету Анёлаў.

14. Узнікненне зла 134

Зло як вынік адпадзення Анёлаў ад Боскага пачатку і праява пыхі. Д'ябал ды іншыя Анёлы ўпадку. Іх уздзеянне з Божага патурання.

15. Стварэнне бачнага свету 137

Стварэнне першарэчыва з нічога. Шэсць дзён стварэння. Асаблівасці часу стварэння.

16. Аб Накананаванні Божым. 140

Накананаванне і яго выкананне. Дзеянне Задумы Божае.

2-гая частка Сімвалу веры. Пра Ісуса Хрыста, Сына Божага

1. Боскія імёны другой Асобы Святой Тройцы 143

Сын Божы — Сын Бога Айца паводле існасці. Ісус — «Збаўца». Хрыстос — «Памазанік».

2. Уласцівасці Сына Божага 145

Адзінародства Хрыста. Яго ўласцівасць быць народжаным, але існаваць вечна. Непадзельнасць Святла ад Святла іншых Асоб Святой Тройцы. Хрыстос — існы Бог.

3-я частка Сімвалу веры. Пра Уцялесненне

1. Збаўленне чалавецтва ад граху 148

Разбуральнае ўздзеянне граху на прыроду чалавека. Неабходнасць прымірэння чалавека з Богам.

2. Пра спалучэнне ў Хрысце дзвюх існасцяў 150

Значэнне ўцялеснення і ўвасаблення Хрыста ў чалавека. Дзве існасці адной Іпастасі.

3. Найсвяцейшая Багародзіца Дзева Марыя 153

Дзева Марыя да Раства Хрыстовага. Дзева пасля Раства і Багародзіца.

4. Раства Ісуса Хрыста. 155

Радасць з прыходу на свет Хрыста. Прыкметы, па якіх можна было даведацца, што нарадзіўся Сын Божы.

5. Служэнне Хрыста як Першасвятара 158
Здзяйсненні Хрыста ў зямным жыцці. Значэнне жыцця Хрыста для сучаснага чалавека.

6. Прароцтвы Старога Запавету аб прыйсці Збаўцы 159
Значэнне перыяду Старога Запавету. Прыкметы прыходу Збаўцы.

7. Прароцтва Данііла аб прыйсці Збаўцы . . 161
Прароцтвы, звязаныя з прыходам Хрыста. Злічэнне Даніілавых сядмін.

8. Здзяйсненне Даніілавага прароцтва 166
Прыход Хрыста ў адпаведнасці з прадказаннямі. Выкананне прароцтва аб лёсах народу Ізраілевага.

4-ая частка Сімвалу веры. Аб Пакуце і смерці

1. Асуджэнне і ўкрыжаванне Ісуса Хрыста. 167
Выданне Збаўцы на смерць замест пакланення. Зямное жыццё Хрыста як факт чалавечай гісторыі.

2. Пакуты і смерць Хрыста 170
Рэальнасць Пакут і смерці Хрыста. Значэнне Крыжовае смерці Хрыста для чалавецтва.

3. Знішчэнне смерці смерцю Хрыста на Крыжы 173
Разбурэнне перашкоды паміж чалавекам і Богам. Знішчэнне духоўнай смерці, боязі смерці і смерці як такой.

4. Удзел чалавека ў Пакуце і смерці Хрыста 174

Неабходнасць прыпадабніцца ў сваім жыцці да Хрыста. Якім чынам можна чалавеку прыняць удзел у Пакуце і смерці Хырста.

5. Значэнне жыцця не паводле цела, а паводле духу 178

Закон Старога Запавету як пярэдадзень хрысціянства. Што значыць рабіць ўчынкі паводле духу.

5-ая частка Сімвалу веры. Пра Уваскрасенне

1. Цуд і моц Уваскрасення Хрыстовага. . . . 182

Значэнне Уваскрасення Хрыстовага. Стан Хрыста ад смерці да Уваскрасення.

2. Сведчанні Святога Пісання аб Уваскрасенні Хрыста 186

Стары і Новы Запавет пра Уваскрасенне. Як людзі даведаліся аб тым, што Хрыстос Уваскрос.

6-ая частка Сімвалу веры. Пра Узнясенне 190

Прадказанні Узнясення Хрыста ў Старым Запавеце. Сведчанні Новага Запавету пра Узнясенне.

7-ая частка Сімвалу веры. Пра Другое Прыйсце

1. Вызначальныя рысы Другога Прыйсця Хрыста 193

Прыйсце ў Славе. Суд Гасподні. Адрозненне ад чалавечага судаводства. Адплата за справы і словы.

2. Час і прыкметы Другога Прыйсця 197

Неакрэсленасць часу Прыйсця. Прыкметы Прыйсця.

3. Вучэнне пра антыхрыста 199

Віды барацьбы д’ябла з Госпадам. Прыход антыхрыста ў апошнія часы.

4. Тры віды Царстваў. 201

Царства, пра якое абвяшчаецца ў Сімвале веры. Яго бясконцасць.

8-ая частка Сімвалу веры. Пра Святую Тройцу

1. Боская існасць Святога Духа. 202

Святы Дух — сапраўдны Бог. Вучэнне аб паходжанні Святога Духа ад Бога Айца.

2. Уласцівасці Святога Духа 204

Усёведанне. Усюдыіснасць. Жыццядайнасць. Зыходжанне ад Айца. Усёмагутнасць. Роўнае пакланенне ўсім Асобам Святой Тройцы.

3. Дзеянне Святога Духа праз прарокаў і Апосталаў 208

Напоўненасць прарокаў Святым Духам. Дзеянне святога Духа праз Апосталаў.

4. Сродкі набыцця Святога Духа і Яго дабратворныя дары чалавеку 210

Сродкі набыцця чалавекам Святога Духа. Яго дабратворныя дары.

9-ая частка Сімвалу веры. Пра Царкву

1. Царква зямная і Нябесная і вера ў яе . . 215

Дзеянне ў Царкве Святога Духа. Царква як прадмет веры.

2. Знаходжанне ў Царкве Божае Ласкі. 217

Вечнасць у Царкве Божае Ласкі. Галава Царквы Ісус Хрыстос.

3. Адзінства Царквы. 219

Боская падстава адзінства Царквы. Абавязкі хрысціян, якія вынікаюць з адзінства Царквы. Памесныя Цэрквы ў адзінай Сусветнай Царкве.

4. Адзінства Царквы Хрыстовай, Нябеснай і зямной:

а) адзінства зямной і Нябеснай Царквы праз малітву. 221

Малітоўнае заклікание Святых. Дапамога святых праз малітву.

б) падставы да заклікання святых у малітве. 225

Сведчанні Старога Запавету. Сведчанні Новага Запавету.

в) дабратворнае аб'яўленне святых і тварэнне цудаў. 227

Дабратворнае аб'яўленне святых. Тварэнне цудаў праз астанкі святых і прадметы-пасярэднікі.

5. Святасць Царквы 230

Падставы святасці Царквы. Як суадносяцца святасць Царквы і грэшнасць яе членаў.

6. Саборнасць Царквы 232

Неабмежаванасць Царквы месцам і часам. Паўната праўды ў Саборнай Царкве.

7. Апостальская Царква 236

Пераемнасць ад Апосталаў вучэння і дароў Святога Духа. Абавязкі хрысціян. Царкоўная іерархія і яе ўстанаўленне Богам.

10-ая частка Сімвалу веры. Пра Хрышчэнне. Вучэнне пра Таінствы Царквы

Таінствы як свяшчэннадзеянні, праз якія праліваецца Ласка Божая 240

Вызначальныя рысы Таінстваў. Сем відаў Таінстваў.

1. Хрышчэнне [Хрост]:

а) паняцце аб Таінстве Хрышчэння 242

Значэнне Таінства Хрышчэння. Боскае ўстанаўленне Таінства Хрышчэння.

б) бачны і нябачны бакі Хрышчэння . . . 244

Бачны бок Хрышчэння. Нябачны бок Хрышчэння.

в) Хрышчэнне немаўлят 247

Збаўленне дзяцей паводле веры бацькоў. Хрышчэнне як нерукатворнае абразанне ад грахоў цела ў Ісуса Хрыста.

г) якім чынам выконваецца Хрышчэнне 249
Сіла Хрышчэння. Учыненне граху пасля Хрышчэння.

2. Мірапамазанне 251
Паняцце аб Таінстве Мірапамазання. Яго Боскае ўстанаўленне.

3. Еўхарыстыя

а) Боскае ўстанаўленне Таінства Еўхарыстыі. 255
Паняцце Еўхарыстыі. Абяцанні Госпада наконт Таінства. Устанаўленне Таінства.

б) здзяйсненне Таінства Еўхарыстыі падчас набажэнства 258
Бачны бок выканання Таінства. Яго нябачны бок.

в) Еўхарыстыя — як Ахвяра, і яе адносіны да Галгофскае Ахвяры 264
Вялікая таямніца Еўхарытыі. Тоеснасць Еўхарыстычнай і Галгофскай Ахвяр. Іх адрозненні.

г) плады Таінства Еўхарыстыі 266
Яднанне з Богам. Яднанне хрысціян паміж сабою.

4. Таінства Пакаяння 268
Пакаянне як Таінства і яго ўстанаўленне. Умовы, якія павінен выканаць каяльнік. Знешні бок Таінства.

5. Святарства 272
Устанаўленне Таінства Святарства Богам. Правы і абвязкі святарства.

6. Шлюб 276

Устанаўленне Таінства Богам. Бачны і нябачны бок Таінства. Адносіны Царквы да бясшлюбнасці.

7. Алееасвячэнне 280

Устанаўленне Богам Таінства Алееасвячэння. Знешні і ўнутрны бок Таінства. Адрозненні Алееасвячэння ад Пакаяння.

11-ая частка Сімвалу веры. Пра будучае ўваскрасенне 282

Слова Божае пра магчымасць уваскрасення. Перамяненне свету. Стан душы памерлых да ўсеагульнага ўваскрасення.

12-ая частка Сімвалу веры. Пра жыццё вечнае 289

Шчасце праведнікаў. Пакуты грэшнікаў і іх прычыны. Значэне памяці аб смерці і ўваскрасенні.

IX. АБ НАДЗЕІ

Аб хрысціянскай надзеі 292

Падстава хрысціянскай надзеі. Сродкі ўмацавання ў ёй.

Пра малітву. 294

Малітва як узнясенне розуму і сэрца да Бога. Унутраная і знешняя малітва. Тры віды малітвасловаў.

Малітва Гасподняя 296

Малітва, дадзеная Госпадам. Прашэнні дароў духоўных. Малітва «Ойча наш» (тэкст). 297

Зварот: ***Ойча наш, Які ёсць у Нябёсах!***

Іменаванне Бога Айцом паводле ласкі, дзякуючы Яго Сыну паводле існасці. Любоў да ўсіх людзей і малітва за іх. Адлучэнне ад усяго зямнога і накіраванасць да Нябеснага.

1-ае прашэнне: ***Хай свяціцца імя Тваё*** . . . 300

Святасць Божага імя. Яго ўслаўленне праз цнатлівае жыццё чалавека.

2-ое прашэнне: ***Хай прыйдзе Царства Тваё*** . . . 301

Значэнне Пакаяння і ачышчэння сэрца. Царства Божае як Царства духоўных даброт.

3-яе прашэнне: ***Хай будзе воля Твая, як на Небе, так і на зямлі.*** . . . 304

Дабрыня волі Божае і грэшнасць волі чалавечае. Крыніцы чалавечага свавольства.

4-ае прашэнне: ***Хлеб наш надзённы дай нам сёння*** . . . 307

Просьба пра неабходнае для нашай цялеснай прыроды. Хлеб для цела і хлеб для душы.

5-ае прашэнне: ***І даруй нам даўгі нашыя, як і мы даруем вінным перад намі.*** . . . 309

Даўгі як здзейсненыя грахі. Неабходнасць прымірэння з бліжнім дзеля даравання іх Богам.

6-ае прашэнне: ***І не дай нас у спакусу*** . . . 312

Значэнне жыццёвых выпрабаванняў для чалавека. Просьба да Бога аб дапамозе.

7-ае прашэнне: ***Але збаў нас ад ліха*** 313

Просьба выбавіць ад зла. Спадзяванне на ўсёмагутнасць Божую.

Услаўленне 314

Абяцанне Госпада выконваць нашы просьбы. Мэта ўслаўлення.

Пра Навуку найвышэйшага шчасця 314

Неабходнасць подзвігу дзеля здзяйснення надзеі. Навука Госпада пра найвышэйшае шчасце. Запаведзі найвышэйшага шчасця (тэкст) 317

1-ая запаведзь найвышэйшага шчасця: ***Шчаслівыя ўбогія духам: бо іх ёсць Царства Нябеснае*** 317

Значэнне пакоры для маральнага ўзыходжання. Прыклад пакоры, пададзены Хрыстом. Духоўнае ўбоства ў суадносінах з матэрыяльным багаццем.

2-ая запаведзь найвышэйшага шчасця: ***Шчаслівыя тыя, хто плача: бо яны суцешацца*** 320

Шчаслівы плач і ўзнагарода тым, хто плача. Адрозненне ад плачу па свецкіх дабротах.

3-я запаведзь найвышэйшага шчасця: ***Шчаслівыя рахманыя: бо яны атрымаюць у спадчыну зямлю*** 322

Уздзеянне лагоды. Прыклады рахманасці.

4-ая запаведзь найвышэйшага шчасця:
Шчаслівыя тыя, хто прагне праўды і смягне па ёй: бо яны спатоляцца 324

Вечнае імкненне чалавека да праўды. Непадманнасць праўды ў Новым Запавеце.

5-ая запаведзь найвышэйшага шчасця:
Шчаслівыя літасцівыя: бо яны памілаваныя будуць 327

Дапамога бліжняму праз выяўленне літасці. Цялесныя і духоўныя справы літасці.

6-ая запаведзь найвышэйшага шчасця:
Шчаслівыя чыстыя сэрцам: бо яны пабачаць Бога 329

Падабенства і адрозненне паміж чысцінёй сэрца і шчырасцю. Бачанне Бога як узнагарода за чысціню сэрца.

7-ая запаведзь найвышэйшага шчасця:
Шчаслівыя міратворцы: бо яны будуць звацца сынамі Божымі. 332

Значэнне міру і міратворства. Веліч узнагароды за яго.

8-ая запаведзь найвышэйшага шчасця:
Шчаслівыя выгнаныя за праўду: бо іх ёсць Царства Нябеснае 334

Пераслед праведных. Гатоўнасць сэрца, поўнага любові, да ахвяры.

9-ая запаведзь найвышэйшага шчасця: ***Шчаслівыя вы, калі абняславяць вас і будуць гнаць, і нагавораць пра вас усялякага благоцця праз Мяне: Радуйцеся і весяліцеся, бо вялікая ўзнагарода ваша на Небе 337***

Пакутніцкі подзвіг. Веліч узнагароды за яго.

X. ПРА ЛЮБОЎ

Повязь веры і любові 339

Любоў як галоўная цнота. Неабходнасць яднання веры і любові для здзяйснення добрых спраў. Унутраны Закон Божы для адрознення дабра і зла. Неабходнасць для чалавека знешняга Закону.

Запаведзі Закону Божага 344

Падзел запаведзяў на дзве скрыжалі. Абавязкі ў адносінах да Бога і бліжняга. Запаведзі Закону Божага (тэкст) 347

1-ая запаведзь Закону Божага: ***Я — Госпад Бог твой: няхай не будзе ў цябе іншых багоў, апрача Мяне 348***

Наказ пазнаваць Бога. Унутраная і знешняя пабожнасць. Грахі супраць першай запаведзі Закону Божага. Вучэнне пра самаадрачэнне.

2-ая запаведзь Закону Божага: ***Не рабі сабе куміра, ані чагось падобнага да таго, што на небе ўгары, што на зямлі ўнізе, і што ў вадзе ніжэй за зямлю: не пакланяйся ім і не служы ім. 354***

Грэх ідалапаклонства і яго сучасныя варыяцыі. Праવамернасць пакланення праваслаўным іконам і святым прадметам. Супрацьлеглыя граху цноты.

3-я запаведзь Закону Божага:
Не кажы імені Госпада Бога твайго марна **358**

Грахі супраць запаведзі. Магчымасць прысягі ў грамадскіх справах.

4-ая запаведзь Закону Божага: ***Шануй дзень суботні, яго святкуй: шэсць дзён працуй і парабі ўсе справы свае: а сёмы дзень — субота [належыцца] Госпаду Богу Твайму.*** **361**

Падставы для ўшаноўвання сёмага дня. Субота ў Старым Запавеце і нядзеля ў хрысціянстве. Найважнейшыя хрысціянскія святы. Пасты і іх прызначэнне.

5-ая запаведзь Закону Божага: ***Шануй бацьку свайго і маці сваю, каб добра табе было і каб доўга жыў на зямлі*** **. 369**

Шанаванне бацькоў і тых, хто іх замяняе. Абавязкі бацькоў у адносінах да дзяцей, пастыраў — да паствы. Значэнне запаведзі паслушэнства.

6-ая запаведзь Закону Божага:
Не забівай **. 374**

Цяжар граху забойства. Яго віды. Наказаныя цноты.

7-ая запаведзь Закону Божага:
Не пралюбадзейнічай **. 377**

Скажэння святога пачуцця любові. Загубнасць распусты.

8-ая запаведзь Закону Божага:
Не крадзі* *381

Забарона на прысваенне ўласнасці бліжняга. Віды крадзяжу. Цноты, супрацьлеглыя грахам.

9-ая запаведзь Закону Божага:
Не сведчы ілжыва супраць бліжняга свайго. 385

Недапушчальнасць крывадушнага сведчання супраць бліжняга. Недапушчальнасць асуджэння.

10-ая запаведзь Закону Божага: ***Не пажадай сабе жонкі бліжняга свайго, не пажадай дому бліжняга свайго, ані поля яго, ані нявольніка яго, ані нявольніцы, ані вала яго, ані асла, аніякае жывёлы яго, анічога, што належыць бліжняму твайму. 388***

Значэнне думак для чалавека. Стадыі развіцця жарсці. Зайздрасць — грэх супраць 10-ай запаведзі.

ВЫСНОВЫ 395

ЛІТАРАТУРА 398

ДАДАТАК. ***Урыўкі са Святога Пісання дзеля запамінання 406***

Прадмова перакладчыка

Я належу да пакалення людзей, для якіх шлях да хрысціянскае навукі пачынаўся зусім не з хрэсьбінаў ў маленстве і не з урокаў Катэхізісу ў школе. Упершыню імя Хрыстос я пачула ад бацькоў у 7 гадоў, калі з экспедыцыі па заходнебеларускіх вёсках тата прывёз знойдзеныя ў закінутых і апаганеных вясковых святынях распяцці. Ён павесіў іх на сцяне і растлумачыў, што гэты Чалавек — Сын Божы, і быў забіты страшным, нялюдскім чынам на Крыжы, і вось у яго рукі і ногі прабітыя цвікамі, і з іх цячэ кроў, а яшчэ з-пад рабрыны. І што распяцці гэтыя дужа старыя — аднаму 350 гадоў, другому 200, трэцяму 100. Я доўга глядзела на іх на сцяне — кожны дзень, адрабляючы ўрокі, зазірала ў спакутаваны твар і прыбітыя да Крыжа рукі і ногі. Мне было вельмі шкада Хрыста. Але тата папярэдзіў, што гаварыць пра Яго з сябрамі ў школе не варта — будуць непрыемнасці.

Жылі мы тады на першым паверсе, і аднойчы мяне запытала жанчына: «Дзетачка, у вас там, можа, малельны дом?». Але ні малітвам, ні веры ніхто мяне не вучыў — не было такой традыцыі ў нашай сям'і. Адносіны з Царквой падтрымлівала толькі мая бабуля. Яе звалі Любоў. У яе было дзве старэйшыя сястры — Вера і Надзея, ды брат Мікалай. Але бачыліся мы зрэдку, і аб тым, што робіць бабуля ў царкве, я магла меркаваць толькі па свянцоных яйках ды кулічах на Вялікдзень. Аднойчы бабулі стала так блага, што давялося паклікаць Хуткую. Прысуд дактароў быў суровы. Бабуля прыняла яго спакойна: "Пара збірац-

ца дамоў". Дамавінаю беларусы называюць труну, а паўднёвыя славяне радзіму. Але пра гэта я даведалася значна пазней, а тады яе фраза мяне моцна здзівіла.

Тата мой быў фатограф. Разам з ім мы праехалі ўсю Беларусь. У яго была ідэя, як на той час — даволі смелая: выдаць фотаальбом пра беларускія святыні. План рэдакцыя зацвердзіла, але грошаў ніхто не даваў, так што рабіў ён гэта ў адпачынку, на ўласны кошт. У таты была тапаграфічная карта 1939 года — яе склалі перад славутым Вераснёўскім паходам Чырвонай Арміі. Крыжамі на карце былі пазначаныя вёскі, дзе былі цэрквы або касцёлы. І вось, едучы гэтым «крыжовым шляхам», мы пабывалі ў такіх мясцінах, куды не трапляла кола аўтамабіліста.

Вёска Рубель на рацэ Гарыні таксама была пазначаная крыжам. Дабірацца да яе трэба было праз такія яміны, што наш «Запарожац» хаваўся ў іх з верхам. А потым давялося самім перацягваць сябе на ручным пароме цераз Гарынь. На цэнтральнай вуліцы Савецкай (а як жа!) у лужыне па самы дах патанаў трактар, на ім грэлася дзябёлая свіння. Мы прайшлі па вузкай сцежцы, што тулілася да плоту, завярнулі за рог і … нечакана аслупянелі: перад намі выплыла з духмяных ліпавых прысадаў драўляная царква XVIII стагоддзя, велічная і ўрачыстая, як блакітная брыганціна. І нічога прыгажэйшага, больш велічнага і праўдзівага ніводная ўлада ў вёсцы Рубель не збудавала і не пакінула. Вось тут, аказваецца, і жыла вера.

Нас сустрэў царкоўны стараста, паказаў царкву, дазволіў пaздымаць. Але колькі яшчэ было ў нас на шляху вёсак, дзе людзі, пастаўшы вакол нашага «Запарожца», з надзеяй прасілі: «Вы, можа, маеце там такую магчымасць — прышліце нам бацюшку!». Дарма

казаць, што такой магчымасці ў таты не было. Але, ад'язджаючы, ён ківаў расчуленым кабетам і казаў, што пастараецца — сорамна было адбіраць у іх надзею.

Ва ўніверсітэце навуковы атэізм нам выкладалі сціс-ла па Катэхізісе. Канешне, адмаўляючы і абвяргаючы, з часціцай «не» і «нібыта», але са старанным тлумачэннем старажытнаяўрэйскіх імёнаў і грэцкіх слоў, і каб здаць залік, студэнт мусіў вывучыць імёны Евангелістаў і Апосталаў, сэнс Таінстваў і Запаведзяў. Менавіта ад выкладчыка атэізму я ўпершыню пачула пра Боганатхнёнасць Бібліі і Еўхарыстычную Ахвяру, Траістасць Боскіх Асоб і адрозненні паміж Усходняй і Заходняй Царквой. Але гэта была навука веры без навукі любові. Урэшце рэшт, пасля доўгіх спрэчак з выкладчыкам мы прыйшлі да высновы, што абвергнуць рэлігію гэтаксама немагчыма, як і даказаць, і што шансаў на тое, што наш прафесар мае рацыю, 50 на 50.

Падабрацца бліжэй да Новага Запавету дапамагло мовазнаўства — з вялікай ўдзячнасцю згадваю я заняткі па старажытнаславянскай мове ў Н. Б. Мячкоўскай, з якой мы займаліся перакладамі прыпавесцяў. Дзякуючы ёй мы вучыліся адкрываць просты сэнс за таямнічымі і пышнымі фразамі і разумець глыбіню і прыгажосць евангельскіх тэкстаў. Працягам гэтае навукі сталі лекцыі сербскахарвацкай мовы, падарожжы ў Сербію, дзе да маёй мамы з павагаю казалі «госпођа» і «молім» замест нашага «прашу», «калі ласка». Кажу пра гэта таму, што за царкоўнаславянскай мовай сучасная руская дый беларуская пакідаюць адценні «вышэйшасці», між тым на радзіме — у паўднёвых славян, словы яе маюць такі самы сэнс, што і нашы родныя, якія нам падаюцца праставатымі.

Нарэшце, дзякуючы лекцыям па старажытнарускай і беларускай літаратуры нас пазнаёмілі з жыццямі Святых, палемікай Праваслаўя з Каталіцызмам і Уніяй, лёсамі беларускіх святых ікон і перакладамі Бібліі і Катэхізіса на старажытнабеларускую мову. Аднак і тут свецкі падыход да гэтых прадметаў скажаў іх першасны, згодны з прызначэннем сэнс. У нашых выкладчыкаў была іншая рэлігія — беларушчына, захаванне мовы і народных традыцыяў, якія бязлітасна сціраліся з памяці нацыі разам са зруйнаваннем святыняў і апаганьваннем мошчаў. Гэта былі лекцыі любові да Слова без веры.

Апошнія дваццаць гадоў змянілі Беларусь. Вернікам вярнулі святыні, а ў семінарыі цяпер рыхтуюць святароў. Здаецца, адышлі ў мінулае гады ваяўнічага атэізму, прафесары перапісалі канспекты і выкладаюць замест яго рэлігіязнаўства, але пытанняў не паменела. Шмат людзей па-ранейшаму захоўваюць толькі вонкавы бок абрадаў, без пакаяння, споведзі і прычасця, без ведання словаў малітвы і спеваў. Адны чакаюць цудаў, іншыя губляюць арыенціры ў штодзённай мітусні.

Але самую галоўную праўду — Любоў — можа данесці да чалавека толькі жывое, непасрэдна яму адрасаванае слова. І ў кнізе І. А. Глухава яно ёсць. У ёй жыве дух евангельскага брацтва, вольнага вандроўніцтва, апошняй вячэры Хрыста, жывога і светлага сяброўства, скажонага здрадаю, але таму такога праўдзіва чалавечнага.

Пры ўсёй прастаце Катэхізіса да разумення некаторых яго праўд чалавек даходзіць доўгім шляхам, бо цяжка паверыць у сваю грэшнасць у маладыя гады, калі ты нічога яшчэ не здзейсніў і толькі збіраешся кімсьці стаць, цяжка зразумець маладой маці,

трымаючы на руках немаўля, што Бога яна павінна любіць больш за маленькі камячок роднага цельца ў сябе на руках. Цяжка маладому чалавеку, поўнаму надзей і амбіцыяў, зразумець сэнс казанняў аб пакоры і дараванні ворагам. Кніга гэтая грунтуецца на вопыце людзей, чый камень ужо пакаціўся з гары, якія зведалі цану страты, горыч крыўды, падманнасць надзей і сіратлівы смак самотнасці. Але на тое і напісаная яна, каб паказаць шлях да вечнасці, да яднання, да паратунку. Шлях дадому.

* * *

У перакладзе з рускай на беларускую мову роля перакладчыка заўсёды сціплая — у сённяшніх рэаліях чытач хутчэй зразумее без перакладу арыгінал, чым пагодзіцца з беларускай інтэрпрэтацыяй. І тым не менш, менавіта праз пераклад некаторыя рэчы чалавек можа зразумець глыбей, выкрасаючы новыя іскры сэнсу з даўно засвоеных слоў і паняццяў.

Як некалі свц. Кірылу і Канстанціну давялося спрачацца з трохʼязычнікамі за права ўслаўляць Бога на славянскай мове нароўні з яўрэйскай, грэцкай і лацінскай, так цяпер даводзіцца адстойваць права некаторых слоў і паняццяў быць менавіта перакладзенымі, а не скалькаванымі з царкоўнаславянскай мовы на беларускую без уліку адрозненняў моўнага ладу гэтай апошняй. І тут трэба адвагі, бо спрэчкі закранаюць самыя святыя і фундаментальныя паняцці, назвы, імёны. У царкоўнаславянскай і беларускай мовах словы «благо» і «блага» — антонімы. Адсюль вынікае цэлы шэраг праблем, імкненне перакладчыкаў пазбегнуць непажаданага скажэння сэнсу пры перакладзе слоў, утвораных

з гэтага кораню: «благодать» — «ласка», «блаженство» — «шчасце», «Благовещение» — «Дабравешчанне/Звеставанне», «Всеблагой» — «Найласкавейшы» і г. д. Аргументы супраць перакладу — спасылкі на праваслаўную традыцыю, аднак пры гэтым ігнаруецца адзін момант: звужэнне сферы ўжытку беларускай літаратурнай мовы напрыканцы XVIII стагоддзя і пабудова яе сучаснага варыянту на зусім іншай аснове — вусным матэрыяле мінска-маладзечанскіх народных гаворак. Да 1831 года 80% насельніцтва гэтага рэгіёну Беларусі былі ўніятамі, пра што сведчаць дадзеныя перапісаў насельніцтва, архітэктура беларускіх святынь і, канешне ж, мова. «Раство» — а не «Ражджаство», «Анёл» — а не «Ангел», «Амін» — а не «Амінь», «Боскі» — а не «Бажэственны», «цнота» — а не «дабрадзецель», — гэта факты жывой мовы, прытым не мовы каталікоў ці ўніятаў, а вынік рэлігійна-культурнага ўзаемадзеяння і ўплыву. Пасля скасавання уніі ў 1831 г. і забароны польскіх школ у 1863 г. вектар гэтых узаемадзеянняў і ўплываў станоўча змяніўся — руская мова стала галоўнай пасярэдніцай засваення іншамоўных тэрмінаў. Аднак выпрацаваны за дзевяць стагоддзяў хрысціянства пласт лексікі гэта мала закранула. Беларуская мова не была дапушчаная ў Царкву: праваслаўнае набажэнства адбывалася паруску, каталіцкае — па-польску.

Беларуская літаратурная мова ў савецкія часы перажыла ідэалагічную «чыстку» — у акадэмічны тлумачальны слоўнік рэлігійныя паняцці і тэрміны не дапускаліся, або з пазнакаю «састарэлае» адсоўваліся ў шэраг слоў, асуджаных на выміранне.

У трагічным XX стагоддзі беларусы пераклалі на родную мову Стары і Новы Запавет, Чэцці Мінеі і

Малітоўнік, але рабілі гэта не дзеячы Беларускай Праваслаўнай Царквы, а пратэстанты, каталікі, уніяты або дзеячы Беларускай Аўтакефальнай Царквы на эміграцыі. Зразумела, што іх намаганні для большасці беларусаў так і не дайшлі.

Дастасаванне царкоўнага лексікону да патрэб нарматыўнага ўжытку беларускай літаратурнай мовы дагэтуль не здзейснілася. Беларусізацыя Праваслаўнай Царквы на радзіме толькі-толькі пачынаецца. Для многіх гэты факт робіцца вызначальным пры выбары канфесіі — інтэлігенцыя, якая шмат намаганняў паклала на пераадоленне міжканфесійных супярэчнасцяў дзеля аб'яднання пад сцягам агульнанацыянальнай ідэі, бачыць у гэтым палітычны падтэкст і робіць выбар на карысць уніяцтва і пратэстантызму. Пры гэтым сфера ўжытку беларускай мовы трагічна малее і звужаецца разам з колам яе носьбітаў.

Менавіта таму, карыстаючы з аказіі, хачу шчыра і сардэчна падзякаваць Пецярбургскаму Таварыству памяці ігуменні Таісіі за іх карысную і вельмі своечасовую ініцыятыву перакладу Праваслаўнага Катэхізіса І. А. Глухава ў ліку іншых нацыянальных моў таксама на беларускую.

Па ўзгадненні з выдаўцом мы пакінулі аўтарскі тэкст без змен, за выключэннем дадатку ў календары дзён ушаноўвання беларускіх святых і цытаты з прадмовы Ф. Скарыны да Бібліі.

З павагай,
перакладчык
Валерыя Ждановіч



Іван Аляксандравіч Глухаў
(1927 – 1999)

АБ АЎТАРЫ

Іван Аляксандравіч Глухаў (1927–1999) нарадзіўся ў сяле Куляшова Сувораўскага раёна Тульскай вобласці ў набожнай сялянскай сям'і і быў узгадаваны ў духу праваслаўнай веры, сціпласці, любові да працы і зычлівага стаўлення да людзей. Вялікі ўплыў на станаўленне яго асобы зрабіла маці Еўдакія Сяргееўна, якую ён ўсё жыццё пяшчотна любіў і шанаваў. У 30-я гг. сям'я пераехала ў Маскву, дзе Іван у 1945 г. скончыў школу і ў 1948 г. — будаўнічы тэхнікум, пасля чаго працаваў тэхнікам ў маскоўскім жыллёвым упраўленні. Ён быў дбайным прыхаджанінам Ціхвінскае царквы сяла Аляксееўскае і прыслугоўваў у алтары.

Хочучы атрымаць багаслоўскую адукацыю, у 1951 г. І. А. Глухаў паступіў у Маскоўскую Духоўную семінарыю, паспяхова скончыў яе ў 1955 г. Пасля гэтага ён быў залічаны ў Маскоўскую Духоўную Акадэмію і скончыў яе ў 1959 годзе са ступенню кандыдата багаслоўя. Яго дыпломнае сачыненне было прысвечанае тэме «Хрысціянскае вучэнне пра зло і яго праявы». Рашэннем Акадэмічнай Рады І. А. Глухаў быў пакінуты пры Акадэміі ў якасці прафесарскага стыпендыята і прызначаны памочнікам інспектара. У Семінарыі ён пачаў

выкладаць катэхізіс, гісторыю Рускае Царквы, а з 1972 г. — сектазнаўства ў Акадэміі. У тым самым годзе ён быў зацверджаны ў званні дацэнта.

За свае працы І. А. Глухаў быў узнагароджаны ордэнамі святога князя Уладзіміра III ступені, Прападобнага Сергія Раданежскага I і III ступеняў, а таксама Патрыяршай граматай. У 1995 годзе ён адбыў паломніцтва ў Святую Зямлю. У апошнія гады свайго жыцця І. А. Глухаў быў прыхаджанінам Маскоўскага храма Усіх Святых, дзе пасля смерці адбылося яго адпяванне; пахаваны Іван Аляксандравіч ў сяле Благавешчанску.

І. А. Глухаў быў патрабавальным выкладчыкам, які дамагаўся трывалых ведаў і строга прымаў экзамены. Так, трэба было напамяць ведаць некалькі соцень выказванняў са Святога Пісання. Прадмет Катэхізісу, які ён выкладаў на першым курсе семінарыі, самая грунтоўная падстава і стрыжань фарміравання праваслаўнага светапогляду, ператвараўся ва ўлюбёны. Пасля яго засваення было лёгка вывучаць усе астатнія прадметы. Вучні параўноўвалі яго прадмет з правіламі дарожнага руху, ведаючы якія, можна спакойна выпраўляцца ў няпросты жыццёвы шлях. І. А. Глухаў бачыў сэнс сваіх лекцый у прасвятленні душ слухачоў Праваслаўным вучэннем, звяртаючыся да іх найлепшых якасцяў і накіроўваючы да Праўды. Ён заўсёды цвёрда стаяў на пазіцыях Святых Айцоў, што асабліва заўважалася падчас гутарак з экуменістамі і прадстаўнікамі іншых

ГЛУХОВ И.

веравызнанняў. Тыя, хто слухаў лекцыі І. А. Глухава, з удзячнасцю згадваюць яго як цудоўнага, выдатнага педагога, які валодаў шырокай эрудыцыяй і шчодра дзяліўся сваімі ведамі са студэнтамі, уважлівага і спагадлівага чалавека.

«Праваслаўны катэхізіс», які прапаноўваецца чытачу, уяўляе з сябе разгорнуты дапаможнік для спасціжэння праваслаўнага веравызнання і настаўляе ў вучэнні пра веру, надзею і любоў. Вучэнне аб хрысціянскай веры коратка выкладзена ў Сімвале веры. У ім, як у фокусе, засяроджваюцца ўсе асноўныя праўды хрысціянства. Вучэнне аб хрысціянскай надзеі змяшчаецца ў малітвах, у прыватнасці, у малітве Гасподняй «Ойча наш», і ў Запаведзях найвышэйшага шчасця. Вучэнне аб хрысціянскай любові выкладаецца ў Законе Божым, або Дзесяціслове.

«Праваслаўны катэхізіс» І. А. Глухава навучае падставам Праваслаўя ў строгай адпаведнасці з творамі Святых Айцоў, але разам з тым адлюстроўвае глыбіню асобы аўтара, яго ўласныя веру, надзею і любоў да Бога, а таксама гарачае імкненне да абуджэння і ўмацавання іх у сваёй аўдыторыі.

ПРАДМОВА

Слухайце сябе, браты, усіх малю:
перш за ўсё, майце страх Божы,
чысціню душэўную і любоў без крывадушша.
А да таго ж любоў да падарожных,
ціхмянасць з пакораю,
пост і малітву, ежа і пітво ў меру.
Гонару і славы не любіце, больш за ўсё бойцеся
і памятайце гадзіну смяротную і Другое Прыйсце.

Прап. Сергій Радaнежскі

Сорам, на думку шматлікіх багасловаў, — гэта маральны страх пры назіранні або пры ўяўленні якой-небудзь заганы, недасканаласці, парушэння прыстойнасці. Яшчэ ў старажытныя часы гаварылі, што сорам — гэта своеасаблівае пакаянне. Як сказаў прафесар Маскоўскай Духоўнай акадэміі Д. Г. Лявіцкі, «галізна, якая не ведае сораму, — гэта поўнае няведанне зла, не толькі адсутнасць сапраўдных недахопаў і недасканаласці, але і адсутнасць самае думкі пра іх».

Царква гаворыць, што сумленне — гэта люстэрка, перад якім нельга схаваць ніводнае заганы. Гэта наш абвінаваўца, сведка, суддзя.

У вучэнні Айцоў Царквы «вобраз Божы» ў чалавеку выяўляецца ва ўласцівасцях і сілах чалаве-

чае душы — яе духоўнасці, розуме, пачуццях, у свабоднай волі, а «падабенства» — у накіраванні гэтых сіл і здольнасцей да Бога, у вольным развіцці і ўдасканаленні дадзеных Богам душэўных сіл дзеля прыпадабнення да Творцы. У сувязі з гэтым не заслугоўвае даравання бяздушнае, халоднае стаўленне чалавека да пастырскай дзейнасці, бо рэлігійнае пачуццё, найбольш інтымнае, абражаецца гэткай непрыхаванай нядбаласцю. Пажадана, каб тут панавала напаўвайсковая, напаўманаская дысыпліна, таму духоўная школа адсякае тых, хто мае па гэтым прадмеце адзнаку «3», хаця і церпіць тых, хто мае адзнаку «3» па іншых прадметах. Наша паспяховасць залежыць ад нашай уласнай увагі, паважлівага стаўлення да прадмету ды інш.

Мы далёка і глыбока прасвечваемся, і не толькі праваслаўныя вернікі звяртаюць на нас сваю ўвагу. Радуюцца вернікі, калі бачаць на вышыні сваю паству, і засмучаюцца ў адваротным выпадку, зларадніччаюць сектанты і ворагі Царквы і веры праваслаўнай.

Катэхізіс, адзін з галоўных прадметаў семінарыі, падстава дагматычнага багаслоўя, з'яўляецца настольнай кнігаю праваслаўнага веравызнання і ўжываецца пры ацэнцы веравызнання іншых канфесій.

У Катэхізісе ўсё выкладзена коратка, ясна і глыбока, і сказаць так, як у Катэхізісе, нідзе больш немагчыма. Завучванне і разуменне поруч

з асэнсаваннем — канчатковая мэта вывучэння гэтага прадмета.

Усе праўды навукі веры пацвярджаюцца Святым Пісаннем. Трэба завучваць тэксты Старога і Новага Запавету, бо яны з'яўляюцца першапачатковымі аксіёмамі. Калі мы добра растлумачым праўды веры і зможам пацвердзіць іх ясна і коратка, дык прынясем карысць і сабе, і слухачам.

Царкоўнаславянская мова — жывая мова, асвечаная царкоўнай традыцыяй. Яна з'яўляецца жывой мовай гутаркі чалавека з Богам. Гэта вельмі эластычная, прыгожая мова, якая выяўляе самыя патаемныя спадзяванні душы. Мы павінны мець Біблію і на царкоўнаславянскай, і на рускай мове.

Катэхізіс складаецца з наступных частак:

– уступная частка (раздзелы I–VII);

– галоўная частка (раздзелы VIII–X).

Катэхізіс — навука праваслаўнай хрысціянскай веры: *Каб ты мог ведаць з пэўнасцю тыя словы, якіх цябе навучылі (Лк. 1, 4).* А таксама: *А той пачаў адважна прамаўляць у сінагогах (Дзеі 18, 26).* Катэхізіс перакладаецца як «абвяшчэнне», «спосаб пераканання», ад старажытна-грэцкага κατηχέω, што значыць «прамаўляць» «тлумачыць». Навучаюцца казаннем, павучаннем, абвяшчэннем, тлумачэннем. Сам Хрыстос ніколі не пакідаў казанняў. Апосталы ж разнеслі Слова Божае па ўсім свеце.

Катэхізіс — падставовае вучэнне аб праваслаўнай веры хрысціянскай, неабходнай для кожнага хрысціяніна.

Вуснае настаўленне — падстава хрысціянскай веры. Настаўленне выкладаецца кожнай хрысціянскай душы, каб дагадзіць Богу, для выратавання душы, дзеля чаго неабходна:

– пазнанне сапраўднага Бога і праўдзівая вера ў Яго;

– жыццё ў суладдзі з вераю і добрыя справы.

Пазнанне праўды — справа ўсяго жыцця чалавечага.

Хрысціянская вера грунтуецца на дзвюх крыніцах: Святым Паданні і Святым Пісанні. Непасрэднае Абʼяўленне Бога — Святое Пісанне.

Вера патрэбная, перш за ўсё, таму што *без веры немагчыма дагадзіць [Богу] (Яўр. 11, 6)*. Вера грунтуецца на даверы. Веру трэба мець моцную, цвёрдую.

Поруч з вераю павінна непарыўна ісці жыццё ў суладдзі з вераю і добрыя справы, бо *вера без справаў мёртвая (Як. 2, 20)*.

Вера — першая, галоўная, хрысціянская цнота: *Бо вера — гэта здзяйсненне спадзяванага, упэўненасць у рэчах нябачных (Яўр. 11, 1),* г. зн. «упэўненасць ў нябачным, нібы ў бачным, у жаданым і чаканым, нібы ў існуючым» (Свц. Філарэт, мітрапаліт Маскоўскі). Галоўны прадмет веры — Бог, Ён не толькі *нябачны (Рым. 1, 20; Кал. 1, 15),* але і *недасяжны для розуму (Пс. 138, 6)*.

У вызначэнні адрозненняў паміж ведамі і верай указваецца:

- на прадмет зацікаўлення;

- на спосаб засваення;
- на «цэнтр свядомасці».

Адпаведна, паміж ведамі і верай існуюць тры адрозненні:

- прадметам ведаў з'яўляецца бачнае і даступнае для спасціжэння, а веры — нябачнае і нават недасяжнае для розуму;
- веды грунтуюцца на досведзе або даследаванні прадмета, а вера — на даверы да сведчанняў праўды;
- веды належаць непасрэдна розуму, хоць могуць уздзейнічаць і на сэрца; вера належыць пераважна сэрцу, хоць пачынаецца ў думках.

Без веры немагчыма ўявіць сабе жыццё. Св. Кірыла Іерусалімскі так тлумачыць неабходнасць веры: «Вера — гэта вока, якое асвятляе ўсялякае сумленне; яна надае чалавеку веданне. *Бо,* кажа прарок, *калі вы не верыце, вы не ўпэўнены (Іс. 7, 9)*» (Абвяшчальнае павучэнне пятае). Чалавек чыстым вокам, нескажоным сэрцам здольны бачыць духоўныя прадметы, якія не «бачаць вочы цялесныя». *Чыстыя сэрцам (...) пабачаць Бога (Мц. 5, 8),* і таму многім хрысціянам, неадукаваным, але пабожным, дадзена пабачыць таямніцы Божыя.

Верай кіруюцца не толькі хрысціяне, але і ўсе людзі іншых вер. Усё ў свеце, нават між людзьмі, далёкімі ад Царквы, адбываецца праз веру, на веры грунтуецца земляробства, верай кіруюцца маракі, — кажа св. Кірыла Іерусалімскі.

Калі ўжо вера патрэбная ў зямным жыцці, дык тым больш неабходная яна ў пытаннях вечнасці. І мы перад пастырствам мусім з вераю заняцца працаю па вывучэнні багазнаўства. Апостал Павел павучаў: *На гэта зважай, у гэтым будзь, (у гэтым разумей), і няхай поспехі твае для ўсіх будуць яўныя (1 Цім. 4, 15).*

Чалавек просіць у Бога для сябе дабра, і калі не атрымлівае, дык гэта таму, што просіць не дзеля дабра. *Просіце, і не атрымліваеце, таму што дрэнна просіце, каб ужыць на раскошы вашыя (Як. 4, 3).* Прасіць ў Бога трэба духоўных даброт — веры, надзеі, любові. «Паводле ўнутранага настрою душы, — кажа Мікіта Сціфат, — мяняецца існасць рэчаў».

УВОДЗІНЫ

1. Склад прадмету Катэхізіса

Бо сёння трываюць вера, надзея, любоў — гэтыя тры, але большая з іх — любоў (1 Кар. 13, 13).

Катэхізіс складаецца з трох раздзелаў:

1. Вучэнне аб хрысціянскай веры. Яно каратка выкладаецца ў Нікея-Царгародскім Сімвале веры. У ім, як у фокусе, адлюстроўваюцца ўсе галоўныя хрысціянскія дагматы, або праўды.

2. Вучэнне аб хрысціянскай надзеі. Увогуле, яно знаходзіцца ў малітвах і, у прыватнасці, у малітве Гасподняй «Ойча наш» і Запаведзях найвышэйшага шчасця. Здаўна казалі: «Маліся і працуй».

3. Вучэнне аб хрысціянскай любові. Яно выкладзена ў Дзесяцікслове, або Законе Майсеевым, бо нідзе больш, як у ім, не падаюцца так дакладна тыя абавязкі, якія мы павінны выконваць у адносінах да сябе і бліжніх.

Да Сімвалу веры было сказана пра любоў: *Любоў церпіць доўга, міласэрная, любоў не зайздросціць, любоў не заносіцца, не ганарыцца, не вывышаецца, не шукае свайго, не раздражняецца, не замышляе благога, не радуецца з крыўды,*

але цешыцца з праўды: усё пакрывае, усяму дае веры, усяго спадзяецца, усё трывае. Любоў ніколі не чэзне, нават калі прароцтвы перастануць збывацца, нават калі мовы змоўкнуць, нават калі розум спустошыцца (1 Кар. 13, 4-8).

2. Сутнасць рэлігійнага светапогляду

1. Рэлігія — гэта вольная духоўная повязь паміж Богам і чалавекам.

2. Рэлігія — гэта першаснае, неад'емнае, натуральнае, унутранае, жывое стаўленне да Бога.

3. Рэлігійныя адносіны — гэта патрэба ў любові, суразмоўе паміж дзвюма асобамі — Богам і чалавекам:

а) у Богу ёсць унутраны рух да чалавека. *Хіба забудзе жанчына таго, каго выкарміла, і не пашкадуе дзіця свайго ўлоння? Але нават калі забудзе іх жанчына, дык Я не забуду цябе, — кажа Госпад (Іс. 49, 15);*

б) у чалавеку жыве ўнутраны рух да Бога як да Першавобразу: *І зрабіў Госпад Бог чалавека з пылу зямнога і ўдыхнуў ў ноздры яго дыханне жыцця: і стаў чалавек душою жывою (Быц. 2, 7).*

4. У духоўным свеце існуе закон сардэчнага, духоўна-маральнага прыцягнення, які паходзіць ад Бога: *Як алень імкнецца да водных крыніц, так імкнецца душа мая да Цябе, Божа (Пс. 41, 2)!* Нельга знішчыць ў сэрцы імкненне да Бога, якое застаецца законам нашае існасці.

У чалавечай душы існуе рэлігійная патрэба шукання Бога, імкненне да Яго, бо паміж чалавекам і Богам існуе роднасная повязь. Рэлігійнае пачуццё натуральна ўласцівае чалавечай душы.

Нашае ўнутранае духоўнае жыццё — гэта радзіма рэлігіі. Усе рэлігіі, якія існуюць сёння, — гэта знешняя праява, адлюстраванне ўнутранага пачуцця.

Госпад Бог імкнецца да чалавека, як да Свайго вобразу, як да вянца тварэння. Ён не можа пакінуць гэтае кволае стварэнне. Апрача таго, Бог ёсць любоў, Божая любоў да чалавека мацнейшая за мацярынскую любоў, пра яе гаворыцца, што яна невытлумачальная. Менавіта пра гэта сказана ў вышэйзгаданых словах прарока Ісаі.

Існуе таксама любоў чалавека да Бога як да свайго першаўзору. Бог стварыў зямлю, і пасля таго, як удыхнуў у пыл зямны Божае дыханне, чалавек зрабіўся чалавекам. Мы — Божага роду. Усё бачнае хутка прамінае, і таму значным застаецца адзінае імкненне — знайсці радасць і суцяшэнне ў яднанні з Богам.

Як вочы імкнуцца да сонечнага святла, як існуе ў прыродзе закон сусветнага прыцягнення, гэтаксама і ў сферы маральнага жыцця душа нашая імкнецца да Бога.

На шляху душы да Бога можна ўзводзіць перашкоды, пачуццё імкнення да Бога можна стлуміць, але канчаткова выкараніць гэтае пачуццё ў чалавеку нельга. Яно як той алень, што імкнецца

да воднага струменя, пра якога гаворыцца ў словах псалма.

Рэлігія не з'яўляецца чымсьці абстрактным, гэта жывая, сапраўдная повязь Бога з чалавекам.

3. Спрадвечнасць рэлігіі

Рэлігія старая настолькі, наколькі старое само чалавецтва. Не было такіх часоў, калі б адсутнічала повязь паміж Богам і чалавекам.

На думку Лактанцыя, заходняга хрысціянскага пісьменніка і прамоўцы (†330), тэрмін «рэлігія» паходзіць ад лацінскага дзеяслова religare, які мае значэнне «звязваць», «злучаць». У сувязі з гэтым рэлігію ён акрэслівае як повязь чалавечай пабожнасці з Богам. Гэтай повяззю Бог злучыў чалавека з Сабою. Людзі нараджаюцца для таго, каб выказваць справядлівае і належнае паслушэнства Госпаду, Які іх спарадзіў, Яго аднаго ведаць, за Ім ісці следам. Гэтае азначэнне Лактанцыя акрэслівае галоўнае ў рэлігіі — яднанне духу чалавека з Богам, якое абываецца ў глыбінях чалавечага сэрца.

Паколькі рэлігія неадлучная ад існасці чалавека і сягае карэннем глыбінь яго духу, таму, зразумела, яна вечная і паўсюдная. Сведчаннем гэтаму з'яўляецца тое, што:

1. Госпад Бог, які стварыў чалавека паводле вобразу і падабенства Свайго, тым самым з першай хвіліны быцця чалавечага залучыў яго ў вельмі цеснае суразмоўе з Сабою.

2. Нявінная раскоша суразмоўя ў раі.

3. Грэхападзенне. Розум, сэрца і воля чалавека і пасля граху нязменна імкнуцца да Бога як да найвышэйшае Праўды, Дабра і Дасканаласці.

Святое Пісанне паказвае, што пры стварэнні чалавека існавала надзвычай цесная повязь, яднанне Бога з чалавекам, — гэта і была рэлігія цнатлівага чалавека. Пасля грэхападзення чалавек зноў імкнецца да Бога.

Любоў Божая — прычына стварэння свету і чалавека. Праф. А. Д. Бяляеў (1849–1919), абапіраючыся на прынцып Божае любові, разглядае ўсю хрысціянскую дагматычную сістэму і прыходзіць да высновы аб падставовай ролі любові Божае ў стварэнні свету і чалавека, збаўленні чалавека і яго аднаўленні як новага стварэння. Стварэнне Богам сусвету адбылося з добрай волі, з любові да свету. Вынікам стала разнастайнасць рэчаў, з'яў, формаў быцця і жыцця. Любоў з'явілася першаасновай не толькі знешняй, але і ўнутранай творчай дзейнасці Бога: у нараджэнні Сына, у вывядзенні Духа, ва ўзаемаадносінах трох Асоб Боства. З любові былі створаныя таксама найвышэйшыя, вольныя формы жыцця, ў свабодзе якіх непазбежна заключаецца і магчымасць зла. Аднак любоў Божая выявілася і ў магчымасці аднаўлення свету і чалавека шляхам пасланніцтва ў свет Сына Божага, які даў людзям дасканалы маральны закон, паказаў дасканалы ўзор яго выканання і праз смерць на Крыжы прынёс найвялікшую Ахвяру дзеля вызвалення чалавецтва

ад сілы граху, яго асвяшчэння і апраўдання, дый, у рэшце рэшт, — збавення.

4. Паўсюднасць рэлігіі

1. Рэлігійнае пачуццё ўласціве кожнаму чалавеку без выключэння.

2. Пра паўсюднасць рэлігіі гаварылі старажытныя мысліцелі: Цыцэрон, Платон, Арыстоцель, Плутарх ды іншыя, а таксама сучасныя даследчыкі: В. фон Гумбальт, В. Вунт, Дж. Фрэзер, Р. Цымерман.

3. У старажытных народаў і дзікіх плямёнаў няма ерасяў, няма дагматыкі, але ёсць вера ў будучае тагасветнае жыццё, у найвышэйшую ахоўную сілу.

4. Разнастайныя віды рэлігій, якія існавалі калісьці або існуюць цяпер, — усе яны з'яўляюцца выражэннем (вынікам) ідэі Абсалюту, закладзенага Творцам ў духоўную прыроду чалавека.

Здольнасць верыць закладзеная ў чалавечай прыродзе. Рэлігія адвечная, а таму паўсюдная. Платон (428 г. або 427-348 гг., або 347 г. да н. э.) выводзіў з паўсюднасці рэлігіі доказ быцця Божага. Арыстоцель (384-322 гг. да н. э.), які быў заснавальнікам прыродазнаўчых навук, не ведаў ніводнага народа без веры ў Бога. Цыцэрон сказаў, што навуцы невядомы ніводзін нават самы дзікі і грубы народ, які не меў бы рэлігійнага пачуцця. Пасля Цыцэрона было адкрыта амаль паўсвету,

і, тым не менш, не было ніводнага народу, якому не было б ўласціва рэлігійнае пачуццё. Плутарх, грэцкі падарожнік і пісьменнік (46-120 гг.), сведчыў: «Вы знойдзеце гарады без умацаванняў, без навукі, без чыноў і начальства; пабачыце людзей без сталага жытла, у якіх няма ва ўжытку манет, але вы не знойдзеце ніводнага чалавечага грамадства без веры ў боства, ніводнага горада, дзе не было б ніякай святыні, не было б у звычаі аніякае малітвы, ахвяры, клятвы і т. п.». Рымскі пісьменнік Сенека (4 г. да Р. Х. – 65 г. пасля Р. Х.) сцвярджаў, што «усім ўласціва прыроджанае паняцце аб боства, таму ніколі ніводзін народ не знаходзіўся ў такім стане беззаконнасці і разбэшчанасці, каб не прызнаваць ніякага боства». Сучасныя даследчыкі В. фон Гумбальт, В. Вунт, Р. Цымерман, Дж. Фрэзер паказваюць, што норавы і звычаі самых дзікіх плямёнаў сведчаць пра існаванне сярод іх рэлігійных ўяўленняў.

Рэлігія звязаная з адвечным жаданнем чалавека спазнаць адзінага Бога. Аб празе Бога напісаў бл. Аўгусцін: «Ты, Божа, стварыў сэрца нашае з імкненнем да Цябе, і таму не супакоіцца наша сэрца, пакуль не знойдзе Цябе».

5. Рэлігія Старога Запавету

Першапачатковая повязь чалавека — Запавет з Богам. Другая повязь — са спакуснікам. Д'ябал разбурае яднанне чалавека з Богам. Але, хаця

рэлігійная повязь была перарваная свавольствам чалавека, Творца, з ласкі і міласэрнасці Сваёй, не пакідае распуснага чалавека без Сваёй апекі і кіравання. Ён стварае новую повязь, пасылае яму добрую вестку і надзею на збавенне.

Бог не дае ўкараніцца лучнасці з д'яблам і парывае гэтую повязь праз Першаевангелле (Быц. 3, 15), даючы чалавеку суцяшэнне і потым шматкротна спрабуючы навярнуць яго на шлях дабра. Чалавечыя справы адкрытыя для Яго яшчэ да таго, як народзіцца думка аб іх, але ведае Ён і тое, як цяжка пакаяцца. Сапраўды, адразу ж пасля грэхападзення пачалося вартае жалю самаапраўданне і нават ускоснае абвінавачванне Бога, а з боку Евы — абвінавачванне д'ябла.

Першаевангелле — умоўнае абазначэнне прароцтва аб варожасці паміж патомствам («насеннем») змея і патомствам Евы: *І варожасць пакладу паміж табою і паміж жанчынаю, і паміж насеннем тваім і паміж насеннем яе; яно будзе раніць тваю галаву, і ты будзеш раніць яго пяту* (Быц. 3, 15). Гісторыя чалавецтва з'яўляецца выкананнем абяцання, якое Бог даў прабацькам. Пасля граху чалавек не здолеў дасягнуць яднання з Богам і абагаўлення створанага свету. Але Хрыстос Збавіцель пераможа д'ябла і выбавіць род чалавечы з граху, праклянцця і смерці (Хрыстос названы Насеннем Жанчыны). Таму Першаевангелле служыла надзеяй для чалавека старога закону. У ім ёсць указанне на перамогу, якая адбылася ў Хрысце Збаўцы.

Пра гэта сказана пасля Быц. 3, 15, таксама ў Быц. 22, 18; Лічб. 24, 17; Друг. 18, 18; 2Цар. 7, 12-15; Міх. 5, 2; Зах. 9, 9; Мал. 3, 1; 4, 5; Аг. 2, 7-20; Дан. 9, 4-27.

Першаевангелле нясе ў сабе 3 праўды:

1. Разрыў той повязі варожасці і нянавісці, якою звязаў сябе *(і варожасць пакладу)* Адам з д'яблам.

2. Вечная варожасць дабра і зла (ніколі дабро не прымірыцца са злом), *паміж насеннем тваім і насеннем яе*.

Пабожная частка нашчадкаў чалавецтва, якая жыла вераю ў прыход Збаўцы, пастулова сталела, узыходзіла ад сілы ў сілу, ад дасканаласці да дасканаласці, пачала называцца Сынамі Божымі і выспела для ўспрыняцця Месіі Хрыста Збаўцы ў асобе Маці Божае Марыі.

3. Канчатковая перамога дабра над злом *(яно будзе раніць тваю галаву, і ты будзеш раніць яго пяту)*. Бог парывае повязь паміж спакуснікам і спакушаным і навязвае повязь паміж Сабою і чалавекам.

Гэтымі словамі Госпад паклаў пачатак новай лучнасці чалавека з Богам, якая і ёсць Стары Запавет або змяшчаецца ў ім.

Бог абраў для захавання сапраўднае веры яўрэйскі народ і падтрымліваў у ім сапраўднае веданне і шанаванне Бога звышнатуральнымі шляхамі, цудамі, прароцтвамі, праобразамі.

У супрацьлегласць нізкай матэрыі язычніцкіх вераванняў маральныя законы рэлігіі Старога Запавету ўражваюць сваёй узвышанасцю і чысці-

нёй. Любоў да Бога (Друг. 6, 4-5) і бліжняга (Ляв. 19, 18) — вось дзве асноўныя Запаведзі, якія складаюць сутнасць закону Старога Запавету і да якіх не мог узняцца язычніцкі свет. Аднак і рэлігія Старога Запавету не давала чалавеку ўсяе паўнаты праўды.

II. ВЕЛІЧ ЧАЛАВЕКА

1. Хрысціянскае вучэнне аб чалавеку як носьбіце вобразу Божага ў духу сваім

Сусвет добры і прыгожы (сонца, месяц, зоры на небасхіле), але прыгажэйшы за ўсё — чалавек, бо створаны ён не так, як былі створаныя іншыя стварэнні, але паводле Рады Святой Тройцы, і ўшанаваны вобразам і падабенствам да Яе. Рада Тройцы аб чалавеку адлюстраваная ў словах: *І сказаў Бог: створым чалавека паводле вобразу Нашага і падабенства Нашага* (Быц. 1, 26).

Слова, Другая Асоба Святой Тройцы, удыхнула подых жыцця ў пыл зямны. Бог стварыў чалавека, жанчыну для яго і ўсялякае стварэнне ў свеце:

І ўзяў Госпад Бог чалавека, якога стварыў, і ўвёў яго ў сад Эдэнскі, даглядаць яго і ахоўваць (Быц. 2, 15).

І стварыў Госпад Бог яшчэ ад зямлі ўсіх звяроў палявых і ўсіх птушак нябесных, і прывёў іх да чалавека, каб бачыць, як ён іх назаве (Быц. 2, 19).

І зрабіў Госпад Бог з рабрыны, што ўзяў ад чалавека, жанчыну, і прывёў яе да чалавека (Быц. 2, 22).

Цела прывязанае да зямлі, а душа імкнецца да Бога. Бог — гэта найчысцейшы Дух. Мы былі створаныя паводле вобразу і падабенства Божага, значыць, вобраз Творцы ў чалавеку трэба бачыць ў сілах душы, якую Бог ўдыхнуў у чалавека, — гэта розум, пачуццё і воля.

1. Розум. На думку бл. Аўгусціна, розум першага створанага чалавека настолькі высокі, наколькі птушка хутчэйшая за чарапаху. Глыбіня розуму першага чалавека выявілася ў наданні імёнаў; праніклівасць яго розуму настолькі моцная, што дасягала ўнутранай сутнасці рэчаў. Моц і глыбіня розуму прабацькоў раскрываюцца ў словах: *І надаў чалавек імёны ўсёй скаціне, і ўсяму птаству нябеснаму, і ўсім звярам зямным (Быц. 2, 20).*

І на гэта, у прыватнасці, звяртае ўвагу антычная мудрасць. Піфагор задаваў пытанне: «Хто быў наймудрэйшы сярод ўсіх людзей, што надаў імёны рэчам?».

2. Пачуцці. Ніводная заганная, грахоўная думка не скажала розуму чалавека, усе нізкія памкненні і зямныя пачуцці былі падпарадкаваныя чысціні сэрца і розуму: *І былі яны абое голыя, чалавек і жанчына яго, і не саромеліся (Быц. 2, 25).*

Галізна, на думку Святых Айцоў, — гэта абсалютнае няведанне зла. Сорам — гэта маральны страх перад абліччам якой-небудзь заганы, непатрэбства, недасканаласці. Разам са свавольнасцю прыйшла недасканаласць. Сорам — гэта своеасаблівае пакаянне, і гэтае пачуццё ўзнікае зусім не

за добрыя справы, таму яно ў такой ступені было ўласцівае Адаму.

Сэрца і душа былі ў поўным спакоі і гармоніі.

3. Воля. Воля была свабодная, скіраваная толькі да дабра, лёгка і нязмушана, і адчувала здавальненне.

Як толькі з'явілася памкненне да зла, паўстала дысгармонія, і тады спатрэбіўся прымус да дабра з пэўным цялесным і духоўным высілкам. І на сённяшні момант без Божае ласкі зусім немагчыма прымусіць чалавека да дабра.

2. Праявы свавольства з боку першага чалавека і яго адмова ад Божага кіраўніцтва

Гісторыя грэхападзення (Быц. 3, 1-6) апісаная проста. Спакуснік пазайздросціў чалавеку і падступіўся да яго да спакусаю, бо яму дапякала веліч чалавека: *будзеце як багі (Быц. 3, 5).* Гэтыя пытанні асвятляліся ў кнігах наступных аўтараў: епіскапа Феафана, свц. Ціхана Варонежскага, прат. Яўг. Папова, свц. Рыгора Багаслова, прат. Фёдара Галубінскага і Д. Г. Лявіцкага, прат. Іаана Іванова[1].

Найвышэйшае кіраванне светам было парушанае чалавечым свавольствам. Разумовая свядомасць ніколі не можа прымірыцца з такім становішчам і лічыць першы грэх за слабое і маленькае адступленне. Была парушаная адзіная запаведзь:

---

[1] Гл. спіс літаратуры (с. 398-405): пп. 8, 21, 29, 36, 33, 30 адпаведна.

Бо калі нават ўвесь закон выконвае, але саграшыць у нечым адным, будзе вінаваты ва ўсім (Як. 2, 10).

Грэхападзенне не ў саміх пладах. Яно — у парушэнні волі Божае. У духоўным небе не было дрэва пазнання дабра і зла, тым не менш, першы Анёл знайшоў спосаб адвярнуцца ад Бога і зрынуцца ўніз. Значыць, справа не ў дрэве пазнання дабра і зла, нельга думаць, быццам патэнцыяльнае існаванне зла сталася прычынаю грэхападзення і нашага сумнага становішча. Дрэва пазнання дабра і зла патрэбнае было для пераканання і росту ў дабры.

Уся справа ў паслушэнстве, якое парушыў чалавек і апынуўся ў стане поўнага непаслушэнства. У «Дабралюбстве» прыведзены прыклад: калі арол хаця б адным кіпцем зачапіўся за сетку, ён страчвае сваю веліч. Так і чалавек, калі паддаўся хаця б адной жарсці або заганнай звычцы, страчвае моц, якая дазваляла яму панаваць над сабой і навакольным светам.

У адным свавольным учынку першых людзей заключана мноства грахоў: ганарліваць, нявер'е, богаадступніцтва, знеслаўленне Найсвяцейшае Істоты, якой яны ў сваіх думках прыпісвалі зайздрасць, няўдзячнасць, хцівасць; крадзеж, самагубства — бо яны ведалі наступствы злачынства, чалавекагубства — бо разам з сабою яны выдалі на смерць ўсё сваё будучае патомства: *праклятая зямля праз цябе, ў цяжкай працы бузеш карміца з яе праз усе дні жыцця твайго (Быц. 3, 17).*

Ганарлівасць, недавер да Бога, богаадступніцтва выявіліся ў супраціўленні, змове са спакуснікам.

Нішто ў свеце не адчувала пакуты, не ведала зла, а пры падзенні ўся прырода вымыкаецца з падпарадкавання чалавеку і большая частка стварэнняў выходзіць з паслушэнства. Гэтаксама, як мы адчуваем маральныя пакуты перад тымі, каго засмуцілі, тое самае, толькі ў яшчэ большай ступені, было ўласціва Адаму. Сорам — гэта пакаянне, маўклівае, скрушнае і няспыннае. Адам быў нявінны і таму свабодна вёў гутарку з Богам. А пры падзенні ён штораз далей імкнуў ад Бога, бо сустрэча выклікала ў яго штораз большую згрызоту і скруху. Гэтым можа растлумачыць усе жальбы, пакуты, хваробы, усялякую мітусню і самую смерць.

Тым не менш, чалавек пайшоў па шляху зла, але не парушыў наканавання Творцы.

3. Наступствы грэхападзення

Прабацькі паводле іх псіхалагічнага стану змяніліся і ўжо не маглі захоўваць ранейшых адносінаў з Богам: *І схаваўся Адам і жанчына яго перад абліччам Госпада Бога (Быц. 3, 8).* Аддаленне ад Бога цягне за сабой адыход ад усіх добрых станаў душы: веры, надзеі, любові, сыноўскага страху, паслушэнства, чалавек пры гэтым пазбаўлены асалоды сузірання Бога і райскага жыцця.

Св. Ірыней Ліёнскі гаворыць, што прабацькі «прагнулі ўцячы ад Аблічча Божага» («Супраць ерасяў»).

Чалавека, які адышоў ад Бога, вымкнуў з-пад Яго кіраўніцтва, чакаюць шматлікія маральныя пакуты і ўсялякія знешнія беды. Св. Васіль Вялікі ў Гутарцы «Аб тым, што Бог — не віноўнік зла», кажа, што ўсякае аддаленне ад Бога — гэта найгоршае, невыноснае зло, найцяжэйшае для чалавека.

Стройная ўнутраная гармонія паміж душою і целам парушылася, бо душа і цела першага чалавека пасля грэхападзення прыйшлі між сабою ў сутыкненне, а пасля ўсіх гэтых узрушэнняў і шкодных уплываў адбыўся разрыў паміж душою і целам.

Д'ябальская сіла апанавала душу і ўзняла ў ёй такую буру, што ў людзей узнікла адно жаданне — сысці ад Бога прэч і назаўжды. Вельмі цяжка ў такім стане зрабіць прызнанне, і таму Бог Сам пытаецца: *Адаме, дзе ты ёсць? (Быц. 3, 9).* Але Адам не гаворыць праўды, а займаецца самаапраўданнем, паказваючы на Еву. І адбылося ўхіленне ад пакаяння: *І сказаў Адам: жанчына, якую даў Ты, каб была са мною, гэта яна дала мне ад дрэва, і я еў. (...) І сказала жанчына: змей спакусіў мяне, і я ела (Быц. 3, 12-13).*

Адбылася духоўная смерць — зарадзіліся крывадушша, мана, ганарлівасць і г. д. І матэрыяльны свет патануў у зле. *Праклятая зямля праз*

цябе, ў цяжкай працы будзеш карміца з яе праз усе дні жыцця твайго: церні і ваўчыц народзіць яна табе, і будзеш есці траву палявую. У поце аблічча свайго будзеш есці свой хлеб, пакуль не вернешся ў зямлю, з якой ты быў узяты: бо ты ёсць зямля і ў зямлю вернешся (Быц. 3, 17-19). Бо мы ведаем, што ўсё стварэнне разам уздыхае і курчыцца ў болях аж па сённяшні дзень (Рым. 8, 22).

Паводле задумы Божай, чалавека чакала вечнае жыццё: *Бо Бог смерці не стварыў, не весяліцца Ён з пагібелі жывых (Мудр. 1, 13).* А таксама: *Бо Бог стварыў чалавека дзеля нятленнасці і паводле вобразу Свайго і падабенства Свайго стварыў яго (Мудр. 2, 23).*

Але няпраўда цягне за сабою смерць: *Бо праўда неўміручая: [а няпраўда — смерці забеспячэнне] (Мудр. 1, 15).*

Тады Бог прымае рашэнне: «Ідзі, чалавеча, дарогаю, якою ты выбраў сабе сам, толькі ведай, што шмат пакут вынесеш ты на гэтым шляху, але Я Свайго стаўлення не змяню».

Вынікамі падзення сталі пашкоджанне розуму, пачуцця і волі. Замарачэнне розуму і свядомасці выявілася ў тым, што Адам спрабаваў схавацца ад Бога ў ценю райскага саду, хоць ведаў, што Ён Усёведны. Скажэнне пачуцця выявілася ў раптоўным ўсведамленні сваёй галізны, г. зн. страце чысціні і абуджэнні сораму. Скажэнне волі выявілася ў імкненні быць ад Бога штораз далей, у пазбяганні Твару Божага.

Адбылося таксама скажэнне навакольнага асяроддзя і прыроды. Цяпер зямля пачала даваць церні і ваўчыц, паменела садавіны і гародніны. Вучоныя даводзяць, што на Паўночным полюсе раней раслі трапічныя лясы. Жывёльны свет выйшаў з падпарадкавання чалавеку. Сам чалавек пачаў хварэць, і свет ператварыўся ў шпіталь. Смерць цялесная — апошняе наступства грэхападзення, і мала радасці для злачынцы ў тым, што тэрмін яго смяротнага пакарання перанесены. Завязваецца барацьба паміж целам і душою, якая не можа быць вечнай, і, знясільваючы чалавека, прыводзіць яго да смерці.

Але Міласэрны Бог няспынна абвяшчаў Першаевангелле, і з цягам часу абвяшчэнне гэтае рабілася штораз больш вымоўнае. Так, у Кнізе Лічбаў даецца вельмі яснае абяцанне: *Бачу Яго, але яшчэ не сёння; гляджу на Яго, але яшчэ не блізка. Узыходзіць зорка ад Якуба і паўстае жазло ад Ізраіля, і разаб'е лоб Маава, і знішчыць усіх сыноў Сіфавых (Лічб. 24, 17).*

III. УЗНІКНЕННЕ ІЛЖЫВЫХ ВУЧЭННЯЎ ПРА БОГА І ЗАХАВАННЕ САПРАЎДНАЕ ВЕРЫ Ў ЯГО Ў ПАТРЫЯРХАЛЬНЫ ПЕРЫЯД

1. Ілжывыя вучэнні пра Бога

Па меры аддалення чалавека ад Бога, па меры агрубення звычаяў, па меры паглыблення распусты ўзнікаюць ілжывыя вучэнні пра Бога.

Госпад вёў меншую частку людзей асаблівым шляхам праз Свае Аб'яўленні. Большая ж частка пайшла ўласнаю дарогай, але Бог не пакідаў іх. Хоць Ён і дазваляў імісці гэтым шляхам, але сваіх наканаванняў у аносінах да іх не змяніў.

Язычніцкія рэлігіі вельмі разнастайныя. Усе яны падзяляюцца на 4 групы: сабеізм, антрапатэізм, заатэізм, фетышызм.

Сабеізм («саб» — неба) — абагаўленне зорнага неба. Старажытныя людзі меркавалі, што, паколькі нябесныя свяцілы выконваюць пэўныя рухі, значыць, яны маюць у сабе душу.

Антрапатэізм — абагаўленне чалавека. Асабліва перад прыйсцем Хрыста гэты культ быў развіты ў Грэцыі (культ кесараў), і сярод першых «бязбожнікаў», або атэістаў, былі хрысціяне, якія не пакланяліся кесару.

Заатэізм — абагаўленне немага стварэння, абагаўленне жывёлаў. Рэшткі заатэізму захаваліся в Паўднёва-Усходняй Азіі, дзе прадметам пакланення з'яўляюцца свяшчэнныя сланы, свяшчэнныя каровы, свяшчэнныя зайцы.

Фетышызм («фетыш» — амулет, талісман) — абагаўленне самых нікчэмных неадушаўлёных прадметаў: «косць», «ракавіна», «пень». Гэта найніжэйшы гатунак паганства, які паказве, наколькі нізка ў маральным плане маглі ўпасці людзі.

Большая частка людзей забыла і сказіла сапраўднае вучэнне пра Бога. Зямля напоўнілася злом, і тады Бог пакідае Ноя, а рэшту знішчае патопам.

Але зло развівалася. І Бог выбірае яўрэйскі народ, роданачальнікам, патрыярхам якога робіцца Аўраам. Усвядоміць маральнае бяздушша і бяссілле і пажадаць з яшчэ большай сілаю свайго выратавання — вось дзеля чаго яўрэйскі народ быў вызвалены ад цяжару зямное працы.

Знешняй прыкметаю веравання стала вера ў прышэсце Адкупіцеля. Ахвяра прыносілася заўжды, пачынаючы ад Каіна і Авеля, аднак яна не выратоўвала чалавека ад грахоў, але правобразна ўказвала на веру ў адзіную Ахвяру, Якая павінна выратаваць чалавецтва.

2. Захавальнікі сапраўднай рэлігіі — патрыярхі

Сапраўдная рэлігія таксама зберагалася, і зберагальнікамі яе былі патрыярхі і іх сем'і. Яны захоўвалі месіянскія абяцанні і перадавалі іх. Гэтыя абраннікі Божыя падтрымлівалі ў людзях веру ў Адзінага Сапраўднага Бога і ўласным словам і прыкладам вучылі іх пабожнаму жыццю.

Істотны пункт патрыярхальнай веры — вера ў надыход Збаўцы свету, таго нашчадка Евы, які, паводле абяцання Божага, павінен быў разбурыць царства д'ябла і вярнуць людзям страчанае шчасце. Гэтая вера пацвярджалася Госпадам у адкрыццях, прароцтвах, правобразах, цудах. Пісанага Закону Божага ў патрыярхальны перыяд не было. Абяцанні пераказваліся з вуснаў ў вусны. Найстарэйшы патрыярх прыносіў ахвяры і чытаў малітвы. Зне-

шняй сімвалічнай праявай веры патрыярхаў у надыход Збаўцы былі ахвяры, якія складаліся ў месцах, вызначаных з Божае ласкі, або проста ў зручных месцах, якія найбольш спрыялі малітве (у гарах, дубровах).

Яны захоўвалі сапраўдную веру і шанавалі Бога. Але, у супрацьлегласць гэтаму, пачынаючы ад Хама, праклятага за знявагу бацькі, пачало забывацца сапраўднае вучэнне пра Бога і на зямлі стала распаўсюджвацца ідалапаклонства.

З цягам часу жыццё патрыярхаў пачало штораз больш скарачацца, і Бог загадаў прароку Майсею запісаць у Кнігу Закона Аб'яўленні, якія дагэтуль перадаваліся праз Паданні. Падчас саракагадовага блукання яўрэяў па пустыні Бог даў праз Свайго прарока Майсея Свой Закон, Запаведзі [наказы] якога складаюць падставу любой маралі і любога заканадаўства.

У кожнай Запаведзі адкрываецца глыбокая і адвечная праўда. Зместам ўсёй рэлігіі Старога Запавету з'яўляецца самае высокае і чыстае вучэнне пра Бога, свет і чалавека, якое непараўнальна пераўзыходзіць вучэнні ўсіх натуральных рэлігіяў.

Чаканне Месіі і абяцанні аб Ім складаюць галоўнае звяно рэлігіі Старога Запавету ў патрыярхальны і падзаконны перыяды.

Народ-абраннік абяцаннямі, правобразамі, ахвярамі і прароцтвамі рыхтаваўся да прыняцця Месіі, астатнюю частку чалавецтва Божае Наканаванне вяло да гэтай самай мэты, але іншымі шляхамі.

IV. МАРАЛЬНА-РЭЛІГІЙНЫ СТАН ЯЗЫЧНІЦКАГА СВЕТУ ПЕРАД ПРЫЙСЦЕМ НА СВЕТ ХРЫСТА

1. Усведамленне згубнасці свайго грэшнага стану і неабходнасці збаўлення

Язычніцкі свет забыўся на Адзінага Бога і быў пазбаўлены звышнатуральнага Аб'яўлення. Ён павінен быў перажыць усю глыбіню маральнага заняпаду, усвядоміць усю горыч памылкі, каб, нібы блудны сын, апрытомнець, пакаяцца і адчуць у поўнай меры прагу да выпраўлення сваёй правіны і збаўлення.

Язычніцкі свет, які ладзіў у гонар багоў усходнія фэсты, элеўзінскія таінствы ды іншыя містэрыі, не мог ўнесці ў душу людзей таго спакою (стану суцішэння), які дае толькі чыстая і разумная вера.

Разам з заняпадам веры пашыраўся надзвычайны маральны заняпад. На прыкладзе Старажытнага Рыму відаць, што набліжаўся крэс доўгага шляху язычніцкай аблуды. Рым — горад нечуванай раскошы і разам з тым жахлівай беднасці, прыгнёту і пакут. Падставы сямейнага і грамадскага жыцця скажаліся. У выніку тое, што нясе чалавеку карысць, — ганьбуецца, а тое, што аслабляе, шкодзіць, разбэшчвае, — ухваляецца; перавага пачаткаў разбэшчанасці павінна была натуральным шляхам прывесці да згубы. Літаратуру і мастацтва таксама закранула гэтае паўсюднае скажэнне звычаяў,

падставаю гэтага скажэння была мана: яна сеяла сумнеў, а ўжо на грунце сумневу навязваецца скажоная ўласная воля. А корань свавольства — гэта парушэнне волі Божае, якая захоўвае дзеля вечнага жыцця, г. зн. самааддаленне ад ласкавага Твару Божага.

Думка філосафаў, паэтаў і ўсіх людзей таго часу пераходзіла ў адчайны крык, у адкрыты заклік да згубы і самавынішчэння, які даносіўся адусюль. Язычніцкія філосафы прыходзілі да высновы, што смерць лепшая за жыццё, што жыць не варта. Як сказана ў Бібліі, *Дык будзем есці і піць, бо заўтра памрэм (1 Кар, 15, 32).* Цыцэрон (106–43 гг. да Р. Х.) часта ўжываў у сваіх прамовах выраз «О, часы! О, звычаі!».

Сенека (4 г. да Р. Х. – 65 г. пасля Р. Х.) сведчыў: «Запанаваў стан нечуванае разбэшчанасці, з дня на дзень расце схільнасць да граху, з дня на дзень нікне сорам; гэтая схільнасць, адмаўляючы павагу да ўсяго найлепшага і святога, накіроўваецца абы-куды».

Лепшыя сярод імператараў стараліся рознымі заканадаўчымі і адміністрацыйнымі шляхамі спыніць зло, паўстрымаць маральны парадак ад канчатковага заняпаду. Але ўсе намаганні былі дарэмныя, бо голас Божы, які абвяшчаў цераз прарокаў шлях да выратавання, быў *голасам, які гукаў у пустыні (Мк. 1, 3).* Чалавецтва на працягу шматлікіх вякоў на ўласным вопыце спазнала ўсю глыбіню зла і сваё маральнае бяссілле, бездапаможнасць у барацьбе са злом.

2. Чаканне збавення сярод праведнікаў Старога Запавету

Рэлігію немагчыма ўявіць без Аб'яўлення з боку Бога.

Шмат разоў рознымі шляхамі Бог абвяшчаў пра Абяцанага Збаўцу (Жазло Ізраіля, Зорка Якуба, Цар Сіёну, Уладар Ізраіля, Вялікі Прарок).

Збавенне шмат разоў было прадказанае прарокамі Старога Запавету: *Бог шматкротна і шматстайна прамаўляў здаўна да айцоў праз прарокаў (Яўр. 1, 1-2).* Вырашальнае значэнне ў прыняцці прароцтваў мела інтуітыўнае пачуццё. Прыйсце Хрыста прадказвалася розным чынам:

Зорка Якуба, Жазло Ізраіля: *Узыходзіць зорка ад Якуба, і паўстае жазло ад Ізраіля (Лічб. 24, 17).* У тлумачэнні на рускую мову: *восстает Жезл от Израиля.*

Прарок: *Прарока ад братоў тваіх, як ад мяне, узнясе табе Госпад Бог твой, — Таго паслухайце (Друг. 18, 15).* Гл. таксама Друг. 18, 16-18.

Вечны Уладар ў Ізраілі: *Бо з цябе выйдзе мне той, хто стане Уладаром у Ізраілі (Міх. 5, 2).* У рускім перакладзе: *Владыка.*

Праўда Вечная і Святы святых: *І ачысцяцца беззаконні, і прывядзецца праўда вечная (...) і памажацца Святы святых (Дан. 9, 24).*

Праведны і Рахманы Цар Сіёнскі: *Радуйся моцна, дачка Сіёну, цешся галасна, дачка Ерусаліма: вось, Цар твой набліжаецца да цябе,*

праведны і збавенны, рахманы (Зах. 9, 9). Таксама прадказвалася і месца Нараджэння — Віфлеем: *І ты, Віфлеем-Эфрата, хіба ты малы сярод тысяч Іудзіных (Міх. 5, 2);* час Нараджэння (Дан. 9; 24-27): *ад вытоку слоў, што абвясцілі і ўзнеслі Іерусалім, нават да Хрыста Старэйшыны сем сядмін і шэсцьдзесят дзве сядміны (Дан. 9, 25);* Уваход у Іерусалім: *...сядзіць на маладым восліку, сыне асліцы (Зах. 9, 9).*

Усе наступныя прароцтвы былі толькі далейшым развіццём першага прароцтва (Быц. 3, 15) аб прыйсці — Іаана-Папярэдніка: *Гэта я пасылаю Анёла Майго, і падрыхтуе шлях перада Мною (Мал. 3, 1),* а таксама: *І гэта я пашлю вам Іллю Фесвіцяніна, перад Прыйсцем дня Гасподняга, вялікага і светлага (Мал. 4, 5),* і аб хуткім Прыйсці Месіі: *і нечакана прыйдзе ў Царкву Сваю Госпад (Мал. 3, 1).*

Большая ж частка яўрэяў пакутавала ад рабства ў сацыяльным разуменні, г. зн. чакала вызвалення з палону Вавілонскага, а пазней — Рымскага.

3. Чаканне збавення сярод іншых народаў

Чаканне збавення ўласціва ўсім народам. Перад Прыйсцем Хрыста ажываюць старадаўнія паданні аб лепшай будучыні, аб аднаўленні «залатога веку», які чалавецтва перажыло на зары гісторыі.

Гэтаму спрыялі яўрэі, расцярушаныя па твары зямлі. У часы Пталемея Філадэльфа, за 270 гадоў

перад Р. Х., Святое Пісанне было перакладзенае на грэцкую мову. Месію чакалі Сакрат, Платон, Сенека. Тацыт і Светоній пісалі пра ўсеагульнае чаканне Вялікага Святога на Усходзе. Чаканне адлюстраванае і ў антычнай паэзіі. Вергілій, сучаснік Раства Хрыстовага, у Эклогах казаў пра «залаты век» царства Сатурна. У Іудзеі чаканне было паўсюднае: чакалі ўсе — ад уладароў да жабракоў, чакалі вучоныя, кніжнікі, убогія, сляпыя, пра што сведчыць Біблія (на прыкладах самаранкі, жанчыны-хананеянкі).

У Кітаі чаканне Збаўцы можна прасачыць ад VI стагоддзя да Р. Х., гэта чаканне прыйсця Святога з Захаду. Індусы чакалі апошняга, дзесятага ўвасаблення Вішну. Боскага Збаўцы чакалі персы. На Захадзе таксама чакалі прыйсця Збаўцы — кельты, старажытныя продкі германцаў, а таксама старажытныя скандынавы. Старажытныя грэкі ў атмасферы паганства чакалі прыйсця Бога на зямлю ў выглядзе чалавека.

Св. Ігнат (Бранчанінаў) у творы «Аб ерасі і расколе» (СПб., 2005) сцвярджае, што «ерась — гэта ёсць прыхаванае адмаўленне хрысціянства. Калі людзі пачалі адыходзіць ад паганства, усведамляючы яго відавочную недарэчнасць, і прыходзіць да пазнання і веры ў Збаўцу; калі ўсе высілкі д'ябла падтрымаць сярод людзей паганства аказаліся дарэмныя, тады ён вынайшаў ерасі, і праз ерась, захоўваючы для людзей, што прытрымліваюцца яе, імя і некаторыя знешнія прыкметы хрысціян,

не толькі адняў у іх хрысціянства, але і замяніў яго на блюзнерства».

У творы Іаана Дамаскіна «Коратка аб ерасі» (СПб., 2005) прапануюцца звесткі аб 103 ерасях. Прап. Іаан Дамаскін указвае на чатыры першаўзоры ўсіх ерасяў, ад якіх пайшлі ўсе астатнія: 1) варварства, 2) скіфства, 3) элінства, 4) іудзейства. Яскрава пра гэтыя чатыры ерасі выказаўся Апостал: *дзе няма ні эліна, ні іудзея, абразання і неабразання, варвара і скіфа, нявольніка і свабоднага, але ва ўсім і ва ўсіх Хрыстос (Кал. 3, 11). А той, хто ў Хрысце — новае стварэнне (2 Кар. 5, 17).*

1. Варварызм — ад Адамавых дзён да дзесятага калена (да часоў Ноя), калі кожны лічыў за закон меркаванні, прадыктаваныя ўласнай воляй.

2. Скіфізм — ад Ноевых дзён да будаўніцтва Вавілонскае вежы, і пасля вежы Вавілонскае, на працягу невялікага перыяду (з часоў Фары), г. зн. да Фалека і Рэгава.

3. Элінізм — з часоў Серуга, праз ўшанаванне вартых павагі людзей да служэння ідалам у выглядзе статуй. Пазней элінства перайшло ў ерасі (піфагарэйцы, стоікі, платонікі, эпікурэйцы). З таго часу спосаб ўшанавання Бога, а разам з ім і натуральны закон жыцця, аддзеленыя ад гэтых народаў, ад стварэння свету і да сённяшніх дзён існавалі між варварства, скіфства і элінства, пакуль не спалучыліся з набожнасцю Аўраама.

Сярод ерасяў Іаан Дамаскін разглядае таксама наступныя выпадкі ерасі да Маркіёна: сар-

тор-ніляне, васілідыяне, мікалаіты, гностыкі, кар-пакрацяне, кірынфяне, назарэі, яўіянеі, валянціняне, секундыяне, пталемеі, а таксама маркасеі, калаўрасеі, іраклеяніты, афіты, кайяне (кайніты), сіфіяне, архонтыкі, керданяне, маркіяніты, лук'яністы, апеляне, севірыяне, тацяне, энкраціты, катафрыгасты, пепузяне, чатырнадзесятнікі, алогі, адамяне, сампсеі і елкесеі, мелхісэдэкяне, вардасяне, найцяне, валісіі, кафары, ангелікі, апастолікі, савеліяне, арыгеністы. У іншых раздзелах былі разгледжаныя таксама паўліяністы, маніхеі, іеракліты, мелецяне, арыяне, аўдыяне, фаціняне, маркеліяне, паў-арыяне, духаборцы, аэрыяне, аэціяне, дзіміріты, антыдыкамарыяніты, каліры-дыяне, масаляне («малельнікі») — яўхіміты, мартырыяне, сатаністы.

Ад Маркіёна і да Льва з'явіліся згаданыя ніжэй ерасі: нестарыяне, еўціхіяністы, егіпцяне — схізматыкі, манафісіты, афтартадакіты, або гаяніты, агнаіты, або фемісцяне, васануфіты, або семідаліты, ікеты, гнасімахі, іліятрапіты, фнітапсіхіты, аганікліты, феакатагносты, або блюзнеры, хрысталіты — аб тым, што цела Хрыста засталося, эфнафроны, данатысты, іфікапраскопты, парэрмінеўты, лампецяне. Гэтыя ерасі — да Іраклієвых часоў.

Таксама разглядаюцца ерасі ад Іраклія: манафеліты, аўтапраскопты, ізмаіліты, або сарацыны, магаметане, хрысціянапаклёпнікі, іканаборцы, фімалявонты, апасхіты, або даксарыі.

4. Скажоныя паняцці аб Збаўцы сярод іудзеяў

Чацвёртым першаўзорам ерасяў Іаан Дамаскін называе іудаізм, які з часоў Аўраама атрымаў знак абразання і быў запісаны Майсеем як дадзены Богам Закон. Ад Іуды, чацвёртага сына Якуба, называнага Ізраілем, праз Давіда, першага цара з калена гэтага Іуды, ён атрымаў, у рэшце рэшт, назву іудаізм.

Сярод іудзеяў, паводле Іаана Дамаскіна, было сем ерасяў: кніжнікі («законнікі»), фарысеі («адасобленыя»), садукеі («праведныя»), імераваптысты (якія лічылі, што неабходна кожны дзень хрысціцца), ясіны («пабожныя»), насарэі («аддзеленыя» [аскеты]), ірадыяне (якія чакалі Хрыста ў асобе Ірада).

Ад іудзеяў пайшло самарыцянства, і ад яго — самарыты, перш чым сярод элінаў з'явіліся ерасі і перш чым склаліся іх вучэнні. Пасля з‘яўлення элінскай рэлігіі яно ўкаранілася сярод іудзейства з часоў Навухадносара і палону іудзеяў. Яны грэбавалі язычнікамі і не дакраналіся да іх, адмаўлялі прароцтвы, якія былі пасля Майсея, уваскрасенне мёртвых ды іншыя. Самаране былі чатырох гатункаў (гарфіны, іевусеі, ясіны, дасфіны).

V. ХРЫСЦІЯНСКАЯ РЭЛІГІЯ

1. Сутнасць хрысціянства

У язычніцкім свеце мэта жыцця была страчаная, але гэта быў шлях, якім вёў Госпад большую частку чалавецтва дзеля таго, каб вычарпаць усе спадзяванні марнага чалавечага розуму. Язычніцтва, якое далёка адышло ад Бога, згубіўшы шлях, выпіла горкую чашу адчужэння. І язычнікі шукалі шляху да праўды, але гэтыя спробы не далі плёну, што вылілася ў кульмінацыйны і апошні пункт у пытанні Понтыя Пілата: «Што ёсць праўда?». Бо праўда не магла сыходзіць ад знясіленага доўгімі пошукамі аблуднага чалавецтва.

Праўда прыйшла ад Госпада ў асобе Сына Божага, Які даў шлях Праўды і Жыцця: *Я ёсць шлях, і праўда, і жыццё (Ін. 14, 6).* Але хрысціянства цесна звязанае з іудзейскай рэлігіяй Старога Запавету, без якой яго немагчыма зразумець. Стары Запавет быў нянькаю, выхавацелем чалавека старога закону. Знешнім сведчаннем умацавання ў веры было складанне ахвяр, якія, хаця і не ачышчалі ад граху, але ўмацоўвалі ў веры і ўзводзілі ад сілы да сілы, рыхтуючы людзей да прыняцця Месіі — Збаўцы. У патрыярхальны перыяд абяцанні перадаваліся з вуснаў у вусны. У гэты час цэлы народ, які выводзіў сваё паходжанне ад Аўраама, атрымаў абяцанні праз пракаў. Апошнім з пракаў Ста-

рога Запавету стаў Малахія. *Бог, які шматкротна і шматстайна прамаўляў здаўна да айцоў праз прарокаў, у апошнія дні прамаўляў да нас праз Сына, Якога прызначыў наследнікам усяго, праз Якога і вякі стварыў (Яўр. 1, 1-2).* А таксама: *Іудзеі просяць цудаў, і эліны мудрасці шукаюць: а мы абвяшчаем Хрыста Укрыжаванага, для іудзеяў — спакусу, а для элінаў — глупства (1 Кар. 1, 22-23).* З другога боку, іузейства несла сляды часу, сляды нацыянальных забабонаў.

Рэлігія Старога Запавету мела атрыманую ад Бога святую, чыстую, высокую для чалавечага сэрца веру, ведала Сапраўднага Бога, несла правільнае, узвышанае ўяўленне пра Бога. У ёй чалавек даходзіць да шкарлупіны праўды. Гэтага не мела ніводная рэлігія. Шматлікія пакаянныя крыкі зыходзяць з адрынутай чалавечай душы. Але толькі доўгачаканы Месія можа запоўніць бездань паміж веліччу Божай і ўпадкам чалавека, і таму рэлігія Старога Запавету — гэта рэлігія надзеі.

Хрысціянская рэлігія — гэта ажыццяўленне спадзяванага. У ёй ёсць Той доўгачаканы Месія, Які сышоў з неба, Нябесны Архірэй, які ўцялесніўся ва ўлонні Маці Марыі. Хрысціянства не робіць адрозненняў паміж плямёнамі, народамі, узростам і станам людзей, гэта рэлігія агульначалавечая, універсальная, сусветная. Хрысціянства — гэта Хрыстос, Яго жыццё, Яго пакуты, Яго Крыж, Яго Уваскрасенне, Яго Узнясенне, Яго знаходжанне праваруч Айца і пасланне Духа Святога: *але*

гаворым Мудрасць Божую, у таямніцы схаваную, якую прадвызначыў Бог да пачатку вякоў дзеля славы нашае, а якую ніхто з князёў веку гэтага не разумее: бо каб разумелі, не ўкрыжавалі б Госпада славы. Але, як напісана было: чаго вока не бачыць, і вуха не чуе, і што да сэрца чалавеку не ўзыходзіла, тое наканаваў Бог тым, хто любіць яго. А нам Бог адкрыў Духам Сваім: бо Дух усё прасякае, і глыбіні Божыя (1 Кар. 2, 7-10).

Хрыстос — Той, Хто, паводле прароцтва Ісаі, узяў на Сябе грахі ўсяго свету: *Ён боль наш прымае і смутак наш носіць (Іс, 53, 4).* Ён без нараканняў панёс іх да Галгофы, нібы Ягня, якое вядуць на закланне: *Ён, будучы вобразам Божым, не імкнуўся на гвалт быць роўным Богу, але Сябе спустошыў, вобраз раба прыняў і да людзей прыпадабніўся, і, прыбраўшы чалавечае аблічча, Сябе ўпакорыў, стаўшыся паслухмяным аж да смерці, прычым смерці крыжовае (Флп. 2, 6-8).* Іаан Хрысціцель сказаў пра Хрыста: *Вось, Ягня Божае, што бярэ на Сябе грахі свету (Ін. 1, 29).* На Галгофе адбылося поўнае заспакаенне правасуддзя Божага, якое асудзіла чалавека за злачынства да смяротнага пакарання.

Хрыстос — Той, Які *не запярэчыць, не закрычыць (...), трысціны надламанае не пераломіць і лёну, што заняўся тлець, не загасіць, пакуль не давядзе да перамогі суд (Мц. 12, 19-20).*

Язычніцтва — гэта рэлігія, якая знаходзіцца ў стане пошуку, іузейства — рэлігія ў стане надзеі.

Хрысціянства — гэта ажыццяўленне таго, чаго шукала язычніцтва і на што спадзяваліся іудзеі. Хрысціянства — гэта ўвасабленне і той, і другой рэлігіі. Хрыстос Збаўца прынёс на зямлю Божую Праўду ў паўнаце і дасканаласці.

Агромністая праца П. З. Лебядзінскага «Ісус Хрыстос, Сын Божы — Збаўца Свету» (СПб, 2008; перадрук 1896 г.) мела на мэце зрабіць даступным для кожнага хрысціяніна сабранае ў адзінае цэлае ўсё Праваслаўнае вучэнне аб Найсвяцейшай Тройцы, аб стварэнні свету, аб стварэнні чалавека і яго падзенні, аб Боскім будаўніцтве дому выратавання адрынутага чалавека і сапраўднае разуменне вучэння Хрыстовага ў тлумачэнні Святых Апосталаў, Айцоў Царквы ды іншых пісьменнікаў. Дзеля дасягнення мэты аўтар раскрыў змест Біблейскага падання аб Стварэнні свету і лёсе роду чалавечага, правобразу і прароцтва аб Хрысце, усіх чатырох Евангелляў у храналагічным парадку і Пасланняў Святых Апосталаў, што дапаможа сапраўднаму хрысціяніну спасцігнуць феномен Хрыста і сутнасць яго вучэння.

2. Неабходнасць і падстава рэлігійных ведаў у хрысціянстве

а) паняцце аб Аб'яўленні [Адкрыцці]

Што з'яўляецца крыніцай праваслаўнай веры? Ёсць адзіная крыніца — Святое Пісанне і Святое

Паданне, якія разам складаюць Божае Аб'яўленне. Мітрапаліт Маскоўскі Філарэт (Драздоў) задецца пытаннем: «Адкуль вынікае вучэнне Праваслаўнай веры?» — і ў сваім Катэхізісе адказвае: «З Божага Аб'яўлення» (СПб., 2007, 2010). Бог адкрывае Сябе натуральным і звышнатуральным шляхам. Гэта з цяжкасцю разумее чалавек у сённяшні век рацыяналізму і рэлігійнага скептыцызму.

Кажучы словамі М. В. Ламаносава, «Творца даў роду чалавечаму дзве кнігі. У адной Ён выявіў Сваю веліч, а ў другой — Сваю волю. Першая — гэты свет, створаны Ім, каб чалавек, гледзячы на велізарнасць, прыгажосць і стройнасць Яго стварэнняў, прызнаў усёмагутнасць Божую… Другая кніга — Святое Пісанне. У ёй выяўленая прыхільнасць Творцы да нашага збавення». Вучэнне праваслаўнай веры вынікае з Божага Аб'яўлення.

1. Пад імем Божага Аб'яўлення разумеем тое, што Сам Бог адкрыў людзям, каб яны маглі праўдзіва і збавенна верыць у Яго і належным чынам ушаноўваць Яго.

2. Прадвеснікі Аб'яўлення Божага — Адам, Ной, Аўраам, Майсей ды інш. Але ва ўсёй паўнаце і дасканаласці прынёс Аб'яўленне Божае на зямлю ўцялеснены Сын Божы, Госпад наш Ісус Хрыстос, і распаўсюдзіў яго па ўсім свеце праз Вучняў Сваіх і Апосталаў. Аб яго прышэсці ў Новым Запавеце гаворыцца:

Бог, які шматкротна і шматстайна прамаўляў здаўна да айцоў праз прарокаў, у апошнія дні прамаўляў да нас праз Сына, Якога прызначыў наследнікам усяго, праз Якога і вякі стварыў (Яўр. 1, 1-2).

Бога ніхто не бачыў ніколі: Адзінароны Сын, што ва ўлонні Айца, Той адкрыў (Ін. 1, 18).

Ніхто не ведае Сына, толькі Айцец: ні Айца ніхто не ведае, толькі Сын і каму Сын хоча адкрыць (Мф. 11, 27).

3. Чалавек можа спазнаць Бога, разглядаючы рэчы, створаныя праз Бога, але такое пазнанне бывае недасканалае і недастатковае і можа паслужыць толькі за падрыхтоўку да веры, або пэўны дапаможнік да пазнання Бога і Яго Аб'яўлення:

Святы Васіль Вялікі ў Пасланні 232 сказаў: «У разважанні аб веры ў Бога найперш прыходзіць думка, што Бог ёсць, — (думка), якая наведвае нас (якая ўзнікае) праз створаныя рэчы. Старанна разглядаючы створаны свет, мы пазнаем, што Бог Наймудрэйшы, Усёмагутны, Ласкавы; мы пазнаем таксама і ўсе Яго нябачныя ўласцівасці. Гэткім чынам, успрымаем Яго як Найвышэйшага Уладара. Паколькі Творца ўсяго свету — Бог, а мы складаем частку свету, значыць, Бог — таксама і наш Творца. За ўсведамленнем гэтага ідзе вера, а за гэтаю вераю — пакланенне». Такім чынам, існуе пэўная паслядоўнасць: думка — спазнанне трох уласцівасцей Бога: прынящце — вера — пакланенне.

б) натуральнае Аб'яўленне

Бог стварыў усё і адкрываецца нам, перш за ўсё, ва ўсім, што Ён стварыў: *Бо кожны дом будуецца кімсьці, а Той, хто ўсё стварыў — Бог (Яўр. 3, 4).* Нябачныя ўласцівасці Бога спасцігаюцца праз Яго творы: *бо нябачнае Яго, вечная сіла Яго і Боскасць, ад стварэння свету праз разважанне аб творах бачным робіцца (Рым. 1, 20).* А таксама: *Сам наглядае за ўсёй паднябеснай, ведаючы, што ўсё існае на зямлі створана Ім (Іоў, 28, 24-25).* Увесь свет — такая вялікая кніга, у якой чалавек можа чытаць аб Яго Творцы.

Увесь прыгожы 103 псалом праслаўляе Бога-Творцу: *Благаславі, душа мая, Госпада. Госпадзе, Божа мой, як магутна ўзвялічыўся Ты. У веліч і ў красу агарнуў сябе Ты. Ахінуўся святлом, быццам рызаю, распрасцёр неба, нібы намёт (Пс. 103, 1-2).* А таксама: *Як узвялічыліся справы Твае, Госпадзе! Усё мудра стварыў Ты! Стварэннямі Тваімі напоўнілася зямля (Пс. 103, 24).* На гэтую ж тэму пісаў і Васіль Вялікі.

Блажэнны Аўгусцін так апісаў свой дыялог з прыродай: «Аднойчы я захацеў даведацца, дзе і ў якім месцы знаходзіцца мой Бог. Спытаўся я ў зямлі: «Скажы мне, зямля, дзе мой Бог? Альбо ты — мой Бог?» І дала яна адказ і сказала: «Не я твой Бог». І усё, што на ёй, тое самае казала мне. Тады спытаўся я ў мора і ва ўсіх глыбінь і жывёлаў яго: «Дзе мой Бог?». І яны адказалі мне: «Не мы твой

Бог: шукай яго дзесь вышэй за нас». Спытаўся я ў ветра вольнага: «Дзе мой Бог?». І паветра з усімі насельнікамі яго сказала: «Не мы твой Бог». Спытаўся я ў неба, сонца, месяца і зораў, але гаворка ў іх была адна: «Не мы твой Бог, Якога ты шукаеш». Тады звярнуўся я да ўсіх прадметаў, якія назіраў, і сказаў ім: «Вы адказалі мне, што не вы мой Бог; што ж можаце вы сказаць мне аб Ім? І ўсе яны ў голас закрычалі: «Ён стварыў нас!».

Свяціцель Рыгор Багаслоў кажа: «Неба, зямля, мора, словам, — цэлы свет — гэта вялікая і найслаўнейшая кніга Божая, якая выразна сведчыць аб быцці Божым».

Уся прырода сведчыць аб быцці Божым і аб тым, што свет паўстаў не сам па сабе, паводле слоў Марка Тулія Цыцэрона (106–43 г. да н.э.), «калі б сусветны лад залежаў ад выпадку, тады можна было б чакаць і таго, што з кінутых на ўдачу літар складзецца летапіс».

Імя дару, атрыманаму ад Бога, — прырода. А імя чорнае няўдзячнасці — глупства.

Але, апрача знешняе прыроды, пра быццё Божае сведчыць сэрца чалавечае. Сумленне — гэта люстэрка, перад якім нельга схаваць ніводнае заганы. Гэта абвінаваўца, суддзя, сведка. У гэтага бліскучага старажытнага рымскага філосафа, прамоўцы, палітыка сустракаецца таксама згадка аб добрым сумленні як прычыне ўнутранага спакою і радасці. І сумленне карае чалавека за дрэнныя справы. Ён піша: «Калі нават нехта мяр-

кує, што ён надзейна адгароджаны і абаронены ад таго, каб яго выкрылі бліжнія, ён, тым не менш, баіцца вока багоў і перакананы ў тым, што дакор і неспакой, якія дзень і ноч точаць яго сэрца, насланыя багамі дзеля яго пакарання».

Пра натуральны маральны закон сумлення, які мелі таксама і язычнікі, апостал Павел кажа: *народы, што не маюць закону, па прыродзе законнае робяць, яны, законаў не маючы, самі сабе закон: бо выяўляюць рэчы законныя, напісаныя ў сэрцах сваіх, у суладным з імі сумленні, і між сабою думкамі абвінаваўчымі або апраўдальнымі (Рым. 2, 14-15).* Язычнікі — самі сабе закон.

Увесь сусвет, сумленне і чыстае сэрца сведчаць пра Бога. Аднак натуральнага Аб'яўлення недастаткова ў справе пазнання, бо нашы разважанні і высновы могуць быць памылковыя, як паказваюць натуральныя рэлігіі. Само па сабе пазнанне, гэтаксама, як адно толькі сэнсарнае і рацыянальнае спасціжэнне навакольнай рэчаіснасці, недасканалае і з'яўляецца толькі падрыхтоўкаю да веры. Так, глыбокі рускі паэт В. А. Жукоўскі лічыў, што філасофія, якая бярэ пачатак з аднаго толькі чалавечага розуму, памылковая. «Філасофскі Бог — гэта наш разумовы ідал, намі самімі створаны, і, пакланяючыся яму, мы пакланяемся самім сабе». Дапоўніць натуральную «кнігу» дадзена праз звышнатуральнае Аб'яўленне (Святое Паданне і Святое Пісанне), у якім Бясконцая Існасць спагадліва сыходзіць да немачы чалавечага духу.

в) звышнатуральнае Аб'яўленне

Божае Аб'яўленне праўд веры і маралі звышнатуральнае і дадзена праз Святое Паданне і Святое Пісанне, з адмоўнага боку — дзеля абмежаванасці прыроды чалавека і падзення ў грэх, са станоўчага боку — дзеля канчатковае мэты Божага наканавання — суразмоўя чалавека з Богам і дасягнення ім вечнага збавення. Рэлігія без звышнатуральнага Аб'яўлення немагчымая, бо пакланенне магчымае ў суразмоўі з Богам.

Хрысціянскае Божае Аб'яўленне прыносіць прасвятленне розуму. Звышнатуральнае Аб'яўленне — непасрэдная перадача Самім Богам чалавеку тых праўд веры і маралі, якіх чалавек або не ведаў, або недастаткова ўсведамляў і да яскравага ўяўлення аб якіх аніяк не мог узвысіцца ўласным розумам.

У хрысціянскім вучэнні змяшчаецца паўната Праўды, дадзеная Ісусам Хрыстом, Які казаў: *Я ёсць шлях, і праўда, і жыццё (Ін. 14, 6)*. Хрысціянская рэлігія дае прасвятленне розуму: *але гаворым Мудрасць Божую, у таямніцы схаваную, якую прадвызначыў Бог да пачатку вякоў дзеля славы нашае, а якую ніхто з князёў веку гэтага не разумее: бо каб разумелі, не ўкрыжавалі б Госпада славы. Але, як напісана было: чаго вока не бачыць, і вуха не чуе, і што да сэрца чалавеку не ўзыходзіла, тое наканаваў Бог тым, хто любіць яго. А нам Бог адкрыў Духам Сваім: бо Дух усё прасякае, і*

глыбіні Божыя (1 Кар. 2, 7-10). Свяціцеля Рыгора Багаслова вабілі чалавечыя веды Старажытнага свету, і ён нямала папрацаваў, вывучаючы навукі Усходу і Захаду, асабліва Афін. Аднак ён сказаў: «Але ўсе гэтыя веды, зрынуўшы далоў, паклаў я да стоп Хрыстовых, каб яны саступілі Слову вялікіга Бога, якое зацьмявае сабой усялякія звесткі і разнастайныя словы розуму чалавечага».

Існуюць два спосабы распаўсюджвання і захавання ў сапраўднай Царкве Божага Аб'яўлення:

– Святое Паданне;

– Святое Пісанне.

Святое Паданне — гэта вучэнне веры, Закон Божы, Таінствы і святыя абрады, гэта значыць, тое, што праўдзівыя вернікі, якія ўшаноўваюць Бога словам і прыкладам, перадаюць адзін аднаму, а продкі — нашчадкам. Царква — верная захавальніца Святога Падання.

Святое Пісанне — кнігі, напісаныя Духам Божым праз асвечаных ад Бога людзей, названых прарокамі і Апосталамі. Гэтыя кнігі называюцца Бібліяй, ад слова βιβλίον, што значыць «кніга», ужытага ў множным ліку: τα βιβλια. Св. Іаан Залатавусны тлумачыць гэтае слова як зборнае паняцце: «Біблія — гэта мноства кніг, якія ўтвараць адну адзіную». Св. Мікалай Сербскі мяркуе, што множны лік ужыты тут, перш за ўсё, не дзеля адлюстравання колькасці кніг, а дзеля таго, каб паказаць, што Біблія — гэта Кніга кніг, вяршыня пірамiды, складзенай з усіх кніг свету.

Біблія вядомая на працягу 1700 гадоў. Яна змяшчае 77 кніг, з іх 50 — Старога Запавету, 27 — Новага Запавету. Сярод кніг Святога Пісання ў Старым Запавеце кананічных — 39, некананічных — 11. Кананічныя кнігі напісаныя натхнёнымі Богам мужамі, некананічныя — асвечанымі Богам мужамі. Да кананічных кніг належаць кнігі законаў, гістарычныя і павучальныя. Кнігі законаў — гэта 5 кніг, напісаных прарокам Майсеем: Быццё, Выхад, Лявіт, Лічбы, Другазаконне. Гістарычнымі з’яўляюцца 9 кніг: Ісуса Навіна, Суддзяў, Руф, чатыры кнігі Царстваў і дзве кнігі Паралiпаменан [кнігі Летапісаў]. Павучальнымі кнігамі з'яўляюцца 5 кніг: Іова, Псалтыр, 3 кнігі Саламонавы: яго Прытчы, Эклезіяст і Песня Песняў. Да кніг Новага Запавету належаць: Евангелле чатырох евангелістаў — Мацвея, Марка, Лукі, Іаана, а таксама Дзеі святых Апосталаў, якія перадаюць Святую гісторыю Новага Запавету аб жыцці Хрыста і Яго Апосталаў. Таксама да Новага Запавету належаць: 21 павучальная кніга — Пасланні Апосталаў (Якуба — адно, Пятра — два, Іаана Багаслова — тры, Іуды — адно, Паўла — 14: да Рымлян, да Карынфян (два), да Галатаў, да Эфесцаў, да Філіпійцаў, да Каласян, да Салунян (два), да Цімафея (два), да Ціта, да Філімона і да Яўрэяў), а таксама адна кніга прароцтваў — Аб’яўленне Іаана Багаслова аб апошніх лёсах свету і чалавецтва да часу Другога Прыйсця Хрыста на зямлю і пасля Прыйсця.

г) Святое Паданне — найстаражытнейшы спосаб перадачы праўд Аб'яўлення

Ізраіль — абраннік Божы ад роду Сіфа. Сыны Ізраіля былі пакліканыя, каб несці свету, усім людзям праўду Божую аб прышэсці Хрыста на зямлю і будучым збавенні грэшнікаў. Могуць узнікнуць сумненні наконт сапраўднасці Святога Падання, г. зн. Божага Аб'яўлення праз Святое Паданне.

Прычыны захавання Падання ў тым выглядзе, у якім Бог адкрываў праўду:

1. Даўгалецце патрыярхаў Старога Запавету дазваляла захоўваць Аб'яўленне ў першапачатковым выглядзе. Так, Адам перадаваў Аб'яўленне ажно цераз сёмае пакаленне, і г. д. Інфармацыя скажаецца не ад працягласці часу, але ад колькасці асоб, праз вусны якіх перадаецца Паданне.

2. Патрыярхальны перыяд вызначаўся моцным гартам фізічных, душэўных і духоўных сіл. Людзі здольныя былі захоўваць вельмі вялікую колькасць ведаў. Непісьменны чалавек і зараз імкнецца запомніць тыя праўды, якія ён успрымае.

3. Але галоўная прычына — гэта Боскае Наканаванне, Якое не дапусціла скажэння Аб'яўлення і данесла да нашага часу нязменныя праўды Божага Аб'яўлення. Яны перадаваліся словам і прыкладам, калі малодшыя, назіраючы за дзеяннямі старэйшых, імкнуліся пераймаць гэтыя дзеянні і хоць-нехаць рабіліся носьбітамі часткі абрадавых знакаў.

Неабходнасць захавання Святога Падання адлюстраваная ў наступных выказваннях Бібліі: *На тым, браты, стойце, і трымайцеся падання, якому навучыцеся або словам, або пасланнем нашым (2 Сал. 2, 15).* А таксама: *Хвалю вас, браты, бо вы ўсё маё памятаеце, і трымаецеся падання, якое я вам перадаў (1 Кар. 11, 2).* А таксама: *Прарока пастаўлю над імі з асяроддзя братоў іх, як цябе: і ўкладу слова Маё ў вусны Яго, і будзе прамаўляць да іх, як накажу яму (Друг. 18, 18).* Тут нам даюцца вызначэнні крытэрыя сапраўднасці Падання, г. зн. яго адпаведнасці Святому Пісанню. Хрысціяне, якія адмаўляюць значнасць Святога Падання, паводзяць сябе неразумна.

Святы Васіль Вялікі тлумачыць неабходнасць Святога Падання тым, што калі мы адмовімся ад яго, дык тым самым сказім Евангелле, усё Святое Пісанне і змарнуем казанне Апосталаў.

Святы Дыянісій Арэапагіт згадвае, у сувязі з абгрунтаваннем неабходнасці Святога Падання, пра жагнанне — знак Крыжа, пра малітву на Усход, пра Хрышчэнне праз трохразовае занурэнне ў ваду, пра памазанне алеем, пра паслядоўнасць выканання чыну Еўхарыстыі, кажучы, што ўсё гэта ўзята не з напісанага, але з пераказанага з пакалення ў пакаленне.

Сам Хрыстос ў паўнаце і дасканаласці ўвасобіў прарочае служэнне. У Новым Запавеце гаворыцца аб Прарочым, Святарскім і Царскім служэнні Хрыста наступнае:

Бо справы, якія даручыў мне Айцец, каб выканаў іх, тыя справы, якія Я раблю, сведчаць аба Мне, што гэта Айцец Мяне паслаў (Ін. 5, 36).

Бо слова Божае жывое і дзейснае, і вастрэйшае за ўсякі меч двусечны, і пранiклівае аж да падзелу душы і духа, суставаў і мазгоў, і судзіць думкі і намеры сэрца (Яўр. 4, 12).

Галоўная мэта Святога Падання — захаванне сапраўднае веры і падрыхтоўка народу Божага да прыняцця Месіі.

Боганатхнёнасць Святога Пісання азначае яго звышнатуральнасць: усе кнігі Бібліі былі напісаныя мужамі-абраннікамі Божымі пад непасрэдным кіраўніцтвам Святога Духа. Адзнакі боганатхнёнасці Бібліі: адны прысутнічаюць у самім Святым Пісанні, іншыя крыюцца ў чалавечым розуме.

VI. ПРЫКМЕТЫ БОГАНАТХНЁНАСЦІ БІБЛІІ, АБО СВЯТОГА ПІСАННЯ

1. Сведчанні з самога Святога Пісання

Па-першае, аб боганатхнёнасці Бібліі сведчаць прарокі. Чытаючы Святое Пісанне, мы знойзем сведчанні аб тым, што іх вуснамі прамаўляе Госпад Усеўладны. Майсей быў коснаязыкі, і Госпад абяцаў раскрыць яму вусны, каб людзі чулі, што кажа Бог. Госпад сказаў Майсею: *і цяпер ідзі, і Я*

раскрыю вусны твае і зраблю табе так, каб ты гаварыў як належыць (Вых. 4, 12). Прарок Давід сказаў: *Дух Гасподні гаворыць ува мне, і Слова Яго на языку маім (2 Цар. 23, 2).* Прарок Ісая напісаў: *Так гаворыць Бог: у спрыяльны час адказаў Я табе (Іс. 49, 8).* А таксама: *калі ж і забудзе іх жанчына, дык Я не забуду цябе, кажа Госпад (Іс. 49, 15).* Бог прамаўляў таксама праз прарока Малахію ды іншых прарокаў.

На Святое Пісанне спасылаецца і Сам Хрыстос. Хрыстос — гэта жывая Праўда. Ён ставіўся з вялікай пашанаю да Кнігі Божае, падзяляў веру ў яе боганахнёнасць і выкрываў кніжнікаў і фарысеяў у памылковым стаўленні да Слова Божага, прыпісваў яму вечнасць: *парушаючы Слова Божае наказам вашым (Мк. 7, 13),* казаў аб беспамылковасці праўд Пісання: *калі Ён назваў багамі тых, да якіх было Слова Божае, дый не можа быць парушана Пісанне (Ін. 10, 35),* а таксама: *не думайце, што прыйшоў Я парушыць закон або прарокаў: не парушыць прыйшоў Я, але выканаць. Бо сапраўды кажу вам: пакуль не праміне неба і зямля, аніводная ёта, аніводная рыса не праміне з закону, пакуль не здзейсніцца ўсё (Мц. 5, 17-18).* А таксама: *Калі б верылі вы Майсею, верылі б і Мне: бо пра Мяне ён пісаў (Ін. 5, 46).* А таксама: *Праверце ў Пісаннях, калі вы думаеце мець праз іх жыццё вечнае: і яны сведчаць пра Мяне (Ін. 5, 39).* Гэтыя выказванні Хрыста сведчаць пра тое, што Слова Божае было для яго неабвержным аўтарытэтам.

Ісус Хрыстос — не складальнік, а прадмет Святога Пісання. Святое Пісанне павінна было гаварыць пра Яго, але не быць напісаным праз Яго. Хрыстос пытаўся ў Сваіх вучняў: *хто, вы кажаце, Я ёсць? (Мц. 16, 15)?* Ён быў пасланы абвясціць Ласку і Праўду Словам Сваім: *Дык ідзіце, навучайце ўсе народы, хрысцячы іх у імя Айца, і Сына, і Святога Духа (Мц. 28, 19).*

Пра боганатхнёнасць Пісання сведчаць таксама Апосталы. Апостал Пётр казаў: *Не паводле волі даецца людзям прароцтва, але, ад Святога Духа асвечаныя, гавораць святыя Божыя людзі (2 Пят. 1, 21).* Пра тое самае і словы апостала Паўла: *Усякае Пісанне Богам натхнёнае і карыснае для вывучэння, для выкрыцця, для выпраўлення, для пакарання, для настаўлення ў праведнасці (2 Цім. 3, 16).*

2. Меркаванні чалавечага розуму

Меркаванні чалавечага розуму азначаюць магчымасць пазнаваць асаблівыя якасці, уласцівыя Святому Пісанню. Пры гэтым з сутнасці вучэння, змешчанага ў Бібліі, і з яе ўнутраных якасцяў, якія адрозніваюць яе ад усіх кніг, створаных чалавекам, вынікае сведчанне яе звышнатуральнага паходжання. Гэта наступныя ўласцівасці Біблії: вышыня выкладзенага ў Біблії вучэння; чысціня сапраўднага Слова Божага; прароцтвы — адзнака сапраўднасці Слова Божага; цуды; магутнае ўздзеянне Слова Божага на сэрцы чалавечыя.

а) вышыня выкладзенага ў Бібліі вучэння;

У зямных уроках мы дакранаемся да найвышэйшых праўд (Быцця Божага, Анёльскага свету, стварэння свету і чалавека і г. д.). Звяртаючыся да іх, Біблія гаворыць пра самыя ўзнёслыя рэчы зразумела, празрыста і дакладна. І невыпадкова Айцы Царквы параўноўваюць кнігі з ракою, якую лёгка пераходзіць ягня і купаецца ў ёй. Тут вялікае мноства фактаў, ведаў, думак, і ўсё звязана адной думкаю — аб Хрысце, Крыж Якога — гэта цэнтр сусвету. Хрыстос — цэнтр Святога Пісання, уся Біблія звязаная адзінай ідэяй — аб Збаўцы. Чалавечы розум прыхозіць да высновы аб Боскасці Бібліі праз параўнанне яе з найлепшымі творамі чалавечага розуму, якое прыводзіць да думкі, што Біблія не толькі трымае першынство сярод кніг чалавечых, але што гэта — Кніга звышчалавечая паводле вышыні выкладзенага ў ёй вучэння.

Святое Пісанне вылучае на першае месца лепшыя якасці чалавечай асобы, каб падрыхтаваць чалавека да пераходу па той бок створанага свету. Вучэнне, выкладзенае ў Бібліі, абараняе немаўлят, што маюць Заступніка на Небе, які лямантуе пры парушэнні зямное справядлівасці; яно пакрывае міжвольных парушальнікаў закону, даруе тым, хто каецца, ратуе тых, хто шукае збавення: *Гаспадары, праўду і роўнасць рабам выказвайце, ведаючы, што і вы маеце Госпада на небе* (Кал. 4, 1).

Біблія была напісаная рознымі аўтарамі, у розных умовах, дзеля розных мэт, і, тым не менш, змест яе ўяўляе сабою адзінае цэлае. Як дзіўна звязаныя кнігі, хоць напісаныя яны (77 кніг) у розныя часы. Паміж імі да 1700 гадоў: Майсей пісаў за 1600 гадоў да Р. Х., Апосталы ж — праз 100 гадоў пасля Р. Х. Падобнага адзінства зместу кніг мы не сустрэнем у ніводнай літаратуры ніводнага народа. Чым растлумачыць паўнату, маналітнасць, адзінства Бібліі? — Тым, што Аўтарам Святога Пісання з'яўляецца Бог. Святы Дух пісаў праз пасрэдніцтва натхнёных Богам Айцоў, праслаўляючы іх. Гэта адзіная маналітная кніга, хоць аўтары асобных частак Святога Пісання часта нічога не ведалі адзін пра аднаго. Глыбіня думкі ў Бібліі выкладзеная з упэўненнасцю і прастатой, нібыта гаворыцца пра простыя праўды. У ёй няма нічога выпадковага, лішняга.

б) чысціня сапраўднага Слова Божага

Усе лепшыя сярод лепшых чалавечых твораў ставяць на першае месца знешні дабрабыт, матэрыяльнае шчасце. Хоць матэрыяльныя даброты не з'яўляюцца нейкім злом, яны стаяць ў шэрагу іншых даброт і таксама патрэбныя, але галоўнае для чалавека — добры стан яго душы. Галоўная мэта ў кнігах Божых — развіць найлепшыя якасці чалавека, падрыхтаваць яго да Неба і вечнасці: *але ўслед за Святым, што паклікаў вас, і самі*

святыя ва ўсім жыцці будзеце. Таму што напісана: святыя будзеце, бо Я ёсць святы (1 Пят. 1, 15-16).

Чалавечыя творы не пазбаўленыя недахопаў і патураюць чалавечым заганам. Гэта дакладна прасочваецца ў творах старажытных мысліцеляў. Напрыклад, Платон (427–347 гг. да н. э) дасягнуў высокай ступені маральнага жыцця, але ў творы «Ідэальная дзяржава» ён кажа, што трэба забіваць нездаровых дзяцей, і чым раней, тым лепш. Арыстоцель (384–322 гг. да н.э.) лічыў: «Як можна адчуваць любоў да рабоў, нявольнікаў?» і г. д. Рымскія законы, «узор справядлівасці», прыраўноўвалі забойства раба да забойства хатняе жывёлы, тады як Слова Божае кажа нікім не пагарджаць, але ўсіх любіць. Хрыстос кажа: *Глядзіце, каб не пагарджалі ніводным з гэтых малых: бо кажу вам, што Анёлы іх на небе заўсёды бачаць аблічча Айца Майго Нябеснага (Мц. 18, 10),* а таксама: *а калі хто спакусіць аднаго з гэтых малых, што вераць у Мяне, лепш бы яму было, каб павесілі жоран млынарскі на шыю яму і ўтапілі ў бездані марской (Мц. 18, 6).* Высокія маральная падставы, выкладзеныя ў Слове Божым, прызнаюць нават ворагі Слова Божага, якія часта пасля знаёмства з Бібліяй робяцца гарачымі прыхільнікамі вучэння Хрыста. Адрозненні кніг Святых і чалавечых пераконвалі людзей ў сапраўднасці Пісанняў.

в) прароцтвы — прыкмета сапраўднасці Слова Божага;

Прадказанні, зробленыя на падставе чалавечых меркаванняў, якія грунтуюцца на веданні навук, законаў прыроды і грамадства, не з'яўляюцца прароцтвамі. Гэта прадказанні астранома, якія грунтуюцца на веданні законаў нябеснае механікі. Тое самае можна сказаць пра прадказанні лекара, падставаю якіх служыць веданне медыцыны. Прадказанне кіраўніка дзяржавы грунтуецца на добрым веданні законаў развіцця чалавечага грамадтва.

Прароцтвы Святога Пісання зусім іншыя, чым ў свецкіх узорах прыродазнаўчых навук і філасофіі. Да прароцтваў належаць прадказанні не столькі аб заканамерных падзеях, колькі аб выпадковых, якія маглі быць, а маглі і не быць, або здарыцца іншым разам. Яны вядомыя не чалавечаму розуму, а толькі Богу і адбываюцца паводле Яго волі.

Гэта прароцтвы Старога і Новага Запавету аб жыцці Хрыста, Яго Прыйсці, месцы і часе Нараджэння, Пакутах, смерці, Уваскрасенні, Узнясенні. Святы Юстын Філосаф кажа: «… якім чынам паверылі б мы Чалавеку Укрыжыванаму, што Ён Першынец ненароджанага Быцця Божага і будзе чыніць Суд над усім родам чалавечым, калі б не знаходзілі мы сведчанняў, прадказаных аб Ім перш, чым Ён прыйшоў і зрабіўся Чалавекам, і калі б не бачылі, што менавіта так і адбылося, гэта значыць, што зямля іудзейская спустошаная, што

людзі з усяго свету паверылі ў Яго праз вучэнне Апосталаў Яго» («Гутарка з іудзеем Трыфанам»).

У Псалмах 21 і 68 даецца яскравае прароцтва аб Месіі — поўны і падрабязны вобраз Крыжовае пакуты і смерці Ісуса Хрыста. Так у псалме 21 прадказаныя словы ўкрыжаванага Хрыста: *Божа, Божа мой, выслухай мяне, навошта пакінуў Ты мяне; далёка ад выратавання майго словы грэшнага ляманту майго (Пс. 21, 2).*

Што ж гэта за Месія, якога гэтак чакалі яўрэі і, тым не менш, не толькі не прынялі, але і ўкрыжавалі? Пра гэта говорыць французскі натураліст Б. Паскаль: «Іудзеі, забіваючы Хрыста, каб не прызнаваць Яго за Месію, даказалі тым самым у апошні раз, што Ён — Месія, працягваючы Яго не прызнаваць, яны сталі бездакорнымі сведкамі сапраўднасці Месіі. І забіваючы, і працягваючы выракацца Яго, яны выконвалі прароцтва». Яўрэі, якія ўкрыжавалі Хрыста і дагэтуль яго не прынялі, зрабіліся нявольнымі выканаўцамі прароцтва: *А ўсё гэта здарылася, каб збылося сказанае Госпадам праз прарока, які гаворыць: вось, Дзева ва ўлонне прыме і народзіць Сына, і назавуць Яго імем Эмануіл, што значыць: з намі Бог (Мц. 1, 22-23).*

г) цуды

У прароцтвах прадказваюцца не толькі выпадковыя, але і дзівосныя будучыя падзеі, якія залежаць выключна ад волі Божае. Рацыяналісты

не вераць у цуды і спрабуюць знайсці для іх рацыянальнае тлумачэнне. Аднак цуд — гэта Божы знак, што перамагае на пэўны час законы прыроды, які павінен пераканаць чалавека ў Боскім паходжанні Аб'яўлення. Калі не верыце Мне, дык паверце справам Маім, — кажа Хрыстос: *бо Я сышоў з нябёсаў здзейсніць не волю Маю, але волю Айца, што паслаў Мяне (Ін. 6, 38).* Тыя цуды, якія тварыў Хрыстос, — надзвычайныя.

Законы, якія ствараюць падставу сусветнага ладу, нельга перайначыць, але можна на кароткі час перамагчы іх моц нашымі абмежаванымі сіламі. Тым больш гэта магчыма для Госпада. Свет адкрыты для любога дзеяння Божага. Госпад можа зрабіць любы цуд — з любові Яго да людзей і свету. Усялякі цуд не парушае сутнасць таго або іншага закону, а толькі на пэўны час перамагае яго моцаю асаблівае Божае волі на тое. Напрыклад, прыйсце на зямлю Ісуса Хрыста: *А ўсё гэта здарылася, каб збылося сказанае Госпадам праз прарока, які гаворыць: вось, Дзяўчына ва ўлонне прыме і народзіць Сына, і назавуць Яго імем Эмануіл, гэта значыць: з намі Бог (Мц. 1, 22-23).* У адным з царкоўных спеваў, прысвечаных Уцялесненню Сына Божага, гаворыцца: «Бо калі Бог захоча, перамагаецца натуральны парадак». Гэта значыць: Бог, калі захоча, перамагае натуральныя законы, г. зн. змяняе тое, што прадыктавана законамі прыроды, прасторы і часу. Гэта і ёсць цуды, якія не паддаюцца рацыянальнаму вытлумачэнню.

Шмат хто дзівіцца з незвычайных Божых здольнасцей, пра якія напісана ў Боскім Пісанні, Старым і Новым запавеце, у іншых Царкоўных гісторыях, — гаворыць ў сваіх яскравых казаннях іераманах Сімяон Полацкі. Яны даюцца Богам за цнатлівае жыццё і дасканаласць веры ў Бога. Сапраўды, *дзіўны Бог у святых Сваіх, Бог Ізраілеў (Пс. 67, 36),* бо «надзвычайную моц, якая пераўзыходзіць натуру ўсіх стварэнняў і ўласцівая толькі Яму, надаючы Сваім угоднікам, творыць праз іх цуды, вартыя захаплення, якія пераўзыходзяць і чалавечы, і Анёльскі розум. Гэтаксама, як матэрыяльнае сонца, асвятляючы сваімі залатымі праменнямі чыстае люстэрка, пасяляецца ў ім адбіткам сваім і перадае яму свае праменні, каб яно магло асвятляць усё астатняе, так і Спрадвечнае Сонца, Найлітасцівейшы Госпад, калі знаходзіць чыстую, як люстэрка, душу, асяляецца ў ёй ласкаю Сваёю, паводле Свайго непадманнага абяцання: *калі хто любіць Мяне, слова Маё выконвае: і Айцец Мой палюбіць яго, і Мы да яго прыйдзем і створым у Ім жытло (Ін. 14, 23).* А знаходзячыся ў такім чалавеку, Ён творыць праз яго звышнатуральнае і выяўляе Сябе праз дзівосы сярод святых Сваіх. Ён адзін толькі мае моц тварыць цуды, а са слабых людзей робіць дужых, каб яны маглі тварыць цуды, дзеля ўмацавання сапраўднай веры і іх дабрачыннага жыцця» (Сімяон Полацкі. «Вячэра душэўная» СПб, 2011).

д) магутнае ўздзеянне Слова Божага на сэрцы чалавечыя

Біблія прыпадабняецца да моцы двусечнага мяча ва ўздзеянні на душу і дух чалавека. Няма іншай такой кнігі, якая б гэтак яскрава выявіла чалавека, яго розум, яго пачуцці, яго волю, якая пакарыла б столькі народаў і гэтак доўга аказвала б уплыў на ўсё чалавецтва. Вучэнне Біблii было абвешчана па ўсім свеце: *дзякую Богу майму праз Ісуса Хрыста за ўсіх вас, што вера ваша абвяшчаецца па ўсім свеце (Рым. 1, 8).* Сапраўднасць вучэння была выказаная Словам, справамі і думкамі: *Я ж маю сведчанне большае за Іаанава: бо справы, якія даручыў Мне Айцец, каб выканаў іх, тыя справы, што Я выконваю, сведчаць аба мне, што гэта Айцец Мяне паслаў (Ін. 5, 36).*

Біблія мае дзівосную прачулую моц. І яна ўмее суцяшаць у смутную часіну, гадаваць у дабры і найвышэйшай мудрасці, калі чалавек распачынае яе вывучэнне з чыстым сэрцам. На ёй збываюцца словы апостала Пятра: *Сказаў жа Ісус дванаццацярым: можа і вы хочаце сысці? Адказаў яму Сымон Пётр: Госпадзе, да каго мы пойдзем? Ты маеш словы жыцця вечнага (Ін. 6, 67-68).*

Шматлікія рацыяналісты, якіх не пераканалі цуды, спрабавалі знайсці слабыя месцы ў Бібліі. Ніводную кнігу так не пераследвалі, але аб яе, маўляў аб тую скалу, разбіваюцца ўсе негатыўныя пачынанні. Напачатку супраць вучэння ўзброіліся

ўсе і ўсім: мудрацы і філосафы — розумам і пяром; валадары і самі рымскія імператары — агнём і мячом; жрацы і чэрнь — лютай ярасцю і злобай, паклёпам і кпінаю. Аднак Біблія мае дзівосную жыццяздольнасць: *Бо слова Божае жывое і дзейснае, і вастрэйшае за ўсякі меч двусечны, і праніклівае аж да падзелу душы і духа, суставаў і мазгоў, і судзіць думкі і намеры сэрца (Яўр. 4, 12).*

Архіепіскап і прафесар-хірург Лука (Война-Ясянецкі) сказаў: «Праўдзівая навука і сапраўдная рэлігія, якою з'яўляецца Біблія, не супярэчаць адна адной. Рэлігія супярэчыць не навуцы, а нашым ведам (і прыкладным уяўленням) аб прыродзе. Але паміж Акрыцом і самой прыродай супярэчнасці няма і не можа быць, таму што Бог з'яўляецца Творцам іх абедзвюх» (Дух, душа і цела. «Навука і рэлігія», 2001).

Вучоныя, пісьменнікі і паэты шмат разоў выказваліся наконт велічы Святога Пісання і яго вучэння:

Зняможаны ў быцці суровым
Не раз сабе знаходзіў я
Ў гучанні Адвечнага Слова
Спатолю й крыніцу жыцця *(І. З. Нікіцін).*

Марнеюць усе зямныя сілы,
Калі ўз'юшыцца жыццё,
І нас, нібыта на краю магілы,
Цяжар страшэнны гне, маўляў трысцё.

Вось у гадзіну гэткую з любоўю
Пра Кнігу тую спамяні,
І ўсёй душой, нібы да ўзгалоўя,
Ты прыпадзі і адпачні *(Ф. І. Цютчаў).*

«Кніга гэтая (…), як рака цудоўная: плыткая — па ёй ягня брысці можа, а глыбокая — што і слон плаваць мусіць» *(Ф. Скарына).*[1)]

«Ёсць кніга, у якой усё сказана, усё вырашана, пасля якой ні ў чым няма сумневу, кніга несмяротная, святая, кніга вечнай праўды, вечнага жыцця — Евангелле. Увесь прагрэс чалавецтва, усе поспехі ў навуках і ў філасофіі заключаюцца толькі ў большым пранікненні ў таямнічую глыбіню гэтай Боскай Кнігі… Падстава Евангелля — акрыццё праўды праз любоў і ласку» *(В. Р. Бялінскі).*

«У любым ўзросце і пры розных абставінах я вяртаўся да чытання Евангелля, і кожны раз яго змест апускаў на душу спакой і лагоду» *(А. І. Герцэн).*

«Госпадзе! Што за кніга гэтае Св. Пісанне, якое дзіва і якая моц, дадзеныя ў Ім чалавеку!… І колькі таямніц, вырашаных і адкрытых! Люблю кнігу гэтую! Загібель народу без Слова Божага, бо прагне душа Яго Слова і ўсялякага адчування харства» *(Ф. М. Дастаеўскі).*

«Новы Запавет — гэта найлепшая кніга, якую калі-небудзь ведаў або будзе ведаць свет» *(Ч. Дыкенс).*

---

1) Уведзена перакладчкам.

«І што гэта за кніга, Біблія! Велічная і агромністая, як свет, яна сягае карэннем глыбінь Сусвету і ўздымаецца да таямнічага блакіту нябёсаў!… Сапраўды — гэта існае Слова Божае, тады як усе іншыя кнігі свету выяўляюць толькі сваё чалавечае мастацтва». А таксама: «Вы добра робіце, што шукаеце супакаення ў Евангеллі, бо гэта невычэрпная крыніца ўсялякае праўды, якой розум нідзе ў іншым месцы не знойдзе» *(Г. Гейнэ).*

«Слова Бібліі напаўняе мяне захапленнем, святасць Евангелля прамаўляе да майго сэрца. Зірніце на кнігі філосафаў, наколькі нікчэмныя яны перад Бібліяй. Хіба магчыма, каб такая дзівосная і разам з тым простая кніга была вынікам рук чалавечых?» *(Ж-Ж. Русо).*

Геалогія і палеанталогія бліскуча пацвердзілі парадак стварэння свету, выкладзены ў Бібліі: «Паслядоўнасць, у якой выводзяцца істоты арганічнага паходжання, складае дакладную паслядоўнасць шасці дзён стварэння свету, як нам яе прадстаўляе кніга Быцця» *(А. Фехнер).*

3. Як чытаць Святое Пісанне

Госпад — гэта Таямніца хрысціянскай рэлігіі. Ён адкрыў Сябе немаўлятам, схаваўшы Сябе перад мудрымі і разумнымі.

Што ж трэба, каб чытанне Святога Пісання прынесла нам карысць? Неабходна настроіць сябе, бо перад намі ляжыць Кніга Божая. Грэх пераш-

каджае разуменню Святога Пісання. Пачынаць чытанне трэба з асаблівай увагаю, чыстаю душою і чыстым целам, пераажагнаўшыся. Раскрываць Святое Пісанне належыць, маючы пэўную мэту — умацаваць сябе ў веры, ачысціць ад граху, узвысіць маральнасць.

Існуе тры спосабы вытлумачэння цёмных месцаў Святога Пісання:

– з кантэксту, высвятляючы незразумелыя месцы з папярэдніх месцаў раздзела;

– чытанне паралельных месцаў, са звяртаннем увагі на спасылкі, дзе ўказваюцца аналагічныя месцы;

– зварот да сабарнага розуму, тлумачэнняў Святых Айцоў на кнігі Бібліі (Поўны збор твораў Іаана Залатавуснага ў 12 тт.; Творы бл. Ераніма ды інш.).

Святое Пісанне паказве, што вучэнне аб Богу, выкладзенае ў Старым Запавеце, было канчаткова дапоўненае хрысціянствам.

VII. ХРЫСЦІЯНСКАЕ ВУЧЭННЕ ПРА ЧАЛАВЕКА. ЗМЕСТ ХРЫСЦІЯНСКАГА ЖЫЦЦЯ

1. Мэта чалавечага быцця

Шчасце чалавека — вось мэта стварэння чалавека, каб не толькі Бог адчуваў шчасце, але і створаны Ім чалавек. І з гэтым пагаджаюцца ўсе

праявы чалавечае думкі, усе натуральныя рэлігіі — і гэтая згода заключаецца ў слове «шчасце».

Акрэсленне мэты чалавечага быцця — галоўная задача хрысціянскае рэлігіі і вучэння. Людзі імкнуцца да шчасця як да жыццёвае мэты, але разумеюць шчасце па-рознаму. Яго шукалі ў матэрыяльным дабрабыце, у цялеснай раскошы, ва ўладзе, у навуках, у ведах. Усё натуральнае прыемнае для чалавека, прыносіць яму здавальненне. Але *якая ж бо карысць чалавеку, калі ён здабудзе ўвесь свет, але змарнуе сваю душу (Мц. 16, 26)?*

Мудрэц старога закону, які шукаў шчасце паўсюль, усё паспытаў і пераканаўся на ўласным досведзе: *Я бачыў усе рэчы, зробленыя пад сонцам: і вось – усё марнасць і пагоня за ветрам (Экл. 1, 14).* Гэта значыць: усё марнота марнот у бачным свеце, а сапраўднае шчасце і сэнс быцця чалавека — гэта яго пабожнасць і выкананне Запаведзяў Божых, дзякуючы чаму адбіваецца ў нас адлюстраванне святасці і дасканаласці Бога, як адлюстраванне сонца ў вадзе. Мэта жыцця можа ажыццявіцца толькі праз дзейнае прыпадабненне да Бога.

Шчасце немагчыма ўявіць без маральнай дасканаласці. Бог — крыніца нашага шчасця. Бл. Аўгусцін у «Споведзі» кажа: «Ты, Божа, стварыў нас для Сябе Самога». Ён — крыніца нашага жыцця і мэта нашых імкненняў. Выкананне евангельскіх пачаткаў — веры, любові і праўды — наканаванае

тут, на зямлі — у часовым жыцці, а працяг удасканальвання чакаецца ў жыцці тагасветным.

Ажыццяўленне евангелькіх пачаткаў — веры, праўды і любові — пакладае пачатак дасканаласці тут, на зямлі, у часовым жыцці, працяг ўдасканальвання адбываецца ў наступным.

Сапраўднае шчасце залежыць ад нашай дасканаласці. Шляхам маральнага ўдасканальвання мы набліжаемся да Бога, шляхам рэгрэсу аддаляемся ад Бога, ад ласкі Божае, ад шчасця, ад найвышэйшае асалоды, ад крыніцы жыцця і святла. Бог — канчатковая мэта нашага ўдасканальвання, і гэты працэс бясконцы. Госпад гаворыць у Старым Запавеце: *будзеце святыя, як святы Я, Госпад (Ляв. 1, 45),* а таксама ў Новым Запавеце: *Будзьце ж вы дасканалыя, як дасканалы Айцец ваш Нябесны (Мц. 5, 48).*

Мэта жыцця — гэта падрыхтоўка да вечнасці, але праз гэта зусім не адмаўляецца значэнне часовага жыцця, а наадварот, сцвярджаецца. Яму надаецца сэнс, якім звязваецца цяг зямнога жыцця з вечным, бо часовае жыццё без вечнага, — зямля без неба, — страчвае ўсялякі сэнс для дасканалага чалавека, здольнага мысліць і адчуваць. Інакш чалавек разважае так: будзем піць і есці, бо заўтра памрэм. Чалавек створаны для Славы Божае. Мэту і сэнс быцця мы павінны знаходзіць не ў нас саміх, не ва ўласным эгаізме, пачуццёвай асалодзе, а ў жыцці дзеля Славы Божае, для праслаўлення Бога шляхам добрых спраў, выканання запаведзяў

Божых. Усё створанае — цудоўнае. І самае цудоўнае — чалавек, бо створаны ён не так, як усе бачныя часткі сусвету, якія з'яўляюцца сведкамі ўсёмагутнасці Божай, але чалавек адзначаны святлом Святой Тройцы, і ў яго ўдыхнуў Бог подых жыцця. І неадлучная ад чалавека любоў да Творцы, што стварыў чалавека — да Бога, Які стварыў нас дзеля шчасця, дзеля найвышэйшае асалоды. Гэта будзе магчыма, калі мы дасягнем духоўнага містычнага адзінства з Богам. Св. Ігнат (Бранчанінаў) у сваім нарысе хрысціянскай антрапалогіі «Слова пра чалавека» (СПб, 2005), на падставе Святога Пісання і твораў Святых Айцоў сцвярджае, у якасці асноўнай, ідэю аб тым, што чалавек — гэта храм. Яго прызначэнне — асвячанасць, напоўненасць Святым Духам, інакш гэты «слоўны» храм робіцца прытулкам сіл зла — дэманаў. Трэцяга не дадзена.

К. М. Сільчанкоў, цудоўны рускі багаслоў, нібыта пра сённяшнія дні напісаў з глыбокай скрухаю словы аб забыцці чалавекам свайго духоўнага свету, аб аднабаковым служэнні целу, калі вышэйшыя патрэбы чалавечага духу тлумяцца і парушаюцца, і чалавек апускаецца да ўзроўню звычайнай жывёліны. Хіба пра сучаснага чалавека мы не можам сказаць словамі З. М. Сільчанкова: «Паўсюль у гэтым свеце бачыць ён бязрадасную, забойчую пустку: старыя ідэалы разбітыя і ўтаптаныя ў бруд, новыя — не выснаваныя, пэўнай жыццёвай мэты ў іх няма, тых надзей, той веры,

якія раней саграваліі чалавецтва і так упрыгожвалі яго жыццё, ён ужо больш у сабе не знаходзіць, а ў гэтай пустцы губляе для сябе ўсялякія падставы жыватворная чалавечая любоў» (Новая Запаведзь. СПб, 1999, с. 319).

У «Развітальнай гутарцы Збавіцеля з Вучнямі» ў словах Госпада аб параўнанні Яго з вінаграднай лазой, а людзей з галінамі, асаблівая ўвага звяртаецца на захаванне чалавекам, у лучнасці з Ім, уласнай свабоды; у іх цудоўна адлюстроўваецца ўзаемадзеянне свабоднай волі чалавека і Божай ласкі. Калі чалавек поўнасцю пакладаецца на Божую дапамогу, Божая ласка асвятляе яго, ачышчае ад граху: «Абяцанне магутнасці бязмежнай з'яўляецца цяпер нібыта ўзнагародаю за безумоўную залежнасць галін ад сапраўднае лазы. Чалавек папярэджваецца аб яго поўным, абсалютным бяссіллі да самастойнай і незалежнай добрай дзейнасці, ад яго вымагаецца безумоўнае адрачэнне ад прывіду ўласнае моцы, усеагульная і поўная падданне сябе пад кіраванне Хрыстовае і ўплыў сіл дабратворных, і за гэта абвяшчаецца і ўказваецца тая вышыня магутнасці і сілы, на якую ён пры гэтым узыходзіць. Лаза сапраўдная поўніцца бязмежжам сіл Божых, што і адлюстроўваецца ў жыцці кожнай асобнай яе галіны: мера атрыманых ад яе сіл залежыць ужо толькі ад самой галінкі, ад яе здольнасці да іх успрыняцця». (СПб, 1997, с. 252).

2. Паняцце аб граху

Жыццё чалавека страчвае ўсялякі сэнс, калі ўчыняецца грэх. Грэх перашкаджае суразмоўю з Богам, парушае гармонію быцця.

Грэх бярэ свой пачатак ад д'ябла: *Хто робіць грэх, той ад д'ябла, бо найперш д'ябал грашыць (1 Ін. 3, 8).* Гэта д'ябальская сіла, гэта беззаконне: *Кожны, хто ўчыняе грэх, і беззаконне ўчыняе, і грэх ёсць беззаконне (1 Ін. 3, 4).* Як толькі чалавек учыняе ў думках свавольства, ён адразу ж уваходзіць у супярэчнасць з самім сабой, з навакольнымі людзьмі, з Богам.

Грэх — гэта найцяжэйшае зло, прычына пакут, плачу, няшчасцяў. Грэх атручвае ўсю нашу істоту. Як толькі грэх праточваецца ў свядомасць, ён адразу ж увозіць чалавека ў супярэчнасць з самім сабой, з навакольным светам, з Богам і даводзіць яго да смерці. Грэх з'яўляецца прычынай шматлікіх хвароб і самой смерці: *грэшнікаў смерць лютая (Пс. 33, 22).* Смерць — царыца жаху — страшная для кожнага чалавека, і тым больш — для грэшніка, бо душа адлучылася ад Бога і ў момант смерці адчувае, што павінна з'явіцца перад бесстароннім Суддзёй і даць адказ за ўсе свае правіны. Тады душа грэшніка адчувае страшныя душэўныя пакуты і згрызоты, і нават блізкія былі б радыя, каб такі чалавек памёр.

Усё жыццё павінна быць накіраванае да выкаранення граху. Каб ачысціць сябе ад гра-

ху, чалавек павінен памятаць пра збавенне, якое адбываецца не без нашага стараннага ўдзелу.

3. Паняцце аб збавенні

Збавенне — гэта маральнае адраджэнне чалавека, які абмежаваны і сапсаваны грахом, бо ў нас жыве іншы закон, які ваюе супраць закону розуму: *іншы закон у суцёгнах маіх, які ваюе супраць закону розуму майго (Рым. 7, 23).* Але збавенне складаецца не толькі з вызвалення ад граху, але і са здабыцця для сабе святасці, ласкі Святога Духа, каб заўжды адчуваць у сабе чысціню душы і цела, каб здзерці з сябе грэшнага, цялеснага, старога чалавека і апрануцца ў чалавека новага: *калі хто не народзіцца вадою і духам, не можа ўвайсці ў Царства Божае (Ін. 3, 5).* Без маральнага адраджэння Царства Божае прынесла б чалавеку пакуты, а не шчасце, бо ў душы яго не было б нічога роднаснага з дабротамі Царства Божага.

Таму чалавек павінен прыкладаць намаганні, каб ачысціцца ад граху, але адных чалавечых высілкаў недастаткова. Свабода, якую мы маем, павінна быць накіраваная намі насустрач волі Божай. Неабходная дапамога Божае ласкі: *адкласці вам, разам са старымі звычкамі, чалавека старога, які тлее ў спакуслівых жаданнях, абнавіцца ж духам розуму вашага і апрануцца ў новага чалавека, створанага паводле Бога, у праведнасці і святасці праўды (Эф. 4, 22-24).* Усё гэта магчыма

толькі ў Царкве, дзе жыве ласка Божая. І ўсё, што мае ў сабе Царква, служыць толькі адной мэце — збавенню чалавека і апрананню яго ў шаты святасці і чысціні. Ласка Божая перадаецца Царквою ў абрадах, малітвах, таінствах, чытанні Слова Божага, спевах, што павінна спрыяць перамозе чалавека над грахом.

VIII. ПРА ВЕРУ

Агульна пра сімвал веры

Сімвал веры — кароткі і дакладны выклад хрысціянскага веравучэння.

Сімвал веры паўстаў у IV стагоддзі і быў складзены падчас двух першых Сусветных Сабораў. Да гэтага існавалі Антыяхійскі, Іерусалімскі, Рымскі ды інш. Сімвалы веры Памесных цэркваў, падобныя між сабой і блізкія па духу, адрозніваліся толькі ў рэдакцыі.

Сусветны Сабор — гэта сход пастыраў і настаўнікаў хрысціянскай Кафалічнай Царквы для зацвярджэння сапраўднага вучэння і дабрапрыстойнасці сярод хрысціян. Усяго адбылося сем Сусветных Сабораў: 1) Нікейскі — у 325 г., 2) Канстанцінопальскі 1-ы — у 381 г., 3) Эфесскі — у 431 г., 4) Халкідонскі — у 451 г., 5) Канстанцінопальскі 2-гі — у 553 г., 6) Канстанцінопальскі 3-ці — у 680–681 гг., 7) Нікейскі 2-гі — у 787 г.

Ісус Хрыстос надаваў вялікую вагу азначэнням Царквы і лічыў, што той, хто іх парушае, будзе пазбаўлены ласкі Божай, як язычнік: *Скажы Царкве, а калі і Царкевы не паслухае, няхай будзе ён табе як язычнік і мытнік (Мц. 18, 17).* Правіла склікання Сабораў наследуе прыклад Апосталаў, якія склікалі Сабор у Іерусаліме (Дзеі 15). У тыя часы шырока абмяркоўвалася, ці трэба вымагаць ад язычнікаў поўнага выканання суровага Майсеева Закону. У прыватнасці, востра паўстала пытанне абразання; замест яго прапаноўвалася прыняцце Хрышчэння (Дзеі 15).

У IV стагоддзі можна было адкрыта вызнаваць веру, і да гэтага часу распаўсюдзілася ерась арыянства. Арый не хацеў прызнаваць, што Сын Божы роўны Айцу, і вучыў, што Ён — найабсалютнейшае, найвышэйшае стварэнне Божае. У 325 годзе на Першы Сусветны Сабор у Нікею з'ехаліся 318 Айцоў Царквы. Паводле сведчання блажэннага Тэадарыта, ва ўсіх Айцоў былі сляды катаванняў, гэта быў з'езд пакутнікаў. Яны разгледзелі вучэнне Арыя і прапанавалі яму зрачыся яго. Тут яны выпрацавалі Нікейскі Сімвал веры, які складаўся з сямі частак.

Неўзабаве з'явілася ерась Македонія — Першасвятара Канстацінопальскай Царквы, які зводзіў Святы Дух да службовага духу. У 381 годзе ў Цараградзе, або Канстанцінопалі, на Другім Сусветным Саборы яго заклікалі да пакаяння. Тады былі складзеныя 8 – 12 часткі Сімвалу

веры, і ён пачаў называцца Нікея-Канстанцінопальскім.

У Царкве няма нічога неабгрунтаванага. Святыя Айцы кіраваліся імкненнем пераадолець супярэчнасці ў Першаснай Царкве.

Сімвал веры складаецца з 12 частак:

1. Пра Бога, Творцу свету.
2. Пра Ісуса Хрыста, Сына Божага.
3. Пра Уцялесненне.
4. Пра пакуты і смерць.
5. Пра Уваскрасенне.
6. Пра Узнясенне.
7. Пра Другое Прыйсце
8. Пра Святую Тройцу.
9. Пра Царкву.
10. Пра Хрышчэнне.
11. Пра будучае ўваскрасенне.
12. Пра жыццё вечнае.

Сімвал веры

(1) Веру ў адзінага Бога Айца, Усеўладнага, Творцу неба і зямлі, усяго бачнага і нябачнага.

(2) І ў адзінага Госпада Ісуса Хрыста, Сына Божага, Адзінароднага, народжанага ад Айца спрадвеку: Святло ад Святла, Бога сапраўднага ад Бога сапраўднага, народжанага, не створанага, адзінаіснага з Айцом, праз Якога ўсё сталася.

(3) Ён дзеля нас, людзей, і дзеля нашага збаўлення сышоў з Нябёсаў, і прыняў цела ад Духа Святога і Дзевы Марыі, і стаўся чалавекам.

(4) І быў ўкрыжаваны за нас пры Понцкім Пілаце, і пакутаваў, і быў пахаваны.

(5) І ўваскрос на трэці дзень, паводле Пісання.

(6) І ўзышоў на неба, і сядзіць праваруч Айца.

(7) І прыйдзе са славаю судзіць жывых і мёртвых, Яго ж Царству не будзе канца.

(8) І ў Духа Святога, Госпада, жыццядайнага, Які зыходзіць ад Айца, Якому нароўні з Айцом і Сынам пакланенне і слаўленне належаць, Які вяшчаў праз прарокаў.

(9) У адзіную Святую, Саборную і Апостальскую Царкву.

(10) Вызнаю адзінае хрышчэнне дзеля збаўлення ад грахоў.

(11) Чакаю ўваскрасення мёртвых.

(12) І жыцця будучага веку. Амін.

1-я частка Сімвалу веры. Пра Бога — Творцу свету

Веру ў адзінага Бога Айца, Усеўладнага, Творцу неба і зямлі, усяго бачнага і нябачнага.

Першая частка Сімвалу веры ўмацоўвае веру ў Бога Айца, Усеўладнага Творцу. У ёй гаворыцца пра Бога, Яго ўласцівасці і справы. Бог Адзіны па-

водле Сутнасці (1 Кар. 8, 4) і Траісты ў Асобах (Мц. 28, 19). Паводле Божага Аб'яўлення, Бог ёсць Вечны Дух (Пс. 89, 3), Уселітасцівы (Пс. 144, 8-9), (Аб'яўл. 4, 8), (Мц. 19, 17), Усёведны (1 Ін. 3, 20), Усяправедны (Пс. 10, 7), Усёмагутны (Пс. 32, 9), (Пс. 32, 9), (Лк. 1, 39), Усюдыісны (Пс. 138, 7-12), Нязменны (Пс. 101, 27-28), Самадастатковы (Дзеі, 17, 25), Найласкавейшы (Пс. 144, 8-9).

1. Вера і пабожнасць

Вера — гэта страх Божы, дар Божы, моц Божая. Гэта ўласцівае нам прыроджанае пачуццё, якім прасякнутае ўсё наша ўнутранае жыццё, і калі яго ўмацоўваць, на шляху прыпадабнення да Бога адбываецца ўнутранае духоўнае містычнае яднанне з Богам. Неабходна мець цвёрдую перакананасць веры ў Бога, Яго ўласцівасці і дзеянні, Яго Быццё. У адваротным выпадку мы нічога не зможам зразумець. Наша сэрца з'яўляецца вокам разумення, і калі яно хворае, дык, па аналогіі, яно не можа бачыць Бога.

Усё жыццё хрысціяніна — гэта вынік глыбокага рэлігійнага пачуцця; вера як дар не хаваецца ў нашым сэрцы, але праз учынкі, унутраныя рухі душы абавязкова праявіць сябе вонкава. Калі ў нас ёсць пачуццё любові да кагосьці, мы заўсёды выяўляем яго ў якіх-небудзь учынках. Усе цноты, усе знешнія прыкметы міласэрнасці — гэта вынік глыбокіх рэлігійных перажыванняў чалавека. Калі

мы робім добрыя справы, Бог адкрывае Сябе настолькі, наколькі мы здольныя бачыць духоўныя прадметы. Існаванне Бога — гэта праўда, бачная сама сабой для існага хрысціяніна, і душа, асабліва ачышчаная ад граху, бачыць Бога: *Шчаслівыя чыстыя сэрцам (Мц. 5, 8).* Пра Бога гаворыць натуральнае Аб'яўленне, якое прыводзіць да Веры, а за ім — звышнатуральнае Аб'яўленне, якое не шукае Бога, але ад пачатку і да канца прасякнутае непадважнасцю праўды існавання, або быцця Божага. Нявер'е — гэта недахоп розуму ў адносінах да Бога. Асабліва ў цяжкія хвіліны жыцця чалавек можа выказаць адсутнасць веры. Таму нам павінна быць уласціва толькі дзейная вера, і найбольш блізкім дзеяннем нашае веры з'яўляецца яе вызнанне, каб ані праслед, ані спакуса, ані страх смерці, ані цкаванне, ані пакуты не змаглі б прымусіць хрысціяніна зрачыся веры. *Бо сэрцам верыцца ў праўду, вуснамі ж вызнаецца дзеля збавення (Рым. 10, 10).* А таксама: *бо ад перапоўненасці сэрца гавораць вусны (Лк. 6, 45).* Сапраўды, чым жыве наша сэрца, пра тое гавораць і вусны, і справы, і ўчынкі, і ўсё жыццё. Калі штосьці не знаходзіць месца ў нашым сэрцы, а належыць толькі да розуму, тады мы і не вызнаем гэтага, так ці інакш.

Азначэнне веры можна даць і са знешняга, вытлумачальнага гледзішча. Розумам мы пазнаем менш, тады як праз веру ўсё можам спазнаць. Вера — галоўная крыніца пазнання. Праз веру мы можам спасцігнуць тое, што знаходзіц-

ца па-за межамі спасціжэння. Вера патрэбная таму, што *без веры немагчыма дагадзіць [Богу] (Яўр. 11, 6).* Толькі сапраўдная хрысціянская вера здавальняе ўсе патрэбы чалавечага духу. Перад кожным разумным чалавекам паўстаюць пытанні аб прычыне пачатку і канца, аб зле, аб правіне, дый іншыя пытанні, і адказ на іх даюць дагматы хрысціянскага веравызнання.

Сусвет большы за рэгулярныя геаметрычныя фігуры на бязлюднай выспе, якую быў бы рады ўбачыць чалавек разумны, і таму такую радасць павінна ўсяляць у чалавека жыццё!

2. Адзінабожжа

Апостал Павел, пабачыўшы ў Афінах розныя ахвярнікі і сляды пакланення, у адным месцы ў цэнтры Афін убачыў вялікі ахвярнік. Апостал зрабіў выснову аб набожнасці афінян і, гледзячы на надпіс, сказаў: *дык Таго, каго, не ведаючы, вы (пабожна) ушаноўваеце, я і абвяшчаю вам (Дзеі 17, 23).* г. зн. «таго Бога невядомага, якому вы пакланяецеся, я і прапаведую вам».

Калі ў Сімвале веры гаворыцца: «Веру ў адзінага Бога Айца», дык тым самым выражаецца прызнанне адзінаўладдзя, бо там, дзе ўладаў шмат, там бязладдзе: *няма іншага Бога, апроч Бога Адзінага (1 Кар. 8, 4).* А таксама: *Я першы і я апошні, апроч Мяне няма Бога (Іс. 44, 6).* Толькі адзінабожжа стварае цэласнае адзінства: *Слухай,*

Ізраіль! Госпад Бог наш ёсць Госпад адзіны! (Друг. 6, 4). Чаканне прыходу Адзінага Бога выказанае ў словах прарока: *Вось Я пасылаю Анёла Майго, і падрыхтуе шлях перада Мною: і нечакана прыйдзе ў Царкву Сваю Госпад, Якога вы шукаеце, і Анёл Запавету, якога вы прагнеце: вось Ён, ідзе, кажа Госпад Усеўладны (Мал. 3, 1).*

Прападобны Іаан Дамаскін у сваёй кнізе «Дакладны выклад праваслаўнае веры» гаворыць: «Мы пад словам *Святы Божа* разумеем Айца, не толькі Яму самому надаючы імя Боства, але ведаючы, як Бога, і Сына, і Духа Святога. І пад словам *Святы Моцны* разумеем Сына, не пазбаўляючы Айца і Духа Святога моцы. І слова *Святы Несмяротны* адносім да Святога Духа, не адымаючы ў Айца і Сына несмяротнасці, але адносна кожнай з Асоб, прымаючы ўсе Божыя імёны проста і незалежна, і верна». Пра гэта сказана ў Пасланнях апостала Паўла: *няма іншага Бога, апрача Адзінага. Бо, хоць і ёсць так званыя багі, ці на небе, ці на зямлі: паколькі багоў шмат і паноў шмат, — але ў нас адзіны Бог Айцец, з Якога ўсё, і мы ў Яго, і адзіны Госпад Ісус Хрыстос, праз Якога ўсё, і мы праз Яго (1 Кар. 8, 4-6),* і адзіны Дух Святы, у Якім усё, і мы — у Ім. А таксама: *Бо ўсё з Яго і праз Яго і ў Ім. Яму слава на вякі. Амін (Рым. 11, 36).*

Калі адзінабожжа існуе шмат у якіх рэлігіях, дык аб Траістасці, апроч хрысціянства, не ведае ніводная з іх.

3. Траістасць Божых Асоб

Бог адзіны паводле Сутнасці, але траісты ў Асобах: Айцец, Сын і Дух Святы — Тройца Адзінасутная і Непадзельная. Траісты дагмат адрознівае хрысціяніна ад вернікаў іншых рэлігій. У хрысціянскай рэлігіі ён з'яўляецца галоўным, і на ім грунтуецца ўсё багаслоўскае веравучэнне. Паводле Траістага дагмату, тры Асобы адкрытыя найбольш выразна ў Новым Запавеце: Бог-Айцец, Бог-Сын і Бог-Дух Святы. Асабістая ўласцівасць Айца — яго Бацькоўства, або ненароджанасць; Сына — адвечнае нараджэнне ад Айца; Духа — адвечны зыход ад Айца. Кожная з Боскіх Асоб валодае непадзельна ўсімі Божымі дасканаласцямі, таму яны — тры Асобы аднаго Бога.

Будучы асноўным, гэты дагмат адначасова з'яўляецца самым недасяжным для разумення. Тут усё незразумелае: што такое адвечнае нараджэнне? што такое адвечны зыход? Тут захоўваецца прынцып падпарадкавання, бо народжаны ніколі не можа быць роўны таму, хто яго нараджае. Але адначасова Бог-Айцец і Бог-Сын раўназначныя і тоесныя. Той, хто зыходзіць, не роўня таму, хто нараджае, і, тым не менш, у Тройцы Яны — адзіныя.

Калі гаворыцца пра Бога ў Старым Запавеце, нярэдка ўжываецца множны лік. Аб трох Асобах у Старым Запавеце гаворыцца не наўпрост, але спакрыёму. У першым радку Бібліі словы «бара Элагім» — імя Божае стаіць у множным

ліку («Багі»), хоць дзеясловў, які звязаны з ім — у адзіночным. Першасная Рада была Радаю Святой Тройцы, і тады было сказана: *... створым чалавека паводле вобразу Нашага і падабенства Нашага (Быц. 1, 26),* што нельга аднесці да рэштак політэізму або рады Бога з Анёламі. Тое самае і пасля выгнання чалавека: *І сказаў Бог: вось, Адам стаў як адзін з Нас, хто ведае дабро і зло (Быц. 3, 22).* Перад рассяленнем людзей пасля будаўніцтва Вавілонскай вежы: *і сказаў Госпад: (...) дык пойдзем, і як сыдзем, памяшаем там мовы іх, каб не разумеў ніхто голасу бліжняга [свайго] (Быц. 11, 6-7).* Ва ўсіх гэтых выпадках гаворка ідзе пра Раду паміж роўнымі.

Указанні на траістасць Асоб Бога можна выявіць у з'яўленні Бога перад Аўраамам: *і з'явіўся перад ім Бог ля дубровы Мамрыйскае, калі сядзеў ён апоўдні перад уваходам да намёту свайго. Узняў ён вочы свае, і вось, тры мужы стаяць перад ім (Быц. 18, 1-2),* а таксама ў прарока Ісаі, які бачыў Славу Божую і чуў Яго голас, калі Ён казаў: *каго пашлю, і хто пойдзе да гэтых людзей (Іс. 6, 9),* а таксама бачыў і чуў Серафімаў, якія гукалі адзін аднаму: *Святы, Святы, Святы Госпад Усеўладны: напоўнілася ўся зямля славаю Яго (Іс. 6, 3).*

Пракакам Давідам сказана ў псалме: *Словам Гасподнім нябёсы ўмацаваныя, і Духам вуснаў Яго ўся сіла іх (Пс. 32, 6).* Тут згадваюцца ўсе тры Божыя Асобы: *Словам* — другая Асоба Святой Тройцы,

Господнім — першая Асоба Святой Тройцы, *Духам вуснаў Яго* — трэцяя Асоба Святой Тройцы.

У Новым Запавеце Бог наўпрост, без ніякага прыкрыцця выявіў траістасць Боскіх Асоб: *дык ідзіце, навучайце ўсе народы, хрысцячы іх ў імя Айца і Сына і Святога Духа (Мц. 28, 19).* У Апакаліпсісе ёсць услаўленне Бога: *Святы, Святы, Святы Госпад Бог Усеўладны, Які быў, і ёсць, і будзе (Аб'яўл. 4, 8).* Святая Тройца — Айцец, Сын і Святы Дух — непасрэдна аб'явілася свету пры Хрышчэнні Госпада Ісуса Хрыста, што адбылося 6/19 студзеня.

4. Недасяжнасць Бога для розуму

Побач з праўдаю быцця Божага існуе другая праўда — недасяжнасць Яго істоты для спасціжэння. Бог вялікі і незразумелы. Істота Божая вышэй за ўсе веды не толькі чалавека, але і Анёлаў. Пра невымоўныя шляхі Божыя гаворыць апостал Павел у Пасланні да Рымлян: *О, глыбіня багацця і найвышэйшае мудрасці і розуму Божага! Якія недасяжныя прысуды Яго і недаследаваныя шляхі Яго! (Рым. 11, 33).*

Госпад заўжды прыкрываў сваю перавагу або пад выглядам Анёльскім, або пад чалавечым, літуючыся з нашае немачы. *Бо Бога ніхто не бачыў ніколі: Адзінародны Сын, што быў ва ўлонні Айцовым, Той адкрыў (Ін. 1, 18).* А таксама: *Ніхто не ведае Сына, толькі Айцец; ані Айца ніхто не*

ведае, толькі Сын, і каму Сын хоча адкрыць (Мц. 11, 27).

Сутнасць Божая не паддаецца спасціжэнню:

- з прычыны абмежаванасці нашае прыроды;
- з прычыны недаступнасці Яго быцця;
- з прычыны абмежаванасці нашага цела.

Але, з іншага боку, мы ведаем пра Бога тое, што Ён Сам адкрыў аб Сабе для таго, каб мы маглі належна і збавенна верыць у Яго. Так, псалом 21 дакладна прадказвае Пакуты Хрыстовыя: *Божа, Божа мой, пачуй мяне, навошта пакінуў Ты мяне; далёка ад выратавання майго словы грэшнага ляманту майго (Пс. 21, 2).*

Усё, што адбываецца ў Царкве, у шырокім разуменні з'яўляецца Таінствам. Гэта сустрэча Бога з чалавекам і яднанне з Ім. У кожным Таінстве ёсць бачны бок – паслядоўнасць чынаў, гэта значыць словы і дзеянні ўдзельнікаў, «рэчыва» Таінства (вада ў Хрышчэнні, хлеб і віно ў Еўхарыстыі), але ёсць і нябачны бок — духоўнае пераўтварэнне і адраджэнне чалавека, дзеля якога выконваецца ўся паслядоўнасць чынаў. Еп. Іларыён (Алфееў) піша: «У Таінствах ласка Божая сыходзіць на нас і асвячае ўсю нашу існасць — і душу, і цела, — далучаючы яе да існасці Божае, ажыўляючы, абагаўляючы і адраджаючы да жыцця вечнага. У Таінствах мы атрымліваем вопыт Неба і прадчуваем Царства Божае, да якога далучыцца цалкам, г. зн. увайсці ў яго і жыць у ім, магчыма толькі пасля смерці». У Таінствах праз нябачныя зна-

кі нябачна сыходзіць на чалавека ласка Святога Духа.

5. Духоўная сутнасць Бога

Бог ёсць Дух, гэта значыць, Істота бесцялесная, духоўная, Якая мае любоў, розум і свабодную волю: *Дух (ёсць) Бог: і той, хто кланяецца Яму, павінен кланяцца духам і праўдаю (Ін. 4, 24),* а таксама: *Бо Госпад ёсць Дух, а дзе Дух Гасподні, там свабода (2 Кар. 3, 17).* Толькі духоўнае можа быць дасканалым і адлюстроўваць уласцівасці Божыя.

Але ў Святым Пісанні Богу прыпісваюцца і цялесныя члены, што належыць разумець у духоўным сэнсе. Так, сэрца Божае азначае Дабрыню, або Любоў Божую, вочы і вушы — Усёведанне, рукі — Усёмагутнасць. Святое Пісанне прыстасоўваецца да звыклай чалавечай мовы. Антрапамарфізм[1] Старога Запавету не дагматычны. Богу толькі ўмоўна прыпісваюцца тыя або іншыя часткі цела. За гэтымі апісаннямі крыецца сапраўднае стаўленне Бога да Свайго стварэння. Вобразнасць увогуле ўласцівая яўрэйскай мове: напрыклад, гаворачы пра вечнасць Бога, Давід выкарыстоўвае выраз: *Бо тысяча год перад вачыма Тваімі, Госпадзе, як дзень учарашні (Пс. 89, 5).* Апрача таго, чалавеку, які мае цела, уласціва, гаворачы пра духоўныя прадметы, выкарыстоўваць

---

[1] Вучэнне, паводле якога Бог мае вобраз чалавека.

вобразы і сімвалы. У Новым Запавеце Бог проста называецца Духам.

Указанні на тое, што набліжаецца час, калі пакланенне Богу не будзе прывязана да якога-небудзь канкрэтнага месца, а стане паўсюдным, азначае, што Бог ёсць неабмежаваны Дух.

Уяўленне пра Бога як пра Духа падводзіць чалавека да высновы, што мэта яго жыцця таксама духоўная. Бог Дух валодае абсалютнай дасканаласцю, а супярэчлівая чалавечая існасць вызначаецца раздвоенасцю жаданняў. Таму мэта маральнага ўдасканальвання чалавека — рух да Бога. Калі чалавек ідзе шляхам маральнага ўдасканальвання, тады ён набліжаецца да Бога, прыпадабняецца да Яго.

6. Усёведанне Божае

Прадметам Божага ведання з'яўляецца ўсведамленне Сваёй прыроды. Мы не ў стане прасякнуць у Яго ўласцівасці ўласным розумам. Бог ведае Уласную Існасць, гэта значыць, яму ўласцівая самасвядомасць. Чалавек называецца разумнай істотай толькі таму, што ён мае самасвядомасць. Адсутнасць самасвядомасці зводзіць чалавека да шэрагу немых жывёл. Наша самасвядомасць недасканалая, яна развіваецца, бо чалавек праходзіць стадыі маладосці, сталасці, звятчэння. Самасвядомасць Бога ад веку да веку сталая і незнішчальная.

Апрача таго, Богу ўласцівае веданне свету рэчыўнага, гэта значыць, усёй створанай прыроды.

Ён ведае ўсю існую натуру, і ўсё названа Ім тымі або іншымі імёнамі.

Па-трэцяе, Ён ведае ўсё, што адбываецца ў свеце маральным, свеце свабодных разумных істот, у нашай душы і сэрцы. Прадметам Боскага ведання з'яўляецца наш маральны свет: *Бог большы за сэрца нашае (1 Ін. 3, 20).*

Бог ведае выпадковае і неабходнае, бо ў Богу ўсё, без выключэння. Богу вядомае мінулае і будучыня, выпадковае і абавязковае. Так, праз прарока Малахію Бог прадракае слаўнае Другое Прыйсце Хрыста: *Гэта Я пашлю да вас Іллю Фесвіцяніна, перад прыйсцем дня Гасподняга, вялікага і светлага (Мал. 4, 5).* Псалмапевец звяртаецца да Бога, якому вядомыя думкі чалавека і шлях яго жыцця: *Ты разумееў задумы мае здалёк: сцяжыну маю і повязі мае прасачыў Ты і ўсе шляхі мае прадбачыў (Пс. 138, 2-3).*

Веданне Богам будучых вольных чалавечых дзеянняў называецца прадбачаннем. Кожнаму з нас Ён ад веку наканаваў тое або іншае. Прадбачанне — гэта веданне, але не сіла; гэткім чынам мы таксама можам прадбачыць учынкі і падзеі з нашымі блізкімі і сябрамі, але мы не ў стане іх змяніць, нам даступна толькі назіраць за імі, пакутаваць або радавацца. Боскае прадбачанне не адымае ў нас свабоды, бо прадбачанне — гэта веданне, але не сіла, не прычына падзей. «Не таму што-небудзь неабходнае збываецца, што Бог прадбачыць, але таму і прадбачыць Ён, што так збу-

дзецца», — гавораць Святыя Айцы. Магчымасць прадбачання Божага звязаная з тым, што для Бога няма будучыні, а ёсць толькі цяперашнасць.

7. Праўда Божая

У псалме гаворыцца: *Бог справядлівы і любіць праўду, праведнікі ўгледзяць Аблічча Яго (Пс. 10, 7).* Праўда Божая адзіная, але праяўляецца двума шляхамі:

- праўда, дадзеная ў законе — будучы самай дасканалай істотай, Бог хоча, каб мы прыпадабняліся да Яго, і таму Ён дае нам маральны закон, закон сумлення, напісаны на нашых сэрцах, і гэтым шляхам мы павінны ісці;
- праўда, адмераная па заслугах — будучы ўсёмагутным, Бог патрабуе выканання гэтага закону ўжо тут, на зямлі. Пакуты сумлення — гэта праявы праўды, адмеранай па заслугах, але канчаткова дакорлівы голас сумлення зважыць заслугі кожнага з нас у дзень Другога Прыйсця Гасподняга, ва ўсёй сіле праявіцца Суд праўды, адмеранай па заслугах.

За выкананне натуральнага закону, або сумлення, Бог узнагароджвае душэўным спакоем, цішынёй. Праўда, адмераная па заслугах, патрабуе выканання праз згрызоты, дакоры сумлення. Гэта страшнае пакаранне. Гэткім чынам ужо на зямлі Бог адплачвае грэшнікам за іх грахі. Гаворачы аб правасуддзі Божым, апостал Павел кажа, што Бог

адмерае кожнаму паводле спраў яго (Рым. 2, 6) і што *Бог не зважае на асобы (Рым. 2, 11).*

Часам згадваюць пакуты праведнікаў і шчасце грэшных. Гэта толькі знешнія праявы жыцця праведнікаў і грэшнікаў, бо пры знешняй немачы і пакутах мы не ведаем, якія радасці і шчасце адчуваюць яны, і наадварот, ў больш-менш нармальных умовах не ведаем, якія дакоры сумлення могуць тачыць душы.

8. Усёмагутнасць Божая

Усёмагутнасць Божая выяўляецца ў тым, што Бог выконвае ўсё, што заўгодна Яму, без аніякай цяжкасці і перашкоды. Сапраўдны ўсёмагутны Бог *— шчаслівы і адзіны моцны, Цар цароў і Уладар уладароў (1 Цім., 6, 15).*

Усёмагутнасць вызнае Сам Госпад і не раз гаворыць: *Я Бог Усёмагутны (Быц. 17, 1),* без ніякага вагання *не страціць моцы ў Бога ніводнае слова (Лк. 1, 37).* Размаўляючы з фарысеямі і садукеямі, Іаан Хрысціцель кажа: *і не думайце казаць сабе: «бацька ў нас Аўраам»; бо кажу вам, што можа Бог з гэтага камення ўзнесці дзяцей Аўрааму (Мц. 3, 9).* Усёмагутны Бог можа і з каменя зрабіць чалавека.

Усёмагутнасць Божая найбольш яскрава выяўляецца ў стварэнні сусвету. Мы чытаем па днях тое, што адбывался паводле адзінага Слова Божага: *Сказаў Ён — і сталася: загадаў Ён — і стварылася*

(Пс. 32, 9). Усёмагутнасць Божая выяўляецца заўжды і ў клопаце пра стварэнні, і асабліва яскрава — у цудах, якія здзяйсняюцца з пэўнай мэтай.

Усёмагутнасць Божая мае маральны характар. Яна заключаецца не ў тым, каб рабіць усё, што захочацца чалавеку, а ў тым, што Бог можа ажыццявіць усё, што заўгодна волі Яго. Калі ж Бог не выконвае тое, што Яму не міла, дык Ён выказвае праз гэта і Сваю сілу і моц, а не слабасць і бяссілле.

9. Усюдыіснасць Божая

Чым большую здольнасць да самастойнага быцця маюць істоты, тым больш падпарадкоўваюць яны сабе прастору і тым менш залежаць ад яе. Сярод стварэнняў найбольшай усюдыіснасцю вызначаюцца прадстаўнікі Анёльскага свету.

Усюдыіснасць Божая характарызуе прасторавую неабсяжнасць. Паводле Давіда, у імгненне вока можна і ўзляцець на неба, і сысці ў пекла, і ў глыбіні прасторы, але паўсюль мы знойдзем прысутнасць Божую: *Куды пайду я ад Духа Твайго; і ад Аблічча Твайго куды я ўцяку? Калі ўзыду на неба, Ты там ёсць, або калі сыду ў пекла, Ты там ёсць. Калі пазычу я крылы ў зары і перасялюся за край мора, і там рука Твая пакіруе мной, і ўтрымае мяне правая рука Твая. Калі скажу я: Можа, цемра схавае мяне? Але і цемра — святло ў асалодзе маёй. Бо не азмрочыцца цемра праз*

Цябе, і ноч асвеціцца, нібы дзень: як цемра яе, так і святло яе (Пс. 138, 7-12).

Бог Увесь ва ўсім і разам з тым па-за ўсім і над усім. Нельга думаць, што Бог адной часткаю Сваёй Істоты знаходзіцца ў адным месцы, а іншай часткаю — у іншых месцах; гэта не так. Ён Увесь ува ўсім, і разам з тым ні з чым не звязаны і па-над усім. Свет стварэнняў мае канец, але Бог вышэй за ўсе стварэнні.

Бог паўсюль, але ў Нябёсах і ў святынях Яго прысутнасць асаблівая. Госпад дае пазнаць Сябе жыхарам неба і ў Нябёсах пачуццёвым шляхам. У храме Ён дае пазнаць Сябе духоўным вокам, і асабліва — сапраўдным хрысціянам у Таінстве Прычасця. На Небе Ён дае пазнаць Сябе настолькі, наколькі гэта магчыма для нашай прыроды. У царкве Ён такама дае пазнаць сябе настолькі, наколькі гэта магчыма, скрушнаму сэрцу, і гэта добра ведаюць тыя простыя, шчырыя сэрцам людзі, якія моляцца ў храмах і часам больш ведаюць пра Бога, чым тыя, хто скончыў багаслоўскія школы і дакрануўся да Божых праўд адным толькі розумам. Ісус Хрыстос гаворыць: *Бо там, дзе двое або трое сабраліся ў імя Маё, там Я ёсць сярод іх (Мц. 18, 20).*

10. Нязменнасць Божая

Усё ў свеце існуе, калі ёсць на тое адпаведныя ўмовы, але калі яны знікаюць, дык знікаюць, ма-

леюць, знішчаюцца і стварэнні. Існуюць умовы — і квітнеюць расліны, знікаюць умовы — знікаюць і кветкі. Можа змяніцца і ўвесь створаны сусвет, які разбурыцца або сальецца, але Бог застаецца заўжды: *Усе яны загінуць, а Ты застанешся (...) Але Ты — такі самы, і гады Твае не скончацца (Пс. 101, 27-28).* Апостал Якуб піша, што *ад Айца светаў (...) няма змены ані ценю (Як 1, 17),* гэта значыць у Богу няма змены, і нават ценю змены.

Усё, што ёсць на свеце, — не вечнае, усё змяняецца, але Бог знаходзіцца па-за часам, Ён — вечная, не падуладная зменам Існасць. *Я ёсць Альфа і Амега, пачатак і канец, кажа Госпад, ёсць, і быў, і буду, Усеўладны (Аб'яўл. 1, 8).*

Св. Рыгор Багаслоў так гаворыць пра нязменнасць Боства: «Боства не падлягае пераўтварэнням і зменам, бо няма нічога такога, што было б лепшае за Яго і ў што Ён мог быператварыцца». Нязменнасць Бога — гэта вынік яго самабытнасці, бо Бог заўжды той самы. Быццё Бога — гэта поўны выраз Яго сутнасці. Яно заўсёды роўнае свайму ўнутранаму зместу. Мяняцца могуць адносіны паміж Богам і светам, Богам і чалавекам («вонкавая зменлівасць»).

11. Самадастатковасць і найвышэйшае шчасце Божыя

Бог усім дае ўсё, а Сам нічога ні ад каго не патрабуе: *ані ад рук чалавечых дагаджэння не*

прымае, быццам патрабуючы што-небудзь, а Сам дае ўсім жыццё і дыханне, і ўсё (Дзеі 17, 25).

Бог — Найдабрэйшы Творца сусвету. Ён дорыць стварэнням столькі даброт, колькі трэба дзеля іх шчасця: *Шчодры і ласкавы Госпад, шмат цярплівасці і літасці ў Ім. Добры Госпад для ўсіх, і шчодрасць Ягоная ва ўсіх справах Яго (Пс. 144, 8-9).*

Сам Ісус Хрыстос казаў: *ніхто не добры, толькі Бог Адзіны (Мц. 19, 17).* Бясконцая дабрыня, або любоў Божая да стварэнняў, складае Яго сутнасць. Апостал Іаан гаворыць: *Бог ёсць любоў (1 Ін. 4, 16).* У псалмапеўца Давіда гаворыцца: *поўня весялосці перад Абліччам Тваім: прыгажосць у руцэ тваёй правай да сканчэння дзён (Пс. 15, 11).* У Богу знаходзіцца крыніца ўсялякага быцця. Поўня даброт перад тварам Божым — вынік абсалютнае Божае дасканаласці.

Бог найшчаслівейшы, і той, хто набліжаецца да Яго, адчувае найвышэйшае шчасце. З цягам часу знікаюць умовы для падтрымання нашага жыцця. Паколькі гэта адбываецца з намі тады, калі побач расце і ўбіраецца ў поўную моц і расквітае маладое пакаленне і чэрпае звонку ўсе неабходныя да таго ўмовы, зразумела, што прычына старэння арганізму, усіх душэўных і фізічных сіл закладзена ўнутры, і ёсць магчымасць нейкім чынам паўплываць на гэты працэс, гэта значыць, пры разбурэнні цела павялічыць у сабе духоўную і маральную дасканаласць.

Пасля грэхападзення чалавека агарнула злосць, яму пачалі дакучаць напасці і розныя беды, і тым не менш, ён усё ж такі адчувае і стан шчасця. Ад злога сэрца сыходзяць злыя думкі, а той, каму выпала доля шчасця, толькі дабра жадае наваколь-наму свету. Праз грэх чалавечая прырода трапіла ў ненармальны стан, інакш бы яна прыносіла больш даброт і радасцяў.

12. Вучэнне пра Бога — Творцу і Усеўладнага Гаспадара

Бог называецца Творцам, бо Ён стварыў усё, і Усеўладным Гаспадаром, бо Ён трымае ўсё і ўсіх у Сваёй моцы і волі. Яго веліч выяўляецца ў словах апостала Паўла: *Богам ніхто не кіруе, толькі Дух Божы (1 Кар. 2, 11),* а таксама: *Усё гэта робіць адзін і той самы Дух, надзяляючы кожнага асоб-на, як Яму хочацца (1 Кар. 12, 11).*

Свяціцель Рыгор Багаслоў пісаў, што недастат-кова было для Дабрыні Божай замыкацца ў Сабе самой, і Яна будуе свет Анёльскі, і далей: *... як Ён сказаў, так і было: загадаў Ён, і стварылася (Пс. 32, 9).* Прат. Ф. Галубінскі, праф. Д. Г. Лявіцкі, якія зрабілі галоўным прадметам свайго доследу Найвышэйшую Мудрасць і Дабрыню Божую ў лёсах свету і чалавецтва, указваюць: «Усе прыватныя мэты, прызначаныя таму ці іншаму гатунку стварэнняў, як сведчыць Пісанне, аб'ядноўваюцца ў адной агульнай, астатняй, найвышэйшай мэце

ўсялякага створанага быцця (...) Самадастатковы і Найшчаслівейшы, які не мае ніякае патрэбы ў стварэннях і які прывёў іх у быццё паводле адной толькі ласкі Сваёй, усё стварыў толькі дзеля Славы Сваёй. Слава Творцы — гэта апошняя ступень усяго створанага» (Найвышэйшая мудрасць і дабрыня Божая. СПб, 2004, с. 73–74; перадрук 1858 г.).

Неба — Анёльскі свет. Зямля — маса, агромністае бяскрайняе, бязмежнае мора першаіснасцяў, якія знаходзяцца ў бездані цемры. І Дух Божы лунаў над ёю і надаваў форму, саграваў і ажыўляў гэтую масу. Як птушка, выседжваючы яйка, дае яму жыццё, так і Дух Божы, лунаючы над вадою, ствараў з яе жыццё. Бог стварыў неба і зямлю, г. зн. увесь аб'ём створанага быцця, першарэчыва. *На пачатку стварыў Бог неба і зямлю (Быц. 1, 1).* Так пачынаецца Кніга Быцця. Вучэннем пра Бога Творцу і Усеўладнага Гаспадара адмаўляюцца ўсе вучэнні пантэізму (атаесамленне Бога і свету) і дуалізму (прызнанне самастойнага, адрознага ад адзінага Бога, прынцыпу існавання), у якіх вытворнае залежыць ад прычыннасці; але ж Бог стварыў свет з нічога, толькі з ласкі Сваёй. У псалме 101 прарокам Давідам гаворыцца пра стварэнне, якое змяняецца і ў рэшце рэшт гіне: *Спачатку Ты, Госпадзе, зямлю заснаваў, і нябёсы — справа Тваіх рук. Яны загінуць, Ты ж трываць будзеш вечна: як шаты, струхлеюць усе яны, і як вопратку, згорнеш Ты іх, і пераменяцца яны. Ты ж застанешся такі самы, і гадам Тваім не будзе канца (Пс. 101, 26-28).* Пра

гэта самае казаў і бл. Аўгусцін: «Толькі створаныя рэчы, прадметы і істоты змяняюцца і падлягаюць гібелі. Толькі Бог самабытны і нязменны».

Найвышэйшае стварэнне Божае — чалавек: *створым чалавека паводле вобразу Нашага і падабенства Нашага (Быц. 1, 26).*

Бог стварыў істоты, здольныя адчуваць і разумець, а напаследак — чалавека, і пакінуў яго як нейкі Свой вобраз сярод адушаўлёных і неадушаўлёных стварэнняў, здольных да адчування і разумення, каб яны, як нейкую даніну, прыносілі яму карысць, а прырода разумнай спагадлівасцю да чалавека даказвала прыхільнасць да свайго Творцы. Вобраз Божы складаецца са справядлівасці і святасці праўды: *і апрануцца ў новага чалавека, створанага паводле Бога, у праведнасці і святасці праўды (Эф. 4, 24).* Вобраз Божы — «моц разумення і наканавання» (св. Рыгор Ніскі), падабенства Божае — маральныя ўласцівасці і іх удасканальванне. Сам Бог мае валадарства, гэтаксама і чалавеку даў Ён валадарыць над стварэннямі. Чалавек таксама пануе і судзіць сярод людзей, падобна да Бога, за выключэннем таго, што Бог не мае патрэбы ў сведках, тады як чалавеку патрэбныя і абвінаваўцы, і сведкі. Падобны да Божага розуму ў неабмежаванасці і розум чалавечы, які можа ў адно імгненне агарнуць ўвесь сусвет. Чалавек як вобраз Божы здольны таксама да стваральнай дзейнасці ў рамках свайго жыцця. Прыпадабняючыся да Бога, чалавек можа будаваць сваё жыццё, ідучы

шляхам збавення. Яго творчасць у вузкім сэнсе гэтага слова ўзбагачаецца і адухаўляецца, калі мае мэты, згодныя з Божымі Запаведзямі.

13. Стварэнне нябачнага свету

Да нябачнага духоўнага свету належаць Анёлы. Гэта бесцялесныя духі, адораныя розумам, воляй і магутнасцю. Анёл (па-грэцку ἄγγελος) значыць «вястун», пасланец Божы, бо Анёлаў Бог пасылаў, каб абвясціць Сваю волю. Так, на гары Морыя Анёл, пасланы Богам, спыніў руку Аўраама, які занёс нож над сваім сынам Ісаакам, каб прынесці яго ў ахвяру (Быц. 22). Гэтая назва ўказвае на пэўную пасаду, абавязак.

Анёльскія сілы пазначаныя на пачатку Бібліі адным словам «неба», бо для яўрэйскага народа гэты свет быў не такі важны: яму было дадзена суразмоўе з Самім Богам. Вучэнне аб стварэнні Богам нябачнага свету ў Старым Запавеце прадстаўлена прыхавана, бо ў той час рана было яшчэ адкрываць веды пра Анёльскі свет яўрэям, як народу пачуццёваму, які лёгка паддаваўся ідалапаклонству і лёгка скажаў паняцці, якія адкрываліся ў Старым Запавеце.

Існуюць два меркаванні наконт разумення часу стварэння Анёльскага свету. Паводле аднаго меркавання (напрыклад, прап. Іаан Дамаскін), нябачнае было створана раней за бачнае, і стварэнне Анёльскага свету з’яўляецца першасным ак-

там стварэння. Зыходзячы з другога меркавання (напрыклад, бл. Феадарыт Кірскі), Анёлы былі створаныя адначасова з бачным светам або пазней за яго. Будучы стварэннямі, Анёлы маюць пэўныя прасторавыя і часавыя формы, таму можна меркаваць, што іх стварэнне адбылося не раней за стварэнне гэтых форм, і на гэта ёсць наступныя падставы:

1-я падстава: *Зямля ж была безаблічная і бязладная, і цемра над тварам бездані, і Дух Божы лунаў над абліччам вады (Быц. 1, 2).* Але гэтага нельга аднесці да Анёльскага свету, у якім панавалі лад, іерархія, розум і ласка Божая. На другі дзень Бог падзяліў воды скляпеннем і сабраў воды пад скляпеннем ў адно месца, *і назваў Бог скляпенне небам (Быц. 1, 8).* Гэта наша бачнае неба, створанае на пачатку касмагоніі.

2-я падстава. Пра неба гаворыцца ў 1-ым раздзеле Быцця двойчы, але гэта не паўтарэнне ўжо сказанага. У першым выпадку [*На пачатку стварыў Бог неба і зямлю (Быц. 1, 1)*] гаворыцца пра стварэнне Анёльскае, а ў другім вершы маецца на ўвазе іншае — бачнае неба.

3-я падстава. У свеце Старога Запавету ў Кнізе Іова напісана, як Анёлы ўзносяць славу і веліч Божую, Яго мудрасць і магутнасць: *Хто ж паклаў нарожны камень на ёй? Калі (створаныя) былі зоры, пахвалілі Мяне голасам гучным усе Анёлы Мае (Іоў, 38, 6-7).* Зоры былі створаныя на чацвёрты дзень стварэння (на 3-ці дзень адбылося кшталта-

ванне зямлі, на 2-гі і 1-шы дзень — афармленне бачнага свету).

4-я падстава. У святле Новага Запавету апостал Павел, а затым і Дыянісій Арэапагіт апісалі ўжо Нябесную іерархію. Апостал Павел пра Ісуса Хрыста, Сына Божага, гаворыць: *Ім створана было ўсё, што на небе і што на зямлі, бачнае і нябачнае: будзь то пасады, ці дзяржавы, ці начальства, ці ўлады: усё Ім і для Яго створана (Кал. 1, 16).*

Пра быццё Анёльскага свету, увогуле, шмат сказана ў Старым Запавеце. Пры выгнанні чалавека з раю Бог паставіў ля райскае брамы Херувіма — ахоўваць шлях да дрэва жыцця (Быц. 3, 24). Аўраам пасылаў Елізара па жонку для сына Ісаака і казаў, што Анёл падрыхтуе шляхі яму (Быц. 24, 7). Якуб бачыў у сне лесвіцу і Анёлаў, што сыходзілі і ўздымаліся па ёй (Быц. 28, 12-13). Пра Анёлаў часта гаворыцца ў Псалтыры. Напрыклад: *Хваліце Яго, усе Анёлы яго, хваліце Яго, усе войскі Яго (Пс. 148, 2).* А таксама: *Робіш Анёламі Сваімі духаў, і слугамі Сваімі полымя агністае (Пс. 103, 4).* Пра Анёлаў пісалі прарокі. Так, прарок Ісая бачыў Серафімаў, якія атачалі пасад Божы (Іс. 6); прарок Езекііль бачыў Херувімаў у праяве Дому Божага (Ез. 10). Тры хлапчукі ў печы Вавілонскай спявалі: *Благаславіце, усе справы Гасподнія, Госпада, (...) Благаславіце, Анёлы Гасподнія, Госпада (Дан. 3, 57-58), благаславіце, усе войскі Гасподнія, Госпада, спявайце і ўзносьце Яго над усімі*

ў вяках (Дан. 3, 61). Анёл Божы двойчы з'яўляўся да Агары, служкі Сарынай (Быц. 16, 7-13; 21, 17-18). Маной, пабачыўшы Анёла, спалохаўся яго, як Бога (Суд. 13, 17). У Новым Запавеце апісана, як Анёл удзельнічаў у Дабравешчанні (Лк. 1, 26). Анёл узнёс хвалу Хрысту ў ноч Раства. Анёлы ўмацоўвалі Хрыста падчас Гефсіманскае малітвы, падчас Пакуты, абвясцілі Уваскрасенне Хрыста і г. д.

Анёл-Абаронца даецца чалавеку ў дзень Хрышчэння, штодня спадарожнічае яму: *Анёлам Сваім даць загад аб табе, каб ахоўвалі цябе на кожным шляху тваім (Пс. 90, 11).* А таксама: *Глядзіце, каб не пагарджалі ніводным з гэтых малых: бо кажу вам, што Анёлы іх на небе заўсёды бачаць аблічча Айца Майго Нябеснага (Мц. 18, 10).* І толькі калі чалавек западае ў грэх, тады Анёл са скрухаю адступае ад яго. Грэх адганяе Анёла, як дым адганяе пчолаў. Словамі св. Васіля Вялікага: «Як пчолаў адганяе дым і галубоў — смурод, так і Абаронцу нашага жыцця аддаляе варты жалю і смярдзючы грэх». Ад пакаяння чалавека ў Анёлаў бывае радасць на Небе: *радасць бывае сярод Анёлаў Божых з аднаго грэшніка, які каецца (Лк 15, 10).*

Святое Пісанне сведчыць, што Анёл пастаўлены таксама над кожным народам: *Калі дзяліў Усявышні народы, рассеяў сыноў Адамавых, акрэсліў межы народаў паводле колькасці Анёлаў Божых (Друг, 32, 8).*

14. Узнікненне зла

Усё, што Госпад стварыў, было добрае, і Ён бачыў гэта напрыканцы стварэння: *пабачыў Бог усё, што Ён стварыў: і вось, вельмі добра (Быц. 1, 31).* Зло стала вынікам непаслушэнства, вольнага адступлення ад Разумнага, Вышэйшага, Боскага пачатку, ад разумна свабодных істот, але не вынікам творчае працы Божае і Яго прадбачання. Вобраз адпадзення ад Бога паказаны ў выглядзе вайны: *І была бітва на небе (...) І зрынуты быў вялікі змей, змей старажытны, называны д’яблам і шатанам (Аб’яўл. 12, 7, 9).*

Бог стварыў Анёльскія сілы не ў ступені абсалютнае дасканаласці. Ён бачыў сярод іх недахопы. Стварэнне не можа быць цалкам дасканалае, бо гэта супярэчыць Абсалютнаму Пачатку. Зараніца, адзін з Анёлаў, запаліўся гонарам, пажадаў самастойнага шчасця. Ганарлівасць, пыха і марнае жаданне славы абрынулі таго, хто сказаў: *на неба ўзыду (Іс. 14, 13).* У яго зарадзілася жаданне пашырыць свае паўнамоцтвы, павялічыць асалоду, багацце. Але ён не перастаў быць рабом цемры, д’яблам, а стаў толькі непрыдатным рабом; калі быў ён Анёлам святла, дык стаў нявольнікам цемрадзі, д’яблам, гэта значыць паклёпнікам і спакуснікам. Невымоўнай злобаю жарыўся ён, абыходзячы ўсе мясціны, шукаючы, каму б прынесці загубу, і адно суцяшэнне яму, калі спакусіць ён чалавека. Ён можа ўздзейнічаць на чалавека праз жарсці і

ачмурэнне пачуццяў, розуму і волі, але без патурання волі Божае не зможа анічога. Кажучы словамі Хрыста, *вы айцу вашаму д'яблу належыце і жаданні айца вашага хочаце выконваць: ён ад пачатку быў душагуб і не ўстояў у праўдзе, бо няма праўды ў ім (...), бо сам ён мана і бацька маны (Ін. 8, 44)*. І пры старанным вымаўленні Божага імя перамагаецца ўся сіла цемры. Легіён чарцей без патурання Хрыста не мог увайсці ў свіней.

Трэцяя частка Анёлаў адпала разам з Зараніцай. Гэта чэрці, пра якіх казаў апостал Іуда: *Анёлы ж, якія не прызнавалі свайго начальства, але пакінулі сваё жытло (Іуд. 1, 6)*. А таксама сказана ў Аб'яўленні: *І была бітва на небе: Міхал і Анёлы яго бітву ўчынілі са змеем, і змей біўся, і анёлы яго. І не перамаглі, і месца ўжо не знайшлося ім на небе. І скінуты быў змей вялікі, змей старажытны, што завецца д'яблам і шатанам, які спакушаў увесь свет, і быў ён абрынуты на зямлю, а анёлы яго разам з ім зрынутыя былі ўніз (Аб'яўл. 12, 7-9)*.

Будучы памазаным Херувімам, ён быў дасканалы, пакуль не ўчыніў беззаконне, пажадаўшы заняць месца Бога: *... сказаў: я ёсць Бог, сяджу на пасадзе багоў пасярод мора (Ез. 28, 2)*.

Тады і быў ён выгнаны, як нячысцік, з гары Божае у пекла, і ўпаў пасля ўзнясення: *ты — адбітак дасканаласці, поўны найвышэйшай мудрасці і вянец дабрыні, быў у асалодзе раю Божага, усялякімі шляхетнымі каменнямі ўпрыгожаны: сер-*

далікам і тапазам, і смарагдам і гіяцынтам, і андраксам і сапфірам, і яшмаю і срэбрам і золатам, і лігірам і агатам, і аметыстам і хрызалітам, і бірылам і оніксам і золатам напоўніў скарбніцы твае і жытніцы твае, з таго дня, як быў створаны ты. Ты быў памазаным херувімам на гары святой Божай, быў сярод каменняў ззяйных. У дасканаласці бавіў ты дні свае ад дня стварэння твайго, пакуль не ўгняздзілася ў табе няпраўда. Ад багацця куплі тваёй напоўніў ты скарбніцы твае беззаконнасцю, і зграшыў, і быў адрынуты ад гары Божае: і наляцеў ценем і вывеў цябе Херувім з асяроддзя каменчыкаў агністых. Ганарліва занёсся ты сэрцам тваім ў багацці тваім, спарахнела мудрасць твая пасярод дабрабыту: дзеля мноства грахоў тваіх быў зрынуты ты на зямлю, перад царамі аддалі цябе на ганьбаванне. Праз мноства грахоў тваіх і няпраўдаў куплі тваёй апаганіў ты святыні твае, і выведу я агонь з сярэдзіны тваёй, які цябе і пахлыне: і ператвару цябе ў пыл на зямлі перад усімі, хто бачыць цябе. І ўсе, хто ведаў цябе сярод народаў, абурацца на цябе: загубаю ты стаў, і не будзе цябе павек (Ез. 28, 12-19).

А таксама: *У пекла зрынутая слава твая, буйная твая весялосць: пад табою пасцелюць гніль, і покрыва тваё – чэрві. Як жа ўпаў ты з неба, зараніца, сын зары! Раструшчыўся на зямлі той, хто памыкаў ўсімі народамі. Ты ж казаў сабе ў духу сваім: на неба ўзыду, вышэй за зоры*

нябесныя пастаўлю мой пасад, сяду нагары, сярод высокіх круч, на паўночным краі: уздымуся вышэй за аблокі, буду падобны да Усявышняга. Сёння ж зрынуты ты ў пекла, у глыбіні апраметнай (Іс. 14, 11-15).

У грунтоўнай працы прат. Т. І. Буткевіча «Зло, яго сутнасць і паходжанне» (СПб, 2005; перадрук з 1897 г.) праводзіцца параўнаўчы аналіз розных філасофскіх вучэнняў аб першародным граху і паходжанні зла ў свеце, пачынаючы ад паданняў старажытных народаў аж да нашых дзён. Аўтар робіць выснову, што вучэнне Боскага Аб'яўлення аб распаўсюджанні зла ў свеце з'яўляецца важкай праўдаю.

15. Стварэнне бачнага свету

У першым вершы Бібліі акрэслены ўвесь аб'ём створанага быцця. Пры гэтым Майсей гаворыць не як вучоны-натураліст, але як настаўнік веры.

Бог стварыў свет з нічога, што ўпершыню выражана ў 7-м раздзеле Другой Кнігі Макавеевай, калі маці намаўляла сыноў на пакуту: *малю цябе, дзіця, паглядзі на неба і зямлю, і ўсё, што ёсць ў іх, бачучы, зразумееш, што ўсё стварыў Бог з нічога, гэтаксама паўстаў і род чалавечы (2 Мак. 7, 28).*

Зямля — гэта першарэчыва, першаматэрыя, яна была непраглядная, бяскрайняя, бязмежная, называлася морам і паводле свайго стану наблі-

жалася да воднага складу. Усё гэта ахінала цемра, і Дух Божы насіўся над зямлёй, *і Дух Божы лунаў над абліччам вады (Быц. 1, 3).* Св. Васіль Вялікі ў «Шасцідневе» праводзіць аналогію Яго дзеянняў з дзеяннямі птушкі-наседкі, якая выседжвае яйкі, дае жыццё. Гэтаксама і Дух Божы саграваў і тварыў з мёртвай бясформнай масы стройны свет — другаснае, або прыватнае стварэнне.

1-ы дзень. У першы дзень Госпад стаў Творцам першарэчыва. Напачатку Бог стварыў святло як неабходную ўмову для арганічнага і неарганічнага жыцця. Фізічнае святло — абавязковы, неаспрэчны варунак усялякага быцця, гэтакама, як і звязаная са святлом цеплыня, пра што даводзяць і сучасныя лабараторыі. Святло і цеплыня — гэта роднасныя натуральныя з'явы, якія паўстаюць у выніку руху часціц рэчыва. Гэта значыць, Бог прывёў у рух інертнае першарэчыва. Рух спарадзіў цяпло, якое пераходзіла ў святло, накшталт таго, як пры трэнні палачак ўспыхвае агонь. Святло можа ўзнікаць і без крыніцы святла, як вынік руху часціц.

2-гі дзень. Тут коратка, у агульных рысах выкладаецца касмагонія (стварэнне космасу). У гэты дзень былі створаныя Зямля і ўсе целы ў космасе, якія не вылучаюць уласнага святла, а таксама Скляпенне неба — паветраная прастора, атмасферная абалонка, якая аддзяляе зямлю ад нябеснага святла. Майсей нездарма называе прастору Скляпеннем, бо яна вельмі цвёрдая, і толькі для нашых агрубелых целаў, прызвычаеных да зямлі,

яна здаецца пустой прастораю. Скляпенне неба бароніць нас ад бамбардзіроўкі нябесных целаў, якія згараюць у паветранай абалонцы зямлі.

3-ці дзень. Канчатковае фарміраванне зямной кары, якая дагэтуль была бясформнай масай. Загушчанае першарэчыва астыла і ўтварыла сушу ў некаторых мясцінах, а нізіны былі запоўненыя вадой, каб зямля магла прарасціць зеляніну, траву (Быц. 1, 11). Гэта першы творчы акт пад уздзеяннем не толькі Божага Слова, але і Духу Божага, які даваў жыццё, саграваў, утвараў з неарганічнага жыцця жыццё арганічнае. Тут існуе дзівосная паступовасць і паслядоўнасць стварэння: напачатку — імхі, лішаі ды водарасці, якія распаўсюджваюцца без дапамогі насення, затым — травы, якія рассяваюцца з дапамогаю насення, а пазней — дрэвы, што даюць плады.

4-ы дзень. Першапачатковы свет быў сканцэнтраваны Богам ў асаблівых целах. Крыніца святла — сонца і вялікае мноства іншых сонцаў у сусвеце, якія пераўзыходзяць нашае.

5-ы дзень. Госпад магутнасцю Сваёю паклікаў з небыцця стварэнне жывых істот. Гэта адлюстравана праз падвойнае ўжыванне дзеяслова «бара» («стварыў»). Напачатку з'явіліся насельнікі вод, потым — паветра.

6-ы дзень. Пасля ўсяго гэтага Бог стварыў чацвёраногіх жывёл. Заканчвае Госпад актам стварэння чалавека. Чалавек — вяршыня стварэння Божага.

7-ы дзень. Госпад адпачыў ад спраў Сваіх. Гэты дзень трывае дагэтуль. У гэты дзень Госпад нічога не ставарае, але адпачывае.

Адносна даўжыні дня трэба сказаць, што для Бога часу няма. Слова «дзень» у Біблії шматзначнае і можа азначаць розныя прамежкі часу, акрэсленыя (астранамічныя суткі — 24 гадзіны) і неакрэсленыя. Сонца было створана толькі на 4-ы дзень, і ён стаў роўны цяперашнім суткам. Існуе меркаванне аб тым, што першыя дні стварэння маглі быць кароткія, як выраз усёмагутнасці Божае.

Такім чынам:

- Бог — Творца першарэчыва, з якога пазней Ён ставарае арганізаваны свет;
- свет паўстае не імгненна, а на працягу шасці момантаў, названых днямі;
- у стварэнні бачнага свету адбываецца паступовае ўзыходжанне ад ніжэйшага да вышэйшага, ад прасцейшага да больш складанага.

16. Аб Наканаванні Божым

Пасля заканчэння стварэння Бог працягвае клапаціцца пра свет і чалавека.

Чалавек створаны для шчасця, каб ён любіў Бога, ўслаўляў Яго і быў шчаслівы, пазнаючы Яго. Божая воля аб прызначэнні чалавека да вечнага шчасця называецца наканаваннем. Неразумная істота не спазнае Бога, яна проста існуе, а чалавек, пазнаючы Бога, ўзыходзіць ад славы да славы. Але

чалавек збочыў са шляху, які вёў да шчасця, яго апанавалі хваробы і пакуты, аж да смерці. Бог ад веку прадбачыў, што чалавек не ўстоіць і ўпадзе, і паводле Свайго прадбачання і бясконцай літасці Ён стварыў шлях да яго збавення праз Адзінароднага Сына Свайго Ісуса Хрыста, *бо абраў нас у Ім да стварэння свету (Эф. 1, 4),* г. зн. у Радзе Святой Тройцы было прынятае рашэнне не толькі стварыць чалавека, але і аднавіць яго. Калі ў Старым Запавеце няма згадкі аб аднаўленні чалавека, дык у Новым Запавеце гэта добра бачна. Задума Старога Запавету аб стварэнні чалавека ў Новым Запавеце дапаўняецца думкаю аб яго аднаўленні.

Гэтае рашэнне Тройцы будзе трываць без змен, бо Госпад ужо ажыццявіў гэтае наканаванне і даў папераджальную ласку, якая дзейнічае на ўсіх. І яна збаўляе тых, хто дабравольна прымае яе. А тыя, хто выказваюць ёй супраціў, дабравольна рыхтуюць для сябе асуджэнне. Гэта значыць, наканаванне датычыцца ўсяго чалавецтва агулам, але кожная асоба мае права выбару — або прыняць, або адрынуць выратавальную руку Божую. У Пасланні ўсходніх патрыярхаў аб праваслаўнай веры з 1723 г. гаворыцца: «Паколькі Ён прадбачыў, што адны будуць добра выкарыстоўваць сваю свабодную волю, а іншыя дрэнна, таму адным наканаваў Ён славу, а іншых асудзіў».

Паводле Катэхізіса свяціцеля Філарэта: «Наканаванне Божае — гэта безупыннае ўздзеянне

ўсёмагутнасці, найвышэйшае мудрасці і дабрыні Божае, якім Бог ахоўвае быццё і сілы стварэнняў, накіроўвае іх да добрых мэт, усялякаму дабру спрыяе, а зло, якое ўзнікае праз аддаленне ад дабра, спыняе або выпраўляе і схіляе ў бок добрых вынікаў». Наканаванне Божае дзейнічае на ўвесь сусвет і ў прыватнасці — на ўсе стварэнні, якімі б малымі яны не здаваліся. Увесь свет — гэта кропля ранішняе расы, што збягае ў расу. Перад Яго бязмежнай літасцю, дабрынёй і мудрасцю няма нічога малога і нязначнага. *У доме Айца Майго пакояў шмат (Ін. 14, 2).*

Наканаванне Божае незалежна ад чалавечай волі ўдзельнічае ў збавенні чалавека, навяртае, накіроўвае яго свядомасць і волю да добрых мэт і спазання Бога. Ісус Хрыстос казаў: *Зірніце на птушак нябесных, яны не сеюць, не жнуць, не збіраюць у жытніцы, і Айцец ваш Нябесны насычае іх: дык хіба вы не лепшыя за іх (Мц. 6, 26)?* Вось псалом 90-ы, «Шчаслівы той, хто жыве пад аховай Найвышэйшага», кажа пра ўплыў наканавання Божага на чалавека.

2-ая частка Сімвалу веры. Пра Ісуса Хрыста, Сына Божага

І ў адзінага Госпада Ісуса Хрыста, Сына Божага, Адзінароднага, ад Айца народжанага спрадвеку: Святло ад Святла, Бога сапраўднага

ад Бога сапраўднага, народжанага, не створанага, адзінаіснага з Айцом, праз Якога ўсё сталася.

З 2-й па 7-ю частку Сімвалу веры гаворка ідзе пра другую Асобу Святой Тройцы. 2-ая частка Сімвалу веры ўмацоўвае веру ў Ісуса Хрыста — адзінаіснага Бога-Сына, Які спрадвечна нараджаецца ад Бога-Айца.

1. Боскія імёны другой Асобы Святой Тройцы

Назва *Сын Божы* ўказвае на Яго Боскую Асобу, на Яго Сыноўства. Людзям часам таксама надаецца назва сыноў Божых паводле ласкі, але толькі Ісус з'яўляецца Сынам па сутнасці, бо Ён называе Айца «Ойча Мой» і нідзе не гаворыць «Ойча наш». Ён называе Айца і Айцом вернікаў, і Айцом Сваім: *Дык будзьце ж вы міласэрныя, бо і Айцец ваш міласэрны (Лк. 6, 36).* А таксама: *Будзьце ж беззаганныя, як і Айцец ваш Нябесны (Мц. 5, 48).* А таксама: *Бо калі вы даруеце людзям правіны іх, дык даруе і вам Айцец ваш Нябесны (Мц. 6, 14).*

Ісусам Яго назвалі, калі Ён прыйшоў у свет як Чалавек. *Ісус* — грэцкая форма старажытнаяўрэйскага слова *Іешуа* (скарочанага ад *Іегошуа*), што значыць *дапамога Бога*, або *Збаўца*. Гэтае імя дадзенае было для Яго Архангелам Гаўрыілам праведнаму Язэпу.

Хрыстос — так Яго назвалі пракокі. Гэтае грэцкае слова значыць *Памазанік*, па-яўрэйску яно

гучыць як *Машыях* — *Месія*. Імя *Хрыстос* паходзіць ад памазання святым мірам, праз якое падаюцца дары Святога Духа, неабходныя для пэўнай дзейнасці. Памазанікамі называлі цароў, прарокаў, першасвятароў. Царам праз памазанне надавалася сіла, прарокам — дар прадбачання, першасвятарам — святасць для службаў.

Хрыстос быў памазаны як Цар, магутнасць якога выбавіць чалавецтва з-пад улады граху, д'ябла і смерці, як *шчаслівы і адзіны магутны, Цар цароў і Уладар уладароў (1 Цім. 6, 15).* Царскае памазанне Хрыста — гэта яго служэнне як Цара Неба і зямлі. Яно здзяйснялася ўжо тут, на зямлі (праз цуды, вылечванне хворых). Але галоўным чынам гэтае Царскае служэнне адбылося на Крыжы і падчас сыходу ў пекла.

Хрысту давалася памазанне таксама і як прароку. Калі служэнне прарока ў Старым Запавеце — гэта абвяшчэнне якой-небудзь праўды, г. зн. пачаткі Аб'яўлення, дык Хрыстос абвясціў казанне ў паўнаце і дасканаласці, таму мы не павінны чакаць новага Аб'яўлення. Хрыстос — Увасабленне Жывой Праўды.

Памазанне Хрыста як Першасвятара — паводле аналогіі са Старым Запаветам — гэта прымірэнне чалавека з Богам. Аднойчы здзейснены грэх не дазволіў чалавеку вярнуцца да Бога, тым болей, грахі, якія паўтараліся зноў і зноў ды штораз далей адводзілі чалавека ад Бога. У Старым Запавеце былі ўказанні на адзіную крывавую ахвяру, якая павінна

быць дзеля гэтага прынесеная, але сама гэтая ахвяра не ачышчала чалавека. Кожны чалавек сваімі грахамі павялічваў шырокую прагную бездань граху, і пераадолець гэтую бездань натуральным шляхам, зліквідаваць яе было нельга, таму яе перайшоў Сам Хрыстос яшчэ ў зачатку, калі сустрэўся з грэшным чалавечым целам. Канчатковы ж момант прымірэння — гэта Галгофскі Крыж.

Ён адначасова і Ахвяра, і Архірэй, «Той, хто прыносіць, і Той, каго прыносяць», як гаворыцца ў літургіі св. Іаана Залатавуснага. Ён *названы ад Бога, Першасвятар паводле чыну Мелхісэдэкавага (Яўр. 5, 10).*

2. Уласцівасці Сына Божага

Слова *Адзінароднага* азначае, што Хрыстос адной прыроды з Богам Айцом і з'яўляецца Сынам ва ўласным сэнсе, пра што ўжо згадвалася вышэй. Пра гэта часта гаворыцца ў Новым Запавеце. *Слова сталася целам, і асялілася між нас (Ін. 1, 14).* Гэта адбываецца таму, што Яго чалавечнасці пераказаныя былі без меры ўсе дары Духа Святога і, такім чынам, Яму ў найвышэйшай ступені ўласцівыя:

- веданне Прарока;
- святасць Першасвятара;
- магутнасць Цара.

Калі *на пачатку было Слова, і Слова было ў Бога, і Богам было Слова (Ін. 1, 1),* а таксама *Сло-*

вам Гасподнім нябёсы ўмацаваныя (Пс. 32, 6), дык адкрылася такая Слава, што выявіць яе не мог ні Анёл, ні чалавек, а мог толькі Азінародны: *І Слова сталася целам, і асялілася між нас (і бачылі мы славу Яго, славу як Адзінароднага ад Айца), поўнае ласкі і праўды (Ін. 1, 14).* А Бога Айца не бачыў ніхто: *Бога не бачыў ніхто ніколі, Адзінародны сын, што ва ўлонні Айца, Той адкрыў (Ін. 1, 18).* Пра Адзінароднасць Хрыста гавораць і Святыя Айцы. Прап. Сымон Новы Багаслоў у «Словах» піша, што калі адбываецца духоўнае нараджэнне чалавека і Бог пасяляецца ў нас праз Таінствы, у гэты момант выходзіць на яў Слава Божая: «А паколькі Айцец і Сын Яго Адзінародны адзіныя, дык зразумела, што і Слава Іх абодвух адзіная, яна адкрываецца і спасцігаецца ўсімі, каму хоча Сын адкрыць, праз Святога Духа, Які сыходзіць ад Айца».

Словы *ад Айца народжанага* акрэсліваюць Асабістую ўласцівасць другой Асобы Святой Тройцы. Сярод арыян існавалі ерасі, якія спрабавалі прынізіць Сына перад Богам Айцом, маўляў, Ён быў стварэннем, у той час як Сын Божы быў народжаны *(народжаны, не створаны).* Ён вечны, гэта значыць — існуе заўжды, *спрадвеку*, і знаходзіцца ў Богу Айцы.

У словах *Святло ад Святла* тлумачыцца недасяжнасць таямніцы існавання Асоб Святой Тройцы. Паводле аналогіі з сонечным святлом, якое нельга адлучыць ад самога сонца, Бог Айцец і Бог Сын складаюць адзінае, непадзельнае, веч-

нае святло. У дадзеным выпадку яшчэ магчымая аналогія са святлом свечкі ў самым цёмным пакоі.

Словы *Бога сапраўднага ад Бога сапраўднага* азначаюць, што гэтаксама, як мы раскрываем праз словы свой унутраны свет, так і Бог Словам Сваім дае нам, разумным істотам, спазнаць Сябе ў Сваіх дарунках: *Ведаем таксама, што Сын Божы прыйшоў і даў нам (святло і) розум, каб спазналі Бога сапраўднага, і каб былі ў сапраўдным Сыне Яго Ісусе Хрысце: Ён ёсць сапраўдны Бог і Жыццё вечнае (1 Ін. 5, 20).* Святыя Айцы кіруюцца гэтым пасланнем апостала Іаана для таго, каб прадухіліць мудрагельствы арыян ды іншых ерэтыкоў.

Словы *адзінаісны з Айцом* паказваюць, што Сын Божы мае тую самую Боскую Існасць, што і Бог Айцец. Калі Ён нараджаецца ад Асобы Айца, Ён нараджаецца з Яго Існасці, паводле слоў Іаана Дамаскіна. У Евангеллі сказана, што той, хто адрынуў Сына, адрынуў і Айца: *Хто ж маніць, калі не той, хто адмаўляе, што Ісус ёсць Хрыстос? Гэта — антыхрыст, які адмаўляе Айца і Сына. Усякі, хто адрынуў Сына, не мае і Айца, а той, хто вызнае Сына, і Айца мае (1 Ін 2, 22-23).*

Нарэшце, слова *Бо праз Яго ўсё сталася* азначаюць, што Бог Айцец усё стварыў праз Сына Свайго як Вечнае Сваё Слова: *Усё праз Яго сталася, і без Яго нічога не сталася з таго, што сталася (Ін. 1, 3).*

Як Бог Ісус Хрыстос, паводле св. Рыгора Багаслова, ёсць «Святло Айца, Слова Вялікага Розу-

му, што пераўзыходзіць усялякае слова, Вышэйшае Святло найвышэйшага Святла, Адзінародны Сын, які ззяе разам з Вялікім Духам, Добры Цар, Валадар свету, Даўца жыцця, Стваральнік усяго, што ёсць і будзе».

3-я частка Сімвалу веры. Пра Уцялесненне

Ён дзеля нас, людзей, і дзеля нашага збавення сышоў з Нябёсаў, і прыняў цела ад Духа Святога і Дзевы Марыі, і стаўся чалавекам.

1. Збаўленне чалавецтва ад граху

У Адама праз грэх увайшло зло, а праз зло ўвайшла смерць. Мы паводле закону натуральнага нараджэння пераймаем у спадчыну грахоўную прыроду, і цялесную, і духоўную: *праз аднаго чалавека ўвайшоў у свет грэх і праз грэх — смерць, гэтак і смерць перайшла праз усіх людзей, бо ўсе мы зграшылі (Рым. 5, 12).* Грэхападзенне «сказіла ўсе сілы душы, паслабіла яе прыродныя імкненні да цноты» (св. Рыгор Сінаіт). Душа чалавека зрабілася схільная да зла. Грэх разбуральна паўплываў на цела, якое сталася падатнае для смерці, *бо заплата за грэх — смерць (Рым. 6, 23).* Грэхападзенне прабацькоў чалавецтва пацягнула за сабой праклянцце, у якім гучыць не гнеў, але літасць Божая, бо грэх парушыў гармонію створанага свету, і

чалавек замест прыпадабнення да Бога ўсё далей адыходзіў ад Бога і стаў бы падобны да д'ябла, таму што той, *хто грэх чыніць — той ад д'ябла, бо найперш д'ябал грашыць (1 Ін. 3, 8)*. Для таго і з'явіўся Сын Божы, каб разбурыць справы д'ябла: *Анёлаў жа, якія не захавалі сваёй улады, але пакінулі сваё жытло, на суд вялікага дня ў вечных путах над цемраю ўтрымлівае (Іуд. 1, 6)*. Грэх — усялякае беззаконне, усялякая няпраўда: *Калі хто бачыць брата свайго, які грашыць грахом не на смерць, дык няхай моліцца, і (Бог) дасць яму жыццё, гэным, што грашаць не на смерць. Ёсць грэх на смерць: не аб гэтым кажу маліцца. Усялякая няпраўда ёсць грэх, і ёсць грэх не на смерць (1 Ін. 5, 16-17)*.

Якуб бачыў Бога твар у Твар. *Узышло яму сонца, калі пераходзіў Пенуэл [аблічча Божае]: ён жа кульгаў сцягном сваім (Быц. 32, 31)*. Калі заззяла сонца, знікла і аблічча Божае, г. зн. узышоў на Неба Хрыстос, але не пазбыўся кульгавасці Ізраіль, бо выратаваны быў не цалкам. І ў знак удзячнасці Богу Якуб паставіў намёт (Быц. 33, 17). Як Нябесны Архірэй, Госпад пераадольвае непераадольную прорву паміж Богам і чалавекам. Паміж імі адбываецца прымірэнне звышнатуральным шляхам, шляхам дапамогі Бога чалавеку ў справе вяртання да першапачатковага стану. Калі адзіны грэх аддаліў Адама ад Бога, дык што ж казаць пра пазнейшае чалавецтва? Кожны чалавек рабіў уласны, асабісты ўклад у пашырэнне прорвы

паміж Богам і скажонай натураю. Ніхто сярод стварэнняў не ў стане быў яе пераадолець, і толькі Сын Божы, Эмануіл, дабравольна бярэ на Сябе грэх чалавека: *Усякі, хто робіць грэх, робіць і беззаконне, і грэх ёсць беззаконне. І вы ведаеце, што Ён з'явіўся дзеля таго, каб узяць грахі нашыя, і што ў Ім няма граху (1 Ін. 3, 4-5).* А таксама: *Ведаем мы, што кожны, хто народжаны ад Бога, не грашыць: а народжаны ад Бога пільнуе сябе, і ліхі не зачэпіць яго (1 Ін. 5, 18).* Увасабленне Бога ў чалавечым целе было адзіным спосабам збавення і прымірэння чалавека з Богам.

2. Пра спалучэнне ў Хрысце дзвюх існасцяў

У гэтай частцы Сімвалу веры гаворыцца пра чалавечую існасць Ісуса Хрыста: *Аб тым, што мы бачылі і чулі, абвяшчаем вам, каб і вы мелі лучнасць з намі: а наша лучнасць — з Айцом і з Сынам Яго Ісусам Хрыстом (1 Ін. 1, 2).*

Выяўляючы Сваё бязмежнае чалавекалюбства, Сам Госпад вырашае ўвасобіцца ў чалавека, успрыняць увесь склад чалавечае натуры — цела і душу. *Бо жыццё з'явілася, і мы бачылі і сведчым, і абвяшчаем вам гэтае вечнае жыццё, якое было ў Айца і з'явілася нам (1 Ін. 1, 2).* Дзеля чалавецтва Госпад сышоў з нябёсаў, гэта значыць, прыняў цела. *І ніхто не ўзышоў на неба, толькі Сын Чалавечы, што на небе, Які з неба сышоў (Ін, 3, 13).* Не перастаючы быць сапраўдным Богам, Ён

стаў сапраўдным Чалавекам, які прыняў цела ад Святога Духа: *І Слова сталася целам і асялілася між нас (і бачылі мы славу Яго, славу, як Адзінароднага ад Айца), поўнае ласкі і праўды (Ін. 1, 14).* У Ім адбылося яднанне дзвюх існасцяў — Боскае і чалавечае. Ён адзінаісны і з Богам, і з чалавекам.

Пытанне пра Хрыста, пытанне ўсяго хрысціянства — гэта пытанне пра Царкву, гэта пытанне пра ўсю сусветную гісторыю, якая точыцца вакол Хрыста, як планеты вакол сонца, гэта пытанне пра асобу кожнага чалавека, які павінен імкнуцца да Бога, да Хрыста.

Хрыстос — Сын Божы, сапраўдны Бог, Эмануіл. Калі чалавек загаворыць, дык тым самым ён публічна выяўляе свой унутраны свет. Так і Бог Слова выявіў людзям таямніцы Божага жыцця, і некаторыя таямніцы невядомыя нават Нябеснай Царкве, — тыя таямніцы, што адкрытыя Царкве зямной. *Бо Бог адзін, і адзін пасрэднік паміж Богам і людзьмі, Чалавек Хрыстос Ісус, што аддаў Сябе дзеля адкуплення ўсіх (1 Цім. 2, 5-6).* На падставе Яго натуральных уласцівасцяў Яму надаюцца розныя імёны. А менавіта:

- Святло (1 Ін. 1, 5; 1, 7; 12, 46);
- Жыццё (Ін. 14, 6);
- Сіла (1 Кар. 1, 24);
- Праўда (Ін. 14, 6);
- Адзінародны (Ін. 1, 14; 1, 18 ды інш);
- Ззянне і Вобраз Бацькоўскі (Яўр. 1, 3);
- Літасць (Мц. 9, 13);

• Найвышэйшая Мудрасць, Праўда, Збавенне (1 Кар. 1, 30).

Былі ерэтыкі, які сцвярджалі, нібыта цела ў Яго было ўяўнае, іншыя казалі, быццам Ён, маючы цела, не меў чалавечае душы, а быў Духам Божым. Дзве прыроды, дзве волі, чалавечая і Боская, былі ўласцівыя Хрысту. Тое, што належала да Боскай — цуды, вылечванне хворых; да чалавечай — прага, пакуты. Ён быў ва ўсім падобны да нас, апроч граху. Ён хацеў есці, піць, Ён плакаў, Ён пакутаваў, толькі нідзе не сказана, каб Ён смяяўся. Адна Асоба Эмануіла не злітна, не злеплена, але і непадзельна злучыла дзве існасці. Чалавечая існасць Хрыста прасякнутая Боствам,ператвораная і не мае абсалютна нічога агульнага з грахом.

«Доказы Боскасці Ісуса Хрыста» (СПб., 2007; перадрук з 1907 г.) наступныя: 1) падрыхтоўка роду чалавечага да прыняцця хрысціянства; 2) выкананне прароцтваў аб Месіі на Ісусе Хрысце; 3) бязгрэшнасць Ісуса Хрыста; 4) Яго дзівосны ўплыў на людзей; 5) сведчанне Ісуса Хрыста аб Сабе; 6) сведчанне аб Ім Апосталаў; 7) сведчанне святых пакутнікаў; 8) сведчанне Сусветнае Царквы; 9) Боскасць вучэння Хрыста; 10) збавенне свету, выкананае Ісусам Хрыстом; 11) Уваскрасенне Ісуса Хрыста; 12) з'яўленне Ісуса Хрыста пасля Уваскрасення; 13) існаванне святых у Хрысціянскай Царкве; 14) цуды, здзейсненыя святымі сілаю Ісуса Хрыста; 15) сіла малітоўнага заклікання Ісуса Хрыста; 16) сіла жагнання; 17) магутны

ўплыў Евангелля на душу чалавека; 18) перамога хрысціянства над ворагамі, немагчымая паводле натуральных законаў; 19) дабратворны ўплыў хрысціянства на культуру, сямейнае, грамадскае і дзяржаўнае жыццё народаў; 20) водгукі няверных людзей і філосафаў аб тым, што Ісус Хрыстос не быў звычайным чалавекам.

3. Найсвяцейшая Багародзіца Дзева Марыя

Таямніцы ўцялеснення Бога паслужыла Найсвяцейшая Дзева Марыя. Яна належала па айцу да роду Давідава, па маці — да роду архірэйскага, першасвятарскага. Марыя нарадзілася ад немаладых бацькоў, якія доўга маліліся аб яе нараджэнні і далі абяцанне прысвяціць дзіця Богу. Згодна з гэтым абяцаннем, у трохгадовым узросце яе адвялі ў храм. Яна па 15 прыступках ўзнялася да бабінца храма, і першасвятар Захарыя ўвёў яе ў Святыя святых. У царкоўным спеве ёсць словы: *Анёлы, пабачыўшы ўваход Найчысцейшае, здзівіліся: як Дзева ўвайшла ў Святыя святых*.

Божая Дзева пасялілася ў адной з сялібаў і 12 гадоў жыла пры храме ў працы і малітоўным служэнні. Яна дала абяцанне дзявоцтва і паведаміла пра гэта першасвятарам. Даведаўшыся пра гэтае жаданне, яны не сталі настойваць на выкананні звычаю, але, не жадаючы адкрыць гэтую таямніцу і з агульнай згоды, заручылі Яе з праведным Язэпам і выправілі ў Назарэт, да яго ў хаціну.

Праз 4 месяцы з'явіўся перад Ёй Нябесны Жыхар у момант, калі Яна чытала прароцтва Ісаі: *вось Дзева прыме ва ўлонне і народзіць Сына, і назавуць Яго імем: Эмануіл (Іс. 7, 14),* а Яна тады ўяўляла Сябе, хіба, апошняю Яе служкаю. Пасланец Нябёсаў развеяў Яе сумненні: *не бойся, Марыя: бо знайшла Ты ласку ў Бога (Лк. 1, 30) — І сказала ж Марыя: вось Я, Слуга Госпада, няхай станецца Мне паводле слова твайго (Лк. 1, 38).* У царкоўных спевах гаворыцца: *Да Раства Дзева, і ў Растве Дзева, і пасля Раства застаешся Дзеваю.* Паколькі гэта было святое зачацце, дык і нараджэнне адбылося без болю, ў адрозненне ад абяцання, дадзенага Еве. Хрыстос нарадзіўся ад Яе не па-Божы, а па-чалавечы, але Яна была і Вечнай Дзеваю, і Багародзіцай. На тое існуюць наступныя падставы:

Першая падстава: Начальнік Нябеснага Воінства Гаўрыіл прадказаў Ёй нараджэнне Збаўцы: *Дух Святы найдзе на Цябе, і сіла Найвышэйшага ахіне Цябе: і таму тое, што народзіцца, Сынам Божым назавецца (Лк. 1, 35).*

Другая падстава: У Старым Запавеце гаворыцца: *вось Дзева прыме ва ўлонне і народзіць Сына, і назавуць яго імем: Эмануіл (Іс. 7, 14); што значыць: з намі Бог (Мц. 1, 23).*

Трэцяя падстава. Яна выказаная ў словах прывітання сваячкі Альжбеты. Марыя спяшаецца да Альжбеты падзяліцца радасцю і, цалуючы Марыю, Альжбета гаворыць: *І адкуль гэта мне,*

што прыйшла Маці Госпада майго да мяне (Лк. 1, 43)? Гэтае імя раўназначнае імю «Багародзіца».

4. Раство Ісуса Хрыста

Іудзеі чакалі Месію як вялікага мага, чакалі па-свойму і язычнікі. Але яны не ўбачылі Божае Дзіцятка. Анёл Божы ноччу ў полі абвясціў пастухам: *Не бойцеся: бо вось я абвяшчаю вам вялікую радасць, якая будзе ўсім людзям: бо цяпер нарадзіўся вам у горадзе Давідавым Збаўца, каторы ёсць Хрыстос Госпад (Лк. 2, 10-11).* Першымі сведкамі Раства Хрыстовага сталі Віфлеемскія пастухі і вешчуны. Пастухі, якія пабачылі зорку і пачулі Анёльскія спевы, увайшлі ў пячору, якая падчас Нараджэння заззяла святлом. Вешчуны з Усходу (астраномы), якія чакалі Прыйсця Збаўцы, таксама прыйшлі ў Іудзею і пасля наведвання Іудзейскага цара падышлі да пячоры. І Анёлы заспявалі: *Радуйся моцна, дачка Сіёну, цешся голасна, дачка Іерусаліма: вось, Цар твой набліжаецца да цябе, праведны і збавенны, рахманы Ён і сядзіць на маладым вослiку, сыне асліцы (Зах. 9, 9).* Пазней так будуць радавацца жыхары Іерусаліма, сустракаючы Цара, але Ён прадбачыў, што неўзабаве яны ж будуць крычаць: «Укрыжуй, укрыжуй Яго», — і жаль, і слёзы з'явіліся на твары Яго. Ён адзін не падзяляў агульнай радасці, бо тыя, каго Ён шмат разоў хацеў сабраць, як птушанят, так і не пазналі, што надышоў іх час.

Аб тым, што нарадзіўся Сын Божы, даведаліся:

• праведны Язэп, які пачуў ад Архангела Гаўрыіла: *бо народжанае ў Ёй паходзіць ад Святога Духа (Мц. 1, 20)*.

• Вешчуны з Усходу, што бачылі Зорку, якая абвяшчала Раство: *Дзе народжаны Цар Іудзейскі? бо мы бачылі зорку Яго на ўсходзе і прыйшлі пакланіцца Яму (Мц. 2, 2)*.

• Праведная Альжбета, якая пры сустрэчы з Марыяй сказала: *Благаславёная Ты між жанок, і благаславёны плод улоння Твайго! І адкуль гэта мне, што прыйшла Маці Госпада майго да мяне? Бо вось, калі голас прывітання Твайго дайшоў да вушэй маіх, узварухнулася вясёла дзіцятка ў чэраве маім (Лк. 1, 42-43)*.

• Начныя пастухі, якія неслі варту, пачулі ад Архангелаў: *Не бойцеся: бо вось, абвяшаю я вам вялікую радасць, якая будзе ўсім людзям: бо цяпер нарадзіўся вам у горадзе Давідавым Збаўца, каторы ёсць Хрыстос Госпад (Лк. 2, 10-11)*. А таксама: *Слава ў вышынях Богу, і на зямлі мір, сярод людзей добрае волі (Лк. 2, 14)*.

• Праведны Сімяон, які прамовіў: *Цяпер адпускаеш слугу Твайго, Валадару, паводле слова Твайго, з мірам; бо бачылі вочы мае збавенне Тваё, якое прыгатаваў Ты перад абліччам усіх людзей: святло для асветы паганам, і славу народа Твайго Ізраіля (Лк. 2, 29-32)*. Паводле падання, Сімяон у юнацкія гады перакладаў Біблію з яўрэйскае на грэцкую мову, каб папоўніць Александрыйскую

бібліятэку. Ён быў у ліку 77 перакладчыкаў. Калі дайшоў ён да месца ў Кнізе прароцтваў Ісаі: *вось Дзева прыме ва ўлонне і народзіць Сына,* ён паспрабаваў выправіць тэкст, напісаць замест «*Дзева*» — «*Жанчына*», але яго спыніў Анёл Божы, які запэўніў яго, што ён не памрэ, пакуль не пераканаецца ў праўдзівасці прароцтва. Сімяон жыў, паводле падання, каля 300 гадоў, чакаючы выканання Божага абяцання. На саракавы дзень пасля Раства бацькі прынеслі Божае Дзіцятка для выканання законаў у храм, дзе яго прыняў праведны Сімяон, які і вымавіў гэтую дзіўную песню Хрысту.

- Ганна Прарочыца, якая славіла нараджэнне Госпада, *гаварыла пра Яго ўсім, хто чакаў збавення ў Іерусаліме (Лк. 2, 38).*

- Іаан Хрысціцель, які *бачыў, што разыходзяцца нябёсы і Дух, як голуб, сыходзіць на Яго. І голас быў з неба: Ты Сын Мой улюбёны, Якому спагадаю (Мк. 1, 10-11).* Пасля выхаду з пустыні, дзе ён прабыў да 30 гадоў, ён прыняў грамадскае служэнне. Іаан Хрысціцель навучаў, заклікаючы да пакаяння: *бо Я хрышчу вас у вадзе ў пакаянне, але Той, Хто ідзе за мною, дужэйшы за мяне, і я нават не варты несці Яму абутак (Мц. 3, 11).* Ён падрыхтаваў сваіх сучаснікаў да будучага прыходу Хрыста, указваючы: *Вось, Ягня Божае, што бярэ на Сябе грахі свету (Ін. 1, 29),* паводле Найвышэйшага натхнення.

- Гэткі самы голас чулі таксама апосталы Іаан, Якуб і Пётр падчас Перамянення Хрыста на

гары Фавор: *Гэта ёсць мой Сын улюбёны, якому спагадаю; Яго слухайце (Мц. 17, 5).*

- Яго пазналі ўсе іудзеі ў Ізраілі па цудах і добрых справах, па вышыні Яго вучэння.

Невымоўная радасць заўсёды ахоплівае чалавецтва ў дзень Раства Хрыстовага: нараджаецца Збаўца! І яго ўслаўляюць ва ўсе вякі ўсе народы (Калядныя матывы ў рускай паэзіі XVIII–XX стагоддзяў. СПб, 2010).

5. Служэнне Хрыста як Першасвятара

Госпад учыніў нашае збавенне Сваім жыццём, Сваёй смерцю на Крыжы. Ён:

- уваскрашаў мёртвых;
- вылечваў душэўныя і цялесныя хваробы;
- накарміў народ;
- хадзіў па вадзе;
- а калі вучыў, дык прамаўляў з такой сілаю, што ўсе дзівіліся з Яго Слоў.

Госпад пакінуў нам Евангелле Царства Божага, або сапраўднае вучэнне аб збавенні і вечным шчасці. Гэта самае галоўнае і самае істотнае ў Яго Вучэнні.

Якім чынам жыццё Хрыста збаўляе нас? Праўдзівае Слова Божае мае на чалавека жыватворны ўплыў і ўзносіць яго на Неба. Яно збаўленнае для ўсіх, хто вымаўляе Яго з чыстым сэрцам: *ад чыстага сэрца любіце адзін аднаго належна, народжаныя не з тленнага насення, але з нятлен-*

нага, праз Слова Бога Жывога, Які трывае ў вяках. Бо ўсялякае цела, як трава, і ўсялякая слава чалавечая, як квецень на траве: высахла трава — і квецень з яе апала; Слова ж Гасподняе застаецца ў вяках. А гэта і ёсць тое Слова, якое вам абвешчана (1 Пят. 1, 22-25). А таксама: *Не адыдзе жазло ад Іуды, ні посах правадыра паміж сцёгнаў яго, пакуль не прыйдзе прызначанае яму і Той, каго чакаюць народы (Быц. 49, 10).*

Мы павінны ў думках сваіх, у свядомасці і ў сэрцы мець вобраз Хрыста. Сярод моладзі прынята наследаваць вобразу літаратурнага героя, тым болей варты таго вышэйшы, найвышэйшы сярод усіх вобраз Хрыста: *Хто Мне служыць, няхай ідзе Маім шляхам, і дзе Я, там і слуга мой будзе (Ін. 12, 26).* Пастырству Хрыста Збаўцы прысвечана галоўная праца З. А. Салерцінскага (1846–1920 гг.), прафесара СПбДА, пабудаваная на старанным вывучэнні евангельскіх сведчанняў, твораў Святых Айцоў, а таксама новай, рускай і заходняй літаратуры (Пастырства Хрыста Збаўцы. СПб, 2005).

6. Прароцтвы Старога Запавету аб прыйсці Збаўцы

Ці не лепей было б, каб Месія прыйшоў адразу пасля грэхападзення, прамінаючы пакутлівы шлях упадку чалавецтва? Патрэбны быў час, каб выявілася ўся глыбіня таго зла, якое прынесла грэхападзенне, каб бруд граху выспеў у чалавеку

і ўвесь вытачыўся на яў пухлінаю, і каб чалавецтва пазбылася яго. Чалавецтва мусіла на ўласным вопыце спазнаць усю глыбіню зла і прагу Божага паратунку. Патрэбная была падрыхтоўка да таго, каб чалавецтва, якое жыло паводле Старога Запавету [Закону], безумоўна пазнала і прыняло Евангелле, і таму гаворыцца, што іудзейскі народ меў выхавацеля, настаўніка, які падвозіў яго да Хрыста: *Закон нам быў настаўнікам у Хрысце (Гал. 3, 24).*

Праз прарокаў Госпад нязменна паўтараў, штораз глыбей і падрабязней раскрываў прароцтва пра выкананне абяцання, дадзенага ўпершыню ў Першаевангеллі і правільна ўспрынятае і пераказанае нашчадкам праз Адама. Гэта была вялікая надзея і радасць з магчымасці аднаўлення чалавецтва пасля граху, і толькі на працягу апошніх пяці стагоддзяў занікла казанне, занікла і надзея. Выбіраючы невялікі народ, Госпад аддзяляе айца вернікаў ад бацькоўскага дому і гаворыць Аўрааму: *благаславяцца ў насенні тваім усе народы зямныя (Быц. 22, 18),* што, як на той час, цяжка было сабе ўявіць. Новае абяцанне дадзенае было Давіду: *і аднаўлю насенне тваё пасля цябе, якое будзе ад чэрава твайго, і падрыхтую Царства Яго (2 Цар, 7, 12).*

Увесь Стары Запавет прасякнуты правобазам Новага Запавету, будучы ценем прышлых даброт. Усе крывавыя ахвяры Старога Запавету сталі правобразам Адзінае Нявіннае Ахвяры, прынесенай да сканчэння свету. На пасху ў Старым Запавеце крывёю заколатага Ягняці — правобраза

Хрыста — памазваліся вушакі дзвярэй, якія былі правобразам Крыжа Гасподняга.

Былі прадказаныя шматлікія прыкметы, па якіх можна было пазнаць Збаўцу, калі Ён народзіцца. Прарок Міхей прадказаў месца Нараджэння Хрыста — Віфлеем: *І ты, Віфлеем-Эфрата, хіба ты малы сярод тысяч Іудзіных? Бо з цябе выйдзе Мне той, хто будзе Уладаром у Ізраілі, а паходжанне Яго здаўна, спакон веку (Міх. 5, 2).* Прарок Ісая прадказаў Наражэнне Збаўцы ад Дзевы: *Дасць Госпад Сам вам знак: вось, Дзева прыме ва ўлонні сваім і народзіць Сына, і назаве Яго імем Эмануіл (Іс. 7, 14).* Прарок Малахія прадказаў набліжэнне тэрміну прыйсця Збаўцы (Мал. 3, 4-5). Прарок Захарыя прадказаў Уваход Збаўцы ў Іерусалім: *Радуйся моцна, дачка Сіёну, цешся голасна, дачка Іерусаліма: вось, Цар твой набліжаецца да цябе, праведны і збавенны, рахманы Ён і сядзіць на маладым восліку, сыне асліцы (Зах. 9, 9).* Прарок Ісая прадказаў Пакуты Збаўцы: *Ён жа прыняў раны за грахі нашыя і нёс пакуты за беззаконні нашыя, кара свету нашага на Ім, ранамі Яго мы вылечыліся (Іс. 53, 5).*

7. Прароцтва Даніїла аб прыйсці Збаўцы

Прарок Даніїл на 490 гадоў наперад прадказаў шмат падзей, звязаных з прыйсцем Збаўцы, — яго смерць на Крыжы і разбурэнне Іерусаліма і храма, якое адбылося ўслед за ёй, спыненне

ахвяр, якія прыносіліся паводле Старога Запавету: *Семдзесят сядмін адмерана для народу твайго і святога гораду твайго, каб састарэла злачынства, і скончыўся грэх, і запячатаныя былі грахі, і загладжаныя крыўды, і выпраўленыя беззаконні, і каб прыведзеная была праўда вечная: і запячатаныя былі праявы і прарок, і памазаны быў Святы святых.*

Дык ведай і разумей: ад абвяшчэння загаду пра аднаўленне Іерусаліма і да Хрыста Уладара сем сядмінаў і шэсцьдзесят дзве сядміны: і вернуцца, і адбудуюцца вуліцы і брамы, і надыдуць нішчымныя гады.

І пасля шасцідзесяці дзвюх сядмін спатрэбіцца памазанне, і суду не будзе ў Ім: а горад і святыня будуць разбураныя з Уладаром, які надыдзе, і спустошацца, як у патопе, і да канца войскі, парадкам скарочаныя, загінуць.

І ўсталюе Запавет для многіх сядміна адна: а ў палове сядміны спыніцца ахвяра і прынашэнне, і ў святыні запануе агіда запусцення, і нават да сканчэння часу канчаткова будзе аддадзена на спусташэнне (Дан. 9, 24-27).

Прарок разам са сваімі аднапляменнікамі трапіў у Вавілонскі палон. Народ Ізраілеў 70 гадоў знаходзіўся ў няволі і горка бедаваў аб сваім палоне. Асаблівая скруха агарнула прарокаў, якія маліліся, перш за ўсё, аб выбаўленні з палону граху, якому служылі ўсе: і язычнікі, якія не спазналі Божага Аб’яўлення, а таксама іудзеі, якія фізічна

не адчувалі прыняволення. Прарок Данііл мацней за іншых бедаваў з прычыны няволі граху. У сваім прароцтве ён гаворыць, што засталося сем сядмін, калі ўсе грахі, за якія балела яму душа, будуць запячатаныя. У вершы 24 усе беззаконні пастаўленыя ў цесную сувязь з прыйсцем Праўды Вечнай, з надыходам Якой будзе пакладзены крэс усім правобразам, праявам, прароцтвам. Праўдай Вечнай, як і Уладаром (у рускім перакладзе — Старэйшынай), а таксама Святым святых тут называецца Хрыстос («Памазанік»). Пасля першага тэрміну павінна адбыцца вяртанне іудзейскага народа з палону. Затым праз сем сядмін адбудуецца Іерусалім. Хрыстос будзе выдадзены на смерць без суда, пасля чаго шмат іудзеяў загіне. Апошняя сядміна прынясе ўніверсальны Запавет для многіх. У палове сядміны спыняцца ахвяры і прынашэнні, якія адмяняла Ахвяра Ісуса Хрыста. Паўсядміны Сам Хрыстос усталёўваў Новы Запавет, а потым Апосталы і Вучні Яго паўсюль разнеслі Дабравесце.

Ніжэй падаюцца прадказаныя падзеі: вяртанне іудзеяў з палону (праз 7 х 7 = 49 гадоў); выданне Хрыста на смерць (яшчэ праз 62 х 7 = 434 гады). Ад пачатку ажыццяўлення прадказання да смерці Хрыста мінае 483 гады (49 + 434). Казанні Хрыста доўжыліся паўсядміны, або 3,5 гады. Хрышчэнне Гасподняе і пачатак служэння адбыліся, калі Хрысту было 30 гадоў. Адсюль 483–30 = 453 г. — год Раства Хрыстовага, калі весці адлік пасля выдання Артаксерксам Лангімонам Указу на імя Нееміі.



На працягу апошняй сядміны будзе зацверджаны для многіх Новы Запавет, і ў палове гэтай сядміны, гэта значыць, праз 3,5 гады, перастануць прыносіцца ахвяры, і ў Святыні запануе агіда запусцення. Затым прыйдуць рымскія легіянеры на чале з Цітам, разбураць святыню і горад, і там запануе запусценне да сканчэння дзён. Пачатак сядмінам пакладзе выданне загаду аб аднаўленні Іерусаліма і храма, заканчэнне настане разам з разбурэннем аднаго і другога. На працягу першых сядмін (7 х 7 = 49 гадоў) адновяцца Іерусалім і храм пры вельмі нялёгкіх абставінах; пасля наступных 62-х сядмін (62 х 7 = 434 гады) Хрыстос будзе аддадзены на смерць.

Указаў, выдадзеных пасля прароцтва Данііла пярсідскімі царамі на карысць іудзеяў, было чатыры: указ Кіра (1 Езд. 6, 3), указ Дарыя (1 Езд. 6, 1), указ Артаксеркса Лангімона на імя Ездры (1 Езд. 7, 12), указ Артаксеркса Лангімона на імя Неэміі, тагачаснага цывільнага ўладара (Неем. 2, 6). Прароцтва Данііла нельга аднесці да першых трох

указаў, а толькі да чацвёртага, выдадзенага Артаксерксам Лангімонам на імя Нееміі, бо ў першых трох указах нічога не гаворыцца пра аднаўленне Іерусаліма, а толькі пра стварэнне храма (у першых двух) і аб пракладанні да храмаў царскіх дарог (у трэцім), у той час як пра аднаўленне горада няма ані слова. У чацвёртым указе гаворыцца непасрэдна пра аднаўленне Іерусаліма, яго муроў і дамоў (Неем. 2, 8, 13-17).

Указ Артаксеркса Лангімона на імя Нееміі быў выдадзены, як сведчыць пра гэта сам Неемія (Неем. 2, 1), на 20-ы год царавання Лангімона, што адпавядае, паводле ўдакладнёнага падліку хрысціянскіх багасловаў, 453 году да Раства Хрыстовага. Гэты год з'яўляецца пачаткам адліку Даніілавых сядмін. Сем сядмін адводзілася на пабудову Іерусаліма, яго муроў і дамоў. Пасля гэтага да прыходу Месіі адводзілася яшчэ 62 сядміны. Разам 7 + 62 = 69, а 69 x 7 = 483 гады, так што канец прадказання адносіцца да Хрышчэння Месіі, гэта значыць — да Яго адкрытага Аб'яўлення, да моманту Яго выхаду на грамадскае служэнне. Госпад, Сам будучы Заканадаўцам, схіліў выю Сваю пад уладаю закону, а да гэтага Ён займаўся плотніцкім рамяством. Смерць Месіі адбылася пасля 69-й сядміны, г. зн. у сярэдзіне апошняй 70 сядміны, калі, згодна з прароцтвам Данііла, павінны былі спыніцца ахвяры, што прыносіліся паводле Старога Запавету. Уся апошняя сядміна прысвячаецца сцвярджэнню Новага Запавету: *І ўсталюе Запавет для многіх сяд-*

міна адна: у палове сядміны спыніцца ахвяра і прынашэнне, і ў святыні запануе агіда запусцення, і нават да сканчэння часу канчаткова будзе аддадзена на спусташэнне (Дан. 9, 24-27).

8. Здзяйсненне Даніілавага прароцтва

Прадказанні Данііла здзейсніліся з надзвычайнай дакладнасцю. Ісус Хрыстос нарадзіўся ў 453 годзе пасля выдання Артаксерксам Лангімонам указу на імя Неемii. Ад гэтага ўказу і пачынаюцца сядміны. На працягу першых сямі сядмін іудзеі партыямі вярталіся з палону, затым столькі ж гадоў адбудоўвалі Іерусалім, яго вуліцы і муры, у вельмі цяжкіх абставінах. Ізраільцянам адразу пасля вяртання не хапала працоўных рук, сродкаў, матэрыялаў, ім усяляк перашкаджалі язычнікі. Пасля дасягнення трыццацігадовага ўзросту Хрыстос выйшаў на грамадскае служэнне: *Ісус, пачынаючы Сваё служэнне, быў гадоў трыццаці (Лк. 3, 23),* а гэта канец 69-ае сядміны. У сярэдзіне апошняй сядміны (з 70-й) былі знішчаныя ахвяры і прынашэнні Старога Запавету, г. зн. разам са смерцю Збаўцы на Крыжы. Праз 3,5 гады пасля таго, як Ён заняў пасаду грамадскага Настаўніка, сапраўды спыніліся ахвяры і прынашэнні Старога Запавету. Замест іх (напярэдадні Пакут Збаўцы) была ўстаноўленая новая Бяскроўная Ахвяра — Найсвяцейшае Таінства Еўхарыстыі. Хрыстос першую палову гэтай сядміны выкарыстаў Сам на

зацвярджэнне Свайго Запавету ў Іудзеі і Самарыі, а праз 3,5 гады пасля Яго смерці і Уваскрасення Евангелле было абвешчанае Апосталамі паўсюль, дзе толькі знаходзіліся расцярушаныя «авечкі дому Ізраілева». Нарэшце, у прароцтве прадказваецца, што неўзабаве пасля смерці Месіі знішчаная будзе самабытнасць яўрэйскага народа, здарыцца разбурэнне Іерусаліма, яго храма, муроў, спусташэнне, якое будзе доўжыцца да сканчэння дзён. І кожнаму вядома з гісторыі, што імпертар Ціт разам з рымскім войскам дашчэнту разбурыў Іерусалім і храм, паклаўшы крэс Іудзейскаму Царству (70 гадоў пасля Нараджэння Хрыста). Ізраільская дзяржава паўстала толькі пасля 1947 года. Ніводная вайна не вялася з такой жорсткасцю, з якою Ціт знішчыў больш за мільён яўрэяў (было прадказана: *загінуць, нібы ў патопе*). На месцы святыні сёння стаіць мячэць Амара, хоць іудзеі шмат разоў безвынікова спрабавалі аднавіць храм.

4-ая частка Сімвалу веры. Аб пакуце і смерці

І быў укрыжаваны за нас пры Понцкім Пілаце, і пакутаваў, і быў пахаваны.

1. Асуджэнне і ўкрыжаванне Ісуса Хрыста

Замест пакланення Госпад быў выдадзены на Крыж. Праўда і мана — паняцці несумяшчальныя,

палярна супрацьлеглыя. Калі б сёння Госпад прыйшоў выкрываць нашыя беззаконні, адбылося б тое самае. Нездарма кажуць: «Праўда вочы коле». І Госпад прадказвае паслядоўнікам і вучням: *заплачаце і загалосіце вы, а свет усцешыцца (Ін. 16, 20).* А таксама: *Увесь свет ляжыць у зле (1 Ін. 5, 19),* і калі мы будзем змагацца са злом, яно будзе імкнуцца нас знішчыць: *Дый усе, хто жадае жыць набожна ў Хрысце, спазнаюць ганенні (2 Цім. 3, 12).* Дабро і зло, праўда і мана, любоў і нянавісць — супрацьлеглыя адно аднаму. Хрысціяне цярпелі ўціск ад тых, хто не называўся хрысціянамі, і так было ва ўсе часы, у тым ліку і на Русі. Росквіт хрысціянства аднесены да IV стагодзя. У гэты час пацярпела нямала стаўпоў Царквы.

Іудзейскія ўладары, кніжнікі і фарысеі люта, з усяе моцы зненавідзелі Хрыста. Гэтая нянавісць да Хрыста выкрыла іх. Яны зайздросцілі Хрысту, бо баяліся, што Яго ўзвядуць на Царскі пасад. Ніякае правіны за ім не знайшлі, але знайшліся крывадушныя сведкі. Хрыста прыгаварылі да смяротнага пакарання. Кніжнікі і фарысеі цудоўна ведалі Пісанне, і, пачуўшы словы аб тым, што Госпад называе Сябе Сынам Чалавечым, першасвятар Кайяфа разадраў на сабе вопратку, удаючы гнеў. На досвітку Хрыста прывялі да Понтыя Пілата, пракуратара Іудзеі (2-36 г. пасля Р. Х.), прадстаўніка рымскае ўлады. Сінедрыён доўга ўпрошваў пракуратара, які не бачыў за Хрыстом правіны, але пасля пагроз аб скарзе ке-

сару ён пагадзіўся на пакаранне Хрыста смерцю. Ганарлівы Понтый Пілат вымушаны быў схіліцца перад рымскай магутнасцю, укрыжываўшы Хрыста. Паводле розных гістарычных крыніц, неўзабаве пасля евангельскіх падзей за жорсткае вынішчэнне самаранаў Понтый Пілат быў сасланы імператарам Тыберыем у Галію, дзе скончыў жыццё самагубствам.

Святыя Айцы ў Нікеі ўнеслі ў Сімвал Веры імя Понтыя Пілата і ўказалі на выкананне прароцтва патрыярха Якуба: *Не адыдзе жазло ад Іуды, ні посах правадыра паміж сцёгнаў яго, пакуль не прыйдзе прызначанае яму і Той, каго чакаюць народы (Быц. 49, 10).* Пазней так і здарылася. Змяняліся суддзі, старэйшыны, еўпархі, першасвятары, і, нарэшце, за 60 гадоў да прыйсця Хрыста, Пампей падначаліў Іудзею Рыму, і самакіраванне паступова пачало падмяняцца рымскай уладаю, аж пакуль не знікла са смерцю Хрыста. У 70 г. пасля Р. Х. іудзейскі народ назаўжды быў пазбаўлены сваёй бацькаўшчыны. Жазло адступіла ад Ізраіля. Словы *пры Понцкім Пілаце* ўказваюць на канкрэтную дату, гэта значыць на тое, што зямное жыццё Хрыста зрабілася фактам чалавечай гісторыі. Розныя народы Усходу па-рознаму адлічвалі гады, у прыватнасці, Іудзея мела ўласныя храналагічныя табліцы. Агульнае летазлічэнне паўстала толькі пасля ўзнікнення хрысціянскай рэлігіі. На пачатку VI стагоддзя манах Дыянісій склаў хрысціянскія храналагічныя табліцы. Для ўкладання велікодных

табліц ён выкарыстаў табліцы Александрыйскае Царквы, у якіх выкарыстоўвалася эра Дыяклетыяна, але, не жадаючы весці злічэнне паводле гадоў «паганага прыгнятальніка», ён вырашыў пазначыць гады «ад Уцялеснення Хрыста». Тады ж было ўведзена і абазначэнне эры ад Раства Хрыстовага. У афіцыйных актах эра ад Р. Х. сустракаецца з VIII стагоддзя.

2. Пакуты і смерць Хрыста

І пакутаваў і быў пахаваны. Хрыстос сапраўды пакутаваў, прыняў смерць і быў пахаваны. Выказвалася меркаванне аб тым, што цела ў Хрыста было толькі ўяўнае, адсюль рабілася выснова, што не адбылося і выкупленне. Але Госпад адпакутаваў і памёр не паводле Божае, але паводле чалавечае існасці. Госпад памёр як Чалавек, а не як Бог.

Яго пакуты былі не вымушаныя, але добраахвотныя, бо дзеля гэтага Ён і прыйшоў на свет, пра што шмат разоў казаў вучням, асабліва ў Гефсіманскім садзе.

Госпад Сам пайшоў насустрач тым ваярам, што хацелі схапіць Яго, пытаючы: «Каго шукаеце?». Хрыстос меў не прывіднае цела, не прывідную смерць і не прывідныя пакуты. Госпад дабравольна пайшоў на смерць, і задоўга да падзей Ён прадказваў Сваю смерць. *Я кладу душу Маю, каб зноў узяць яе: ніхто не адыме яе ў Мяне, але Я*

сам аддаю яе: бо маю ўладу аддаць яе і ўладу зноў узяць яе (Ін. 10, 17-18).

Усе дзеянні Божыя разлічаныя ў чалавеку на тое, каб ён адрозніваў чалавечыя ўчынкі ад цудаў і мог суаднесці іх з уздзеяннем ласкі Божае. Адам — наш праайцец, Хрыстос — Творца праайца. Адам — гэта галава роду чалавечага, які яднаецца з ім праз цялеснае нараджэнне. У Хрысце ўсе мы яднаемся праз веру. Гэта новая жыватворная галава ўсяго чалавецтва. Адам дапусціў цяжкое парушэнне закону, якое раз'яднала чалавека з Богам, аднак гэты грэх пакрываецца і складае таямніцу выкуплення. Патомства Адама грэшнае і таму смяротнае: *як праз аднаго чалавека ўвайшоў у свет грэх — а з грахом і смерць, гэтак і смерць перайшла праз усіх людзей (Рым. 5, 12).* Але Новы Адам нясе віну старога Адама. У Новым Адаме, Творцы праайца і першага чалавека, мы праз глыбокую шчырую веру пазбываемся граху, пракляцця і смерці. Яго добраахвотная Пакута і Смерць на Крыжы за нас, маючы бясконцую вартасць і значэнне, як смерць бязгрэшнага Богачалавека, — гэта і поўнае заспакаенне правасуддзя Божага, якое асудзіла нас за грэх, і несмяротная заслуга, якая надала Яму права без абразы правасуддзя дараваць нам, грэшным, грахі і адорваць ласкаю для перамогі над грахом і смерцю. *Бо сапраўды не Анёлаў прымае ён, але насенне Аўраамава прымае. Дзеля гэтага Ён павінен быў ва ўсім прыпадабніцца да братоў, каб быць міласэрным і верным Першасвятаром перад*

Богам, каб ачысціць грахі людскія. Бо, як Сам Ён, спакушаны, пацярпеў, дык можа і спакушаным дапамагчы (Яўр. 2, 16-18). Гэта вялікая Божая ласка і міласэрнасць: *Бо ласкі хачу, а не ахвяры, і ведання Бога, а не цэласпалення (Ос. 6, 6). Ласка і Праўда між сабой сустракаюцца, справядлівасць і спакой цалуюцца (Пс. 84, 11).* Выявілася бясконцая міласэрнасць Божая, і яна спалучылася з праўдай. Гэта бязмерная заслуга, якая дала Яму права дараваць нам грахі і ласку, каб мы самі слабыя рэшткі ўласнай свабоды ўжывалі для далейшай барацьбы з грахом і перамагалі яго, карыстаючы з ласкі Божай.

Калі мы ў думках перанясемся ў Вялікую пятніцу, дык увесь род чалавечы будзе ўяўляць сабой тых, хто былі ля Крыжа, пад Крыжам і на Крыжы. Ля Крыжа і пад Крыжам — Стары Адам, на Крыжы — Новы Адам. Вынікам граху сталіся пракляцце і смерць. Хрыстос узяў на сябе чалавечы грэх, а таксама і вынік яго — пракляцце. Аб выбаўленні з пракляцця сказана: *Хрыстос адкупіў нас ад пракляцця закону, стаўшыся за нас пракляццем (Гал. 3, 13).* І невыпадкова Ён прыняў смерць менавіта на Крыжы, бо *пракляты кожны, хто вісіць на дрэве (Гал. 3, 13; Друг. 21, 23).*

У Асобе Хрыста чалавецтва ўкрыжавала Таго, Хто, паводле яго разумення, ўвасабляў усю глыбіню граху. Чалавецтва не мела сілы, каб ўсвядоміць усю бездань уласнага беззаконня і, тым больш, дабраахвотна прыняць яго на сябе, але ў

асобе Хрыста яно здзейсніла гэта, беручы на сябе грэх. Госпад выбавіў чалавека з граху, пракляцця і смерці. Ён дараваў грахі і даў ласку дзеля таго, каб мы перамагалі грэх і смерць.

У гэтым таямніца будаўніцтва дому чалавечага. *Бо калі ад граху аднаго смерць запанавала праз аднаго, дык тым болей тыя, хто прымае празмернасць ласкі і дар праведнасці, панаваць будуць у жыцці праз аднаго Ісуса Хрыста (Рым. 5, 17).* Гэта значыць, мы больш набылі праз Хрыста, чым страцілі праз Адама. *У Ім жа маем адкупленне Крывёю Яго, і адпушчэнне грахоў, паводле багацця ласкі Яго (Эф. 1, 7).*

3. Знішчэнне смерці смерцю Хрыста на Крыжы

Смерць, вяршыню ўсіх пакут, Хрыстос прыбіў Крыжам. Грэх пакараны не толькі Яго Пакутамі, але і смерцю. Смерць — канчатковае знішчэнне граху, пік ўсіх пакут, іх вянец. Але Госпад, сам не маючы граху, узяў наш грэх і ўкрыжаваў яго. Смерць Хрыста канчаткова разбурыла бар’ер паміж чалавекам і Богам і злучыла іх.

Знішчаная была духоўная смерць. Пазбаўленая Божае ласкі, душа апынаецца ў змроку жалю і пакут. Але, здзяйсняючы грэх і пакаянне, чалавецтва можа зноў ісці з Богам і да Бога.

Быў знішчаны страх смерці. Раней жыццё чалавечае атручанае было адною думкаю аб смерці. Апостал вучыў: *Калі дзеці сталіся ўдзельнікамі*

цела і крыві, дык і Ён таксама стаўся іх удзельнікам, каб праз смерць перамагчы таго, хто трымае ўладу над смерцю, інакш кажучы, д'ябла, і збавіць тых, хто пад страхам смерці ўсё сваё жыццё падданы быў рабству (Яўр. 2, 14-15). А таксама: *Бо для мяне жыццё — Хрыстос, і смерць — набытак (Флп. 1, 21).* Для праведнікаў страху не існуе, а для грэшніка жыццё поўніцца невымоўнымі пакутамі, якіх ён можа пазбыцца.

Смерць была знішчаная як такая, як мысляць яе рацыяналісты. Такой смерці няма для хрысціяніна, пра што было вядома і да Прыйсця Хрыста, але Хрыстос прынёс вестку аб гэтым ва ўсёй поўні. Знішчэння жыцця не існуе. Ёсць толькі пераход з аднаго жыцця ў іншае.

4. Удзел чалавека ў Пакуце і смерці Хрыста

Моц смерці на Крыжы ў тым, што гэта смерць не проста чалавека, але Богачалавека. «Каб нам ажыць, — кажа св. Рыгор Багаслоў, — нам патрэбны быў Бог, які ўцялесніўся і быў забіты». На Галгофскім Крыжы адбылося Таінства. Смерць была разбураная Крыжам Богачалавека, а за Яго смерцю на Крыжы настала Уваскрасенне.

Нашае адкупленне адбылося дарагой цаной. *Хіба не ведаеце, што целы вашыя ёсць храм Святога Духа, Які жыве ў вас, Якога вы маеце ад Бога; і вы не сваё, бо вы куплены дарагою цаною? Дык праслаўляйце Бога ў целах вашых і ў душах*

вашых, бо яны — Божыя (1 Кар. 6, 19-20). А таксама: *Бо любоў Божая ахінае нас, хто разважае так: калі ўжо Ён адзін памёр за ўсіх, дык гэта ўсе памерлі. Хрыстос жа памёр за ўсіх, каб жывыя жылі ўжо не дзеля сябе, але дзеля Таго, Хто памёр за іх і ўваскрос (2 Кар. 5, 14-15).* А таксама: *Няўжо вы не разумееце, што ўсе мы, якія ахрысціліся ў Хрыста Ісуса, у смерць Яго ахрысціліся (Рым. 6, 3)?* А таксама: *Бо кожны раз, калі вы ясце гэты хлеб і п'яце чару гэтую, смерць Гасподнюю абвяшчаеце, дакуль (Ён) не прыйдзе (1 Кар. 11, 2).*

Кажучы словамі свц. Кірылы Александрыйскага, «кожны з тых, хто атрымаў збавенне праз Хрыста і нібыта вельмі ўзбагаціўся ад прыпадабнення да Яго праз асвячэнне ў Духу, Богу абавязаны сваім жыццём» («Глафіры, або ўмелыя тлумачэнні выбраных месцаў з Кнігі Выхад»).

Мы павінны весці святое жыццё, бо такое жыццё было ў Хрыста. А калі вырашаем жыць свята, дык набываем дзівосны вобраз Яго, прыпадабняючыся да Таго, Хто дзеля нас зрабіўся падобны да нас, Адзінародны як Бог, першародны паводле існасці чалавечае, і разам з тым будзем святым і сапраўды прыемным прынашэннем Богу і Айцу. Паводле словаў свц. Кірылы Александрыйскага, «тым, хто носіць на сабе вобраз Хрыста, належыць адцурацца думак, уласцівых жаночаму полу, і далёка адганяць ад сябе, як нешта сапраўды агіднае і ненавіднае Богу, распешчанасць, разбэшчанасць і слабасць, і, наадварот, набрацца вартай мужчынскага

полу гатоўнасці да практыкаванняў у цноце» (Тамсама). Паводле слоў апостала Паўла: *Але, што для мяне было набыткам, тое дзеля Хрыста лічыў я за страту. Але (...) ўсё адмятаю, як смецце, дзеля таго, каб адшукаць Хрыста і знайсці сябе ў Ім, маючы не маю праведнасць, якая з закону, але тую, што праз веру ў Хрыста, існую праведнасць ад Бога ў веры: каб разумець Яго, і сілу ўваскрасення Яго, і суперажываць пакутам Яго, прыпадабняючыся да смерці Яго, каб толькі дасягнуць уваскрасення з мёртвых (Флп. 3, 7-11).*

Госпад сваёй смерцю на Крыжы падараваў неабходнае кожнаму збавенне. Каб трапіць у лік збаўленых, мы павінны ўдзельнічаць ў пакутах і смерці Ісуса Хрыста, каб паўсюль, куды б мы не йшлі, што б ні рабілі, не пакідаць вобразу Хрыста і трымаць Яго ў сэрцы. Калі не поўніцца яно думкамі пра жыццё Ісуса Хрыста, дык запоўніць яго вораг, бо хітры ён і падступны, таму што прырода не прызнае пусткі. Госпад выбавіў нас з граху, праклянцця і смерці. Але далёка не ўсе ўдзельнічаюць ва ўласным збавенні, г. зн. у пакутах і смерці Хрыста: праз Веру (цераз Евангелле), Таінствы, укрыжаванне цела з яго пажадаю і юрлівасцю. Мы павінны ўдзельнічаць ў пакуце і смерці Хрыста, каб Яго заслугі сталіся нашымі:

1) Праз жывую шчырую веру. Апостал Павел сказаў у Пасланні да Галатаў: *Бо праз закон я памёр для закону, каб жыць для Бога. Я ўкрыжаваны разам з Хрыстом. І ўжо не я жыву, але жыве*

ўва мне Хрыстос. А што цяпер жыву ў целе, дык жыву вераю ў Сына Божага, што палюбіў мяне і выдаў Сябе за мяне (Гал. 2, 19-20). Усялякая іншая вера — разумовая, мёртвая, д'ябальская вера. Аўраам паверыў Богу, і праз гэта залічаны быў да праведнікаў. *Ведайце ж, хто ад веры, тыя ёсць сыны Аўраамавы (Гал. 3, 7).* А таксама: *... праведны вераю жыць будзе. Закон жа не ад веры, але чалавек, які гэта выконвае, жыць будзе ў гэтым (Гал. 3, 10-12). Таму што справамі закону не апраўдаецца ўсялякае цела перад ім, бо праз закон пазнаецца грэх (Рым. 3, 20).*

2) Праз Таінствы, у якіх схаваная і адлюстраваная моц збавенных Пакут і смерці Ісуса Хрыста. У Пасланні да Галатаў таксама гаворыцца: *Не адмятаю ласкі Божае: бо калі праз закон апраўданне, дык Хрыстос дарма памёр (Гал. 2, 21).* Ва ўсіх Таінствах падаецца дабратворная сіла, пачынаючы з ясляў Хрыста, гэта значыць, ласка Духа Святога прадбачыць і ачышчае чалавечую свядомасць яшчэ да прыняцця Таінства Хрышчэння, і той, хто прыходзіць у Царкву, кіруецца вольным выбарам, аддае перавагу вечнаму жыццю перад рабалепствам граху. Царкоўныя Таінствы спрыяюць нам Божай ласкаю ў барацьбе са злом, бо яны занадта вялікія, каб брацца з ім спаборнічаць.

3) Праз укрыжаванне цела свайго з яго пажадлівасцю і юрлівасцю:

а) устрыманнем ад пажадлівасці;

б) малітваю за ворага.

Нішто так не разбурае духоўныя і цялесныя сілы, як грэх. Карысць з укрыжавання граху ў нашым целе ведае кожны хрысціянін. *А тыя, Хрыстовыя, укрыжавалі цела з пажадлівасцю і юрлівасцю (Гал. 5, 24).*

5. Значэнне жыцця не паводле цела, а паводле духу

Мудра кажа Апостал: *Бо праз закон я памёр для закону (Гал. 2, 19),* але ў Старым Запавеце закон не меў спрыяльнае сілы, ён толькі казаў, што рабіць і як рабіць. *Гэтага толькі хачу даведацца ад вас: ці ад спраў закону Дух вы прымаеце, ці ад слухання веры? Ці вы такія няцямныя? Пачаўшы духам, цяпер завяршаеце целам (Гал. 3, 2-3)?* А таксама: *Бо Той, Хто дае вам Духа і між вамі цуды робіць, — ці ад спраў закону гэта робіць, ці ад слухання веры (Гал. 3, 5)?*

Дабратворныя сілы дае Хрыстос. *Разам з Хрыстом ўкрыжаваны: жыву не сам, але жыве ўва мне Хрыстос (Гал. 2, 19-20).*

Аўрааму і насенню яго, г. зн. Хрысту, было дадзенае абяцанне (запавет) (Гал. 3, 16). Праз 430 гадоў быў абвешчаны Закон, які не адмяняў абяцанне, дадзенае з прычыну росту злачынстваў. Ён павінен быў дзейнічаць да часу Прыйсця насення, згаданага ў абяцанні. *Дык закон быў для нас настаўнікам, (каб весці) да Хрыста, каб нам апраўдацца верай: а калі прыйшла вера, мы ўжо не*

пад настаўнікам (Гал. 3, 24-25). Закон не супярэчыў абяцанню Божаму. Ізраільцяне жылі нібы жыццём ягняці, прынесенага ў ахвяру, мажучы яго крывёю вушакі. Так і мы жывём ўжо не сваім жыццём, але жыццём Хрыста, які памёр за нас, хоць Ён і ажыў зноў, таму што Ён быў Жыццём паводле існасці, як Бог. Вернікі благаслаўляюцца з верным Аўраамам, а ўсе, хто ўмацоўваецца праз справы Закону, знаходзяцца пад пракляццем. Бог недаступны праз служэнне паволе Закону, а даступны толькі праз Хрыста. Так, кожны, хто вісіць на дрэве, прыраўноўваецца да таго, хто не выконвае цэлы час усяго, што напісана ў Кнізе Закона. А той, хто выконвае Закон, будзе жывы яго выкананнем, хаця Закон не па веры. *А што Законам ніхто не апраўдваецца перад Богам, гэта ясна, бо праведны верою жыць будзе. Закон жа не ад веры, але чалавек, які гэта выконвае, жыць будзе ў гэтым. Хрыстос адкупіў нас ад праклёцця закону, стаўшыся за нас праклёццем, бо напісана: пракляты ўсякі, хто вісіць на дрэве (Гал. 3, 11-13).*

Пакуль мы жылі ў дзяцінстве, мы жылі пад уладаю матэрыяльнага пачатку свету, але калі настала паўналецце, прыйшоў Ісус Хрыстос, каб атрымаць усынаўленне, — а таму Бог паслаў у сэрцы нашыя Духа Сына Свайго, які галосіць: «Авва, Ойча!»: *Гэтак і мы, пакуль былі дзецьмі, былі прыняволеныя стыхіямі свету. Калі ж настала поўня часу, паслаў Бог Сына Свайго (Адзінароднага), які нарадзіўся ад жанчыны і быў пад*

законам, каб адкупіць тых, хто пад законам, каб нам прыняць усынаўленне. А як вы — сыны, дык паслаў Бог ў сэрцы вашыя Духа Сына Свайго, які галосіць: Авва, Ойча! (Гал. 4, 3).

Пасланнем да Галатаў апостал Павел заклікае нас не падпарадкоўвацца ярму няволі, але заставацца на свабодзе, падараванай Хрыстом: *Дык стойце ў волі, якою вызваліў нас Хрыстос, і не падпадайце зноў пад ярмо рабства (Гал. 5, 1).* А таксама: *Скажыце мне, што хочаце быць пад законам: ці ж вы не слухаеце закону? Бо напісана: што Аўраам меў двух сыноў: аднаго ад рабыні, а другога ад вольнае. Але той, што ад рабыні, нарадзіўся паводле цела, а той, што ад вольнае — паводле абяцання. Гэта іншасказ. Бо гэта два Запаветы: адзін — ад гары Сінайскае, што родзіць для рабства, якое ёсць Агар: таму што Агар ёсць гара Сінай ў Аравіі і адпавядае цяперашняму Іерусаліму, і яна ў рабстве разам з дзецьмі сваімі, а вышэйшы Іерусалім вольны, ён — маці ўсім нам. Бо напісана: Весяліся, няплодная, якая не нараджае: загукай і загаласі ты, якая не пакутавала ў родах, бо нашмат больш дзяцей ў пакінутай, чым у той, што мела мужа. Мы ж, браты, — паводле Ісаака, дзеці абяцаныя. Але, як тады народжаны паводле цела ганяў народжанага паводле духу, гэтак жа і цяпер. Што ж кажа Пісанне? Выгані рабу і сына яе, бо сын рабыні не будзе наследнікам разам з сынам свабоднай. Вось жа, браты, мы дзеці не рабыні, але свабоднай (Гал. 4, 21-31).*

Калі ж мы жывём духам, дык паводле духу павінны быць і ўчынкі нашыя. Гэтак мы ўкрыжоўваем грэх з пажадлівасцю і юрлівасцю, у адваротным выпадку грэх укрыжоўвае нас. Калі вораг апануе душу нашую, мы адчуем усю горыч жыцця. Справы духа супрацьлеглыя жаданням цела, — гаворыць апостал Павел, заклікаючы любіць адзін аднаго.

Бо вас, браты, паклікалі на свабоду: толькі каб свабода ваша не сталася сродкам для цела, але любоўю служыце адзін аднаму. Бо ўвесь закон ў адным слове выконваецца: любі бліжняга свайго, як самога сябе. Калі ж адзін аднаго грызяце і заядаеце, сцеражыцеся, каб не знішчылі адзін аднаго. Я ж кажу: кіруйцеся духам і жаданняў цела не выконвайце; бо цела хоча насуперак духу, а дух — насуперак целу: яны адзін аднаму праціваццa, каб вы не тое рабілі, чаго хацелі б. Бо калі дух вас водзіць, вы не пад законам. Бо справы цела выдомыя: гэта пралюбадзейства, распуста, нячыстасць, саромныя ўчынкі, пакладенне ідалам, чарадзейства, варожасць, суперніцтва, зайздрасць, ярасць, раздражненне, спрэчкі, (спакусы), ерасі, нянавісць, забойствы, п'янства, непрыстойнасці і тым падобнае: гэта кажу вам наперад, як і казаў, што тыя, хто гэтак робяць, Царства Божага не ўнаследуюць. Плод жа духа: любоў, радасць, мір, доўгацярплівасць, дабрыня, міласэрнасць, вера, пакорлівасць, стрыманасць: на іх няма закону. Але тыя — Хрыстовыя —

ўкрыжавалі цела з пажадлівасцю і юрлівасцю. Калі мы жывем духам, дык і кіруемся духам. Не будзем задавацца, адзін аднаго дражнячы, адзін аднаму зайздросцячы (Гал. 5, 13-26). Няхай кожны выпрабоўвае сваю справу сам, і тады кожны будзе мецъ пахвалу ў сабе, а не ў іншым, бо кожны будзе несці ўласны цяжар. Тэма пыхі працягваецца і ў наступным раздзеле Паслання да Галатаў, дзе гаворыцца аб тым, што той, хто думае, быццам ён нешта з сябе ўяўляе, будучы нічым, сам сябе зводзіць: *Бо хто думае, што ён ёсць нешта, будучы нічым, розумам сам сабе лісьлівіць (Гал. 6, 3).*

Такім чынам, закон Старога Запавету — гэта агароджа, гарадскія муры, а Новы Запавет нясе людзям волю і любоў.

5-ая частка Сімвалу веры. Пра Уваскрасенне

І ўваскрос на трэці дзень, паводле Пісання

1. Цуд і моц Уваскрасення Хрыстовага

У 4-й частцы Сімвалу веры гаворка ідзе пра служэнне Хрыста як Першасвятара, у 5-7-й частках — як Цара.

7-ы дзень тыдня сімвалізуе для нас час Уваскрасення, калі Хрыстос прыняў смерць за нас і ажыў, і мы прыпадабняемся да Яго духоўна, паміраючы праз Святое Хрышчэнне, каб дачакацца ўваскрасення: *Дык мы пахавалі сябе з Ім*

хрышчэннем у смерць, каб, як Хрыстос уваскрос з памерлых цераз славу Айца, так і нам хадзіць у абноўленым жыцці (Рым. 6, 4). А таксама: *Але цяпер Хрыстос уваскрос з мёртвых, будучы першынцам сярод памерлых (1 Кар. 15, 20)*.

Моц гэтага дагмату напаўняе хрысціяніна шматлікімі асноўнымі цнотамі: *Дык апранайцеся, як абраннікі Божыя, святыя і любыя, у шаты шчодрасці, дабрыні, ціхай мудрасці, лагоды (і) спагадлівай цярплівасці, церпячы адзін аднаго і прабачаючы сабе, калі хто да каго мае жаль: як Хрыстос дараваў вам, гэтак і вы. А паверх усяго апержыцеся любоўю, бо яна — гэта повязь дасканаласці, і няхай у сэрцах вашых запануе Божы спакой, да якога Вы і былі пакліканыя ў адным целе (Кал. 3, 12-15)*.

Калі Хрыстос не ўваскрос, дык дарэмная і наша вера. Уваскрасенне Хрыста — цуд над цудамі, бо Хрыстос, будучы Богам, уваскрасіў Сябе Сваёю Уласнай сілаю. Бл. Аўгусцін кажа: «Адыміце Ўваскрасенне, і хрысціянства будзе пазбаўлена самага галоўнага».

Распад чалавечага цела пачынаецца адразу, як толькі яго пакідае душа. Аднак тлен не закрануў Хрыста. *Але цяпер Хрыстос уваскрос з мёртвых, стаў першынцам сярод памерлых. Бо як смерць праз чалавека, так праз чалавека і ўваскрасенне з мёртвых. Бо як у Адаме ўсе паміраюць, так у Хрысце ўсе ажывуць, кожны сваім парадкам (1 Кар. 15, 20-23)*. А таксама: *Апошні ж вораг*

зnішчыцца — смерць, бо ўсё скарыў пад ногі Яго (1 Кар. 15, 26-27).

Гэтак і для нас падобнае да гэтага вобразу Хрышчэнне — не змыванне цялеснага бруду, але абяцанне Богу чыстага сумлення. Таму і запалілася радасцю сэрца Давідава, пра якое згадваў апостал Пётр: *таму і ўсцешылася сэрца маё, ды зарадаваўся язык мой: дый цела маё прыстане ў надзеі, што не пакінеш душы маёй у пекле, дый не дасі святому Твайму бачыць тленне (Дзеі 2, 26-27).*

У акружэнні Хрыста было шмат такіх, хто хацеў ведаць, якой сілаю Ён здзяйсняе цуды, і нават абвінавачваў Яго ў тым, быццам Ён гэта робіць сілю Вельзевула. Госпад на гэта адказаў: *І калі злы дух злога духа выганяе, дык раздваіўся ён сам у сабе: як жа ўсталюецца царства яго? І калі Я сілаю Вельзевула выганяю нячыстых духаў, дык чыёй сілаю сыны вашыя выганяюць (Мц. 12, 26-27)?*

Ворагі хрысціянства дарма спрабавалі растлумачыць гэты дагмат па-іншаму, снуючы розныя гіпотэзы:

– Аб «выкраданні» Цела Хрыстовага Апосталамі, што ўяўляецца немагчымым з прычыны баязлівасці і недаверлівасці Апосталаў, пільнасці спецыяльна прызначанай сінедрыёнам варты. Пасля Уваскрасення Хрыста ваяроў не аддалі пад суд. Наадварот, яны атрымалі грошы і загад маўчаць пра Ўваскрасенне Хрыста. Паклёп аб «выкраданні» распусцілі варожыя да Хрыста першасвятары ды іудзейскія старэйшыны.

– Аб уяўнай смерці (нібыта Хрыстос знаходзіўся у летаргіі, — у халоднай труне апрытомнеў і выйшаў з магілы); аднак, калі б чалавек з прабітымі нагамі мог бы ўстаць, дык гэта сапраўды быў бы цуд над цудамі.

– Аб уяўных праявах, замарачэнні (упершыню выказана у II стагоддзі Цэльсам, які шмат пісаў супраць хрысціянства). Выказваліся меркаванні, што Уваскрасенне — гэта ілюзорная з'ява. Аднак Хрыста бачыла шмат людзей, не падатных праявам. Яго бачылі ўсе Апосталы і больш за 800 вернікаў.

– Міфалагічная тэорыя (К. Вальней, А. Дрэвэ ды інш.) адмаўляла сапраўднасць існавання Ісуса Хрыста як гістарычнае Асобы і разглядала Яго выключна як факт міфалогіі. Гістарычная школа (Э. Рэнан, Ф. Баўэр, Д. Штраўс ды інш.) лічыла, што евангельская аповесць мае зміфалагізаваныя рэальныя падставы, а Ісус Хрыстос — толькі прапаведнік і настаўнік веры, але не звышнатуральная Асоба. Спроба рацыяналістычнага вытлумачэння біяграфіі Хрыста выклікала сур'ёзную крытыку і неўзабаве была адрынутая большасцю вучоных.

– Фотагенічная тэорыя, якая была абвергнутая: дзякуючы адкрыццю кумранскіх рукапісаў, сфарміравалася новае бачанне і тлумачэнне асобы Ісуса Хрыста.

Хрыстос сышоў у пекла, каб абвясціць там перамогу над смерцю і вызваліць душы, якія з верою чакалі Яго прыйсця. У святочным Велікодным

трапары гаворыцца: «У труне целам, у пекле ж з душою, як Бог, у раі ж з разбойнікам, і на Пасадзе быў Ты, Хрысце, з Айцом і Духам, усё здзейсніў, Неапісальны». Хрыстос быў у раі, як Бог, хоць у хрысціянскай іканаграфіі Хрыстос малюецца, як Чалавек. Пекла — месца, пазбаўленае святла, духоўная вязніца, стан душы, праз грэх адлучанай ад святла і зануранай у цемры і плачу. Гэта месца знаходжання зрынутых анёлаў: *І анёлаў, якія не захавалі сваёй годнасці, але пакінулі сваё жытло (Іуд. 1, 6).* Пра стан Хрыста, ад смерці да Уваскрасення, гаворыцца ў Велікодных спевах: «У труне целам, у пекле ж з душою, як Бог, у раі ж з разбойнікам, і на Пасадзе быў Ты, Хрысце, з Айцом і Духам, усё здзейсніў, Неапісальны». А таксама ў Пасланні апостала Пятра гаворыцца пра абвяшчэнне ў пекле перамогі над смерцю: *Бо і Хрыстос, каб прывесці нас да Бога, раз пацярпеў за грахі нашыя, Праведнік за няправедных, прыняў смерць целам, але ажыў духам, у Якім Ён і тым духам, што былі ў вязніцы, сышоў і абвяшчаў (1 Пят. 3, 18-19).*

2. Сведчанні Святога Пісання аб Уваскрасенні Хрыста

У словах «паводле Пісання» выказана, што Ісус Хрыстос памёр і Уваскрос менавіта так, як пра гэта прароча было напісана ў кнігах Старога Запавету.

Пра Уваскрасенне Хрыста менавіта на трэці дзень сказана ў Першым Пасланні апостала Паўла да Карынфян: *Бо я найперш пераказаў вам тое, што і сам прыняў, што Хрыстос памёр за грахі нашыя паводле Пісання, і што Ён быў пахаваны і ўваскрос на трэці дзень, паводле Пісання (1 Кар. 15, 3-4).*

Пра Уваскрасенне было сказана ў Пісанні Старога Запавету, прычым гэтак ясна, нібыта пракрокі самі знаходзіліся ў месцы Пакут: *Ён жа прыняў раны за грахі нашыя і нёс пакуты за беззаконні нашыя, кара свету нашага на Ім, ранамі Яго мы вылечыліся (Іс. 53, 5).* Сапраўды, мы вылечыліся Яго ранамі і смерцю. За гэтае прадказанне Ісая быў названы старазапаветным евангелістам. *... няма ў Ім ані выгляду, ані велічы; і мы бачылі Яго, і не было ў Ім ні выгляду, ні прывабнасці: выгляд Яго быў пазбаўлены гонару, і прыніжаны горш за ўсіх сыноў чалавечых: Чалавек гэты ў ранах, спакутаваны ў хваробах, і мы адварочвалі твар свой ад Яго, зганьбаванага, і пагарджалі Ім. Ён грахі нашыя носіць і за нас пакутуе, а мы думалі, што Ён нясе пакуты і раны, ад Бога пакараны. Ён жа прыняў раны за грахі нашыя і пакуты за беззаконні нашыя, кары свету нашага на Ім, ранамі Яго мы вылечыліся. Усе мы, як авечкі, заблукалі: кожны збіўся са шляху свайго, і Госпад усклаў на Яго грахі за ўсіх нас. І Той, хоць цвілілі Яго, не размыкае вуснаў Сваіх: як авечка, якую вядуць, каб закалоць, і як Ягня перад тым, хто стрыжэ*

яго, не падае голасу, так Ён не размыкае вуснаў сваіх (Іс. 53, 2-7).

Таксама і ў Дзеях Апосталаў ёсць спасылка на псалом 115 прарока Давіда: *Бо не пакінеш душы маёй у пекле, ды не дасі Святому Твайму бачыць тленне (Дзеі 2, 27).* Тут не менш дакладна нам прадказана пра Уваскрасенне Хрыста. Прычым гэта не багаслоўскія высновы: сам апостал Пётр адносіць гэтае месца Кнігі Ісаі да Хрыста. Апосталы былі асцярожныя, і толькі пасля Зыходу на іх Святога Духа Пётр гаворыць казанне да Іудзеяў пра Уваскрасенне Таго, Каго яны ўкрыжавалі.

Прарочы вобраз трохдзённага Уваскрасення пададзены ў кнізе прарока Іоны. Правобразам трохдзённага Уваскрасення Хрыста было трохдзённае знаходжанне прарока Іоны ў чэраве кіта. *І быў Іона ў чэраве кіта тры дні і тры ночы (Іона 2, 1).* Пра гэта пазней былі словы Самога Хрыста: *Род нягодны і чужаложны знакаў шукае: і знакі не будуць дазеныя яму, апрача знаку прарока Іоны (Мц. 16, 4).*

Сведкаў цуду Уваскрасення Хрыста было багата. Непрыяцелі даведаліся пра цуд першыя. Гэта былі ваяры, што сцераглі магілу Хрыста, бо Анёл Божы адваліў камень, які закрываў Магілу, і здарыўся землятрус, ад якога яны ў страху ўцяклі да сінедрыёну. Але сэрцы іх скамянелі, яны не ў стане былі ўспрыняць вестку аб Уваскрасенні Хрыста. І хаця яны атрымалі грошы за маўчанне, усё ж распавялі пра гэтую падзею найбліжэйшым сваякам, і ўвесь Іерусалім загаварыў пра здарэнне.

Уваскрэслы Хрыстос з'яўляўся перад:

- двума падарожнікамі, Сваімі вучнямі, апосталамі Лукой і Клеопам, што ішлі ў Эмаўс, якія спачатку не пазналі Яго (Лк. 24, 13-35);
- жанчынамі-міраносіцамі, калі тыя ішлі да Апосталаў (Мц. 28, 9-10);
- Марыяй-Магдаленай, якая плакала ля Гасподняе Магілы (Ін, 20, 14-18);
- апосталам Пятром (Лк. 24, 34), (1 Кар. 15, 5);
- усімі Апосталамі, апрача апостала Фамы, праз зачыненыя дзверы дому (Мк. 16, 14), (Лк. 24, 36-44), (Ін. 20, 19-25);
- Апосталамі, з Фамой уключна (Ін. 20, 26-29);
- апосталам Якубам (1 Кар. 15, 7);
- семярымі вучнямі на моры Тыверыядскім (Ін. 21);
- усімі Апосталамі на працягу 40 дзён, ды разам з імі больш як перад пяццю сотнямі вернікаў (Мц. 28, 16-20), (1 Кар. 15, 6);
- Апосталамі на 40-ы дзень, калі Ён благаславіў іх і Узнёсся з Аліўнай гары [гары Элеон] на Неба. Калі аблокі схавалі Яго, перад Апосталамі з'явіліся Анёлы і паведамілі пра будучае Другое Прыйсце (Лк. 24, 50-53), (Дзеі 1, 1-11).

Такая колькасць сведчанняў пацвярджае сапраўднасць Уваскрасення Хрыстовага. Няма сумневу, былі таксама іншыя, менш вядомыя, аб'яўленні Хрыста пасля Уваскрасення.

6-ая частка Сімвалу веры. Пра Узнясенне

І узышоў на неба, і сядзіць праваруч Айца

Узнясеннем Госпад паказаў, што Ён увайшоў у тую Славу Айцову, у якой Ён быў да стварэння свету. Гэтая падзея — вянец збавення чалавека — не раз адлюстроўвалася ў месіянскіх месцах Святога Пісання.

У Старым Запавеце Узнясенне Хрыстовае было прадказана шмат разоў. Гэты цуд над цудамі мог бы здарыцца і без прароцтва ў Старым Запавеце. Але Псалмапевец бачыць дзівосную падзею Узнясення Хрыстовага: *Расчыняйце, брамы высокія! Але, расчыняйцеся, брамы адвечныя, каб увайшоў Цар Славы. Хто ж гэты Цар Славы? Госпад моцны і магутны, Госпад дужы ў барацьбе. Расчыняйце, брамы высокія! Але, расчыняйцеся, брамы адвечныя, каб увайшоў Цар Славы! Хто ж гэты Цар Славы? Госпад войскаў нябесных — Ён ёсць Цар Славы (Пс. 23, 7-10)!*

Блажэнны Тэадарыт гаворыць: «Давід паказвае сашэсце Хрыста, і Анёлы бачаць дзівоснае відовішча, якое адбылося ад пачатку вякоў».

Давід таксама, прадказваючы Узнясенне Хрыста, выкарыстоўвае ў адносінах да яго займеннік «Ты»: *Ты ўзышоў на вышыню і паланіў палон; Ты дары прыняў дзеля людзей, каб нават тыя, што працівяцца, маглі пры Госпадзе жыць (Пс. 67, 19).* Дзверы, што стаялі зачыненыя, расхінуліся перад

Хрыстом, і Ён прыняў дары, каб збаўляць людзей. Потым пра тое, што Хрыстос узышоў на вышыню, вышэйшую за ўсе нябёсы, г. зн. вышэй за ўсіх, будзе сказана ў Новым Запавеце, у Пасланні да Эфесцаў: *Той, хто сышоў, — гэта Той, хто ўзышоў вышэй за ўсе нябёсы, каб здзейсніць усё. І Ён паставіў адных Апосталамі, іншых прарокамі, адных евангелістамі, іншых пастырамі і настаўнікамі, дзеля святых учынкаў, дзеля служэння, на будаванне Цела Хрыстовага (Эф. 4, 10-12).*

Прарок Захарыя гаворыць аб Тым, Хто падзеліць на два бакі гару Аліўную [гару Элеон]. І *многія стануць з Ім на гары Аліўнай* і ўвойдуць у Царства Яго, і ўсе народы з іх уладарамі будуць падпарадкоўвацца Яму: *І пастануць таго дня ногі Яго на гары Аліўнай, што стаіць проста на Усход перад Іерусалімам; і расколецца напалам гара Аліўная: палова яе на Усход, а другая палова да мора — вялізным прагалам, і адыдзе палова гары на поўнач, і палова яе — на поўдзень (Зах. 14, 4).*

Нарэшце, Данііл упершыню называе Хрыста Сынам Чалавечым: *І ў іншых звяроў аднятая была ўлада, і працяг жыцця дадзены ім быў толькі да пары да часу. Бачыў я ноччу ў сне, як па аблоках нябесных Сын Чалавечы ішоў, дайшоў да Старога днямі і быў падведзены да Яго: і дадзеная Яму была ўлада, і слава, і Царства, і ўсе людзі, плямёны і народы служылі Яму; улада Яго, улада вечная, яна не міне, і Царства Яго не загіне (Дан. 7, 12-13).*

Сын Чалавечы — уласнае імя Хрыста, Які ішоў да Прадвечнага і прыняў уладу і Славу. Госпад Сам назваў сябе Сынам Чалавечым, у тым ліку і перад Укрыжаваннем, калі Кайяфа, пачуўшы яго словы, разадраў на сабе вопратку.

Што датычыцца Новага Запавету, дык тут не аднойчы паўтараецца, што Госпад, будучы Сынам Чалавечым, узышоў на Неба, і узышоў з целам праслаўленым, целам новым, баганосным, і сеў праваруч Айца. Паколькі Бог Усюдыісны, тое, што Хрыстос сядзіць праваруч Айца, належыць разумець у сэнсе духоўным, г. зн. як тое, што Ісус Хрыстос мае такую самую магутнасць і Славу, што і Бог Айцец. Правая рука, правы бок — сімвал моцы, велічы. Госпад увайшоў у Славу, магутнасць і веліч Айца, заўсёды ідзе да Яго і сыходзіць ад Яго, як улагаджальная Ахвяра. *Мы маем такога Архірэя, які сеў праваруч пасаду велічы на небе (Яўр. 8, 1).*

Ён з існасцю чалавечай узышоў на Неба, але не з той, якую маем мы (тлен і попел), але з праслаўленым, нятленным целам. Ён са сваёй славай увайшоў на Неба, і яна адкрыецца на зямлі, калі папоўніцца лік абраннікаў Божых. Пра гэтую праўду больш за ўсё і гаворыцца ў Пісанні:

І адказаў Пётр: за Хрыста Божага. Але Ён строга загадаў ім нікому не гаварыць аб гэтым, сказаўшы, што Сын Чалавечы мусіць вынесці шмат пакут, і спакусаў, (...) і будзе забіты, і на трэці дзень уваскрэсне (Лк., 9, 20-22).

Бо хто пасаромееецца Мяне і Маіх слоў, таго Сын Чалавечы пасаромееецца, калі прыйдзе ў славе Сваёй і Айца і Святых Анёлаў (Лк. 9, 26).

Будзьце ж і вы гатовыя, бо Сын Чалавечы прыйдзе ў такую часіну, аб якой не думаеце (Лк. 12, 40).

Бо, як маланка выблісне з усходу і відаць да захаду, так будзе прыход Сына Чалавечага (Мц. 24, 27).

І тады з'явіцца знак Сына Чалавечага на небе: і тады заплачуць усе плямёны зямныя і ўгледзяць Сына Чалавечага, што ідзе па аблоках нябесных з сілаю і славаю вялікай (Мц. 24, 30).

Бо як Айцец мае жыццё ў Сабе, так і Сыну даў жыццё ў Сабе, і даў Яму ўладу і суд чыніць, бо Ён ёсць Сын Чалавечы (Ін. 5, 26-27).

7-ая частка Сімвалу веры. Пра Другое Прыйсце

І прыйдзе са славаю судзіць жывых і мёртвых, Яго ж Царству не будзе канца.

1. Вызначальныя рысы Другога Прыйсця Хрыста

Падчас Узнясення Гасподняга Анёлы з'явіліся перад Апосталамі і абвясцілі ім пра будучае Прыйсце Хрыста: *гэты Ісус, узяты ад вас на*

неба, прыйдзе гэтаксама, як бачылі вы Яго, калі ўзыходзіў на неба (Дзеі 1, 11).

Слава, з якою Госпад узышоў на Неба, уласцівая не толькі небу, але і зямлі, толькі на зямлі запануе яна тады, калі надыдзе час, наканаваны чалавецтву: *пакуль не праміне неба і зямля, ніводная ёта, ці ніводная рыса не праміне з закону, пакуль не здзейсніцца ўсё (Мц. 5, 18).* Са Славаю Госпад узышоў на Неба, са Славаю і прыйдзе. Госпад шмат разоў гаворыць і пра пакуты Свае, і пра Славу, кажучы, што надыдзе час, калі Сын Чалавечы прыйдзе судзіць у Славе і адлучыць авец ад казлоў, інакш кажучы, гэта будзе Прыйсце без такога прыніжэння, як першы раз: *Калі ж прыйдзе Сын Чалавечы ў Славе Сваёй і ўсе святыя Анёлы з Ім, тады сядзе на пасадзе славы Сваёй. І збяруцца перад Ім усе народы; і адлучыць іх адзін ад аднаго, як пастух адлучае авец ад казлоў; і паставіць авец праваруч ад Сябе, а казлоў леваруч. Тады скажа Цар тым, хто праваруч Яго: прыйдзіце, благаслаўлёныя Айца Майго, наследуйце Царства, прызначанае вам ад стварэння свету. Бо хацеў Я есці, і вы накармілі Мяне, смяг, і вы напаілі Мяне, быў здарожаны, і вы прынялі Мяне. Быў голы, і вы апранулі Мяне, быў хворы, і вы наведалі Мяне, быў у вязніцы, і вы прыйшлі да Мяне. Тады праведнікі скажуць Яму ў адказ: Госпадзе! Калі мы бачылі Цябе галоднага і накармілі? Ці прагнага — і напаілі; калі мы бачылі Цябе здарожанага — і прынялі? Ці голага — і апранулі? І Цар скажа ім у адказ:*

сапраўды кажу вам: тое, што вы зрабілі аднаму з гэтых меншых братоў Маіх, вы зрабілі Мне. Тады скажа і тым, што леваруч: ідзіце ад Мяне, праклятыя, у агонь вечны, прызначаны д'яблу і анёлам яго: бо Я быў галодны, і вы не далі Мне есці, смяг, і вы не напаілі Мяне, быў здарожаны, і не прынялі Мяне, голы, і не апранулі Мяне, быў хворы і ў вязніцы, і не наведалі Мяне. Тады і яны скажуць Яму ў адказ: Госпадзе! Калі мы бачылі Цябе галоднага, ці прагнага, ці здарожанага, ці голага, ці хворага, ці ў вязніцы — і не паслужылі Табе? Тады скажа ім у адказ: сапраўды кажу вам, як не зрабілі гэтага аднаму з гэтых меншых — не зрабілі і Мне. І пойдуць тыя на вечную пакуту, а праведнікі ў жыццё вечнае (Мц. 25, 31-46).

Калі Царква — Царства Божае на зямлі — агарне ўсе народы, незалежна ад месца, тады Госпад запануе ў гэтым Царстве навек. Гэта не адчувальнае Царства, яно вышэй за ўсё адчувальнае.

Другое Прыйсце будзе ў Славе, у адрозненне ад першага, якое было ў прыніжэнні, дзеля збавення чалавецтва. У Другім Прыйсці Госпад прыйзе не збаўляць, але судзіць, каб адмераць кожнаму паводле справаў яго. Адкрыецца ўрачысты, Страшны суд, для якога ўскрэснуць усе: … *але ўсе пераменімся неўзабаве, у імгненне вока, пры апошняй трубе (1 Кар. 15, 51-52).* Гэтым Прыйсцем Госпад пакладзе крэс цяперашняму нястройнаму ладу рэчаіснасці і дасць пачатак Царству, якому не будзе канца. Пра гэта гаворыцца ў прароцтве Данііла: *Бачыў я ноч-*

чу ў сне, як па аблоках нябесных Сын Чалавечы ішоў, дайшоў да Старога днямі і быў падведзены да Яго: і дадзеная Яму была ўлада, і слава, і Царства, і ўсе людзі, плямёны і народы служылі Яму; улада Яго, улада вечная, яна не міне, і Царства Яго не загіне (Дан. 7, 13-14). У Новым Запавеце мы чуем з вуснаў Архангела Гаўрыіла сказанае Дзеве Марыі: *Ён будзе вялікі і Сынам Найвышэйшага назавецца (Лк. 1, 32),* падобна да таго, як спадкаемец аднаўляе падарваны царскі пасад.

Суд Гасподні Яго Другога Прыйсця карэнным чынам адрозніваецца ад чалавечага судаводства. Гэты суд не вымагае доказаў, таму што ўсе выкананыя ўчынкі прамаўляюць самі за сябе. Гэта суд нашага сумлення, якое скажа, хто мы такія. Знікне ўсялякі падман і самападман. Гэта можна бачыць, па-першае, на прыкладзе Адама, які сам пабачыў сваю галізну. Па-другое, пры спатканні з тым, хто зазнаў ад нас крыўду, мы губляем спакой і пазбягаем сустрэчы з ім, што і выкрывае нас ужо тут, а тым болей, на Страшным судзе, калі Госпад будзе нас судзіць. Ісус сказаў іудзеям тады, калі яны шукалі Яго, каб забіць за тое, што вылечваў хворых у суботу, парушаючы яе: *... бо надыдзе час, калі ўсе, хто ў магілах, пачуюць голас Сына Божага, і выйдуць, хто чыніў дабро, на ўваскрашэнне жыцця, а хто чыніў благое — на ўваскрашэнне суда (Ін. 5, 28-29).*

Госпад высветліць усё, што рабілася ў змроку начным, і выявіць сардэчныя намеры кожнага. У

кага сэрца чыстае, той не засаромееццa, і наадварот. Апостал Павел вучыць не мудрагеліць звыш таго, што напісана, бо аднаму Богу вядомыя нашы патаемныя думкі: *Дзеля гэтага не судзіце заўчасна, пакуль не прыйдзе Госпад, які высветліць схаванае ў цемры і выявіць думкі сэрцаў; і тады пахвала будзе кожнаму ад Бога (1 Кар. 4, 5).*

Госпад адплачвае не толькі за ўчынкі, але і за словы, і асудзіць нас таксама за благія словы або думкі, калі яны не будуць загладжаныя пакаяннем, верай і выпраўленнем жыцця. Так, у Евангеллі ад Мацвея Госпад выкрывае фарысеяў, якія казалі, быццам Ён выганяе д'яблаў моцаю вельзевула, князя д'ябальскага, і гаворыць пра тое, што трэба даражыць словам, бо знеслаўленне Святога Духа не знойдзе даравання ні ў гэтым жыцці, ні ў будучым: *Кажу ж вам, што за ўсякае пустое слова, якое скажуць людзі, дадуць яны адказ у дзень суда (Мц. 12, 36).*

2. Час і прыкметы Другога Прыйсця

Пры ўсёй яскравасці Другога Прыйсця Гасподняга ў евангельскім апавяданні пра яго дзень і гадзіну не ведае ніхто, нават Анёлы, апроч самога Бога. Таямнічасць ў адносінах да прадказаных падзей увогуле ўласцівая Святому Пісанню, што мае вялікае выхаваўчае значэнне. Калі б мы ведалі, што адбудзецца пасля кожнага нашага ўчынку, яны зводзіліся б да звычайных механічных дзеянняў. Але

Госпад схаваў гэта ад нас, каб выхаваць у нас свабодную схільнасць да дабра, каб мы рабілі яго добраахвотна. Бог не марудзіць з выкананнем абяцання, як лічаць некаторыя, але доўга церпіць, жадаючы, каб усе прыйшлі да пакаяння: *Не марудзіць Госпад з абяцаным, як гэта некаторыя за маруднасць прымаюць, але доўга церпіць нас, не хочучы, каб нехта загінуў, але каб усе прыйшлі да пакаяння. Прыйдзе ж дзень Гасподні, як злодзей уночы, і тады нябёсы з шумам пройдуць (2 Пят. 3, 9-10).* Пакуль яшчэ не досыць папоўнілася лічба праведнікаў і не надышоў час прывядзення да пакаяння.

Прыпавесцю аб пяцярых мудрых і пяцярых неразумных дзяўчатах Госпад навучае нас заўжды пільнавацца і рупіцца пра здабыццё Святога Духа: *Дык не спіце, бо не ведаеце ні дня, ні гадзіны, калі прыйдзе Сын Чалавечы (Мц. 25, 13).*

Хоць не выканаўся дагэтуль прадвызначаны час Прыйсця, не папоўнілася лічба абраннікаў, тым не менш, пададзеныя яго прыкметы, і іх досыць багата:

- змяншэнне веры;
- змяншэнне любові між людзей;
- павелічэнне беззаконнасцяў і зла, адступленне ад Бога;
- павелічэнне стыхійных бедстваў;
- абвяшчэнне Евангелля ўсім народам;
- прыйсце антыхрыста.

Усе гэтыя прыкметы будуць паступова ўзмацняцца, выяўляцца ў шэрагу штораз больш тон-

кіх і дасканалых беззяконнасцяў, аж да прыйсця антыхрыста.

3. Вучэнне пра антыхрыста

Бо патаемна ўжо робяцца беззаконнасці (2 Фес. 2, 7), — пісаў апостал Павел. Свет будзе знаходзіцца пад уладаю антыхрыста, які шмат каго будзе спакушаць, сам жа ён будзе цалкам пад уладаю д'ябла.

Існуюць чатыры спосабы барацьбы д'ябла з Госпадам:

1. Спакушэнне самога Госпада ў пустыні.

2. Напад на людзей, каб перашкодзіць справе Божай. Такія праявы здараліся яшчэ ў часы Хрыста — гэта былі выпадкі апантанасці ў Палестыне. Але Госпад пасылаў Сваіх вучняў, каб тыя выганялі чарцей і вылечвалі апантаных.

3. Пакуты і смерць Госпада, Уваскрасенне і Узнясенне Яго на Неба (Лк. 22, 53), якія складаюць ужо адкрыты трыумф Госпада над усімі сіламі смерці і цемры (да Узнясення Гасподняга дэманы, гэтаксама, як іншыя Анёлы, мелі свабодны доступ да Неба).

4. Выгнанне з Неба ўяўляе з сябе вырашальную эпоху ў гісторыі князя цемрадзі, якая падзяляецца на чатыры перыяды:

1) Улада на зямлі і на Небе да Прыйсця Хрыста.

2) Першым Прыйсцем Ісуса Хрыста д'ябал быў выгнаны з Неба, але яшчэ мае ў якасці поля дзейнасці зямлю.

3) Спакуснік павязаны і зрынуты з зямлі ў бездань, як некалі быў зрынуты з Неба на зямлю.

4) Пасля кароткачасовага вызвалення з бездані ён будзе паддадзены канчатковаму, вырашальнаму Суду і трапіць у геену вогненую, з якой ніколі не зможа вызваліцца.

Дух апошніх часоў вымагае, каб з'явіўся, нарэшце, нейкі антыхрыст. Некаторыя мяркуюць, што гэта толькі дух часу, але насамрэч гэта пэўная асоба, супрацьлеглая Хрысту. Ён будзе валодаць усёй сілаю д'ябла, якую той перакажа яму, сядзе на зямным пасадзе і будзе імкнуцца вынішчыць хрысціянства, але сам загіне жахлівым чынам.

Госпад кажа: *Але як прыйдзе Сын Чалавечы, ці знойдзе веру на зямлі (Лк. 18, 8)?* Настане час, калі ўсе адзін аднаго пачнуць ненавідзець, з'явяцца лжэпрарокі і лжэхрысты, будуць паступова ўзмацняцца беззаконнасці і ўціск супраць вызнаннікаў Евангельскай праўды. Менавіта ў дачыненні да гэтых часоў сказаныя былі словы апостала Паўла пра патаемнае беззаконне ў дзеянні. І усё ж нават ў цяжкія дні знаходжання антыхрыста на зямлі Госпад не пакіне Сваіх верных слугаў, колькасць якіх скароціцца да крайніх межаў, — і Царква ўстоіць (Мц. 24).

У гэты час будуць пасланыя двое сведкаў, Ілля і Энох, якія будуць весці зацятую барацьбу з антыхрыстам, і калі будзе здавацца, што ўсяму канец і зло перамагло, Госпад пашле Анёла з сямю язвамі, і прыйдзе Госпад, Які ў Другім Сва-

ім Прыйсці пераможа антыхрыста *духам вуснаў Сваіх (2 Фес. 2, 8).*

У акадэмічнай працы прафесара МДА А. Д. Бяляева «Пра бязбожжа і антыхрыста» (СПб, 2007) сабрана і пракаментавана ўсё, што пісалася або гаварылася пра антыхрыста, прыкметы яго прыйсця, пачынаючы з Апостальскіх часоў. Гэтае сачыненне было сапраўднай падзеяй у царкоўным жыцці Расіі і атрымала прызнанне дзякуючы сваёй глыбіні, сістэматычнасці і строга праваслаўным поглядам на самыя гарачыя пытанні, якія датычацца праблем прышлых лёсаў кожнай асобы і ўсяго чалавецтва.

4. Тры віды Царстваў

Мы маем тры віды Царстваў: Царства прыроды (цэлы свет), Царства ласкі Божай (Царква Хрыстовая, якая аб'ядноўвае ўсіх вернікаў на зямлі), пра якое сказана: *Сапраўды, кажу вам: не будзе зводу гэтаму роду, як ўсё гэта станецца (Мк. 13, 30),* а таксама Царства славы, якому не будзе канца і якое яшчэ не пачыналася. Царства славы не мае пачатку, яно ў Бозе, а першыя два Царствы маюць пачатак і канец. У Сімвале веры гаворыцца пра Царства славы. Аб трэцім Царстве мы молімся і ў малітве да Айца Нябеснага.

Калі чалавек «захварэў» на грэхападзенне, свет ператварыўся ў шпіталь. Адсюль заклік: *Пакайцеся, бо наблізілася Царства Нябеснае (Мц.*

4, 17). Па меры вызвалення з граху настае Царства Божае ласкі, і па меры поўнага ачышчэння ад граху надыходзіць Царства славы. Калі ж запануе Царства славы, ніхто і памысліць не зможа аб тым, якая слава чакае тых, хто варты яе. Архангел Гаўрыіл гаворыць Дзеве Марыі пра бясконцасць Царства ласкі Божае і будучага Царства Славы: *Ён будзе вялікі і Сынам Найвышэйшага назавецца, і дасць Яму Госпад Бог пасад Давіда, бацькі Яго, і цараваць будзе над домам Якуба навекі, і Царству Яго не будзе канца (Лк. 1, 32-33).* Словы пра бясконцасць Царства Хрыстовага былі ўключаныя ў Сімвал веры на II Сусветным саборы для абвяржэння ерэтычных меркаванняў Маркела, якія лічыў, нібыта Царства Хрыста скончыцца разам са сканчэннем часоў.

8-ая частка Сімвалу веры. Пра Святую Тройцу

І ў Духа Святога, Госпада, жыццядайнага, Які зыходзіць ад Айца, Якому нароўні з Айцом і Сынам пакланенне і слаўленне належаць, Які вяшчаў праз прарокаў.

1. Боская існасць Святога Духа

Святы Дух называецца Госпадам як сапраўдны Бог. Усе праўды знаходзяцца вакол трох галоўных праўд. Да першай праўды, пра Бога Творцу, Які

ўсяму свету лёс наканаваў, належыць стварэнне Богам свету, бачнага і нябачнага. Да другой праўды, пра Бога Адкупіцеля, Сына Чалавечага, належыць стварэнне чалавека, яго падзенне і таямніца адкуплення яго праз Бога Сына. Да трэцяй праўды, пра Святога Духа, належыць нашае асвячэнне, засваенне намі Духам Святым тых дабратворных дароў, якія праз свае Крыжовыя Пакуты выпрасіў Госпад. Святы Дух прысвойвае кожнаму паасобку плады Галгофскае Ахвяры.

Другі Сусветны сабор асудзіў ерась Македонія, які прыніжаў Святога Духа, лічыў Яго службовым духам Айца і Сына і абражаў Яго Боскую годнасць. Македонія адлучылі ад Царквы і склалі 8-ую частку Сімвалу веры пра Святога Духа, называючы Яго Госпадам. Госпадам на першым саборы быў названы Сын Божы, а на Другім саборы Госпадам назвалі таксама Святога Духа, маючы на ўвазе выпадак з Ананіяй і яго жонкаю Сапфірай. Паводле Апостальскага звычаю, той, хто далучаўся да абшчыны, павінен быў уносіць сваю маёмасць, аднак Ананія і яго жонка ўтаілі частку ад сваёй маёмасці і такім чынам зманілі Святому Духу, г. зн. Богу. Апостал Пётр сказаў Ананіі: *Ананія, Ананія, чаму напоўніў шатан сэрца тваё, каб ашукаць Духа Святога ды прыхаваць з цаны за зямлю? (...) Не людзей ты ашукаў, а Бога (Дзеі 5, 3-5).*

Айцамі Другога Сусветнага сабору Сімвал веры быў складзены настолькі поўна, што Трэці

Сусветны сабор ў сёмым правіле забараніў складаць новы Сімвал веры. Прап. Іаан Дамаскін у «Дакладным выкладзе праваслаўнай веры» навучае: «пра Духа Святога гаворым, што зыходзіць ад Айца, і Духам Айцовым называем: пра Духа ж ад Сына ніяк не кажам, але дакладна Яго Духам Сыноўскім называем».

2. Уласцівасці Святога Духа

Святы Дух валодае Боскімі ўласцівасцямі ўсёведання, усюдыіснасці, усёмагутнасці, жыццядайнасці. Зыход з'яўляецца Асабістаю, або Іпастаснаю ўласцівасцю Святога Духа.

Святы Дух такі самы ўсёведны, як і Бог Айцец. Вуснамі Хрыста сказана, што гэта Дух праўды: *Калі ж прыйдзе Ён, Дух Праўды, навучыць вас усякае праўды (Ін, 16, 13).* Хрыстос гаворыць, што прыйдзе Суцяшыцель, Якога дасць Бог Айцец, навучыць нас і абвесціць будучыню — гэта Дух Праўды: *(і) калі нешта папросіце ў імя Маё, Я зраблю. Калі любіце Мяне, выконвайце мае Запаведзі, і Я ўпрашу Айца, і Ён дасць вам іншага Суцяшыцеля, каб быў з вамі давеку, Духа праўды, якога свет не можа прыняць, бо не бачыць Яго, і не ведае Яго: вы ж ведаеце Яго, бо Ён з вамі ёсць і будзе (Ін. 14, 14-17).* А таксама: *Калі ж прыйдзе Суцяшыцель, Яго Я пашлю вам ад Айца, Дух Праўды, Які ад Айца зыходзіць, Ён будзе сведчыць аба Мне, дый вы сведчыць будзеце таксама, бо вы*

ад пачатку са Мной (Ін. 15, 26-27). Апостал кажа: *але гаворым Мудрасць Божую, у таямніцы схаваную, якую прадвызначыў Бог спрадвеку дзеля славы нашае, а якую ніхто з князёў веку гэтага не разумее: бо каб разумелі, не ўкрыжавалі б Госпада Славы. Але, як напісана было: чаго вока не бачыць, і вуха не чуе, і што да сэрца чалавеку не ўзыходзіла, тое наканаваў Бог тым, хто любіць Яго. А нам Бог адкрыў Духам Сваім: бо Дух усё прасякае, і глыбіні Божыя (1 Кар. 2, 7-10).*

Усюдыіснасць азначае, што Святы Дух адначасова прысутнічае ва ўсіх душах вернікаў. Апостал Павел ў Пасланні да Эфесцаў гаворыць аб тым, што праз дзеянне Святога Духа мы робімся сынамі Божымі: *бо праз Яго маем абое доступ да Айца ў адным Духу (Эф. 2, 18).*

Дух Святы настаўляе ўсіх служыцеляў Царквы *(Дзеі 20, 28).*

Бог Айцец, Бог Сын, Бог Святы Дух маюць ўласцівасць надаваць жыццё ўсяму жывому, усім стварэнням: *Дух ажыўляе, цела не дае ніякае карысці. Словы, якія кажу Я вам, ёсць дух і жыццё (Ін. 6, 63).*

Жыццядайнасць ўласцівая толькі Богу, стварэнні надаваць жыццё не могуць. Гэтую думку развіваў псалмапевец Давід: *Ты адварочваеш аблічча Тваё — і тузаюцца яны ў жаху; дух адымаеш у іх — і знікаюць яны і ў пыл назад абяртаюцца. Пашлеш Духа Твайго — і паўстануць яны, і аблічча зямлі Ты абновіш (Пс. 103, 29-30).*

Дзеянне Духа незразумелае, але адчувальнае, яно ў аднаўленні, адбудове чалавека: *калі хто не народзіцца вадою і Духам, не можа ўвайсці ў Царства Божае (Ін. 3, 5)*.

Святы Іаан Залатавусны гаворыць у Слове на Святы Вялікдзень: «Калі жыццё жыве на зямлі, дык гэтым мы абавязаны Духу Святому». Давід гаворыць пра ролю Духа ў чалавечым жыцці: *Усе яны на Цябе чакаюць, каб Ты даў есці ім у належны час (Пс. 103, 27).* І адсюль заклік у псалме: *Усякае дыханне няхай славіць Госпада (Пс. 150, 6)!* Наадварот, недапушчальна ганіць Духа: паводле слоў Хрыста, — *блюзнерства супраць Духа не даруецца чалавекам (Мц. 12, 31).*

Словамі *які зыходзіць ад Айца* ўказваецца на Боскае паходжанне Духа Божага. Дух спрадвеку зыходзіць ад Бога Айца, гэтаксама, як і Сын спрадвеку Нараджаецца ад Айца. Гаворачы *ад Айца*, Хрыстос тлумачыць вучням, што Ён хоча прасіць для іх Суцяшыцеля, тым самым указваючы на падставу праваслаўнай веры: *Калі ж прыйдзе Суцяшыцель, якога Я пашлю вам ад Айца, Дух Праўды, Які ад Айца зыхозіць, Ён будзе сведчыць аба мне (Ін. 15, 26).* У гэтым пункце веравучэння ў Праваслаўі ёсць прынцыповыя разыходжанні з Рымска-каталіцкім вучэннем аб зыходзе Святога Духа ад Айца і Сына (Filioque), якое не мае падстаў ні ў Святым Пісанні, ні ў творах Св. Айцоў Старажытнае Царквы. Вартыя ўвагі ў сувязі з гэтым творы вядомых царкоўных дзеячоў,

асветнікаў XVII-XVIII ст. братоў Ліхудаў, «Мечык духоўны», напісаны ў 1690 г. ў форме дыялогаў, пра адрозненні паміж Праваслаўнай і Рымска-каталіцкай Цэрквамі (СПб, 2011), а такама твор грэцкага епіскапа Іллі Міняція «Камень спакусы, або выклад пачатку і прычын адпадзення Царквы Заходняе ад Усходняе і прадметаў нязгоды паміж імі» (СПб, 2010).

Пра усёмагутнасць Святога Духа сказана ў псалме Давіда: *Словам Гасподнім нябёсы ўмацаваныя, і Духам вуснаў Яго ўся сіла іх (Пс. 32, 6).* Майсей згадвае ролю Святога Духа ў стварэнні сусвету. Дух саграваў, ажыўляў бездань і ўкладаў у яе тое, што ператварыла яе ў жывое адзінства: *і Дух Божы лунаў над абліччам вады (Быц. 1, 2).*

Хрыстос абяцаў даравацъ ласку Духа Святога, якая павінна была навучаць служыцеляў Царквы: *Пільнуйце ж самі сябе і ўвесь статак, бо ў ім Дух Святы паставіў вас за епіскапаў, каб пасвіць Царкву Госпада і Бога, якую прыдбаў Ён Уласнаю крывёю (Дзеі 20, 28).*

Словы: *Якому разам з Айцом і Сынам належыць пакланяцца*, азначаюць, што Духу Святому належыць пакланяцца ў гэткай самай ступені, што і Айцу, і Сыну. Гэта вынікае са слоў Хрыста. Гаспад, пасылаючы сваіх вучняў, гаворыць: *Дык ідзіце, навучайце ўсе народы, хрысцячы іх у імя Айца і Сына і Святога Духа (Мц. 28, 19).*

3. Дзеянне Святога Духа праз прарокаў і Апосталаў

У Сімвале веры ёсць словы: *Які гаварыў праз прарокаў.* Сапраўды, Святы Дух прамаўляў вуснамі прарокаў Старога Запавету. Самастойна чалавек не мог дайсці да разумення глыбіні і вышыні Боскага вучэння і слухаў прарокаў. Прарок Давід сказаў у псалме: *Дух Гасподні гаворыць ува мне, і слова Яго на языку маім (2 Цар. 23, 2).*

Аднак ерэтыкі, у прыватнасці, гностыкі I стагоддзя, спрабавалі гэта адмаўляць. Яны казалі, што Апосталы сапраўды былі перапоўненыя Святым Духам, а прарокаў, нібыта, апаноўваў злы дух Бэліял [Веліяр], і малявалі Бога як жорсткага мсціўцу, тым самым адварочвалі людзей ад Бога сапраўднага, і таму шмат хто збочваў у ерась паганства, г. зн. служэння д'яблу. Яны казалі, што ў Старым Запавеце Бог паказаны як жорсткі, помслівы, Ён карае за кожны грэх, а вось у Новым Запавеце Бог даруе грахі, Ён літасцівы. Але хіба можна адрозніваць паміж сабой Бога Старога Запавету і Новага Запавету? Госпад гаворыць, што ўсё сказанае ў Святым Пісанні сведчыць аб Ім: *Праверце ў Пісаннях, калі вы думаеце мець праз іх жыццё вечнае: і яны сведчаць пра Мяне (Ін. 5, 39).* А таксама: *Бо калі б вы верылі Майсею, дык верылі б і Мне, бо пра Мяне ён пісаў. А калі яго пісанням не верыце, як дасце веры Маім словам (Ін. 5, 46-47)?* Пра гэта гаворыцца таксама ў Старым

Запавеце: *Прарока пастаўлю над імі з асяроддзя братоў іх, як цябе: і ўкладу слова Маё ў вусны Яго, і будзе прамаўляць да іх, як накажу Яму (Друг. 18, 18).* На шляху ў Эмаўс Госпад распавядаў вучням пра тое, як Майсей ды іншыя прарокі сведчылі пра Ісуса Хрыста. Ён казаў эмаўскім падарожнікам пра свае намеры адносна Старога Закону: *не думайце, што прыйшоў Я парушыць закон або прарокаў: не парушыць прыйшоў Я, але выканаць (Мц. 5, 17-18).* Г. зн., Хрыстос прыйшоў выканаць Закон прарокаў. Стары Запавет быў выхавацелем для людзей, ён рыхтаваў іх да прыняцця Новага Запавету. Таму не толькі Стары Запавет, але і Новы Запавет раскрывае дзеянне Святога Духа, пра гэта гавораць і Апосталы. Гэтак Апостал Павел навучае: *Усякае Пісанне Богам натхнёнае і карыснае для вывучэння, для выкрыцця, для выпраўлення, для пакарання, для настаўлення ў праведнасці, каб быў дасканалы чалавек Божы, гатовы для ўсякай добрай справы (2 Цім. 3, 16).* Пра тое, што пракаў натхняў Бог, гаворыцца ў Пасланні апостала Пятра: *Ніколі адвольна не даецца людзям прароцтва, але, ад Святога Духа асвечаныя, выказваюць яго святыя Божыя людзі (2 Пят. 1, 21).* А таксама гаворыць ён і пра дзеянне Святога Духа праз Апосталаў: *ім жа адкрылася, што не ім самім, а нам служыла тое, што было абвешчана вам сягоння тымі, якія неслі вам добрую вестку праз Духа Святога, пасланага з Нябёсаў (1 Пят. 1, 21).*

Але ў Сімвале веры сказана пра дзеянне Святога Духа толькі праз прарокаў. Прычына гэтага ў тым, што ў III стагоддзі яшчэ свежа памяталі зыход Святога Духа на Апосталаў. Гэтая праўда не падлягала скажэнню, і Айцы Сабору не сталі гэтую праўду закранаць. Яна была занадта відавочная. Апостал Павел кажа: *але гаворым Мудрасць Божую, у таямніцы схаваную, якую прадвызначыў Бог спрадвеку дзеля славы нашае, а якую ніхто з князёў веку гэтага не разумее. (...) Але, як напісана было: чаго вока не бачыць, і вуха не чуе, і што да сэрца чалавеку не ўзыходзіла, тое наканаваў Бог тым, хто любіць яго. А нам Бог адкрыў Духам Сваім: бо Дух усё прасякае, і глыбіні Божыя (1 Кар. 2, 7-10).*

4. Сродкі набыцця Святога Духа і Яго дабратворныя дары чалавеку

Мы гаворым аб тым, што настаўнікі Старога і Новага Запавету былі натхнёныя Богам. Паўстае пытанне, а ці можам мы зрабіцца носьбітамі Духу Божага? Апостал Павел звяртаецца да Карынфян: *Хіба не ведаеце, што вы ёсць храм Божы, і Дух Божы жыве ў вас (1 Кар. 3, 16)?* Не толькі можам, але і павінны. Бо прырода не выносіць пусткі, і калі мы не запоўнім сваё ярмо Словамі Божымі, дык злы дух з гэтага скарыстае.

Але па прыродзе сваёй мы не можам зрабіцца носьбітамі дабратворнае сілы Божае, і таму мы,

дзеці злосці, дзеці гневу, у момант Хрышчэння прышчапляемся да Хрыста, як дзікая аліва да вінаграднае лазы, і робімся ўдзельнікамі Божае ласкі, хоць вялікія тыя сілы зла, што змагаюцца супраць нас.

Калі грэх перамагае душу чалавека, ён адразу выпустошвае яе з усяго святога, узвышанага, і мы адразу адчуваем пустку, холад у сэрцы і ў душы. І чым дольш мы будзем заставацца ў такім стане, тым больш будзе зла. Грэх адразу дае аб сабе знак, і мы павінны адразу шукаць паратунку і сродкаў вылечвання ад душэўнага змроку. Галоўны прынцып хрысціяніна: панаваннне духа над целам.

Галоўны сродак — гэта малітва. Госпад пасылае ласку, якая выціскае дух злосці, хоць і не адразу, але паступова, па меры выканання малітвы, якую слухае Госпад, бо дух злосці не адразу здае свае пазіцыі. Госпад гаворыць: *Бо калі вы, благія, умееце добрыя даянні даваць дзецям сваім, дык тым болей Айцец Нябесны дасць Духа Святога тым, хто просіць у яго (Лк. 11, 13).* Сіла зла пакідае сэрца, бо ў ім асяляецца Святы Дух, і звонку, і знутры запаноўвае ласкавы спакой. Гэта адбываецца спакрыёму, нябачна для іншых.

Іншы сродак — гэта Таінствы, і асабліва Таінства Еўхарыстыі, у якіх хаваецца дабратворная сіла. Таінства можа быць або на выратаванне, або на асуджэнне, у залежнасці ад ступені маральнага ачышчэння, з якім мы прыступаем да яго. Не дзе-

ля нашых учынкаў і праведнасці, але дзеля чалавекалюбства Свайго Святы Дух сышоў на зямлю і выратаваў нас праз купель адраджэння. Апостал кажа: *Калі ж з'явілася спагада і любоў да людзей Збаўцы нашага, Бога, Ён выбавіў нас не паводле ўчынкаў праведных, якія здзейснілі мы, але паводле міласці Сваёй, праз купелю адраджэння і абнаўлення Духам Святым, Якога выліў на нас шчодра праз Ісуса Хрыста, Збавіцеля нашага (Ціт. 3, 4-6).* А таксама: *І не зневажайце Святога Духа Божага, Якім вы запячатаны на дзень адкуплення (Эф. 4, 30).* Плод Духа складаецца з усялякае дабрыні, праведнасці і праўды: *бо плод Духа ёсць ва ўсякай дабрыні, і праведнасці, і праўдзе (Эф. 5, 9).*

Можаце, чытаючы, пазнаць маё разуменне таямніцы Хрыстовай, якая ў іншых родах не была выказаная сынам чалавечым, бо (толькі) цяпер адкрылася Святым Апосталам Яго і прарокам Духам Святым (Эф. 3, 4-5).

Ім было адкрыта, што не ім самім, але нам служыла тое, што было абвешчана вам сёння тымі, хто нёс вам добрую вестку Духам Святым, пасланым з Нябёсаў, да якой нават Анёлы жадаюць прынікнуць (1 Пят. 1, 12).

Душы вашыя ачысціўшы Духам у паслухмянасці праўдзе, дзеля некрывадушнае братняе любові, заўсёды любіце адзін аднаго ад чыстага сэрца (1 Пят. 1, 22).

Па першы сродак сягаем мы ўдзень і ўночы, па другі — перыядычна.

Існуюць дабратворныя дары Святога Духа, паводле прарока Ісаі: *І выйдзе парастак з камля Ясеева, галіна ад кораню яго: і спачне на ім Дух Гасподні, Дух мудрасці і розуму, Дух рады і моцы, Дух ведаў і страху Гасподняга, перапоўніць яго Дух страху Гасподняга (Іс. 11, 1-3).*

Дух страху Гасподняга — гэта глыбокая ўнутраная багабойнасць, якая засцерагае ад зла і з'яўляецца крыніцаю святых спраў.

Дар пазнання, або ведання — гэта здольнасць зазіраць ў аддаленую будучыню, у найвышэйшай сваёй праяве ён з'яўляецца асаблівасцю прарочага служэння.

Дар дужасці і моцы дае чалавеку мужнасць, гарт, робіць яго здольным да выканання волі Божае. Як сказана Псалмапеўцам: *Бо нават праходзячы далінаю ценю смяротнага, не пабаюся напасці, бо Ты са мною (Пс. 22, 4).*

Дар духу рады складае здольнасць наварочваць іншых на шлях праўды. Без гэтага дару самыя глыбакадумныя парады, самыя руплівыя клопаты пра дабро іншых не дадуць аніякае карысці, а маючы гэты дар Духа Святога, можна і простым, нявышуканым словам ўздзейнічаць на сэрца слухача. Гэта важна для кожнага чалавека, хрысціяніна, але асабліва для святара, якому пажадана валодаць гэтым дарам. Святару даецца таксама Божая ласка вязаць і адпускаць грахі, якая была паабяцаная Апосталам праз Ісуса Хрыста яшчэ падчас Яго зямнога жыцця.

Дар разумення, або розуму, складае здольнасць глыбока асэнсоўваць рэчы і меркаваць пра справы не толькі па знешніх праявах, даступных пачуццям, як гэта ўласціва звычайным людзям, але і сягаць вокам розуму да самае сутнасці рэчаў. Гэтак да грэхападзення надаваў імёны Адам. Прыкладамі гэтага дару з'яўляецца водгук Збаўцы аб дзвюх лептах, ахвяраваных удавою для Іерусалімскага храма (Мц. 12; Лк. 21), і празорліваць апостала Пятра, калі ён выкрыў падман Ананіі і Сапфіры (Дзеі 5).

Дар мудрасці — гэта здольнасць знаходзіць найлепшыя сродкі для дасягнення маральных мэт. Прыклад такой мудрасці выказаў цар Саламон, які самым простым спосабам вызначыў сапраўдную маці спрэчнага немаўляці (3 Цар. 3).

Дар духу Гасподняга, або дар дабравесця і натхнення, ў найвышэйшай ступені адзначае святасць жыцця, якая вылучае Божых абраннікаў, служыць павучальным прыкладам і для звычайных простых смяротных. *Памяць праведных жыве з пахваламі: імя ж ліхіх чэзне (Прып. 10, 7),* — гаворыць Іудзейскі цар Саламон, які зведаў на ўласным вопыце пабожнасць і ліхі грэх. Бо ліхі грэх спусташае жыццё.

9-ая частка Сімвалу веры. Пра Царкву

У адзіную Святую, Саборную і Апостальскую Царкву.

1. Царква зямная і Нябесная і вера ў яе

Як і ў 8-й частцы Сімвалу веры, тут таксама ідзе гаворка пра Святога Духа. Калі ў 8-й частцы пра Яго гаворыцца як пра Бога, дык тут, у 9-й частцы гаворыцца пра тую сферу, у якой мы маем магчымасць набыцця Святога Духа, інакш кажучы — узыходжання ад славы да славы. Бог Айцец пасылае Свайго Сына на Крыж. Сын паслухмяна ідзе, нібы Ягня. Дух Святы прысвойвае нам плады Галгофскае Ахвяры Госпада нашага Ісуса Хрыста. Цяпер Госпад знаходзіцца на Небе ў Славе, — як існы Прарок, Першасвятар і Цар, і жадае, каб і мы далучыліся да Яго Славы. Госпад прымае маленне толькі ў Царкве.

Царква — гэта Богам устаноўленая супольнасць людзей, злучаных Праваслаўнай вераю, Законам Божым, іерархіяй і Таінствамі. У Царкве Святы Дух напаўняе ўсё і творыць збавенне ўсіх.

Верыць у Царкву — значыць з глыбокай павагай ушаноўваць сапраўдную Царкву Хрыстовую і падпарадкоўвацца яе вучэнню і Запаветам з упэўненасцю, што ў ёй нязменна трывае, збавенна дзейнічае, навучае і кіруе ласка Божая, якая пра-

ліваецца з адзінай вечнай яе Галавы — Госпада Ісуса Хрыста.

Царква і бачная, і нябачная. Як прамет веры, — Царква нябачная.

На першы погляд, паміж Царквою і супольнасцю вернікаў існуюць аналогіі, аднак, калі глыбей разглядаць азначэнне Царквы, дык можна пабачыць за павярхоўнымі аналогіямі грунтоўныя адрозненні паміж імі.

Царква — гэта Богам устаноўленая супольнасць, і гэтай супольнасці дадзеныя былі абяцанні вечнасці, так што ніякія сілы зла не змогуць яе пахіснуць. Царква існуе дзве тысячы гадоў, і няма іншай такой супольнасці, якая б гэтак доўга існавала.

У Царкве ёсць і чалавечыя, і Боскія пачаткі.

З вялікай павагай шанаваць Царкву, верыць Царкве — значыць падпарадкоўвацца правілам, запаведаным у Царкве.

У гэтым азначэнні Царквы назіраюцца два бакі: бачны бок азначае, што існуе супольнасць, нябачны — прысутнасць ласкі Божае, якая навучае, ператварае і ўзвышае. Хоць Царква бачная, паколькі яна існуе на зямлі і да яе належаць усе праваслаўныя хрысціяне, якія жывуць на зямлі, аднак яна і нябачная, бо існуе таксама і на Небе, і да яе належаць усе, хто памёр у сапраўднай веры і святасці. Верыць — гэта значыць верыць у тое нябачнае, да якога не сягаюць нашы бачныя вочы, але мы верым ў адпаведнасці з вызначэннем веры. Нябачная Царква, як засвоеная праз яе і асвечная

ласка Божая, і складае, уласна кажучы, прадмет веры ў Царкву. Вера, паводле апостала Паўла, — гэта *ўпэўненасць у рэчах нябачных (Яўр. 11, 1),* здзяйсненне нябачнага, г. зн. Царква Нябесная. Нябесная Царква ўключае ў сябе ўсе істоты ад пачатку часоў; тут спачывае ласка Божая і праўда, якія праліваюцца ад адзінай яе Галавы — Ісуса Хрыста. Паводле апостала Паўла, *ласка ж Госпада нашага (Ісуса Хрыста) памножылася ўва мне разам з верою і любоўю ў Хрысце Ісусе (1 Цім. 1, 14).*

Мы малітваю прыступаем да горада Сіёна, да горада Бога Жывога, да мірыядаў Анёлаў, духам праведных і дасканалых, і да Заступніка — Хрыста Збаўцы, які яднае ўсіх нас пад адзіным кіраўніцтвам: *Але вы прыступіліся да гары Сіёну і да горада Бога Жывога, да нябеснага Іерусаліма і мірыядаў Анёлаў, да ўрачыстага Сходу і царквы першынцаў, запісаных на Небе, і да Суддзі ўсіх, Бога, і да духаў праведнікаў дасканалых, і да Хадайніка Новага Запавету Ісуса (Яўр. 12, 22-24).*

Царква, у сціслым сэнсе гэтага слова, была заснаваная ў раі. Пасля грэхападзення быў пакладзены пачатак Царкве ратаваных, якая саступіла месца Царкве Нябеснай.

2. Знаходжанне ў Царкве Божае Ласкі

У сапраўднай Царкве нязменна прысутнічае збавенна дзейсная ласка Божая, і чалавек можа пераканацца ў гэтым на ўласным вопыце: *Сло-*

ва сталася целам, і асялілася між нас, (і бачылі мы славу Яго, славу як Адзінароднага ад Айца), поўнае ласкі і праўды (Ін. 1, 14). І я ўпрашу Айца, і Ён дасць вам другога Суцяшыцеля, каб быў з вамі давеку (Ін, 14, 16).

Падставы для гэтага сцвярджэння наступныя:

1. Абяцанне Хрыста падараваць ласку Святога Духа, якая навучае служыцеляў Царквы. Епіскапам Эфесскае Царквы сказана было, што яны пастаўленыя, каб пасвіць Царкву, не самі, але Духам Святым: *Пільнуйце ж самі сябе і ўвесь статак, бо ў ім вас Дух Святы паставіў за епіскапаў, пасвіць царкву Госпада і Бога, якую Ён прыдбаў уласнаю крывёю (Дзеі 20, 28).* Ісуса Хрыста паставіў Галавой Царквы Бог Айцец: *і ўсё скарыў пад ногі Яго, і даў Яго за галаву над ўсім у Царкве, якая ёсць цела Яго, поўня Поўніцы ўсяго ва ўсіх (Эф. 1, 22-23).* Царква тут прыпадабняецца да цела, якое мае шмат частак.

2. Сам Хрыстос сказаў аб вечным знаходжанні ў Царкве ласкі Божае: *Я збудую Царкву Маю, і брамы пякельныя не перамогуць яе (Мц. 16, 18),* і згодна з Яго непадманным абяцаннем Царква будзе стаяць да сканчэння часоў. Сілы пекла — гэта самая магутная і злая моц сусвету, якая ўзбройваецца супраць Царквы, але, тым не менш, не можа яе знішчыць. Няма такой сілы, якая б разбурыла яе: *Я з вамі ва ўсе дні да сканчэння веку (Мц. 28, 20).* А таксама: *Калі Бог за нас, дык хто супраць нас (Рым. 8, 31)?*

3. Пра вечную ласку Божую ў Царкве гаворыць і апостал Павел: *[Богу] Слава ў Царкве і ў Ісусе Хрысце, на ўсе роды, адвеку і давеку (Эф. 3, 21).*

Царква вечная і мае вечную Галаву — Ісуса Хрыста. Божая ласка ў Царкве сыходзіць ад яе Галавы. Бог Айцец прымае нашыя маленні, падзякі, прынашэнні толькі праз Царкву, праз Ісуса Хрыста, г. зн. ад тых, хто не перапыніў кананічнага дыялогу з Царквой. Толькі ў Царкве Ён — Збаўца, тады як па-за Царквою Ён — Творца. Святары — гэта толькі служыцелі, г. зн. прылады выканання Божае волі. У Царкве дзейнічае Святы Дух, які паслаў епіскапаў пасвіць статак. Хрыстос жа — настаўнік, Які падаў прыклад статку Сваім уласным жыццём. Калі сярод Карынфян пачалася дзяльба, апостал Павел пачаў ушчуваць іх, што яны толькі служыцелі: *Бо хто Павел? Хто Апалос? Яны толькі служкі, праз якіх вы ўверавалі, і каму як даў Госпад (1 Кар. 3, 5).* У Царкве існуе не толькі зямная, але і Нябесная іерархія, якой падпарадкоўваюцца душы памерлых.

3. Адзінства Царквы

Як наша цела робіць жывым душа, гэтак Логас, Слова Божае, дае жыццё і насычае Царкву ад першага дня яе заснавання. Як нельга ўявіць наша цела, падзеленае на часткі, гэтак нельга ўявіць і Царкву ў падзеленым стане. Усе мы пакліканыя адной надзеяй: *Адно цела, адзін дух,*

як і вы пакліканыя да адной надзеі заклікання вашага; адзін Госпад, адна вера, адно хрышчэнне, адзін Бог і Айцец усіх, Які над усімі і праз усіх, і ва ўсіх нас (Эф. 4, 4-6).

Першасвятар Хрыстос — адзіная Галава вечнае Царквы, вечны падмурак хрысціянскага жыцця. Як цела мае адну Галаву, так і Царква мае адну Галаву — Ісуса Хрыста. Хрыстос з'яўляецца нарожным каменем, вечным падмуркам царквы.

Мы ўсе браты ў Хрысце, і гэта не абстракцыя. Хрысціянін яскрава адчувае духоўную роднасць, бо паводле веры пасылаецца ласка Божая. Людзі нецаркоўныя не адчуваюць нават кроўнага брацтва. Праз веру мы набліжаемся да Бога і адчуваем брацтва між сабою ў адзінай сям'і. На кожнага верніка накладаецца абавязак захоўваць ў свеце адзінства веры, яднанне духа ў яднанні свету, каб не адпасці адзін ад аднаго. І наколькі глыбокая ў нас вера, настолькі мы робімся ўдзельнікамі жыцця Царквы і набліжаемся да Хрыста: *Калі вы будзеце мець веру, як гарчычнае зерне, і скажаце гэтай гары: перайдзі адгэтуль туды, дык яна пяройдзе, і не будзе нічога немагчымага для вас (Мц. 17, 20).* Вера — гэта суб'ектыўнае пачуццё, дзякуючы якому мы дасягаем адзінства ў Царкве, як часткі цела царкоўнага, — у адзінай сям'і, у адзіным арганізме. Хрышчэнне — гэта той сродак, праз які мы прымаем удзел у жыцці, асвечаным Божай ласкаю.

Бачныя невялікія адрозненні ў арганізацыі не перашкаджаюць Аўтакефальным Цэрквам на-

лежаць да Сусветнае Царквы і вызнаваць адзіны Сімвал веры, Закон Божы і існуючую святарскую іерархію, *захаваць адзінства духа ў саюзе міру (Эф. 4, 3).*

Ва ўсіх Памесных Цэрквах тыя самыя дух веры і Божай ласкі. Наяўнасць шматлікіх Памесных Цэркваў не супярэчыць вучэнню аб адзінстве Царквы, бо гэта вялікія часткі аднаго цела Хрыстовага.

4. Адзінства Царквы Хрыстовай, Нябеснай і зямной

а) адзінства зямной і Нябеснай Царквы праз малітву

Зямная і Нябесная Царква злучаюцца між сабой малітвамі веры і любові. *Госпад блізкі да ўсіх, хто заклікае Яго, усіх, хто заклікае Яго ў праўдзе. Волю тых, хто баіцца Яго, ён выканае, і малітву іх пачуе, і выратуе іх (Пс. 144, 18-19).* Але асабліва слухае Ён малітву праведнікаў: *бо многа можа шчырая малітва справядлівага (Як. 5, 16).*

Нішто ў матэрыяльным свеце не знікае дарма, так адбываецца і ў свеце духоўным. Нездарма гавораць: «Сэрца сэрцу вестку падае», асабліва гэта вядома пра сэрца маці. Ёсць шмат такіх прыкладаў у жыцці. Шырока вядомы выпадак, які здарыўся з прап. Сергіем Раданежскім. Сябар прап. Сергія, св. Стафан, епіскап Пермскі, аднойчы ехаў са сваёй

епархіі ў Маскву. Мінаючы манастыр сябра, ён устаў, прамовіў малітвы і аддаў паклон у кірунку манастыра, кажучы: «Мір табе, духоўны браце». Прап. Сергій знаходзіўся у той час на трапезе, разумеючы духам прывітанне Стафана, ён устаў сярод трапезы, склаў малітву, пакланіўся ў кірунку таго месца, дзе знаходзіўся епіскап Стафан, і сказаў: «Радуйся і ты, пастуша Хрыстовага статку, і няхай заўжды будзе з табой мір Божы». Аб тым, як святыя, якія прабываюць у славе нябеснай, бачылі навылёт ўнутраны свет чалавека, сказана ў жыціях святых. Выдатны гісторык В. А. Ключэўскі быў цудоўным знаўцам жыційнай літаратуры і выявіў гістарычнасць жыцій святых (Ключэўскі В. А. Старажытнарускія жыціі святых... М, 1988).

Прарок Ерамія звяртаўся ў малітвах да Бога, і Госпад сказаў, што калі б прыйшлі прасіць за іудзейскі народ хоць Майсей і Самуіл, дык не дапамаглі б нават іх малітвы: *І сказаў мне Госпад: нават калі стануць перад абліччам Маім Майсей і Самуіл, не будзе прыхільнасці ў душы Маёй да гэтых людзей: гані іх (з Твару Майго), і хай яны адыдуць (...). І адпомшчу ім чатырма карамі, сказаў Госпад (Ер. 15, 1, 3).* Ерамія быў тады ў Царкве зямной, а Майсей і Самуіл — у Царкве Нябеснай. Гэта сведчыць аб заступніцтве святых за тых, хто жыве на зямлі.

У Іуды Макавея была праява: бачыў ён у малітве памерлага першасвятара Онію, які, ў сваю чаргу, бачыў мужа, што яшчэ больш горача маліўся

аб народзе іудзейскім, які патрабуе збавення, гэта значыць, прарока Ерамію: *Праява ж яму была такая: Онія, былы архірэй, муж сумленны і добры, паважнага выгляду, лагоднага нораву, прыемны ў гутарцы, які ад дзяцінства быў навучаны ўсім цнотам, (бачыў) яго з уздзетымі рукамі, у малітве за ўвесь люд іудзейскі. І як потым аб'явіўся другі муж, упрыгожаны сівізною і славаю, і аточаны нейкай дзіўнай надзвычайнай веліччу. І адказаў Онія: гэта — браталюбец, які шмат моліцца за люд і за святы горад, Ерамія, Божы прарок (2 Мак. 15, 12-14).*

Прападобны Серафім Сароўскі, прападобны Амвросій Опцінскі ды іншыя не распячатвалі лісты, бо прадбачылі іх змест і прасілі тым ці іншым чынам адказаць на тое або іншае пісьмо.

Шмат хто просіць малітваў святых у розных патрэбах. Малітва — гэта патрэба таксама і праведнікаў. Святыя не могуць існаваць без малітвы, і Бог да іх малітваў прыхільны. Калі Гоcпад не выконвае і не чуе нашых малітваў, дык слухае і выконвае малітвы святых. Малітвы святых прыемныя Богу, як кадзільны дух.

Пачуўшы нашыя малітвы, святыя не могуць захаваць абыякавасць да нашага стану. Прасвятляючыся святлом і Божай ласкаю, яны дапамагаюць і нам, пазычаючы тую ласку, якую атрымліваюць ад Хрыста, Крыніцы ласкі. Гэтак месяц, што асвятляе ноччу зямлю, прымае святло ад сонца, і гэтае святло для нас прыемнае.

Яшчэ будучы ў целе, многія святыя дапамагалі людзям. Так, Майсей жадаў быць выкрэслены з Кнігі жыцця дзеля яўрэйскага народу, апостал Павел жадаў быць адлучаны ад Хрыста дзеля іудзейскага народу. Цела ёсць вязніца духа, і вызваленыя з гэтай вязніцы святыя хадайнічаюць таксама і за нас.

Калі малітва яшчэ пры жыцці мае вялікае значэнне, тым больш, малітвы святых дапамагаюць нам, калі парываецца повязь з целам. Мы аточаныя злом і заклікаем святых, каб іх малітва працяла эфірную прастору. Яны ведаюць нашы цяжкасці, нашы патрэбы і, узмацняючы нашы просьбы сваёй малітвай, узносяць іх да Бога. Святы Кірыла Іерусалімскі ў Гутарцы аб Літургіі навучае: «Стаючы на малітву, мы павінны заклікаць патрыярха, прарокаў ды іншых праведнікаў старога Запавету, а таксама ўсіх святых Новага Запавету, каб іх малітвамі і старшынствам Бог прыняў нашае маленне». Святы Васіль Вялікі ў Слове на Сорак пакутнікаў гаворыць: «Той, хто ў смутку, няхай звяртаецца да Сарака пакутнікаў, і няхай звяртаецца да іх таксама той, хто ў весялосці: адзін няхай вызваліцца ад згрызот, а ў другога няхай збудуцца яго спадзяванні. Тут мы таксама бачым набожную жанчыну, якая моліцца за сваіх дзяцей, за мужа ў дарозе, а таксама просіць здароўя для хворага. Звяртайцеся з вашымі просьбамі да пакутнікаў».

Праваслаўная Царква заклікае: «Госпадзе, Ісусе Хрысце, Сыне Божы, дзеля малітваў Найчысцейшае

Маці Тваёй, прападобных і баганосных Айцоў нашых і ўсіх святых, злітуйся з нас». Святыя аказваюць уплыў і падаюць дапамогу не ўласнай сілаю, але ласкай і святлом, якія зыходзяць ад адзінай і дабратворнай Галавы Царквы — Ісуса Хрыста.

Члены зямной Царквы заклікаюць у малітвах тых, хто залічаны да святых Царквы Нябеснай, і яны аказваюць дапамогу траякім чынам:

- нябачнай сілаю;
- праз свае аб'яўленні;
- праз разнастайныя сродкі.

б) падставы да заклікання святых у малітве

На чым грунтуецца сяганне па малітоўную дапамогу святых, якую некаторыя адмаўляюць? Правіла Царквы зямной — заклікаць малітвай на дапамогу святых Нябеснае Царквы — грунтуецца на Святым Паданні, бо спачатку Евангелле распаўсюджвалася вусна. Згадкі пра гэта зафіксаваныя таксама ў Пісанні.

У Кнізе Быцця апавядаецца, як зграшыў супраць Бога Авімелех, пакрыўдзіўшы Аўраама, а Бог паслаў яго да Аўраама прасіць памаліцца за сябе: *Сёння ж аддасі жонку мужу, бо ён — Прарок, і памоліцца аб табе, і жывы будзеш (Быц. 20, 7).* Малітва Аўраама аказалася дзейсная, бо па ёй Бог вяртае здароўе.

У кнізе Іова Госпад пасылае да Іова яго сяброў, якія зграшылі, замест таго, каб непасрэдна Само-

му суцешыць іх, — прасіць у Іова малітваў, праз якія ім будзе дараваная літасць: *Сёння ж вазьміце сем цялят і сем баранаў і ідзіце да раба майго Іова, і няхай учыніць ахвяру за вас; а Іоў, раб мой, памоліцца за вас, бо толькі яго аблічча Я прыму: бо, каб не ён, загубіў бы Я ўсіх вас, таму што не гаворыце праўды, як раб мой Іоў (...) і адпусціў ім грахі дзеля Іова. Госпад жа вярнуў страты Іова: калі той памаліўся Яму за сяброў сваіх, адпусціў ім грахі іх (Іоў, 42, 8-10).*

У 1-й Кнізе Царстваў — на заклік народу Ізраіля прарок Самуіл узняў лямант да Госпада, і паслухаў яго Госпад: *і сказалі сыны Ізраілевы да Самуіла: не змаўчы пра нас у ляманце да Госпада Бога нашага, няхай збавіць нас ад рук іншапляменнікаў (...), і ўзняў Самуіл лямант да Госпада, і паслухаў яго Госпад (1 Цар. 7, 8-9).*

Пра дзейснасць малітвы пракакаў гаворыцца ў іншых Кнігах Царстваў. Так, сарэпская ўдава звяртаецца да Іллі наконт сына: *што мне і табе, чалавеча Божы? ты прыйшоў да мяне прыгадаць няпраўды мае і замарыць сына майго (...), і заклікала Госпада і сказала: Госпадзе, Божа мой, няхай жа вернецца душа хлапчука гэтага да яго. І сталася так: (...) і сказала жанчына да Іллі: цяпер зразумела я, што ты — Божы чалавек, і слова Гасподняе ў вуснах тваіх праўдзівае (3 Цар. 17, 18-23).* Гэтаксама Нееман заклікае Елісея, каб ачысціў яго ад праказы: *О, каб мой уладар быў у прарока Божага, што ў Самарыі, той бы ачысціў*

яго ад праказы яго (...), Цар Ізраілеў разадраў шаты свае і сказаў: (...) зразумейце і паглядзіце, як гэты шукае зачэпкі да мяне. І тады пачуў гэта Елісей, (....) кажучы: няхай прыйдзе да мяне Не-еман, і няхай зразумее, што ёсць прарок у Ізраілі (4 Цар. 5, 3-8).

Давід разам з іменем Божым заклікае імёны праведнікаў Старога Запавету, бо не спадзяецца на ўласную малітву: *Госпадзе Божа Аўраама і Ісаака і Ізраіля айцоў нашых (1 Пар. 29, 18).*

Па аналогіі ў Царкве Новага Запавету святар просіць за нас Бога — па малітвах Божае Маці, святых Апосталаў, пакутнікаў, святых, шанаваных у пэўных мясцовасцях. Апостал Павел звяртаецца да братоў па веры, Рымлян, Салунян: *Малю вас, браты, Госпадам нашым Ісусам Хрыстом і любоўю Духа, дапамагаць мне малітвамі за мяне да Бога, каб выбавіцца мне ад няверуючых ва Іудзеі (Рым. 15, 30).* А таксама: *Просім жа вас, браты, ведаць тых, што працуюць у вас і пастаўленыя над вамі ў Госпадзе, і вас навучаюць, і шануйце іх вельмі высока ў любові за справу іх, жывіце ў згодзе між сабою (1 Сал. 5, 12-13).* А таксама: *Браты, маліцеся за нас (1 Сал. 5, 25).*

в) дабратворнае аб'яўленне святых і тварэнне цудаў

Аб'яўленне святых — гэта сведчанне аб пасярэдніцкай малітве святых з Неба. Гэта добрат-

ворнае з'явішча, і калі святыя так дзейсна дапамагаюць, знаходзячыся ў целе, дык тым болей яны аказваюць дапамогу з Нябёсаў.

Калі Хрыстос памёр, першая загаварыла пра гэта варта, якая стаяла ля Магілы, і святыя, што выйшлі з магіл. У момант смерці Хрыста святыя ўваскрэслі, каб прыйсці ў Іерусалім, аб'явіцца многім і абвясціць тым, хто яшчэ знаходзіўся ў Царкве іудзейскай, што Хрыстос сышоў у пекла і вызваліў душы праведнікаў. Гэтым яны пабудзілі тых, хто заставаўся ў Царкве Старога Запавету, перайсці ў Царкву Новага Запавету: *і многа целаў памерлых святых паўставалі: і выйшлі з магіл, пасля Уваскрасення Яго, увайшлі ў святы горад і аб'явіліся многім (Мц. 27, 52-53).*

Сведка таямніц, святы евангеліст Іаан, у Аб'яўленні бачыў у Нябёсах (праяву) Анёла, які духмяным фіміямам узносіў кадзільны дым: *І прыйшоў іншы Анёл, і стаў перад алтаром, маючы кадзільню залатую, і далі яму багата фіміяму, каб паклаў з малітвамі ўсіх святых на залаты алтар, што быў перад Пасадам. І ўзняўся дым кадзільны з малітвамі святых ад рукі Анёла перад Богам (Аб'ўл. 8, 3-4).* Гэткую моц мае любоў праведнікаў.

Святыя зазналі ад Бога такой вялікай пашаны, што нават пасля сваёй смерці здзяйсняюць цуды апасродкавана (праз астанкі святых ды іх рэчы), нібы тая пасудзіна, у якой захоўвалі духмяны алей. Нават калі пахучы алей з яе забраць, пасудзіна ўсё

роўна яшчэ доўга будзе захоўваць чароўны пах. Цудатворны ўплыў аказвалі косці прарока Елісея (4 Цар. 13, 21), галаўныя павязкі і хусты ад цела апостала Паўла (Дзеі 19, 12).

Св. Рыгор Багаслоў у выкрывальным Слове супраць Юліяна-адступніка казаў пра моц астанкаў святых, што нават малыя астанкі роўназначныя іх святым мошчам: «Не пасаромеўся ты ахвяр, прынесеных за Хрыста, не пабаяўся вялікіх падзвіжнікаў: таго Іаана, Пятра, Паўла, Якуба, Сцяпана, Лукі, Андрэя, Тэклі ды іншых, што раней і пасля іх пацярпелі за праўду, якія і агню, і жалезу, і звярам, і мучыцелям, і бедствам, існым і прадказаным, нават сярод чужынцаў, цялесна і бесцялесна, старанна супрацьстаялі.

Дзеля чаго? Каб ані словам не здрадзіць пабожнасці. Ім жа вялікае ўшанаванне і ўрачыстасці справядліва прысвечаныя. Ад іх і дэманы выганяюцца, і хваробы вылечваюцца. Іх жа праявы і іх прароцтвы. І толькі ў іх адных целы маюць роўную моц з іх святымі душамі, калі да іх датыкаюцца або ўшаноўваюць. Іх жа нават кроплі крыві дзейнічаюць нароўні з целамі».

Прападобны Іаан Дамаскін таксама гаворыць пра астанкі, якія захоўваюць ласку Божую, праз якую чыняць дабро: «Мошчы святых, як збавенныя крыніцы, дараваў нам Хрыстос Уладар, з іх струменяцца шматлікія дабрадзействы», і далей тлумачыць: «Праз розум і ў целах святых асяліўся Бог».

5. Святасць Царквы

Царква — вялікае цела яе Галавы, Богачалавека Ісуса Хрыста. Царква адухаўляецца Духам Святым, які надае жыццё целу Царквы.

Царква складаецца з розных членаў, якія стаяць на розных ступенях маральнае дасканаласці, аднак гэта не перашкаджае Царкве быць Святой, бо Святая яе Галава, Госпад Наш Ісус Хрыстос. Цела гіне, калі пашкоджваюцца яго галоўныя органы — галава і сэрца. Членаў Царквы можна суаднесці з пшаніцай і пустазеллем, з добрай і дрэннай рыбай, з адпаведных прыпавесцяў Збаўцы пра пшаніцу і пустазелле (Мц. 13, 24-30), пра нерат (Мц. 13, 47-50). Апостал Павел у Другім Пасланні да Цімафея гаворыць пра Царкву як пра дом, у якім шмат посуду, адзін — у пашане, другі — для нізкага ўжытку: *А ў вялікім доме ёсць посуд не толькі залаты і срэбны, але і драўляны, і гліняны; і адзін у пашане, другі — не ў пашане. Дык, калі хто ачысціць сябе з гэтага, той будзе посудам у пашане, асвечаным і карысным для Уладара, прыдатным на ўсякую добрую справу (2 Цім. 2, 20).*

Трэцяя падстава Святасці ў тым, што Хрыстос палюбіў Царкву і выдаў Сябе за яе, каб асвяціць яе Сваёй крывёю: *Хрыстос палюбіў Царкву і выдаў Сябе за яе, каб асвяціць яе, ачысціўшы купеллю воднаю ў слове, каб увясці яе Сабе слаўнаю, Царкву гэтую, без плямы ці заганы, ці чагосьці такога, але каб стала яна святая і беззаганная (Эф. 5, 25-27).*

Тут форма дзеяслова была ўжытая ў будучым часе, што ўказвае на Яго мэты і нашыя спадзяванні, у адпаведнасці з якімі галоўная задача Царквы — весці да Святасці.

Чацвёртая падстава Святасці Царквы заключаецца ў тым, што Царква — гэта грамада недасканалых людзей, але тыя, хто грашыць і каецца, не перашкаджаюць Царкве быць Святой. Хрыстос асвяціў Царкву Таінствамі, а грэшнікі, якія не прынялі пакаяння, далей адсякаюцца ад Цела Царквы бачнымі дзеяннямі царкоўнай іерархіі і нябачным шляхам — Наканаваннем Божым. Хрыстос маліўся ў астатняй малітве за нас: *Асвяці іх праўдаю Тваёю: Слова Тваё — праўда (Ін. 17, 17). І за іх Я асвячаю Сябе, каб і яны былі асвячаныя праўдаю (Ін. 17, 19).*

Як можна суаднесці са Святасцю Царквы грэшнасць яе членаў?

а) Бачным дзеяннем царкоўнай іерархіі. У часы «хрысталагічных спрэчак» з IV па VIII стагоддзе, ад Царквы адпала некалькі ерэтычных плыняў — арыяне, македаняне, нестарыяне, манафізіты і манафіліты, іканаборцы ды іншыя. Апостал Павел кажа: *Дык адрыньце благога пасярод вас саміх (1 Кар. 5, 13).*

б) Ёсць такія, хто грашыць, але застаецца нябачны, распаўсюджвае цяжкія грахі, — яны, паводле Наканавання Божага, нябачна адсякаюцца ад Царквы. *Бо цвёрдая аснова Божая стаіць, маючы гэткую пячаць: «пазнаў Госпад Сваіх»,*

і: «няхай адступіцца ад няпраўды кожны, хто імя Госпада называе» (2 Цім. 2, 19). Госпад моцаю ўсёведання ведае, хто сапраўдны, а хто намінальны хрысціянін, і апошнія прыпадабняюцца да галін, зусім або напалову засохлых, якія ёсць, аднак не перашкаджаюць дрэву пладаносіць. Яны ўжо не спажываюць жыватворных сокаў дрэва і жывуць толькі цялесным жыццём.

Калі мы заклікаем імя Божае, дык адступаюць сілы няпраўды і зла. Царква застаецца святой, бо падставай яе святасці з'яўляюцца Святасць яе Боскае Галавы — Ісуса Хрыста і ласка Святога Духа.

Нарэшце, Царква Святая моцаю яе сапраўднага складу: у ёй заўжды былі і будуць прападобныя, падзвіжнікі, пакутнікі, аскеты, тыя, хто служыць Богу і імкнецца да збавення.

6. Саборнасць Царквы

Саборнасць Царквы азначае, што яна не абмежаваная ні часам, ні месцам, ні народам.

У адносінах да Царквы слова «Саборная», «Сусветная», «Кафалічная» — сінонімы. Да Яе належаць вернікі ўсіх часоў і народаў.

Царква Старого Запавету была абмежаваная і месцам, і народам, і часам. Тады пакланяліся толькі ў Іерусаліме. Пра абмежаванасць месцам сведчыць той факт, што іудзеі збіраліся ў Іерусаліме на вялікія святы. Аднак у гутарцы Ісуса Хрыста з самаранкаю Госпад указвае на тое, што

настане час пакланення Яму ў духу і праўдзе: *Кажа ёй Ісус: жанчына, вер Мне, надыдзе пара, калі не на гары гэтай, і не ў Іерусаліме пакланяцца будзеце Айцу. Вы пакланяецеся, а таго не ведаеце, мы пакланяемся, бо ведаем тое, што збаўленне ёсць ад Іудзеяў. Але настане пара, дый яна ўжо прыйшла, калі праўдзівыя паклоннікі будуць пакланяцца Айцу ў духу і праўдзе, бо Айцец гэткіх шукае паклоннікаў Яму (Ін. 4, 21).* Гэта абвяшчае і апостал Павел: *па ўсёй зямлі разышоўся голас іх (Рым. 10, 18).* А таксама: *Найперш дзякую Богу майму праз Ісуса Хрыста за ўсіх вас, што вера ваша абвяшчаецца па ўсім свеце (Рым. 1, 8).* А таксама: *Дзякуй жа Богу, што заўсёды нам дае перамогу ў Ісусе Хрысце, і салодкі дух розуму Яго выяўляе праз нас ва ўсялякім месцы (2 Кар. 2, 14).* А таксама: *Бо Госпад ёсць Дух, а дзе Дух Гасподні, там свабода (2 Кар. 3, 17).* А таксама: *Дзеля надзеі, прыгытаванай вам у нябёсах, пра якую вы чулі раней ў словах праўды Дабравесця, якое ёсць у вас, як і ва ўсім свеце, і пладаносіць, і расце яно, як і сярод вас, з таго дня чуеце і разумееце ласку Божую ў праўдзе (Кал. 1, 5-6).*

Царква Новага Запавету называецца яшчэ Ўсходняй. Гэта значыць, што Сусветная праваслаўная вера была зацверджаная сямю Сусветнымі Цэрквамі менавіта на Ўсходзе, і дагэтуль з ласкі Божае наша Руская Царква застаецца Усходняй Царквою. З Усходам звязаныя ўсе чаканні райскае раскошы: Эдэм быў на Усходе; там было дадзе-

на абяцанне аб насенні жанчыны, а таксама ўсе хрысціянскія абяцанні і дапаўненні Першаевангелля. Нарэшце, на Усходзе прыйшоў Хрыстос.

Іудзейская царква была абмежаваная таксама і часам. Стары Запавет быў настаўнікам: *закон настаўнікам нам быў у Хрысце (Гал. 3, 24)*, рыхтуючы народ да прыняцця Новага Запавету. Царква Хрыстовая вечная: *Я збудую Царкву Маю, і брамы пякельныя не перамогуць яе (Мц. 16, 18)*. Еўхарыстыя будзе адбывацца ў ёй да сканчэння дзён.

Пра неабмежаванасць народам гаворыцца ў наступных сведчаннях: *І, падышоў Ісус, і прамовіў да іх, кажучы: дадзена Мне ўсякая ўлада на небе і на зямлі. Дык ідзіце, навучайце ўсе народы, хрысцячы іх у імя Айца і Сына і Святога Духа, навучаючы іх выконваць усё, што Я сказаў вам; і вось Я з вамі ва ўсе дні да сканчэння веку. Амін. (Мц. 28, 18-20)*. А таксама: *І Пісанне, прадбачучы, што Бог вераю апраўдвае паган, загадзя абвясціла Аўрааму: у табе благаславёныя будуць усе народы. Гэтак тыя, што ад веры, благаслаўляюцца разам з верным Аўраамам (Гал. 3, 8-9)*. А таксама: *І апрануўшыся ў новага, які абнаўляецца ў пазнанні паводле вобразу Стваральніка свайго, дзе няма Грэка і Іудзея, абразання і неабразання, варвара і Скіфа, раба і свабоднага, але ўсё і ва ўсім Хрыстос (Кал. 3, 10-11)*. А таксама: *І сказаў ім: ідзіце па ўсім свеце і абвяшчайце Евангелле ўсякаму стварэнню. Хто паверыць і ахрысціцца, будзе збаўлены: а хто*

веры не мае, асуджаны будзе (Мк. 16, 15-16). А таксама: *Тады расчыніў ім розум дзеля зразумення Пісання. І сказаў ім: так напісана, і так належала пакутаваць Хрысту і ўваскрэснуць з мёртвых на трэці дзень, і абвяшчацца ў імя Яго пакаянню ды адпушчэнню грахоў ва ўсіх народах, пачаўшы ад Іерусаліма (Лк. 24, 45-47).*

Абяцанні, дадзеныя Царкве, былі наступныя:

- брамы пякельныя не адолеюць яе;
- Госпад прабудзе з ёю да сканчэння веку;
- у ёй прабудзе Слава Божая аб Ісусе Хрысце ва ўсе роды веку;
- яна ніколі не можа адпасці ад веры, праўды;
- ні паграшыць у праўдзе веры,
- ні памыляцца.

Царква беспамылковая. Крыніца беспамылковацсці не ў нас, але ў Ісусе Хрысце: *Хрыстос палюбіў Царкву і выдаў Сябе за яе, каб асвяціць яе (Эф. 5, 25).* Хрыстос асвяціў яе Пакутамі і смерцю. Царква асвечаная малітваю Хрыста за тых, хто верыць Богу Айцу: *Асвяці іх праўдаю Тваёю (Ін. 17, 17).* У Таінствах Царквы багата пераліваецца ласка Святога Духа. *Дух (ёсць) Бог: і той, хто кланяецца Яму, павінен кланяцца духам і праўдаю (Ін. 4, 24).*

Саборная Кафалічная Царква мае ў сабе ўсё неабходнае для збавення чалавека. Саборная Царква Новага Запавету заснаваная яе Галавой — Ісусам Хрыстом, асвячаная Святым Духам і дабратворная. Царкву Новага Запавету можна параўнаць з

Ноевым Каўчэгам, з караблём, што плыве сярод хваляў бурлівага жыццёвага мора і будзе плысці аж да Другога Прыйсця Хрыста. Вядома, што ўсе, хто не трапіў у Ноеў каўчэг, загінулі.

З вызнання святасці і беспамылковасці Царквы вынікае, што, належачы да яе, можна атрымаць збавенне.

У Пасланні Усходніх Пратрыярхаў аб Праваслаўнай веры, ч. 12, гаворыцца: «Вызнаём без сумневу, як цвёрдую праўду, што Кафалічная Царква не можа грашыць і памыляцца і выказваць ману замест праўды: бо Дух Святы, які заўжды дзейнічае праз Айцоў і Настаўнікаў Царквы, што служаць верна, засцерагае Яе ад усялякіх хібаў».

Муж ёсць галава жонкі, так і Хрыстос галава Царквы, і Ён жа Збавіцель цела (Эф. 5, 23), таму, каб прымаць удзел у гэтым збавенні, неабходна быць членам Яго цела, г. зн. Кафалічнае Царквы.

7. Апостальская Царква

Падставаю Царквы з'яўляецца Хрыстос Збаўца. На гэтым нарожным Камені Апосталамі і была створаная Царква. *Бо ніхто не можа пакласці іншага падмурка, апрача закладзенага, які ёсць Ісус Хрыстос (1 Кар. 3, 11).* А таксама: *Таму (Богу Айцу) Слава ў Царкве ў Хрысце Ісусе, на ўсе роды, адвеку давеку (Эф. 3, 21).*

Апостал Павел гаворыць: *Дык вы ўжо не чужыя і не прышлыя, але суграмадзяне святым і*

хатнія ў Бога, умацаваныя на падмурку Апосталаў і прарокаў, маючы за наражны камень Самога Ісуса Хрыста, ўзнесеныя былі на падмурку Апосталаў і Прарокаў, якія былі наражным каменем Самому Ісусу Хрысту (Эф. 2, 19).

Апосталы, ствараючы Царкву, прайшлі з краю да краю ўвесь сусвет. Рымская Царква была заснаваная апосталам Пятром. Апостал Андрэй Першапаклікані заснаваў Цэрквы ў Крыме, Кіеве, Ноўгарадзе.

Царква называецца Апостальскаю таму, што яна няспынна і нязменна захоўвае ад Апосталаў і вучэнне, і пераемнасць дарункаў Святога Духа, што ажыццяўляецца праз святое рукапалажэнне. З 5000 чалавек Хрыстос выбраў семдзесят вучняў, а з сямідзесяці — дванаццаць, і тры з паловаю гады вучыў іх. *І Ён паставіў адных Апосталамі, другіх Прарокамі, іншых евангелістамі, іншых пастырамі і настаўнікамі, дзеля ўдасканалення святых, дзеля справы служэння, на збудаванне цела Хрыстовага (Эф. 4, 11-12).* У першы дзень Уваскрасення Ён паставіў Апосталаў на служэнне і падаў ім дары Святога Духа, сказаўшы: *Прыміце Духа Святога. Каму адпусціце грахі, таму будуць адпушчаныя, на кім пакінеце, на тым застануцца (Ін. 20, 22-23).*

Апостал Павел гаворыць, што вучэнні, якія не грунтуюцца на вучэнні Апосталаў, належыць адкідаць: *Бо ёсць многа і непакорлівых, і пустасловаў, і ашуканцаў, асабліва з абрэзаных, якім трэба*

затыкаць рот: яны цэлыя дамы разбэшчваюць, навучаючы, чаму не след, дзеля ганебнае карысці (Ціт. 1, 10-11). Належыць захоўваць адзінны Дух у адзінай Царкве: *Бо ўсе адным Духам ахрышчаныя ў адно цела, Іудзеі або Грэкі, рабы або вольныя: і ўсе напоеныя адным Духам. Бо Цела — не адзін член, але многа (1 Кар. 12, 13-14).*

На хрысціян накладаюцца важныя **абавязкі:**

- зберагаць адзінства веры;
- захоўваць Апостальскае вучэнне і Апостальскае паданне:

Ерэтыка чалавека пасля першай і другой перасцярогі пакінь, ведаючы, што гэткі разбэсціўся і грашыць, асуджаны сам сабою (Ціт 3, 10-11).

Скажы Царкве, а калі і Царквы не паслухае, няхай будзе ён табе як язычнік і мытнік (Мц. 18, 17).

На тым, браты, стойце, і трымайцеся паданя, якому навучыцеся або словам, або пасланнем нашым (2 Сал. 2, 15).

О, Цімафею, захавай паданне (1 Цім. 6, 20).

Хвалю вас, браты, бо вы ўсё маё памятаеце, і трымаецеся падання, якое я вам перадаў (1 Кар. 11, 2).

Галоўнымі крыніцамі веравучэння з'яўляюцца:

- Святое Паданне,
- Святое Пісанне,
- Апостальскія правілы,
- Сусветныя саборы,
- Памесныя саборы,
- Вучэнні і правілы Святых Айцоў.

Царква як цела Хрыстовае мае галоўныя органы, і гэтымі органамі з'яўляецца царкоўная іерархія, якая праліваe Божую ласку на статак Хрыстовы. Іерархія мае сувязь з Хрыстом. Царкоўная іерархія, або святарская падпарадкаванасць, дазваляе захоўваць пераемнасць Апостальскага служэння. Органам іерархіі, які можа дзейнічаць ад імя ўсяе Царквы, з'яўляецца Сусветны сабор. Галоўныя часткі Сусветнае Царквы папарадкаваныя праваслаўным Патрыярхам. Меншыя вобласці і гарады папарадкоўваюцца мітрапалітам, архіепіскапам і епіскапам. Святы Дух спачывае на членах Царкоўнай іерархіі, якім даецца ўлада. Сусветны сабор ахоплівае сваёй уладаю ўсю Царкву, а на яго ўздзейнічае толькі Святы Дух. Памесныя Саборы падпарадкоўваюцца Патрыярхам.

Царкоўныя саборы — гэта не прадукт дзейнасці Царквы, а паступовае раскрыццё царкоўнае свядомасці. Праўды, абвешчаныя Хрыстом. Святыя Айцы надалі гэтым праўдам форму дагматаў, каб мы не маглі збочыць ў ерась. У кожным дагмаце два бакі: унутраны і знешні. Унутраны бок нязменны, знешні — гэта слоўная фармулёўка, якая змяняецца, бо мова ў народаў абнаўляецца.

Жыццё Царквы складаецца з цеснага ўзаемадзеяння іерархіі і паствы. Непасрэдны ўдзел свецкіх вернікаў неабходны. Так, святар мае права даравання грахоў, але толькі ўсвядомленых свецкімі вернікамі, выспаведаных, і толькі тым, якія праг-

нуць выбавіцца з гэтых грахоў. Пры абранні епіскапа патрабуецца таксама сведчанне ад знешніх, г. зн. згода свецкіх вернікаў.

10-ая частка Сімвалу веры. Пра Хрышчэнне Вучэнне пра Таінствы Царквы

Вызнаю адзінае хрышчэнне дзеля збаўлення ад грахоў.

Таінствы як святчэннадзеянні, праз якія праліваецца Ласка Божая

Таінствы — гэта свяшчэннадзеянні, усталяваныя Самім Богам, з дапамогаю якіх праз бачныя дзеянні падаецца нябачная ласка Божая.

Таінствы адрозніваюцца ад абрадаў тым, што яны ўстаноўленыя Богам. Ёсць сведчанні аб тым, калі і пры якіх абставінах яны былі ўстаноўленыя і абяцаныя Богам. Іх устаноўленасць Богам азначае, што яны дабратворныя, г. зн. выконваюцца дзеля асвячэння Божай ласкаю нашай грэшнай душэўнай і цялеснай прыроды, і мы можам прымаць удзел у іх або на асуджэнне, або на ўваскрасенне. У Святым Пісанні ёсць неаднаразовыя згадкі пра Таінствы. Напрыклад: *Усе мы, якія ахрысціліся ў Хрыста Ісуса, у смерць Яго ахрысціліся (Рым. 6, 3).* Тут гаворыцца пра Таінства Хрышчэння. А таксама: *Бо кожны раз, калі вы ясце гэты хлеб і*

п'яце чару гэтую, смерць Гасподнюю абвяшчаеце, дакуль (Ён) не прыйдзе (1 Кар. 11, 26). Тут маецца на ўвазе Таінства Прычасця.

Колькасць Таінстваў нязменная. Усіх Таінстваў сем.

1. Хрышчэнне [Хрост] — гэта Таінства, у якім чалавек атрымлівае ласку Божую, праз якую адраджаецца на духоўнае жыццё і ачышчаецца з грахоў. Вораг хітры, падступны: з усіх бакоў спрабуе прабрацца ў нашу душу: праз розум, праз цела, вочы, слых, дотык, і нішто так не спусташае нашу душу, як грэх.

2. Мірапамазанне — Таінства, якое ўмацоўвае ў духоўным жыцці, спрыяе таму, каб устояць у духоўным жыцці і расці ў ім.

3. У Таінстве Еўхарыстыі чалавек насычаецца духам і найшчыльнейшым чынам злучаецца з Крыніцаю жыцця Хрыстом.

4. У Таінстве Пакаяння адбываецца даравание грахоў, усвядомленых чалавекам і выказаных ім на споведзі. У Пакаянні чалавек вылечваецца з хвароб духоўных.

5. У Таінстве Святарства даецца ласка на духоўнае адраджэнне і выхаванне іншых праз Вучэнне і Таінствы.

6. Таінства Шлюбу асвячае натуральную повязь да вобразу повязі Хрыста з Царквой і злучае дваіх ў адно цела. У Шлюбе чалавек атрымлівае ласку Божую, якая асвячае сямейнае жыццё, натуральнае нараджэнне і выхаванне дзяцей.

7. Таінства Алееасвячэння вылечвае з хвароб цела праз вылечванне духа.

Усе Таінствы неабходныя для хрысціян, апрача Таінстваў Святарства і Шлюбу.

1. Хрышчэнне [Хрост]:

а) паняцце аб Таінстве Хрышчэння

У Сімвале веры згадваецца толькі адно Хрышчэнне [адзіны Хрост], таму што былі часы, калі ставілася пад сумнеў аднаразовасць выканання гэтага Таінства. Хрышчэнне з'яўляецца мяжой, якая аддзяляе хрысціян ад нехрысціян. Хрышчэнне пачало выконвацца замест абразання Старога Запавету: *у Ім вы і абрэзаныя абразаннем нерукатворным, зняўшы з цела грахі цялесныя ў абразанні Хрыстовым, пахаваныя з Ім у Хрышчэнні, у Ім вы і ўваскрэслі разам праз веру ў сілу Бога, Які ўваскрасіў Яго з мёртвых: дый вас, што былі мёртвыя ў грахах і неабразанні цела вашага, ажывіў разам з Ім, дараваўшы нам ўсе грахі (Кал. 2, 11-13).*

Хрышчэнне — гэта Таінства, у якім вернік праз трохразовае занурэнне цела ў ваду, з закліканнем Бога Айца і Сына і Святога Духа, паміраe для жыцця цялеснага, грэшнага, і адраджаецца ад Святога Духа на жыццё духоўнае, святое. Апостал Павел гаворыць: *Іаан хрысціў хрышчэннем пакаяння, кажучы народу, каб паверылі ў Таго, хто ідзе за ім, гэта значыцца, у Ісуса Хрыста (Дзеі 19,*

4), але гэтае Хрышчэнне было Хрышчэннем пакаяння, яно рыхтавала да прыняцця Збаўцы.

Да першых абяцанняў устанаўлення Хрышчэння Богам належыць гутарка з Нікадымам, у якой Госпад гаворыць: *калі хто не народзіцца нанова, не зможа бачыць Царства Божага (Ін. 3, 3).* Пасля пытання Нікадыма аб тым, як жа можна нарадзіцца нанова, Ісусам даецца другое абяцанне, у якім Ён гаворыць, што чалавек не ўвойдзе ў Царства Божае без нараджэння вадой і Духам. Хрышчэнне — гэта дзверы ў Царства Божае: *Сапраўды, сапраўды кажу табе: калі хто не народзіцца вадою і Духам, не можа ўвайсці ў Царства Божае (Ін. 3, 5).*

На 40-ы дзень пасля Уваскрасення Госпад на Аліўнай гары наказаў Апосталам: *дык ідзіце, навучайце ўсе народы, хрысцячы іх ў імя Айца і Сына і Святога Духа (Мц. 28, 19).*

Гэтае Таінства пачало выконвацца з першага дня існавання Царквы. У першы дзень Пяцідзесятніцы іудзеі сабраліся ля пакою, дзе былі Апосталы, і пачалі пытацца: «Што нам рабіць?». Пётр сказаў: «Пакайцеся»; *пакайцеся, і няхай кожны з вас ахрысціцца ў імя Ісуса Хрыста дзеля адпушчэння грахоў: і возьмеце дар Духа Святога (Дзеі 2, 38).* А таксама: *Няўжо ж хто можа забараніць ваду дзеля хрышчэння вось гэтых, што прынялі Духа Святога, як і мы? І загадаў ім хрысціцца ў імя Ісуса Хрыста. Тады прасілі яго, каб пабыў у іх некалькі дзён (Дзеі 10, 47-48).* І 3000 чалавек былі

ахрышчаныя ў імя Айца і Сына і Святога Духа. Так утварылася першая паства (Дзеі 2, 38-41).

б) бачны і нябачны бакі Хрышчэння

Таінства Хрышчэння мае бачны і нябачны бок. Для Хрышчэння выкарыстоўваецца натуральная вада з чыстага вадаёму і асвячаецца падчас выканання Таінства. Бачны бок Таінства Хрышчэння — гэта вада, занурэнне цела ў яе, словы малітвы. Нябачны бок — патаемнае нараджэнне на жыццё вечнае, г. зн. дараванне грахоў і Богаўсынаўленне.

Хрышчэнне адбываецца праз трохразовае занурэнне: па-грэцку «баптызіо» (βαπτίζω) — занурэнне. Мы ведаем, што Ісус Хрыстос быў хрышчаны ў вадзе ў Іардане.

Занурэнне само па сабе не з'яўляецца Таінствам. Яно робіцца такім толькі пры вымаўленні выканаўчых слоў: «Хрысціцца раб Божы (называецца імя) у імя Айца і Сына і Святога Духа».

Апостал Піліп хрысціў шматлікіх самаран, хрысціў на шляху ў Дамаск еўнуха царыцы Эфіёпскай, на якога пасля выйсця з вады сышоў Дух Святы: *Сказаў жа яму Піліп: Калі верыш з усяго сэрца, дык можна табе. І мовіў у адказ: веру, што Ісус Хрыстос ёсць Сын Божы. І загадаў спыніць воз. І сышлі абое ў ваду, Піліп з еўнухам, і ахрысціў яго. Калі ж выйшлі з вады, Анёл Гас-*

подні схапіў Піліпа, і еўнух больш не бачыў яго, бо паехаў у сваю дарогу ўсцешаны (Дзеі 8, 37-39).

Калі паверылі Піліпу, які разносіў дабравесце пра Царства Божае і імя Ісуса Хрыста, дык хрысціліся мужчыны і жанчыны: *Калі ж паверылі Піліпу, які абвяшчаў ім Царства Божае ды імя Ісуса Хрыста, мужчыны і жанчыны хрысціліся. Сымон жа і сам паверыў і, як хрысціўся, быў пры Піліпе (Дзеі 8, 12-13).*

Іаан Хрысціцель хрысціў непадалёк ад Саліма, дзе было багата вады: *Іаан жа таксама хрысціў ў Эноне, недалёка ад Саліма, бо вады там было багата (Ін. 3, 23).* Поўнае занурэнне ў ваду было невыпадковае. Занурэнне ў ваду прыпадабняецца за водаў Патопу, які змываў грахі.

Нябачны бок Хрышчэння такі:

1. Падобна да таго, як у момант Хрышчэння Хрыста Святы Дух сышоў у выглядзе голуба, гэтаксама ў праваслаўным Хрышчэнні ласка Духа сыходзіць на ахрышчанага. Ласка адраджае чалавека нябачным нараджэннем — пра тое былі словы Хрыста, звернутыя да Нікадыма: *калі хто не народзіцца нанова, не зможа бачыць Царства Божага (Ін. 3, 3).* Хрышчэнне злучае нас з Ісусам Хрыстом праз падабенства да Ўваскрасення: *Што ж скажам? Ці нам вязнець у граху, каб памнажалася ласка? Няхай не станецца! Мы, якія памерлі для граху, як жа ж мы будзем жыць у ім? Няўжо вы не разумееце, што ўсе мы, якія ахрысціліся ў Хрыста Ісуса, у смерць Яго ахрысціліся? Дык мы*

пахавалі сябе разам з Ім хрышчэннем у смерць, каб, як Хрыстос уваскрос з памерлых цераз славу Айца, так і нам хадзіць у абноўленым жыцці. Бо, калі мы былі злучаныя з Ім падабенствам смерці Яго, дык будзем [злучаныя і падабенствам] уваскрасення (Рым. 6, 1-5). Хрышчэнне збаўляе нас ад вечнага асуджэння і вечнае смерці і кары вечнай.

2. Даруюцца ўсе грахі, што маюць першародную і асабовую падставу — пра гэта словы апостала Паўла ля святліцы: *пакайцеся, і няхай кожны з вас ахрысціцца ў імя Ісуса Хрыста дзеля адпушчэння грахоў (Дзеі 2, 38).* Грахі, здзейсненыя да Хрышчэння, пасля выйсця з купелі Хрышчэння, паводле слова Апостала, *абмыліся, але асвяціліся, але апраўдаліся імем Госпада нашага Ісуса Хрыста і Духам Бога нашага (1 Кар. 6, 11).*

3. Да Хрышчэння ўсе мы — дзеці Бога, пасля Хрышчэння мы сыны Божыя паводле ласкі: *Бо ўсе вы сыны Божыя праз веру ў Хрыста Ісуса. Бо, колькі вас у Хрыста ахрысцілася — у Хрыста апранулася. Няма ўжо Іудзея, ані Грэка, няма раба, ані свабоднага; няма мужчынскага полу, ані жаночага: бо ўсе вы адно ў Хрысце Ісусе (Гал. 3, 26-28).* А таксама: *Закон жа прыйшоў пасля, і такім чынам памножыўся грэх. А калі памножыўся грэх, звыш меры памножылася ласка, каб, так як грэх запанаваў у смерці, так і ласка запанавала праз праведнасць на жыццё вечнае, праз Ісуса Хрыста, Госпада нашага (Рым. 5, 20-21).*

Дзеянні выконваюцца не механічна, але з ўдзелам нашай волі. Папераджальная ласка дзейнічае ў свеце, і некаторыя слухаюць яе голасу, іншыя прыпісваюць яе пачуццям, якія датычацца нямоглага чалавечага цела. «У Хрышчэнні замацоўваецца вобраз ласкі, г. зн. само рашэнне і надае сіл, каб устояць у гэтым намеры, — кажа св. Феафан, — ласка гэтая, адраджальная, надае сілы, каб устояць у гэтым намеры». Ідучы да Хрышчэння, мы прымаем рашэнне замяніць заганны лад жыцця на святы, а без гэтага рашэння Таінства не можа мець моцы.

в) Хрышчэнне немаўлят

Пры хрышчэнні немаўлят яны павінны мець хросных бацькоў, якія адказваюць за іх і абавязаныя выхоўваць немаўлят, ведучы іх у жыццё ласкі Божае.

Некаторыя адмаўляюць слушнасць Хрышчэння немаўлят. Аднак у Новым Запавеце часта сустракаюцца апісанні таго, як Бог збаўляе дзяцей паводле веры бацькоў. Так, хананеянцы, якая прасіла за дачку, Госпад выканаў прашэнне. Дачка акрыяла паводле веры матчынае (Мц. 15, 22-28). Апантаны падлетак вылечыўся паводле веры бацькі (Лк. 7, 14). Апосталы таксама не рабілі выключэння для дзяцей. Апостал Пётр ахрысціў «дом» Карнілія (Дзеі 10, 44), апостал Павел — Лідзію і яе хатніх: *І слухала адна жанчына, на імя Лідзія, гандляр-*

ка парфіраю, з горада Фіятыра, якая шанавала Бога, і Госпад адчыніў сэрца ёй, каб успрыняла прамову Паўла. Калі ж хрысцілася яна і дом яе (Дзеі 16, 14-15), а таксама сям'ю астрожнага вартаўніка: *Гаспадары, што мне трэба рабіць, каб выратавацца? Яны ж сказалі: Вер у Госпада Ісуса Хрыста — і будзеш збаўлены ты і ўвесь дом твой. І казалі слова Гасподняе яму і ўсім хатнім ягоным. І ўзяў іх ў тую ж гадзіну ночы, паабмываў раны ды ахрысціўся сам разам з усім сваім домам (Дзеі 16, 30-33).* Апостал Павел хрысціў Сцяпанаў «дом» у Карынфе (1 Кар. 1, 16), вучняў Іаана Хрысціцеля ў Эфесе (Дзеі 19, 1-7), цэлую грамаду самарыцян (Дзеі 8, 14-17), «дом» Крыспа, начальніка сінагогі: *А Крысп, начальнік сабору, паверыў у Госпада з усім домам сваім, і многія з Карынфян, слухаючы, паверылі ды ахрысціліся (Дзеі 18, 8).*

Хрысціліся і дарослыя (Дзеі 2, 38; Мк. 16, 16), і немаўляты (Лк. 18, 16; Кал. 2, 11-12). Абразанне паводле Старога Запавету адбывалася на восьмы дзень, а Хрышчэнне ёсць больш дасканалае выкананне абразання. Гэта нерукатворнае абразанне ад грахоў цела ў Ісуса Хрыста.

У 252 г. Карфагенскі сабор вызначыў: «Не належыць нам нікога адлучаць ад Хрышчэння і ласкі Бога, да ўсіх міласэрнага, ласкавага і спагадлівага. Калі трэба трымацца гэтага ў дачыненні да ўсіх, дык асабліва ў дачыненні да нованароджаных немаўлят, якія ўжо таму заслугоўваюць нашае

дапамогі і літасці Божае, што ад пачатку свайго нараджэння яны сваім плачам і слязьмі выказваюць адно маленне (Цыт. паводле: св. Кіпрыян Карф. 46. Ліст да епіскапа Фіда).

«Калі ж хрысціць дзіця?» — гэта пытанне аб тым, як чалавеку лепей расці: пад уздзеяннем ласкі Божае ці без ласкі. Паміж хрышчаным і няхрышчаным дзіцём вялікая розніца, як паміж раслінаю, якая расце пад сонцам і без сонца.

г) якім чынам выконваецца Хрышчэнне

Пры Хрышчэнні выконваецца замова, каб ад хрышчанага адагнаць д'ябла, бо да Хрышчэння чалавек па-ранейшаму знаходзіцца пад яго ўладаю. Д'ябал змагаецца з чалавекам праз заганныя звычкі, да якіх чалавек можа схіляцца. Па-за ласкаю людзі, *паводле звычаю гэтага свету, па волі князя ўлады паветранае, духа, што дзейнічае цяпер ў сынах праціўлення (Эф. 2, 2).*

Знакам крыжа — Жагнаннем неаднаразова асвячаюцца і вада, і хрышчаны. Падчас царкоўнае службы Жагнанне выконваецца шматкроць. Жагнанне мае тую самую сілу, што імя Ісуса Хрыста Ўкрыжаванага, якое вымаўляецца з вераю рухам вуснаў. А пра сваё імя Хрыстос казаў: *імем Маім дэманаў выганяць будуць (Мк. 15, 17).* Моц замовы пры Хрышчэнні заключаецца ў закліканым з малітваю і верай імені Ісуса Хрыста. Хрышчаны з вераю атрымлівае збаўленне: *Хто паверыць*

і ахрысціца, збаўлены будзе (Мк. 16, 16). Чалавек атрымлівае ачышчэнне і асвячэнне, гэтаксама, *як і Хрытос палюбіў Царкву і выдаў Сябе за яе, каб асвяціць яе, ачысціўшы купеллю воднаю, у слове (Эф. 5, 25-26).*

Святы Кірыла Іерусалімскі гаворыць пра Крыж: «Ён — вялікая засцярога, дадзеная бедным у дар, і слабым без высілку. Бо гэта ласка Божая, знак для верных і страх — для злых духаў (Абвеснае павучанне, 13, 36). Знак Крыжа — Жагнанне — вялікая сіла, дадзеная бедным у дар, бо гэта — невычэрпнае багацце для душы, і слабым без высілку, бо нават на смяротным ложку слабы можа перажагнацца.

З крыжам, дадзеным падчас Хрышчэння, нельга расставацца ніколі. Ісус Хрыстос сказаў: *калі хто хоча ісці за Мною, няхай сябе зрачэцца, возьме крыж свой і за мной ідзе следам (Мц. 16, 24).* Хрыстос не пазбег Крыжа, тым болей не належыць пазбягаць яго чалавеку.

Белая вопратка, у якую апранаецца хрышчаны, — сімвал чысціні душы і цела. Тыя, хто грашыць пасля Хрышчэння, робяць цяжкі грэх. Іхны грэх нашмат цяжэйшы за грэх тых, хто яшчэ не ахрышчаны. Праз спазнанне Госпада і Збаўцы нашага Ісуса Хрыста чалавек граху пазбаўлецца, але, трапіўшы пад уздзеянне новага граху, зноў заблытваецца ў грэсе, а выблытацца з новага сілá бывае яшчэ цяжэй.

Хаджэнне хрышчанага вакол купелі — гэта радасць духоўная, спалучаная з духоўным прасвят-

леннем. Хрышчэнне — гэта духоўнае нараджэнне, а нараджаецца чалавек аднойчы. Той, хто грашыць пасля Хрышчэння, вінаваты горш за няхрышчанага, бо ён адмаўляецца ад Божае дапамогі для таго, каб чыніць дабро: *Бо, уцёкшы ад брыдоты свету праз пазнанне Госпада і Збавіцеля нашага Ісуса Хрыста, зноў, заблытаўшыся, пераможаныя бываюць, дык апошняе для іх горш за першае (2 Пят. 2, 20)*. Аднак той, хто зграшыў, мае магчымасць ачысціцца з граху праз пакаянне: *пакайцеся, і няхай кожны з вас ахрысціцца ў імя Ісуса Хрыста дзеля адпушчэння грахоў: і возьмеце дар Духа Святога (Дзеі, 2, 38)*.

2. Мірапамазанне

Падобна да таго, як чалавек, народжаны ў фізічнае жыццё, мае патрэбу ў вопратцы, пітве і г. д., гэтаксама народжаны духоўна мае патрэбу ў новай ежы — ласцы, якая вяртае і ўмацоўвае на жыццё духоўнае. Таінства Мірапамазання ўстаноўленае, каб чалавек мог устояць у духоўнай праўдзе, трываць у ёй і ўмацоўвацца ў ласцы Святога Духа.

Яшчэ нашмат раней за Галгофу евангеліст Іаан кажа: *Дый вы памазанне маеце ад Святога, і ведаеце ўсё (1 Ін. 2, 20)*. А таксама: *І памазанне, якое вы прынялі ад Яго, у вас застаецца, і вы не маеце патрэбы, каб хто вучыў вас, але, як гэтае самае памазанне вучыць вас аб усім, а яно праўдзівае і непадманнае, дык, калі яно навучыла вас, у тым трывайце (1 Ін. 2, 27)*. Гэтае абяцанне выканалася

ў дзень Пяцідзесятніцы: Праз зыход Святога Духа ўсе Таінствы атрымалі дар Святога Духа. Моц Таінства артымала і Мірапамазанне.

У найбліжэйшыя дні пасля Пяцідзесятніцы Апосталы, знаходзячыся ў Іерусаліме, пачулі, што Самарыя была ахрышчаная дыяканам Піліпам, і тады двойга апосталаў, Пётр ды Іаан, накіроўваюцца туды і накладаюць на тых, каго хрысціў Піліп, рукі, каб яны прынялі дар Святога Духа: *тады яны ўсклалі на іх рукі, і тыя прынялі Духа Святога (Дзеі 8, 17)*.

Апостал Павел, хрысцячы дванаццаць вучняў Іаана Хрысціцеля, якія былі ахрышчаныя хрышчэннем пакаяння, хрысціць іх Хрышчэннем Хрыстовым, затым ужо ўскладае на іх рукі, і Дух Святы сыходзіць на іх: *Пачуўшы, яны ахрысціліся ў імя Госпада Ісуса, і, як усклаў Павел рукі на іх, зышоў на іх Дух Святы (Дзеі 19, 5-6)*.

Вышэй згаданыя словы апостала Іаана датычацца бачнага памазання, але вядома, што напачатку Апосталы дзеля паслання хрышчаным дароў Святога Духа практыкавалі ўскладанне рук: *Апосталы ж, якія былі ў Іерусаліме, пачуўшы, што Самарыя прыняла слова Божае, паслалі ім Пятра ды Іаана, якія прыйшлі, памаліліся за іх, каб прынялі Духа Святога: бо не сышоў Ён датуль ні на каго з іх, а толькі былі яны ахрышчаныя ў імя Госпада Ісуса (Дзеі 8, 14-16)*. Апосталы былі вымушаныя замяніць ўскладанне рук на Мірапамазанне з практычных меркаванняў, бо Царква

хутка распаўсюджвалася па цэлым свеце, і яны фізічна не паспявалі з ускладаннем рук.

Свц. Дыянісій Арэапагіт у кнізе «Аб царкоўнай іерархіі» (раздзел 4) піша, што пераемнікі Апосталаў замест ускладання рук пачалі практыкаваць Мірапамазанне на ўзор памазання, якое выкарыстоўвалася ў часы Старога Запавету: *І ўзяў Садок іерэй рог з алеем са скініі, і памазаў Саламона, і затрубілі ў трубны рог, і вырашылі ўсе людзі: няхай жыве цар Саламон (3 Цар. 1, 39).* Госпад сказаў Майсею: *і зрабі гэты алей для святога памазання, мазь, складзеную па-майстэрску алейнікам: гэта будзе міра для святога памазання (Вых. 30, 25).*

Такім чынам, памазанне было ўведзенае самімі Апосталамі. Памазанне вонкава выконваецца іерэем, але памазвае Сам Бог: *Дый памазанне, якое вы атрымалі ад Яго, у вас застаецца, і вам не трэба, каб нехта вучыў вас, але, як гэтае самае памазанне [Яго, Дух Яго] вучыць вас аб усім (1 Ін. 2, 27).*

Памазанне выконваецца пасля Хрышчэння, і тады хрышчаны робіцца членам Царквы. Выканаўчай формулай Таінства Мірапамазання з'яўляюцца словы: «Пячаць дару Духа Святога. Амін». Пячаць Святога Духа непазбыўная, і наступствы памазання невымоўныя.

Многія хрысціяне інтуітыўна добра адрозніваюць хрысціянскую праўду аб д'ябальскае маны. Хто вучыць іх? Пра гэта коратка гаворыць апостал Павел: *Той, хто ўмацоўвае нас з вамі ў Хрысце і*

памазаў нас, ёсць Бог, Які і запячатаў нас, і даў задатак Духа ў сэрцах нашых (2 Кар. 1, 21-22). Памазвае Сам Бог, і вучыць сама дабратворная сіла памазання.

Рэчыва для Мірапамазання — гэта Святое Міра. Для яго прыгатавання, апроч вады, алею і віна, выкарыстоўваецца больш за 40 духмяных рэчываў, пахучы алей розных гатункаў, напрыклад, ружовы алей (каб атрымаць 1 кг алею, трэба 1000 кг пялёсткаў), дарагія віны, ладаны, духмянае карэнне і кветкі. Разнастайнасць духмяных рэчываў сімвалічна ўказвае на багацце дабратворных дароў Святога Духа, якія перадаюцца праз Мірапамазанне.

Царква атрымала Міра з Візантыі, з Канстанцінопаля. Пасля надання Аўтакефаліі Руская Царква да 1917 года сама гатавала Міра ў Міраварнай палаце былога Патрыяршага палацу ў Маскоўскім Крамлі. Цяпер урачысты чын Міраварэння выконваецца ў малым саборы Данскога манастыра, у Вялікі тыдзень Пакут Гасподніх, пачынаючы з Вялікага панядзелка. У Вялікую сераду ў падрыхтаванае міра закладаюць пахі, у Вялікі чацвер Патрыярх асвячае Міра, напярэдадні разлітае ў посуд, і асвечанае Міра разліваецца ў посуд і рассылаецца праасвяшчэнным, а праз іх, у сваю чаргу, благачынным, а затым Міра перадаецца ў цэрквы.

Міра асвячалі Апосталы, а зараз яго асвячаюць іх пераемнікі — епіскапы. У Рускай Царкве

ў цяперашні час Міра асвячаецца год цераз год у Маскве — Патрыярхам.

У Таінстве Мірпамазання выконваецца з малітвай памазанне частак цела: ілба (асвячэнне розуму і думак), грудзей (асвячэнне сэрца, або жаданняў), вачэй, вуснаў і вушэй (асвячэнне пачуццяў), рук і ног (замена спраў мінулых на пабожныя).

3. Еўхарыстыя

а) Боскае ўстанаўленне Таінства Еўхарыстыі

Еўхарыстыя — гэта Таінства, у якім вернікі пад выглядам хлеба і віна ядуць Цела і Кроў Хрыстовую для Вечнага жыцця.

Таінства Еўхарыстыі адрозніваецца найвялікшай таямнічасцю і веліччу Дару. Няма такога дакладнага слова, якім можна было б хоць у нейкай ступені акрэсліць унутраны бок Таінства. Тут самым непасрэдным чынам чалавек злучаецца з Самім Богам.

Перш чым устанавіць гэтае Таінства, Гоcпад папярэдзіў яго чатырохразовым абяцаннем у гутарцы з вучнямі, якія пыталіся ў Яго, што трэба рабіць, каб чыніць справы Божыя (тады як Хрышчэнне Ён папярэдзіў двухразовым абяцаннем, а Мірапамазанне — аднаразовым):

Што нам рабіць, каб рабіць справы Божыя? Адказаў Ісус і сказаў ім: вось справы Божыя: каб вы верылі ў Таго, Каго Ён паслаў. Яны ж сказалі

Яму: які ж Ты дасі знак, каб мы бачылі і паверылі Табе? Што Ты робіш? Бацькі нашыя елі манну ў пустыні і насыціліся, паводле напісанага: хлеб з Неба даў ім есці. Ісус жа сказаў ім: Сапраўды, сапраўды кажу вам: не Майсей даў вам хлеб з Неба, але Айцец Мой дае вам сапраўдны хлеб з Неба. Бо хлеб Божы ёсць той, што сыходзіць з Неба і дае жыццё свету. Яны ж сказалі Яму: Госпадзе! Давай нам заўсёды такі хлеб. Ісус жа сказаў ім: Я ёсць хлеб жыцця, хто прыходзіць да Мяне, не будзе галодны, хто верыць ў Мяне, не будзе смягнуць ніколі. Але Я сказаў вам, што і бачылі Мяне, і не верыце. Усё, што даў Мне Айцец, да Мяне прыйдзе, і таго, хто прыходзіць да Мяне, не выганю прэч: бо Я сышоў з Неба не дзеля таго, каб чыніць волю Маю, але волю Айца, Які Мяне паслаў (Ін. 6, 28-38).

Ісус даў Іудзеям знак сапраўднага хлеба з Нябёсаў ад Айца Нябеснага: *Бо хлеб Божы ёсць той, што сыходзіць з Неба і дае жыццё свету (Ін. 6, 33).* На гэта Іудзеі сказалі Яму: *Госпадзе! Давай нам заўсёды такі хлеб (Ін. 6, 34).* Іудзеі наракалі на Яго, але Ісус сказаў: *ніхто не можа прыйсці да Мяне, калі Яго не прывабіць Айцец, што паслаў Мяне, і Я ўваскрашу яго ў апошні дзень (Ін. 6, 44).* А таксама: *таго, хто прыходзіць да Мяне, не выганю прэч: бо Я сышоў з Неба не дзеля таго, каб чыніць волю Маю, але волю Айца, Які Мяне паслаў... Воля Таго, хто паслаў Мяне, такая, каб кожны, хто бачыць Сына і верыць у Яго, меў*

жыццё вечнае, і Я ўваскрашу яго ў апошні дзень (Ін. 6, 37-40).

Вельмі галодныя іудзеі, якія не бачылі іншых запасаў ежы, апроч пяці хлябоў, што благаславіў Госпад і разнёс па шэрагах, наеліся і вельмі здзівіліся з гэтага цуду. Госпад дае чатырохразовае абяцанне пасля насычэння пяці тысяч чалавек пяццю хлябамі: *Я — хлеб жывы, што сышоў з Неба, хто есць хлеб гэты, жыць будзе вечна (Ін. 6, 51).* Ісус гаворыць аб супрацьлегласці манны і гэтага хлеба: *Хлеб жа, які дам, ёсць Цела Маё, якое Я аддам за жыццё свету (Ін. 6, 51).*

Іудзеі спрабавалі зразумець гэтае абяцанне і спрачаліся пра яго: *жорсткае гэта слова (Ін. 6, 60).* Госпад не ўдзельнічае ў спрэчцы, бо Праўда ёсць Праўда, больш за гэта, Ён гаворыць, што надыдзе час, калі Ён дасць у ежу Цела Сваё і Кроў Сваю: *Бо Цела Маё сапраўды ёсць ежа, і Кроў Мая сапраўды ёсць пітво (Ін. 6, 55).*

Збянтэжаныя, вучні Яго пачалі адыходзіць ад Хрыста. Але Ён не пераконвае іх, а вымаўляе гэта тройчы, пакладаючыся на іх веру: *Ці гэта вас абурае? А калі ўбачыце Сына Чалавечага, які ўзыходзіць туды, дзе быў раней? Дух ёсць тое, што ажыўляе, цела ж нічога не вартае: словы, якія вам кажу, ёсць Дух і жыццё (Ін. 6, 61-63).* Але Ісус ведаў загадзя, хто сярод вучняў не верыць і хто здрадзіць Яму. Таму і казаў Ён, што *ніхто не можа прыйсці да Мяне, калі яму не будзе дадзена Айцом Маім (Ін. 6, 65).*

Калі засталося дванаццаць чалавек, Ісус спытаўся ў іх, ці не хочуць яны таксама пайсці, але Пётр адказаў: *Госпадзе! Да каго нам ісці? Ты маеш словы жыцця вечнага (Ін. 6, 68).* Тады Хрыстос, пасля выпрабавання веры апосталаў, пераканаўся, што яны дакладна зразумелі Яго словы: *Хіба не Я вас дванаццацярых абраў? Але адзін з вас — д'ябал (Ін. 6, 70).*

Само Таінства Еўхарыстыі было ўстаноўленае напярэдадні Галгофскае Ахвяры на Тайнай Вячэры. Тут Госпад прадказаў здраду: *адзін з вас выдасць Мяне (Мц. 26, 21).*

У святліцы вучні прыгатавалі ўсё неабходнае для пасхі паводле Старога Запавету: *І, калі яны елі, Ісус, узяўшы хлеб і паблагаславіўшы, паламаў, і даваў вучням, кажучы: прыміце, ешце, гэта ёсць Цела Маё. І, узяўшы чару і аддаўшы хвалу, падаў ім і сказаў: піце з яе ўсе, бо гэта ёсць Кроў Мая, Новага Запавету, за многіх праліваная дзеля даравання грахоў (Мц. 26, 26-28).* Гэта апошнія дні і гадзіны жыцця Ісуса Хрыста. Тут Госпад гаворыць ужо не прыпавесцямі, а наўпрост.

б) здзяйсненне Таінства Еўхарыстыі падчас набажэнства

Парадак Таінства Еўхарытыі — Боская літургія (па-грэцку λειτουργία — грамадскі абавязак, служэнне). У цяперашні час існуюць чатыры чыны выканання Еўхарыстыі: Літургія Св. Іаана

Залатавуснага (выконваецца звычайна ў нядзелю і ў будзённыя дні), Літургія св. Васіля Вялікага (выконваецца дзесяць разоў на год), Літургія св. Якуба, брата Гасподняга (выконваецца толькі раз на год на дзень св. Якуба, 23 кастрычніка паводле ст. ст., у Іерусаліме ды ў нешматлікіх іншых месцах), Літургія Раней Асвячаных Дароў (па серадах і пятніцах падчас Вялікага посту і на працягу першых трох дзён Вялікага тыдня; падчас гэтай Літургіі Дароў не асвячаюць, а прычашчаюцца Дарамі, асвячанымі раней).

Спачатку рыхтуецца рэчыва для Таінства, потым да Таінства рыхтуюцца вернікі, і, нарэшце, адбываецца само Таінства і вернікі прычашчаюцца. Літургія, адпаведна, падзяляецца на тры часткі: праскамідыя, Літургія запрошаных і Літургія верных.

Да бачнага, знешняга боку выканання Таінства належаць хлеб і віно, малітвы, выканаўчыя словы. Першая частка Літургіі называецца праскамідыяй (προσκομιδή, што ў перакладзе з грэцкай мовы азначае «прынашэнне»). Падчас яе рыхтуецца рэчыва для Таінства. Гэтая назва паходзіць ад звычаю старажытных хрысціян прыносіць хлеб, віно і ўсё неабходнае для выканання Літургіі. Хлеб выкарыстоўваецца чысты пшанічны, кіслы (з рошчыны), званы просвіраю. Ісус Хрыстос для выканання Таінства ўзяў не праснак, а кіслы хлеб. Стары Запавет казаў есці праснакі на пасху ў знак таго, што іўдзеі павінны былі выйсці з Егіпту.

Просвіра павінна быць круглая і складацца з дзвюх частак — гэта напамін пра дзве існасці Хрыста: Боскую і Чалавечую. Віно выкарыстоўваецца вінаграднае, чырвонага колеру, які нагадвае колер крыві. З працятай рабрыны Хрыста вылілася Кроў і вада, і ў напамін пра гэта віно разбаўляаецца вадой.

У Літургіі выкарыстоўваецца пяць просвіраў як згадка пра пяць хлябоў, якімі цудоўным чынам Хрыстос насыціў пяць тысяч чалавек. Непасрэдна для прычашчэння выкарыстоўваецца адна просвіра. Праскамідыя, як частка Літургіі, складаецца з напаміну аб прароцтвах і правобразах, а часткаю і саміх падзей, якія датычацца Раства і Пакут Ісуса Хрыста. Пры гэтым з просвіры выймаецца частка, неабходная для здзяйснення Таінства; а таксама неабходная частка віна, змяшанага з вадою, выліваецца ў свяшчэнны посуд. Пры гэтым святар згадвае ўсю Царкву: праслаўленых (кананізаваных) святых, моліцца за жывых і мёртвых, за ўлады і за тых, хто з вераю і стараннасцю прынёс просвіры або прынашэнні.

Літургія запрошаных — другая частка багаслужэння. Яна мае такую назву, таму што пры яе выкананні могуць прысутнічаць і запрошаныя, г. зн. тыя, хто рыхтуецца да Святога Хрышчэння, а таксама каяльнікі, адлучаныя за цяжкія грахі ад прыняцця Святога Прычасця. Гэтая частка Літургіі складаецца з малітваў, спеваў, чытання Апостальскіх кніг і Евангелля. Гэтая частка заканчваецца наказам: «Запрошаныя, выйдзіце».

Літургія верных — самая адказная частка багаслужэння. На ёй могуць прысутнічаць толькі верныя, г. зн. ахрышчаныя. Яе можна падзяліць на перанясенне Шчырых Дароў з ахвярніка на прастол; падрыхтоўка вернікаў да асвячэння Дароў; асвячэнне (пераісненне) Дароў; падрыхтоўка вернікаў да Прычасця; Прычашчэнне; падзяка за Прычасце і адпуст.

Пераісненне Святых Дароў адбываецца пасля вымаўлення святаром слоў Хрыста: *Прыміце, ешце, гэта ёсць Цела Маё (...). Піце з яе ўсе, бо гэта ёсць Кроў Мая, Новага Запавету, за многіх праліваная дзеля даравання грахоў (Мц. 26, 26-28),* — падчас заклікання Святога Духа ў малітве. У гэтыя ўрачыстыя і святыя хвіліны хлеб і віно пераісняюцца ў сапраўднае Цела і сапраўдную Кроў Хрыстовыя. Удзельнікі Літургіі адчуваюць, як на іх сыходзіць ласка Святога Духа.

Пытанне пра час пераіснення стаў прадметам бурлівай багаслоўскай палемікі з другой паловы XVII стагоддзя паміж прыхільнікамі спрадвечных традыцый Усходняй Праваслаўнай Царквы, якія грунтаваліся на Святым Пісанні і творах Святых Айцоў, і «лаціннікамі», тымі, хто спрабаваў «удасканаліць» Праваслаўе пад уплывам пазіцыі Рымска-каталіцкае Царквы, якая ўстанавіла унію сярод праваслаўнага насельніцтва Паўднёва-Заходняй Расіі ў 1596 годзе. Праваслаўная Царква верыць, што Таінства пераіснення хлеба і віна ў Хрыстовыя Цела і Кроў адбываецца пад уздзеян-

нем Святога Духа па малітве святара, у той час як Заходняя Царква выключыла яе з Літургіі і навучае, што пераісненне Святых Дароў адбываецца пры вымаўленні святаром Словаў Хрыста, сказаных Ім на Тайнай вячэры пры ўстанаўленні Ім Таінства Еўхарыстыі («Прыміце, ешце...»). У абарону праваслаўнай пазіцыі выступіў Патрыярх Іаакім і манах Яўхім Чудаўскі, якія ў 1690 годзе напісалі кнігу «Асцё» (СПб, 2006). Супраць яе выступіў архімандрыт Гаўрыла Дамецкі, які заняў пралацінскую пазіцыю ў творы «105 пытанняў». У сваю чаргу, манах Дамаскін у 1705 годзе напісаў 105 адказаў, якія склалі другую кнігу з такой самай назваю «Асцё» (СПб., 2011).

У вучэнні аб Еўхарыстыі св. Кірыла Іерусалімскі дакладна выказвае думку аб прысутнасці Хрыста ў рэчыве гэтага Таінства. «Хоць пачуццё, — гаворыць ён, — падказвае табе, што гэта хлеб і віно, але няхай умацоўвае цябе вера. Не паводле смаку мяркуй пра рэч, але праз веру перакананайся непахісна, што спадобіўся ты Цела і Крыві Хрыстовых» (Т. IV, 6). Хлеб і віно ператвараюцца ў Цела і Кроў Хрыстовыя, гэтаксама, як на вяселлі ў Кане Галілейскай вада цудоўным чынам перамянілася ў віно. Асвячэнне Дароў адбываецца праз закліканне Святога Духа: «Молім Чалавекалюбца Бога паслаць Святога Духа на прадстаўленыя Дары, каб зрабіў Ён хлеб Целам Хрыстовым, а віно — Крывёю Хрыстовай. Бо, без сумневу, да чаго дакранецца Святы Дух, тое асвячаецца і пе-

раісняецца» (Сведчанне аб эпіклезісе. т. V, 7[1)]). Св. Рыгор Ніскі кажа наўпрост, што «хлеб асвячаны ўсяленнем Слова».

Прап. Іаан Дамаскін напісаў: «Калі ты станеш дапытвацца, як гэта адбываецца, дык табе дастаткова ведаць, што гэта дзеецца праз Святога Духа... Мы не ведаем нічога, апрача таго, што Слова Божае праўдзівае, дзейснае і ўсёмагутнае, але шляхі яго ўздзеяння непрасочныя». Нябачны бок Еўхарыстыі выяўляецца ў тым, што хлеб і віно пераісняюцца ў Цела і Кроў Хрыста. У Еўхарыстыі прысутнічае ўвесь Хрыстос з Яго Чалавечнасцю і Боскасцю: *Хто есць цела Маё і п'е Кроў Маю, мае жыццё вечнае, і Я ўваскрашу яго ў апошні дзень (Ін. 6, 54).* Пры раздрабленні Ягняці Ён увесь прысутнічае ва ўсіх часцінках. Пра гэта гаворыцца ў малітве: «Раздрабляецца і падзяляецца Божае Ягня, драблёнае, але непадзельнае, заўжды ядомае і ніколі не з'едзенае, але тых, хто прычашчаецца, Ён асвячае». Еўхарыстыя выконваецца штодзённа на тысячах прастолаў, але гэта не значыць, што існуе шмат целаў Хрыстовых. Паасобку прыгатаваныя хлеб і віно пераісняюцца ў адзінае Цела і Кроў пад уздзеяннем Святога Духа, і ў адно і тое ж Цела Існага ў Нябёсах: *адзін хлеб, адно цела — мы многія, бо ўсе прычашчаемся ад аднаго Хлеба (1 Кар. 10, 17).*

Цела застаецца Целам, а Кроў — Крывёю на ўсе часы. Толькі Святым Дарам падаецца багалеп-

---

1) Эпіклезіс – заклікание, еўхарыстычная малітва

нае пакланенне. Усім астатнім святыням, у тым ліку святым машчам, прыносіцца дабратворнае пакланенне. Пратэстанты кажуць, што пераіснёныя Дары застаюцца такімі толькі ў момант службы, а пасля яе заканчэння Яны зноў ператвараюцца ў хлеб і віно. Аднак гэта не так. Існуюць і Раней Асвячаныя Дары.

в) Еўхарыстыя — як Ахвяра, і яе адносіны да Галгофскае Ахвяры

У Гутарцы пра Боскую літургію св. прав. Іаана Кранштацкага ёсць словы: «Чалавек не ўсведамляе ўсёй глыбіні і важнасці Вялікай таямніцы, якая адбываецца перад яго вачыма. Між тым сярод цудаў гэта і ёсць найважнейшае — Боская літургія». Усе спробы наблізіць да нашага разумення тое, што адбываецца на Еўхарыстычным Прастоле, ёсць вынік дурасці і паганства.

1. У Таінстве Еўхарыстыі прысутнічаюць Цела і Кроў Хрыста, і ўвесь Хрыстос з Яго Чалавечнасцю і Боскасцю, і гэтыя словы неаднаразова паўтараюцца Хрыстом.

2. Хрыстос, які раздрабляецца і падзяляецца, разам з тым увесь прысутнічае ў кожнай часцінцы.

3. Паасобку прыгатаваныя хлеб і віно робяцца адным і тым самым Целам.

4. Пераіснёныя Дары заўжды застаюцца Дарамі.

5. Толькі Ім належыцца багалепнае пакланенне.

Св. Ігнат Баганосец пісаў, што Еўхарыстычная Ахвяра тоесная Ахвяры Галгофскай.

Тоеснасць Еўхарыстычнае і Галгофскае Ахвяр выяўляецца ў наступным:

1. Галгофская Кроў пралілася на мёртвыя косці праведнікаў і святых, і яны ўваскрэслі і абвяшчалі новую веру ў народзе. Няхай ніхто не наважыцца сёння выпрабоўваць гэта каля хрысціянскага Прастола, што было б блюзнерствам і вар'яцтвам. Хрыстос быў Першасвятаром, і Ён сапраўды стаў Ахвяраю, каб аднавіць грэшную існасць чалавека. Як тады, гэтак і цяпер прыносіцца Тое самае Найчысцейшае Цела і Тая самая Кроў, Той самы, «Хто прыносіць і Каго прыносяць».

2. Хвалебна-падзячны характар абедзвюх Ахвяр. На Тайнай вячэры Хрыстос Сваім Вучням і Апосталам, падзякаваўшы, прапанаваў Цела і Кроў, якія праліваюцца і ахвяруюцца на адпушчэнне грахоў: *І, калі яны елі, Ісус, ўзяўшы хлеб і паблагаславіўшы, паламаў, і даваў вучням (Мц. 26, 26).* Еўхарыстыя таксама мае хвалебна-падзячны характар. Само слова «Еўхарыстыя» (грэч. Ευχαριστία) значыць «падзяка». Пасля голасу святара: «Дзякуем Госпаду», — хор адказвае: «Табе спяваем, Цябе хвалім, Табе дзякуем». Хвала Госпаду шмат разоў аддаецца ў тайных малітвах Літургіі.

3. Улагаджальны характар як Галгофскае, так і Еўхарыстычнае Ахвяры. Святар моліцца за ўвесь свет, за цэлы сусвет. Душа таго, хто прыносіць Ахвяру, мусіць быць чыстая.

Адрозненне гэтых Ахвяр выяўляецца ў наступным:

1. Хрыстос, які памёр аднойчы (Рым. 6), цяпер ужо не памірае, і сёння Еўхарыстычная Ахвяра — не паўтарэнне Галгофскай, але і не толькі ўспамін пра яе, бо яна далучае годных да пладоў Галгофскае Ахвяры.

2. Галгофская Ахвяра была прынесеная за ўвесь род чалавечы, Еўхарыстычная прыносіцца толькі за годных. Годныя — гэта тыя, хто можа засвоіць плады Галгофскае Ахвяры.

3. Галгофская Ахвяра — крывавая, пакутніцкая; Еўхарыстычная Ахвяра — бяскроўная і беспакутная.

г) плады Таінства Еўхарыстыі

1. Гэта спажыў для душы, без якога яна памірае і знаходзіцца ў стане азмрочанасці, смутку і пакут. *Бо Цела Маё сапраўды ёсць ежа, і Кроў Мая сапраўды ёсць пітво (Ін. 6, 55),* — сказаў Ісус Хрыстос. Пажадана прычашчацца не радзей як чатыры разы на год. Старажытныя хрысціяне бралі прычасце кожную нядзелю. Да Таінства належыць рыхтавацца, дзеля гэтага патрэбны час.

2. Хрыстос выбавіў нас з граху прабацькоў, адрадзіў нас другім Хрышчэннем. У Еўхарыстыі адбываецца самае шчыльнае яднанне з Богам, Крыніцаю жыцця і ласкі.

3. У Еўхарыстыі адбываецца самае шчыльнае яднанне хрысціян між сабою, як братоў. Паводле слоў апостала Паўла, *адзін хлеб, адно цела — мы многія, бо ўсе ад аднаго хлеба прычашчаемся (1 Кар. 10, 17)*. Нішто іншае так не яднае людзей у адзіную хрысціянскую сям'ю.

4. Еўхарыстыя — залог нашага будучага ўваскрасення і шчаслівага жыцця: *Хто есць Цела Маё і п'е Кроў Маю, мае жыццё вечнае, і Я ўваскрашу яго ў апошні дзень (Ін. 6, 54)*. А таксама: *І хто есць Цела Маё і п'е кроў Маю, ува Мне ёсць, і Я ў ім (Ін. 6, 56)*.

Чалавек робіцца сапраўдным удзельнікам Боскага жыцця. Але гэта датычыцца толькі тых, хто прычашчаецца годна, інакш прычасце прыносіць чалавеку асуджэнне: *Няхай выпрабуе сябе чалавек, і тады есць з хлеба гэтага і п'е з чары гэтай. Бо той, хто есць і п'е непрыстойна, той есць і п'е прысуд сабе, не разважаючы аб Целе Гасподнім (1 Кар. 11, 28-29)*.

Еўхарыстыя будзе выконвацца да Другога Прыйсця, і ніякая пякельная моц не здолее яе знішчыць.

Калі хто смягне, няхай прыйдзе да Мяне і п'е: хто верыць у Мяне, у таго, як сказана ў Пісанні, з чэрава пацякуць рэкі вады жывой. Гэта сказаў Ён пра Духа, Якога меліся прыняць вернікі ў імя Яго; бо не было яшчэ на іх Духа Святога, бо не быў яшчэ Ісус услаўлены (Ін. 7, 37-39).

4. Таінства Пакаяння

Пакаянне ўказвае на перамену думак, жаданняў і ўсіх паводзін чалавека, усіх яго імкненняў.

Грэх прыносіць страшэнны разлад ва ўзаемаадносіны паміж душой і целам, і, разумеючы гэта, Арыген кажа: «Як нястраўную ежу не прымае страўнік, а вымётвае вонкі, так і грэх не прымае душа, і яна жадае вывергнуць яго з сябе». Як ад нястраўнае ежы цягне на ваніты, так і грэх, дапушчаны ў душу, выклікае ў ёй млоснасць. Грэх уносіць буру, збянтэжанасць ў нашу душу. Знікае спакой. Чалавек уступае ў супярэчнасць з цэлым светам, з самімі сабою. *Няма цэлага месца ў касцях маіх з-за грахоў маіх. Праступкі мае нагрувасціліся вышэй за галаву маю, як бярэмя цяжкое, прыгнятаюць яны мяне. Засмярдзелі і загнаіліся раны мае з-за дурасці маёй (Пс. 37, 4-6).* Чуючы на сабе грэх, нельга не каяцца, гэта нязбыўная патрэба душы. *Бо віну маю вызнаць я мушу (Пс. 37, 19).* Кожны здзейснены грэх даецца чалавеку ў знакі, і неабходна вызнаць яго, г. зн. дабравольна пакаяцца пасля перажытае ўнутранае барацьбы, якая, бывае, дасягае такой моцы, што людзі вызнаюць свае грахі, пакідаючы ўсё сваё багацце і славу.

Стан граху цяжка перадаць, гэтую д'ябальскую буру цяжка перажыць, калі нішто не цікавіць, і тут вельмі важна не даць журбе запанаваць над сабой. Каяльніку патрэбная вера ў Хрыста і надзея на міласэрнасць Яго. Вера ў Хрыста — гэта сіла,

якая выгане д'ябальшчыну, а без веры д'ябальская сіла можа давесці чалавека, які здзейсніў цяжкія грахі, да загібелі, да трагедыі. Прыкладам адчаю, які мяжуе са знеслаўленнем Святога Духа, можа быць Іуда, які не верыў у Хрыста ў сваім стане і таму не здолеў пакаяцца.

Каяльнік павінен 3-4 дні рыхтавацца да прычасця, пакаяцца перад уласным сумленнем, у сэрцы сваім. Яму трэба ўсвядоміць свае грахі, зненавідзець іх. *Бо той смутак, які па Богу, нерупліваe пакаянне ў збаўленне ператварае (2 Кар. 7, 10).* А таксама: *Аб Ім* (г. зн. аб Ісусе Хрысце) *усе пpapокі сведчаць: хто верыць у Яго, дастане адпушчэнне грахоў праз імя Ягонае (Дзеі 10, 43).* Сапраўды, сказана было яшчэ ў Старым Запавеце: *І калі грэшнік адвернецца ад беззаконнасці сваёй і ўчыніць суд і праўду, дык праз гэта і будзе жыць (Ез. 33, 19).* Хрысціянская рэлігія — рэлігія радасці, і адзіны прымальны смутак — гэта смутак па Богу, які прыводзіць да цвёрдага рашэння — выправіць сваё жыццё, бо гэта неабходная ўмова для атрымання даравання грахоў. Пра гэта і гаворыць прарок Езекііль: *І калі грэшнік адвернецца ад беззаконнасці сваёй і ўчыніць суд і праўду, дык праз гэта і будзе жыць (Ез. 33, 19).*

Каяльнік павінен мець намер, каб свой заганны лад жыцця змяніць на пабожны. Прыкладам на гэта можа служыць мытнік Закхей. Калі Хрыстос накіраваўся ў Іерыхон, Закхей пажадаў хаця б здалёк пабачыць яго дый залез на смакоўніцу. Там

яго прыкмеціў Хрыстос, прывеціў і завітаў да яго ў дом. Глыбока ўражаны Закхей пакаяўся ў сваіх грахах і паабяцаў, што калі каго скрыўдзіў падчас збірання падаткаў, дык аддасць учацвёра болей (Лк. 19, 1-10). Закхей зрабіўся апосталам з ліку сямідзесяці. Ён стаў першым епіскапам Кесарыі Палестынскай, дзе верна служыў Евангеллю і мірна спачыў.

Пакаянне адпавядае ўсім патрабаванням Таінства. Яно ўстаноўленае Богам, бо пра яго двойчы давалася абяцанне: *І дам табе ключы Царства Нябеснага, і калі што звяжаш на зямлі, тое будзе звязана і на Небе; і калі што развяжаш на зямлі, тое будзе развязана на Небе (Мц. 16, 19).* А таксама: *прыміце Духа Святога. Каму адпусціце грахі, таму будуць адпушчаныя; на кім пакінеце, на тым застануцца (Ін. 20, 22-23).*

Знешні бок Пакаяння выяўляецца ў наступным:

1. Вуснае вызнанне грахоў. Толькі вызнаныя грахі страчваюць сілу, нявызнаныя не даруюцца Богам. Царква не судзілішча, а лячэбніца; чым больш чалавек будзе сябе судзіць, тым больш ён атрымае апраўдання. Святар, выслухоўваючы каяльніка, павінен убачыць тыя шляхі, якія прыводзілі да граху, і ўмела іх адцяць. Гэтаксама, як зямны лекар, пастыр не можа стаць прыладаю лячэння, не ведаючы, ад якой хваробы лячыць. Святар — гэта духоўны лекар, які мае справу з нябачнымі, ненамацальнымі хваробамі, якія могуць выяўляцца і бачна, напрыклад, каяльнік бляд-

нее або чырванее. Першыя хрысціяне каяліся перад Апосталамі: *Багата ж з тых, што паверылі, прыходзілі, вызнаючы і апавядаючы ўчынкі свае (Дзеі 19, 18).*

2. Святар накладае епітрахіль, жагнае і ўчыняе даравальную малітву, якая мае ў сабе таемную выканаўчую формулу Таінства Пакаяння: «Госпад і Бог наш Ісус Хрыстос, ласкаю і шчодрасцю Чалавекалюбства Свайго, няхай даруе табе, дзіця (называецца імя), усе грахі твае: і я, нягодны іерэй, уладаю Яго, мне дадзенаю, дарую і вызваляю цябе ад усіх грахоў тваіх, у імя Айца і Сына і Святога Духа. Амін». Пры апошніх словах даравальнай малітвы святар жагнае галаву спавядальніка. Пасля гэтага спавядальнік устае і цалуе Святы Крыж і Евангелле — у знак любові і пашаны перад Госпадам і вернасці дадзеных у прысутнасці святара абяцанняў. Дараванне вызвалення азначае поўнае адпушчэнне ўсіх вызнаных грахоў каяльніка, і тым самым яму дазваляецца прыступіць да прычашчэння Святых Таямніц. Калі святар лічыць, што немагчыма адразу адпусціць грахі каяльніка з увагі на іх цяжар або нядбальства ў пакаянні, тады даравальная малітва не чытаецца, і каяльнік не дапускаецца да Прычасця. Паводле патрэбы на каяльніка накладаюцца епітым'і — забароны, пакаранні, якія ўжываюцца дзеля духоўнага лекавання. Яны ўяўляюць з сябе пабожныя практыкаванні, напрыклад, пост звыш абавязковага, аж да адлучэння ад Прычасця ў выпадку цяжкіх грахоў.

5. Святарства

Святарства — гэта Таінства, у якім Дух Святы праз епіскапскае рукапалажэнне даручае выконваць Таінствы і пасвіць статак Хрыстовы. Госпад не адразу высвячае на пастырскае служэнне, але выбірае, вучыць, рыхтуе. У першы дзень Уваскрасення Ён устанаўляе Святарства словамі: *Прыміце Духа Святога* і далей дае моц вязаць і адпускаць грахі. Благаслаўленне, пададзенае Ісусам Хрыстом у дзень Уваскрасення праз подых, — гэта сімвал нязменнай прысутнасці Хрыста з Апосталамі, а таксама іх пераемнікамі: *Мір вам! Як паслаў Мяне Айцец, так і Я пасылаю вас. Сказаўшы гэтае, дыхнуў і кажа ім: прыміце Духа Святога. Каму адпусціце грахі, таму будуць адпушчаныя, на кім пакінеце, на тым застануцца (Ін. 20, 21-23).* Пастыр абавязаны вучыць. Апостал Павел гаворыць: *гора мне, калі я не абвяшчаю Евангелля (1 Кар. 9, 16).*

Пасля Пяцідзясятніцы Апосталы адразу пачалі выконваць рукапалажэнне. Апосталы абралі сем дыяканаў, памаліліся аб пасланні дабратворных дароў, і ўсклалі на іх рукі. Апостал Павел звярнуўся да сваіх вучняў: *Я пакінуў цябе на Крыце дзеля таго, каб ты давяршыў недаробленае і паставіў па ўсіх гарадах прэсвітэраў (Ціт 1, 5).* А таксама: *Рук паспешліва ні на каго не ўскладай і не рабіся супольнікам у чужых грахах (1 Цім. 5, 22).* Апостал Павел пісаў, што кожны павінен успрымаць епіскапаў як слуг Хрыстовых і аконамаў дому Та-

ямніц Божых: *Гэтак чалавек павінен разумець нас як служак Хрыстовых і аконамаў таямніц Божых (1 Кар. 4, 1).* А таксама: *Пільнуйце ж самі сябе і ўвесь статак, бо ў ім Дух Святы паставіў вас за епіскапаў, каб пасвіць Царкву Госпада і Бога, якую прыдбаў Ён Уласнаю крывёю (Дзеі 20, 28).* А таксама: *Шчаслівы ты, Сымоне, сын Іонаў, бо не цела і кроў адкрылі табе гэта, але Айцец Мой, што ў Нябёсах; і Я кажу табе: ты — скала, і на гэтай скале я збудую Царкву Маю, і брамы пякельныя не перамогуць яе; і дам табе ключы Царства Нябеснага; і калі што звяжаш на зямлі, тое будзе звязана на Небе; і калі што развяжаш на зямлі, тое будзе развязана на Небе (Мц. 16, 17-19).*

Таінства хіратоніі, або рукапалажэння, выконваюць толькі ўслед за Літургіяй. Цэнтральным момантам з'яўляецца пры гэтым ўскладанне рук на асобу, якая адбывае Таінства Хіратоніі. Вымаўляюцца выканаўчыя словы малітвы: «Ласка Божая, якая заўжды хворых лечыць і спустошаных напаўняе, рукапакладае (імя рукапакладзенае асобы — у дыякана, або дыякана ў прэсвітэра, або архімандрыта — у епіскапа), — дык памолімся за яго, няхай сыдзе на яго ласка Найсвяцейшага Духа». Зварот «Ласка Божая…» і дзве малітвы, якія чытаюцца патаемна («Госпадзе, Божа наш…» і «Госпадзе, Спасе наш…»), з'яўляюцца таемнымі выканаўчымі словамі Таінства хіратоніі. У гэты момант над хіратанізаваным адбываеца нябачнае дзеянне — яму перадаецца ласка Святога Духа.

Пасля гэтых малітваў кандыдат апранаецца ў святарскую вопратку, адпаведна ступені святарства. Дыякан прымае рыпіду, прэсвітэр — частку святога Ягняці (пасля пераіснення Святых Дароў). Архірэй вымаўляе: «Прымі залог гэты і захавай яго ў цэласці і непарушнасці да апошняга дыхання твайго, бо за яго будуць цябе катаваць у Другое і Страшнае Прыйсце Вялікага Госпада і Спаса нашага Ісуса Хрыста». Разам з малітваю і рукапалажэннем нававысвячаны атрымлівае і адпаведную яго служэнню ласку святарства. Переканансць у гэтым грунтуецца на Аб'яўленні.

Надзеленыя ўладаю святарства маюць вялікія правы: навучаць і настаўляць паству, адраджаць іншых на жыццё духоўнае ў Царкве; вязаць і адпускаць грахі; рукапакладаць (епіскапы); выкрываць; ушчуваць; з усялякай доўгацярплівасцю лячыць. Маюць яны і вялікія абавязкі: *І з кожнага, каму дадзена багата, багата і спаганяцца будзе, і каму больш даручана, з таго больш вымагаецца (Лк. 12, 48).* Пастыр адказвае, апрача сябе, таксама за паству. Гора таму пастыру, які страціць паству. Невыпадкова ў момант хіратоніі пастыр здымае з рукі заручальны пярсцёнак і заручаецца з Царквою. Пастыры і Святыя Айцы з вялікім страхам прыступалі да гэтай дзейнасці. Ва ўсіх справах пастыра на першым месцы павінны стаяць інтарэсы паствы, затым інтарэсы сям'і, а на апошнім месцы — яго асабістыя інтарэсы. Такое ярмо можа здавацца цяжкім, але, калі пастыр упражэцца ў гэтае жыццё, дык, кажучы словамі

Хрыста, акажацца *яромо Маё добрае, і цяжар Мой лёгкі (Мц. 11, 30).*

Існуюць тры ступені святарства: епіскап, прэсвітэр, дыякан. Дыякан прыслугоўвае пры Таінствах, але не выконвае іх; прэсвітэр выконвае Таінствы, будучы падначалены епіскапу; епіскап не толькі выконвае Таінствы, але мае ўладу праз рукапалажэнне пераказваць іншым дабратворны дар іх выканання.

Духоўная ўлада, дадзеная Хрыстом Сваім вучням, пакліканым абвяшчаць Слова Божае, сімвалізуецца епіскапскім жазлом. На старажытных выявах Хрыста звычайна прадстаўлялі з кіём. Значэнне жазла траістае: пастырства, прапаведніцтва, падарожніцтва. Ад Хрыста і Апосталаў жэзлы перайшлі з пэўным духоўна-сімвалічным значэннем да іх пераемнікаў — епіскапаў, якім жазло ўручаецца пры іх рукапалажэнні. «Жазло» — гэта таксама назва славутай рускай друкаванай кнігі XVII стагоддзя іераманаха Сімяона Полацкага, першага і галоўнага афіцыйнага твора, які выкрываў памылкі раскольнікаў Праваслаўнае Царквы. «Жазло» было напісанае з благаславення Патрыярха Маскоўскага і Усяе Русі Іясафа II, які працягваў пачатае патрыярхам Ніканам выпраўленне і друкаванне багаслужэбных кніг, прывядзенне іх у адпаведнасць з грэцкім арыгіналам, а таксама Вялікага Маскоўскага Сабору 1667 года. Царкоўны Сабор прызнаў, што «Жазло» напісанае «з чыстага срэбра Божага Слова».

6. Шлюб

Шлюб — гэта Таінства, у якім пры свабодным абяцанні сямейнай вернасці, дадзеным перад святаром і Царквой жаніхом і нявестаю, благаслаўляецца іх сямейная повязь па вобразу повязі Хрыста з Царквою і просіцца для іх ласка чыстага адзінадушша для благаславёнага нараджэння і хрысціянскага выхавання дзяцей.

Таінства шлюбу ўстаноўленае Богам. Мы ведаем пра яго з урокаў гісторыі роду чалавечага:

1. У Кнізе Быцця сказана, што Бог стварыў чалавека з праху зямнога і жанчыну з рабрыны яго. Калі Бог прывёў да Адама яго жанчыну, ён сказаў: *Вось, гэта косць ад касцей маіх і цела ад цела майго: яна будзе называцца жанчынаю, бо ўзятая ад мужа. Дзеля гэтага пакіне чалавек айца свайго і маці сваю і прылепіцца да жанчыны сваёй, і будуць двое адным целам (Быц. 2, 23-24).*

2. Калі фарысеі пачалі пытацца ў Ісуса Хрыста, ці дазволена разводзіцца з жонкаю, Ён сказаў: *Ці не чыталі вы, што Той, Хто стварыў ад пачатку мужчыну і жанчыну, стварыў іх такімі? І сказаў: дзеля гэтага пакіне чалавек бацьку свайго і маці, і прылепіцца да жонкі сваёй; і будуць двое адным целам (Мц. 19, 4-5).*

3. Апостал Павел вучыць ў Пасланні да Эфесцаў: *Дзеля гэтага пакіне чалавек айца свайго і маці і прылепіцца да жонкі сваёй, і будуць двое*

ў адным целе. Таямніца гэта вялікая; я ж кажу аб Хрысце і Царкве (Эф. 5, 31-32).

Бачны бок Таінства Шлюбу выяўляецца ў наступным:

а) урачыстае сведчанне жаніха і нявесты перад святаром і Царквою аб тым, што яны бяруць шлюб паводле ўзаемнай згоды, што яны дабравольна і без прымусу захаваюць сямейную вернасць да канца свайго жыцця;

б) благаслаўленне іх шлюбнае повязі святаром, калі ён пасля ўскладання на галовы жаніха і нявесты вянцоў, тройчы благаслаўляе іх, прамаўляючы: «Госпадзе, Божа наш, славаю і гонарам вянчай іх».

Пры выкананні Таінства Шлюбу выконваюцца асаблівыя абрады, якія маюць сваё глыбокае значэнне:

- жаніху і нявесце даюць запаленыя свечкі і пярсцёнкі на знак ўзаемнае любові адзін да аднаго і непарыўнасці іх шлюбнай повязі;
- вянцы ўскладаюцца на жаніха і нявесту як ўзнагарода за цнатлівае жыццё і на знак іх перамогі і апанавання ўласных пачуццяў: «Вянчаецца раб божы (імя) з рабой Божай (імя) у імя Айца і Сына і Святога Духа. Амін»;
- ім даюць піць віно з чашы на ўспамін старадаўняга звычаю — прычашчэння да Св. Таямніц у дзень здзяйснення Таінства Шлюбу, а таксама на ўспамін цуду, здзейсненага Госпадам ў Кане Галілейскай, і на знак таго, што з гэтага

моманту муж і жонка будуць піць агульную чашу і радасці, і гора;

- трохразовае хаджэнне вакол аналоя адбываецца на знак духоўнай урачыстасці і радасці, а разам з тым і непарыўнасці шлюбнай повязі.

Шлюбная повязь, асвячаная Царквой, з'яўляецца падабенствам лучнасці Хрыста з Царквой і ўзвышаецца да вобразу гэтай повязі: *Што Бог злучыў, таго чалавек няхай не разлучае (Мц. 19, 6).* У гэтым ёсць нябачнае ўздзеянне ласкі Божай, падаванай у Таінстве Шлюбу, якая спрыяе захаванню адзінадушша і любові мужа і жонкі ва ўзаемных абавязках і ўзаемных адносінах. Двое злучаюцца «у адно цела», а раз'яднанне прыводзіць да такога стану, як быццам бы чалавека рассеклі на дзве часткі. У гэтай повязі не павінна быць месца нават ценю таго, што перашкаджае злучэнню ў адно цела. Сама тэрміналогія ўказвае на тое, што адбываецца нешта таямнічае, глыбока непадуладнае спасціжэнню. Нічога падобнага няма ў ніякай іншай рэлігіі, вучэнні, дактрыне. Развод — гэта вельмі балючы акт. Ісус адказваў фарысеям, што Майсей *дзеля жорсткасці сэрца вашага напісаў вам гэтую запаведзь (Мк. 10, 5).* У шлюбе, асвячаным Царквою, пабрацца шлюбам другі раз магчыма, як правіла, толькі пасля смерці мужа ці жонкі.

У адно цела злучаюцца двое людзей зусім розных з гледзішча выхавання, адукацыі, іншых якасцяў. Калі мінае пэўны час пасля шлюбаван-

ня, не трэба даваць месца варожасці і нянавісці: *Таксама і вы, жонкі, пакарайцеся сваім мужам, каб тыя з іх, што не пакараюцца слову, жыццём жонак сваіх без слова былі здабываныя, пабачыўшы ваша чыстае, багабойнае жыццё. (...) Але ўкрыты чалавек у нятленнасці лагоднага сэрца і маўклівага духу, што дужа цэнна перад Богам (1 Пят. 3, 1-4).*

Шлюб не з'яўляецца абавязкам для ўсіх. Больш за гэта, дзявоцтва, захаванае ў чысціні, лепшае за шлюб: *дзеля гэтага, хто аддае замуж дзяўчыну сваю, добра робіць, а хто не аддае, робіць лепей (1 Кар. 7, 38).* Але гэта дадзена не кожнаму. Госпад сказаў: *не ўсе разумеюць словы гэтыя, але каму дадзена (...): хто можа зразумець, няхай зразумее (Мц. 19, 11-12).* Таксама апостал Павел кажа: *Нежанатым і ўдовам кажу: добра ім, калі застануцца, як я (1 Кар. 7, 8).*

Чалавек, не звязаны шлюбам, можа цалкам прысвяціць сябе вышэйшым маральным мэтам: *нежанаты клапоціцца аб Гасподнім, як дагадзіць Госпаду, а жанаты клапоціцца аб свецкім, як дагадзіць жонцы (1 Кар. 7, 32-33).* Менавіта з гэтай прычыны шматлікія святыя ўгоднікі Божыя ўхіляліся ад шлюбу і захоўвалі цнатлівасць. Напрыклад, Іаан Прадцеча, апостал Павел, апосталы Іаан і Якуб. Той, хто не бярэ шлюбу з нейкіх іншых меркаванняў, здзяйсняе яшчэ большы грэх, і ён адчувае ўсю горыч гэтага няслушнага ўчынку.

7. Алееасвячэнне

Алееасвячэнне — гэта Таінства, ў якім пры памазанні цела алеем заклікаецца на хворага ласка Божая, якая вылечвае немачы, душэўныя і цялесныя. У народзе Алееасвячэнне называюць Сабораваннем. Звычайна яно выконваецца раз на год падчас Вялікага посту або на Успенскі пост.

Госпад загадаў выконваць гэтае Таінства ў першыя дні Свайго служэння, кажучы: *калі і Мне не верыце, дык верце ўчынкам (Маім) (Ін. 10, 38).* Апосталаў-Евангелістаў сустракалі з зацятай няпрыяззю, і таму Госпад даў ім моц вылечваць хворых: *І, паклікаўшы дванаццаць вучняў Сваіх, даў ім уладу над нячыстымі духамі, каб выганяць іх і лячыць усякую немач і ўсякую хваробу (Мц. 10, 1).* А таксама: *хворых вылечвайце, пракажоных ачышчайце, мёртвых уваскрашайце, злых духаў выганяйце. Задарма атрымалі, задарма давайце (Мц. 10, 8).* І Апосталы прапаведавалі пакаянне і вылечвалі, памазваючы хворых алеем: *І выйшлі яны і прапаведавалі, каб пакаяліся: і выганялі многіх дэманаў, і мазалі аліваю многіх хворых, і вылечвалі (Мк. 6, 12-13).* Апосталы перадалі Таінства святарам: *Занядужаў хто з вас? Паклічуць няхай прэсвітэраў царкоўных, і хай яны памоляцца над ім, памазаўшы яго алеем ў імя Гасподняе (Як. 5, 14).*

Знешні бок Таінства — памазанне частак цела (лоб, вочы, ноздры, шчокі, вусны, грудзі, рукі з

абодвух бакоў) выконваецца пасля сяміразовага прачытання сямі розных урыўкаў з Апостала і сяміразовага прачытання сямі розных урыўкаў з Евангелля. Выканаўчымі словамі з'яўляюцца наступныя: «Ойча Святы, Лекару душ і целаў, што паслаў Адзінароднага Твайго Сына, Госпада нашага Ісуса Хрыста, Які ўсялякую хваробу вылечвае і ад смерці збаўляе, вылечы і раба Твайго (або: і рабу Тваю) (імя) ад цялесных і душэўных немачаў, што апанавалі яго, і ажыватвары яго ласкаю Хрыста Твайго».

Унутраны бок Таінства — дараванне здзейсненых грахоў.

Ужыванае рэчыва — аліва, г. зн. алей, выціснуты з маслін, які адразу ж асвячаецца; непажадана выкарыстоўваць масла жывёльнага паходжання.

Паміж Пакаяннем і Алееасвячэннем існуюць адрозненні.

У Пакаянні даруюцца тыя грахі, якія каяльнік усведамляе, перажывае, ненавідзіць, шчыра каецца ў іх і вызнае на споведзі духоўніку. У алееасвячэнні даруюцца грахі, якія або былі забытыя, або свядома і несвядома схаваныя перад судом нашага сумлення, але паўстаюць перашкодаю паміж чалавекам і Богам. Апрача таго, Алееасвячэнне выконваецца над цяжка хворым. Аднак, калі грэх быў затоены ў Таінстве Пакаяння, такі грэх не даруецца праз Таінства Алееасвячэння, і таму, звычайна, Таінства Алееасвячэння папярэджваецца Таінствам Пакаяння. Пасля Саборавання выконваецца Прычасце.

У некаторых выпадках, калі чалавек знаходзіцца на ложку смерці, дараванне грахоў адбываецца праз Пакаянне, у меру яго сіл, астатнія ж грахі, у якіх ён не можа пакаяцца з прычыны цялеснае і духоўнае немачы, праз Алееасвячэнне. Ласка дзейнічае і на душу, і на цела. Прычыны хвароб крыюцца ў здзейсненых грахах, і калі даруецца прычына, дык, як вынік, адбываецца вылечванне, калі хвароба не на смерць, калі ж хвароба на смерць, дык настае лёгкая і спакойная смерць, бо чалавек умацоўваецца і духам, і целам да пераходу ў іншы свет.

11-ая частка Сімвалу веры. Пра будучае ўваскрасенне

Чакаю ўваскрасення мёртвых.

У момант смерці цела апускаецца ў зямлю, але сыходзіць туды не навек, бо ў дзень Сканчэння гэтага веку душа чалавека паяднаецца з яго целам.

Гэтыя праўды былі вядомыя здаўна. Пра іх гаварылі прарокі: *дух адымаеш у іх — і знікаюць яны і ў пыл назад абяртаюцца. Пашлеш Духа Твайго — і паўстануць яны, і аблічча зямлі Ты абновіш (Пс. 103, 29-30).* А таксама: *Бо я ведаю, што Вечнаісны ёсць, і Ён ў апошні дзень адкупіць мяне (і) адновіць з зямлі скуру маю, якая церпіць гэта, бо ад Госпада здзейснілася гэта ўсё мне (Іоў, 19, 25-26).*

Прароку Езекіілю была праява пахавання Збаўцы. Ён бачыў косці, што ўсейвалі поле, якія ажывіў зыход Святога Духа: *і вывеў мяне ў Духу Гасподнім і паставіў мяне сярод поля, яно ж было поўнае касцей чалавечых (...) і вось, вельмі багата іх было на паверхні поля, і вось яны, вельмі сухія. І сказаў Мне: Сыне Чалавечы, ці ажывуць гэтыя косці? І я сказаў: Госпадзе Божа, Ты ведаеш гэта. І сказаў мне: Сыне Чалавечы, дай прароцтва на гэтыя косці і скажы ім: косці сухія, пачуйце слова Гасподняе: (...) вось, Я ўвяду ў вас Дух жыццядайны і дам на вас жылы, і нарашчу на вас мяса, і нацягну на вас скуру, і дам вам Дух Мой у вас, і ажывеце і даведаецеся, што Я ёсць Госпад (...).*

І прамовіў Госпад Мне, кажучы: Сыне Чалавечы, гэтыя косці ёсць увесь дом Ізраілеў, бо яны кажуць: сухія былі косці нашыя, загінула надзея наша, былі мы забітыя (Ез. 37, 1-11).

У Евангеллі сказана, што надыдзе час, калі ўсе мёртвыя пачуюць голас Госпада: *... бо надыдзе час, калі ўсе, хто ў магілах, пачуюць (Ін. 5, 28).*

Апосталы гавораць пра ўваскрасенне ў Пасланнях: *Бо Сам Госпад з абвяшчэннем, з голасам Архангела і трубой Божай сыдзе з Неба, і мёртвыя ў Хрысце ўскрэснуць найперш (1 Сал. 4, 16).* А таксама: *бо не ўсе памрэм, але ўсе пераменімся знячэўку, у імгненне вока, пры апошняй трубе; бо затрубіць яна, і мёртвыя ўскрэснуць нятленныя, і мы пераменімся (1 Кар. 15, 51-52). Бо тленнаму*

трэба апранучца ў нятленнасць, і смяротнаму гэтаму апранучца ў несмяротнасць (1 Кар. 15, 53). А таксама: *сеецца цела душэўнае, паўстае цела духоўнае (1 Кар. 15, 44).* А таксама: *што ты сееш, не ажыве, калі не памрэ (1 Кар. 15, 36).* У пасланні апостала Варнавы гаворыцца: «Госпад дзеля таго і прыходзіў, каб скасаваць смерць».

Пра ўваскрасенне шмат разоў сказана апалагетамі і Айцамі Царквы. Тэртуліян часта казаў пра ўваскрасенне цела і напісаў спецыяльны трактат з такой самай назвай, дзе гаворыцца: «Уваскрасенне мёртвых — спадзяванне хрысціян. Дзякуючы яму, мы — вернікі». Паводле св. Ірынея Ліёнскага, вернікі «абуджаныя будуць сілаю Святога Духа і ўведзеныя ў Царства Божае» (Казанне 42). Св. Іаан Залатавусны таксама звяртаецца да гэтай тэмы: «Але памерлы, скажаш ты, гніе і парахнее, і ператвараецца ў друз і попел. Што з таго, любы? З гэтага акурат і трэба радавацца найбольш. Той, хто хоча перабудаваць развалены і спарахнелы дом, найперш выводзіць з яго жыхароў, потым разбурае гэты дом і зноў стаўляе яго ў лепшым выглядзе. (…) Дык звяртайма ж увагу не на разбурэнне, а на прышлую Славу» (Слова 5, Пра Лазара).

Свц. Клімент Рымскі гаворыць, што Госпад цэлы час паказвае нам, як будзе адбывацца ўваскрасенне: «Паглядзім, любыя, на ўваскрасенне, якое адбываецца ва ўсякі час. Дзень і ноч прадстаўляюць нам уваскрасенне: ноч западае ў сон — паўстае дзень, мінае дзень — настае

ноч. Паглядзім на плады зямныя, якім чынам адбываецца сеў зярнят. Выйшаў сейбіт, кінуў іх зямлю, і кінутае насенне, што ўпала ў зямлю сухое і голае, згнівае, але пасля разбурэння вялікая моц Наканавання Госпадняга ўваскрашае яго, і з аднаго зярняці вырошчвае мноства і дае плён» (Тлумачэнне на Першае Пасланне да Карынфян, р. 24).

Св. Ігнат Баганосец быў перакананы, што вобраз Уваскрасення Хрыстовага — сведчанне нашага будучга ўваскрасення: «Нятленне і ўваскрасенне ёсць дары ўцялеснення Хрыста».

Будучае ўваскрасенне абвяшчаецца ідэяй будучай расплаты.

Дзеянне Святога Духа адбываецца і на мёртвых, і на жывых ў імгненне вока. Само стварэнне вызваліцца ад працы сатлевання. Нашыя будчыя целы будуць духаносныя, не падпарадаваныя межам прасторы і часу.

Уваскрэснуць і грэшнікі, і праведнікі: грэшнікі будуць змрочныя і агідныя, што не дзівіць, бо нават тут, на зямлі, твар закарэлага грэшніка выклікае міжвольную агіду; праведнікі ж будуць ясныя. Калі чалавек будзе ўслаўлены, ён стане такім, аб якім мы нават не наважваемся марыць.

Свет пяройдзе з аднаго стану ў іншы. Пасля Прыйсця Госпада ён прыняў новую фазу развіцця. Да гэтага ён быў светам граху, нейкім безнадзейным душэйным шпіталем. К. М. Сільчанкоў пісаў аб тым, што Уваскрасенне Хрыстовае мае для чалавека найглыбейшы і надзвычай радасны сэнс.

Несмяротнае жыццё абвяшчаецца праз гэта як жыццё асабітае, а «жыццё вернікаў, прысвоенае паводле ласкі, будзе падобнае да жыцця Госпада, уласцівага Яго істоце і Яму належнага: што гэтае жыццё — у яго сапраўдным глыбінным сэнсе — не адзін толькі працяг быцця, але водбліск, адлюстраванне вечнага шчасця Божага, далучэнне да Яго святога жыцця, усярадаснае суразмоўе з Ім у бясконцым дні слаўнага Яго Царства» (Развітальная гутарка Збаўцы з Вучнямі. СПб, 1997, с. 181).

Зменам будзе спрыяць агонь. Пра гэта прадказана ў Старым Запавеце: *Як агонь загарыцца ад ярасці Маёй, распаліцца да пекла апраметнай, зжарэ зямлю і плады яе, папаліць падножжа гор. Збяру на іх беды, і стрэлы Мае звяду на іх (Друг. 32, 22-23).* А таксама: *Бо вось, надыдзе дзень, распалены, як печ, і папаліць іх, і будуць усе іншапляменнікі і ўсе, хто чыніў беззаконнасці, як сцябло: і запаліць іх дзень Гасподні, які надыходзіць, кажа Госпад Усеўладны, і не пакіне па іх ані кораню, ані галін (Мал. 4, 1).* А таксама ў Новым Запавеце: *А сённяшнія нябёсы і зямля, тым жа словам згаданыя, захоўваюцца для агню на дзень Суда і загубы людзей бязбожных (2 Пят. 3, 7).*

Праўда спалення свету была вядомая і язычніцкаму свету. Нягледзячы на разыходжанні, усе язычніцкія мудрацы прадказвалі аднолькавы канец (Сакрат, Дыяген, Заратустра). Праўда ўсеагульнага збавення таксама была вядомая ўсім народам, і тут прысутнічала ідэя справядлівай адплаты.

Лёс тых, хто перайшоў у іншы свет, неаднолькавы: тыя, хто перайшлі ў яго ў веры і пакаянні, але без здзяйснення добрых спраў, — знаходзяцца напярэдадні будучага асуджэння, пакут. У біблейскай гісторыі, — калі Якубу паведамляюць пра смерць Язэпа, ён шмат дзён плача над ім і не хоча расставаца з ім, гаворыць пра свой намер сысці ў апраметню. Якуб лічыў, што душа Язэпа знаходзіцца там, бо меркаваў, што ён здзейсніў нейкі вялікі грэх (Быц. 37, 35).

Тыя, хто перайшлі ў веры і пакаянні з добрымі справамі, — знаходзяцца на парозе вечнага шчасця: *подзвігам добрым я жыў, бег скончыў, веру захаваў. На астатак рыхтуецца мне вянок праўды, які дасць мне Госпад, праведны Суддзя, у гэты дзень, і не толькі мне, але і ўсім, хто з'яўленне Яго палюбіў (2 Цім. 4, 7-8).* Але лёс іх не вырашаны канчаткова. Царква моліцца за іх. Нашым светам будзе свет нашых успамінаў, г. зн. тых учынкаў, якія мы здзейснілі.

Смерць вяртае нас самім сабе, уводзіць нас ў свет бязгучнай цішыні, і калі ўспаміны добрыя, мы будзем адчуваць у душы спакой, а калі дрэнныя, дык мы будзем вязнець у пакуце.

Пасля прыватнага суду, які чакае нас пасля смерці, *бо ўсім нам трэба з'явіцца перад судом Хрыстовым, каб кожны атрымаў за тое, што ён рабіў з целам, добрае ці благое (2 Кар. 5, 10),* мы ўсё ж маем магчымасць малітвамі Царквы атрымаць вечнае шчасце. Нашы царкоўныя малітвы прыемныя

Богу. Паводле св. Васіля Вялікага, «калі складаецца Страшная Ахвяра, Госпад прымае малітвы і за тыя душы, якія знаходзяцца ў пекле». Свяціцель Кірыла Іерусалімскі гаворыць: «Найвялікшая карысць будзе душам, за якіх узносіцца маленне ў той час, калі складаецца Святая і Страшная Ахвяра» (Павучанне аб уводзінах у таямніцы. 5, р. 9).

Царква штодзённа моліцца за памерлых, апрача Светлага тыдня і Раства Хрыстовага. Ёсць спецыяльна вызначаныя дні для памінання памерлых — Бацькоўскія суботы, Змітроўская субота — перад 26 кастрычніка / 8 лістапада, калі ўшаноўваецца абраз «Усіх скрушных Радасць»; загавіны, або запускі — субота перад Масленіцай; 2-я, 3-я, 4-я суботы тыдняў Вялікага посту; Радаўніца — у аўторак пасля Светлае сядміцы; Траецкая Сусветная субота; памінанне палеглых воінаў — 29 жніўня / 11 верасня, у гонар Адсячэння галавы Іаана Прадцечы; а таксама 2 красавіка / 9 мая.

Душа не памірае: *І не бойцеся тых, што забіваюць цела, а душы забіць не могуць (Мц. 10, 28),* — кажа Госпад. Яна жыве. *І вернецца прах ў зямлю, бо быў ёю, і дух вернецца да Бога, Які даў яго (Экл. 12, 7).* Тленнае зробіцца нятленным: *што і само стварэнне вызвалена будзе з няволі тлення на волю славы дзяцей Божых (Рым. 8, 21).*

12-ая частка Сімвалу веры. Пра жыццё вечнае

І жыцця будучага веку. Амін.

Вечнае жыццё — гэта жыццё, якое надыдзе пасля ўваскрасення памерлых і Усеагульнага суду Хрыстовага. Праведнікі пойдуць у вечнае жыццё, грэшнікі — на вечную пакуту, — сказана ў Евангеллі: *І пойдуць гэтыя на пакуту вечную, а праведнікі — у жыццё вечнае (Мц. 25, 46).*

Пасля ўваскрасення жыццё вечнае будзе апошнім цудам на зямлі: *Мы ж паводле Яго абяцання чакаем новага неба і новае зямлі, на якіх праўда жыве (2 Пят. 3, 13).* Цела таксама будзе ўдзельнічаць у шчасці душы, яно будзе праслаўленае святлом Божым, падобна да цела Ісуса Хрыста падчас Перамянення Яго на Фаворы: *і як мы насілі вобраз зямнога* (г. зн. Адама), *будзем насіць і вобраз нябеснага* (г. зн. Госпада Ісуса Хрыста) *(1 Кар. 15, 49).*

Праведнікаў чакае шчаслівае жыццё: *тады праведнікі заззяюць, як сонца, у Царстве Айца іх (Мц. 13, 43),* а таксама: *Сеецца ў прыніжэнні, паўстае ў славе (1 Кар. 15, 43),* але пра яго не гаворыцца ў Святым Пісанні, бо немагчыма апісаць тое шчасце, у якім будуць прабываць праведнікі: *І ведаю чалавека ў Хрысце (...), які быў узяты ў рай і чуў невымоўныя словы, якіх чалавеку нельга казаць (2 Кар. 12, 2-4).*

Апостал Павел гаворыць: *чаго вока не бачыць, і вуха не чуе, і што да сэрца чалавеку не ўзыходзіла,*

тое наканаваў Бог тым, хто любіць Яго (1 Кар. 2, 9). Толькі адно можна сказаць: крыніцаю вечнага жыцця ёсць Бог: *Будзе Бог усё ва ўсім (1 Кар. 15, 28).* І таму, як гаворыць Апостал Павел: *маю жаданне развязацца і быць з Хрыстом (Флп. 1, 23).*

Ужо зараз вернікі жывуць у перадсмаку прышлага шчасця, як пры варажбе скрозь цьмянае шкло, а тады будуць бачыць шчасце тварам у Твар. *Цяпер мы бачым, нібы ў люстры, цьмяна, тады ж тварам у Твар: цяпер разумею я часткова, тады ж спазнаю, гэтаксама, як і сам быў пазнаны (1 Кар. 13, 12).* У евангельскай прыпавесці пра багатага і Лазара Самім Ісусам Хрыстом сказана пра дараванне душам прадвызначэння шчасця раней, чым настане Апошні Суд: праведны Лазар адразу пасля смерці быў аднесены на лона Аўраамава (Лк. 16, 22).

А грэшнікаў чакаюць вечная пакуты, і не таму, што гэтага прагне Бог, а таму што самі яны не прынялі Любові і Праўды: *за тое, што яны не прынялі любові праўды, каб выратавацца ім (2 Сал. 2, 10).* Грэшнікаў чакае вечны агонь: *ідзіце ад Мяне, праклятыя, у агонь вечны, прызначаны д'яблу і анёлам яго (Мф. 25, 41),* або геена вогненая: *лепей табе з адным вокам увайсці ў царства Божае, чымсьці, маючы двое вачэй, быць укінутым у геену вогненую, дзе чарвяк іх не памірае, ды агонь не згасае (Мк. 9, 47-48).* Той, хто не будзе запісаны ў Кнізе жыцця, апынецца навек у вогненым возеры, што азначае другую смерць:

А гэта другая смерць. І каго не знойдуць сярод запісаных ў Кнізе жыцця, зрынуты будзе ў возера вогненае (Аб'яўл. 20, 14-15).

Паводле справядлівасці Божага суду, існуюць розныя ступені шчасця, згодна з Божай Праўдай, у залежнасці ад праведнасці жыцця зямнога. Нават па нашай, чалавечай праўдзе, стаўленне да людзей ўзнікае рознае. *Іншая слава сонцу, іншая слава месяцу, іншая слава зорам: бо зорка ад зоркі розніцца ў славе. Гэтак і ўваскрасенне мёртвых (1 Кар. 15, 41-42).*

Што ж рабіць нам, бедным людзям, што апынуліся пасярод гэтага сусветнага зла? У Старым Запавеце сказана ў Наймудрэйшага: *Памятай пра канец свой, і павек не саграшыш (Сір. 7, 39).* Жыццё хуткаплыннае, прамінае, нібы кароткі дзень. Многія святыя задоўга перад канцом рыхтаваліся да пераходу ў вечнае жыццё. І сярод цяперашніх хрысціян ёсць мноства такіх, хто рыхтуецца да гэтага пераходу. Гэтая думка можа палохаць, асабліва маладых. Але вечнае жыццё непазбежнае, бясконца трываць на зямлі мы не будзем. Даброты аб'яўленыя ўсім людзям аднолькава, але адныя карыстаюць з іх разумна, іншыя ж злоўжываюць: *шырокія брамы і вольны шлях вядуць да згубы (Мц. 7, 13).* Таму Апостал кажа: *ачысцім сябе ад усякага бруду цела і духа (2 Кар. 7, 1).* Ачышчэнне ад брыдоты, ад граху — вось мэта нашага жыцця.

IX. АБ НАДЗЕІ

Аб хрысціянскай надзеі

Дзе ёсць вера, там ёсць надзея і любоў, і наадварот. Але нярэдка здараюцца яўныя адступленні ад гэтага правіла. Вера можа быць прыналежнасцю выключна розуму, у той час як надзея належыць да сэрца. Чалавеку ўласцівыя таксама інстынктыўныя імкненні да Бога, але неабходны і свядомы, дзейны рух да Яго. У Сімвале веры: тэарэтычная частка — вучэнне аб веры, лучыва — вучэнне аб надзеі, практычная частка — вучэнне аб любові.

Надзея хрысціянская — гэта суцішэнне сэрца ў Богу, з упэўненасцю, што Ён няспынна дбае пра наша збавенне і дорыць нам абяцанае шчасце, *Госпада Ісуса Хрыста, надзеі нашае (1 Цім. 1, 1),* або падставу нашае надзеі.

Да канца спадзявайцеся на ласку, што прыносіцца нам у аб'яўленні Ісуса Хрыста (1 Пят. 1, 13).

Святы праведны Іаан Кранштацкі сказаў: «Праніклівы розум і моцная воля без асвечанага любоўю сэрца — кінжал у руках разбойніка».

Прадмет хрысціянскае надзеі — Бог, і Ён не расчаруе і не прымусіць саромецца. Той, хто жыве надзеяй, ведае, што з ім Бог, і Ён пашле Сваю добратворную дапамогу. Калі чалавек пакладаецца на свае прыродныя сілы, ён лёгка можа зажурыцца, ўпасці ў адчай. Прыкладам можа быць веданне

хрысціянскай дагматыкі без удзелу сэрца, — холадна, адным розумам. У гэтым выпадку нават невялікія жыццёвыя нягоды прыводзяць да забыцця адкрытых Богам праўд, і чалавек, не маючы надзеі, маркоціцца і нават западае ў адчай. Таму вельмі важна мець надзею на тое, што нават калі на цябе абрынецца ўсё сусветнае зло, — Госпад абароніць.

Паколькі надзея належыць, галоўным чынам, да вобласці сэрца, пачуццяў, мы павінны звяртаць больш увагі на сэрца. Развіццё разумовых здольнасцей адбываецца, не закранаючы сэрца, чыста механічна. На жаль, калі дзіця яшчэ малое, бацькі і выхавацелі часцей звяртаюцца не толькі да розуму, але і да сэрца, аднак па меры сталення ўвага надаецца звычайна толькі разумоваму развіццю. Тыя, хто мае развіты розум і моцную волю і дзейнічаюць праз іх без удзелу асвечанага любоў сэрца, перажываюць пакуты, а яшчэ горш пакутуюць тыя, хто мае з імі дачыненне.

Сродкамі набыцця і ўмацавання надзеі з'яўляюцца малітва, сапраўднае вучэнне аб шчасці і дзейнае выкананне гэтага вучэння, уласны подзвіг, які заключаецца ў выкананні Запаведзяў шчасця. Калі розум і волю можна развіваць пад прымусам, хоць большы поступ нават у засваенні звычайных прадметаў дасягаецца з удзелам усіх сіл душы, дык надзея ўзнікае толькі праз малітву ад зыходу ласкі Божае.

Пра малітву

Малітва — гэта гутарка чалавека з Богам. З малітваю спалучаецца ласка, якая даруе, літуецца: *І чаго папросіце (у Айца) ў імя Маё, тое зраблю, каб уславіўся Айцец у Сыне (Ін. 14, 13).* Нават мы, калі ў нас просяць дабра, даем дабро і не можам даць *камень замест хлеба*, дык, тым болей, дае дабро Госпад, бо Ён добры.

Які ж галоўны сродак мае развіваць і адукоўваць нашае сэрца? Гэта ласка Божая, якая падаецца падчас малітвы. Паводле св. Іаана Кранштацкага, «малітва — гэта залатая повязь чалавека-хрысціяніна, падарожніка і госця на зямлі, са светам духоўным, членам якога ён з'яўляецца, а больш за ўсё — з Богам, крыніцаю жыцця». У «Катэхізісе» свц. Філарэта даецца такое азначэнне: «Малітва — гэта паднясенне розуму і сэрца да Бога, якое выяўляецца праз поўнае вялікай пашаны слова чалавека да Бога». Можна атрымаць інтэлектуальную адукацыю энцыклапедычнай ступені, а сэрца пакінуць не кранутым Божай ласкаю, і ў выніку ўсе веды пойдуць марна нават пры самых нязначных жыццёвых турботах. *Людзі гэтыя набліжаюцца да Мяне вуснамі сваімі і шануюць Мяне сваім языком; сэрца ж іх далёкае ад Мяне; дык дарэмна яны пакланяюцца Мне (Мц. 15, 8-9).*

Маючы душу і цела, мы павінны ўслаўляць Бога душой і целам, таму што *яны Божыя (1 Кар.*

6, 20), бо натуральна, калі *ад перапоўненасці сэрца гавораць вусны (Мц. 12, 34).*

Чалавек — істота двухсастаўная, таму і дадзеныя яму дзве малітвы — знешняя (вусная, вонкавая) і ўнутраная (духоўная, разумовая, сардэчная).

Галоўны від малітвы складаецца са спалучэння ўнутранай і знешняй малітвы, звароту да Бога і знешніх дзеянняў — паклонаў, стаяння на малітве, жагнання, дзеянняў падчас набажэнства. Госпад слухае сардэчную духоўную малітву. Унутраная малітва прыемная Богу, яна неабходная паўсюль і заўжды. Майсей маліўся перад пераходам Чырвонага мора без знешніх прыкмет малітвы, г. зн. разумоваю, сардэчнаю малітвай, і Госпад адказаў: *Чаго (ты) галосіш да Мяне (Вых. 14, 15)?* Гэта значыць, малітва яго была пачутая.

Неабходнасць знешняе малітвы не абвяргаецца, але толькі пры спалучэнні яе з унутранай. Знешняя малітва без унутранай чыніцца марна, яна гнявіць Бога вымаўленнем малітоўных слоў без руплівае ўвагі. Калі мы бачым, што суразмоўца не звяртае на нас увагі, мы злуемся і крыўдуем, а тым больш Бог, калі мы чынім малітву крывадушна, па правілах, але думкамі адбягаем далёка, — гневаецца на нас. Знешняя малітва без унутранай абсалютна недаравальная, непрымальная.

У «Лесвіцы» прап. Іаана Лесвічніка сказана аб тым, што Анёл адкрыў пэўнаму святому манаху наступны парадак думак у малітве, прыемнай

Богу: «Пачатак малітвы павінен складацца з услаўлення Бога, з падзякі Богу за незлічоныя Яго дабразействы; потым мы павінны прынесці Богу шчырае вызнанне грахоў нашых у скрусе духоўнай, на заканчэнне можам прапанаваць, зрэшты, з велізарнай пакораю, — прашэнні да Госпада аб нашых душэўных і цялесных патрэбах, пакідаючы ў глыбокай пашане выкананне або невыкананне гэтых прашэнняў на Яго волю» (Слова 28, р. 7).

Існуюць тры асноўныя роды малітоўных зваротаў: услаўленне, падзяка, прашэнне. У малітве належыць услаўляць Бога за Яго Боскую дасканаласць. Стаючы на малітву, мы павінны дзякаваць за ўсе дабрадзействы, выказаныя нам увогуле і ў прыватнасці. Мы просім шмат даброт для душы і для цела. Жадаючы штосьці атрымаць, мы просім Бога ў сваёй патрэбе і павінны верыць, што атрымаем дапамогу. Святыя Айцы кажуць, што малітва павінна быць кароткая, але злучаная з сэрцам. Бог ведае, што нам трэба, і ўсё пасылае дзеля нашае карысці і дабра праз Найвышэйшую Мудрасць Сваю і Любоў.

Малітва Госпадняя

Узорнай малітваю з'яўляецца малітва Госпадняя, перакладзеная на ўсе мовы і гаворкі зямлі. Гэта адзіная малітва, якую даў нам Госпад. Ён навучыў ёй Апосталаў, якія перадалі яе ўсім вер-

нікам. Гэтая малітва кароткая, але дужа глыбокая. Яна ўсеабдымная паводле зместу: у ёй сказана пра ўсе найважнейшыя людскія жыццёвыя патрэбы. Паводле слоў Свяціцеля Ігната (Бранчанінава), «прашэнні, з якіх складаецца малітва Гасподняя, — прашэнні дароў духоўных, якія чалавецтва набыло праз адкупленне. Няма слова ў малітве аб цялесных, часовых патрэбах чалавека». Госпад даў людзям гэтую малітву, каб чалавецтва ведала, пра што перш за ўсё належыць маліцца і прасіць Бога.

Ойча наш, Які ёсць у Нябёсах! 1) Хай свяціцца імя Тваё, 2) Хай прыйдзе Царства Тваё, 3) Хай будзе воля Твая, як на Небе, так і на зямлі. 4) Хлеб наш надзённы дай нам сёння; 5) і даруй нам даўгі нашыя, як і мы даруем вінным перад намі; 6) і не дай нас у спакусу, 7) але збаў нас ад ліха. Бо Тваё ёсць Царства і сіла і слава, і на вякі вякоў. Амін (Мц. 6, 9-13).

Малітва *Ойча наш* падзяляецца на 3 часткі: зварот, або заклік; сем прашэнняў; услаўленне.

Зварот: *Ойча наш, Які ёсць у Нябёсах!*

Айцец — гэта блізкае і зразумелае для нас слова. У Старым Запавеце няма звароту да Бога «Айцец», і толькі Новы Запавет, дзякуючы Хрысту, адкрывае нам магчымасць называць Бога Айцом,

бо Яго Адзінародны Сын робіцца Першародным. Хрыстос не аднойчы звяртаецца да Бога: *Ойча! (Ін 17, 1; Лк. 22, 41; Мц. 26, 39; 1 Кар. 6, 20).* «Госпад Творца наш, які стварыў нас з нічога, а праз Сына Свайго, паводле існасці, зрабіўся нам Айцом паводле ласкі», — гаворыць бл. Сімяон, архіепіскап Фесаланікійскі. Нам дараваныя ад Айца Нябеснага жыццё і міласць: *Жыццё і міласць паклаў мне, і прысутнасць Твая жывіла мой дух (Іоў. 10, 12).* І пра гэта гаворыць кожны чалавек у цвярозым розуме: *Усе яны на Цябе чакаюць, каб Ты даў есці ім у належны час (Пс. 103, 27).* Усе мы паходзім не ад немых істот, але ад Адама, Адам жа — ад Бога: *А тым, што прынялі Яго, (...) дадзена ім сіла дзецьмі Божымі стацца, тым, якія вераць у імя Яго, тым, што не ад крыві, не ад жадання цела, не ад жадання мужа, але ад Бога нарадзіліся (Ін. 1, 12-13).* Такім чынам, мы браты — паводле пахожання. І калі Ева нараджае нявольнікаў тлення без нашай згоды, дык Царква нараджае сыноў свабоды і шчасця паводле нашай волі.

Усякі чалавек можа звяртацца да Бога, незалежна ад таго, адроджаны ён ці не, але хрысціяне маюць перавагу, бо яны адкупленыя дарагою цаною Крыві Божае. Хрысціяне — браты не толькі паводле паходжання, але і паводле адкуплення. Бог паслаў Адзінароднага Сына Свайго, каб адкупіў нас.

Нарэшце, мы — браты паводле асвячэння, адраджальнага ўздзеяння Святога Духа. Госпад

гаворыць: *Іншага Суцяшыцеля дасць вам (Ін. 14, 16),* г. зн. Духа праўды. Нас адраджае ласка Святога Духа.

Такім чынам, кажа св. Максім Спавядальднік, уся Святая Тройца ўдзельнічае ў чалавечым збаўленні і адраджэнні.

У закліканні выяўляецца любоў да ўсіх людзей і гатоўнасць маліцца за іх. Кажучы *Ойча наш,* мы думаем пра ўсіх і молімся за ўсіх, і не толькі за адроджаных, але і за тых, якія яшчэ не адрадзіліся, і за тых, хто набліжаецца да адраджэння, і за тых, хто яшчэ не быў пакліканы да яго. Усе мы браты. Любоў — адзнака дзяцей Божых. Калі мы будзем жывіць адзін да аднаго нянавісць, гэта будзе адзнакаю д'ябла.

Словы *Які ёсць у Нябёсах* азначаюць адхіленне ўсяго зямнога і накіраванасць да Нябеснага. Мы не замыкаем Бога на Небе, і, адрынуўшы зямное і марнае, уздымаемся ў вышыню, да Нябеснага і вечнага, сваім розумам, сэрцам і воляй, і маем магчымасць адчуць Бога тут, на зямлі. Малітва стане асалодаю для чалавека, і ўсцешыцца Сам Бог. Мы (Святая Тройца) грукаем, і тыя, хто пачуе і адчыніць дзверы, прыйдуць і памоляцца: *Вось, стаю пад дзвярыма і грукаю: калі хто пачуе мой голас і адчыніць дзверы, увайду да яго і павячэраю з ім, дый ён са Мною (Аб'яўл. 3, 20).* Мы — дзеці Айца Нябеснага, і Бацькаўшчына наша не тут, а ў Нябёсах.

1-ае прашэнне: *Хай свяціцца імя Тваё*

Госпад Бог багаты на ласку і шчодрасць, Госпад — пануе. Ён, якому ўласцівыя вечная Слава і веліч, гаворыць аб Сабе: *Імем Маім дэманаў выганяць будуць (Мк. 16, 17).* Імя Божае святое само па сабе: *Святое імя Яго (Лк. 1, 49).* І ў прашэнні маецца на ўвазе, што імя Божае павінна свяціцца, г. зн. быць аб'яўленае, як святое, праз наша духоўнае жыццё.

Мы дзеці зямных айцоў, і мы ўсяляк імкнемся іх уславіць: *слава чалавека з гонару айца яго, і ганьба дзецям маці ў бясслаўі (Сір. 3, 11).* Будучы дзецьмі Айца Нябеснага, мы таксама павінны жадаць Яго ўслаўлення, і не так словамі, колькі жыццём і добрымі справамі. І тады, гледзячы на наша жыццё, якое ідзе шляхам маральнага ўдасканальвання, г. зн. прыпадабнення да Бога, людзі будуць услаўляць Бога і радавацца. І наадварот, праз амаральных хрысціян *імя Божае ганьбуецца між людзей (Іс. 52, 5).* Святасць Божага імя вызнае Давід у псалмах. Услаўляецца Маці Божая пры Дабравешчанні і сустрэчы з Альжбетаю.

Цнатлівае дабрачыннае жыццё, асабліва пастырскае, — гэта найлепшае хрысціянскае казанне. І наадварот, жыццё амаральнае — самая дзейсная антырэлігійная прапаганда. *Дык няхай святло вашае свеціць перад людзьмі, каб яны бачылі вашыя добрыя справы, і ўслаўляе Айца вашага, што ў Нябёсах (Мц. 5, 16).*

Максім Спавядальнік указвае: «Свяцім мы імя Нябеснага Айца свайго паводле ласкі, калі ўтаймоўваем прывязаную да матэрыі юрлівасць і ачышчаемся ад згубнай пажадлівасці».

Жыцці святых сведчаць аб магчымасці для чалавека дасягнуць духоўнай вышыні. Чалавечае жыццё прападобны Серафім Сароўскі параўнаў са свечкаю: «На жыццё нашае глядзець трэба, як на свечку. <...> Воск — гэта наша вера, а агонь — любоў, якая злучае ўсё разам: і веру, і надзею, гэтаксама, як воск і кнот гараць разам пад уплывам агню. Дрэннай якасці свечка смярдзіць пры гарэнні і чэзне; гэткае самае смярдзючае ў духоўным сэнсе і жыццё грэшніка перад Богам» (Сказанні аб жыцці і подзвігах старца Серафіма. СПб, 2005). Вядомае і параўнанне са свечкай самога айца Серафіма, зробленае выдатным падзвіжнікам XIX стагоддзя архіепіскапам Антоніям Варонежскім: «Мы, — нібы капеечныя свечачкі. А ён, — нібы пудовая свечка, заўжды гарыць перад Госпадам, — як мінулым сваім жыццём на зямлі, так і цяперашняй адвагаю перад Святой Тройцай».

2-ое прашэнне: *Хай прыйдзе Царства Тваё*

Ёсць тры Царствы: Царства прыроды, Царства ласкі і Царства славы.

Калі мы молімся аб Царстве Божым, Царства ласкі і Царства славы. Чалавек уступае ў Царства ласкі па меры свайго ачышчэння ад граху.

А некаторыя зусім не адхіляюцца ад граху, хоць мінула ўжо больш за 2000 гадоў пасля Раства Хырстовага. Для адных гэтае Царства надышло ў поўнай сіле, для другіх — часткова, трэцім — зусім невядома, *бо пануе (...) грэх у смяротным (...) целе, каб скарыцца перад ім у пажадлівасці яго (Рым. 6, 12).*

Пакайцеся, бо наблізілася Царства Нябеснае (Мц. 4, 17). Гэтымі словамі пачалося казанне Ісуса Хрыста, Які прыйшоў у свет, што вязнеў ў зле, і заклікаў да ачышчэння сэрца. Але многія адыходзілі ад Яго, бо чакалі не таго, што атрымлівалі. *Не прыйдзе Царства Божае заўважна. (...) Бо вось, Царства Божае ўнутры вас ёсць (Лк. 17, 20-21),* бо гэта Царства праўды, міру і радасці ў Святым Духу; *праўда, і мір, і радасць ў Духу Святым (Рым. 14, 17),* якія запануюць у жыцці грамадства і кожнага з нас. У лістах прап. Амброзія Опцінскага сказана: «Як і чым набываецца Царства Божае ўнутры нас? Паводле слова Апостальскага, яно набываецца, па-першае, праўдаю, або праведнасцю, якая выяўляецца ў выкананні Запаведзяў Божых і літасцівым і спагадлівым стаўленні да бліжніх, па-другое, мірам з бліжнімі, спакоем без жарсцяў, згодаю са сваім сумленнем і мірам з Богам праз пакаянне і пакору. Калі хрысціянін прымусіць сябе да такога ладу, тады ён атрымае дабратворную дапамогу і ў спрыянні Святога Духа сярод самых смуткаў будзе радавацца, цвёрда верачы Апостальскаму слову, што (…) *шмат па-*

кут трэба нам, каб увайсці ў Царства Нябеснае (Дзеі 14, 22) (Збор пісьмаў… М, 1997, с. 48).

На пытанне Пілата: *Ты Цар Іудзейскі?* Хрыстос адказаў: *Царства маё не з гэтага свету (Ін. 18, 36).* Гэта духоўнае Царства не з гэтага свету, а не Царства матэрыяльных даброт. Як сказаў прап. Амброзій Опцінскі, «Госпад, з дабрыні Сваёй і міласэрнасці Сваёй, хоча падараваць нам вечнае шчасце на Небе, у Царстве Нябесным, а мы, праз слепату нашу, больш жадаем, шукаем шчасця і часовага дабрабыту на зямлі» (Збор пісьмаў… М, 1997, с. 48). Царства Божае надыходзіць спакрыёму. Ніхто не можа ўбачыць, што робіцца ў той ці іншай душы.

Царква — Царства Божае на зямлі. Мы молімся, каб Царква Божая ахапіла ўсе народы. Калі б гэта адбылося, дык знікла б зло як такое. *Не праміне род гэты (Лк. 21, 32),* калі надыдзе Царства Божае.

Мы думаем, молячыся, і пра Царства славы, у якое павінны ўвайсці ўсе. Дарога да Царства славы вядзе праз Царства ласкі. І мы павінны спачатку ўвайсці ў першае. А каб трапіць ў Царства славы, мы павінны імкнуцца трапіць ў Царства ласкі. Апостал Павел кажа: *Маю жаданне развязацца і быць з Хрыстом (Флп. 1, 23).* Толькі Бог, які кліча нас да сябе, ведае, калі выспее плод. Госпад выпрабоўвае ўсе сродкі для выхавання чалавека, і калі ўсе сродкі вычарпаныя, Бог абрывае жыццё для таго, каб не павялічваць меру беззаконнасці.

3-яе прашэнне: *Хай будзе воля Твая, як на Небе, так і на зямлі*

Хай будзе воля Твая. Гэтымі словамі выказваецца просьба, каб усё ў нашым жыцці адбывалася так, як хоча Бог, а не так, як жадаем мы. *Бо Бог адзін, і адзін пасярэднік між Богам і людзьмі — чалавек Ісус Хрыстос, што аддаў сябе дзеля адкуплення ўсіх (1 Цім. 2, 5-6).*

Сапраўдны хрысціянін хоча, каб свяцілася імя Божае і надышло Царства дабрадзейства для ўсіх. Для гэтага неабходна, каб выканалася воля Божая. Гэта Найсвяцейшая, Праведная і Добрая воля. Бог непараўнальна больш любіць нас, чым мы самі сябе, і, несумненна, даруе нам ўсё неабходнае, калі мы самі не будзем гэтаму перашкаджаць.

У Святым Пісанні ёсць мноства прыкладаў імкнення да выканання волі Божай. Усім вядомы прыклад праведнага Іова, які без нараканняў вытрываў усе выпрабаванні, пасланыя Богам, не страціў веры: *Госпад даў, Госпад узяў; як Госпаду заўгодна, так і будзе (Іоў, 1, 21).*

Ісус Хрыстос маліўся ў Гефсіманскім садзе: *Ойча! калі будзе Твая воля, пранясі гэтую чару міма Мяне, але не Мая воля, а Твая няхай станецца (Лк., 22, 42).* Апостал Пётр, адчуваючы любоў і спагаду да Хрыста, прасіў Яго: «Госпадзе, будзь літасцівы да Сябе, хай не напаткае Цябе гэткая доля». Але Хрыстос сказаў «Адыдзі ад Мяне, ша-

тан!» — *Адыдзі ад мяне, шатан, бо думаеш не аб Божым, але аб чалавечым (Мк. 8, 33).*

У зборніку «У садзе Гефсіманскім» (СПб, 2004) прадстаўленыя творы Святых Айцоў і паэтаў аб тым, як разумець чалавеку Волю Божую. Так, прап. Нікадым Святагорац кажа, што воля чалавека «заўсёды разбаўленая самалюбствам, вельмі часта памыляецца і не ведае таго, чаго трэба жадаць. Воля ж Гасподняя заўсёды добрая, наймудрэйшая і найправеднейшая, дабратворная і ніколі памыліцца не можа. Таму, паколькі яна ёсць неадменны закон для ўсяго, што існуе і здараецца, дык павінна быць правілам для волі ўсіх разумных стварэнняў і царыцаю іх жаданняў, якой яны павінны пакорліва ва ўсім слухаць» (с. 52).

Госпад часта стрымлівае тых, хто просіць, бо жадае ім толькі дабра. Калі б Госпад выконваў нашыя жаданні, якія нам падаюцца добрымі, тады б мы хутка давялі сябе да загібелі. Так, першы Адам загубіў сябе праз выкананне ўласнай волі і пагарду да волі Айца Нябеснага. У дзяцінстве дзіця шмат чаго хоча, але бацькі абмяжоўваюць яго жаданні дзеля яго ўласнае карысці. На працягу ўсяго жыцця Госпад пасылае нам тое, што карысна нам, ведаючы, што для нас карысна, і ўтрымлівае ад таго, што не дае карысці, і ніколі не пашле нам выпрабаванне, якое перавышае нашы сілы.

Воля Божая выконваецца на Небе, а на зямлі чалавек спрабуе выканаць уласную волю, і тут пануе не адзін пачатак, а два, г. зн. шматуладдзе (кожны

жадае выканання ўласнай волі), што выклікае безлад і багацце зла. Існуюць тры цяжкія крыніцы грэшнае спакусы і чалавечага свавольства: д'ябал, свет, уласнае цела: *пажадлівасць цела, пажадлівасць вачэй і пыха жыццёвая (1 Ін. 2, 16)*.

Першая крыніца — д'ябал. *Д'ябал,* — кажа апостал Пётр, — *як леў рыкаючы ходзіць, шукаючы, каго праглынуць (1 Пят. 5, 8)*. Д'ябал заўсёды кваліўся спакушаць людзей, у тым ліку Апосталаў дый Самога Хрыста. Воля шатана — рассеяць вучняў ад Свайго Настаўніка і Бога, як гэта здарылася з Іудам. Вера Пятра так уз'юшыла апраметную, што д'ябал прасіў дазволу на тое, каб рассеяць яго веру, спраўдзіць, ці вытрывае яна. Але Госпад сказаў: *Сымон, Сымон! Гэта шатан прасіў, каб прасеяць вас, як пшаніцу, але Я маліўся за цябе, каб не паменшала вера твая (Лк. 22, 31-32)*.

Другая крыніца — свет. Апостал Павел гаварыў, што не ўсё карысна сярод дазволенага: *Усё мне можна, але не ўсё карысна: усё мне можна, але апанаваць мяне не дам нічому (1 Кар. 6, 12)*. А таксама: *Ойча Справядлівы, і свет Цябе не пазнаў (Ін. 17, 25)*.

Трэцяя крыніца — наша ўласнае цела, не ўтаймаванае постам і малітвою, якое паўстае супраць душы: *але бачу іншы закон у членах маіх, які ваюе супраць закону розуму майго і бярэ мяне ў палон законам грэшным, што існуе ў членах маіх (Рым. 7, 23)*. З гэтым звязана існаванне пастоў, як шматдзённых, гэтак і аднадзённых.

Дадатак: *як на Небе, так і на зямлі* азначае неабходнасць ачышчэння свайго жыцця, каб, як ў Вышэйшым свеце, у нас без перашкод дзейнічала Воля Божая.

4-ае прашэнне: *Хлеб наш надзённы дай нам сёння*

Паколькі чалавек — істота трохсастаўная, ён указвае ў прашэнні на падтрыманне сваёй цялеснай прыроды.

Хлеб — гэта ўсё набходнае нам на кожны дзень (і адзенне, і абутак, і дах над галавою).

«Тварыце і ўрабляйце рай», — сказана было чалавеку: *І ўзяў Госпад Бог чалавека, якога стварыў, і ўвёў яго ў сад Эдэнскі, даглядаць яго і ахоўваць (Быц. 2, 15). Наш* — азначае, што мы набываем неабходнае для жыцця ўласнай працаю. Праца стала неабходным дабрадзействам пасля грэхападзення. *У поце твару твайго будзеш здабываць хлеб твой (Быц. 3, 19),* — наказаў Госпад Адаму, як нейкі лек. У Старым Запавеце апавядаецца аб тым, як патрыярх Якуб, шчыруючы ў працы, значна памножыў багацце Лавана (Быц. 30). Праца прыносіць чалавеку сапраўдную радасць. Калі ж мы стараемся пражыць за кошт іншых, дык гэта не наш хлеб. «Хто не працуе, той не есць» — гэта крыху змененае выказванне апостала Паўла: *дый ні ў кога не елі хлеба задарма, але цяжка і рупліва працавалі ноч і дзень, каб не абцяжарыць каго з*

вас — не таму, што мы не мелі ўлады, але каб сябе саміх даць вам за прыклад дзеля наследавання нам. Бо, калі мы былі ў вас, дык далі вам такі наказ: калі хто не хоча працаваць, той няхай і не есць (2 Фес. 3, 8-10).

Хлеб надзённы — азначае, што мы просім не прысмакаў, не дарагіх каштоўнасцей, не салодкага хлеба, але надзённага, не поўных сусек, але неабходнага, не на працяглы час, але на сёння. Госпад хоча, каб мы былі здаровыя і жыццярадасныя. Калі нам даецца больш за гэта, мы павінны дзякаваць.

Сёння — азначае: не турбуйся пра будучыню, кожны дзень сам аб сабе дбае. *Дык не турбуйцеся пра заўтрашні дзень, бо заўтрашні дзень сам будзе турбавацца аб сабе. Годзе кожнаму дню свайго ліха (Мц. 6, 34).* Госпад не абяцаў нам заўтрашняга дня, хоць абяцаў Сваю ласку і літасць.

Паглядзіце на птушак нябесных, што не сеюць, не жнуць і не збіраюць у свірны, і Айцец наш нябесны корміць іх (Мц. 6, 26). Той, хто цвёрда спадзяецца на Госпада — ніколі не застанецца без апекі. *Паглядзіце на палявыя лілеі, як яны растуць: не працуюць, не прадуць; а я кажу вам, што і Саламон ва ўсёй славе сваёй не апранаўся так, як кожная з іх (Мц. 6, 28-29).* Бо Айцец Нябесны ведае нашыя патрэбы: *дый Айцец ваш нябесны ведае, што ўсё гэта вам патрэбна (Мц. 6, 32).*

Перашае прашэнне ў малітве Гасподняй — духоўнае, для душы. Чацвёртае прашэнне —

пра ўсё неабходнае для чалавека штодня. Але, просячы пра патрэбы цялесныя, мы не павінны забывацца на душу, каб не ўнесці дысгармонію ў сваю прыроду. Хлеб для душы — гэта малітва і Слова Божае. У Евангеллі сказана: *не хлебам адным будзе жыць чалавек, але ўсялякім словам, якое зыходзіць з вуснаў Божых (Мц. 4, 4).* Таму тыя, хто сярод дабрабыту ў доме не знаходзяць спакою, не могуць зразумець, у чым тут прычына. А яна крыецца ў недахопе духоўнага жыцця, перш з ўсё — у адсутнасці пакаяння. Ісус Хрыстос называў сябе Хлебам Жыцця: *Я — хлеб жывы, што сышоў з Неба, хто есць хлеб гэты, жыць будзе вечна (Ін. 6, 51).* А таксама: *Бо Цела Маё сапраўды ёсць ежа, і Кроў Мая сапраўды ёсць пітво (Ін. 6, 55).*

5-ае прашэнне:

І даруй нам даўгі нашыя, як і мы даруем вінным перад намі

У евангеліста Мацвея сказана: *даруй даўгі нашыя,* у евангеліста Лукі: *даруй грахі нашыя,* «даўгі» і «грахі» — гэта сінонімы. Мы — грэшнікі паводле існасці. Пра гэта сведчаць прарокі Старога Запавету: *Вось жа, у беззаконні я быў зачаты, і ў грахах нарадзіла мяне маці мая (Пс. 50, 7).* А таксама: *няма ж нікога (...) чыстага (...) ад бруду, (...) Нават калі адзін дзень (доўжылася) жыццё*

яго на зямлі (Іоў 14, 4). У Новым Запавеце апостал Павел гаворыць: *праз аднаго чалавека ўвайшоў у свет грэх і праз грэх — смерць, гэтак і смерць перайшла праз усіх людзей, бо ўсе мы зграшылі (Рым. 5, 12).* «Радуйцеся», — гэта былі першыя словы Хрыста пасля Уваскрасення. А як мы можам радавацца, калі пагрузлі ў граху? Ігумен Філарэт (Вазнясенскі) піша: «Наша сэрца зацягнулася цвіллю і плесняю граху, страціла здольнасць да адчуванняў чыстых, духоўных і па-хрысціянску ўзвышаных. Замест гэтага яно стала схільнае да патурання пачуццям і зямным прывязанасцям, а таксама заражанае пыхаю і часам здзіўляе поўнай адсутнасцю любові і добразычлівасці да бліжняга» (Канспект па Законе Божым, СПб, 2010, с. 8).

Гэта прашэнне вымаўляецца з пачуццём і ўсведамленнем поўнай сваёй нявартасці, з усведамленнем і надзеяй, што Бог можа дараваць нам грахі паводле літасці сваёй і хадайніцтва Хрыста. Бо *Бог адзін і адзін пасярэднік між Богам і людзьмі — чалавек* Хрыстос Ісус *(1 Цім. 2, 5).* Свяціцель Філарэт гаворыць: «Хрыстос прапануе лёгкі дагавор. Мы атрымалі ў спадчыну першародны грэх, апрача таго, Бог улічвае ўсе грэшныя справы і грахі ў думках, і, тым не менш, Госпад прапануе лёгкую ўмову». Просячы дараваць нам грахі нашыя, мы павінны рабіць такія ўчынкі ў адносінах да сваіх бліжніх: *Бо, калі вы даруеце людзям правіны іх, дык і вам даруе Айцец Ваш Нябесны, а калі не даруеце людзям правіны іх, дык і вам*

не даруе Айцец ваш правінаў вашых (Мц. 6, 14-15). Гняўлівае і злоснае сэрца траціць ласку Божую, і ў ім знаходзіць месца толькі той, хто ходзіць, як леў рыкаючы, г. зн. д'ябал.

Неабходна прымірыцца са сваімі бліжнімі, перш чым ставаць на малітву: *І калі ты прынясеш ахвяру тваю да алтара і там прыпомніш, што брат твой мае штось супраць цябе, пакінь там ахвяру перад алтаром і пайдзі перш пагадзіся з братам тваім, а тады ўжо прыйдзі і прынясі ахвяру тваю (Мц. 5, 23-24).* А таксама: *Калі магчыма, з вашага боку, з усімі людзьмі будзьце ў згодзе (Рым. 12, 18).* Асабліва гэта важна ў Таінстве Еўхарыстыі. Чалавек робіць выбар: ён можа даравацъ з усяго сэрца, а можа прыпадабніцца да злоснага крэдытора. Калі застанецца нейкае зласлівае пачуццё, усё будзе дарэмна. Гняўлівае і зласлівае сэрца не здольнае ўспрыняць Боскую любоў, Божую ласку, а прагне толькі помсты і пакут для крыўдзіцеляў. Госпад не змагаецца з намі ва ўсёдаравальнасці, і таму не даруе грахі тым, хто сам не дараваў. І мы павінны дараваць крыўдзіцелям і маліцца Богу, каб Госпад іх улагодзіў.

Там, дзе няма даравання грахоў, няма сапраўднага пакаяння, а дзе няма пакаяння — там няма вынікаў Хрыстовых заслуг. Таму усёдараванне такое важнае. Яго значэнне падкрэслівае існаванне ў Царкве пабожнага абраду даравання, які выконваецца напярэдадні Чатырохдзясятніцы, у Даравальную нядзелю.

6-ае прашэнне: *І не дай нас у спакусу*

Бог выпрабоўвае нас дзеля таго, каб адвярнуць чалавека ад граху, умацаваць яго веру і ўзнесці да любові: *Госпадзе, выпрабаваў Ты мяне і спазнаў мяне Ты. Ведаеш Ты, калі я сядаю і калі я ўстаю (Пс. 138, 1-2).* А таксама: *Выпрабуй мяне, Божа, і сэрца маё спазнай! Пашлі мне цяжар і зразумей шляхі мае: і зірні, ці не збочыў я на шлях беззаконнасці, і скіруй мяне на шлях вечнасці (Пс. 138, 23-24).*

Выпрабаванні лечаць эгаізм, пыху чалавека. Псалмапевец кажа: *Добра мне, (Госпадзе), што ўпакорыў Ты мяне (Пс. 118, 71).*

Прыкладаў выпрабаванняў шмат. Д'ябал сказаў, што Іоў шануе Бога, бо жыве багата. Госпад, каб выпрабаваць Іова, дапусціў, каб яго агарнулі нягоды, і асарамаціў Іоў д'ябла, бо ўстояў ў сваёй пашане да Бога.

Ёсць выпрабаванні, у якіх узнікае блізкая небяспека граху. Былі спакушаныя Адам і Ева. Быў спакушаны Язэп жонкаю Патыфара, але не пайшоў супраць Боскае Запаведзі, быў несправядліва абвінавачаны ў тым, што квапіўся парушыць цнатлівасць, і кінуты ў вязніцу (Быц. 39). І мы просім, каб Госпад адвярнуў нас ад граху або, калі няма на тое волі Божае, каб умацаваў нас. Найлепшая зброя ў барацьбе з д'яблам — гэта знак Жагнання, выкананага з жарам, якое насылае на д'ябла жах і трымценне, ды малітва Ісусава, вымаўленне Божага імя. Прашэнне не вызваляе чалавека ад улас-

най сур'ёзнай барацьбы з грахом, але не варта пры гэтым ганарліва заносіцца і нельга не прыгадаць у гэтым выпадку апостала Пятра, які казаў, што не пакіне Госпада, але асарамаціўся і тройчы здрадзіў Яму. У апостала Паўла былі моцныя спакусы, але ён меў ласку і трываў: *досыць табе ласкі Маёй, бо сіла Мая выяўляецца ў немачы (2 Кар. 12, 9).* Чалавек не павінен пакладацца на ўласныя марныя сілы, а толькі спадзявацца на дапамогу Божую.

Бог выпрабоўвае нас, але не спакушае. Калі не выпрабоўваць нас, мы ператворымся ў занадта далікатныя стварэнні. *Выпрабуй мяне, Госпадзе, і паспытай мяне, растапі нутро маё і сэрца маё (Пс. 25, 2),* — просіць Госпада псалмапевец Давід. Многія святыя прасілі выпрабаванняў. Часта сярод поўнага дабрабыту находзіць нейкае захмурэнне, збег абставінаў, пры якіх можна запасці ў грэх, а потым і ў спанаду паўтарэння граху. Маральны ж бок граху ва ўсёй прыкрасці сваёй нас разбэшчвае.

Наша сэрца — поле барацьбы, а наша зброя — Жагнанне і моц малітвы.

7-ае прашэнне: *Але збаў нас ад ліха*

Гэта — просьба да Бога выбавіць нас ад усялякага зла. Ад моманту грэхападзення *ўвесь свет ляжыць у зле (1 Ін. 5, 19),* і на ўсіх мовах і гаворках узносіцца Малітва Гасподняя. Госпад чуе малітвы і збаўляе ад падкопаў д'ябла, які імкнецца рассеяць нас, бы тую пшаніцу. Д'ябал ваюе толькі там,

дзе змагаюцца супраць яго. Госпад паводле літасці Сваёй збаўляе ад многіх нягод. *Багата журбот у праведных, і з усіх выбавіць іх Госпад (Пс. 33, 20).* Але ў апошні дзень перад Страшным судом Госпад канчаткова пазбавіць нас д'ябальскага зла.

Наша сіла ў тым, што мы вызнаём усёмагутнасць Божую, для Якога няма нічога немагчымага.

Словы малітвы *Ойча наш* — Божыя, гэта не звычайныя чалавечыя словы, моц яе не ў чалавечай прагнасці да пашаны, а ў нашым добрым жыцці і добрых справах. Ідучы гэтым шляхам прыпадабнення да Бога, шляхам маральнага ўдасканальвання, чалавек можа дасягнуць найвышэйшага маральнага шчасця.

Услаўленне

Госпад абяцаў нам: *І чаго папросіце (у Айца) ў імя Маё, тое зраблю, каб уславіўся Айцец у Сыне (Ін. 14, 13).* Мэта ўслаўлення — умацаваць нашу надзею, каб мы без ваганняў маглі з поўнай упэўненасцю спадзявацца на Бога ў самым істотным. *Амін* — азначае «няхай будзе так», г. зн., хай сапраўды станецца тое, што просіцца ў Бога. Гэткім чынам умацоўваецца наша надзея.

Пра Навуку найвышэйшага шчасця

У Старым Запавеце для маральнага ўдасканальвання чалавека патрэбныя былі знешнія законы,

але ў рэчышчы Новага Запавету недастаткова толькі заклікаць імя Божае: *Многія скажуць мне ў той дзень: Госпадзе, Госпадзе, Ці не Тваім іменем мы прарочылі? І ці не Тваім іменем выганялі дэманаў, і ці не Тваім іменем многія цуды чынілі? (Мц. 7, 22).* Ён жа скажа: *Не ведаю вас (Мц. 25, 12).*

Грэшнасці трэба пазбаўляцца не толькі ва ўчынках, але і ў думках. Гэты подзвіг прапануе нам здзейсніць Хрыстос, Які заклікае нас да ўнутранай чысціні. Ён звяртае нашую ўвагу на ўнутраны свет і асабістае ўдасканальванне, на ачышчэнне душы. І таму Хрыстос, выкрываючы фарысеяў і законнікаў, называе «павапленымі трунамі» тых, хто захоўвае толькі знешняе добрапрыстойнае аблічча: *Гора вам, кніжнікі і фарысеі крывадушныя, бо прыпадабняецеся да трунаў павапленых, якія звонку выглядаюць прыгожа, а ў сярэдзіне поўныя касцей трупных і ўсялякае нечысці (Мц. 23, 27).* А таксама: *і вам, законнікам, гора, бо ўзвальваеце на чалавека бярэмя не па сілах, а самі адным пальцам вашым не кранеце цяжару (Лк. 11, 46).*

Уласны подзвіг — верны сродак, каб наблізіцца да Бога. *Што ж клічаце Мяне: Госпадзе, Госпадзе, а не робіце таго, што кажу (Лк. 6, 46)?*

Мы павінны рабіць тое, што належыць выконваць нам самім; тое, што перавышае нашыя сілы, — дапаможа зрабіць Госпад. Госпад не толькі ахвяруе навуку і Евангелле, але Ён перад тым выканаў яго да ёты. Ён здзейсніў найцяжэйшую запаведзь, дадзеную Ім Самім, паклаў душу Сваю

за сяброў Сваіх: *Вось запаведзь Мая: любіце адзін аднаго, як Я палюбіў вас: няма большае любові за тую, калі хто душу сваю пакладзе за сяброў сваіх. Вы — сябры Мае, калі выконваеце тое, што Я загадваю вам (Ін. 15, 12-14).*

Ісус Хрыстос на гары назваў вучняў, якія слухалі Яго казанне, соллю зямлі: *Вы — соль зямлі: калі ж соль страціць сілу, дык чым асоліцца? Яна ўжо нікуды не вартая, толькі высыпаць яе вон на патаптанне людзям. Вы — святло свету: не можа горад схавацца, стоячы на версе гары. І, запаліўшы свечку, не ставяць яе пад спудам, але на падсвечнік, і свеціць усім, хто ёсць у доме. Гэтак няхай святло вашае свеціць перад людзьмі, каб яны бачылі вашыя добрыя справы і ўславілі Айца вашага, што ў Нябёсах (Мц. 5, 13-16).* «Соль зямлі», як звычайная соль, якая засцерагае ад гніення, мае ахоўваць грамадства ад заняпаду і маральнага разлажэння. Супраць яго не здольны ўстояць той, хто толькі паводле імя з'яўляецца хрысціянінам. Устоіць толькі той, хто дабравольна прыме Царства Хрыстовае.

У кожнай Запаведзі Хрыстовай можна бачыць павучанне і разам з тым абяцанне шчасця. Узнагароду ж чалавек атрымлівае ўжо тут, на зямлі.

Запаведзі найвышэйшага шчасця

Запаведзі найвышэйшага шчасця акрэсленыя Хрыстом Госпадам нашым у Евангеллі (Мц. 5, 3-12), разам іх дзевяць:

1. Шчаслівыя ўбогія духам: бо іх ёсць Царства Нябеснае.

2. Шчаслівыя тыя, хто плача: бо яны суцешацца.

3. Шчаслівыя рахманыя: бо яны атрымаюць у спадчыну зямлю.

4. Шчаслівыя тыя, хто прагне і праўды і смягне па ёй: бо яны спатоляцца.

5. Шчаслівыя літасцівыя: бо яны памілаваныя будуць.

6. Шчаслівыя чыстыя сэрцам: бо яны пабачаць Бога.

7. Шчаслівыя міратворцы: бо яны будуць звацца сынамі Божымі.

8. Шчаслівыя гнаныя за праўду: бо іх ёсць Царства Нябеснае.

9. Шчаслівыя вы, калі абняславяць вас і будуць гнаць, і нагавораць пра вас усялякага благоцця праз Мяне: Радуйцеся і весяліцеся, бо вялікая ўзнагарода ваша на Небе.

1-ая запаведзь найвышэйшага шчасця: *Шчаслівыя ўбогія духам: бо іх ёсць Царства Нябеснае.*

Запаведзі найвышэйшага шчасця — гэта залаты ланцуг, чароўная лесвіца маральнага ўдасканальвання, якая пачынаецца з найпрасцейшага,

а заканчваецца найцяжэйшым. Пачаткам маральнага ўдасканальвання з'яўляецца прызнанне ўбогасці душы. Калі чалавек гэтага не ўсведамляе, дык іншых запаведзяў не адолее. Калі ж выканае, можа падступіцца да другой Запаведзі, яшчэ цяжэйшай.

Паводле тлумачэння св. Іаана Залатавуснага, «убогасць духоўная — гэта мудрасць пакоры» (Гутарка на Евангелле ад Мацвея, — на раздзел 15). Хрысціянская пакора адкрывае шлях да Царства Нябеснага. Гэта не тая заганная ціхмянасць, калі чалавек, як нявольнік, выконвае ўсё, што б яму ні загадалі; калі ён не ўсведамляе волю, дадзеную ад Бога, і падмяняе яе лёкайскім дагаджэннем, ліслівасцю ды іншымі нікчэмнымі пачуццямі. «Служыць бы рады, прыслужвацца агідна», — сказаў А. С. Грыбаедаў у «Горы з розуму». Пакора — гэта чысціня розуму, дабрыня сэрца, святасць волі, сілы, якія, наадварот, падпарадкоўваюць сабе навакольных, так што тыя самі міжвольна пераймаюць і схіляюцца перад гэтымі цнотамі. Так, пакорлівага хрысціяніна Айцы параўноўваюць з налітым калоссем, якое пад цяжарам зярнят хіліцца да зямлі. Ёсць байка І. А. Крылова пра дзве бочкі, пустую і поўную. Пустая бочка кацілася з шумам і грукатам, а поўная — ціха.

Марнае жаданне славы і пыха масцілі шлях, па якім пайшлі першыя людзі. Нам трэба развярнуцца на 180° у адносінах да шляху, якім крочыў Адам, і тады мы пабачым шлях маральнага ўзыходжання.

Хрыстос аднаўляе нас праз пакору. Ён адкрывае Царства Нябеснае і кладзе ў яго падмурак самае жалоснае ўяўленне аб уласных вартасцях. Гэта супрацьлегласць таго, што мы бачым у гісторыі Старога Запавету. Старэйшыны, кніжнікі і законнікі лічылі сябе за вучняў Майсеевых; і фарысей (евангельскі) выйшаў на сярэдзіну храма і пачаў сябе хваліць. Але ж самалюбаванне з'яўляецца падзеннем, або, прынамсі, прыпынкам у маральным удасканальванні. І калі сам чалавек гэтага не заўважае, дык іншыя бачаць і належным чынам гэта ацэньваюць.

Сам Хрыстос падаў нам прыклад найвялікшае пакоры. Св. Рыгор Ніскі ў Слове 1 «Аб найвышэйшым шчасці» гаворыць: «Дзе найдзеш большую пакору — Цару істот увайсці ў суразмоўе з нашай існацю ўбогай? Цар над царамі, Пан над панамі з уласнай волі прыняў на сябе вобраз нявольніка; Суддзя сусвету робіцца даннікам пануючых; Госпад стварэнняў шукае прытулку ў прытоне, Усеабдымны не знаходзіць месца ў гасцініцы, але кладзеецца ў яслях бязмоўных жывёл, Чысты і Найцнатлівейшы прымае на сябе бруд чалавечае натуры, нясе на Сабе і ўсю ўбогасць нашую, даходзіць нават да выпрабавання смерцю. Ці бачыце вы меру разгульнае ўбогасці? Жыццё смакуе смерць; Суддзю вядуць на судзілішча; Гаспадар жыцця ўсяго існага падданы прысуду суддзі; Цар ўсёй сусветнай сілы не адхіляе ад Сябе рукі катаў». Апостал Павел гаворыць пра Хрыста:

Сябе спустошыў, вобраз раба прыняў (Флп. 2, 7). Пра Хрыста было прароцтва Ісаі, які сказаў: *і лёну, што заняўся тлець, не загасіць (Мц. 12, 20).*

Духоўнае ўбоства можа суіснаваць з матэрыяльнымі дабротамі, калі яны не апанавалі чалавека: *Усё мне можна, але не ўсё карысна: усё мне можна, але авалодаць мною не дам нічому (1 Кар. 6, 12).* Інакш, сказаў Хрыстос, якая карысць з багацця, калі яно нішчыць душу? *Бо якая ж карысць чалавеку, калі ён здабудзе ўвесь свет, але змарнуе сваю душу (Мц. 16, 26)?* На жаль, у 98% выпадкаў чалавека апаноўвае матэрыяльны дабрабыт. Юнаку, які жадае не проста пабожнасці, але дасканаласці, Хрыстос параіў раздаць маёмасць і пайсці ўслед за Ім: *калі хочаш быць беззаганны, пайдзі, прадай маёмасць тваю і раздай бедным; і будзеш мець скарб на Небе; і ідзі ўслед за Мною (Мц. 19, 21).*

2-ая запаведзь: ***Шчаслівыя тыя, хто плача: бо яны суцешацца.***

Шчаслівы той, хто, маючы цноты, забываецца на ўчарашняе і, гледзячы ў будучыню, бачыць свае недахопы са шчырай скрухаю. *Бо той смутак, які па Богу, неруплівае пакаянне ў збаўленнеператварае, а смутак свецкі смерць робіць (2 Кар. 7, 10).* Бог дае суцяшэнне і радасць чалавеку, які шкадуе аб сваіх грахах. Часам кажуць, што хрысціянская рэлігія — гэта рэлігія плачу, але гэта не так, хрысціянства — рэлігія радасці.

Так, цар Манасія, які не быў пабожны і пакланяўся ідалам, унес іх у храм, угнявіў Бога, і пагане паланілі іудзеяў. У палоне Манасія прыгадаў сваё служэнне ідалам і пачаў каяцца ў сваіх грахах і плакаць дзень і ноч. Госпад прыняў яго плач і змяніў гнеў на міласць, — вярнуў Манасію ў Іудзею і пасадзіў на царскі пасад (2 Пар. 3, 18-20). Пакаянная малітва Манасіі чытаецца ў Вялікі пост на Каноне св. Андрэя Крыцкага. Ніневіцяне даведаліся пра гнеў Божы і пачалі ўсім народам каяцца, маліцца, пасціць, — і Госпад пачуў іх малітву і адняў гнеў (Іона, 3). Апостал Пётр, быць можа, грашыў не менш за Іуду, але ён пакаяўся, плакаў аб сваіх грахах — і быў памілаваны Богам. Усялякі іншы плач Богу не мілы. Св. Ігнат (Бранчанінаў) у «Аскетычных вопытах» пісаў: «Дар плачу і слёз ёсць адзін з найвялікшых дарункаў Божых. Ён — дар нязбыўна неабходны нам дзеля нашага збавення. Дары прароцтва, празорлівасць, цудатворства — гэта адзнакі асаблівага дагаджэння Богу і прыхільнасці Божай, а дар замілавання і слёз — гэта прыкмета прынятага або прыймальнага пакаяння».

Але не кожны плач дае суцяшэнне. Паводле святога праведнага Іаана Кранштацкага, «плача бяссільная злосць, абуранае самалюбства, незаспакоеная прагнасць, прыніжаны гонар». Розны плач у праведніка і ў грэшніка. Калі плакаць па свеце, гэта можа давесці да душэўнага і цялеснага разладу. Тут паказальны прыклад Іуды, які цікавіўся не столькі вучэннем Хрыста, колькі матэрыяльнай

карысцю. Ён не меў зла, але кіраваўся прагаю нажывы, або смуткам па карысці гэтага свету. Іуда бачыў, што іудзеі хацелі пабіць Ісуса каменнем, але спадзяваўся, што ён атрымае грошы, а Ісус здолее ўцячы ад даганятых. Ён усвядоміў грэх і пайшоў у сінедрыён, але не атрымаў там суцяшэння па-за вераю Хрыста як Сына Божага — і павесіўся. Так смутак па карысці гэтага свету прывёў яго да смерці.

3-ая запаведзь: *Шчаслівыя рахманыя: бо яны атрымаюць у спадчыну зямлю*

Калі першая ступень руху да Бога выяўляецца ва ўбогасці духу, і пакора — недасяжная вышыня для чалавека, які прагне марнай славы, калі на другой ступені чалавек шкадуе і аплаквае грахі — і Госпад пасылае суцяшэнне, дык на трэцяй ступені знаходзіцца рахманасць, спалучананая з панаваннем над сабой. Чалавек, які ўсвядоміў свае правіны, не бачучы сваіх цнот, аплакаў іх, — ён імкнецца быць рахманым, нікога не абражаць, нікога не гнявіць. Рахманасць — цярплівае znяcенне крыўд, дараванне крыўдзіцелям, без гневу і абвінавачванняў. Гэта мастацтва над мастацтвамі, якое выяўляецца ў апанаванні бурлівых пачуццяў. Св. Іаан Лесвічнік гаворыць, што толькі мужны чалавек рахманы: «Рахманасць — гэта нязменны лад розуму, які і ў славе і ў няславе застаецца аднолькавы» («Лесвіца», Слова 24).

Прыклады рахманасці даюць Ісус Хрыстос і вялікія падзвіжнікі. *Навучыцеся ад мяне,* — гаворыць Хрыстос, — *бо я ціхі і лагоднага сэрца (Мц. 11, 29).* Яму не верацъ, узвозяць на Яго паклёп, кажуць, што Ён вылечвае сілаю вельзевула. Хто б не ўз'юшыўся? Калі Яго білі, Ён пакорліва адказваў: *калі блага Я сказаў, дакажы, што блага, а калі добра, за што б'еш Мяне (Ін. 18, 23).* І Ён маліўся на Крыжы за ўвесь свет. Св. Іаан Залатавусны ў Слове пра рахманасць гаворыць: «Існуе шмат цнот, якімі павінны валодаць хрысціянскія мужы, але больш за ўсіх рахманасць, бо толькі тых, хто ззяе ў ёй, Хрыстос называе рупліўцамі Божымі. Нам належыць, калі хтосьці зняважыць, або ўдарыць, або зробіць нешта жахлівае, стрываць ўсё высакародна, са спакойнай душою, думаючы аб тым, што рахманасць робіць паслядоўнікамі Бога». Услед за Хрыстом так рабілі пакутнікі, пакорліва і рахмана даруючы крыўдзіцелям. Іх судзіць і ўзнагароджвае Госпад: *Не помсціце за сябе, любыя, але дайце месца гневу. Бо напісана: Мне помста, Я аддам, кажа Госпад (Рым. 12, 19).*

Св. Іаан Залатавусны прыводзіць яскравыя прыклады рахманых: «Майсей, рахмана зносячы іудзейскую дурасць і ратуючы сваімі малітвамі ворагаў, атрымаў Нябесны гонар і добрую славу больш за іншых, і быў названы сябрам Божым; (...) Давід, які ашчаджаў ворагаў і няпрыяцеляў, здабыў перад Богам шмат прыхільнасці і любові. (...) А Павел і Пётр, якія праз гэтую цноту дасяг-

нулі Нябеснага скляпення, жылі ёю, заззялі рахманасцю больш, чым усялікімі іншымі дабротамі, вітаючы тых, хто іх ганіў, робячы дабро ворагам, часта ратуючы малітвамі тых, хто пабіваў іх каменнем, робячы так, яны ведалі, што гэта асабліва міла Богу, і больш за іншае дабро лічыцца на Небе за пабожнасць. (…) Бачучы таксама Сцяпана, які маліўся за ворагаў падчас небяспекі (Дзеі 7, 59), мы аднолькава здзіўляемся яго рахманасці і подзвігам. Дык, калі маем гэтулькі і такіх кіраўнікоў у дабрыні, будзем пабуджаць сябе і іншых ісці па іх слядах, і служыць рахманасцю Богу, які прымае гэтае служэнне з большай радасцю, чым усе астатнія цноты».

Пра старца схіярхімандрыта Гаўрыіла, падзвіжніка нашых дзён, яго духоўныя дзеці казалі, што яго асабліва вызначалі пакора і рахманаць, прастата: «… гэтай немудрагелістай святасці было зусім неўласцівае асуджэнне, яна была перапоўненая малітвай, любоўю, цнотаю, развагамі і той чароўнай лагодай, якую мы вобмацкам адчуваем, калі бярэм у рукі ластаўку або галубка» [Арх. Сімяон (Халмагораў). Схіярх. Гаўрыіл. СПб, 2010, с. 166].

4-ая запаведзь: *Шчаслівыя тыя, хто прагне праўды і смягне па ёй: бо яны спатоляцца*

На чацвёртай ступені духоўнага ўзыходжання — тыя, хто прагне праўды і смягне па ёй. Калі Хрыстос ў Палестыне выкладаў Сваё вучэнне, спя-

кота дасягала 50°- 60°, і аравійцы цэлы час смяглі. Улічваючы гэта, Хрыстос навучаў слухачоў, каб яны гэтаксама прагнулі бачыць і ведаць праўду, заўзята імкнуцца да яе.

Тыя, хто прагне праўды і смягне па ёй — гэта людзі, якія любяць чыніць дабро, яны выконваюць Запаведзі найвышэйшага шчасця ва ўласным жыцці як патрэбу хрысціяніна. Яны не лічаць сябе за праведнікаў, але глядзяць на сябе як на грэшнікаў і вінаватых перад Богам. Гэта тыя, хто з жаданнем і малітваю веры, як духоўнай ежы і пітва, прагнуць дабратворнага апраўдання праз Ісуса Хрыста і смягнуць па ім. Іларыён, мітрапаліт Кіеўскі, у «Слове аб Законе і Ласцы Божай», — лепшым творы старажытнарускай царкоўнай літаратуры, кажа, што Закон, дадзены Майсеем, — толькі папярэднік і слуга Ласкі і Праўды: «Найперш Закон, потым Ласка, найперш цень, потым Праўда» (СПб, 2006, с. 12). Імкненне да Божае Праўды выявілася ў Законе Божым наогул і ў Запаведзях у прыватнасці. *Насычуся, калі стану ў абліччы славы Тваёй (Пс. 15, 16),* — гаворыць псалмапевец Давід.

У чалавецтве жыло чаканне Праўды вечнай, ўпершыню абвешчанай прарокам Даніілам, які прадракаў: *і каб прыведзеная была праўда вечная (Дан. 9, 24),* г. зн. здарыцца апраўданне чалавека, вінаватага перад Богам, праз ласку і веру ў Госпада Ісуса Хрыста. Чалавецтва вязнела ў няволі граху, і, паводле прароцтва Данііла, заставалася семдзесят

сядмін да прыходу Праўды Вечнай, Хрыста, які прыйшоў і пакрыў грахі ўсіх. Калі мы не будзем мець веры ў Хрыста, дык застанемся ў рамках закону Старога Запавету і не атрымаем адпушчэння грахоў.

У Старым Запавеце прарок Данііл сказаў пра надыход Праўды, а ў Новым Запавеце апостал Павел — пра Праўду абʼяўленую. Яна заключаная ў тым, каб:

галоднага накарміць	намаўляючы, навярнуць грэшніка
смяглага напаіць	навучыць праўдзе таго, хто яе не ведаў
голага апрануць	добраму і бліжняму даць параду
вязніцу наведаць	маліцца за іх
хвораму дапамагчы	суцешыць засмучанага
падарожніку даць прытулак	не помсціць за зло
памерлага пахаваць	шчыра дараваць крыўды

і чакаць памілавання ад Вечнага Суддзі на Судзе Божым.

Апостал Павел сказаў: *Праўда ж Божая праз веру ў Ісуса Хрыста ва ўсіх і для ўсіх вернікаў; бо няма розніцы, бо ўсе зграшылі і пазбаўленыя славы Божае, апраўданыя задарма ласкаю Ягонай, адкупленнем, што ў Хрысце Ісусе, Якога аддаў Бог на ахвяру ачышчэння праз веру, у Крыві Ягонай, дзеля выяўлення праўды Сваёй, для даравання грахоў, учыненых раней (Рым. 3, 22-25).*

Гэтаксама, як насычэнне цялеснае спыняе пачуццё голаду і смагі, духоўнае насычэнне азначае ўнутранае суцішэнне памілаванага грэшніка, а таксама набыццё сілы для добрых ўчынкаў, якую дае ласка апраўдальная.

Але поўнае насычэнне душы, створанай дзеля таго, каб мець асалоду праз Бога, настане ў вечным жыцці.

5-ая запаведзь: *Шчаслівыя літасцівыя: бо яны памілаваныя будуць*

Тыя, хто выконвае Запаветы найвышэйшага шчасця, робяцца літасцівымі. Яны імкнуцца дапамагчы ўсім, чым могуць. Пра справы міласці святой Іаан Залатавусны сказаў так: «Розны вобраз літасці і шырокая гэта запаведзь».

Стары Запавет не ведаў літасці, ён заспакойваў толькі асабістыя эгаістычныя імкненні, таму ў часы Старога Запавету панавалі варожасць і нянавісць.

У Першапачатковай Царкве ўсе былі як браты і сёстры, мелі адзін розум і адно сэрца. Гэтая братэрская любоў выяўлялася ў агульнай маёмасці, бяседах і добрых справах хрысціян, у дапамозе бліжнім, чым толькі льга.

Галоўныя справы міласці падзяляюцца на два віды:

1. Міласць цялесная. Пра яе гаворыцца ў прыпавесці пра Госпада, Які ўсядзе на пасадзе

Славы Сваёй і падзеліць усіх па правы і левы бок. Адным наканаванае было Царства Нябеснае: *Тады скажа Цар тым, хто праваруч Яго: прыйдзіце, благаслаўлёныя Айца Майго, наследуйце Царства, прызначанае вам ад стварэння свету. Бо хацеў Я есці, і вы накармілі Мяне, смяг, і вы напаілі Мяне, быў здарожаны, і вы прынялі Мяне. Быў голы, і вы апранулі Мяне, быў хворы, і вы наведалі Мяне, быў у вязніцы, і вы прыйшлі да Мяне. (Мф. 25, 34-36).* Калі тое было? Госпад сказаў, што калі гэта было зроблена аднаму з братоў меншых, дык, значыць, таксама і Яму. А ў вечны агонь пайшлі тыя, хто не рабіў спраў літасцівых: *Бо Я быў галодны, і вы не далі Мне есці, смяг, і вы не напаілі Мяне, быў здарожаны, і не прынялі Мяне, голы, і не апранулі Мяне, быў хворы і ў вязніцы, і не наведалі Мяне. Тады і яны скажуць Яму ў адказ: Госпадзе! Калі мы бачылі Цябе галоднага, ці засмяглага, ці здарожанага, ці голага, ці хворага, ці ў вязніцы — і не паслужылі Табе? Тады скажа ім у адказ: сапраўды кажу вам, як не зрабілі гэтага аднаму з гэтых меншых — не зрабілі і Мне. І пойдуць тыя на вечную пакуту, а праведнікі ў жыццё вечнае (Мц. 25, 31-46).* Калі тое было? Госпад сказаў, што, паколькі гэта не было зроблена аднаму з меншых, дык не было зроблена і Яму.

Лічыцца нават пададзеная шклянка вады: *І хто напоіць вас чашаю вады дзеля Мяне, за тое, што вы Хрыстовыя, сапраўды кажу вам, не страціць узнагароды сваёй (Мк. 9, 41).*

Марыя Магдаліна, якая абмыла ногі Хрыста мірам у доме фарысея Сымона (Лк. 7, 37-38), мела гонар першаю сустрэць Хрыста пасля Яго Уваскрасення. Учарашні злачынца Закхей, які прыняў Хрыста ў сваім доме, стаў епіскапам (Лк. 19). Мастацкая літаратура адлюстроўвае колішнюю традыцыю наведвання злачынцаў у турмах. Так, у рамане В. Гюго «Убогія» расказваецца пра тое, як наведванне астрогу епіскапам перамяніла грэшніка. І раней прынята было наведваць вязніцы і рабіць карыснае для зняволеных. У мастацкай літаратуры вядомым сімвалам збаўлення праз міласэрнасць і любоў стала цыбулінка — прыпавесць, якую нагадала Грушанька Алёшу Карамазаву.

2. Міласць духоўная выяўлецца ў тым, каб адвярнуць грэшніка ад шляху аблуды. Таму, хто здзейсніў гэта, даруецца шмат грахоў. Належыць таксама навучыць бліжняга парадай, маліцца за яго, дараваць крыўды і не адплачваць злом за зло.

6-ая запаведзь: ***Шчаслівыя чыстыя сэрцам: бо яны пабачаць Бога***

Сэрца — крыніца нашых добрых спраў. Гэта рэзервуар, з якога выліваюцца добрыя і благія задумы. *Добры чалавек з добрага скарбу сэрца свайго выносіць добрае, а благі чалавек з благога скарбу сэрца свайго выносіць благое; бо ад перапоўненага сэрца гавораць вусны яго* (Лк. 6, 45). Не меншае зло адчуваюць тыя, хто мае дачыненне

з благім чалавекам. Чысціня сэрца ўласцівая чалавеку, які чысты ў сваіх ўчынках, думках і не прывязаны да зямных рэчаў. Гэта усеабдымная цнота, якая ахоплівае ўсяго чалавека знутры і звонку, і ён, трываючы ў ёй, праводзіць цнатлівае жыццё.

Шчырасць — гэта ніжэйшая ступень чысціні, пра якую гаворыць Хрыстос у шостай Запаведзі. Гэта цнота ніжэйшага ўзроўню, бо чалавек можа быць чысты сэрцам, шчыры, але слабы і лёгка паддавацца спакусе граху. Шчыры чалавек не хітруе, яго стан супрацьлеглы ханжаству, крывадушнасці, калі чалавек можа прыгожа гаварыць, а ў сэрцы хаваць злосць, трымаць «камень за пазухай». Прыкладамі гэтага з'яўляюцца евангельскія фарысеі, якія выказвалі сябе вонкава прыемнымі людзьмі, але ніколькі не займаліся ачышчэннем свайго сэрца.

Чысціня сэрца — гэта недапушчэнне нават думкі благой або жадання, якія не аселяцца ў ім. Хай сабе горкая, але лепей праўда, чым салодкая мана. Чысціня сэрца з'ўляецца абавязковай умовай для яднання з Богам. У Евангеллі сказана: *тады праведнікі заззяюць, як сонца, у Царстве Айца іх (Мц. 13, 43).* За сваю душэўную чысціню чалавек атрымае вялікую ўзнагароду — ён пабачыць Бога. Бачыць Бога — невымоўная раскоша, таму што Бог — Крыніца раскошы.

Гэтак, пра прап. Сілуяна Афонскага, які на працягу 46 гадоў жыў і працаваў на Афонскай гары,

у Рускім манастыры святога Шматпакутнага Панцеляймона, апавядаюць, што ён ніколі не дапускаў у сэрцы сваім думак, якія маглі б угнявіць Бога: «Жыў на зямлі чалавек, муж велізарнай сілы духу. Імя яму Сімяон. Доўга ён маліўся з нястрымным плачам: «Злітуйся з мяне», але не слухаў яго Бог. Мінула доўгая чарада месяцаў гэтае малітвы, і сіл у яго душы забракла; ён дайшоў да адчаю і выгукнуў: «Ты няўмольны!». І калі разам з гэтымі словамі ў яго збалелай ад роспачы душы нешта надарвалася, ён раптам на імгненне пабачыў жывога Хрыста; агонь запаланіў сэрца ягонае і ўсё цела з такой сілаю, што, калі б праява пратрывала яшчэ імгненне, ён бы памёр. Пасля ён ужо ніколі не мог забыць невымоўна лагодны, бязмежна замілаваны, радасны, поўны недасяжнага спакою пагляд Хрыста, і праз наступныя доўгія гады свайго жыцця нязменна сведчыў, што Бог ёсць Любоў, Любоў бязмерная, недасяжная для розуму» (Іераман. Сапрон Сахараў. Старац Сілуян. СПб: Таварыства памяці ігуменні Таісіі, 2007).

На пытанне аб тым, што з'яўляецца прыкметаю сардэчнай чысціні, прап. Ісаак Сірын дае такі адказ: «Калі хтосьці ўсіх людзей бачыць добрымі і ніхто не падаецца яму нячыстым і апаганеным, тады ён сапраўды чысты сэрцам» (Слова 21). Апостал Пётр навучаў: *заўсёды любіце адзін аднаго ад чыстага сэрца (1 Пят. 1, 22).*

Чысціня даецца праз Хрышчэнне, але жыццё ёсць жыццё, занадта вялікімі сіламі валодае зло. У

далейшым на працягу нашага жыцця ачышчэнне сэрца мы павінны суадносіць са Святым Пісаннем, яно — святло на нашых жыццёвых пуцявінах. І мы з дапамогаю Яго гонім з сэрца ўсе злыя думкі.

7-ая запаведзь: *Шчаслівыя міратворцы: бо яны будуць звацца сынамі Божымі*

Гэтая запаведзь самым неасрэдным чынам звязаная з пачуццём міралюбнасці. Чалавек хоча адчуваць мір не толькі ва ўласнай душы, але і ў сям'і, у грамадстве, а знешнія абставіны цэлы час выводзяць яго з раўнавагі.

Шматлікія мільёны людзей гінуць, бо ў душы чалавека няма міру. Зямля знаходзіцца пад цяжарам варожасці і дзяльбы, таму Госпад як Міратворац сышоў і прымірыў грэшнае чалавецтва з Богам і між сабою. У ноч Раства Жыхары Неба апявалі гэтую падзею: *Слава ў вышынях Богу, і на зямлі мір, сярод людзей добрае волі (Лк. 2, 14).* Хрыстос адмовіўся ад усіх правоў, якія належаліся Яму як Богу і як Чалавеку, толькі каб прымірыць чалавецтва. І таму мы павінны адмаўляцца ад усіх сваіх правоў, каб запанаваў мір. Галоўнае, каб не было абражанага самалюбства, як гэта, напрыклад, здарылася ў Апосталаў, калі яны хацелі звесці агонь з Неба, каб знішчыць паселішча, якое не прыняло Хрыста. Але гэта не азначае адмаўлення ад гра-

мадскага служэння. «Што дае найбольшую асалоду для людзей мірнага жыцця? — пытаецца св. Рыгор Ніскі. — Пра якую жыццёвую прыемнасць не пачнеш казаць, каб яна прыносіла асалоду, патрэбны мір; бо, калі будзе ўсё, што цэніцца ў гэтым свеце: багацце, здароўе, жонка, дзеці, дом, род, прыслуга, сябры, зямля, мора, і тое, і іншае, што ўзбагачае сваімі дарамі, сады, звярыныя паляванні, купальні, месцы для спаборніцтваў і цялесных практыкаванняў, для прахалоды і забаў, усе, што ні ёсць, вынаходніцтвы, здзейсненыя ў імя асалоды; прыкладзі да гэтага забаўляльныя відовішчы, музыку, і калі ёсць нешта іншае, чым расквечанае жыццё раскошных; калі будзе ўсё гэта, але не будзе пры тым аднаго дабра — міру, якая карысць з усіх гэтых даброт, калі асалоду з іх перапыніць вайна? Таму мір і сам прыемны для тых, хто раскошуе ў ім, і надае асалоды ўсяму, што мае вартасць у гэтым свеце. Мір сам па сабе для тых, хто мае розум, даражэйшы за ўсялякае руплівае імкненне да яго здабыцця. Таму надмернасць Божага чалавекалюбства можна спазнаць па тым, што дабром адорвае Ён не за працу і поты, але за асалоды, можна сказаць, і радасці; бо з усяго, што радуе, найважнейшае ёсць мір, які кожнаму пажадана мець у той меры, каб не толькі самому карыстацца, але, з увагі на вялікае багацце гэтага, улучаць і тым, хто не мае. Бо сказана: *шчаслівыя міратворцы*, а міратворац — той, хто дае мір іншым» (Слова 7, Пра найвышэшае шчасце).

Мы павінны заўжды паводзіць сябе лагодна, не ствараць нагоды да спрэчак. Калі здарылася спрэчка, трэба яе спыніць, нават ахвяруючы ўласнымі інтарэсамі, калі толькі гэта не супрэчыць абавязку і нікому не шкодзіць. Важна імкнуцца суцішыць варожасць іншых, молячы Бога аб прымірэнні.

Абяцанне ўсынаўлення Богам знамянуе вышыню подзвігу і ўзнагароды, паводле падабенства да Сына Божага, які сышоў, каб прымірыць чалавецтва з правасуддзем Божым.

8-ая запаведзь: *Шчаслівыя выгнаныя за праўду: бо іх ёсць Царства Нябеснае*

Калі мы будзем спрыяць міру, дык благое нас не кране, а калі мы паўстанем супраць благога, дык і яно паўстане супраць нас. Св. прап. Іаан Кранштацкі пісаў: «Заўсёды благія, разбэшчаныя людзі ненавідзелі праведных і гналі, і будуць ненавідзець і гнаць» («Гутаркі пра найвышэйшае шчасце»). Пераслед, нібы цень, паўсюль імкне ўслед за праведнасцю, падобнай да сонца: *Калі б вы былі ад свету, дык свет любіў бы сваё, але, калі вы не ад свету, але Я абраў вас ад свету, за гэта і ненавідзіць вас свет* (Ін. 15, 19).

Ад веку нечувана, каб людзей, што адмовіліся ад свету, любіў бы ўвесь свет, каб не ганілі іх і не плявузгалі на іх. Адмаўляючыся ад гэтай нянавісці, паўстаючы ў самаабарону, дамагаючыся

любові ад свету, служачы яму свецкімі ўчынкамі і адукацыяй дзяцей свету, свецкай дабрачыннасцю і ўсім тым, чаго ад яго крывадушна вымагае дух часу, і, такім чынам, дзеля гэтага забываючыся на адзінае — ачышчэнне свайго сэрца, аддаючыся цалкам знешнім учынкам, манах здраджвае свайму найістотнейшаму прызванню, не хоча быць паслядоўнікам Хрыста, адмаўляецца ад нясення крыжа, узятага ім дабравольна, адмаўляецца ад здабыцця Царства Божага ўнутры сябе, мяняючы яго на царства князя гэтага свету, гэтага веку. Няхай яго лаюць, ганяць, абліваюць памыямі, якія выліваюцца з сэрцаў хаяльнікаў, — разумны і цвярозы чалавек не спыніцца на вуліцы перад п'яным валацугам, які пачне яго бэсціць толькі за тое, што ён не выкачаўся ў брудзе гэтаксама, як гэты прапойца. *Не адказвай дурню паводле дурацi яго, каб самому не прыпадабніцца да яго, але адказвай дурню паводле дурасці яго, каб не стаў ён разумнікам у вачах тваіх (Прып. 26, 4-5).*

Маральнае вучэнне перамагае сучасных служак д'ябла і антыхрыста святасцю і ціхмянай любоўю вызнаннікаў Хрыста. *Гора жыхарам зямлі і мора, бо зышоў да вас д'ябал у гневе вялікім, ведаючы, што часу мае няшмат (Аб'яўл. 12, 12).* Гэтая зброя ў чыстых руках, як і само Хрыстовае імя, як Крыж Хрыстовы, — адна можа адолець усю незлічоную пякельную раць, што ўзброілася супраць тысячагадовае носьбіткі сапраўднай Хрыстовай Апостальскай веры.

Госпад прымае ахвяру ад сэрца, поўнага любові. Менавіта такую ахвяру прынёс Авель, і за яе Каін зненавідзеў яго. Язэпа зненавідзелі яго браты і разлучылі з улюбёным бацькам. У Егіпце яго чакалі новыя выпрабаванні. У вязніцу Язэп трапіў з-за таго, што захаваў цнатлівасць. Вядомая гісторыя шматпакутнага Іова, які страціў шмат, але ўстояў у пабожнасці.

Патрыярх Гермаген (гады Патрыяршага служэння 1606-1612), нязломны барацьбіт за чысціню Праваслаўя і адзінства Рускае зямлі, служыць для рускага чалавека яскравым прыкладам палымянай веры і любові да свайго народу. Ён здзейсніў шматлікія подзвігі ў Смутныя часы, калі Рускую зямлю апанавалі беды ўнутранага бязладдзя, паглыбленыя польскім нашэцем, самааддана зберагаў Рускую дзяржаву, і словам, і ўчынкамі бараніў праваслаўную веру ад лацінства, адзінства нашай Бацькаўшчыны — ад унутраных і знешніх ворагаў; больш за дзевяць месяцаў гараваў ён у цяжкой няволі і прыняў пакутніцкую смерць ад голаду і смагі. Святасць Патрыяршага подзвігу, як і ўсяе яго асобы, пазней была асвечаная звыш — пры ўскрыцці ў 1652 годзе ракі з мошчамі прападобнага. Праз сорак гадоў пасля смерці Патрыярх Гермаген ляжаў, як жывы, а ў 1654 годзе яго нятленныя мошчы былі перанесеныя ва Успенскі сабор Маскоўскага Крамля.

9-ая запаведзь: ***Шчаслівыя вы, калі абняславяць вас і будуць гнаць, і нагавораць пра вас усялякага благоцця праз Мяне: Радуйцеся і весяліцеся, бо вялікая ўзнагарода ваша на Небе***

У Запаведзі гаворыцца пра пакутніцкі подзвіг, які выяўляецца ў тым, каб з радасцю прыняць няславу, выгнанне, беды і самую смерць за імя Хрытовае і за сапраўдную праваслаўную веру. Пакутнікі сваёй дабравольнай смерцю за веру засведчылі моц дадзенага ім найвышэйшага шчасця, якое ператварыла пакуты ў радасць; гэтым самым яны сведчаць аб перамозе Хрыста над смерцю. Пакутніцтва — гэта адбыццё Хрытовага шляху, паўтарэнне Пакут і адкупіцельнай Ахвяры Хрыста. Гэтак, першапакутнік Сцяпан перад сінедрыёнам, які яго асудзіў, *зірнушы на Неба, пабачыў славу Божую і Ісуса, што стаяў праваруч Бога, і сказаў: вось, бачу Нябёсы расчыненыя і Сына Чалавечага, што стаіць праваруч Бога (Дзеі 7, 55-56).* Падчас пакут для яго адчынілася Царства Нябеснае.

Пакутніцтва ў першыя стагоддзі хрысціянства выступіла як працяг Апостальскага служэння. Адзінаццаць з дванаццаці Апосталаў (апрача Іаана Багаслова) скончылі жыццё пакутніцкім подзвігам.

Апостал Павел распавёў аб сабе: *Хіба яны Служыцелі Хрыстовыя? Не ад вялікага розуму кажу, я — больш. У працы — больш, у ранах — нашмат больш, у астрогах — з ліхвою, і шмат разоў пры смерці. Ад Іудзеяў пяць разоў дастаў па*

сорак [удараў] без аднаго, тройчы білі мяне кіямі, аднойчы каменнем закідалі, тройчы карабель перакуліўся са мною, ноч і дзень прабыў у глыбіні; шмат пешых падарожжаў: беды ад разбойнікаў, беды ад землякоў, беды ад паганцаў, беды ў гарадах, беды ў пустынях, беды на моры, беды ад фальшывых братоў, у працы і знямозе, часта без сну, у голадзе і смазе, часта ў пастах, у холадзе і галечы. Апрача знешніх паўсядзённых напасцяў, на мне клопат пра ўсе Цэрквы. Хто знемагаецца, каб і я не знямогся? Хто спакушаецца, каб і я не распаліўся? Калі маю хваліцца, дык буду хваліцца маёй немаччу. Бог і Айцец Госпада нашага Ісуса Хрыста, благаславёны навек, ведае, што я не лгу. У Дамаску язычніцкі намеснік Арэфы цара пільнаваў горад Дамаск, жадаючы схапіць мяне: і я праз акно ў кашы спушчаны быў па сцяне і выслізнуў з рук ягоных (2 Кар. 11, 23-32).

У найвышэйшай ступені абяцае Госпад узнагароды за тыя нягоды, якія перажывае чалавек тут, на зямлі. Чалавек, які выканаў сем папярэдніх запаведзяў, ужо не з гэтага свету. І цяпер ён павінен не выказаць маладушша ў ліхіх прыгодах, што напаткалі яго, падобных да тых, якія гналі апостала Паўла (2 Кар. 11, 23-32), і выявіць цвёрдасць і трываласць, мужнасць і цярплівасць. Тады атрымае ён узнагароду перад Богам. Апостал Павел піша пра веліч узнагароды Госпада і невымоўную радасць, якая чакае чалавека ў Небе, калі ён выканаў Запаветы: *Ведаю чалавека ў*

Хрысце, які чатырнаццаць гадоў таму (ці ў целе, ці па-за целам — не ведаю: Бог ведае) падхоплены быў да трэцяга неба. І ведаю гэткага чалавека, (ці ў целе, ці па-за целам — не ведаю: Бог ведае), які быў узяты ў рай і чуў невымоўныя словы, якіх чалавеку нельга казаць (2 Кар. 12, 2-4).

X. ПРА ЛЮБОЎ

Повязь веры і любові

Вера і надзея — часовыя цноты, бо яны толькі ў гэтым свеце дазваляюць наблізіцца да Бога. Любоў вечная. Любоў — гэта трэцяя хрысціянская цнота, большая за ўсе астатнія. *Цяпер мы бачым, нібы ў люстры, цьмяна, тады ж тварам у Твар: цяпер разумею я часткова, тады ж спазнаю, гэтаксама, як і сам быў пазнаны. Бо сёння трываюць вера, надзея, любоў — гэтыя тры, але большая з іх — любоў (1 Кар. 13, 12-13).* Мы верым, таму што не ў стане даказаць, будуем меркаванні, часткова пазнаем Бога, глядзім, нібы праз мутнае шкло, але настане час, калі мы зможам пабачыць Яго тварам у Твар. У тагасветным жыцці ўсё грунтуецца на любові да Бога, бо яна вечная.

У грэцкай мове і ў іншых мовах любоў называецца рознымі словамі: агапэ — хрысціянская любоў, сторгэ — любоў да родных, філія — да сяброў, эрас — цялесная любоў.

Пра хрысціянскую любоў, яе веліч і вечнасць, апостал Павел гаворыць ва ўсім 13 раздзеле Першага Паслання да Карынфянаў: *Калі я гавару мовамі чалавечымі і анёльскімі, а любові не маю, дык я медзь звінячая і кімвал брынклівы. І калі я маю прароцтва, і мне адкрытыя ўсе таямніцы і ўсе думкі, і калі маю ўсю веру, каб і горы перастаўляць, а не маю любові, дык я нішто. І калі я раздам усю маёмасць маю, і аддам цела маё на спаленне, а любові не маю, дык няма мне ніякае карысці (1 Кар. 13, 1-3).* І далей: *Любоў церпіць доўга, міласэрная, любоў не зайздросціць, любоў не заносіцца, не ганарыцца, не вывышаецца, не шукае свайго, не раздражняецца, не замышляе благога, не радуецца з крыўды, але цешыцца з праўды: усё пакрывае, усяму дае веры, усяго спадзяецца, усё трывае. Любоў ніколі не чэзне, нават калі прароцтвы перастануць збывацца, нават калі мовы змоўкнуць, нават калі розум спустошыцца (1 Кар. 13, 4-8).*

Знешняя крыніца любові — Бог, які ёсць Любоў. Калі вы любіце адзін аднаго, дык вы ведаеце Бога. Унутраная крыніца любові — наша добрае сэрца. Трэба аддаць яму шмат увагі, зрабіць яго шчодрым на любоў, лагодным, усёдаравальным, выхаваць яго. Яно як рэзервуар. З добрага сэрца праліваюцца добрыя задумы. З благога сэрца зыходзяць благія задумы: забойствы, крадзяжы, чэрствасць, скамянеласць, неспагалівасць.

Калі любоў ёсць у нашым сэрцы, дык мы робім учынкі і справы любові. Ці мелі любоў дзе-

ці Іллі? Не, яны мелі няўдзячныя сэрцы. Авесалом, сын Давідаў, таксама не меў любові, сэрца ў яго было благое, неспагадлівае да роднага бацькі. Кажа наймудрэйшы: «Сыне мой, больш за ўсё беражы сэрца».

Вера, спалучаная з любоўю, — вера дзейная, належыць да сэрца. Але калі вера разумовая, калі гэта так званая тэарэтычная вера, вера без той любові, што належыць да сэрца, — гэта вера халодная, д'ябальская. Апостал Якуб кажа пра мёртвую, д'ябальскую веру: *Што карысці, браты мае, калі хто кажа, што ён мае веру, а ўчынкаў не мае; хіба можа вера збавіць яго? Калі брат або сястра будуць голыя і пазбаўленыя будуць штодзённай ежы, а нехта з вас скажа ім: ідзіце ў спакоі, грэйцеся і насычайцеся, але не дасць ім патрэбнага для цела: што за карысць? Гэтак і вера, калі не мае ўчынкаў, сама па сабе мёртвая (Як. 2, 14-17).*

Сектанты, вернікі іншых канфесій сцвярджаюць, што дастаткова адной толькі веры. Але вера без любові і добрых учынкаў недастатковая. *Хто не любіць брата, трывае ў смерці (1 Ін. 3, 14).* Чалавек, паддадзены грахам, не здольны нават аднойчы зрабіць добры ўчынак, а тым болей — на працягу доўгага часу. Прыкладамі могуць служыць святыя Дыянісій Студыйскі, Кіпрыян Карфагенскі, у якіх нават не было ворагаў: так жылі першыя хрысціяне.

Пытанне рацыяналістаў і атэістаў: ці не дастаткова адной любові без веры? Не, любоў не

здольная чыніць дабро без веры, бо прырода чалавечая скажоная і накіраваная не толькі на дабро, выявілася схільнасць да благога. Ёсць людзі, якія любяць, але сваю любоў не пацвярджаюць добрымі ўчынкамі, наадварот, парушаюць Запаведзі. Такая любоў — крывадушная. *калі хто любіць Мяне, слова Маё выконвае: і Айцец Мой палюбіць яго, і Мы да яго прыйдзем і створым у Ім жытло (Ін. 14, 23).* Найлепшым знешнім сведчаннем рэлігійных перакананняў з'яўляюцца паводзіны хрысціяніна, пастыра. Сапраўдны плён хрысціянскае веры — любоў і адпаведныя ёй добрыя ўчынкі. Гэтага можна чакаць толькі ад хрысціяніна. Ісус Хрыстос казаў: *Хто мае Запаведзі Мае і выконвае іх, той любіць Мяне, а хто Мяне любіць, таго і Айцец Мой любіць будзе, і Я палюблю яго і з'яўлюся яму Сам (Ін. 14, 21).* Плён веры — любоў і адпаведныя ёй справы. Гэта добрыя ўчынкі, якія мы павінны выконваць, і яны павінны быць для нас жаданыя і выконвацца свабодна, без аніякага прымусу.

Сродак для вызначэння таго, што добра, а што дрэнна, ёсць у душы кожнага чалавека.

Апостал Іаан Багаслоў у Евангеллі прыводзіць наступную гісторыю. Да Хрыста прывялі жанчыну, заспетую на пралюбадзействе. Хрыстос сказаў іудзеям: *«На кім з вас няма граху, хай першы кіне ў яе камень».* І яны, выкрытыя сумленнем, пачалі разыходзіцца. Тады Хрыстос сказаў ёй: *«Дзе ж твае абвінаваўцы? Ніхто не асудзіў цябе? І Я цябе не абвінавачваю, ідзі і больш не грашы»*

(Ін. 8). Сумленне — крыніца, якая непадманна сведчыць, што добра, а што дрэнна. *Бо калі народы, што не маюць закону, па прыродзе законнае робяць, яны, законаў не маючы, самі сабе закон: бо выяўляюць рэчы законныя, напісаныя ў сэрцах сваіх, у суладным з імі сумленні, і між сабою думкамі абвінаваўчымі або апраўдальнымі (Рым. 2, 14-15).* Калі чалавек парушыў маральны закон, тады сумленне будзе выкрываць яго ўдзень і ўночы. Сумленне — гэта анёл, які нясе суцяшэнне, і суддзя, які адважвае пакаранне. Сумленне — усведамленне маральнай патрэбы, яно знаходзіца ў розуме, сэрцы і волі. Не трэба ніякіх высноў, каб, запытаўшыся ў сумлення, атрымаць адказ. Ачышчэнне сэрца — любоў да праўды, справядлівасці, узгадненне практычных учынкаў з тэарэтычнымі ведамі — высвечаваюць розум і свядомасць. І наадварот, бурлівая плынь пачуццяў, якая праносіцца над чалавекам, імкне з вялікай сілаю і прамінае, і тады чуецца дакорлівы голас сумлення. Унутраны Закон ёсць і ў язычнікаў.

Але аднаго жыццёвага вопыту недастаткова. Пад уплывам бурлівых пачуццяў унутраны Закон парушаецца. Гэта, напэўна, добра ўсведамлялі Язэпавы браты, якія прадалі яго ў няволю. Калі б чалавек не парушаў унутраны Закон, дык не спатрэбіўся б і знешні. Таму паўстала неабходнасць знешняга Закону, блізкага розуму і сэрцу чалавека. Такім чынам, існуюць розныя сродкі, каб адрозніць добрыя справы ад благіх: Закон Божы

ўнутраны, або сведчанне сумлення; Закон Божы знешні, або Запаветы Божыя.

Прыкладаў недастатковасці ўнутранага Закону ў Святым Пісанні багата: апісана, як вернікаў скідалі ў мора (у Кнігах пракрокаў Ісаі, Іоны), у роў з ільвамі, у вогненную печ (у Кнізе прарока Даніла), закідалі каменнем дыякана Сцяпана (у Дзеях Апосталаў), усё адымалі ў прарока Іова (у Кнізе прарока Іова), ссеклі галаву Іаану Прадечы (у Евангеллі ад Мацвея і ад Марка). Святы Іаан Залатавусны выкрываў паганства неаднойчы.

Б. Паскаль падзяляў людзей на «тры гатункі»: адныя шукалі Бога, знайшлі і супакоіліся, іншыя не знайшлі Яго і на тым супакоіліся, трэція шукалі, але не знайшлі, аднак не супыніліся. Адпаведна першыя — разумныя і шчаслівыя, другія — неразумныя і нешчаслівыя, трэція — нешчаслівыя, але разумныя. Запаведзі Закону Божага дазваляюць чалавеку, які заблукаў, знайсці Бога.

Запаведзі Закону Божага

Запаведзі Закону Божага — гэта дзесяць асноўных законаў, якія, паводле Пяцікніжжа, дадзеныя былі самім Богам Майсею, у прысутнасці сыноў Ізраіля, на гары Сінай на пяцідзесяты дзень пасля Выхаду з Егіпта (Вых. 19, 10-25). Сінай нагадвае Алтар Усявышняга, велічныя Словы Якога былі пачутыя сярод хмар, маланак і грымотаў. Яны былі простыя і для ўсіх зразумелыя, але неслі высокую

маральную вартасць. Госпад на Сінаі знешнім чынам нагадвае нам унутраны Закон, прыродна ўласцівы нашай душы. Сам Госпад накрэсліў «Дзесяціслоў» на дзвюх каменных скрыжалях і перадаў іх Майсею. Запаведзі, інакш Дзесяціслоў, (Вых. 20, 2-17; Друт. 5, 7-21), былі падзеленыя на дзве скрыжалі: любоў да Бога і любоў да бліжняга. Чалавек павінен навучыца любіць паводле закону Старога Запавету. У Новым Запавеце ў Запаведзях найвышэйшага шчасця любоў будзе ўзнесеная на нечуваную вышыню. Ісус Хрыстос дасць Новую Запаведзь: *палюбі Госпада Бога твайго ўсім сэрцам тваім, і ўсёю душою тваёю, і ўсім разуменнем тваім: гэта ёсць першая і найвялікшая запаведзь: другая ж падобная да яе: палюбі бліжняга твайго як самога сябе: на гэтых дзвюх Запаведзях грунтуецца ўвесь закон і прарокі (Мц. 22, 37-40).*

Калі Майсей сышоў з гары пасля сарака дзён знаходжання на ёй і пабачыў, што народ скача вакол залатога цяльца, забыўшыся на Бога, ён страшэнна абурыўся і разбіў Скрыжалі з Божымі Запаведзямі аб скалу. Пасля, як народ раскаяўся, Бог загадаў Майсею вычасаць дзве новыя каменныя Скрыжалі і на іх напісаць дзесяць запаведзяў.

У дзесяці Запаведзях няма мовы аб любові да самога сябе, што і так зразумела чалавеку: *бо ніхто ніколі не меў нянавісці да свайго цела, але жывіць і грэе яго, як і Госпад Царкву (Эф. 5, 29),* і таму Госпад цэлы час абмяжоўвае празмерную

любоў да самога сябе: *Хто хоча ісці за Мною, няхай зрачэцца сябе, і возьме крыж свой, і ідзе следам за Мною (Мк. 8, 34).*

Любоўю да сябе трэба ахвяраваць дзеля любові да бліжніх: *Няма любові большае за тую, калі хто душу сваю пакладзе за сяброў сваіх (Ін. 15, 13),* а любоўю да сябе і бліжніх трэба ахвяраваць дзеля любові да Бога: *Хто любіць бацьку або маці больш за Мяне, не варты Мяне; і хто любіць сына ці дачку больш за Мяне, не варты Мяне (Мц. 10, 37).*

Абавязкі перад Богам складаюць 4 Запаведзі:

- пазнаваць і шанаваць сапраўднага Бога;
- пазбягаць фальшывага ўшанавання Бога;
- не парушаць ушанавання Бога ані словам;
- захоўваць лад і тэрміны ў справах ушанавання Бога.

Абавязкі ў адносінах да бліжніх складаюць 6 запаведзяў:

- любіць і шанаваць бліжніх;
- не чыніць шкоды жыццю бліжніх;
- не чыніць шкоды іх маральнай чысціні;
- не чыніць шкоды іх уласнасці;
- не шкодзіць ім словам;
- не жадаць ім шкоды.

Любоў да Бога — гэта аснова ўсяго Закону, калі мы палюбім Бога ўсім сэрцам, душою і розумам, дык нам не забракне сіл для выканання ўсяго Закону. Закон побач з намі, ён у нашым сэрцы, у душы, у нашых вуснах. Заканадаўца ўнутранага і

знешняга Закону той самы — гэта Бог. Некаторыя гавораць, нібыта біблейскі закон супярэчць нашай фізічнай прыродзе, — але гэтыя законы не толькі блізкія, яны тоесныя. *Дык што ж Закон: Ён дадзены з прычыны праступкаў (Гал. 3, 19).* Таму, звяртаючыся да іудзеяў, Апостал кажа: *«Вы маеце два законы, а язычнікі — адзін, але яны і асудзяць вас».* Госпад ведае нашыя намеры, і Ён цалуе добрыя намеры, дапамагае нам і дае ласку.

Запаведзі Закону Божага

(1) Я — Госпад Бог твой: няхай не будзе ў цябе іншых багоў, апрача Мяне.

(2) Не рабі сабе куміра, ані чагось падобнага да таго, што на небе ўгары, што на зямлі ўнізе, і што ў вадзе ніжэй за зямлю: не пакланяйся ім і не служы ім.

(3) Не кажы імені Госпада Бога твайго марна.

(4) Шануй дзень суботні, яго святкуй: шэсць дзён працуй і парабі ўсе справы свае: а сёмы дзень — субота [належыцца] Госпаду Богу Твайму.

(5) Шануй бацьку свайго і маці сваю, каб добра табе было і каб доўга жыў на зямлі.

(6) Не забівай.

(7) Не пралюбадзейнічай.

(8) Не крадзі.

(9) Не сведчы ілжыва супраць бліжняга свайго.

(10) Не пажадай сабе жонкі бліжняга свайго, не пажадай дому бліжняга свайго, ані поля яго, ані нявольніка яго, ані нявольніцы, ані вала яго, ані асла, аніякае жывёлы яго, анічога, што належыць бліжняму твайму.

1-я запаведзь Закону Божага:

Я — Госпад Бог твой: няхай не будзе ў цябе іншых багоў, апрача Мяне.

Да чаго дайшоў род чалавечы, калі ўжо Сам Госпад Бог нагадвае чалавеку аб Сабе, нават не праз Анёлаў. У гэтай Запаведзі Госпад указвае на наш галоўны абавязак — вучыцца пазнаваць Бога. Нават немыя істоты ведаюць голас свайго гаспадара, а чалавек забыўся на Бога Свайго. Мы павінны шанаваць Бога, будучы Яго стварэннямі. *Пазнае вол таго, хто яго набыў, і асёл яслі Гаспадара свайго; Ізраіль жа не ведае* [Мяне] *(Іс. 1, 3).* Светабудова, сусвет, суша, мора — гэта вялікая кніга, якая сведчыць аб Яго Быцці.

Бо нябачнае Яго, ад стварэння свету праз разважанне аб творах бачнымі робіцца, і вечная сіла Яго і Боства (Рым. 1, 20). Праўды Быцця Божага былі настолькі вядомыя, настолькі відавочныя для продкаў у розных рэлігіях, што адмаўленне Яго быцця ёсць самае відавочнае глупства. Пазнаючы Бога, мы павінны адначасова шанаваць Яго, услаўляць Яго целам і душой, таму што мы

створаныя Богам. Язычнікі спазналі Бога, але не ўславілі Яго, змарнелі і скаціліся ніжэй за немых істот.

Паводле М. В. Ламаносава, існуюць дзве кнігі пазнання Бога: Боскае Аб'яўленне — Святое Пісанне і Кніга натуральная, — чым больш мы будзем паглыбляцца ў твор, тым больш будзем разумець і пазнаваць Творцу. І. Ньютан, які сфармуляваў законы сусветнага прыцягнення і руху, адкрыў дыферэнцыяльнае вылічэнне, сказаў пра Бога: «Ён трывае вечна, існуе паўсюль; Ён усталёўвае даўжыню часу і прасторы». Батанік К. Ліней гаварыў пасля сваіх назіранняў над раслінамі, што, падобна да Майсея, бачыў след Бога, і яго душа перапоўнілася захапленнем: «Я бачыў след Божы ў Яго стварэнні; і паўсюль, нават у дробных незаўважных Яго творах — якая моц! якая мудрасць! якая невымоўная дасканаласць!». І. Кеплер ў працы «Пра гармонію сусветаў» казаў: «Дзякую Табе, Творца і Бог мой, за тое, што Ты падараваў мне гэтую радасць з твору Твайго, гэтае захапленне справамі рук Тваіх! Я адкрыў веліч спраў Тваіх людзям, наколькі здольны быў абмежаваны дух мой спасцігнуць Тваю бясконцасць».

Святое Пісанне ўжо не шукае Бога, але мае Яго.

Казаў дурны ў сэрцы сваім: Няма Бога! (Пс. 13, 1). Гэта вынік душэўнай ва́ды сэрца. Безупынна пазнаючы Бога, мы павінны аддаваць належнае Яму, ушаноўваць Яго, не проста дзеля цікаўнасці.

Але *ў благую душу не ўвойдзе мудрасць (Мудр. 1, 4)*. Таму належыць шанаваць Бога і ўнутрана, і вонкава, каб нішто не вымусіла нас адмовіцца ад веры ў Бога: *бо сэрцам верыцца дзеля праведнасці, а вуснамі вызнаецца дзеля збаўлення (Рым. 10, 10)*.

Нядзеля — гэта Вялікдзень Гасподні. У нядзелю трэба адкласці ўсе свае справы і пайсці ў храм Гасподні. Калі мы будзем захапляцца паўсядзённымі справамі, якія заўжды знойдуцца, дык скажуць, якая ж іх вера? Няхай ніякая благая цяга не апануе нас. Увесь знешні Закон для нас цалкам натуральны, але калі не выконваць першую запаведзь, дык і ўвесь Закон акажацца нам не па сілах.

Унутраная Пабожнасць азначае:

- верыць у Бога;
- баяцца Бога, але не жывёльным страхам, а ставіцца да Яго з глыбокай, трапяткой павагаю;
- хадзіць перад Богам, г. зн. цэлы час памятаць пра Яго;
- спадзявацца на Бога, мець у Ім супакаенне сэрца;
- любіць Бога;
- падпарадкоўвацца Богу;
- услаўляць Бога;
- пакланяцца Яму;
- дзякаваць Яму;
- заклікаць Бога.

Гэта дабратворны настрой, калі Бог заўжды адчуваецца ў сэрцы.

Знешняя Пабожнасць ўключае два абавязкі:

1. Вызнаваць Бога, каб нішто — ні ўціск, ні жыццёвыя нягоды — не маглі перашкодзіць сведчанню пра Бога. Усё набожнае жыццё хрысціяніна — гэта выраз унутранага пачуцця глыбкай, трапяткой пашаны.

2. Наведваць набажэнствы — у святочныя, нядзельныя дні і святы Гасподнія.

Грахі супраць першай Божай Запаведзі наступныя:

1. Бязбожжа — гэта не столькі прыкмета абмежаванасці розуму, колькі душэўная ва́да сэрца, адмаўленне Бога з жадання пазбыцца страху Суда.

2. Шматбожжа — політэізм, прызнанне шматлікіх уяўных багоў. У чалавечым сэрцы ёсць схільнасць да аднаго пачатку. Нават у Афінах сярод шматбожжа быў адзін помнік «Нябачнаму Богу».

3. Нявер'е — прызнанне Бога, але, нягледзячы на гэта, заўзятасць і дрэнныя ўчынкі, праз гэта — адмаўленне Божага Наканавання і Аб'яўлення. Дэістычны рух, які паўстаў у Англіі ў XVII стагоддзі, прытрымліваўся меркавання, паводле якога свет існуе на падставе натуральных законаў.

4. Ерась — скажэнне падстаў хрысціянскай дагматыкі, калі да вучэння веры прымешваюць погляды, спрэчныя з праўдай.

5. Раскол — ухіленне ад адзінага ўшанавання Бога, якое датычыцца не хрысціянскіх дагматаў, але абрадавых, вонкавых спраў.

6. Адчай — крызісны стан душы, калі чалавек зусім не спадзяецца на атрыманне ад Бога ласкі і збаўлення. Цяжкі стан душы, як вынік грахоў, які мяжуе са знеслаўленнем Святога Духа. І толькі вера і надзея, якія апускаюцца ў сэрца, рассейваюць гэты змрок.

7. Богаадступніцтва — павярхоўная вера, якая існуе датуль, дакуль чалавеку нічога не пагражае. У небяспецы чалавек адступаецца ад Бога, выракаецца сапраўднае веры дзеля свецкіх даброт.

Шмат хто адступаўся ад Бога. Калі ўзмацняўся ўціск, шмат хто адмаўляўся ад веры. За адно імя хрысціяніна расстрэльвалі.

8. Чарадзейства — калі чалавек верыць не столькі Божай ласцы, колькі злым духам і сягае па чары.

9. Забабоны — нікчэмная вера ў звычайныя прадметы, якія нібыта маюць боскую моц, калі спадзяюцца на яе замест Бога або баяцца яе. Гэта вельмі шырока распаўсюджана сярод хрысціян і азмрочвае самую веру.

10. Любоў да стварэння (людзей, жывёл) больш, чым да Бога: *Усё мне можна, але не ўсё карысна: усё мне можна, але авалодаць мною не дам нічому (1 Кар. 6, 12).*

11. Угодніцтва перад людзьмі — калі, каб дагадзіць людзям, ідуць супраць сумлення і Бога. Часта выяўляецца ў лісьлівых словах, пры гэтым імі нярэдка спрабуюць пакрыць нават заганныя ўчынкі. Забойца і ліслівец знаходзяцца на адным узроўні.

Крыважэрнымі і ліслівымі гідзіцца Госпад (Пс. 5, 7). А таксама: *Бо калі б я яшчэ людзям дагаджаў, дык не быў бы слугою Хрыстовым (Гал. 1, 10).*

12. Залішняе спадзяванне на людзей — калі хтосьці пакладаецца на ўласныя сілы і здольнасці або іншых людзей, а не на літасць Божую і Яго дапамогу: *праклёты чалавек, які спадзяецца на чалавека і ўзвядзе апірышча сваё на ім, і ад Госпада адступіць сэрца яго (Ер. 17, 5).*

13. Лянота — маці ўсіх грахоў.

Каб ідэальна выканаць запаведзь, неабходна пайсці на самаадрачэнне. Св. Васіль Вялікі гаворыць, што трэба не толькі скінуць з сябе старога Адама, які тлее ў цялеснай пажадзе, але і быць непадуладным спакусам свету, мець асуджэнне смерці, г. зн. усё жыццё, поўнасцю і без астачы, прысвяціць бліжнім і Богу. Тысячы падзвіжнікаў, адрынуўшы свае прыхамаці, сыходзілі ў пустыні і пакутавалі за Хрыста, Які сказаў: *Хто хоча ісці за Мною, няхай зрачэцца сябе, і возьме крыж свой, і ідзе следам за Мною (Мк. 8, 34).*

Тым, хто ідзе ўслед за Хрыстом, Госпад пасылае суцяшэнне: *Бо, паводле таго, як памнажаюцца ў нас пакуты Хрыстовыя, гэтак памнажаецца Хрыстом і пацеха нашая (2 Кар. 1, 5).* Праз ушанаванне Святых і Анёлаў мы ўшаноўваем Божую ласку.

Першая запаведзь — асноўная. Калі выканаць яе, дык ніякая іншая заўзятая цяга не апануе,

кажучы словамі св. Васіля Вялікага. У адваротным выпадку мы не выканаем ніводнае Запаведзі, таму што язычнікі, маючы натуральны Закон, выканалі волю Божую лепш, чым іудзеі, якія мелі і ўнутраны, і знешні Законы.

2-я запаведзь Закону Божага:

Не рабі сабе куміра, ані чагось падобнага да таго, што на небе ўгары, што на зямлі ўнізе, і што ў вадзе ніжэй за зямлю: не пакланяйся ім і не служы ім.

Тэртуліян, адзін з настаўнікаў Царквы другога стагоддзя, сказаў на дзіва слушныя і глыбокія словы: «Душа чалавечая па прыродзе хрысціянка». *Бо калі народы, што не маюць закону, па прыродзе законнае робяць, яны, законаў не маючы, самі сабе закон: бо выяўляюць рэчы законныя, напісаныя ў сэрцах сваіх, у суладным з імі сумленні, і між сабою думкамі абвінаваўчымі або апраўдальнымі (Рым. 2, 14-15).* Але па меры аддалення ад Госпада Бога чалавецтва не толькі страціла духоўнасць, але і разбэсцілася. Народы рассяліліся па раўнінах і больш за ўсё захапляліся свяцiламі. Тыя, хто жылі ў гарах, больш захапляліся прыроднымі з’явамі. Тыя, хто жылі па берагах рэк і мораў, больш захапляліся насельнікамі вод. Кумір (ідал) — выява якога-небудзь нябеснага або зямнога ці воднага стварэння, якому замест Бога пакланяюцца і служаць.

Госпад забараняе пакланяцца кумірам і адначасова кажа Майсею ўзнесці намёт, зрабіць выявы херувімаў, каб пакланяцца Яму: *Ахвяру заўсёдную, з пакалення ў пакаленне, з роду ў род, перад дзвярыма намёта сходу перад Госпадам, у іх буду адкрывацца табе там і прамаўляць да цябе (Вых. 29, 42).* Госпад гаворыць пра асвячэнне намёта сходу і ахвярніка, і ўсіх, хто мае да іх ачыненне: *і асвячу намёт сходу і алтар, і Аарона, і сыноў яго асвячу, каб святчэннадзейнічалі Мне (Вых. 29, 44).* Пры гэтым вядома, што ідал быў нізрынуты ў храме Дагона, а тыя, хто дакрануўся да яго, загінулі (1 Цар. 5, 1-12). Але тут няма супярэчнасці. Апостал Павел гаворыць: *ідал на свеце нішто, і што няма іншага Бога, апрача Адзінага (1 Кар. 8, 4).* Паводле В. А. Жукоўскага, усялякі «філасофскі бог» — гэта разумовы ідал, і пакланяючыся яму, мы пакланяемся самім сабе. Ідал — гэта нішто, але яму не толькі пакланяліся, але і прыносілі ахвяры.

У сувязі з гэтым можа паўстаць пытанне аб правамернасці пакланення хрысціянскім абразáм. Паводле падання, Госпад Сам зрабіў Сваю выяву цару Эфесскаму. Калі мастакі не змаглі зрабіць Яго выяву, Ён узяў хусту, плашчаніцу, прыклаў да Твару — і пакінуў Аблічча. Госпад не з'явіўся перад Майсеем на просьбу яго, а потым стлуміў Сваю вышэйшасць і ўвасобіўся ў Целе Чалавечым. Апостал Піліп прасіў: «Госпадзе, пакажы нам Айца», і атрымаў адказ: «Той, хто бачыў Мяне, бачыў і

Айца». *Кажа Яму Піліп: Госпадзе, пакажы нам Айца, і годзе з нас. Кажа яму Ісус: гэтулькі часу Я з вамі, і ты не пазнаў Мяне, Піліп? Хто бачыў Мяне, бачыў і Айца; як жа ты кажаш: пакажы нам Айца (Ін. 14, 8-9)?* Прап. Іаан Дамаскін казаў, што стварыць выяву Бога нябачнага, невыяўнага, сапраўды, немагчыма. А калі Ён *Сябе спустошыў, вобраз раба прыняў (Флп. 2, 7),* г. зн. стаўся Чалавекам і набыў колькасныя прыкметы — меру, велічыню, — тады мы пачалі ствараць Яго выявы і словамі, і фарбамі.

Галоўны грэх супраць гэтай Запаведзі — ідалапаклонства, але яно канула ў гісторыю, засталося толькі на некаторых выспах. Аднак існуе вытанчанае ідалапаклонства, і пра гэта можна шмат казаць.

Імкненне да памнажэння набытку не супярэчыць хрысціянскаму вучэнню, але важна, каб яно не запанавала над чалавекам цалкам: *хцівасць, якая ёсць ідаласлужэнне (Кал. 3, 5).*

Дагаджэнне ўласнаму чэраву, злоўжыванне ласункамі, абжорства і п'янства выклікаюць шматлікія хваробы. Ласыя ненажэры вышэй за ўсё ставяць пачуццёвую асалоду, *ім жа скон — загуба, ім жа бог — чэрава, і слава ў сораме іх, тых, што думаюць аб зямным (Флп. 3, 19).*

Ганарлівасць, пыха, фанабэрыя — гэта цяжкая ва́да, бо чалавек ставіць вышэй за ўсё ўласнае меркаване, сваё рашэнне лічыць за найвышэйшы аўтрытэт. Крывадушнасць — ва́да, калі добрыя

ўчынкі выстаўляюцца ўсім на паказ. Але, паводле вучэння Царквы, свае добрыя ўчынкі не належыць адкрываць. Ганарысты вышэй за ўсё цэніць уласныя здольнасці і перавагі. Крывадушнасць — вонкава пабожныя справы, пост і строгае выкананне абрадаў, якія ўжываюцца дзеля здабыцця пашаны сярод людзей без думкі аб унутраным выпраўленні свайго сэрца (Мц. 6, 5-7).

Госпад называе адны прадметы святымі, іншыя — неасвячанымі. Адны перад Аблíччам Божым — прыемныя, іншыя ў Вачах Божых — агідныя. Кумір — гэта нішто і з'яўляецца агідаю перад Аблíччам Божым. Крыж — вялікая святыня, і ўсе, хто дакранаецца да яе, асвячаюцца. Увесь дахрысціянскі свет рыхтаваў свет да прыняцця Крыжа, а сёння чалавецтва павінна зноў усвядоміць глыбіню таямніцы Галгофскага Крыжа. Вялікая святыня таксама і абраз, — выявы Хрыста і Маці Божай або святых. У Старым Запавеце — тыя, хто глядзеў з верай на медзяную скульптуру змея, вылечваліся. Так і цяпер: тыя, хто з вераю глядзіць на Крыж і абраз, — атрымліваюць дапамогу.

Цноты, супрацьлеглыя граху ідалапаклонства:

1. Нелюбоў да ліхвярства і шчодрасць.
2. Паўстрыманасць і пост.
3. Пакора і выкананне добрых ўчынкаў у таямніцы.

3-я запаведзь Закону Божага:

Не кажы імені Госпада Бога твайго марна.

Мы марнеем у мітусні і нярэдка дарэмна вымаўляем гэтае найсвяцейшае Імя, перад якім схіляюцца і трымцяць Анёльскія сілы. Усялякае імя ў нейкай ступені адлюстроўвае Існасць Невыяўнага Бога. Госпад над усім пануе. Бог багаты на міласць і шчодры. Усеўладны усё трымае ў правай Сваёй руцэ.

Кранаючы Божыя імёны, мы падсвядома або свядома выяўляем частку Яго велічы і бясконцае прыроды. Таму недапушчальна згадваць іх у пустых размовах, жартах, пры гэтым спакушаючы няверныя душы. Ісак Ньютан здымаў з сябе капялюш, калі вымаўляў імя Бога.

Грахі супраць гэтай Запаведзі:

1. Блюзнерства — дзёрзкія словы супраць Бога. Зазвычай Бог карае непасрэдна тут, на зямлі. Гэтак Сенахірым [Сенахерыб], цар Асірыйскі, збіраючыся захапіць Іерусалім, пыхліва выхваляўся і блюзнерыў: «Не толькі цар Іезекія з народам сваім не зможа абараніць ад мяне горад Іерусалім, але і Бог яму не дапаможа супраць маёй незлічонай сілы». Бог пачуў гэтыя словы і за адну ноч Анёл Гасподні знішчыў сто восемдзесят пяць тысяч яго ваяроў. Пабачыўшы гэта, Сінахірым уцёк у Ніневію і там быў забіты ўласнымі дзецьмі (2 Пар. 32).

2. Нараканні — скаргі на Яго паводзіны. Гэтак іудзеі ў пустыні наракалі на Майсея. Хрысціянін, бывае, наракае ў горы, у бядзе. Аднак нельга безразважна скардзіцца на простае недасяжнае для разумення Наканаванне Божае. Прыкладам можа быць жыццё вялікага свяціцеля Іаана Залатавуснага, поўнае подзвігаў і пакут, узор хрысціянскае самаадданасці, цярплівасці і пакоры перад воляй Божай. У росквіце сваёй славы ён вынес шмат пакут і адышоў да Госпада са словамі: «Слава Богу за ўсё!».

3. Кашчунства /блюзнерства/ — калі свяшчэнныя прадметы зневажаюцца або апаганьваюцца. Вядомая гісторыя апошняга вавілонскага цара Валтасара, які на сваю апошнюю бяседу загадаў прынесці свяшчэнны залаты і срэбны посуд з Іерусалімскага храма, каб піць з яго віно. Калі бяседа была ў самым разгары, нейкая нябачная рука на сцяне залы накрэсліла пісьмёны, якія, як вытлумачыў іх цару прарок Данііл, прадказвалі хуткую загібель і царству Вавілонскаму, і самому цару. Той самай ночы цар Валтасар быў забіты (Дан. 5).

4. Няўважлівасць пры малітве, калі малітоўныя словы вымаўляюцца механічна. Святы Васіль Вялікі адзначаў, што няўважлівасць бывае рознага паходжання: адна вынікае з нашай душэўнай слабасці, іншая — з нядбальства. Няўважліваць у выніку нядбальства з'яўляецца грахом, а каб пазбегнуць няўважівасці, якая вынікае са слабасці, належыць прыкласці намаганні нашай волі. Калі не можа

яшчэ маліцца наша сэрца, не можа сачыць за словамі малітвы наш розум, дык мы павінны працягваць малітву, як нейкую працу. Тады за гэтую працу Госпад даруе нам, у свой час, уважлівую малітву.

5. Падманная клятва /крывадушная прысяга/ — калі сцвярджаюць клятваю тое, чаго няма.

6. Парушэнне клятвы /зламанне прысягі/ — калі не выконваюць справядлівую і законную клятву. Цар Седэкія парушыў дадзеную ім прысягу Навуходаносару, цару вавілонскаму, і перайшоў на бок егіпецкага цара, каб разам з ім ісці супраць Навуходаносара. За гэта яго выкрыў Бог праз прарока Езекііля: *жыву Я! Клятву Маю, якую ён зняважыў, і запавет Мой, які ён зламаў, абрыну на галаву яму: і закіну на яго мярэжу Маю, і заблытаецца ён ў ёй, і прывяду яго ў Вавілон, і там буду судзіцца з ім за крывадушша яго, якім ён падмануў Мяне (Ез. 17, 19-20).* Навуходаносар неўзабаве ўзяў Іерусалім, адвёў Седэкію ў палон, там яму выкалалі вочы і пасадзілі ў вязніцу, дзе ён і памёр.

7. Парушэнне абяцанняў, дадзеных Богу.

8. Бажба — легкадумнае ўжыванне клятвы ў звычайных размовах. Госпад наказаў: *А Я кажу вам: не прысягай зусім: ні небам, бо яно — пасад Божы; ані зямлёю, бо яна — падножжа нагам Яго; ані Іерусалімам, бо ён — горад вялікага Цара; ані галавою сваёй не прысягай, бо не можаш ніводнага воласа зрабіць белым ці чорным. Але няхай будзе слова вашае: але, але, ні, ні, а што больш за гэта, тое ад няпрыязі (Мц. 5, 34-37).*

Асобна стаіць пытанне прысягі, якая ўжываецца ў грамадскіх справах. Прысягу можна ўжываць ў важных выпадках на запатрабаванне законнае ўлады, дзеля грамадскай карысці і праўды, бо Сам Бог кляўся Аўрааму і Давіду, жадаючы паказаць непарушнасць Сваёй волі: *Бо людзі клянуцца вышэйшым, і кожнае спрэчкі між імі канец — на сцвярджэнне прысяга. Дзеля гэтага і Бог, хочучы далей паказаць наследнікам абяцання нязменнасць волі Сваёй, ужыў прысягу (Яўр. 6, 16-17).* Аднак пры гэтым трэба пабраць намер і не здрадзіць прысязе.

4-я запаведзь Закону Божага:

Шануй дзень суботні, яго святкуй: шэсць дзён працуй і парабі ўсе справы свае: а сёмы дзень — субота [належыцца] Госпаду Богу Твайму.

Паводле Запаведзі, сёмы дзень тыдня загадана прысвячаць Богу, таму што Бог за шэсць дзён стварыў свет, а на сёмы адпачыў ад праў стварэння (г. зн. не стаў далей ствараць). Гэтая запаведзь была ўстаноўленая, каб Ізраіль пазнаў Бога і, пазнаючы, услаўляў Яго. Госпад наказаў Адаму: *У поце аблічча свайго будзеш есці хлеб свой, пакуль не вернешся ў зямлю, з якой ты быў узяты: бо ты ёсць зямля і вернешся ў зямлю (Быц. 3, 17-19).* Суботы ж Госпад загадаў прысвячаць

Богу: *і суботы Мае святкуйце: каб быў знак паміж Мною і паміж вамі, каб ведалі вы, што Я Госпад Бог ваш (Ез. 20, 20).* Па святкаванні суботы можна было вызначыць маральны стан ізраільцян. У гэты дзень нават немыя істоты вызваляліся ад працы. У Старым Запавеце гаворыцца пра тое, як паводле Божага загаду быў да смерці пабіты каменнем чалавек, які ў суботу збіраў у лесе дровы (Лічб. 15, 32-36).

Вызваляючыся ад усялякай марнай мітусні, мы павінны пазнаваць Бога — гэта найпершая мэта выканання Запаведзі. *Шануй дзень суботні,* — пасля сыходу ў пустыню Сін так сказаў Госпад, выводзячы іудзеяў з егіпецкай няволі (Друг. 5, 15). Ушаноўваць Бога мы можам, толькі пазнаючы Яго ласку, міласэрнасць і волю. Другая мэта захавання Запаведзі — адпачынак ад працы. У прыродзе чаргуецца пладанашэнне і адпачынак. Ёсць падобны прыклад і ў земляробтве. Адзін год збіраюць з зямлі плён, а на другі год пакідаюць яе пад парам.

Свята павінна быць прысвечанае служэнню Богу праз наведванне набажэнства, выкананне добрых учынкаў. Калі чалавек наведвае ў святочны дзень царкву, гэта знак таго, што ён ведае Бога, удзячны Яму і Яго шануе. Жыццёвыя клопаты адкладаюцца на будзённыя дні. Святы — гэта набожнае сузіранне спраў Божых, збіранне маральных і духоўных сіл Божых. Святочны час не прынясе чалавеку карысці, калі чалавек няправільна выкарыстае яго. У Старым Запавеце субот-

нія дні — гэта Вялікая субота — Найласкавейшая субота — субота, калі Госпад суботнічаў. Святкаванне суботы — гэта цень будучага святкавання Нядзелі: *Дык няхай ніхто не асудзіць вас за ежу, або за пітво, або за ўдзел у свяце, або за маладзікі, або за суботы: гэта цень таго, што мае быць, цела ж Хрыстовае (Кал. 2, 16-17).*

Наступны дзень — Вялікдзень — аднадзённая Пасха, калі быў звязаны шатан, згубнік. У хрысціянстве з часоў Апостальства святкуецца дзень нядзельны, першы дзень тыдня, ў гонар Уваскрасення Хрыстовага. У Дзеях Апосталаў згадваецца пра сход хрысціян у першы дзень тыдня для выканання Таінства Прычасця: *У першы ж дзень тыдня, калі вучні сабраліся, каб пераламіць хлеб, Павел гутарыў з імі, хочучы выйсці назаўтра, і зацягнуў сваё слова да паўночы (Дзеі 20, 7).* Апостал Іаан Багаслоў згадвае таксама менавіта нядзелю: *Я быў у духу ў дзень нядзельны, і чуў за сабою голас вялікі, нібы трубы, які казаў: Я ёсць Альфа і Амега, Першы і Апошні (Аб'яўл. 1, 10).* Марыя Магдаліна раніцай, на наступны дзень пасля суботы, пабачыла, што камень адвалены ад Магілы Ісуса Хрыста: *У першы ж дзень пасля суботы Марыя Магдаліна прыйшла на досвітку, яшчэ ўпоцемках, на магілу, і бачыць — камень адвалены ад магілы (Ін. 20, 1).* Гэта пабачылі таксама іншыя жанчыны-міраносіцы: *У першы ж дзень пасля суботы вельмі рана прыйшлі яны на магілу, несучы прыгатаваныя пахі, дый іншыя з імі (Лк. 24, 1).* Лука і Клеопа таго

ж дня ішлі ў Эмаўс: *І вось, двое з іх пайшлі таго ж дня ў вёску, што за шэсцьдзесят стадый ад Іерусаліма, званую Эмаўс (Лк. 24, 13).*

Ісус Хрыстос прыйшоў да вучняў пасля свайго Уваскрасення, увечары таго ж дня: *І ўвечары таго ж дня, першага пасля суботы, калі дзверы, дзе былі сабраныя вучні (Яго), былі замкнёныя са страху перад Іудзеямі, прыйшоў Ісус і стаў пасярэдзіне і сказаў ім: мір вам (Ін. 20, 19).* Хрыстос зноў прыйшоў да вучняў праз восем дзён: *І праз восем дзён ізноў былі ў доме вучні Яго, і Фама з імі. Прыйшоў Ісус пры зачыненых дзвярах, і стаў пасярод (іх) і сказаў: мір вам (Ін. 20, 26).*

Царква Новага Запавету з першага дня ўшаноўвала Нядзелю. Апроч нядзельнага дня, ёсць Вялікія святы, у тым ліку і Вялікдзень, Дванадзесятыя святы і некаторыя іншыя.

Да Дванадзесятых свят належаць:

Раства Найсвяцейшае Багародзіцы — 8/21[1] верасня;

Уздзвіжанне Крыжа Гасподняга — 14/27 верасня;

Уводзіны ў храм Найсвяцейшае Багародзіцы — 21 лістапада/04 снежня;

Раства Хрыстовае — 25 снежня/07 студзеня;

Хрышчэнне Гасподняе — 06/19 студзеня;

Стрэчанне Гасподняе — 02/15 лютага;

---

[1] Святы пададзеныя паводле старога і новага стылю.

Благавешчанне [Дабравешчанне/Звеставанне] Найсвяцейшае Багародзіцы — 25 сакавіка/07 красавіка;

Уваход Гасподні ў Іерусалім — за шэсць дзён перад Вялікаднем;

Узнясенне Гасподняе — на 40-ы дзень пасля Вялікадня;

Зыход Святога Духа на Апосталаў — на 50-ы дзень пасля Вялікадня, і наступны за ім — Духаў дзень;

Перамяненне Гасподняе — 06/09 жніўня;

Успенне Найсвяцейшае Багародзіцы — 15/28 жніўня.

Іншыя святы:

29 жніўня/11 верасня — Усекнавенне галавы Іаана Прадцечы;

17/30 верасня — Пцц. Веры, Надзеі, Любові і маці іх Сафіі;

25 верасня/08 кастрычніка — Спачын прп. Сергія, ігумена Раданежскага;

26 верасня/09 кастрычніка і 08 мая/21 мая — Ап. Іаана Багаслова;

01/14 кастрычніка — Пакроў Найсвяцейшае Багародзіцы;

13/26 кастрычніка, 12/25 лютага і ў аўторак Светлага Тыдня — Іверскае Іконы Божай Маці;

22 кастрычніка/04 лістапада і 08/21 ліпеня — Казанскае іконы Божай Маці;

26 кастрычніка/08 лістапада — Дзімітрыева (Змітрава) бацькоўская субота;

08/21 лістапада — Сабор Архістратыга Міхала;

09/22 лістапада — Іконы Маці Божае «Скорапаслушніца»;

17/30 лістапада — Прп. Нікана, ігумена Раданежскага;

23 лістапада/06 снежня — Дв. вял. кн. Аляксандра Неўскага, свц. Мітрафана Варонежскага;

27 лістапада/10 снежня — Іконы Маці Божае «Знак»;

06/19 снежня і 08/21 мая — Свяціцеля Мікалая, архіепіскапа Мір Лікійскіх;

01/14 студзеня — Абразанне Гасподняе;

02/15 студзеня і 19 ліпеня/01 жніўня — прп. Серафіма Сароўскага;

12/25 студзеня — Пц. Таццяны;

14/27 студзеня — Роўнаап. Ніны, асветніцы Грузіі;

30 студзеня/12 лютага — Сабор трох свяціцеляў: Васіля Вялікага, Рыгора Багаслова, Іаана Златавуснага;

01/14 лютага — Пк. Трыфана;

02/15 сакавіка — Пц. Еўдакеі;

17/30 сакавіка — Прп. Аляксея, чалавека Божага.

19 сакавіка / 01 красавіка — Пр. Сафіі, княгіні Слуцкай[1)]

[1)] Дапоўнена перакладчыкам.

28 красавіка / 11 мая — Свц. Кірылы, епіскапа Тураўскага[1)]

7/20 мая – Іконы Божай Маці Жыровіцкай

23 мая / 05 чэрвеня — Прп. Ефрасінні, ігумені Полацкай (1173)[2)]

11/24 мая — Роўнаап. Кірылы і Мефодыя, настаўнікаў Славянскіх;

29 чэрвеня/12 ліпеня — Слаўных і паўсюдна шанаваных Першых Вярхоўных апосталаў Пятра і Паўла;

20 ліпеня / 02 жніўня, 05 / 18 верасня — Прпк. Афанасія, ігумена Брэсцкага (1648)[3)]

24 чэрвеня/07 ліпеня — Раство Прадцечы і Хрысціцеля Гасподняга Іаана

11/24 ліпеня — Роўнаап. кн. Вольгі;

15/28 ліпеня — Роўнаап. вял. кн. Уладзіміра;

27 ліпеня/12жніўня — Впк. і лекара Панцеляймона

30 ліпеня/12 жніўня — Пк. Іаана Воіна;

01/14 жніўня — Паходжанне Пачэсных Дрэў Жыццядайнага Крыжа Гасподняга (пачатак Успенскага посту) і «Мядовы Спас»;

06/19 жніўня — Перамяненне Гасподняе, або «Яблычны Спас»;

---

1) Дапоўнена перакладчыкам.

2) Дапоўнена перакладчыкам.

3) Дапоўнена перакладчыкам.

16/29 жніўня — «Арэхавы» або «Хлебны Спас»;

26 жніўня/08 верасня, 21 мая/03 чэрвеня, 23 чэрвеня/06 ліпеня — Уладзімірскай іконы Маці Божае.

Пост Чатырохдзесятніцы, або Вялікі Пост, устаноўлены на сорак дзён, паводле прыкладу Ісуса Хрыста, які пасціў сорак дзён (Мц. 4, 2), і ахоплівае першыя 5 тыдняў ад панядзелка пасля Сырапуснага тыдня і 6-ы Вялікі тыдзень, ад панядзелка да пятніцы.

Пятроў пост доўжыцца ад 1-го да 5-ці тыдняў, у залежнасці ад тэрміну Святога Вялікадня. Ён пачынаецца праз тыдзень пасля дня Святой Тройцы і доўжыцца да 12 ліпеня — дня памяці святых Першых Вярхоўных апосталаў Пятра і Паўла. Ён настае з панядзелка пасля Тыдня Усіх Святых. Калі ж 12 ліпеня супадае з серадой або пятніцай, разгаўленне пераносіцца на наступны дзень.

Успенскі пост устаноўлены ў гонар Гаспадыні і Царыцы Нябеснай, перад Вялікімі святамі Перамянення Гасподняга і Успення Маці Божае, і працягваецца два тыдні — з 01/14 да 15/27 жніўня. Гэта суровы пост. Падчас яго есці рыбу дазваляецца толькі на працягу аднаго дня — на свята Перамянення Гасподняга.

Калядны пост — малая чатырохдзясятніца. У гэты пост дазваляецца рыба. Майсей, атрымліваючы Скрыжалі, пасціў 40 дзён, і мы пасцім, прымаючы Самога Заканадаўцу ў скрыжалях свайго сэрца. Пост доўжыцца з 28 лістапада да

07 студзеня. З 07 да 19 студзеня посту няма, за выключэннем пярэдадня Хрышчэння Гасподняга (нар. Вадохрышча) — Вадзяная куцця.

Пасціць належыць таксама па серадах і пятніцах: па серадах — у памяць аб выданні Ісуса Хрыста на Пакуты, па пятніцах — у памяць аб Яго Пакутах і смерці.

Галоўная мэта цялеснага посту — выканаць пост духоўны. Калі чалавек накладае пост свайму чэраву, дык павінен накладаць пост і сваім сардэчным думкам.

5-я запаведзь Закону Божага:

Шануй бацьку свайго і маці сваю, каб добра табе было і каб доўга жыў на зямлі.

Самыя першыя бліжнія для нас — гэта ўласныя бацькі. Выкананне гэтай Запаведзі настолькі важнае ў вачах Божых, што Госпад абяцае ўжо тут, на зямлі, дабро тым, хто яе выканае, накшталт Шчасця Новага Запавету.

Паводле гэтай Запаведзі, трэба шанаваць бацькоў, не дапускаць дзёрзкага, грубага слова, якое можа ў значнай ступені скараціць дні зямнога жыцця, слухацца іх, карміць і даглядаць у хваробе і старасці, маліцца аб збаўленні іх душ (2 Мак. 12, 43-44; Ер. 35, 18-19; Вых. 21, 16; Быц. 27; Сір. 39; Ін. 15, 13).

Ні з чым нельга параўнаць тое, што мы робім, калі дапускаем грубыя словы, зневажаючы бацькоў.

Яны — благаславёныя прылады Божага Наканавання. Прамудры Ісус, сын Сірахаў, павучае: *Усім сэрцам тваім ўслаўляй бацьку твайго і матчыных радзільных пакут не забывай (Сір. 7, 29)*.

Нам належыць падпарадкоўвацца, г. зн. усялякую справу распачынаць з ведама бацькоў: *Учынкамі і словам шануй бацьку твайго і маці (Сір. 3, 8)*. А таксама: *бо слава чалавеку з гонару айца яго, і ганьба дзецям — маці ў бясслаўі (Сір. 3, 11)*. Прыклад паслушэнства бацькам выказаў Хрыстос Збаўца. Ён — Творца і Заканадаўца — выканаў гэтую запаведзь перад Сваімі бацькамі.

Бацькоў належыць карміць і даглядаць у старасці і хваробах. Неапісальным болем адбілася ў матчыным сэрцы кожная слязінка дзіцяці, таму хрысціянін не можа ставіцца да сваіх бацькоў абыякава і жорстка. Уласныя хваробы пераносіць лягчэй, чым чалавеку нашмат старэйшаму за цябе. Св. Філарэт кажа: «Калі бацькі будуць патрабаваць ад вас дапамогі, і сам ты будзеш бедаваць, пакінь клапаціца пра самога сябе, але прыгадай Хрыста на Крыжы, Які ў болю і пакутах думаў таксама і пра народ, які Яго ўкрыжаваў, і пра Маці, сказаўшы: *Жанчына, гэта сын Твой,* і вучню: *вось, Маці твая (Ін. 19, 26-27)*».

Бясконца важная малітва за памерлых бацькоў. За малітву Госпад можа перавесці нябожчыка з аднаго стану ў іншы. Хто ж будзе рупіцца пра сваіх бацькоў, калі не блізкія? Малітва пры Бяскроўнай Ахвяры закранае ласкаю душы памерлых, рады-

кальна мяняе, лагодзіць іх стан. Таму трэба імкнуцца заўжды падаваць памінальныя запіскі на Літургіі. Той, хто цэлы час падае іх, адчувае дзейсную карысць і сам таксама атрымлівае сабе дапамогу.

Мы павінны шанаваць і тых, хто заступае месца бацькоў, і, перш за ўсё, шанаваць сваю Бацькаўшчыну, дзе нарадзіліся нашыя продкі, дзяды і бабулі. Таму абавязак кожнага хрысціяніна — любіць сваю Бацькаўшчыну. Патрыятычныя подзвігі знаходзяцца ў адной плоскасці з подзвігамі веры. Патрыятычнае пачуццё — гэта самае глыбокае пачуццё чалавечае прыроды, і яго прыклады выяўляюць у Святым Пісанні Майсей, Ісус Навін, Суддзі і ўсе, хто быў патрыётам сваёй Радзімы. *Бо калі даруеш ім грахі іх, даруй: калі ж не, дык выкрэслі мяне з кнігі Тваёй, у якую ўпісаў (Вых. 32, 32),* — гаворыць Майсей. У кожным слове псалма 136-га пры згадках аб Іерусаліме разносіцца крык, лямант і горкі плач Давідаў. Хрыстос, які прыйшоў збавіць род чалавечы, пасылаў Сваіх вучняў спачатку да суайчыннікаў: *на шлях язычнікаў не ідзіце (...), ідзіце ж найперш да авец дому Ізраілева, што загінулі (Мц. 10, 5-6),* і бедаваў, плачучы, калі іх не прынялі, бо бачыў, які лёс рыхтуюць сабе сыны Ізраілевы. *Бо я хацеў бы сам быць адлучаны ад Хрыста за братоў маіх (Рым. 9, 3),* абы толькі яўрэйскі народ атрымаў збавенне, — сказаў апостал Павел. Існуе шмат прыкладаў патрыятызму ў сусветнай гісторыі. Так, свяціцель Аляксей, мітрапаліт Маскоўскі, адбыў падарожжы ў Арду, просячы

міру. Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Гермаген, які заклікаў да абароны веры і Бацькаўшчыны, марнеў у вязніцы і там памёр. Яскравыя прыклады набожнасці і патрыятызму выявіліся падчас разгулу ўціску ў Рыме ў першыя стагоддзі хрысціянства, калі за адно толькі імя «хрысціянін» кідалі на пажыранне звярам.

Мы таксама павінны шанаваць тых, хто трымае ўладу ў сваіх руках, бо ўсё адбываецца паводле Божага Наканавання: *Бойся Бога, сыне, і цара, і ніводнаму з іх не праціўся* (Прып. 24, 21). А таксама ў Новым Запавеце: *Усякая душа няхай падпарадкоўваецца вышэйшым уладам, бо няма ўлады, каб не ад Бога, існуючыя ж улады ад Бога пастаўленыя. Тым жа, хто праціўіцца ўладзе, праціўіцца Божаму загаду (...). Дзеля гэтага трэба слухацца не толькі з боязі, але і добрасумленна* (Рым. 13, 1-2, 5). А таксама: *тады аддайце кесару кесарава, а Божае Богу* (Мц. 22, 21). А таксама: *Бога бойцеся, цара шануйце* (1 Пят. 2, 17).

Цяжка і духоўнаму пастыру з ганарыстым, непакорлівым народам.

Мы павінны шанаваць усіх настаўнікаў. *Слухайцеся ўсіх настаўнікаў вашых і выяўляйце пакору: бо яны над душамі вашымі чуваюць, як абавязаныя здаць справу аб іх* (Яўр. 13, 17).

Нам увогуле належыць шанаваць усіх старэйшых за нас. Жыццё жорстка выпрабоўвае і з цягам часу адбірае душэўныя і цялесныя сілы. І ў Старым, і ў Новым Запавеце наказваецца шанаваць

старэйшых: *Перад сівым ўстань і ўшануй старо-га чалавека, і пабойся Госпада Бога твайго (Ляв. 19, 32).* А таксама: *Старому не рабі паскудства, але суцяшай, як бацьку; малодшых, як братоў; старых жанчын, як матак (1 Цім. 5, 1-2).*

Ёсць толькі адно выключэнне з агульнага правіла, калі мы маем права адмовіць бацькам, прадстаўнікам улады, пастырам, не парушаючы 5-й Запаведзі, — калі гэта супярэчыць веры, або Закону Божаму. Так, калісьці Апосталы за-далі пытанне: «Каго нам слухаць, Бога ці вас (сінедрыён)?»: *Мяркуйце, ці справядліва перад Богам слухацца вас болей, чым Бога (Дзеі 4, 19)?*

Існуюць і абавязкі бацькоў ў адносінах да дзя-цей. Апостал Павел кажа: *... і вы, айцы, не раз-дражняйце дзяцей вашых, але выхоўвайце іх у напамінанні і навуцы Гасподняй (Эф. 6, 4).* Усё ама-ральнае ў дзіцяці трэба выкараняць. Бацькоўскае благаслаўленне мае асаблівую сілу, пра што сведчыць прыклад нашых продкаў. *Бо бацькоўскае благаслаўленне ўмацоўвае дамы дзяцей, кляцьба ж матчына разбурае дашчэнту (Сір. 3, 9).* У Святым Пісанні паказана, наколькі дабратворны ўплыў мела благаслаўленне Ноя, Ісаака, Якуба. Госпад асабліва ахоўвае жыццё і дбае пра дабрабыт тых, хто шануе бацькоў на зямлі, і, як дасканалую ўзнагароду, дорыць шчаслівае жыццё ў Нябеснай Бацькаўшчыне.

Праклён бацькоў нясе непазбежную загібель дзецям і тут, і ў прышлым жыцці. Існуюць і аба-

вязкі пастыра ў адносінах да статка: *Пасвіце,* — кажа апостал Пётр, — *Божы статак, які ў вас, наглядаючы за ім не пад прынукаю, але з добрай волі і па-Божы, ды не дзеля несправядлівае карысці, але старанна, і не панукаючы над спадчынай, але даючы прыклад статку (1 Пят. 5, 2-3).*

Гэта значыць, не з сябе ганарыцца, але ўсе Запаветы выконваць ва ўласным жыцці. Інакш тыя, каго пасвяць, убачаць, што перад імі не пастыр, а наймiт.

Слова ў дзень Страшнага суда Гасподняга будзе судзіць нас, бо ўсякае пустое слова абернецца супраць нас (Мц. 12, 36). Кожнаму трэба адплочваць тым, што яму належыцца, толькі тады можна чакаць на зямлі гармоніі і ладу. Нічога не адбываецца без волі Божае, гэтак вучыць апостал Павел і просіць падпарадкоўвацца: *Дык аддавайце кожнаму належнае: каму падатак — падатак, а каму мыта — мыта, каму страх — страх, а каму гонар — гонар (Рым. 13, 7),* і тады ў грамадстве будзе гармонія, у адваротным выпадку — безлад. Таму трэба своечасова вучыць дзяцей гэтай Запаведзі паслушэнства.

6-я запаведзь Закону Божага: *Не забівай*

Госпад кажа Майсею: *Хто пральe кроў чалавечую, таго кроў пральецца рукою чалавека: бо чалавек створаны паводле вобразу Божага (Быц. 9, 6-7).* Бойцеся страціць вобраз Божы. Гэткіх чака-

юць згрызоты сумлення, жорсткія пакуты ўжо тут, на зямлі. І чалавек, які не ў стане зносіць свае маральныя пакуты, прыходзіць да высновы аб неабходнасці пакаяцца ў зробленым, і толькі тады яго ўтрапёная душа атрымлівае супакаенне.

Каін пасля здзейсненага забойства хадзіў па зямлі, *стагнаў і калаціўся (Быц. 4, 12).* Ф. М. Дастаеўскі ў «Злачынстве і пакаранні» яскрава абмаляваў цяжкія душэўныя пакуты Раскольнікава — заканамерныя наступствы злачынства — і магчымасць пазбыцца пакут праз пакаянне.

Аднак ёсць яшчэ большы грэх — гэта духоўнае забойства. Цялеснае забойства датычыцца толькі часовага свету. Духоўнае забойства — гэта забойства навек. Род духоўнага забойства — гэта спакуса, калі нехта зводзіць бліжняга ў няверʼе або беззаконнасць, і праз гэта аддае яго душу на духоўную смерць: *а калі хто спакусіць аднаго з гэтых малых, што вераць у Мяне, лепш бы яму было, каб павесілі жоран млынарскі на шыю яму і ўтапілі ў бездані марской (Мц. 18, 6).* Ты адымаеш у чалавека тое, што адымае душу ў вечнасці. Адна ж душа ў вачах Госпада даражэйшая за цэлы свет. У бл. Аўгусціна сказана: «Не думай, што ты не забойца, калі наставіў бліжняга на шлях граху, на шлях распусты, ты разбэшчваеш душу спакушанага і адымаеш тое, што належыцца вечнасці».

Таксама грахамі супраць гэтай Запаведзі зʼяўляюцца асуджэнне невінаватага падсуднага, перахоў і вызваленне забойцы, пасіўнасць пры

магчымасці выбавіць чалавека ад смерці. Мяцеж супраць ураду, забойства, самагубства — тры жахлівыя злачынствы, выхад на двабой, які з'яўляецца цяжкім грахом (свц. Філарэт). У Евангеллі сказана: *дык аддайце кесару кесарава, а Божае Богу (Лк. 20, 25).* Наш абавязак — падтрымліваць жыццё, дадзенае Богам, а не зводзіць яго, таму самагубства, аднаразовае або расцягнутае на доўгі час, — гэта найцяжэйшы грэх.

Ёсць адзін тонкі грэх забойства: гэта ўсялякі гнеў, нават той, які вонкава не выяўляецца: *Усякі, хто ненавідзіць брата свайго, ёсць душагуб (1 Ін. 3, 15).* Нішто так не спальвае душу, як гнеў, за які чакае пакаранне аж да геены вогненнай: *А Я кажу вам, што ўсякі, хто гневаецца на брата свайго дарэмна, падлягае суду; а хто скажа брату свайму: «рака́»* [пусты чалавек], *падлягае сінедрыёну; а хто скажа: «вырадак», падлягае геене вогненнай (Мц. 5, 22). Гневайцеся, ды не грашыце (Эф. 4, 26),* г. зн. гневайцеся на спрадвечнага ворага — д'ябла, а на бліжняга мы не маем права гневацца, гэта вобраз Божы. Паглядзі на таго, на каго ты гневаешся, ты пабачыш у глыбіні пакут схаваны вобраз Божы, і табе зробіцца крыўдна за сябе, што ты так абражаў вобраз.

Ёсць забойства, якое не з'яўляецца парушэннем закону. Гэта пакаранне злачынцы паводле закону. Так зрабіў бы чалавек з хворым органам, які ўжо немагчыма вылечыць, і трэба ампутаваць. Па аналогіі, абераганне блізкіх ад благога шляхам

знішчэння злачынцы ёсць такая самая ампутацыя. Забойства на вайне таксама не лічыцца за грэх. Наадварот, у бітве выяўляецца найвышэйшая хрысціянская цнота: *Няма любові большае за тую, калі хто душу сваю пакладзе за сяброў сваіх (Ін. 15, 13).* Гэта дапушчальнае дзеянне, хоць вайна заўжды балюча адбіваецца на жыцці грамадства. Міру жадаюць усе, і не толькі хрысціяне моляцца аб тым, каб настаў мір, а мячы і дзіды былі перакаваныя на сярпы і плугі. Забойства, здзейсненае незнарок, з гледзішча закону таксама не з'яўляецца злачынствам. Аднак той, хто здзейсніў яго, павінен прынесці ў Царкве пакаянне.

Мы павінны абыходзіцца з бліжнімі з любоўю і лагодай, дапамагаць ім і прымірацца з імі, даравацць нанесеныя крыўды. *Гневайцеся, ды не грашыце: няхай сонца не зайдзе ў гневе вашым (Эф. 4, 26),* — сказаў апостал Павел. Не варта помсціць крыўдзіцелям — ім адмерае па справядлівасці Госпад: *Не помсціце за сябе, любыя, але дайце месца гневу. Бо напісана: Мне помста, Я аддам, кажа Госпад (Рым. 12, 19).* А таксама: *Мяркуйце, ці справядліва перад Богам слухацца вас болей, чым Бога (Дзеі 4, 19).*

7-я запаведзь Закону Божага: *Не пралюбадзейнічай*

Гэтую запаведзь можна выказаць інакш — «не пералюбі». Пачуццё любові — гэта самае

святое пачуццё, падстава ўсялякай цноты. Але грэх, заўсёдная пляга чалавецтва, ператварае гэтае пачуццё з нармальнага ў ненармальнае. Калі любоў пераўзыходзіць свае межы, адбываецца найвялікшае зло. Чым вышэй скажоны прадмет, тым большае зло адбываецца. Цела чалавека, якое не падпарадкоўваецца духу — неўтаймаваная жывёліна. Воля, а не інстынкт, павінна вызначаць чалавечыя ўчынкі. Паглядзіце на пралюбадзея, ён у тысячу разоў больш няшчасны за ўсіх астатніх людзей. Асалода граху мінае хутка, а скруха вечная. Тыя, хто парушае гэтую запаведзь, пазбаўляюцца многіх душэўных сіл і здольнасцей. Звычайна губляецца памяць, азмрочваецца розум, слабне і забіраецца ў палон воля, апаноўваюць неспакой і нахабства. Такі чалавек гідзіцца сам сабою.

Нябачная повязь, што злучала «дваіх ў адно цела», парываецца, і людзі зноў разлучаюцца і робяцца чужыя адзін аднаму.

Блуд — бязладная цялесная любоў між людзьмі, якія не пабралі шлюбу.

Пралюбадзейства — перанос любові людзей, звязаных шлюбам, на пабочных асоб.

Кровазмяшэнне — злучэнне повяззю, падобнаю да шлюбнай, блізкіх родзічаў.

Распуста цесна звязаная з грахом абжорства. Прап. Ніл Сінайскі кажа: «Распуста абапіраецца на абжорства». Пра гэты грэх нават згадваць нядобра. Пра шматлікія грахі, звязаныя з парушэннем

гэтай Запаведзі, апостал Павел раіць не казаць у голас: *А блуд і ўсялякая нячыстасць і прагавітасць няхай і не згадваецца ў вас, як і належыць святым. Ілаянка, і благія жарты або блюзнерствы непатрэбныя, а лепш падзяка: бо, каб вы ведалі, што ніякі распуснік, ці нячысты, ці хцівец, які ёсць ідалапаклоннік, не мае спадчыны ў Царстве Хрыста і Бога (Эф. 5, 3-5).*

Распуснае жаданне разбэшчвае да крайняй ступені душэўныя сілы (знерваваны, дурны, пазбаўлены чысціні розуму). Св. Іаан Залатавусны кажа: «Калі цябе не вельмі палохае будучае пакаранне, дык пабойся цяперашняга свайго стану, і нават ніхто не паспачувае тваайму злашчасцю».

Распуста — вялікае зло, якое апаноўвае чалавека, нават выклікаючы хваробы, і прыніжае да стану, горшага за жывёльны. Каб паставіць заслон гэтаму злу, усімі культурамі і цывілізаванымі народамі парушальнікі гэтай Запаведзі сурова ганіліся і караліся. Вуснамі цара Барыса сыну-юнаку даецца такі наказ: «Захоўвай святую чысціню…». Распуснік — лішні чалавек у грамадстве, які аказвае згубны ўплыў на яго маральнае здароўе. Злачынная маці забываецца на далікатнасць свайго полу. Услед за гэтай заганай ідзе галеча.

Госпад у прыпавесці пра блуднага сына паказвае ўсю згубнасць гэтага шляху. У душы такога чалавека — змрок. Суб'ектыўны негатыўны стан пагаршаецца аб'ектыўным — да ўнутранага стану душэўнай азмрочанасці дадаюцца згрызоты зне-

шнія. У нейкі момант гэта робіцца нясцерпна, і тады чалавек у скажэнні розуму і душэўных сіл робіць замах на ўласнае жыццё. Распусніку ўсё бачыцца ў скажоным святле, таму што замарачэнне цалкам скажае светапогляд. Думка ўваходзіць у абсяг розуму, потым у абсяг сэрца, а потым ахоплівае і абсяг волі, і чалавек беззваротна гіне для вечнасці.

У Новым Запавеце Госпад забараняе нават глядзець на жанчыну, таму што гэтае полымя паглынае ўсе добрыя пачуцці душы: *А я кажу вам, што кожны, хто глядзіць на жанчыну з распуснымі думкамі, ужо блудзіць з ёй у сэрцы сваім. Калі ж правае вока тваё спакушае цябе, вырві яго і кінь ад сябе, бо лепей табе, каб загінуў адзін член цела твайго, чымсьці ўсё цела тваё будзе ўкінутае ў геену (вогненную) (Мц. 5, 28-29).*

Святое Пісанне наказвае мець святую любоў, мудрую любоў, да самаадрачэння: *Мужы, любіце сваіх жонак, як Хрыстос палюбіў Царкву і выдаў Сябе за яе, каб асвяціць яе (Эф. 5, 25).* А таксама: *Жонкі, пакарайцеся сваім мужам, як Госпаду, бо муж ёсць галава жонкі, як і Хрыстос галава Царквы, і Ён жа збавіцель цела (Эф. 5, 22-23).*

Каб пазбегнуць духоўнага пралюбадзейства, трэба страхам Божым выганяць дух нячыстасці, дух д’ябальскі. Св. Іаан Шматпакутны ў змаганні з гэтай цягай зарываў сябе на некалькі дзён у зямлю. Целы нашыя трэба захоўваць у чысціні, бо яны — члены Хрыстовыя і храмы Святога Духа, —

гаворыць апостал Павел: *Уцякайце ад распусты: усякі грэх, які робіць чалавек, не закранае цела, а распуснік грашыць супраць уласнага цела. Хіба не ведаеце, што целы вашыя ёсць храм Духа Святога, што жыве ў вас, Якога вы маеце ад Бога (1 Кар. 6, 18-19)?*

Госпад звязвае мужа і жонку шлюбнай повяззю — «двое ў адно цела», стварае непарыўную лучнасць, але варта толькі паслізнуцца, як суладдзе душ парываецца, моц дабратворная ўжо не злучае, а выяўляюцца два супрацьлеглыя пачаткі, і распадаецца сям'я, грамадства, нацыя.

Зло, якое адбываецца пры парушэнні 7-й Запаведзі, неапісальнае і не мае ступені і межаў. Адно цяжкое парушэнне нараджае шматлікія грахі. Таму трэба папярэджваць яго з трывалай цярплівасцю.

8-я запаведзь Закону Божага: *Не крадзі*

У 6-й і 7-й Запаведзях Госпад аберагае чалавечае жыццё, працягласць якога залежыць ад 5-й Запаведзі аб ушанаванні сваіх бацькі і маці. Коратка гэтыя Запаведзі могуць быць пазначаныя як шанаванне бацькоў, захаванне лагоды і цялесная ўстрыманасць. У 8-10 Запаведзях забараняецца датыкацца да ўсяго, што нам не належыць. 8-я запаведзь забараняе прысвойваць ўласнасць бліжняга (крадзеж).

Біблейскі прарок Захарыя асуджае несумленнае набыццё рэчаў. Ім сказана, што праклён, які сыходзіць на ўсіх насельнікаў зямлі, таму, хто краў, — той будзе знішчаны: *І сказаў ён мне: што ты бачыш? І я адказаў: я бачу — ляціць світак, у даўжыню дваццаць лакцей, і ў шырыню дзесяць лакцей. І сказаў ён мне: гэта праклён, які сыходзіць на твар усёй зямлі; бо на кожнага злодзея падзе помста ад гэтага нават да смерці, і на кожнага, хто прысягаў крыва, ад гэтага падзе помста да смерці. І вынесу яго, кажа Госпад Саваоф, і ўвойдзе ў дом злодзея і ў дом таго, хто маніць, прысягаючы імем маім, і аселіцца пасярод дому яго, і знішчыць яго, і дрэва яго, і каменне яго (Зах. 5, 2-4).* Матчын праклён вынішчыць дом дашчэнту, тым больш, праклён Госпада Бога. Адзін раз, у асобе прабацькоў, Госпад навёў праклён на зямлю, і ён вісіць, як Навуходаносараў меч, і сячэ тых, хто падпадае пад гэты грэх.

Гэты грэх мае разнастайныя праявы. Першы грэх — грабеж без цырымоніяў з ужываннем грубай сілы.

Крадзеж — патаемнае выкраданне чужой рэчы, калі злодзеі імкнуцца незаўважна пракрасціся ў дом і застацца нявыкрытымі.

Святатацтва — выкраданне тых прадметаў, якія былі прысвечаныя Богу або Царкве: воск, алей ці яшчэ што-колечы. Той, хто ўкраў, адлучаецца ад Царквы, ад Царкоўнага суразмоўя. 73-е

правіла Апосталаў гаворыць: «Хто ўкрадзе посуд залаты або срэбны, той адлучаецца на 15 гадоў і абавязаны прынесці пяцікратную кампенсацыю скрадзенага». Гэта пахілая сцежка для чалавека, які мае дачыненне да царкоўных каштоўнасцей.

Духоўнае святатацтва (сыманія), паводле імя вешчуна Сымона, які хацеў атрымаць дабратворныя дары за грошы, азначае выкарыстанне духоўных ведаў у мэтах собскае карысці. Вяшчун Сымон, пабачыўшы ў Самарыі, што праз ускладанне рук апосталаў Пятра ды Іаана перадаецца Святы Дух, прапанаваў ім грошы, каб атрымаць ад іх гэтую ўладу — нізводзіць Святога Духа на іншых. Але ў адказ на сваю прапанову ён пачуў ад апостала Пятра толькі суровы прысуд: *Няхай срэбра тваё будзе з табой на загубу, бо дар Божы ты маніўся за грошы прыдбаць (Дзеі 8, 20).*

Духоўнае ён вымяраў матэрыяльным. А духоўны дар можа мець толькі той, хто мае адпаведныя душэўныя якасці. Духоўнае святатацтва згубнае для абодвух бакоў, бо бясцэннае і набываецца, і аддаецца — за ўзнагароду; у той час як Госпад наказаў Апосталам бескарыслівасць: *Задарма дасталі, задарма давайце (Мц. 10, 8).*

Ліхвярства — выкарыстанне чужой уласнасці з карысцю для сябе, калі бярэцца больш, чым належыцца. Асабліва распаўсюджаны гэты грэх у цяперашнія часы.

Падман — усялякае несумленнае набыццё нейкіх даброт.

Хабарніцтва — пабіранне хабару ад падначаленых або падсудных. У Святым Пісанні сказана: *Дарункаў не прымай, бо дарункі асляпляюць вочы відушчым і пераварочваюць словы справядлівых (Вых. 23, 8).*

Тут ёсць небяспека пайсці супраць сумлення, апраўдваючы вінаватых і ўціскаючы бязвінных.

Дармаедства — атрыманне заплаты за справу, якая насамрэч не рабілася. Чалавек павінен шчырай і нялёгкай працаю здабываць сабе дабро. Адаму быў дадзены наказ: *У поце аблічча свайго будзеш есці хлеб свой (Быц. 3, 17-19).* Ідэальна выканаць гэты наказ цяжка. У прыпавесці аб талентах паказана дапушчальнасць памнажэння маёмасці (Мц. 25, 13-30); у ёй апавядаецца аб тым, як адзін чалавек, што атрымаў пяць талентаў, набыў яшчэ пяць, іншы атрымаў два таленты, набыў два, а трэці атрымаў адзін і нічога не набыў, а зарыў яго ў зямлю, г. зн. выкарыстаў жыццё на самога сябе і быў пазбаўлены духоўных даброт. Таму праца неабходная, але да яе трэба прыкладаць справы духоўнай і цялеснай міласці.

У св. Ціхана Задонскага ёсць словы: «Скрадзенае чужое дабро, як агонь, што ўвайшоў у дом, усю іншую маёмасць з'ядае» (Творы свц. Ціхана Задонскага. 1994, т. IV). Таму драпежнік і грабежнік прыпадабняюцца да таго, хто носіць ваду рэшатам: крадзі, чалавеча, але ведай, нішто не пойдзе табе на карысць, і ўсё пральецца скрозь пальцы.

Пра гэта кажа прыказка: «У злодзея ні кала, ні двара». Як толькі рэч скрадзеная, адразу дабрабыт у доме заканчваецца. Разам з чужым дабром у дом уносіцца няшчасце. Смутак па дабротах гэтага свету, у адрозненне ад смутку па Богу, у выніку нясе смерць. *Бо смутак па Богу нерупліваe пакаянне ў збаўленне ператварае (2 Кар. 7, 10).* Сумаваў па дабротах гэтага свету Іуда, і канец яго вядомы. У адрозненне ад Іуды, апостал Пётр меў смутак па Богу — і пражыў годнае жыццё.

Пры забароне гэтых грахоў прадпісваюцца наступныя цноты: 1) бескарыслівасць; 2) вернасць; 3) справядлівасць; 4) літасць да бедных. *Калі хочаш быць беззаганны, пайдзі, прадай маёмасць тваю і раздай бедным; і будзеш мець скарб на Небе (Мц. 19, 21),* — сказаў Хрыстос юнаку, які прагнуў дасканаласці. Але гэта была не запаведзь, а евангельскі наказ дасканалае бескарыслівасці. Хочаш быць сонцам — выконвай гэтую запаведзь, а хочаш застацца зоркай — тады жыві ва ўласным свеце.

9-ая запаведзь Закону Божага:

Не сведчы ілжыва супраць бліжняга свайго

Богу заўгодна было не толькі, каб мы не згадвалі імя Госпада марна, але Яму заўгодна і тое, каб мы і вобраз бліжняга не бэсцілі ў сэрцах сваіх. У гэтым прасочваецца непасрэдная сувязь паміж За-

паведзямі. Іх нельга памяняць месцамі. У 10-й Запаведзі Госпад наўпрост падводзіць нас да Новага Запавету, бо яна блізкая па духу да новазапаветных запаведзяў. І таму нас узводзіць на Неба лесвіца з 19 прыступак. З іх 10 прыступак падводзяць да Новага Запавету, астатнія ж 9 ўздымаюць да Неба. Той, хто выйшаў з начнога змроку, не можа ўвайсці ў святло Нябеснае. Новы Запавет асляпіў бы чалавека. Таму Стары Запавет праз Майсея рыхтуе чалавека да ўспрыняцця Новага Запавету.

Мана падобная да молата, мяча і вострай стралы. Тое самае і чалавек, які крывадушна сведчыць супраць бліжняга свайго. Словам можна забіць чалавека. Рэзкае, легкадумна пушчанае слова можа нанесці на сэрцы рану, асабліва чалавеку эмацыянальнаму. Язык — нястрымнае зло, — кажа апостал Якуб: *а ўтаймаваць язык ніхто з людзей не можа: гэта — нястрымнае зло, напоўненае смяротнаю атрутаю (Як. 3, 8).* «Язык мой — вораг мой», і нішто нам так не шкодзіць, як уласны язык. Апостал Пётр кажа: *Бо хто хоча жыццё любіць і бачыць добрыя дні, няхай паўстрымае язык свой ад зла, і вусны свае, каб крывадушна не гаварылі (1 Пят. 3, 10).* Святое Пісанне забараняе выказваць меркаванні пра сапраўдныя недахопы чалавека, а тым больш нагаворваць на яго. *Крыважэрнымі і ліслівымі гідзіцца Госпад (Пс. 5, 7).* Той, хто зграшыў, мае над сабой Суддзю, гаворыць Іаан Залатавусны, навошта ж ты забягаеш уперад улады? Мы ведаем толькі пра яго

падзенне, але не ведаем яго ўнутранага стану. Мы асуджаем яго, а ён моліцца, і Госпад даруе яму. Св. Ціхан Задонскі кажа пра тое, колькі людзей, вартых лепшай долі, праз адзін зласлівы паклёп страціла павагу: «О, неўтаймаваны язык! Колькі благога ты свету робіш! Як вецер раздзімае пажар па цэлым горадзе або вёсцы, гэтак і неўтаймаваны язык ўсялякае зло па ўсёй дзяржаве і па ўсім свеце разносіць. Адзін паклёпнік даведаўся — і ўжо ўсе ведаюць, адзін сказаў — і ўсе гавораць. О, сапраўды лепш сто разоў паткнуцца нагамі, чым языком! Малы член — язык, але шмат благога робіць (Як. 3, 6). Падвойным парканам абнесены, г. зн. зубамі і губамі, але надта ж спрытна вырываецца і вытыркаецца» («Скарб духоўны, па свеце збіраны»).

Чым больш чалавек схільны да граху, тым больш ён ганіць, і чым чалавек чысцейшы, тым менш ён схільны да асуджэння. Ісус Хрыстос сказаў: *Не судзіце, каб не былі асуджаныя (Мц. 7, 1).* А таксама: *І што ж ты ўгледзеў сучок у воку брата твайго, а бервяна ва ўласным воку не заўважаеш (Мц. 7, 3)?* Апостал Якуб сказаў, што належыць стрымліваць язык: *Калі хто сярод вас думае, што ён багабойны, ды не закілзае языка свайго, але ашуквае сэрца сваё, у таго багабойнасць пустая (Як. 1, 26).* Таксама пра гэта гаворыць апостал Пётр: *Бо хто хоча жыццё любіць і бачыць добрыя дні, няхай паўстрымае язык свой ад зла, і вусны свае, каб крывадушна не гаварылі (1 Пят. 3, 10).*

Апостал Павел кажа: *Дзеля гэтага, адкінуўшы хлусню, гаварыце кожны праўду бліжняму свайму, бо мы члены адзін аднаму (Эф. 4, 25).* Мы павінны дзейнічаць на карысць усяму целу, бо мы яго члены, — а не шкодзіць яму. Св. Дзьмітры Растоўскі гаворыць: «Не радуйся з памылкі бліжняга, а, наадварот, плач і лямантуй, лічучы яго падзенне нібыта за ўласнае. (…) Адны толькі чэрці радуюцца з загібелі грэшных, бо і самі незваротна загінулі. Чалавек павінен радавацца з чалавечага збаўлення, — каб і самому атрымаць збаўленне і знайсці літасць ў Бога сёння і ў дзень Суда («Альфабэт духоўны»).

Дрэнныя намеры задрэнчваюць, працінаюць сэрца палымяным мячом, змушаючы пацярпелага пакінуць месца і пазбягаць таго, ад каго ён церпіць.

Гэта запаведзь забараняе паклёпніцтва і крывадушную прысягу ў судзе.

10-я запаведзь Закону Божага:

Не пажадай сабе жонкі бліжняга свайго, не пажадай дому бліжняга свайго, ані поля яго, ані нявольніка яго, ані нявольніцы, ані вала яго, ані асла, аніякае жывёлы яго, анічога, што належыць бліжняму твайму.

Гэтая запаведзь забараняе юрлівыя жаданні, у другую чаргу — карыслівыя і ўладалюбныя жа-

данні. Гэтая запаведзь блізкая да запаведзяў Новага Запавету. Якое жаданне мае чалавек у цяперашнім жыцці, такі будзе кірунак руху яго душы і пасля смерці.

Думкі для чалавека маюць вялікае значэнне. Тое, што свежае паветра для цела, тое і чыстыя думкі для душы. Яны ўмацоўваюць душу на добрыя справы. Наадварот, атрутнае паветра заражае цела і заўчасна зводзіць яго ў дамавіну. З заразлівага паветра ўсе імкнуцца выйсці. Гэтак і ў душы, дзе асяліліся жарсці, няма месца Анёлам, там толькі чэрці радуюцца ўсёй чарадой. Душа пазбаўляецца духоўнага святла і знаходзіцца ў стане азмрочанасці, скрухі і пакут. Гэтаксама, як на чыстым паветры адчуваецца пах кветак, і ўсё жывое імкнецца да гэтага месца, так і ў душы, асвечанай шляхетнымі думкамі, адчуваецца падых Божае ласкі. Чалавек, які не мае спакою, не можа выказаць сябе ціхмяным, але распаўсюджвае на ўсё, што яго атачае, раздражненне, нервовасць. Ад душы, якая паглыбляецца ў заганны настрой, адступаюцца Анёлы Божыя, і яна трапляе ў рукі адрынутых анёлаў і Зараніцы, што стаяць за левым плячом і поўнасцю апаноўваюць душой юрліўца. Няправедныя думкі — агіда для Госпада: *Госпад гідзіцца думкамі няправеднымі (Прып. 15, 26).* Няправедныя думкі апаганьваюць чалавека: *Бо з сэрца зыходзяць благія думкі, забойствы, чужаложствы, распуста, крадзяжы, крывадушныя сведчанні, ганьбаванне (Мц. 15, 19).* У нячыстым

сэрцы — нячыстыя думкі. З чыстага сэрца зыходзіць адно дабро, з нячыстага — адна прагавітая пажадлівасць, адны грахі. Апостал Якуб сказаў: *У спакусе няхай ніхто не кажа: Бог мяне спакушае; бо Бог не спакуснік благім, і Сам нікога не спакушае. Але кожны спакушаецца, захоплены і прываблены ўласнай пажадаю: а тая пажада, зачаўшы, спараджае грэх, а ўчынены грэх спараджае смерць (Як. 1, 13-15).* Пажадлівасць авалодвае чалавекам і спараджае грэх, а грэх спараджае смерць.

Прап. Ніл Сорскі, спасылаючыся на Святых Айцоў (прап. Іаан Лесвічнік, прап. Філафей Сінаіт, прап. Ісаак Сірын, прап. Сымон Новы Багаслоў) апісвае развіццё жарсці па меры захаплення чалавека яе прадметам (Клін, 2001):

прыклад →	спалучэнне →	складанне →	палон →	жарсць
уяўленне аб задуме або прадмеце	прынящце яго (думкі аб ім, развважанні)	згода з ім (прыхільны прыём задумы)	заняволенне ім (захапленне)	схільнасць і дзеянне – існасць душы

дынаміку жарсці даседаваў свц. Феафан Пустэльнік (Жарсці і барацьба з імі. М. 2004):

спакуса →	прыклад →	увага →	асалода →	жаданне →	рашучасць →	справа
ад свету	уяўленне пра рэч, нараджэнне вобразу	свядомая фіксацыя на вобразе	прадмет пачынае падабацца	актыўны пошук прадмета	прынящце рашэння аб канкрэтных дзеяннях	
знешні штуршок	розум	розум	сэрца	воля	воля	вынік

Можна прасачыць пэўную паслядоўнасць удзелу ў развіцці жарсці спачатку розуму, потым сэрца і, нарэшце, волі.

Стадыі развіцця жарсці, паводле вучэння Святых Айцоў:

1. Прыклад. Думка прыходзіць у выглядзе прыкладу, які з'яўляецца простым уяўленнем пра рэч, яно спараджаецца дзеяннем або пачуццём, або выплывае з памяці і ўяўлення, што ўзнікла ў нашай свядомасці. Тут яшчэ няма граху, бо прыклад не залежыць ад нас. Яго прычына — цела, падобнае да неўтаймаванай жывёліны.

2. Увага — гэта фіксацыя свядомасці, або разумовага вока, на народжаным вобразе, каб яго разгледзець, каб пагутарыць з ім. Хто ўнутрана зазіраецца на злачынны прадмет, той выкрывае дрэнны настрой сэрца. Ён прыпадабняецца да таго, хто ў

чысты пакой уводзіць брудную жывёліну. Гэты момант вельмі важны ў маральным жыцці. Ён стаіць на пераходзе да спраў. Хто адагнаў думкі, той разам загасіў усю бойку, спыніў здзяйсненне граху.

3. Асалода — гэта дакрананне да прадмета ўслед за розумам і сэрцам.

4. Жаданне адрозніваецца ад асалоды тым, што душа ў асалодзе трывае сама ў сабе, а ў жаданні схіляецца да прадмета, мае да яго цягу, пачынае шукаць яго.

5. Рашучасць паўстае тады, калі апанаваны жаданнем выказаў згоду на выкананне ўчынку, але яшчэ не прыдумаў і не ўчыніў нічога дзеля дасягнення мэты. У таго, хто рашыўся, ужо ўсё згледжана і вырашана, застаецца толькі прывесці ў рух часткі цела або іншыя сілы дзеля выканання ўчынку.

6. Калі гэтае апошняе адбываецца, тады заканчваецца ўвесь працэс здзяйснення граху і паўстае справа — плод разбэшчанасці і беззаконнасці, зачатая ўнутры і народжаная вонкі.

7. Часта здзейсненая грэшная справа пераходзіць у заганную распусту, г. зн. найстрашнейшы грэшны стан чалавека.

8. Распаленая заганная распуста пераходзіць у жарсць (пакуль у чалавеку жыве цялесная моц). Таму хрысціянскія падзвіжнікі-аскеты даюць параду: «Змагайся і гані думкі, пакуль яны яшчэ не зранілі сэрца, бо тады барацьба будзе надта цяжкая і немагчымая». Невыпадкова чалавека, якога апанавала жарсць, выправіць толькі магіла.

Стары Запавет забараняе мецъ думкі юрлівыя, карыслівыя, уладалюбныя, а Новы Запавет указвае на нішчымнасць духу і тым самым змушае нас да здзяйснення добрых учынкаў, пачынае звяртаць увагу на зародкі спраў (прыклады).

Грэх супраць 10-й Запаведзі адзіны — гэта зайздрасць. Апостал Якуб сказаў пра зайздрасць: *Калі ў вашых сэрцах маеце вы горкую зайздрасць і зацятасць, не хваліцеся і не брашыце на праўду: гэта не тая мудрасць, што з гары зыходзіць, але зямная, душэўная, дэманічная: бо дзе зайздрасць і сваркі, там безлад і ўсялякія благія рэчы (Як. 3, 14-16).* Як іржа раз’ядае метал, гэтак і зайздрасць раз’ядае душу чалавека. Хто б ты ні быў, гэтай жарсцю нікому не наробіш ты гэтулькі шкоды, колькі сабе самому. Моль і чарвяк не так точаць дрэва, як зайздрасць з’ядае чалавека.

Св. Васіль Вялікі гаворыць: «Маўляў тыя каршуны, што, пралятаючы паўз шматлікія лугі, паўз незлічоныя мясціны, прыемныя і пахучыя, імнуцца да чагосьці смярдзючага, ці як тыя мухі, што, абмінаючы здаровае, спяшаюцца на гной, гэтак зайздроснікі не глядзяць на светлы бок жыцця, на веліч заслуг, нападаюць жа на адно гнілое (Гутарка 11, «Пра зайздрасць»). Свяціцель кажа, што зайздрасць — гэта жаль па дабрабыце бліжняга. Зайздросцім маламу, што ён можа ўзняцца вышэй; падобнаму да сябе — што ён можа ўзвысіцца; большаму за сябе — яго поспеху. Зайздроснікамі былі Каін, Язэпавы браты, Авесалом,

фарысеі. Як вецер разносіць агонь па ўсёй вёсцы, гэтак адзін паклёпнік разносіць ману і няславу па ўсім горадзе, па цэлай дзяржаве.

Зайздрасць — гэта жыццёвая атрута. Зайздрослівы не мае пацехі ні з дабра, ні з радасці, а цешыцца толькі з няшчасцяў. Чым чалавек шчаслівейшы, тым больш ворагаў-зайздроснікаў узбройваецца супраць яго.

Свп. Кіпрыян Карфагенскі піша: «Зайзрасць пакідае след: пагрозлівы пагляд, бледнае цела, дрыготкія вусны, сціснутыя, гатовыя ўцяць кулакі…»

Смерць увайшла ў свет праз зайздрасць д'ябла. Падобныя да яго і зайздроснікі, бо яны заўсёды імкнуцца да нешчаслівага канца або смерці. Калі бачыш, адкуль нацэлены ўдар, можна ўхіліцца, а язва зайздрасці незаўважная, гэта корань грахоў. Ва ўсёй гісторыі Старога і Новага Запавету зайздрасць прынесла самыя горкія плады. Каін не атрымаў унутранага спакою, але пачуў словы: *і цяпер ты пракляты (Быц. 4, 11).* Забойца брата з тварам, скажоным скрухай і зайздрасцю, хадзіў і шукаў, хто б забіў яго, але Госпад сказаў, што сямікратна адпомсціць таму, хто заб'е Каіна. Другі прыклад – Авесалом, сын Давідаў, які паўстаў супраць роднага бацькі і шукаў, як забіць яго, і ў гэты час бясслаўна загінуў (2 Цар. 18, 14).

Зайздрасць — гэта самая зацятая і злосная варожасць; зайздросніка дабрадзействы толькі раздражняюць. Зайздроснікі, атрымліваючы паслугі,

яшчэ горш раз'юшваюцца. Чым болей робіцца чалавеку дабра, тым больш яно раздражняе зайздросніка. Гэткай мішэнню для зайздрасці быў Саўл, гэткага звера давялося пазбягаць і праведнаму Давіду. Нарэшце, Госпада на Крыж прывялі злосць і нянавісць іудзеяў.

Зайздрасць цягне за сабой новае зло — грэх срэбралюбства. Гэтае новае зло спараджае штораз большае жаданне ўзбагачэння, і ніякая колькасць срэбра не можа заспакоіць срэбралюбца, а толькі яшчэ горш распальвае яго прагу. Паводле вучэння Святых Айцоў, канец зайздрасці — гэта жаданне бачыць самую лютую загібель ворага.

ВЫСНОВЫ

Катэхізіс ставіцца ў галаву ўсяго Багаслоўя. Ён суровы і кароткі, але ўтрымлівае багаты матэрыял, павучальныя праўды веры і маралі. У старой школе Катэхізіс вывучалі на працягу пяці гадоў, каб добра яго засвоіць. Гэта «рэцэпт», які павінен выконваць кожны культурны і разумны чалавек, каб адчуваць спакой і душэўнае здароўе. Мэта Катэхізіса — прывесці ў выкананне выкладзеныя праўды, здзейсніць іх ва ўласным жыцці. Калі мы не будзем прыкладаць да жыцця гэтыя праўды, яны застануцца мёртвыя. Тым больш належыць імкнуца зрабіць гэта ў адносінах да ведаў пра свет духоўны. Парушэнне законаў духоўнага жыцця прыносіць непамернае зло. Збочыць з іх яшчэ

горш, чым не ведаць шляхоў Госпадавых увогуле. Ісус Хрыстос сказаў пра гэта ў форме прыпавесці: *Слуга ж той, які ведаў волю гаспадара свайго і не быў гатовы, і не рабіў паводле волі яго, будзе моцна біты (Лк. 12, 47),* а апостал Пётр наўпрост: *Бо, уцёкшы ад поскудзі свету праз пазнанне Госпада і Збавіцеля нашага Ісуса Хрыста, зноў, заблытаўшыся, паддаюцца ёй, дык апошняе для іх горш за першае (2 Пят. 2, 20).*

Паводле вучэння Святых Айцоў, смерць душы — гэта страта найвышэйшых маральных каштоўнасцей, жыццё жыццём цялесным, матэрыяльным, поўным пажадлівасці і дробных паўсядзённых інтарэсаў. Яно настае пры пазбаўленні Божай ласкі, калі чалавек цялесна жывы, але «…страціў ужо вобраз і падабенства Божае, як быў створаны напачатку, а набыў вобраз і падабенства д'ябла, ад якога ўсялякае ліха» (Прап. Сімяон Новы Багаслоў. Слова М, 2001, с. 66). Для характарыстыкі «мёртвай душы» ў духоўных сачыненнях выкарыстоўваецца вобраз «вонкавага чалавека», або «цялеснага», які з цудоўнай дакладнасцю адлюстраваны ў паэме М. В. Гогаля «Мёртвыя душы».

Калі на гэтым шляху мы заўважым цяпер або пад вечар нашага жыцця здзейсненыя намі грахі, дык трэба не толькі пакаяцца, але і прынесці плады, вартыя пакаяння, г. зн. загладзіць іх цнотамі, супрацьлеглымі граху. Прыкладам можа быць выкананне намеру Закхея вярнуць учацвёра больш ўсім, каго ён пакрыўдзіў: *Вось, палову маёмасці*

маёй, Госпадзе, аддам убогім, а калі каго чым пакрыўдзіў, аддам учацвёра болей (Лк. 19, 8).

Калі мы выканаем увесь закон, сумленне наша будзе чыстае, і мы бузем адчуваць праўду, спакой і ласку ў Святым Духу: *ачысцім сябе ад усякага бруду цела і духа, здзяйсняючы святасць у страху Божым (2 Кар. 7, 1).* Але і ў гэтым выпадку недапушчальна спыняцца на шляху. Памятайце словы Госпада: *калі зробіце ўсё, загаданае вам, гаварыце: мы рабы нічога не вартыя (Лк. 17, 10).* Калі вы і зрабілі што-небудзь вартае, не трэба на гэта зважаць, узыходзячы ад цноты да цноты, бо ўсё гэта вы зрабілі з Божай дапамогаю, а інакш Госпад адыме ласку і пакажа, хто мы ёсць насамрэч.

Госпад сказаў, што шчаслівыя тыя, хто пераймае Яго прыклад: *Калі гэта ведаеце, шчаслівыя вы, калі гэта рабіць будзеце (Ін. 13, 17).* Прарок Давід у 44-м псалме апавядаў аб тым, якія малітвы пачуе Госпад: *Сэрца маё пераліваецца ад словаў прыемных, гавару я справы мае Цару, язык мой — стыло спрытнага пісара (Пс. 44, 2).* Гэта словы, якія вымаўляюцца з глыбінь чалавечае існасці, маўляў, тое стыло, якім водзіць Сам Бог. Яны прыемныя Госпаду.

ЛІТАРАТУРА

1. Библия, или Книги Священного Писания Ветхого и Нового Завета в русском переводе с параллельными местами и указанием церковных чтений [Біблія, або Кнігі Святога Пісання Старога і Новага Запавету ў рускім перакладзе з паралельнымі месцамі і ўказаннем царкоўных чытанняў]. – СПб.: Издание Патриаршего подворья, 2005; 2007. – 1780 с. (в орфографии издания 1904 г.).
2. Библия. Книги Священного Писания Ветхого и Нового Завета на церковнославянском языке с параллельными местами [Біблія. Кнігі Святога Пісання Старога і Новага Запавету на царкоўнаславянскай мове з паралельнымі месцамі]. – М.: Российское Библейское общество, 2005. Репринтное издание СПб., 1798 г. – 1688 с.
3. Архимандрит Симеон (Холмогоров). Схиархимандрит Гавриил, старец Спасо-Елеазаровой пустыни [Схіярхімандрыт Гаўрыіл, старац Спаса-Елізаравай пустыні]. – СПб.: Издание Центра изучения, охраны и реставрации наследия священника Павла Флоренского, 1996. – 239 с.; 2010. – 416 с.
4. Беляев А. Д. Любовь Божественная: Опыт раскрытия главнейших христианских догматов из начала любви Божественной [Любоў Божая: Досвед раскрыцця найгалоўнейшых хрысціянскіх дагматаў з пачатку Божае любові]. – СПб.: Общество памяти игумении Таисии, 2006. – 508 с.
5. Беляев А. Д. О безбожии и антихристе [Пра бязбожжа і антыхрыста]. – СПб.: Общество памяти игумении Таисии, 2007. – 750 с.

6. В саду Гефсиманском [У садзе Гефсіманскім]. – СПб.: Общество памяти игумении Таисии, 2004. – 60 с.
7. Доказательства Божественности Иисуса Христа [Доказы Боскасці Ісуса Хрыста]. – СПб.: Общество памяти игумении Таисии, 2007 (репринт 1907 г.). – 192 с.
8. Епископ Феофан. Душа и Ангел – не тело, а дух [Душа і Анёл — не цела, а дух]. – М., 1913. – 210 с.
9. Епископ Иларион (Алфеев). Во что верят православные христиане? Катехизические беседы [У што вераць праваслаўныя хрысціяне? Катэхізічныя гутаркі]. – Клин: Христианская жизнь, 2008.
10. Епископ Илия Минятий. Камень соблазна, или изложение начала и причин отпадения Церкви Западной от Восточной и предметов несогласия между ними [Камень спакусы, або выклад пачатку і прычын адпадзення Заходняе Царквы ад Усходняй і прадметаў нязгоды паміж імі]. – СПб.: Общество памяти игумении Таисии, 2010. – 165 с.
11. Иеромонах Симеон Полоцкий. Вечеря душевная [Вячэра душэўная]. – СПб.: Общество памяти игумении Таисии, 2011.
12. Иеромонах Симеон Полоцкий. Жезл правления, утверждения, наказания, казнения [Жазло панавання, зацвярджэння, пакарання, кары смяротнае]. – СПб.: Общество памяти игумении Таисии, 2011.
13. Иеромонах Софроний Сахаров. Старец Силуан [Старац Сілуян]. – СПб.: Общество памяти игумении Таисии, 2007. – 256 с.
14. Иеромонахи Иоанникий и Софроний Лихуды. Мечец духовный [Мечык духоўны]. – СПб.: Общество памяти игумении Таисии, 2011.

15. Инок Евфимий, Патриарх Иоаким. Остен [Асцё]. – СПб.: Общество памяти игумении Таисии, 2006. – 160 с.
16. Инок Дамаскин. Остен, или 105 ответов Гавриилу Домецкому [Асцё, або 105 адказаў Гаўрылу Дамецкаму]. – СПб.: Общество памяти игумении Таисии, 2010. – 196 с.
17. Ключевский В. О. Древнерусские жития святых как исторический источник [Старажытнарускія жыція святых як гістарычная крыніца]. – М.: Наука, 1988. – 512 с.
18. Лебединский П. С. Иисус Христос, Сын Божий – Спаситель мира [Ісус Хрыстос, Сын Божы — Збаўца свету]. – СПб.: Общество памяти игумении Таисии, 2006 (репринт 1896 г.). – 1116 с.
19. Митрополит Стефан Яворский. Камень веры Православно-Кафолической Восточной Церкви [Камень веры Праваслаўна-Кафалічнае Усходняе Царквы]. – СПб.: Общество памяти игумении Таисии, 2010. – 1483 с.
20. Наставления святителя Тихона Задонского, епископа Воронежского, о собственных всякого христианина должностях [Павучанні свяціцеля Ціхана Задонскага, епіскапа Варонежскага, пра ўласныя абавязкі кожнага хрысціяніна]. – СПб.: Общество памяти игумении Таисии, 2005. – 256 с.
21. Описание жизни и подвигов преосвященного Тихона, епископа Воронежского и Елецкого, сочиненное для любителей и почитателей памяти сего преосвященного [Апісанне жыцця і подзвігаў праасвяшчэннага Ціхана, епіскапа Варонежскага і Ялецкага, складзенае для тых, хто любіў і шанаваў памяць гэтага праасвяшчэннага]. – М.: Синод. тип., 1837. – 105 с.

22. Первоиерархи Русской Православной Церкви [Першаіерархі Рускае Праваслаўнае Царквы]. – СПб.: Общество памяти игумении Таисии, 2008. – 88 с.
23. Преп. Симеон Новый Богослов. Слова: в 2-х ч. Пер. с новогреч. епископа Феофана [Прап. Сімяон Новы Багаслоў. Слова: у 2-х ч. Пер. з навагрэцк. епіскапа Феафана] – М., 2001.
24. Собрание писем Оптинского старца иеросхимонаха Амвросия. Письма к мирянам. Письма к монашествующим: вып. 2 [Збор пісьмаў Опцінскага старца іерасхіманаха Амброзія. Пісьмы да міранаў. Пісьмы да манахаў: вып. 2]. – М.: Синтагма – Паломник, 1997.
25. Преподобный Иоанн, игумен Синайской горы (Иоанн Лествичник). Лествица [Лесвіца]. – Издательство Московского подворья Свято-Троицкой Сергиевой лавры. – М., 2006.
26. Преподобный Нил Сорский и его Устав о скитской жизни, изложенный ректором Костромской Духовной семинарии епископом Иустином [Прападобны Ніл Сорскі і яго Статут аб скіцкім жыцці, выкладзены рэктарам Кастрамской Духоўнай семінарыі епіскапам Юстынам]. – Клин: Фонд «Христианская жизнь», 2001. – 127 с.
27. Прот. Григорий Дьяченко. Вера, Надежда, Любовь. Катихизические поучения: в 3-х томах [Вера, Надзея, Любоў. Катэхізічныя павучанні: у 3-х тамах]. – СПб.: Общество памяти игумении Таисии, 2011.
28. Прот. Георгий Титов. Уроки по Пространному Христианскому катихизису. В 2-х книгах. Кн. 1. Введение в Православный катихизис и первые 10 членов Символа веры [Урокі па Падрабязным Хрысціянскім Катэхізісе. У 2-х кнігах. Кн. 1. Уводзіны ў Праваслаўны

катэхізіс і першыя 10 членаў Сімвалу Веры]. М., 1904. – 481 с. Кн. 2. Таинства, 11-й и 12-й члены Символа веры, учение о надежде и о любви [Кн. 2. Таінствы, 11-ая і 12-ая часткі Сімвалу веры, вучэнне пра надзею і пра любоў]. М., 1904. – 451 с.
29. Прот. Евг. Попов. Письма по Православному богословию [Пісьмы па Праваслаўным багаслоўі]. – Пермь, 1874.
30. Прот. Иоанн Иванов. Добро и зло в истории рода человеческого по свидетельству Священного Писания [Дабро і зло ў гісторыі роду чалавечага паводле сведчання Святога Пісання]. – СПб.: Общество памяти игумении Таисии, 2004. – 655 с.
31. Прот. Николай Вознесенский. Сокращенный Православный христианский катихизис [Скарочаны Праваслаўны хрысціянскі катэхізіс]. Игумен Филарет. Конспект по Закону Божию [Канспект па Законе Божым]. – СПб.: Общество памяти игумении Таисии, 2010. – 144 с.
32. Прот. Т. И. Буткевич. Зло, его сущность и происхождение [Зло, яго сутнасць і паходжанне]. – СПб.: Общество памяти игумении Таисии, 2005. – 506 с.
33. Прот. Феодор Голубинский, Левитский Д. Г. Премудрость и благость Божия в судьбах мира и человека [Мудрасць і дабрыня Божая ў лёсах свету і чалавека]. – СПб.: Общество памяти игумении Таисии, 2004. – 376 с.
34. С Рождеством Христовым! Рождественские мотивы в русской поэзии XVIII-XX веков [З Раством Хрыстовым! Калядныя матывы ў рускай паэзіі XVIII-XX стагоддзяў]. – СПб.: Общество памяти игумении Таисии, 2010. – 69 с.

35. Св. Василий Великий. Беседы на Шестоднев [Гутаркі на Шасцідневец]. М., 1999.
36. Св. Григорий Богослов. Творения: в 6 чч. [Творы ў 6 чч.]. – М., 1843–1848.
37. Св. Григорий Нисский. Догматические сочинения. Тт. 1-2. [Дагматычныя творы. Тт. 1-2]. – Краснодар: Текст, 2006.
38. Св. Григорий Нисский. Об устроении человека [Пра ўладкаванне чалавека]. – СПб., 1995.
39. Свт. Димитрий Ростовский. Четьи-Минеи [Чэцці-Мінеі]. – СПб.: Общество памяти игумении Таисии, 2008 (Репринтное воспроизведение издания 1880 г.).
40. Св. Иоанн Златоуст. Избранные творения: в 3-х тт. [Выбраныя творы: у 3-х тт.]. – М., 1993.
41. Свт. Игнатий (Брянчанинов). О ереси и расколе. [Пра ерась і раскол]. Преп. Иоанн Дамаскин. О ереси вкратце [Коратка пра ерась]. – СПб.: Общество памяти игумении Таисии, 2005. – 104 с.
42. Свт. Игнатий (Брянчанинов). Слово о человеке [Слова пра чалавека]. – СПб.: Общество памяти игумении Таисии, 2005. – 107 с.
43. Свт. Иларион, митрополит Киевский. Слово о Законе и Благодати [Слова пра Закон і Ласку]. – СПб.: Общество памяти игумении Таисии, 2006. – 40 с.
44. Свт. Лука (Войно-Ясенецкий). Дух, душа и тело [Дух, душа і цела]. – М., Наука и религия, 2001. – 316 с.
45. Свт. Николай Сербский. Вера святых [Вера святых]. – М.: Покров, 2004. – 130 с.
46. Свт. Тихон Задонский. Творения: в 5 тт. [Творы: у 5-ці тт.]. – Репринт 5-го изд. Издание Свято-Успенского Псково-Печерского монастыря, 1994.

47. Свт. Филарет, митрополит Московский. Православный катихизис. [Праваслаўны катэхізіс]. Прот. Димитрий Соколов. Руководство по Закону Божию [Дапаможнік па Законе Божым]. – СПб.: Общество памяти игумении Таисии, 2010. – 143 с.
48. Свт. Филарет, митрополит Московский. Пространный христианский катихизис Православныя Кафолическия Восточныя Церкви [Падрабязны Хрысціянскі Катэхізіс Праваслаўнае Кафалічнае Усходняе Царквы]. – СПб.: Общество памяти игумении Таисии, 2007. – 104 с. (с приложением: Православный апологетический катихизис. 30 с.)
49. Святитель Феофан Затворник. Страсти и борьба с ними: Выдержки из творений и писем [Жарсці і барацьба з імі: Вытрымкі з твораў і лістоў] / Сост. Игумен Феофан (Крюков). – М.: Даниловский благовестник, 2004. – 327 с.
50. Св. Иоанн Дамаскин. Точное изложение православной веры [Дакладны выклад праваслаўнае веры]. – М.: Издание Сретенского монастыря, 2003. – 384 с.
51. Свящ. А. Невский. Уроки Пространного Православно-христианского катихизиса [Урокі Падрабязнага Праваслаўнага хрысціянскага катэхізіса]. М., 1916. – 158 с.
52. Сильченков К. Н. Прощальная беседа Спасителя с Учениками [Развітальная гутарка Збавіцеля з Вучнямі]. – СПб.: Центр изучения, охраны и реставрации наследия священника Павла Флоренского. – СПб., 1997. – 360 с.
53. Сильченков К. Н. Новая запаведзь [Новая запаведзь]. – СПб.: Центр изучения, охраны и реставрации наследия священника Павла Флоренского, 1999. – 383 с.

54. Сказание о жизни и подвигах старца Серафима, иеромонаха Саровской пустыни и затворника, извлеченное из записок ученика его [Сказ пра жыццё і подзвігі старца Серафіма, іераманаха Сароўскае пустыні і затворніка, выняты з нататак яго вучня]. – СПб.: Общество памяти игумении Таисии, 2005. – 224 с.
55. Соллертинский С. А. Пастырство Христа Спасителя [Пастырства Хрыста Збаўцы]. – СПб.: Общество памяти игумении Таисии, 2005. – 468 с.

ДАДАТАК

УРЫЎКІ СА СВЯТОГА ПІСАННЯ ДЛЯ ЗАПАМІНАННЯ

І. УВОДЗІНЫ

ПРАДМОВА

Каб ты мог ведаць з пэўнасцю тыя словы, якіх цябе навучылі (Лк. 1, 4).

А той пачаў адважна прамаўляць у сінагогах (Дзеі 18, 26).

Без веры немагчыма дагадзіць [Богу] (Яўр. 11, 6).

Вера без справаў мёртвая (Як., 2, 20).

Бо вера — гэта здзяйсненне спадзяванага, упэўненасць у рэчах нябачных (Яўр., 11, 1).

Бо калі вы не верыце, вы не ўпэўненыя (Іс. 7, 9).

... Чыстыя сэрцам (...) пабачаць Бога (Мц. 5, 8).

На гэта зважай, у гэтым будзь, (у гэтым разумей), і няхай поспехі твае для ўсіх будуць яўныя (1 Цім. 4, 15).

Просіце, і не атрымліваеце, таму што дрэнна просіце, каб ужыць на раскошы вашыя (Як. 4, 3).

2. Склад прадмету Катэхізіса

Бо сёння трываюць вера, надзея, любоў — гэтыя тры, але большая з іх — любоў (1 Кар. 13, 13).

Любоў церпіць доўга, міласэрная, любоў не зайздросціць, любоў не заносіцца, не ганарыцца, не вывышаецца, не шукае свайго, не раздражняецца, не замышляе благога, не радуецца з крыўды, але цешыцца з праўды: усё пакрывае, усяму дае веры, усяго спадзяецца, усё трывае. Любоў ніколі не чэзне, нават калі прароцтвы перастануць збывацца, нават калі мовы змоўкнуць, нават калі розум спустошыцца (1 Кар. 13, 4-8).

2. Сутнасць рэлігійнага светапогляду

Хіба забудзе жанчына таго, каго выкарміла, і не пашкадуе дзіця свайго ўлоння? Але нават калі забудзе іх жанчына, дык Я не забуду цябе, — кажа Госпад (Іс. 49, 15);

І зрабіў Госпад Бог чалавека з пылу зямнога і ўдыхнуў ў ноздры яго дыханне жыцця: і стаў чалавек душою жывою (Быц. 2, 7).

Як прагне алень да водных крыніц, так імкнецца душа мая да Цябе, Божа (Пс. 41, 2)!

5. Рэлігія Старога Запавету

І варожасць пакладу паміж табою і паміж жанчынаю, і паміж насеннем тваім і паміж насеннем яе; яно будзе раніць тваю галаву, і ты будзеш раніць яго пяту (Быц. 3, 15).

II. ВЕЛІЧ ЧАЛАВЕКА

4. Хрысціянскае вучэнне аб чалавеку як носьбіце вобразу Божага ў духу сваім

І сказаў Бог: створым чалавека паводле вобразу Нашага і падабенства Нашага (Быц. 1, 26).

І ўзяў Госпад Бог чалавека, якога стварыў, і ўвёў яго ў сад Эдэнскі, даглядаць яго і ахоўваць (Быц. 2, 15).

І стварыў Госпад Бог яшчэ ад зямлі ўсіх звяроў палявых і ўсіх птушак нябесных, і прывёў іх да чалавека, каб бачыць, як ён іх назаве (Быц. 2, 19).

І зрабіў Госпад Бог з рабрыны, што ўзяў ад чалавека, жанчыну, і прывёў яе да чалавека (Быц. 2, 22).

І надаў чалавек імёны ўсёй скаціне, і ўсяму птаству нябеснаму, і ўсім звярам зямным (Быц. 2, 20).

І былі яны абое голыя, чалавек і жанчына яго, і не саромеліся (Быц. 2, 25).

5. Праявы свавольства з боку першага чалавека і яго адмова ад Божага кіраўніцтва

Будзеце як багі (Быц. 3, 5).

Бо калі нават ўвесь закон выконвае, але саграшыць у нечым адным, будзе вінаваты ва ўсім (Як. 2, 10).

Праклятая зямля праз цябе, ў цяжкай працы бузеш карміца з яе праз усе дні жыцця твайго (Быц. 3, 17).

6. Наступствы грэхападзення

І схаваўся Адам і жанчына яго перад абліччам Госпада Бога (Быц. 3, 8).

Адаме, дзе ты ёсць (Быц. 3, 9)?

І сказаў Адам: жанчына, якую даў Ты, каб была са мною, гэта яна дала мне ад дрэва, і я еў. (...) І сказала жанчына: змей спакусіў мяне, і я ела (Быц. 3, 12-13).

Праклятая зямля праз цябе, у цяжкай працы будзеш карміцца з яе праз усе дні жыцця твайго: церні і ваўчыц народзіць яна табе, і будзеш есці траву палявую. У поце аблічча свайго будзеш есці хлеб свой, пакуль не вернешся ў зямлю, з якой ты быў узяты: бо ты ёсць зямля і ў зямлю вернешся (Быц. 3, 17-19).

Бо мы ведаем, што ўсё стварэнне разам стогне і курчыцца ў болях аж па сённяшні дзень (Рым. 8, 22).

Бо Бог смерці не стварыў, не весяліцца Ён з пагібелі жывых (Мудр. 1, 13).

Бо Бог стварыў чалавека дзеля нятленнасці і паводле вобразу Свайго і падабенства Свайго стварыў яго (Мудр. 2, 23).

Бо праўда неўміручая: [а няпраўда — смерці забеспячэнне] (Мудр. 1, 15).

Бачу Яго, але яшчэ не сёння; гляджу на Яго, але яшчэ не блізка. Узыходзіць зорка ад Якуба і паўстае жазло ад Ізраіля, і разаб'е лоб Маава, і знішчыць усіх сыноў Сіфавых (Лічб. 24, 17).

IV. МАРАЛЬНА-РЭЛІГІЙНЫ СТАН ЯЗЫЧНІЦКАГА СВЕТУ ПЕРАД ПРЫШЭСЦЕМ НА СВЕТ ХРЫСТА

3. Усведамленне згубнасці свайго грэшнага стану і неабходнасці збаўлення

Дык будзем есці і піць, бо заўтра памрэм (1 Кар, 15, 32).

Голас, які гукаў у пустыні (Мк. 1, 3).

4. Чаканне збавення сярод праведнікаў Старога Запавету

Бог шматкротна і шматстайна прамаўляў здаўна да айцоў праз прарокаў (Яўр. 1, 1-2).

Узыходзіць зорка ад Якуба, і паўстае жазло ад Ізраіля (Лічб. 24, 17).

Прарока ад братоў тваіх, як ад мяне, узнясе табе Госпад Бог твой, — Таго паслухайце (Друг. 18, 15).

Бо з цябе выйдзе мне той, хто будзе Уладаром ў Ізраілі (Міх. 5, 2).

І каб выпраўленыя былі беззаконні, і каб прыведзеная была праўда вечная, (...) і памазаны быў Святы святых (Дан. 9, 24).

Радуйся моцна, дачка Сіёну, цешся голасна, дачка Іерусаліма: вось, Цар твой набліжаецца да цябе, праведны і збавенны, рахманы (Зах. 9, 9).

І ты, Віфлеем-Эфрата, хіба ты малы сярод тысяч Іудзіных (Міх. 5, 2)?

Ад вытоку слоў, што абвясцілі і ўзнеслі Іерусалім, нават да Хрыста Старэйшыны сем сядмін і шэсцьдзесят дзве сядміны (Дан. 9, 25).

... Сядзіць на маладым васліку, сыне асліцы (Зах. 9, 9).

Гэта Я пасылаю Анёла Майго, і падрыхтуе шлях перада Мною (Мал. 3, 1).

І гэта Я пашлю вам Іллю Фесвіцяніна, перад Прыйсцем дня Гасподняга, вялікага і светлага (Мал. 4, 5).

І нечакана прыйдзе ў Царкву Сваю Госпад (Мал. 3, 1).

3. Чаканне збавення сярод іншых народаў

Дзе няма ні эліна, ні іудзея, абразання і неабразання, варвара і скіфа, нявольніка і свабоднага, але ва ўсім і ва ўсіх Хрыстос (Кал. 3, 11).

А той, хто ў Хрысце — новае стварэнне (2 Кар. 5, 17).

IX. ХРЫСЦІЯНСКАЯ РЭЛІГІЯ

3. Сутнасць хрысціянства

Я ёсць шлях, і праўда, і жыццё (Ін. 14, 6).

Бог, які шматкротна і шматстайна прамаўляў здаўна да айцоў праз прарокаў, у апошнія дні прамаўляў да нас праз Сына, Якога прызначыў наследнікам усяго, праз Якога і вякі стварыў (Яўр. 1, 1-2).

Іудзеі просяць цудаў, і эліны мудрасці шукаюць: а мы абвяшчаем Хрыста Укрыжаванага, для іудзеяў — спакусу, а для элінаў — глупства (1 Кар. 1, 22-23).

Але гаворым Мудрасць Божую, у таямніцы схаваную, якую прадвызначыў Бог спрадвеку дзеля славы нашае, а якую ніхто з князёў веку гэтага не разумее: бо каб разумелі, не ўкрыжавалі б Госпада славы. Але, як напісана было: чаго вока не бачыць, і вуха не чуе, і што да сэрца чалавеку не

ўзыходзіла, тое наканаваў Бог тым, хто любіць яго. А нам Бог адкрыў Духам Сваім: бо Дух усё прасякае, і глыбіні Божыя (1 Кар. 2, 7-10).

Ён боль наш прымае і смутак наш носіць (Іс, 53, 4).

Ён, будучы вобразам Божым, не імкнуўся на гвалт быць роўным Богу, але Сябе спустошыў, вобраз раба прыняў і да людзей прыпадабніўся, і, прыбраўшы чалавечае аблічча, Сябе ўпакорыў, стаўшыся паслухмяным аж да смерці, прычым смерці крыжовае (Флп. 2, 6-8).

Вось, Ягня Божае, што бярэ на Сябе грахі свету (Ін. 1, 29).

... Не запярэчыць, не закрычыць (...), трысціны надламанае не пераломіць і лёну, што заняўся тлець, не загасіць, пакуль не давядзе да перамогі суд (Мц. 12, 19-20).

4. Неабходнасць і падстава рэлігійных ведаў у хрысціянстве

а) паняцце аб Аб'яўленні [Адкрыцці]

Бог, які шматкротна і шматстайна прамаўляў здаўна да айцоў праз прарокаў, у апошнія дні прамаўляў да нас праз Сына, Якога прызначыў наследнікам усяго, праз Якога і вякі стварыў (Яўр. 1, 1-2).

Бога ніхто не бачыў ніколі: Адзінароны Сын, што ва ўлонні Айца, Той адкрыў (Ін. 1, 18).

Ніхто не ведае Сына, толькі Айцец: ні Айца ніхто не ведае, толькі Сын і каму Сын хоча адкрыць (Мф. 11, 27).

Стварыў ад адзінае крыві ўсе народы людскія, каб жылі па ўсім твары зямлі, вызначыў перад гэтым часы і межы рассялення іх, каб шукалі Госпада, пакуль не адчуюць Яго і не знойдуць, таму што недалёка Ён ад кожнага з нас паасобку: бо ў Ім мы жывем і рухаемся, і існуем (Дзеі 17, 26-28).

б) натуральнае Аб'яўленне

Бо кожны дом будуецца кімсьці, а той, хто ўсё стварыў — Бог (Яўр. 3, 4).

Бо нябачнае Яго ад стварэння свету праз разважанне аб творах бачным робіцца, і ўласцівая Яму сіла, і Боскасць (Рым. 1, 20).

Сам наглядае за ўсёй паднябеснай, ведаючы, што ўсё існае на зямлі створана Ім (Іоў, 28, 24-25).

Благаславі, душа мая, Госпада. Госпадзе, Божа мой, як магутна ўзвялічыўся Ты. У веліч і ў красу агарнуў сябе Ты. Ахінуўся святлом, быццам рызаю, распрасцёр неба, нібы намёт (Пс. 103, 1-2).

Як узвялічыліся справы Твае, Госпадзе! Усё мудра стварыў Ты! Стварэннямі Тваімі напоўнілася зямля (Пс. 103, 24).

Народы, што не маюць закону, па прыродзе законнае робяць, яны, законаў не маючы, самі сабе закон: бо выяўляюць рэчы законныя, напісаныя ў сэрцах сваіх, у суладным з імі сумленні, і між сабою думкамі абвінаваўчымі або апраўдальнымі (Рым. 2, 14-15).

в) звышнатуральнае Аб'яўленне

Я ёсць шлях, і праўда, і жыццё (Ін. 14, 6).

Але гаворым Мудрасць Божую, у таямніцы схаваную, якую прадвызначыў Бог спрадвеку дзеля славы нашае, а якую ніхто з князёў веку гэтага не разумее: бо каб разумелі, не ўкрыжавалі б Госпада славы. Але, як напісана было: чаго вока не бачыць, і вуха не чуе, і што да сэрца чалавеку не ўзыходзіла, тое наканаваў Бог тым, хто любіць яго. А нам Бог адкрыў Духам Сваім: бо Дух усё прасякае, і глыбіні Божыя (1 Кар. 2, 7-10).

г) Святое Паданне — найстаражытнейшы спосаб перадачы праўд Аб'яўлення

На тым, браты, стойце, і трымайцеся падання, якому навучыцеся або словам, або пасланнем нашым (2 Сал. 2, 15).

Хвалю вас, браты, бо вы ўсё маё памятаеце, і трымаецеся падання, якое я вам перадаў (1 Кар. 11, 2).

Прарока пастаўлю над імі з асяроддзя братоў іх, як цябе: і ўкладу слова Маё ў вусны Яго, і будзе прамаўляць да іх, як накажу Яму (Друг. 18, 18).

Бо справы, якія даручыў мне Айцец, каб выканаў іх, тыя справы, якія Я раблю, сведчаць аба Мне, што гэта Айцец Мяне паслаў (Ін. 5, 36).

Бо слова Божае жывое і дзейснае, і вастрэйшае за ўсякі меч двусечны, і праніклівае аж да падзелу душы і духа, суставаў і мазгоў, і судзіць думкі і намеры сэрца (Яўр. 4, 12).

X. ПРЫКМЕТЫ БОГАНАТХНЁНАСЦІ БІБЛІІ, АБО СВЯТОГА ПІСАННЯ

4. Сведчанні з самога Святога Пісання

І цяпер ідзі, і Я раскрыю вусны твае і зраблю табе так, каб ты гаварыў як належыць (Вых. 4, 12).

Дух Гасподні гаворыць ува мне, і Слова Яго на языку маім (2 Цар. 23, 2).

Так гаворыць Бог: у спрыяльны час адказаў Я табе (Іс. 49, 8).

Але нават калі забудзе іх жанчына, дык Я не забуду цябе, — кажа Госпад (Іс. 49, 15).

Парушаючы Слова Божае наказам вашым (Мк. 7, 13).

Не думайце, што прыйшоў Я парушыць закон (Ін. 10, 35).

Не думайце, што прыйшоў Я парушыць закон або прарокаў: не парушыць прыйшоў Я, але выканаць. Бо сапраўды кажу вам: пакуль не праміне неба і зямля, ніводная ёта, ніводная рыса не праміне з закону, пакуль не здзейсніцца ўсё (Мц. 5, 17-18).

Калі б верылі вы Майсею, верылі б і Мне: бо пра Мяне ён пісаў (Ін. 5, 46).

Праверце ў Пісаннях, калі вы думаеце мець праз іх жыццё вечнае: і яны сведчаць пра Мяне (Ін. 5, 39).

Хто, вы кажаце, Я ёсць (Мц. 16, 15)?

Дык ідзіце, навучайце ўсе народы, хрысцячы іх у імя Айца, і Сына, і Святога Духа (Мц. 28, 19).

Не паводле волі даецца людзям прароцтва, але, ад Святога Духа асвечаныя, гавораць святыя Божыя людзі (2 Пят. 1, 21).

Усякае Пісанне Богам натхнёнае і карыснае для вывучэння, для выкрыцця, для выпраўлення, для пакарання, для настаўлення ў праведнасці (2 Цім. 3, 16).

5. Меркаванні чалавечага розуму

а) вышыня выкладзенага ў Бібліі вучэння;

Гаспадары, праўду і роўнасць рабам выказвайце, ведаючы, што і вы маеце Госпада на небе (Кал. 4, 1).

б) чысціня сапраўднага Слова Божага

Але ўслед за Святым, што паклікаў вас, і самі святыя ва ўсім жыцці будзеце. Таму што напісана: святыя будзеце, бо Я ёсць святы (1 Пят. 1, 15-16).

Глядзіце, каб не пагарджалі ніводным з гэтых малых: бо кажу вам, што Анёлы іх на небе заўсёды бачаць аблічча Айца Майго Нябеснага (Мц. 18, 10).

А калі хто спакусіць аднаго з гэтых малых, што вераць у Мяне, лепш бы яму было, каб павесілі жоран млынарскі на шыю яму і ўтапілі ў бездані марской (Мц. 18, 6).

в) прароцтвы — прыкмета сапраўднасці Слова Божага

Божа, Божа мой, выслухай мяне, навошта пакінуў Ты мяне; далёка ад выратавання майго словы грэшнага ляманту майго (Пс. 21, 2).

А ўсё гэта здарылася, каб збылося сказанае Госпадам праз прарока, які гаворыць: вось, Дзева ва ўлонне прыме і народзіць Сына, і назавуць Яго імем Эмануіл, што значыць: з намі Бог (Мц. 1, 22-23).

г) цуды

... Бо Я сышоў з нябёсаў здзейсніць не волю Маю, але волю Айца, што паслаў Мяне (Ін. 6, 38).

А ўсё гэта здарылася, каб збылося сказанае Госпадам праз прарока, які гаворыць: вось, Дзева ва ўлонне прыме і народзіць Сына, і назавуць Яго імем Эмануіл, гэта значыць: з намі Бог (Мц. 1, 22-23).

Дзіўны Бог у святых Сваіх, Бог Ізраілеў (Пс. 67, 36).

Калі хто любіць Мяне, слова Маё выконвае: і Айцец Мой палюбіць яго, і Мы да яго прыйдзем і створым у Ім жытло (Ін. 14, 23).

в) магутнае ўздзеянне Слова Божага на сэрцы чалавечыя

Дзякую Богу майму праз Ісуса Хрыста за ўсіх вас, што вера ваша абвяшчаецца па ўсім свеце (Рым. 1, 8).

Я ж маю сведчанне большае за Іаанава: бо справы, якія даручыў мне Айцец, каб выканаў іх, тыя справы, якія Я раблю, сведчаць аба Мне, што гэта Айцец Мяне паслаў (Ін. 5, 36).

Сказаў жа Ісус дванаццацярым: можа і вы хочаце сысці? Адказаў яму Сымон Пётр: Госпадзе, да каго мы пойдзем? Ты маеш словы жыцця вечнага (Ін. 6, 67-68).

Бо слова Божае жывое і дзейснае, і вастрэйшае за ўсякі меч двусечны, і праніклівае аж да падзелу душы і духа, суставаў і мазгоў, і судзіць думкі і намеры сэрца (Яўр. 4, 12).

XI. ХРЫСЦІЯНСКАЕ ВУЧЭННЕ ПРА ЧАЛАВЕКА. ЗМЕСТ ХРЫСЦІЯНСКАГА ЖЫЦЦЯ

4. Мэта чалавечага быцця

Якая ж бо карысць чалавеку, калі ён здабудзе ўвесь свет, але змарнуе сваю душу (Мц. 16, 26)?

Я бачыў усе рэчы, зробленыя пад сонцам: і вось, – усё марнасць і пагоня за ветрам (Экл. 1, 14).

Будзьце святыя, як святы Я, Госпад (Ляв. 11, 45).

Будзьце ж вы дасканалыя, як дасканалы Айцец ваш Нябесны (Мц. 5, 48).

5. Паняцце аб граху

Хто робіць грэх, той ад д'ябла, бо найперш д'ябал грашыць (1 Ін. 3, 8).

Кожны, хто ўчыняе грэх, і беззаконне ўчыняе, і грэх ёсць беззаконне (1 Ін. 3, 4).

Грэшнікаў смерць лютая (Пс. 33, 22).

6. Паняцце аб збавенні

Іншы закон у сцёгнах маіх, які ваюе супраць закону розуму майго (Рым. 7, 23).

Калі хто не народзіцца вадою і духам, не можа ўвайсці ў Царства Божае (Ін. 3, 5).

Адкласці вам, разам са старымі звычкамі, чалавека старога, які тлее ў спакуслівых жаданнях, абнавіцца ж духам розуму вашага і апрануцца ў новага чалавека, створанага паводле Бога, у праведнасці і святасці праўды (Эф. 4, 22-24).

XII. ПРА ВЕРУ

Агульна пра сімвал веры

Скажы Царкве, а калі і Царквы не паслухае, няхай будзе ён табе як язычнік і мытнік (Мц. 18, 17).

Сімвал веры

*(1) **В**еру ў адзінага Бога Айца, Усеўладнага, Творцу неба і зямлі, усяго бачнага і нябачнага.*

*(2) **І** ў адзінага Госпада Ісуса Хрыста, Сына Божага, Адзінароднага, народжанага ад Айца спрадвеку: Святло ад Святла, Бога сапраўднага ад Бога сапраўднага, народжанага, не створанага, адзінаіснага з Айцом, праз Якога ўсё сталася.*

*(3) **Ё**н дзеля нас, людзей, і дзеля нашага збаўлення сышоў з Нябёсаў, і прыняў цела ад Духа Святога і Дзевы Марыі, і стаўся чалавекам.*

*(4) **І** быў ўкрыжаваны за нас пры Понцкім Пілаце, і пакутаваў, і быў пахаваны.*

*(5) **І** ўваскрос на трэці дзень, паводле Пісання.*

*(6) **І** ўзышоў на неба, і сядзіць праваруч Айца.*

*(7) **І** прыйдзе са славаю судзіць жывых і мёртвых, Яго ж Царству не будзе канца.*

*(8) **І** ў Духа Святога, Госпада, жыццядайнага, Які зыходзіць ад Айца, Якому нароўні з Айцом і Сынам пакланенне і слаўленне належаць, Які вяшчаў праз прарокаў.*

*(9) **У** адзіную Святую, Саборную і Апостальскую Царкву.*

*(10) **В**ызнаю адзінае хрышчэнне дзеля збаўлення ад грахоў.*

*(11) **Ч**акаю ўваскрасення мёртвых.*

*(12) **І** жыцця будучага веку. Амін.*

1-ая частка Сімвалу веры. Пра Бога — Творцу свету

Веру ў адзінага Бога Айца, Усеўладнага, Творцу неба і зямлі, усяго бачнага і нябачнага.

1. Вера і пабожнасць

***Ш**часлівыя чыстыя сэрцам (Мц. 5, 8).*

***Б**о сэрцам верыцца ў праўду, вуснамі ж вызнаецца дзеля збавення (Рым. 10, 10).*

***Б**о ад перапоўненасці сэрца гавораць вусны (Лк. 6, 45).*

***Б**ез веры немагчыма дагадзіць [Богу] (Яўр. 11, 6).*

2. Адзінабожжа

Дык Таго, каго, не ведаючы, вы (пабожна) ушаноўваеце, я і абвяшчаю вам (Дзеі 17, 23).

Няма іншага Бога, апроч Бога Адзінага (1 Кар. 8, 4).

Я першы і я апошні, апроч Мяне няма Бога (Іс. 44, 6).

Слухай, Ізраіль! Госпад Бог наш ёсць Госпад адзіны! (Друг. 6, 4).

Вось Я пасылаю Анёла Майго, и падрыхтуе шлях перада Мною: і нечакана прыйдзе ў Царкву Сваю Госпад, Якога вы шукаеце, і Анёл Запавету, Якога вы прагнеце: вось Ён, ідзе, кажа Госпад Усеўладны (Мал. 3, 1).

Няма іншага Бога, апрача Адзінага. Бо, хоць і ёсць так званыя багі, ці на небе, ці на зямлі: паколькі багоў шмат і паноў шмат, — але ў нас адзіны Бог Айцец, з Якога ўсё, і мы ў Яго, і адзіны Госпад Ісус Хрыстос, праз Якога ўсё, і мы праз Яго (1 Кар. 8, 4-6).

Бо ўсё з Яго і праз Яго і ў Ім. Яму слава на вякі. Амін (Рым. 11, 36).

3. Траістасць Божых Асоб

... Створым чалавека паводле вобразу Нашага і падабенства Нашага (Быц. 1, 26).

І сказаў Бог: вось, Адам стаў як адзін з нас, хто ведае дабро і зло (Быц. 3, 22).

І сказаў Госпад: (...) дык пойдзем, і як сыдзем, памяшаем там мовы іх, каб не разумеў ніхто голасу бліжняга [свайго] (Быц. 11, 6-7).

І з'явіўся перад ім Бог ля дубровы Мамрыйскае, калі сядзеў ён апоўдні перад уваходам да намёту свайго. Узняў ён вочы свае, і вось, тры мужы стаяць перад ім (Быц. 18, 1-2).

Каго пашлю, і хто пойдзе да гэтых людзей (Іс. 6, 9).

Святы, Святы, Святы Госпад Усеўладны: напоўнілася ўся зямля славаю Яго (Іс. 6, 3).

Словам Гасподнім нябёсы ўмацаваныя, і Духам вуснаў Яго ўся сіла іх (Пс. 32, 6).

І так ідзіце, навучайце ўсе народы, хрысцячы іх ў імя Айца і Сына і Святога Духа (Мц. 28, 19).

Святы, Святы, Святы Госпад Бог Усеўладны, Які быў, і ёсць, і будзе (Аб'яўл. 4, 8).

4. Недасяжнасць Бога для розуму

О, глыбіня багацця і найвышэйшае мудрасці і розуму Божага! Якія недасяжныя прысуды Яго і недаследаваныя шляхі Яго! (Рым. 11, 33).

Бо Бога ніхто не бачыў нідзе: Адзінародны Сын, што быў ва ўлонні Айцовым, Той адкрыў (Ін. 1, 18).

Ніхто не ведае Сына, толькі Айцец; ані Айца ніхто не ведае, толькі Сын, і каму Сын хоча адкрыць (Мц. 11, 27).

Божа, Божа мой, пачуй мяне, навошта пакінуў Ты мяне; далёка ад выратавання майго словы грэшнага ляманту майго (Пс. 21, 2).

5. Духоўная сутнасць Бога

Дух (ёсць) Бог: і той, хто кланяецца Яму, павінен кланяцца духам і праўдаю (Ін. 4, 24).

Госпад ёсць Дух, а дзе Дух Гасподні, там свабода (2 Кар. 3, 17).

Бо тысяча год перад вачыма Тваімі, Госпадзе, як дзень учарашні (Пс. 89, 5).

6. Усёведанне Божае

Бог большы за сэрца нашае (1 Ін. 3, 20).

Гэта Я пашлю да вас Іллю Фесвіцяніна, перад прыйсцем дня Гасподняга, вялікага і светлага (Мал. 4, 5).

Ты разумееў задумы мае здалёк: сцяжыну маю і повязі мае прасачыў Ты і ўсе шляхі мае прадбачыў (Пс. 138, 2-3).

7. Праўда Божая

Бог справядлівы і любіць праўду, праведнікі ўгледзяць Аблічча Яго (Пс. 10, 7).

Бог адмерае кожнаму паводле спраў яго (Рым. 2, 6).

Бог не зважае на асобы (Рым. 2, 11).

8. Усёмагутнасць Божая

... Шчаслівы і адзіны моцны, Цар цароў і Уладар уладароў (1 Цім., 6, 15).

Я Бог Усёмагутны (Быц. 17, 1), не страціць моцы ў Бога ніводнае слова (Лк. 1, 37).

І не думайце казаць сабе: «бацька ў нас Аўраам»; бо кажу вам, што можа Бог з гэтага камення ўзнесці дзяцей Аўрааму (Мц. 3, 9).

Сказаў Ён — і сталася: загадаў Ён — і стварылася (Пс. 32, 9).

9. Усюдыіснасць Божая

Куды пайду я ад Духа Твайго; і ад Аблічча Твайго куды я ўцяку? Калі ўзыду на неба, Ты там ёсць, або калі сыду ў пекла, Ты там ёсць. Калі пазычу я крылы ў зары і перасялюся за край мора, і там рука Твая пакіруе мной, і ўтрымае мяне правая рука Твая. Калі скажу я: Можа, цем-

ра схавае мяне? Але і цемра — святло ў асалодзе маёй. Бо не азмрочыцца цемра праз Цябе, і ноч асвеціцца, нібы дзень: як цемра яе, так і святло яе (Пс. 138, 7-12).

Бо там, дзе двое або трое сабраліся ў імя Маё, там Я ёсць сярод іх (Мц. 18, 20).

10. Нязменнасць Божая

Усе яны загінуць, а Ты застанешся (...) Але Ты — такі самы, і гады Твае не скончацца (Пс. 101, 27-28).

Ад Айца светаў (...) няма змены ані ценю (Як 1, 17).

Я ёсць Альфа і Амега, пачатак і канец, кажа Госпад, ёсць, і быў, і буду, Усеўладны (Аб'яўл. 1, 8).

11. Самадастатковасць і найвышэйшае шчасце Божыя

Ані ад рук чалавечых дагаджэння не прымае, быццам патрабуючы што-небудзь, а Сам дае ўсім жыццё і дыханне, і ўсё (Дзеі 17, 25).

Шчодры і ласкавы Госпад, шмат цярплівасці і літасці ў Ім. Добры Госпад для ўсіх, і шчодрасць Ягоная ва ўсіх справах Яго (Пс. 144, 8-9).

Ніхто не добры, толькі Бог Адзіны (Мц. 19, 17).

Бог ёсць любоў (1 Ін. 4, 16).

Поўня весялосці перад Абліччам Тваім: прыгажосць у руцэ тваёй правай да скканчэння дзён (Пс. 15, 11).

12. Вучэнне пра Бога — Творцу і Усеўладнага Гаспадара

Богам ніхто не кіруе, толькі Дух Божы (1 Кар. 2, 11).

Усё гэта робіць адзін і той самы Дух, надзяляючы кожнага асобна, як Яму хочацца (1 Кар. 12, 11).

... Як Ён сказаў, так і было: загадаў Ён, і стварылася (Пс. 32, 9).

На пачатку стварыў Бог неба і зямлю (Быц. 1, 1).

Спачатку Ты, Госпадзе, зямлю заснаваў, і нябёсы — справа рук Тваіх. Яны загінуць, Ты ж трываць будзеш вечна: як шаты, струхлеюць усе яны, і як вопратку, згорнеш Ты іх, і пераменяцца яны. Ты ж застанешся такі самы, і гадам Тваім не будзе канца (Пс. 101, 26-28).

Створым чалавека паводле вобразу Нашага і падабенства Нашага (Быц. 1, 26).

І апрануцца ў новага чалавека, створанага паводле Бога, у праведнасці і святасці праўды (Эф. 4, 24).

13. Стварэнне нябачнага свету

Зямля ж была безаблічная і бязладная, і цемра над тварам бездані, і Дух Божы лунаў над абліччам вады (Быц. 1, 2).

І назваў Бог скляпенне небам (Быц. 1, 8).

На пачатку стварыў Бог неба і зямлю (Быц. 1, 1).

Хто ж паклаў нарожны камень на ёй? Калі (створаныя) былі зоры, пахвалілі Мяне голасам гучным усе Анёлы Мае (Іоў, 38, 6-7).

Ім створана было ўсё, што на небе і што на зямлі, бачнае і нябачнае: будзь то пасады, ці дзяржавы, ці начальства, ці ўлады: усё Ім і для Яго створана (Кал. 1, 16).

Хваліце Яго, усе Анёлы яго, хваліце Яго, усе войскі Яго (Пс. 148, 2).

Робіш Анёламі Сваімі духаў, і слугамі Сваімі полымя агністае (Пс. 103, 4).

Благаславіце, усе справы Гасподнія, Госпада, (...) Благаславіце, Анёлы Гасподнія, Госпада (Дан. 3, 57-58), благаславіце, усе войскі Гасподнія, Госпада, спявайце і ўзносьце Яго над усімі ў вяках (Дан. 3, 61).

Анёлам Сваім даць загад аб табе, каб ахоўвалі цябе на кожным шляху тваім (Пс. 90, 11).

Глядзіце, каб не пагарджалі ніводным з гэтых малых: бо кажу вам, што Анёлы іх на небе заўсёды бачаць абліччa Айца Майго Нябеснага (Мц. 18, 10).

Радасць бывае сярод Анёлаў Божых з аднаго грэшніка, які каецца (Лк 15, 10).

Калі дзяліў Усявышні народы, рассеяў сыноў Адамавых, акрэсліў межы народаў паводле колькасці Анёлаў Божых (Друг, 32, 8).

14. Узнікненне зла

І была бітва на небе (...) І зрынуты быў вялікі змей, змей старажытны, называны д'яблам і шатанам (Аб'яўл. 12, 7, 9).

На неба ўзыду (Іс. 14, 13).

Вы айцу вашаму д'яблу належыце і жаданні айца вашага хочаце выконваць: ён ад пачатку быў душагуб і не ўстояў у праўдзе, бо няма праўды ў ім (...), бо сам ён мана і бацька маны (Ін. 8, 44).

Анёлы ж, якія не прызнавалі свайго начальства, але пакінулі сваё жытло (Іуд. 1, 6).

І была бітва на небе: Міхал і Анёлы яго бітву ўчынілі са змеем, і змей біўся, і анёлы яго. І не перамаглі, і месца ўжо не знайшлося ім на небе. І скінуты быў змей вялікі, змей старажытны, што завецца д'яблам і шатанам, які спакушаў увесь свет, і быў ён абрынуты на зямлю, а анёлы яго разам з ім зрынутыя былі ўніз (Аб'яўл. 12, 7-9).

... Сказаў: я ёсць Бог, сяджу на пасадзе багоў пасярод мора (Ез. 28, 2).

Ты — адбітак дасканаласці, поўны найвышэйшай мудрасці і вянец дабрыні, быў у асалодзе раю Божага, усялякімі шляхетнымі каменнямі ўпрыгожаны: сердалікам і тапазам, і смарагдам і гіяцынтам, і андраксам і сапфірам, і яшмаю і срэбрам і золатам, і лігірам і агатам, і аметыстам і хрызалітам, і бірылам і оніксам і золатам напоўніў скарбніцы твае і жытніцы твае, з таго дня, як быў створаны ты. Ты быў памазаным херувімам на гары святой Божай, быў сярод каменняў ззяйных. У дасканаласці бавіў ты дні свае ад дня стварэння твайго, пакуль не ўгняздзілася ў табе няпраўда. Ад багацця куплі тваёй напоўніў ты скарбніцы твае беззаконнасцю, і зграшыў, і быў адрынуты ад гары Божае: і наляцеў ценем і вывеў цябе Херувім з асяроддзя каменчыкаў агністых. Ганарліва занёсся ты сэрцам тваім ў багацці тваім, спарахнела мудрасць твая пасярод дабрабыту: дзеля мноства грахоў тваіх быў зрынуты ты на зямлю, перад царамі аддалі цябе на ганьбаванне. Праз мноства грахоў тваіх і няпраўдаў куплі тваёй апаганіў ты святыні твае, і выведу я агонь з сярэдзіны тваёй, які цябе і пахлыне: і ператвару цябе ў пыл на зямлі перад усімі, хто бачыць цябе. І ўсе, хто ведаў цябе сярод народаў, абурацца на цябе: загубаю ты стаў, і не будзе цябе павек (Ез. 28, 12-19).

У пекла зрынутая слава твая, буйная твая весялосць: пад табою пасцелюць гніль, і покрыва тваё – чэрві. Як жа ўпаў ты з неба, зараніца, сын

зары! Раструшчыўся на зямлі той, хто памыкаў ўсімі народамі. Ты ж казаў сабе ў духу сваім: на неба ўзыду, вышэй за зоры нябесныя пастаўлю мой пасад, сяду нагары, сярод высокіх круч, на паўночным краі: уздымуся вышэй за аблокі, буду падобны да Усявышняга. Сёння ж зрынуты ты ў пекла, у глыбіні апраметнай (Іс. 14, 11-15).

15. Стварэнне бачнага свету

Малю цябе, дзіця, паглядзі на неба і зямлю, і ўсё, што ёсць ў іх, бачучы, зразумееш, што ўсё стварыў Бог з нічога, гэтаксама паўстаў і род чалавечы (2 Мак. 7, 28).

І Дух Божы лунаў над абліччам вады (Быц. 1, 3).

16. Аб Наканаванні Божым

... Бо абраў нас у Ім да стварэння свету (Эф. 1, 4).

У доме Айца Майго пакояў шмат (Ін. 14, 2).

Зірніце на птушак нябесных, яны не сеюць, не жнуць, не збіраюць у жытніцы, і Айцец ваш Нябесны насычае іх: дык хіба вы не лепшыя за іх (Мц. 6, 26)?

2-ая частка Сімвалу веры. Пра Ісуса Хрыста, Сына Божага

І ў адзінага Госпада Ісуса Хрыста, Сына Божага, Адзінароднага, ад Айца народжанага спрадвеку: Святло ад Святла, Бога сапраўднага ад Бога сапраўднага, народжанага, не створанага, адзінаіснага з Айцом, Які быў усім.

1. Боскія імёны другой Асобы Святой Тройцы

Дык будзьце ж вы міласэрныя, бо і Айцец ваш міласэрны (Лк. 6, 36).

Будзьце ж беззаганныя, як і Айцец ваш Нябесны (Мц. 5, 48).

Бо калі вы даруеце людзям правіны іх, дык даруе і вам Айцец ваш Нябесны (Мц. 6, 14).

... Шчаслівы і адзіны магутны, Цар цароў і Уладар уладароў (1 Цім. 6, 15).

... Названы ад Бога, Першасвятар паводле чыну Мельхісэдэкавага (Яўр. 5, 10).

2. Уласцівасці Сына Божага

На пачатку было Слова, і Слова было ў Бога, і Богам было Слова (Ін. 1, 1).

Словам Гасподнім нябёсы ўмацаваныя (Пс. 32, 6).

І Слова сталася целам, і асялілася між нас (і бачылі мы славу Яго, славу як Адзінароднага ад Айца), поўнае ласкі і праўды (Ін. 1, 14).

Бога не бачыў ніхто ніколі, Адзінародны сын, што ва ўлонні Айца, Той адкрыў (Ін. 1, 18).

Ведаем таксама, што Сын Божы прыйшоў і даў нам (святло і) розум, каб спазналі Бога сапраўднага, і каб былі ў сапраўдным Сыне Яго Ісусе Хрысце: Ён ёсць сапраўдны Бог і Жыццё вечнае (1 Ін. 5, 20).

Хто ж маніць, калі не той, хто адмаўляе, што Ісус ёсць Хрыстос? Гэта — антыхрыст, які адмаўляе Айца і Сына. Усякі, хто адрынуў Сына, не мае і Айца, а той, хто вызнае Сына, і Айца мае (1 Ін 2, 22-23).

Усё праз Яго сталася, і без Яго нічога не сталася з таго, што сталася (Ін. 1, 3).

3-я частка Сімвалу веры. Пра Уцялесненне

Ён дзеля нас, людзей, і дзеля нашага збаўлення сышоў з Нябёсаў, і прыняў цела ад Духа Святога і Дзевы Марыі, і стаўся чалавекам.

4. Збаўленне чалавецтва ад граху

Праз аднаго чалавека ўвайшоў у свет грэх і праз грэх — смерць, гэтак і смерць перайшла праз усіх людзей, бо ўсе мы зграшылі (Рым. 5, 12).

Бо заплата за грэх — смерць (Рым. 6, 23).

Хто грэх чыніць — той ад д'ябла, бо найперш д'ябал грашыць (1 Ін. 3, 8).

Анёлаў жа, якія не захавалі сваёй улады, але пакінулі сваё жытло, на суд вялікага дня ў вечных путах над цемраю ўтрымлівае (Іуд. 1, 6).

Калі хто бачыць брата свайго, які грашыць грахом не на смерць, дык няхай моліцца, і (Бог) дасць яму жыццё, гэным, што грашаць не на смерць. Ёсць грэх на смерць: не аб гэтым кажу маліцца. Усялякая няпраўда ёсць грэх, і ёсць грэх не на смерць (1 Ін. 5, 16-17).

Узышло яму сонца, калі пераходзіў Пенуэл [аблічча Божае]: ён жа кульгаў сцягном сваім (Быц. 32, 31).

Усякі, хто робіць грэх, робіць і беззаконне, і грэх ёсць беззаконне. І вы ведаеце, што Ён з'явіўся дзеля таго, каб узяць грахі нашыя, і што ў Ім няма граху (1 Ін. 4-5).

Ведаем мы, што кожны, хто народжаны ад Бога, не грашыць: а народжаны ад Бога пільнуе сябе, і ліхі не зачэпіць яго (1 Ін. 5, 18).

5. Пра спалучэнне ў Хрысце дзвюх існасцяў

Аб тым, што мы бачылі і чулі, абвяшчаем вам, каб і вы мелі лучнасць з намі: а наша лучнасць — з Айцом і з Сынам Яго Ісусам Хрыстом (1 Ін. 1, 2).

Бо жыццё з'явілася, і мы бачылі і сведчым, і абвяшчаем вам гэтае вечнае жыццё, якое было ў Айца і з'явілася нам (1 Ін. 1, 2).

І ніхто не ўзышоў на неба, толькі Сын Чалавечы, што на небе, які з неба сышоў (Ін, 3, 13).

І Слова сталася целам і асялілася між нас (і бачылі мы славу Яго, славу, як Адзінароднага ад Айца), поўнае ласкі і праўды (Ін. 1, 14).

Бо Бог адзін, і адзін пасрэднік паміж Богам і людзьмі, Чалавек Хрыстос Ісус, што аддаў Сябе дзеля адкуплення ўсіх (1 Цім. 2, 5-6).

6. Найсвяцейшая Багародзіца Дзева Марыя

Анёлы, пабачыўшы ўваход Найчысцейшае, здзівіліся: як Дзева ўвайшла ў Святыя святых.

Вось Дзева прыме ва ўлонне і народзіць Сына, і назавуць Яго імем: Эмануіл (Іс. 7, 14).

Вось Я, Слуга Госпада, няхай станецца Мне паводле слова твайго (Лк. 1, 38).

Дух Святы найдзе на Цябе, і сіла Найвышэйшага ахіне Цябе: і таму тое, што народзіцца, Сынам Божым назавецца (Лк. 1, 35).

Вось Дзева прыме ва ўлонне і народзіць Сына, і назавуць яго імем: Эмануіл (Іс. 7, 14); што значыць: з намі Бог (Мц. 1, 23).

І адкуль гэта мне, што прыйшла Маці Госпада майго да мяне (Лк. 1, 43)?

4. Раство Ісуса Хрыста

Не бойцеся: бо вось, я абвяшаю вам вялікую радасць, якая будзе ўсім людзям: бо цяпер нарадзіўся вам у горадзе Давідавым Збаўца, каторы ёсць Хрыстос Госпад (Лк. 2, 10-11).

Радуйся моцна, дачка Сіёну, цешся голасна, дачка Ерусаліма: вось, Цар твой набліжаецца да цябе, праведны і збавенны, рахманы Ён і сядзіць на маладым восліку, сыне асліцы (Зах. 9, 9).

Бо народжанае ў Ёй паходзіць ад Святога Духа (Мц. 1, 20).

Дзе народжаны Цар Іудзейскі? бо мы бачылі зорку Яго на ўсходзе і прыйшлі пакланіцца Яму (Мц. 2, 2).

Благаслаўлёная Ты між жанок, і благаслаўлёны плод улоння Твайго! І адкуль гэта мне, што прыйшла Маці Госпада майго да мяне? Бо вось, калі голас прывітання Твайго дайшоў да вушэй маіх, узварухнулася вясёла дзіцятка ў чэраве маім (Лк. 1, 42-43).

Слава ў вышынях Богу, і на зямлі мір, сярод людзей добрае волі (Лк. 2, 14).

Цяпер адпускаеш слугу Твайго, Валадару, паводле слова Твайго, з мірам; бо бачылі вочы мае збавенне Тваё, якое прыгатаваў Ты перад абліччам усіх людзей: святло для асветы паганам, і славу народа Твайго Ізраіля (Лк. 2, 29-32).

І Яна ў той час прыйшоўшы славіла Госпада і гаварыла пра Яго ўсім, хто чакаў збавення ў Іерусаліме (Лк. 2, 38).

І як выходзіў з вады, бачыў, што разыходзяцца нябёсы і Дух, як голуб, сыходзіць на Яго. І голас быў з неба: Ты Сын Мой улюбёны, Якому спагадаю (Мк. 1, 10-11).

Бо Я хрышчу вас у вадзе ў пакаянне, але Той, Хто ідзе за мною, дужэйшы за мяне, і я нават не варты несці Яму абутак (Мц. 3, 11).

Вось, Ягня Божае, што бярэ на Сябе грахі ўсяго свету (Ін. 1, 29).

Гэта ёсць мой Сын улюбёны, якому спагадаю; Яго слухайце (Мц. 17, 5).

5. Служэнне Хрыста як Першасвятара

Ад чыстага сэрца любіце адзін аднаго належна, народжаныя не з тленнага насення, але з нятленнага, праз Слова Бога Жывога, Які трывае ў вяках. Бо ўсялякае цела, як трава, і ўсялякая слава чалавечая, як квецень на траве: высахла трава — і квецень з яе апала; Слова ж Гасподняе застаецца ў вяках. А гэта і ёсць тое Слова, якое вам абвешчана (1 Пят. 1, 22-25).

Не адыдзе жазло ад Іуды, ні посах правадыра паміж сцёгнаў яго, пакуль не прыйдзе прызначанае яму і Той, каго чакаюць народы (Быц. 49, 10).

Хто Мне служыць, няхай ідзе Маім шляхам, і дзе Я, там і слуга мой будзе (Ін. 12, 26).

6. Прароцтвы Старога Запавету аб прыйсці Збаўцы

Закон нам быў настаўнікам у Хрысце (Гал. 3, 24).

Благаславяцца ў насенні тваім усе народы зямныя (Быц. 22, 18).

І аднаўлю насенне тваё пасля цябе, якое будзе ад чэрава твайго, і падрыхтую Царства Яго (2 Цар, 7, 12).

І ты, Віфлеем-Эфрата, хіба ты малы сярод тысяч Іудзіных? Бо з цябе выйдзе Мне той, хто будзе Уладаром у Ізраілі, а паходжанне Яго здаўна, спакон веку (Міх. 5, 2).

Дасць Госпад Сам вам знак: вось, Дзева прыме ва ўлонні сваім і народзіць Сына, і назаве Яго імем Эмануіл (Іс. 7, 14).

Радуйся моцна, дачка Сіёну, цешся голасна, дачка Іерусаліма: вось, Цар твой набліжаецца да цябе, праведны і збавенны, рахманы Ён і сядзіць на маладым вослiку, сыне асліцы (Зах. 9, 9).

Ён жа прыняў раны за грахі нашыя і нёс пакуты за беззаконні нашыя, кара свету нашага на Ім, ранамі Яго мы вылечыліся (Іс. 53, 5).

7. Прароцтва Данііла аб прыйсці Збаўцы

Семдзесят сядмін адмерана для народу твайго і святога гораду твайго, каб састарэла злачынства, і скончыўся грэх, і запячатаныя былі грахі, і загладжаныя крыўды, і выпраўленыя беззаконні, і каб прыведзеная была праўда вечная: і запячатаныя былі праявы і прарок, і памазаны быў Сьвяты сьвятых.

Дык ведай і разумей: ад абвяшчэння загаду пра аднаўленне Іерусаліма і да Хрыста Уладара сем сядмінаў і шэсцьдзесят дзве сядміны: і вернуцца, і адбудуюцца вуліцы і брамы, і надыдуць нішчымныя гады.

І пасля шасцідзесяці дзвюх сядмін спатрэбіцца памазанне, і суду не будзе ў Ім: а горад і святыня будуць разбураныя з Уладаром, які надыдзе, і спустошацца, як у патопе, і да канца войскі, парадкам скарочаныя, загінуць.

І ўсталюе Запавет для многіх сядміна адна: а ў палове сядміны спыніцца ахвяра і прынашэнне, і ў святыні запануе агіда запусцення, і нават да скончэння часу канчаткова будзе аддадзена на спусташэнне (Дан. 9, 24-27).

8. Здзяйсненне Данііалавага прароцтва

Ісус, пачынаючы Сваё служэнне, быў гадоў трыццаці (Лк. 3, 23).

4-ая частка сімвалу веры. Аб пакуце і смерці

І быў ўкрыжаваны за нас пры Понцкім Пілаце, і пакутаваў, і быў пахаваны.

1. Асуджэнне і ўкрыжаванне Ісуса Хрыста

Заплачаце і загалосіце вы, а свет усцешыцца (Ін. 16, 20).

Увесь свет ляжыць у зле (1 Ін. 5, 19).

Дый усе, хто жадае жыць набожна ў Хрысце, спазнаюць ганенні (2 Цім. 3, 12).

Не адыдзе жазло ад Іуды, ні посах правадыра паміж сцёгнаў яго, пакуль не прыйдзе прызначанае яму і Той, каго чакаюць народы (Быц. 49, 10).

2. Пакуты і смерць Хрыста

Я кладу душу Маю, каб зноў узяць яе: ніхто не адыме яе ў Мяне, але Я сам аддаю яе: бо маю ўладу аддаць яе і ўладу зноў узяць яе (Ін. 10, 17-18).

Як праз аднаго чалавека ўвайшоў у свет грэх — а з грахом і смерць, гэтак і смерць перайшла праз усіх людзей (Рым. 5, 12).

Бо сапраўды не Анёлаў прымае ён, але насенне Аўраамава прымае. Дзеля гэтага Ён павінен быў ва ўсім прыпадабніцца да братоў, каб быць міласэрным і верным Першасвятаром перад Бо-

Семдзесят сядмін — прароцтва Данііла[1] аб аб'яўленні Збаўцы:



1) Больш падрабязнае апісанне прароцтва гл. на с. 161-167.

7 гадоў
30 гадоў
3,5
гады
Раство Хрыстова
Хрышчэнне Госпадава
Крыжовая смерць Збаўцы

гам, каб ачысціць грахі людскія. Бо, як Сам Ён, спакушаны, пацярпеў, дык можа і спакушаным дапамагчы (Яўр. 2, 16-18).

Бо ласкі хачу, а не ахвяры, і ведання Бога, а не цэласпалення (Ос. 6, 6).

Ласка і Праўда між сабой сустракаюцца, справядлівасць і спакой цалуюцца (Пс. 84, 11).

Хрыстос адкупіў нас ад праклёцця закону, стаўшыся за нас праклёццем (Гал. 3, 13).

Праклёты кожны, хто вісіць на дрэве (Гал. 3, 13; Друг. 21, 23).

Бо калі ад граху аднаго смерць запанавала праз аднаго, дык тым болей тыя, хто прымае празмернасць ласкі і дар праведнасці, панаваць будуць у жыцці праз аднаго Ісуса Хрыста (Рым. 5, 17).

У Ім жа маем адкупленне Крывёю Яго, і адпушчэнне грахоў, паводле багацця ласкі Яго (Эф. 1, 7).

2. Знішчэнне смерці смерцю Хрыста на Крыжы

Калі дзеці сталіся ўдзельнікамі цела і крыві, дык і Ён таксама стаўся іх удзельнікам, каб праз смерць перамагчы таго, хто трымае ўладу над смерцю, інакш кажучы, д'ябла, і збавіць тых, хто пад страхам смерці ўсё сваё жыццё падданы быў рабству (Яўр. 2, 14-15).

Бо для мяне жыццё — Хрыстос, і смерць — набытак (Флп. 1, 21).

4. Удзел чалавека ў Пакуце і смерці Хрыста

Хіба не ведаеце, што целы вашыя ёсць храм Святога Духа, Які жыве ў вас, Якога вы маеце ад Бога; і вы не свае, бо вы куплены дарагою цаною? Дык выслаўляйце Бога ў целах вашых і ў душах вашых, бо яны — Божыя (1 Кар. 6, 19-20).

Бо любоў Божая ахінае нас, хто разважае так: калі ўжо Ён адзін памёр за ўсіх, дык гэта ўсе памерлі. Хрыстос жа памёр за ўсіх, каб жывыя жылі ўжо не дзеля сябе, але дзеля Таго, Хто памёр за іх і ўваскрос (2 Кар. 5, 14-15).

Няўжо вы не разумееце, што ўсе мы, якія ахрысціліся ў Хрыста Ісуса, у смерць Яго ахрысціліся (Рым. 6, 3)?

Бо кожны раз, калі вы ясце гэты хлеб і п'яце чару гэтую, смерць Гасподнюю абвяшчаеце, дакуль (Ён) не прыйдзе (1 Кар. 11, 2).

Але, што для мяне было набыткам, тое дзеля Хрыста лічыў я за страту. Але (...) ўсё адмятаю, як смецце, дзеля таго, каб адшукаць Хрыста і знайсці сябе ў Ім, маючы не маю праведнасць, якая з закону, але тую, што праз веру ў Хрыста, існую праведнасць ад Бога ў веры: каб разумець Яго, і сілу ўваскрасення Яго, і суперажываць пакутам Яго, прыпадабняючыся да смерці Яго, каб толькі дасягнуць уваскрасення з мёртвых (Флп. 3, 7-11).

Бо праз закон я памёр для закону, каб жыць для Бога. Я ўкрыжаваны разам з Хрыстом. І ўжо не я жыву, але жыве ўва мне Хрыстос. А што цяпер жыву ў целе, дык жыву вераю ў Сына Божага, што палюбіў мяне і выдаў Сябе за мяне (Гал. 2, 19-20).

Ведайце ж, хто ад веры, тыя ёсць сыны Аўраамавы (Гал. 3, 7).

... Праведны вераю жыць будзе. Закон жа не ад веры, але чалавек, які гэта выконвае, жыць будзе ў гэтым (Гал. 3, 10-12).

Таму што справамі закону не апраўдаецца ўсялякае цела перад ім, бо праз закон пазнаецца грэх (Рым. 3, 20).

Не адмятаю ласкі Божае: бо калі праз закон апраўданне, дык Хрыстос дарма памёр (Гал. 2, 21).

А тыя, Хрыстовыя, укрыжавалі цела з пажадлівасцю і юрлівасцю (Гал. 5, 24).

3. Значэнне жыцця не паводле цела, а паводле духу

Бо праз закон я памёр для закону (Гал. 2, 19).

Гэтага толькі хачу даведацца ад вас: ці ад спраў закону Дух вы прымаеце, ці ад слухання веры? Ці вы такія няцямныя? Пачаўшы духам, цяпер завяршаеце целам (Гал. 3, 2-3)?

Бо Той, Хто дае вам Духа і між вамі цуды робіць, — ці ад спраў закону гэта робіць, ці ад слухання веры (Гал. 3, 5)?

Разам з Хрыстом ўкрыжаваны: жыву не сам, але жыве ўва мне Хрыстос (Гал. 2, 19-20).

Дык закон быў для нас настаўнікам, (каб весці) да Хрыста, каб нам апраўдацца вераю: а калі прыйшла вера, мы ўжо не пад настаўнікам (Гал. 3, 24-25).

А што Законам ніхто не апраўдваецца перад Богам, гэта ясна, бо праведны вераю жыць будзе. Закон жа не ад веры, але чалавек, які гэта выконвае, жыць будзе ў гэтым. Хрыстос адкупіў нас ад пракляцця закону, стаўшыся за нас пракляццем, бо напісана: пракляты ўсякі, хто вісіць на дрэве (Гал. 3, 11-13).

Гэтак і мы, пакуль былі дзецьмі, былі прыняволеныя стыхіямі свету. Калі ж настала поўня часу, паслаў Бог Сына Свайго (Адзінароднага), які нарадзіўся ад жанчыны і быў пад законам, каб адкупіць тых, хто пад законам, каб нам прыняць усынаўленне. А як вы — сыны, дык паслаў Бог ў сэрцы вашыя Духа Сына Свайго, які галосіць: Авва, Ойча! (Гал. 4, 3).

Дык стойце ў волі, якою вызваліў нас Хрыстос, і не падпадайце зноў пад ярмо рабства (Гал. 5, 1).

Скажыце мне, што хочаце быць пад законам: ці ж вы не слухаеце закону? Бо напісана: што

Аўраам меў двух сыноў: аднаго ад рабыні, а другога ад вольнае. Але той, што ад рабыні, нарадзіўся паводле цела, а той, што ад вольнае — паводле абяцання. Гэта іншасказ. Бо гэта два Запаветы: адзін — ад гары Сінайскае, што родзіць для рабства, якое ёсць Агар: таму што Агар ёсць гара Сінай ў Аравіі і адпавядае цяперашняму Іерусаліму, і яна ў рабстве разам з дзецьмі сваімі, а вышэйшы Іерусалім вольны, ён — маці ўсім нам. Бо напісана: Весяліся, няплодная, якая не нараджае: загукай і загаласі ты, якая не пакутавала ў родах, бо нашмат больш дзяцей ў пакінутай, чым у той, што мела мужа. Мы ж, браты, — паводле Ісаака, дзеці абяцаныя. Але, як тады народжаны паводле цела ганяў народжанага паводле духу, гэтак жа і цяпер. Што ж кажа Пісанне? Выгані рабу і сына яе, бо сын рабыні не будзе наследнікам разам з сынам свабоднай. Вось жа, браты, мы дзеці не рабыні, але свабоднай (Гал. 4, 21-31).

Бо вас, браты, паклікалі на свабоду: толькі каб свабода ваша не сталася сродкам для цела, але любоўю служыце адзін аднаму. Бо ўвесь закон ў адным слове выконваецца: любі бліжняга свайго, як самога сябе. Калі ж адзін аднаго грызяце і заядаеце, сцеражыцеся, каб не знішчылі адзін аднаго. Я ж кажу: кіруйцеся духам і жаданняў цела не выконвайце; бо цела хоча насуперак духу, а дух — насуперак целу: яны адзін аднаму працівяцца, каб вы не тое рабілі, чаго хацелі б. Бо калі дух вас водзіць, вы не пад законам. Бо

справы цела выдомыя: гэта пралюбадзейства, распуста, нячыстасць, саромныя ўчынкі, пакладненне ідалам, чарадзейства, варожасць, суперніцтва, зайздрасць, ярасць, раздражненне, спрэчкі, (спакусы), ерасі, нянавісць, забойствы, п'янства, непрыстойнасці і тым падобнае: гэта кажу вам наперад, як і казаў, што тыя, хто гэтак робяць, Царства Божага не ўнаследуюць. Плод жа духа: любоў, радасць, мір, доўгацярплівасць, дабрыня, міласэрнасць, вера, пакорлівасць, стрыманасць: на іх няма закону. Але тыя — Хрыстовыя — ўкрыжавалі цела з пажадлівасцю і юрлівасцю. Калі мы жывем духам, дык і кіруемся духам. Не будзем задавацца, адзін аднаго дражнячы, адзін аднаму зайздросцячы (Гал. 5, 13-26).

Бо хто думае, што ён ёсць нешта, будучы нічым, розумам сам сабе лісливіць (Гал. 6, 3).

5-ая частка Сімвалу веры. Пра Уваскрасенне

І ўваскрос на трэці дзень, паводле Пісання

1. Цуд і моц Уваскрасення Хрыстовага

Дык мы пахавалі сябе з Ім хрышчэннем у смерць, каб, як Хрыстос уваскрос з памерлых цераз славу Айца, так і нам хадзіць у абноўленым жыцці (Рым. 6, 4).

Але цяпер Хрыстос уваскрос з мёртвых, будучы першынцам сярод памерлых (1 Кар. 15, 20).

Дык апранайцеся, як абраннікі Божыя, святыя і любыя, у шаты шчодрасці, дабрыні, ціхай мудрасці, лагоды (і) спагадлівай цярплівасці, церпячы адзін аднаго і прабачаючы сабе, калі хто да каго мае жаль: як Хрыстос дараваў вам, гэтак і вы. А паверх усяго апяражыцеся любоўю, бо яна — гэта повязь дасканаласці, і няхай у сэрцах вашых запануе Божы спакой, да якога Вы і былі пакліканыя ў адным целе (Кал. 3, 12-15).

Але цяпер Хрыстос уваскрос з мёртвых, стаў першынцам сярод памерлых. Бо як смерць праз чалавека, так праз чалавека і ўваскрасенне з мёртвых. Бо як у Адаме ўсе паміраюць, так у Хрысце ўсе ажывуць, кожны сваім парадкам (1 Кар. 15, 20-23).

Апошні ж вораг знішчыцца — смерць, бо ўсё скарыў пад ногі Яго (1 Кар. 15, 26-27).

Таму і ўсцешылася сэрца маё, ды зарадаваўся язык мой: дый цела маё прыстане ў надзеі, што не пакінеш душы маёй у пекле, дый не дасі святому Твайму бачыць тленне (Дзеі 2, 26-27).

І калі злы дух злога духа выганяе, дык раздваіўся ён сам у сабе: як жа ўсталюецца царства яго? І калі Я сілаю вельзевула выганяю нячыстых духаў, дык чыёй сілаю сыны вашыя выганяюць (Мц. 12, 26-27)?

І анёлаў, якія не захавалі сваёй годнасці, але пакінулі сваё жытло (Іуд. 1, 6).

Бо і Хрыстос, каб прывесці нас да Бога, раз пацярпеў за грахі нашыя, Праведнік за няправедных, прыняў смерць целам, але ажыў духам, у Якім Ён і тым духам, што былі ў вязніцы, сышоў і абвяшчаў (1 Пят. 3, 18-19).

2. Сведчанні Святога Пісання аб Уваскрасенні Хрыста

Бо я найперш пераказаў вам тое, што і сам прыняў, што Хрыстос памёр за грахі нашыя паводле Пісання, і што Ён быў пахаваны і ўваскрос на трэці дзень, паводле Пісання (1 Кар. 15, 3-4).

Ён жа прыняў раны за грахі нашыя і нёс пакуты за беззаконні нашыя, кара свету нашага на Ім, ранамі Яго мы вылечыліся (Іс. 53, 5).

... Няма ў Ім ані выгляду, ані велічы; і мы бачылі Яго, і не было ў Ім ні выгляду, ні прывабнасці: выгляд Яго быў пазбаўлены гонару, і прыніжаны горш за ўсіх сыноў чалавечых: Чалавек гэты ў ранах, спакутаваны ў хваробах, і мы адварочвалі твар свой ад Яго, зганьбаванага, і пагарджалі Ім. Ён грахі нашыя носіць і за нас пакутуе, а мы думалі, што Ён нясе пакуты і раны, ад Бога пакараны. Ён жа прыняў раны за грахі нашыя і пакуты за беззаконні нашыя, кары свету нашага на Ім, ранамі Яго мы вылечыліся. Усе мы, як авечкі, заблукалі: кожны збіўся са шляху свайго, і Госпад усклаў на Яго грахі за ўсіх нас. І

Той, хоць цвілілі Яго, не размыкае вуснаў Сваіх: як авечка, якую вядуць, каб закалоць, і як Ягня перад тым, хто стрыжэ яго, не падае голасу, так Ён не размыкае вуснаў сваіх (Іс. 53, 2-7).

Бо не пакінеш душы Маёй у пекле, ды не дасі Святому Твайму бачыць тленне (Дз. 2, 27).

І быў Іона ў чэраве кіта тры дні і тры ночы (Іона 2, 1).

Род нягодны і чужаложны знакаў шукае: і знакі не будуць дазеныя яму, апрача знаку прарока Іоны (Мц. 16, 4).

6-ая частка Сімвалу веры. Пра Узнясенне

І ўзышоў на неба, і сядзіць праваруч Айца

Расчыняйце, брамы высокія! Але, расчыняйцеся, брамы адвечныя, каб увайшоў Цар Славы. Хто ж гэты Цар Славы? Госпад моцны і магутны, Госпад дужы ў барацьбе. Расчыняйце, брамы высокія! Але, расчыняйцеся, брамы адвечныя, каб увайшоў Цар Славы! Хто ж гэты Цар Славы? Госпад войскаў нябесных — Ён ёсць Цар Славы (Пс. 23, 7-10)!

Ты ўзышоў на вышыню і паланіў палон; Ты дары прыняў дзеля людзей, каб нават тыя, што праціваяцца, маглі пры Госпадзе жыць (Пс. 67, 19).

Той, хто сышоў, — гэта Той, хто ўзышоў вышэй за ўсе нябёсы, каб здзейсніць усё. І Ён паставіў

адных Апосталамі, іншых прарокамі, адных евангелістамі, іншых пастырамі і настаўнікамі, дзеля святых учынкаў, дзеля служэння, на будаванне Цела Хрыстовага (Эф. 4, 10-12).

І пастануць таго дня ногі Яго на гары Аліўнай, што стаіць проста на Усход перад Іерусалімам; і расколецца напалам гара Аліўная: палова яе на Усход, а другая палова да мора — вялізным прагалам, і адыдзе палова гары на поўнач, і палова яе — на поўдзень (Зах. 14, 4).

І ў іншых звяроў аднятая была ўлада, і працяг жыцця дадзены ім быў толькі да пары да часу. Бачыў я ноччу ў сне, як па аблоках нябесных Сын Чалавечы ішоў, дайшоў да Старога днямі і быў падведзены да Яго: і дадзеная Яму была ўлада, і слава, і Царства, і ўсе людзі, плямёны і народы служылі Яму; улада Яго, улада вечная, яна не міне, і Царства Яго не загіне (Дан. 7, 12-13).

Мы маем такога Архірэя, які сеў праваруч пасаду велічы на небе (Яўр. 8, 1).

І адказаў Пётр: за Хрыста Божага. Але Ён строга загадаў ім нікому не гаварыць аб гэтым, сказаўшы, што Сын Чалавечы мусіць вынесці шмат пакут, і спакусаў, (...) і будзе забіты, і на трэці дзень уваскрэсне (Лк., 9, 20-22).

Бо хто пасаромеецца Мяне і Маіх слоў, таго Сын Чалавечы пасаромеецца, калі прыйдзе ў славе Сваёй і Айца і святых Анёлаў (Лк. 9, 26).

Будзьце ж і вы гатовыя, бо Сын Чалавечы прыйдзе ў такую часіну, аб якой не думаеце (Лк. 12, 40).

Бо, як маланка выблісне з усходу і відаць да захаду, так будзе прыход Сына Чалавечага (Мц. 24, 27).

І тады з'явіцца знак Сына Чалавечага на небе: і тады заплачуць усе плямёны зямныя і ўгледзяць Сына Чалавечага, што ідзе па аблоках нябесных з сілаю і славаю вялікай (Мц. 24, 30).

Бо як Айцец мае жыццё ў Сабе, так і Сыну даў жыццё ў Сабе, і даў Яму ўладу і суд чыніць, бо Ён ёсць Сын Чалавечы (Ін. 5, 26-27).

7-ая частка Сімвалу веры. Пра Другое Прыйсце

І будзе са славаю судзіць жывых і мёртвых, Яго ж Царству не будзе канца.

3. Вызначальныя рысы Другога Прыйсця Хрыста

Гэты Ісус, узяты ад вас на неба, прыйдзе гэтаксама, як бачылі вы Яго, калі ўзыходзіў на неба (Дзеі 1, 11). Пакуль не праміне неба і зямля, ніводная ёта, ці ніводная рыса не праміне з закону, пакуль не здзейсніцца ўсё (Мц. 5, 18).

Калі ж прыйдзе Сын Чалавечы ў Славе Сваёй і ўсе святыя Анёлы з Ім, тады сядзе на пасадзе славы Сваёй. І збяруцца перад Ім усе народы; і адлучыць іх адзін ад аднаго, як пастух адлучае авец ад казлоў; і пастаўіць авец праваруч ад Сябе, а казлоў леваруч. Тады скажа Цар тым, хто праваруч Яго: прыйдзіце, благаславёныя Айца Майго, наследуйце Царства, прызначанае вам ад стварэння свету. Бо хацеў Я есці, і вы накармілі Мяне, смяг, і вы напаілі Мяне, быў здарожаны, і вы прынялі Мяне. Быў голы, і вы апранулі Мяне, быў хворы, і вы наведалі Мяне, быў у вязніцы, і вы прыйшлі да Мяне. Тады праведнікі скажуць Яму ў адказ: Госпадзе! Калі мы бачылі Цябе галоднага і накармілі? Ці прагнага — і напаілі; калі мы бачылі Цябе здарожанага — і прынялі? Ці голага — і апранулі? І Цар скажа ім у адказ: сапраўды кажу вам: тое, што вы зрабілі аднаму з гэтых меншых братоў Маіх, вы зрабілі Мне. Тады скажа і тым, што леваруч: ідзіце ад Мяне, праклятыя, у агонь вечны, прызначаны д’яблу і анёлам яго: бо Я быў галодны, і вы не далі Мне есці, смяг, і вы не напаілі Мяне, быў здарожаны, і не прынялі Мяне, голы, і не апранулі Мяне, быў хворы і ў вязніцы, і не наведалі Мяне. Тады і яны скажуць Яму ў адказ: Госпадзе! Калі мы бачылі Цябе галоднага, ці прагнага, ці здарожанага, ці голага, ці хворага, ці ў вязніцы — і не паслужылі Табе? Тады скажа ім у адказ: сапраўды кажу вам, як не зрабілі гэтага аднаму з гэтых меншых — не зрабілі і Мне. І пой-

дуць тыя на вечную пакуту, а праведнікі ў жыццё вечнае (Мц. 25, 31-46).

... Але ўсе пераменімся неўзабаве, у імгненне вока, пры апошняй трубе (1 Кар. 15, 51-52).

Бачыў я ноччу ў сне, як па аблоках нябесных Сын Чалавечы ішоў, дайшоў да Старога днямі і быў падведзены да Яго: і дадзеная Яму была ўлада, і слава, і Царства, і ўсе людзі, плямёны і народы служылі Яму; улада Яго, улада вечная, яна не міне, і Царства Яго не загіне (Дан. 7, 13-14).

Ён будзе вялікі і Сынам Найвышэйшага назавецца (Лк. 1, 32).

... Надыдзе час, калі ўсе, хто ў магілах, пачуюць голас Сына Божага, і выйдуць, хто чыніў дабро, на ўваскрашэнне жыцця, а хто чыніў благое — на ўваскрашэнне суда (Ін. 5, 28-29).

Дзеля гэтага не судзіце заўчасна, пакуль не прыйдзе Госпад, які высветліць схаванае ў цемры і выявіць думкі сэрцаў; і тады пахвала будзе кожнаму ад Бога (1 Кар. 4, 5).

Кажу ж вам, што за ўсякае пустое слова, якое скажуць людзі, дадуць яны адказ у дзень суда (Мц. 12, 36).

2. Час і прыкметы Другога Прыйсця

Не марудзіць Госпад з абяцаным, як гэта некаторыя за маруднасць прымаюць, але доўга

церпіць нас, не хочучы, каб нехта загінуў, але каб усе прыйшлі да пакаяння. Прыйдзе ж дзень Гасподні, як злодзей уночы, і тады нябёсы з шумам пройдуць (2 Пят. 3, 9–10).

Дык не спіце, бо не ведаеце ні дня, ні гадзіны, калі прыйдзе Сын Чалавечы (Мц. 25, 13).

3. Вучэнне пра антыхрыста

Бо патаемна ўжо робяцца беззаконнасці (2 Фес. 2, 7).

Але як прыйдзе Сын Чалавечы, ці знойдзе веру на зямлі (Лк. 18, 8)?

І тады адкрыецца беззаконнік, якога Госпад Ісус заб'е духам вуснаў Сваіх (2 Фес. 2, 8).

4. Тры віды Царстваў

Сапраўды, кажу вам: не будзе зводу гэтаму роду, як ўсё гэта станецца (Мк. 13, 30).

Пакайцеся, бо наблізілася Царства Нябеснае (Мц. 4, 17).

Ён будзе вялікі і Сынам Найвышэйшага назавецца, і дасць Яму Госпад Бог пасад Давіда, бацькі Яго, і цараваць будзе над домам Якуба навекі, і Царству Яго не будзе канца (Лк. 1, 32-33).

8-ая частка Сімвалу веры.
Пра Святую Тройцу

І ў Духа Святога, Госпада, жыццядайнага, Які зыходзіць ад Айца, Якому нароўні з Айцом і Сынам пакланенне і слаўленне належаць, Які вяшчаў праз прарокаў.

1. Боская існасць Святога Духа

Ананія, чаму напоўніў шатан сэрца тваё, каб ашукаць Духа Святога ды прыхаваць з цаны за зямлю? (...) Не людзей ты ашукаў, а Бога (Дзеі 5, 3-5).

4. Уласцівасці Святога Духа

Калі ж прыйдзе Ён, Дух Праўды, навучыць вас усякае праўды (Ін, 16, 13).

(і) калі нешта папросіце ў імя Маё, Я зраблю. Калі любіце Мяне, выконвайце мае Запаведзі, і Я ўпрашу Айца, і Ён дасць вам іншага Суцяшыцеля, каб быў з вамі давеку, Духа праўды, якога свет не можа прыняць, бо не бачыць Яго, і не ведае Яго: вы ж ведаеце Яго, бо Ён з вамі ёсць і будзе (Ін. 14, 14-17).

Калі ж прыйдзе Суцяшыцель, Яго Я пашлю вам ад Айца, Дух Праўды, Які ад Айца зыходзіць, Ён будзе сведчыць аба Мне, дый вы сведчыць будзеце таксама, бо вы ад пачатку са Мной (Ін. 15, 26-27).

Але гаворым Мудрасць Божую, у таямніцы схаваную, якую прадвызначыў Бог спрадвеку дзеля славы нашае, а якую ніхто з князёў веку гэтага не разумее: бо каб разумелі, не ўкрыжавалі б Госпада Славы. Але, як напісана было: чаго вока не бачыць, і вуха не чуе, і што да сэрца чалавеку не ўзыходзіла, тое наканаваў Бог тым, хто любіць Яго. А нам Бог адкрыў Духам Сваім: бо Дух усё прасякае, і глыбіні Божыя (1 Кар. 2, 7-10).

Бо праз Яго маем абое доступ да Айца ў адным Духу (Эф. 2, 18).

Дух ажыўляе, цела не дае ніякае карысці. Словы, якія кажу Я вам, ёсць дух і жыццё (Ін. 6, 63).

Ты адварочваеш аблічча Тваё — і тузаюцца яны ў жаху; дух адымаеш у іх — і знікаюць яны і ў пыл назад абяртаюцца. Пашлеш Духа Твайго — і паўстануць яны, і аблічча зямлі Ты абновіш (Пс. 103, 29-30).

Калі хто не народзіцца вадою і Духам, не можа ўвайсці ў Царства Божае (Ін. 3, 5).

Усе яны на Цябе чакаюць, каб Ты даў есці ім у належны час (Пс. 103, 27).

Усякае дыханне няхай славіць Госпада (Пс. 150, 6)!

Блюзнерства супраць духа не даруецца чалавекам (Мц. 12, 31).

Калі ж прыйдзе Суцяшыцель, якога Я пашлю вам ад Айца, Дух Праўды, Які ад Айца зыходзіць, Ён будзе сведчыць аба мне (Ін. 15, 26).

Словам Гасподнім нябёсы ўмацаваныя, і Духам вуснаў Яго ўся сіла іх (Пс. 32, 6).

І Дух Божы лунаў над абліччам вады (Быц. 1, 2).

Пільнуйце ж самі сябе і ўвесь статак, бо ў ім Дух Святы паставіў вас за епіскапаў, каб пасвіць Царкву Госпада і Бога, якую прыдбаў Ён Уласнаю крывёю (Дзеі 20, 28).

Дык ідзіце, навучайце ўсе народы, хрысцячы іх у імя Айца, і Сына, і Святога Духа (Мц. 28, 19).

3. Дзеянне Святога Духа праз прарокаў і Апосталаў

Дух Гасподні гаворыць ува мне, і слова Яго на языку маім (2 Цар. 23, 2).

Праверце ў Пісаннях, калі вы думаеце мець праз іх жыццё вечнае: і яны сведчаць пра Мяне (Ін. 5, 39).

Бо калі б вы верылі Майсею, дык верылі б і Мне, бо пра Мяне ён пісаў. А калі яго пісанням не верыце, як дасце веры Маім словам (Ін. 5, 46-47)?

Прарока пастаўлю над імі з асяроддзя братоў іх, як цябе: і ўкладу слова Маё ў вусны Яго, і будзе прамаўляць да іх, як накажу Яму (Друг. 18, 18).

Не думайце, што прыйшоў Я парушыць закон або прарокаў: не парушыць прыйшоў Я, але выканаць (Мц. 5, 17-18).

Усякае Пісанне Богам натхнёнае і карыснае для вывучэння, для выкрыцця, для выпраўлення, для пакарання, для настаўлення ў праведнасці, каб быў дасканалы чалавек Божы, гатовы для ўсякай добрай справы (2 Цім. 3, 16).

Ніколі адвольна не даецца людзям прароцтва, але, ад Святога Духа асвечаныя, выказваюць яго святыя Божыя людзі (2 Пят. 1, 21).

Ім жа адкрылася, што не ім самім, а нам служыла тое, што было абвешчана вам сягоння тымі, якія неслі вам добрую вестку праз Духа Святога, пасланага з Нябёсаў (1 Пят. 1, 21).

Гаворым Мудрасць Божую, у таямніцы схаваную, якую прадвызначыў Бог спрадвеку дзеля славы нашае, а якую ніхто з князёў веку гэтата не разумее. (...) Але, як напісана было: чаго вока не бачыць, і вуха не чуе, і што да сэрца чалавеку не ўзыходзіла, тое наканаваў Бог тым, хто любіць яго. А нам Бог адкрыў Духам Сваім: бо Дух усё прасякае, і глыбіні Божыя (1 Кар. 2, 7-10).

4. Сродкі набыцця Святога Духа і Яго дабратворныя дары чалавеку

Хіба не ведаеце, што вы ёсць храм Божы, і Дух Божы жыве ў вас (1 Кар. 3, 16)?

Бо калі вы, благія, умееце добрыя даянні даваць дзецям сваім, дык тым болей Айцец Нябесны

дасць Духа Святога тым, хто просіць у яго (Лк. 11, 13).

Калі ж з'явілася спагада і любоў да людзей Збаўцы нашага, Бога, Ён выбавіў нас не паводле ўчынкаў праведных, якія здзейснілі мы, але паводле міласці Сваёй, праз купелю адраджэння і абнаўлення Духам Святым, Якога выліў на нас шчодра праз Ісуса Хрыста, Збавіцеля нашага (Ціт. 3, 4-6).

І не зневажайце Святога Духа Божага, Якім вы запячатаны на дзень адкуплення (Эф. 4, 30).

Бо плод Духа ёсць ва ўсякай дабрыні, і праведнасці, і праўдзе (Эф. 5, 9).

Можаце, чытаючы, пазнаць маё разуменне таямніцы Хрыстовай, якая ў іншых родах не была выказаная сынам чалавечым, бо (толькі) цяпер адкрылася Святым Апосталам Яго і прарокам Духам Святым (Эф. 3, 4-5).

Ім было адкрыта, што не ім самім, але нам служыла тое, што было абвешчана вам сёння тымі, хто нёс вам добрую вестку Духам Святым, пасланым з Нябёсаў, да якой нават Анёлы жадаюць прынікнуць (1 Пят. 1, 12).

Душы вашыя ачысціўшы Духам у паслухмянасці праўдзе, дзеля некрывадушнае братняе любові, заўсёды любіце адзін аднаго ад чыстага сэрца (1 Пят. 1, 22).

І выйдзе парастак з камля Ясеева, галіна ад кораню яго: і спачне на ім Дух Гасподні, Дух мудрасці і розуму, Дух рады і моцы, Дух ведаў і страху Гасподняга, перапоўніць яго Дух страху Гасподняга (Іс. 11, 1-3).

Бо нават праходзячы далінаю цені смяротнага, не пабаюся напасці, бо Ты са мною (Пс. 22, 4).

Памяць праведных жыве з пахваламі: імя ж ліхіх чэзне (Прып. 10, 7).

9-ая частка Сімвалу веры. Пра Царкву

У адзіную Святую, Саборную і Апостальскую Царкву.

1. Царква зямная і Нябесная і вера ў яе

Вера — гэта ўпэўненасць у рэчах нябачных (Яўр. 11, 1).

Ласка ж Госпада нашага (Ісуса Хрыста) памножылася ўва мне разам з вераю і любоўю ў Хрысце Ісусе (1 Цім. 1, 14).

Але вы прыступіліся да гары Сіёну і да горада Бога Жывога, да нябеснага Іерусаліма і мірыядаў Анёлаў, да ўрачыстага Сходу і царквы першынцаў, запісаных на Небе, і да Суддзі ўсіх, Бога, і да духаў праведнікаў дасканалых, і да Хадайніка Новага Запавету Ісуса (Яўр. 12, 22-24).

2. Знаходжанне ў Царкве Божае Ласкі

Слова сталася целам, і асялілася між нас, (і бачылі мы славу Яго, славу як Адзінароднага ад Айца), поўнае ласкі і праўды (Ін. 1, 14).

І я ўпрашу Айца, і Ён дасць вам другога Суцяшыцеля, каб быў з вамі давеку (Ін, 14, 16).

Пільнуйце ж самі сябе і ўвесь статак, бо ў ім вас Дух Святы паставіў за епіскапаў, пасвіць царкву Госпада і Бога, якую Ён прыдбаў уласнаю крывёю (Дзеі 20, 28).

І ўсё скарыў пад ногі Яго, і даў Яго за галаву над ўсім у Царкве, якая ёсць цела Яго, поўня Поўніцы ўсяго ва ўсіх (Эф. 1, 22-23).

Я збудую Царкву Маю, і брамы пякельныя не перамогуць яе (Мц. 16, 18).

Я з вамі ва ўсе дні да скончэння веку (Мц. 28, 20).

Калі Бог за нас, дык хто супраць нас (Рым. 8, 31)?

[Богу] Слава ў Царкве і ў Ісусе Хрысце, на ўсе роды, адвеку і давеку (Эф. 3, 21).

Бо хто Павел? Хто Апалос? Яны толькі служкі, праз якіх вы ўверавалі, і каму як даў Госпад (1 Кар. 3, 5).

3. Адзінства Царквы

Адно цела, адзін дух, як і вы пакліканыя да адной надзеі заклікання вашага; адзін Госпад, адна

вера, адно хрышчэнне, адзін Бог і Айцец усіх, Які над усімі і праз усіх, і ва ўсіх нас (Эф. 4, 4-6).

Калі вы будзеце мець веру, як гарчычнае зерне, і скажаце гэтай гары: перайдзі адгэтуль туды, дык яна пяройдзе, і не будзе нічога немагчымага для вас (Мц. 17, 20).

Захаваць адзінства духа ў саюзе міру (Эф. 4, 3).

4. Адзінства Царквы Хрыстовай, Нябеснай і зямной

а) Адзінства зямной і Нябеснай Царквы праз малітву

Госпад блізкі да ўсіх, хто заклікае Яго, усіх, хто заклікае Яго ў праўдзе. Волю тых, хто баіцца Яго, ён выканае, і малітву іх пачуе, і выратуе іх (Пс. 144, 18-19).

Бо многа можа шчырая малітва справядлівага (Як. 5, 16).

І сказаў мне Госпад: нават калі стануць перад абліччам Маім Майсей і Самуіл, не будзе прыхільнасці ў душы Маёй да гэтых людзей: гані іх (з Твару Майго), і хай яны адыдуць (...). І адпомшчу ім чатырма карамі, сказаў Госпад (Ер. 15, 1, 3).

Праява ж яму была такая: Онія, былы архірэй, муж сумленны і добры, паважнага выгляду, ла-

годнага нораву, прыемны ў гутарцы, які ад дзяцінства быў навучаны ўсім цнотам, (бачыў) яго з уздзетымі рукамі, у малітве за ўвесь люд іудзейскі. І як потым аб'явіўся другі муж, упрыгожаны сівізною і славаю, і аточаны нейкай дзіўнай надзвычайнай веліччу. І адказаў Онія: гэта — браталюбец, які шмат моліцца за люд і за святы горад, Ерамія, Божы прарок (2 Мак. 15, 12-14).

б) падставы да заклікання святых у малітве

Сёння ж аддасі жонку мужу, бо ён — Прарок, і памоліцца аб табе, і жывы будзеш (Быц. 20, 7).

Сёння ж вазьміце сем цялят і сем баранаў і ідзіце да раба майго Іова, і няхай учыніць ахвяру за вас; а Іоў, раб мой, памоліцца за вас, бо толькі яго аблічча Я прыму: бо, каб не ён, загубіў бы Я ўсіх вас, таму што не гаворыце праўды, як раб мой Іоў (...) і адпусціў ім грахі дзеля Іова. Госпад жа вярнуў страты Іова: калі той памаліўся Яму за сяброў сваіх, адпусціў ім грахі іх (Іоў, 42, 8-10).

І сказалі сыны Ізраілевы да Самуіла: не змаўчы пра нас у лямантце да Госпада Бога нашага, няхай збавіць нас ад рук іншапляменнікаў (...), і ўзняў Самуіл лямант да Госпада, і паслухаў яго Госпад (1 Цар. 7, 8-9).

Што мне і табе, чалавеча Божы? ты прыйшоў да мяне прыгадаць няпраўды мае і замарыць сына

майго (...), і заклікала Госпада і сказала: Госпадзе, Божа мой, няхай жа вернецца душа хлапчука гэтага да яго. І сталася так: (...) і сказала жанчына да Іллі: цяпер зразумела я, што ты — Божы чалавек, і слова Гасподняе ў вуснах тваіх праўдзівае (3 Цар. 17, 18-23).

***О**, каб мой уладар быў у прарока Божага, што ў Самарыі, той бы ачысціў яго ад праказы яго (...), Цар Ізраілеў разадраў шаты свае і сказаў: (...) зразумейце і паглядзіце, як гэты шукае зачэпкі да мяне. І тады пачуў гэта Елісей, (....) кажучы: няхай прыйдзе да мяне Нееман, і няхай зразумее, што ёсць прарок у Ізраілі (4 Цар. 5, 3-8).*

***Г**оспадзе Божа Аўраама і Ісаака і Ізраіля айцоў нашых (1 Пар. 29, 18).*

***М**алю вас, браты, Госпадам нашым Ісусам Хрыстом і любоўю Духа, дапамагаць мне малітвамі за мяне да Бога, каб выбавіцца мне ад няверуючых ва Іудзеі (Рым. 15, 30).*

***П**росім жа вас, браты, ведаць тых, што працуюць у вас і пастаўленыя над вамі ў Госпадзе, і вас навучаюць, і шануйце іх вельмі высока ў любові за справу іх, жывіце ў згодзе між сабою (1 Сал. 5, 12-13).*

***Б**раты, маліцеся за нас (1 Сал. 5, 25).*

в) дабратворнае аб'яўленне святых і тварэнне цудаў

І многа целаў памерлых святых паўставалі: і выйшлі з магіл, пасля Уваскрасення Яго, увайшлі ў святы горад і аб'явіліся многім (Мц. 27, 52-53).

І прыйшоў іншы Анёл, і стаў перад алтаром, маючы кадзільню залатую, і далі яму багата фіміяму, каб паклаў з малітвамі ўсіх святых на залаты алтар, што быў перад Пасадам. І ўзняўся дым кадзільны з малітвамі святых ад рукі Анёла перад Богам (Аб'яўл. 8, 3-4).

5. Святасць Царквы

А ў вялікім доме ёсць посуд не толькі залаты і срэбны, але і драўляны, і гліняны; і адзін у пашане, другі — не ў пашане. Дык, калі хто ачысціць сябе з гэтага, той будзе посудам у пашане, асвечаным і карысным для Уладара, прыдатным на ўсякую добрую справу (2 Цім. 2, 20).

Хрыстос палюбіў Царкву і выдаў Сябе за яе, каб асвяціць яе, ачысціўшы купеллю воднаю ў слове, каб уявіць яе Сабе слаўнаю, Царкву гэтую, без плямы ці заганы, ці чагосьці такога, але каб стала яна святая і беззаганная (Эф. 5, 25-27).

Асвяці іх праўдаю Тваёю: Слова Тваё — праўда (Ін. 17, 17).

І за іх Я асвячаю Сябе, каб і яны былі асвячаныя праўдаю (Ін. 17, 19).

Дык адрыньце благога пасярод вас саміх (1 Кар. 5, 13).

Бо цвёрдая аснова Божая стаіць, маючы гэткую пячаць: «пазнаў Госпад Сваіх», і: «няхай адступіцца ад няпраўды кожны, хто імя Госпада называе» (2 Цім. 2, 19).

6. Саборнасць Царквы

Кажа ёй Ісус: жанчына, вер Мне, надыдзе пара, калі не на гары гэтай, і не ў Іерусаліме пакланяцца будзеце Айцу. Вы пакланяецеся, а таго не ведаеце, мы пакланяемся, бо ведаем тое, што збаўленне ёсць ад Іудзеяў. Але настане пара, дый яна ўжо прыйшла, калі праўдзівыя паклоннікі будуць пакланяцца Айцу ў духу і праўдзе, бо Айцец гэткіх шукае паклоннікаў Яму (Ін. 4, 21).

Па ўсёй зямлі разышоўся голас іх (Рым. 10, 18).

Найперш дзякую Богу майму праз Ісуса Хрыста за ўсіх вас, што вера ваша абвяшчаецца па ўсім свеце (Рым. 1, 8).

Дзякуй жа Богу, што заўсёды нам дае перамогу ў Ісусе Хрысце, і салодкі дух розуму Яго выяўляе праз нас ва ўсялякім месцы (2 Кар. 2, 14).

Бо Госпад ёсць Дух, а дзе Дух Гасподні, там свабода (2 Кар. 3, 17).

Дзеля надзеі, прыгытаванай вам у нябёсах, пра якую вы чулі раней ў словах праўды Дабравесця, якое ёсць у вас, як і ва ўсім свеце, і пладаносіць, і расце яно, як і сярод вас, з таго дня чуеце і разумееце ласку Божую ў праўдзе (Кал. 1, 5-6).

Закон настаўнікам нам быў у Хрысце (Гал. 3, 24).

Я збудую Царкву Маю, і брамы пякельныя не перамогуць яе (Мц. 16, 18).

І, падышоў Ісус, і прамовіў да іх, кажучы: дадзена Мне ўсякая ўлада на небе і на зямлі. Дык ідзіце, навучайце ўсе народы, хрысцячы іх у імя Айца і Сына і Святога Духа, навучаючы іх выконваць усё, што Я сказаў вам; і вось Я з вамі ва ўсе дні да сканчэння веку. Амін. (Мц. 28, 18-20).

І Пісанне, прадбачучы, што Бог вераю апраўдвае паган, загадзя абвясціла Аўрааму: у табе благаслаўлёныя будуць усе народы. Гэтак тыя, што ад веры, благаслаўляюцца разам з верным Аўраамам (Гал. 3, 8-9).

І апрануўшыся ў новага, які абнаўляецца ў пазнанні паводле вобразу Стваральніка свайго, дзе няма Грэка і Іудзея, абразання і неабразання, варвара і Скіфа, раба і свабоднага, але ўсё і ва ўсім Хрыстос (Кал. 3, 10-11).

І сказаў ім: ідзіце па ўсім свеце і абвяшчайце Евангелле ўсякаму стварэнню. Хто паверыць і ахрысціцца, будзе збаўлены: а хто веры не мае, асуджаны будзе (Мк. 16, 15-16).

Тады расчыніў ім розум дзеля зразумення Пісання. І сказаў ім: так напісана, і так належала пакутаваць Хрысту і ўваскрэснуць з мёртвых на трэці дзень, і абвяшчацца ў імя Яго пакаянню ды адпушчэнню грахоў ва ўсіх народах, пачаўшы ад Іерусаліма (Лк. 24, 45-47).

Хрыстос палюбіў Царкву і выдаў Сябе за яе, каб асвяціць яе (Эф. 5, 25).

Асвяці іх праўдаю Тваёю (Ін. 17, 17).

Дух (ёсць) Бог: і той, хто кланяецца Яму, павінен кланяцца духам і праўдаю (Ін. 4, 24).

Муж ёсць галава жонкі, так і Хрыстос галава Царквы, і Ён жа Збавіцель цела (Эф. 5, 23).

7. Апостальская Царква

Бо ніхто не можа пакласці іншага фундаменту, апрача закладзенага, які ёсць Ісус Хрыстос (1 Кар. 3, 11).

Таму (Богу Айцу) Слава ў Царкве ў Хрысце Ісусе, на ўсе роды, адвеку давеку (Эф. 3, 21).

Дый вы ўжо не чужыя і не прышлыя, але суграмадзяне святым і хатнія ў Бога, умацаваныя на падмурку Апосталаў і прарокаў, маючы за нарожны камень Самога Ісуса Хрыста, ўзнесеныя былі на падмурку Апосталаў і Прарокаў, якія былі нарожным каменем Самому Ісусу Хрысту (Эф. 2, 19).

І Ён паставіў адных Апосталамі, другіх Прарокамі, іншых евангелістамі, іншых пастырамі і настаўнікамі, дзеля ўдасканалення святых, дзеля справы служэння, на збудаванне цела Хрыстовага (Эф. 4, 11-12).

Прыміце Духа Святога. Каму адпусціце грахі, таму будуць адпушчаныя, на кім пакінеце, на тым застануцца (Ін. 20, 22-23).

Бо ёсць многа і непакорлівых, і пустасловаў, і ашуканцаў, асабліва з абрэзаных, якім трэба затыкаць рот: яны цэлыя дамы разбэшчваюць, навучаючы, чаму не след, дзеля ганебнае карысці (Ціт. 1, 10-11).

Бо ўсе адным Духам ахрышчаныя ў адно цела, Іудзеі або Грэкі, рабы або вольныя: і ўсе напоеныя адным Духам. Бо Цела — не адзін член, але многа (1 Кар. 12, 13-14).

Ерэтыка чалавека пасля першай і другой перасцярогі пакінь, ведаючы, што гэткі разбэсціўся і грашыць, асуджаны сам сабою (Ціт 3, 10-11).

Скажы Царкве, а калі і Царквы не паслухае, няхай будзе ён табе як язычнік і мытнік (Мц. 18, 17).

На тым, браты, стойце, і трымайцеся падання, якому навучыцеся або словам, або пасланнем нашым (2 Сал. 2, 15).

О, Цімафею, захавай паданне (1 Цім. 6, 20).

Хвалю вас, браты, бо вы ўсё маё памятаеце, і трымаецеся падання, якое я вам перадаў (1 Кар. 11, 2).

10-ая частка Сімвалу веры. Пра Хрышчэнне
Вучэнне пра Таінствы Царквы

Вызнаю адзінае хрышчэнне дзеля збаўлення ад грахоў.

Таінствы як свяшчэннадзеянні, праз якія праліваецца Ласка Божая

Усе мы, якія ахрысціліся ў Хрыста Ісуса, у смерць Яго ахрысціліся (Рым. 6, 3).

Бо кожны раз, калі вы ясце гэты хлеб і п'яце чару гэтую, смерць Госпаднюю абвяшчаеце, дакуль (Ён) не прыйдзе (1 Кар. 11, 26).

1. Хрышчэнне [Хрост]:

а) паняцце аб Таінстве Хрышчэння

У Ім вы і абрэзаныя абразаннем нерукатворным, зняўшы з цела грахі цялесныя ў абразанні Хрыстовым, пахаваныя з Ім у Хрышчэнні, у Ім вы і ўваскрэслі разам праз веру ў сілу Бога, Які ўваскрасіў Яго з мёртвых: дый вас, што былі мёртвыя ў грахах і неабразанні цела вашага, ажывіў разам з Ім, дараваўшы нам усе грахі (Кал. 2, 11-13).

Іаан хрысціў хрышчэннем пакаяння, кажучы народу, каб паверылі ў Таго, хто ідзе за ім, гэта значыцца, у Ісуса Хрыста (Дзеі 19, 4).

Калі хто не народзіцца нанова, не зможа бачыць Царства Божага (Ін. 3, 3).

Сапраўды, сапраўды кажу табе: калі хто не народзіцца вадою і Духам, не можа ўвайсці ў Царства Божае (Ін. 3, 5).

І так ідзіце, навучайце ўсе народы, хрысцячы іх ў імя Айца і Сына і Святога Духа (Мц. 28, 19).

Пакайцеся, і няхай кожны з вас ахрысціцца ў імя Ісуса Хрыста дзеля адпушчэння грахоў: і возьмеце дар Духа Святога (Дзеі 2, 38).

Няўжо ж хто можа забараніць ваду дзеля хрышчэння вось гэтых, што прынялі Духа Святога, як і мы? І загадаў ім хрысціцца ў імя Ісуса Хрыста. Тады прасілі яго, каб пабыў у іх некалькі дзён (Дзеі 10, 47–48).

б) бачны і нябачны бакі Хрышчэння

Сказаў жа яму Пілiп: Калі верыш з усяго сэрца, дык можна табе. І мовіў у адказ: веру, што Ісус Хрыстос ёсць Сын Божы. І загадаў спыніць воз. І сышлі абое ў ваду, Пілiп з еўнухам, і ахрысціў яго. Калі ж выйшлі з вады, Анёл Гасподні схапіў Пілiпа, і еўнух больш не бачыў яго, бо паехаў у сваю дарогу ўсцешаны (Дзеі 8, 37–39).

Калі ж паверылі Пілiпу, які абвяшчаў ім Царства Божае ды імя Ісуса Хрыста, мужчыны і жанчыны хрысціліся. Сымон жа і сам паверыў і, як хрысціўся, быў пры Пілiпе (Дзеі 8, 12-13).

Іаан жа таксама хрысціў ў Эноне, недалёка ад Саліма, бо вады там было багата (Ін. 3, 23).

Калі хто не народзіцца нанова, не зможа бачыць Царства Божага (Ін. 3, 3).

Што ж скажам? Ці нам вязнець у граху, каб памнажалася ласка? Няхай не станецца! Мы, якія памерлі для граху, як жа ж мы будзем жыць у ім? Няўжо вы не разумееце, што ўсе мы, якія ахрысціліся ў Хрыста Ісуса, у смерць Яго ахрысціліся? Дык мы пахавалі сябе разам з Ім хрышчэннем у смерць, каб, як Хрыстос уваскрос з памерлых цераз славу Айца, так і нам хадзіць у абноўленым жыцці. Бо, калі мы былі злучаныя з Ім падабенствам смерці Яго, дык будзем [злучаныя і падабенствам] уваскрасення (Рым. 6, 1-5).

Пакайцеся, і няхай кожны з вас ахрысціцца ў імя Ісуса Хрыста дзеля адпушчэння грахоў (Дзеі 2, 38).

Абмыліся, але асвяціліся, але апраўдаліся імем Госпада нашага Ісуса Хрыста і Духам Бога нашага (1 Кар. 6, 11).

Бо ўсе вы сыны Божыя праз веру ў Хрыста Ісуса. Бо, колькі вас у Хрыста ахрысцілася — у Хрыста апранулася. Няма ўжо Іудзея, ані Грэка, няма раба, ані свабоднага; няма мужчынскага полу, ані жаночага: бо ўсе вы адно ў Хрысце Ісусе (Гал. 3, 26-28).

Закон жа прыйшоў пасля, і такім чынам памножыўся грэх. А калі памножыўся грэх, звыш

меры памножылася ласка, каб, так як грэх запанаваў у смерці, так і ласка запанавала праз праведнасць на жыццё вечнае, праз Ісуса Хрыста, Госпада нашага (Рым. 5, 20-21).

в) Хрышчэнне немаўлят

І слухала адна жанчына, на імя Лідзія, гандлярка парфірлю, з горада Фіятыра, якая шанавала Бога, і Госпад адчыніў сэрца ёй, каб успрыняла прамову Паўла. Калі ж хрысцілася яна і дом яе (Дзеі 16, 14-15).

Гаспадары, што мне трэба рабіць, каб выратавацца? Яны ж сказалі: Вер у Госпада Ісуса Хрыста — і будзеш збаўлены ты і ўвесь дом твой. І казалі слова Гасподняе яму і ўсім хатнім ягоным. І ўзяў іх ў тую ж гадзіну ночы, паабмываў раны ды ахрысціўся сам разам з усім сваім домам (Дзеі 16, 30-33).

А Крысп, начальнік сабору, паверыў у Госпада з усім домам сваім, і многія з Карынфян, слухаючы, паверылі ды ахрысціліся (Дзеі 18, 8).

г) якім чынам выконваецца Хрышчэнне

Паводле звычаю гэтага свету, па волі князя ўлады паветранае, духа, што дзейнічае цяпер ў сынах праціўлення (Эф. 2, 2).

Імем Маім дэманаў выганяць будуць (Мк. 15, 17).

Хто паверыць і ахрысціца, збаўлены будзе (Мк. 16, 16).

Хрытос палюбіў Царкву і выдаў Сябе за яе, каб асвяціць яе, ачысціўшы купеллю воднаю, у слове (Эф. 5, 25-26).

Калі хто хоча ісці за Мною, няхай сябе зрачэцца, возьме крыж свой і за мной ідзе следам (Мц. 16, 24).

Бо, уцёкшы ад брыдоты свету праз пазнанне Госпада і Збавіцеля нашага Ісуса Хрыста, зноў, заблытаўшыся, пераможаныя бываюць, дык апошняе для іх горш за першае (2 Пят. 2, 20).

Пакайцеся, і няхай кожны з вас ахрысціцца ў імя Ісуса Хрыста дзеля адпушчэння грахоў: і возьмеце дар Духа Святога (Дзеі, 2, 38).

2. Мірапамазанне

Дый вы памазанне маеце ад Святога, і ведаеце ўсё (1 Ін. 2, 20).

І памазанне, якое вы прынялі ад Яго, у вас застаецца, і вы не маеце патрэбы, каб хто вучыў вас, але, як гэтае самае памазанне вучыць вас аб усім, а яно праўдзівае і непадманнае, дык, калі яно навучыла вас, у тым трывайце (1 Ін. 2, 27).

Тады яны ўсклалі на іх рукі, і тыя прынялі Духа Святога (Дзеі 8, 17).

Пачуўшы, яны ахрысціліся ў імя Госпада Ісуса, і, як усклаў Павел рукі на іх, зышоў на іх Дух Святы (Дзеі 19, 5-6).

Апосталы ж, якія былі ў Іерусаліме, пачуўшы, што Самарыя прыняла слова Божае, паслалі ім Пятра ды Іаана, якія прыйшлі, памаліліся за іх, каб прынялі Духа Святога: бо не сышоў Ён датуль ні на каго з іх, а толькі былі яны ахрышчаныя ў імя Госпада Ісуса (Дзеі 8, 14-16).

І ўзяў Садок іерэй рог з алеем са скініі, і памазаў Саламона, і затрубілі ў трубны рог, і прамовілі ўсе людзі: няхай жыве цар Саламон (3 Цар. 1, 39).

І зрабі гэты алей для святога памазання, мазь, складзеную па-майстэрску алейнікам: гэта будзе міра для святога памазання (Вых. 30, 25).

Дый памазанне, якое вы атрымалі ад Яго, у вас застаецца, і вам не трэба, каб нехта вучыў вас, але, як гэтае самае памазанне [Яго, Дух Яго] вучыць вас аб усім (1 Ін. 2, 27).

Той, хто ўмацоўвае нас з вамі ў Хрысце і памазаў нас, ёсць Бог, Які і запячатаў нас, і даў задатак Духа ў сэрцах нашых (2 Кар. 1, 21-22).

3. Еўхарыстыя

а) Божае ўстанаўленне Таінства Еўхарыстыі

Што нам рабіць, каб рабіць справы Божыя? Адказаў Ісус і сказаў ім: вось справы Божыя: каб

вы верылі ў Таго, Каго Ён паслаў. Яны ж сказалі Яму: які ж Ты дасі знак, каб мы бачылі і паверылі Табе? Што Ты робіш? Бацькі нашыя елі манну ў пустыні і насыціліся, паводле напісанага: хлеб з Неба даў ім есці. Ісус жа сказаў ім: Сапраўды, сапраўды кажу вам: не Майсей даў вам хлеб з Неба, але Айцец Мой дае вам сапраўдны хлеб з Неба. Бо хлеб Божы ёсць той, што сыходзіць з Неба і дае жыццё свету. Яны ж сказалі Яму: Госпадзе! Давай нам заўсёды такі хлеб. Ісус жа сказаў ім: Я ёсць хлеб жыцця, хто прыходзіць да Мяне, не будзе галодны, хто верыць ў Мяне, не будзе смягнуць ніколі. Але Я сказаў вам, што і бачылі Мяне, і не верыце. Усё, што даў Мне Айцец, да Мяне прыйдзе, і таго, хто прыходзіць да Мяне, не выганю прэч: бо Я сышоў з Неба не дзеля таго, каб чыніць волю Маю, але волю Айца, Які Мяне паслаў (Ін. 6, 28-38).

Бо хлеб Божы ёсць той, што сыходзіць з Неба і дае жыццё свету (Ін. 6, 33).

Госпадзе! Давай нам заўсёды такі хлеб (Ін. 6, 34).

Ніхто не можа прыйсці да Мяне, калі Яго не прывабіць Айцец, што паслаў Мяне, і Я ўваскрашу яго ў апошні дзень (Ін. 6, 44).

Таго, хто прыходзіць да Мяне, не выганю прэч: бо Я сышоў з Неба не дзеля таго, каб чыніць волю Маю, але волю Айца, Які Мяне паслаў... Воля Таго, хто паслаў Мяне, такая, каб кожны, хто

бачыць Сына і верыць у Яго, меў жыццё вечнае, і Я ўваскрашу яго ў апошні дзень (Ін. 6, 37-40).

Я — хлеб жывы, што сышоў з Неба, хто есць хлеб гэты, жыць будзе вечна (Ін. 6, 51).

Хлеб жа, які дам, ёсць Цела Маё, якое Я аддам за жыццё свету (Ін. 6, 51).

Жорсткае гэта слова (Ін. 6, 60).

Бо Цела Маё сапраўды ёсць ежа, і Кроў Мая сапраўды ёсць пітво (Ін. 6, 55).

Ці гэта вас абурае? А калі ўбачыце Сына Чалавечага, які ўзыходзіць туды, дзе быў раней? Дух ёсць тое, што ажыўляе, цела ж нічога не вартае: словы, якія вам кажу, ёсць Дух і жыццё (Ін. 6, 61-63).

Ніхто не можа прыйсці да Мяне, калі яму не будзе дадзена Айцом Маім (Ін. 6, 65).

Госпадзе! Да каго нам ісці? Ты маеш словы жыцця вечнага (Ін. 6, 68).

Хіба не Я вас дванаццацярых абраў? Але адзін з вас — д'ябал (Ін. 6, 70).

Адзін з вас выдасць Мяне (Мц. 26, 21).

І, калі яны елі, Ісус, ўзяўшы хлеб і паблагаславіўшы, паламаў і даваў вучням, кажучы: прыміце, ешце, гэта ёсць Цела Маё. І, узяўшы чару і аддаўшы хвалу, падаў ім і сказаў: піце з яе ўсе, бо гэта ёсць Кроў Мая, Новага Запавету, за многіх праліваная дзеля даравання грахоў (Мц. 26, 26-28).

б) здзяйсненне Таінства Еўхарыстыі падчас набажэнства

Прыміце, ешце, гэта ёсць Цела Маё (...). Піце з яе ўсе, бо гэта ёсць Кроў Мая, Новага Запавету, за многіх праліваная дзеля даравання грахоў (Мц. 26, 26-28).

Хто есць цела Маё і п'е Кроў Маю, мае жыццё вечнае, і Я ўваскрашу яго ў апошні дзень (Ін. 6, 54).

Адзін хлеб, адно цела — мы многія, бо ўсе прычашчаемся ад аднаго Хлеба (1 Кар. 10, 17).

в) Еўхарыстыя — як Ахвяра, і яе адносіны да Галгофскае Ахвяры

І, калі яны елі, Ісус, ўзяўшы хлеб і паблагаславіўшы, паламаў і даваў вучням (Мц. 26, 26).

г) плады Таінства Еўхарыстыі

Бо Цела Маё сапраўды ёсць ежа, і Кроў Мая сапраўды ёсць пітво (Ін. 6, 55).

Адзін хлеб, адно цела — мы многія, бо ўсе ад аднаго хлеба прычашчаемся (1 Кар. 10, 17).

Хто есць Цела Маё і п'е Кроў Маю, мае жыццё вечнае, і Я ўваскрашу яго ў апошні дзень (Ін. 6, 54).

І хто есць Цела Маё і п'е кроў Маю, ува Мне ёсць, і Я ў ім (Ін. 6, 56).

Няхай выпрабуе сябе чалавек, і тады есць з хлеба гэтага і п'е з чары гэтай. Бо той, хто есць і п'е непрыстойна, той есць і п'е прысуд сабе, не разважаючы аб Целе Гасподнім (1 Кар. 11, 28-29).

Калі хто смягне, няхай прыйдзе да Мяне і п'е: хто верыць у Мяне, у таго, як сказана ў Пісанні, з чэрава пацякуць рэкі вады жывой. Гэта сказаў Ён пра Духа, Якога меліся прыняць вернікі ў імя Яго; бо не было яшчэ на іх Духа Святога, бо не быў яшчэ Ісус услаўлены (Ін. 7, 37-39).

4. Таінства Пакаяння

Няма цэлага месца ў касцях маіх з-за грахоў маіх. Праступкі мае нагрувасціліся вышэй за галаву маю, як бярэмя цяжкое, прыгнятаюць яны мяне. Засмярдзелі і загнаіліся раны мае з-за дурасці маёй (Пс. 37, 4-6).

Бо віну маю вызнаць я мушу (Пс. 37, 19).

Бо той смутак, які па Богу, нерупліваае пакаянне ў збаўленне ператварае (2 Кар. 7, 10).

Аб Ім усе прарокі сведчаць: хто верыць у Яго, дастане адпушчэнне грахоў праз імя Ягонае (Дзеі 10, 43).

І калі грэшнік адвернецца ад беззаконнасці сваёй і ўчыніць суд і праўду, дык праз гэта і будзе жыць (Ез. 33, 19).

І дам табе ключы Царства Нябеснага, і калі што звяжаш на зямлі, тое будзе звязана і на

Небе; і калі што развяжаш на зямлі, тое будзе развязана на Небе (Мц. 16, 19).

Прыміце Духа Святога. Каму адпусціце грахі, таму будуць адпушчаныя; на кім пакінеце, на тым застануцца (Ін. 20, 22-23).

Багата ж з тых, што паверылі, прыходзілі, вызнаючы і апавядаючы ўчынкі свае (Дзеі 19, 18).

5. Святарства

Мір вам! Як паслаў Мяне Айцец, так і Я пасылаю вас. Сказаўшы гэтае, дыхнуў і кажа ім: прыміце Духа Святога. Каму адпусціце грахі, таму будуць адпушчаныя, на кім пакінеце, на тым застануцца (Ін. 20, 21-23).

Гора мне, калі я не абвяшчаю Евангелля (1 Кар. 9, 16).

Я пакінуў цябе на Крыце дзеля таго, каб ты давяршыў недаробленае і паставіў па ўсіх гарадах прэсвітэраў (Ціт 1, 5).

Рук паспешліва ні на каго не ўскладай і не рабіся супольнікам у чужых грахах (1 Цім. 5, 22).

Гэтак чалавек павінен разумець нас як служак Хрыстовых і аконамаў таямніц Божых (1 Кар. 4, 1).

Пільнуйце ж самі сябе і ўвесь статак, бо ў ім Дух Святы паставіў вас за епіскапаў, каб пасвіць Царкву Госпада і Бога, якую прыдбаў Ён Уласнаю крывёю (Дзеі 20, 28).

Шчаслівы ты, Сымоне, сын Іонаў, бо не цела і кроў адкрылі табе гэта, але Айцец Мой, што ў Нябёсах; і Я кажу табе: ты — скала, і на гэтай скале я збудую Царкву Маю, і брамы пякельныя не пераможуць яе; і дам табе ключы Царства Нябеснага; і калі што звяжаш на зямлі, тое будзе звязана на Небе; і калі што развяжаш на зямлі, тое будзе развязана на Небе (Мц. 16, 17-19).

І з кожнага, каму дадзена багата, багата і спаганяцца будзе, і каму больш даручана, з таго больш вымагаецца (Лк. 12, 48).

Бо яромо Маё добрае, і цяжар Мой лёгкі (Мц. 11, 30).

6. Шлюб

Вось, гэта косць ад касцей маіх і цела ад цела майго: яна будзе называцца жанчынаю, бо ўзятая ад мужа. Дзеля гэтага пакіне чалавек айца свайго і маці сваю і прылепіцца да жанчыны сваёй, і будуць двое адным целам (Быц. 2, 23-24).

Ці не чыталі вы, што Той, Хто стварыў ад пачатку мужчыну і жанчыну, стварыў іх такімі? І сказаў: дзеля гэтага пакіне чалавек бацьку свайго і маці, і прылепіцца да жонкі сваёй; і будуць двое адным целам (Мц. 19, 4-5).

Дзеля гэтага пакіне чалавек айца свайго і маці і прылепіцца да жонкі сваёй, і будуць двое ў адным целе. Таямніца гэта вялікая; я ж кажу аб Хрысце і Царкве (Эф. 5, 31-32).

Што Бог злучыў, таго чалавек няхай не разлучае (Мц. 19, 6).

Дзеля жорсткасці сэрца вашага напісаў вам гэтую запаведзь (Мк. 10, 5).

Таксама і вы, жонкі, пакарайцеся сваім мужам, каб тыя з іх, што не пакараюцца слову, жыццём жонак сваіх без слова былі здабываныя, бачучы вашае чыстае, багабойнае жыццё. (...) Але ўкрыты чалавек у нятленнасці лагоднага сэрца і маўклівага духу, што дужа цэнна перад Богам (1 Пят. 3, 1-4).

Хто аддае замуж дзяўчыну сваю, добра робіць, а хто не аддае, робіць лепей (1 Кар. 7, 38).

Не ўсе разумеюць словы гэтыя, але каму дадзена (...): хто можа зразумець, няхай зразумее (Мц. 19, 11-12).

Нежанатым і ўдовам кажу: добра ім, калі застануцца, як я (1 Кар. 7, 8).

Нежанаты клапоціцца аб Гасподнім, як дагадзіць Госпаду, а жанаты клапоціцца аб свецкім, як дагадзіць жонцы (1 Кар. 7, 32-33).

7. Алеeасвячэнне

Калі і Мне не верыце, дык верце ўчынкам (Маім) (Ін. 10, 38).

І, паклікаўшы дванаццаць вучняў Сваіх, даў ім уладу над нячыстымі духамі, каб выганяць іх і лячыць усякую немач і ўсякую хваробу (Мц. 10, 1).

Хворых аздараўляйце, пракажоных ачышчайце, мёртвых уваскрашайце, злых духаў выганяйце. Задарма атрымалі, задарма давайце (Мц. 10, 8).

І выйшлі яны і прапаведавалі, каб пакаяліся: і выганялі многіх дэманаў, і мазалі аліваю многіх хворых, і вылечвалі (Мк. 6, 12-13).

Занядужаў хто з вас? Паклічуць няхай прэсвітэраў царкоўных, і хай яны памоляцца над ім, памазаўшы яго алеем ў імя Гасподняе (Як. 5, 14).

11-ая частка Сімвалу веры. Пра будучае ўваскрасенне

Чакаю ўваскрасення мёртвых.

Дух адымаеш у іх — і знікаюць яны і ў пыл назад абяртаюцца. Пашлеш Духа Твайго — і паўстануць яны, і аблічча зямлі Ты абновіш (Пс. 103, 29-30).

Бо я ведаю, што Вечнаісны ёсць, і Ён ў апошні дзень адкупіць мяне (і) адновіць з зямлі скуру маю, якая церпіць гэта, бо ад Госпада здзейснілася гэта ўсё мне (Іоў, 19, 25-26).

І вывеў мяне ў Духу Гасподнім і паставіў мяне сярод поля, яно ж было поўнае касцей чалавечых (...) і вось, вельмі багата іх было на паверхні поля, і вось яны, вельмі сухія. І сказаў Мне: Сыне Чалавечы, ці ажывуць гэтыя косці? І я сказаў:

Госпадзе Божа, Ты ведаеш гэта. І сказаў мне: Сыне Чалавечы, дай прароцтва на гэтыя косці і скажы ім: косці сухія, пачуйце слова Гасподняе: (...) вось, Я ўвяду ў вас Дух жыццядайны і дам на вас жылы, і нарашчу на вас мяса, і нацягну на вас скуру, і дам вам Дух Мой у вас, і ажывеце і даведаецеся, што Я ёсць Госпад (...).

І прамовіў Госпад Мне, кажучы: Сыне Чалавечы, гэтыя косці ёсць увесь дом Ізраілеў, бо гэтыя кажуць: сухія былі косці нашыя, загінула надзея наша, былі мы забітыя (Ез. 37, 1-11).

Надыдзе час, калі ўсе, хто ў магілах, пачуюць (Ін. 5, 28).

Бо Сам Госпад з абвяшчэннем, з голасам Архангела і трубой Божай сыдзе з Неба, і мёртвыя ў Хрысце ўскрэснуць найперш (1 Сал. 4, 16).

Бо не ўсе памрэм, але ўсе пераменімся знячэўку, у імгненне вока, пры апошняй трубе; бо затрубіць яна, і мёртвыя ўскрэснуць нятленныя, і мы пераменімся (1 Кар. 15, 51-52).

Бо тленнаму трэба апрануцца ў нятленнасць, і смяротнаму гэтаму апрануцца ў несмяротнасць (1 Кар. 15, 53).

Сеецца цела душэўнае, паўстае цела духоўнае (1 Кар. 15, 44).

Што ты сееш, не ажыве, калі не памрэ (1 Кар. 15, 36).

Як агонь загарыцца ад ярасці Маёй, распаліцца да пекла апраметнай, зжарэ зямлю і плады яе, папаліць падножжа гор. Збяру на іх беды, і стрэлы Мае звяду на іх (Друг. 32, 22-23).

Бо вось, надыдзе дзень, распалены, як печ, і папаліць іх, і будуць усе іншапляменнікі і ўсе, хто чыніў беззаконнасці, як сцябло: і запаліць іх дзень Гасподні, які надыходзіць, кажа Госпад Усеўладны, і не пакіне па іх ані кораню, ані галін (Мал. 4, 1).

А сённяшнія нябёсы і зямля, тым жа словам згаданыя, захоўваюцца для агню на дзень Суда і загубы людзей бязбожных (2 Пят. 3, 7).

Подзвігам добрым я жыў, бег скончыў, веру захаваў. На астатак рыхтуецца мне вянок праўды, які дасць мне Госпад, праведны Суддзя, у гэты дзень, і не толькі мне, але і ўсім, хто з'яўленне Яго палюбіў (2 Цім. 4, 7-8).

Бо ўсім нам трэба з'явіцца перад судом Хрыстовым, каб кожны атрымаў за тое, што ён рабіў з целам, добрае ці благое (2 Кар. 5, 10).

І не бойцеся тых, што забіваюць цела, а душы забіць не могуць (Мц. 10, 28).

І вернецца прах ў зямлю, бо быў ёю, і дух вернецца да Бога, Які даў яго (Экл. 12, 7).

Што і само стварэнне вызвалена будзе з няволі тлення на волю славы дзяцей Божых (Рым. 8, 21).

12-ая частка Сімвалу веры. Пра жыццё вечнае

І жыцця будучага веку. Амін.

І пойдуць гэтыя на пакуту вечную, а праведнікі — у жыццё вечнае (Мц. 25, 46).

Мы ж паводле Яго абяцання чакаем новага неба і новае зямлі, на якіх праўда жыве (2 Пят. 3, 13).

І як мы насілі вобраз зямнога, будзем насіць і вобраз нябеснага (1 Кар. 15, 49).

Тады праведнікі заззяюць, як сонца, у Царстве Айца іх (Мц. 13, 43).

Сеецца ў прыніжэнні, паўстае ў славе (1 Кар. 15, 43).

І ведаю чалавека ў Хрысце (...), які быў узяты ў рай і чуў невымоўныя словы, якіх чалавеку нельга казаць (2 Кар. 12, 2-4).

Чаго вока не бачыць, і вуха не чуе, і што да сэрца чалавеку не ўзыходзіла, тое наканаваў Бог тым, хто любіць Яго (1 Кар. 2, 9).

Будзе Бог усё ва ўсім (1 Кар. 15, 28).

Маю жаданне развязацца і быць з Хрыстом (Флп. 1, 23).

Цяпер мы бачым, нібы ў люстры, цьмяна, тады ж тварам у Твар: цяпер разумею я часткова, тады ж спазнаю, гэтаксама, як і сам быў пазнаны (1 Кар. 13, 12).

За тое, што яны не прынялі любові праўды, каб выратавацца ім (2 Сал. 2, 10).

Ідзіце ад Мяне, праклятыя, у агонь вечны, прызначаны д'яблу і анёлам яго (Мф. 25, 41).

Лепей табе з адным вокам увайсці ў царства Божае, чымсьці, маючы двое вачэй, быць укінутым у геену вогненую, дзе чарвяк іх не памірае, ды агонь не згасае (Мк. 9, 47–48).

А гэта другая смерць. І каго не знойдуць сярод запісаных ў Кнізе жыцця, зрынуты будзе ў возера вогненае (Аб'яўл. 20, 14-15).

Іншая слава сонцу, іншая слава месяцу, іншая слава зорам: бо зорка ад зоркі розніцца ў славе. Гэтак і ўваскрасенне мёртвых (1 Кар. 15, 41-42).

Памятай пра канец свой, і павек не саграшыш (Сір. 7, 39).

Шырокія брамы і вольны шлях вядуць да згубы (Мц. 7, 13).

Ачысцім сябе ад усялякай брыдоты цела і духу (2 Кар. 7, 1).

IX. АБ НАДЗЕІ

Аб хрысціянскай надзеі

Госпада Ісуса Хрыста, надзеі нашае (1 Цім. 1, 1).

Да канца спадзявайцеся на ласку, што прыносіцца нам у аб'яўленні Ісуса Хрыста (1 Пят. 1, 13).

Пра малітву

І чаго папросіце (у Айца) ў імя Маё, тое зраблю, каб уславіўся Айцец у Сыне (Ін. 14, 13).

Людзі гэтыя набліжаюцца да Мяне вуснамі сваімі і шануюць Мяне сваім языком; сэрца ж іх далёкае ад Мяне; дык дарэмна яны пакланяюцца Мне (Мц. 15, 8-9).

Ад перапоўненасці сэрца гавораць вусны (Мц. 12, 34).

Чаго (ты) галосіш да Мяне (Вых. 14, 15)?

Малітва Гасподняя

Ойча наш, Які ёсць у Нябёсах! 1) Хай свяціцца імя Тваё, 2) Хай прыйдзе Царства Тваё, 3) Хай будзе воля Твая, як на Небе, так і на зямлі. 4) Хлеб наш надзённы дай нам сёння; 5) і даруй нам даўгі нашыя, як і мы даруем вінным перад намі; 6) і не дай нас у спакусу, 7) але збаў нас ад ліха. Бо Тваё ёсць Царства і сіла і слава навек. Амін (Мц. 6, 9-13).

Зварот: *Ойча наш, Які ёсць у Нябёсах!*

Жыццё і міласць паклаў мне, і прысутнасць Твая жывіла мой дух (Іоў. 10, 12).

Усе яны на Цябе чакаюць, каб Ты даў есці ім у належны час (Пс. 103, 27).

А тым, што прынялі Яго, (...) дадзена ім сіла дзецьмі Божымі стацца, тым, якія вераць у імя Яго, тым, што не ад крыві, не ад жадання цела, не ад жадання мужа, але ад Бога нарадзіліся (Ін. 1, 12-13).

Іншага Суцяшыцеля дасць вам (Ін. 14, 16).

Вось, стаю пад дзвярыма і грукаю: калі хто пачуе мой голас і адчыніць дзверы, увайду да яго і павячэраю з ім, дый ён са Мною (Аб'яўл. 3, 20).

1-ае прашэнне: *Хай свяціцца імя Тваё*

Імем Маім дэманаў выганяць будуць (Мк. 16, 17).

Святое імя Яго (Лк. 1, 49).

Слава чалавека з гонару айца яго, і ганьба дзецям маці ў бясслаўі (Сір. 3, 11).

Імя Божае ганьбуецца між людзей (Іс. 52, 5).

Дык няхай святло вашае свеціць перад людзьмі, каб яны бачылі вашыя добрыя справы, і ўслаўляе Айца вашага, што ў Нябёсах (Мц. 5, 16).

2-ое прашэнне: *Хай прыйдзе Царства Тваё*

Пануе (...) грэх у смяротным (...) целе, каб скарыцца перад ім у пажадлівасці яго (Рым. 6, 12).

Пакайцеся, бо наблізілася Царства Нябеснае (Мц. 4, 17).

Не прыйдзе Царства Божае заўважна.(...) Бо вось, Царства Божае ўнутры вас ёсць (Лк.17,20-21).

Праўда, і мір, і радасць ў Духу Святым (Рым. 14, 17).

Шмат пакут трэба нам, каб увайсці ў Царства Нябеснае (Дзеі 14, 22).

Царства маё не з гэтага свету (Ін. 18, 36).

Не праміне род гэты (Лк. 21, 32).

Маю жаданне развязацца і быць з Хрыстом (Флп. 1, 23).

3-яе прашэнне: *Хай будзе воля Твая, як на Небе, так і на зямлі*

Бо Бог адзін, і адзін пасярэднік між Богам і людзьмі — чалавек Ісус Хрыстос, што аддаў сябе дзеля адкуплення ўсіх (1 Цім. 2, 5-6).

Госпад даў, Госпад узяў; як Госпаду заўгодна, так і будзе (Іоў, 1, 21).

Ойча! калі будзе Твая воля, пранясі гэтую чару міма Мяне, але не Мая воля, а Твая няхай станецца (Лк., 22, 42).

Адыдзі ад мяне, шатан, бо думаеш не аб Божым, але аб чалавечым (Мк. 8, 33).

Пажадлівасць цела, пажадлівасць вачэй і пыха жыццёвая (1 Ін. 2, 16).

Д'ябал, як леў рыкаючы ходзіць, шукаючы, каго праглынуць (1 Пят. 5, 8).

Сымон, Сымон! Гэта шатан прасіў, каб прасеяць вас, як пшаніцу, але Я маліўся за цябе, каб не паменшала вера твая (Лк. 22, 31-32).

Усё мне можна, але не ўсё карысна: усё мне можна, але апанаваць мяне не дам нічому (1 Кар. 6, 12).

Ойча Справядлівы, і свет Цябе не пазнаў (Ін. 17, 25).

Але бачу іншы закон у членах маіх, які ваюе супраць закону розуму майго і бярэ мяне ў палон законам грэшным, што існуе ў членах маіх (Рым. 7, 23).

4-ае прашэнне: *Хлеб наш надзённы дай нам сёння*

І ўзяў Госпад Бог чалавека, якога стварыў, і ўвёў яго ў сад Эдэнскі, даглядаць яго і ахоўваць (Быц. 2, 15).

У поце твару твайго будзеш здабываць хлеб твой (Быц. 3, 19).

Дый ні ў кога не елі хлеба задарма, але цяжка і рупліва працавалі ноч і дзень, каб не абцяжарыць каго з вас — не таму, што мы не мелі ўлады, але каб сябе саміх даць вам за прыклад дзеля наследавання нам. Бо, калі мы былі ў вас, дык далі вам такі наказ: калі хто не хоча працаваць, той няхай і не есць (2 Фес. 3, 8-10).

Дык не турбуйцеся пра заўтрашні дзень, бо заўтрашні дзень сам будзе турбавацца аб сабе. Годзе кожнаму дню свайго ліха (Мц. 6, 34).

Паглядзіце на птушак нябесных, што не сеюць, не жнуць і не збіраюць у свірны, і Айцец наш нябесны корміць іх (Мц. 6, 26).

Паглядзіце на палявыя лілеі, як яны растуць: не працуюць, не прадуць; а я кажу вам, што і Саламон ва ўсёй славе сваёй не апранаўся так, як кожная з іх (Мц. 6, 28-29).

Дый Айцец ваш нябесны ведае, што ўсё гэта вам патрэбна (Мц. 6, 32).

Не хлебам адным будзе жыць чалавек, але ўсялякім словам, якое зыходзіць з вуснаў Божых (Мц. 4, 4).

Я — хлеб жывы, што сышоў з Неба, хто есць хлеб гэты, жыць будзе вечна (Ін. 6, 51).

Бо Цела Маё сапраўды ёсць ежа, і Кроў Мая сапраўды ёсць пітво (Ін. 6, 55).

5-ае пытанне:

І даруй нам даўгі нашыя, як і мы даруем вінным перад намі

Вось жа, у беззаконні я быў зачаты, і ў грахах нарадзіла мяне маці мая (Пс. 50, 7).

Няма ж нікога (...) чыстага (...) ад бруду, (...) Нават калі адзін дзень (доўжылася) жыццё яго на зямлі (Іоў. 14, 4).

Праз аднаго чалавека ўвайшоў у свет грэх і праз грэх — смерць, гэтак і смерць перайшла праз усіх людзей, бо ўсе мы зграшылі (Рым. 5, 12).

Бо Бог адзін, і адзін пасярэднік між Богам і людзьмі — чалавек Ісус Хрыстос (1 Цім. 2, 5).

Бо, калі вы даруеце людзям правіны іх, дык і вам даруе Айцец Ваш Нябесны, а калі не даруеце людзям правіны іх, дык і вам не даруе Айцец ваш правінаў вашых (Мц. 6, 14-15).

І калі ты прынясеш ахвяру тваю да алтара і там прыпомніш, што брат твой мае штосьці супраць цябе, пакінь там ахвяру перад алтаром і пайдзі перш пагадзіся з братам тваім, а тады ўжо прыйдзі і прынясі ахвяру тваю (Мц. 5, 23-24).

Калі магчыма, з вашага боку, з усімі людзьмі будзьце ў згодзе (Рым. 12, 18).

6-ае прашэнне: *І не дай нас у спакусу*

Госпадзе, выпрабаваў Ты мяне і спазнаў мяне Ты. Ведаеш Ты, калі я сядаю і калі я ўстаю (Пс. 138, 1-2).

Выпрабуй мяне, Божа, і сэрца маё спазнай! Пашлі мне цяжар і зразумей шляхі мае: і зірні, ці не збочыў я на шлях беззаконнасці, і скіруй мяне на шлях вечнасці (Пс. 138, 23-24).

Добра мне, (Госпадзе), што ўпакорыў Ты мяне (Пс. 118, 71).

Досыць табе ласкі Маёй, бо сіла Мая выяўляецца ў немачы (2 Кар. 12, 9).

Выпрабуй мяне, Госпадзе, і паспытай мяне, растапі нутро маё і сэрца маё (Пс. 25, 2).

7-ае прашэнне: *Але збаў нас ад ліха*

... Увесь свет ляжыць у зле (1 Ін. 5, 19).

Багата журбот у праведных, і з усіх выбавіць іх Госпад (Пс. 33, 20).

Услаўленне

І чаго папросіце (у Айца) ў імя Маё, тое зраблю, каб уславіўся Айцец у Сыне (Ін. 14, 13).

Пра Навуку найвышэйшага шчасця

Многія скажуць мне ў той дзень: Госпадзе, Госпадзе, Ці не Тваім іменем мы прарочылі? І ці не Тваім іменем выганялі дэманаў, і ці не Тваім іменем многія цуды чынілі? (Мц. 7, 22). — Не ведаю вас (Мц. 25, 12).

Гора вам, кніжнікі і фарысеі крывадушныя, бо прыпадабняецеся да трунаў павапленых, якія звонку выглядаюць прыгожа, а ў сярэдзіне поўныя касцей трупных і ўсялякае нечысці (Мц. 23, 27).

І вам, законнікам, гора, бо ўзвальваеце на чалавека бярэмя не па сілах, а самі адным пальцам вашым не кранеце цяжару (Лк. 11, 46).

Што ж клічаце Мяне: Госпадзе, Госпадзе, а не робіце таго, што кажу (Лк. 6, 46)?

Вось запаведзь Мая: любіце адзін аднаго, як Я палюбіў вас: няма большае любові за тую, калі хто душу сваю пакладзе за сяброў сваіх. Вы —

сябры Мае, калі выконваеце тое, што Я загадваю вам (Ін. 15, 12-14).

Вы — соль зямлі: калі ж соль страціць сілу, дык чым асоліцца? Яна ўжо нікуды не вартая, толькі высыпаць яе вон на патаптанне людзям. Вы — святло свету: не можа горад схавацца, стоячы на версе гары. І, запаліўшы свечку, не ставяць яе пад спудам, але на падсвечнік, і свеціць усім, хто ёсць у доме. Гэтак няхай святло вашае свеціць перад людзьмі, каб яны бачылі вашыя добрыя справы і ўславілі Айца вашага, што ў Нябёсах (Мц. 5, 13-16).

Запаведзі найвышэйшага шчасця

1. Шчаслівыя ўбогія духам: бо іх ёсць Царства Нябеснае.

2. Шчаслівыя тыя, хто плача: бо яны суцешацца.

3. Шчаслівыя рахманыя: бо яны атрымаюць у спадчыну зямлю.

4. Шчаслівыя тыя, хто прагне праўды і смягне па ёй: бо яны спатоляцца.

5. Шчаслівыя літасцівыя: бо яны памілаваныя будуць.

6. Шчаслівыя чыстыя сэрцам: бо яны пабачаць Бога.

7. Шчаслівыя міратворцы: бо яны будуць звацца сынамі Божымі.

8. Шчаслівыя выгнаныя за праўду: бо іх ёсць Царства Нябеснае.

9. Шчаслівыя вы, калі абняславяць вас і будуць гнаць, і нагавораць пра вас усялякага благоцця праз Мяне: Радуйцеся і весяліцеся, бо вялікая ўзнагарода ваша на Небе.

1-ая запаведзь найвышэйшага шчасця: *Шчаслівыя ўбогія духам: бо іх ёсць Царства Нябеснае.*

Сябе спустошыў, вобраз раба прыняў (Флп. 2, 7).

І лёну, што заняўся тлець, не загасіць (Мц. 12, 20).

Усё мне можна, але не ўсё карысна: усё мне можна, але авалодаць мною не дам нічому (1Кар.6,12).

Бо якая ж карысць чалавеку, калі ён здабудзе ўвесь свет, але змарнуе сваю душу (Мц. 16, 26)?

Калі хочаш быць беззаганны, пайдзі, прадай маёмасць тваю і раздай бедным; і будзеш мець скарб на Небе; і ідзі ўслед за Мною (Мц. 19, 21).

2-ая запаведзь: *Шчаслівыя тыя, хто плача: бо яны суцешацца.*

Бо той смутак, які па Богу, неруплівае пакаянне ў збаўленне ператварае, а смутак свецкі смерць робіць (2 Кар. 7, 10).

3-ая запаведзь: *Шчаслівыя рахманыя: бо яны атрымаюць у спадчыну зямлю*

Навучыцеся ад мяне, бо я ціхі і лагоднага сэрца (Мц. 11, 29).

Калі блага Я сказаў, дакажы, што блага, а калі добра, за што б'еш Мяне (Ін. 18, 23)?

Не помсціце за сябе, любыя, але дайце месца гневу. Бо напісана: Мне помста, Я аддам, кажа Госпад (Рым. 12, 19).

4-ая запаведзь: ***Шчаслівыя тыя, хто прагне праўды і смягне па ёй: бо яны спатоляцца***

Насычуся, калі стану ў абліччы славы Тваёй (Пс. 15, 16).

І каб прыведзеная была праўда вечная (Дан. 9, 24).

Праўда ж Божая праз веру ў Ісуса Хрыста ва ўсіх і для ўсіх вернікаў; бо няма розніцы, бо ўсе зграшылі і пазбаўленыя славы Божае, апраўданыя задарма ласкаю Ягонай, адкупленнем, што ў Хрысце Ісусе, Якога аддаў Бог на ахвяру ачышчэння праз веру, у Крыві Ягонай, дзеля выяўлення праўды Сваёй, для даравання грахоў, учыненых раней (Рым. 3, 22-25).

5-ая запаведзь: ***Шчаслівыя літасцівыя: бо яны памілаваныя будуць***

Тады скажа Цар тым, хто праваруч Яго: прыйдзіце, благаславёныя Айца Майго, наследуйце Царства, прызначанае вам ад стварэння свету. Бо хацеў Я есці, і вы накармілі Мяне, смяг, і вы напаілі Мяне, быў здарожаны, і вы прынялі Мяне.

Быў голы, і вы апранулі Мяне, быў хворы, і вы наведалі Мяне, быў у вязніцы, і вы прыйшлі да Мяне (Мф. 25, 34-36).

Бо Я быў галодны, і вы не далі Мне есці, смяг, і вы не напаілі Мяне, быў здарожаны, і не прынялі Мяне, голы, і не апранулі Мяне, быў хворы і ў вязніцы, і не наведалі Мяне. Тады і яны скажуць Яму ў адказ: Госпадзе! Калі мы бачылі Цябе галоднага, ці засмяглага, ці здарожанага, ці голага, ці хворага, ці ў вязніцы — і не паслужылі Табе? Тады скажа ім у адказ: сапраўды кажу вам, як не зрабілі гэтага аднаму з гэтых меншых — не зрабілі і Мне. І пойдуць тыя на вечную пакуту, а праведнікі ў жыццё вечнае (Мц. 25, 31-46).

І хто напоіць вас чашаю вады дзеля Мяне, за тое, што вы Хрыстовыя, сапраўды кажу вам, не страціць узнагароды сваёй (Мк. 9, 41).

6-ая запаведзь: *Шчаслівыя чыстыя сэрцам: бо яны пабачаць Бога*

Добры чалавек з добрага скарбу сэрца свайго выносіць добрае, а благі чалавек з благога скарбу сэрца свайго выносіць благое; бо ад перапоўненага сэрца гавораць вусны яго (Лк. 6, 45).

Тады праведнікі заззяюць, як сонца, у Царстве Айца іх (Мц. 13, 43).

Заўсёды любіце адзін аднаго ад чыстага сэрца (1 Пят. 1, 22).

7-ая запаведзь: ***Шчаслівыя міратворцы: бо яны будуць звацца сынамі Божымі***

Слава ў вышынях Богу, і на зямлі мір, сярод людзей добрае волі (Лк. 2, 14).

8-ая запаведзь: ***Шчаслівыя выгнаныя за праўду: бо іх ёсць Царства Нябеснае***

Калі б вы былі ад свету, дык свет любіў бы сваё, але, калі вы не ад свету, але Я абраў вас ад свету, за гэта і ненавідзіць вас свет (Ін. 15, 19).

Не адказвай дурню паводле дурацi яго, каб самому не прыпадабніцца да яго, але адказвай дурню паводле дурасці яго, каб не стаў ён разумнікам у вачах тваіх (Прып. 26, 4-5).

Гора жыхарам зямлі і мора, бо зышоў да вас д'ябал у гневе вялікім, ведаючы, што часу мае няшмат (Аб'яўл. 12, 12).

9-ая запаведзь: ***Шчаслівыя вы, калі абняславяць вас і будуць гнаць, і нагавораць пра вас усялякага благоцця праз Мяне: Радуйцеся і весяліцеся, бо вялікая ўзнагарода ваша на Небе***

Зірнушы на Неба, пабачыў славу Божую і Ісуса, што стаяў праваруч Бога, і сказаў: вось, бачу Нябёсы расчыненыя і Сына Чалавечага, што стаіць праваруч Бога (Дзеі 7, 55–56).

Хіба яны Служыцелі Хрыстовыя? Не ад вялікага розуму кажу, я — больш. У працы — больш, у ранах — нашмат больш, у астрогах — з ліхвою, і шмат разоў пры смерці. Ад Іудзеяў пяць разоў дастаў па сорак [удараў] без аднаго, тройчы білі мяне кіямі, аднойчы каменнем закідалі, тройчы карабель перакуліўся са мною, ноч і дзень прабыў у глыбіні; шмат пешых падарожжаў: беды ад разбойнікаў, беды ад землякоў, беды ад паганцаў, беды ў гарадах, беды ў пустынях, беды на моры, беды ад фальшывых братоў, у працы і знямозе, часта без сну, у голадзе і смазе, часта ў пастах, у холадзе і галечы. Апрача знешніх паўсядзённых напасцяў, на мне клопат пра ўсе Цэрквы. Хто знемагаецца, каб і я не знямогся? Хто спакушаецца, каб і я не распаліўся? Калі маю хваліцца, дык буду хваліцца маёй немаччу. Бог і Айцец Госпада нашага Ісуса Хрыста, благаславёны навек, ведае, што я не лгу. У Дамаску язычніцкі намеснік Арэфы цара пільнаваў горад Дамаск, жадаючы схапіць мяне: і я праз акно ў кашы спушчаны быў па сцяне і выслізнуў з рук ягоных (2 Кар. 11, 23-32).

Ведаю чалавека ў Хрысце, які чатырнаццаць гадоў таму (ці ў целе, ці па-за целам — не ведаю: Бог ведае) падхоплены быў да трэцяга неба. І ведаю гэткага чалавека, (ці ў целе, ці па-за целам — не ведаю: Бог ведае), які быў узяты ў рай і чуў невымоўныя словы, якіх чалавеку нельга казаць (2 Кар. 12, 2-4).

X. ПРА ЛЮБОЎ

Повязь веры і любові

Цяпер мы бачым, нібы ў люстры, цьмяна, тады ж тварам у Твар: цяпер разумею я часткова, тады ж спазнаю, гэтаксама, як і сам быў пазнаны. Бо сёння трываюць вера, надзея, любоў — гэтыя тры, але большая з іх — любоў (1 Кар. 13, 12-13).

Калі я гавару мовамі чалавечымі і анёльскімі, а любові не маю, дык я медзь звінячая і кімвал брынклівы. І калі я маю прароцтва, і мне адкрытыя ўсе таямніцы і ўсе думкі, і калі маю ўсю веру, каб і горы перастаўляць, а не маю любові, дык я нішто. І калі я раздам усю маёмасць маю, і аддам цела маё на спаленне, а любові не маю, дык няма мне ніякае карысці (1 Кар. 13, 1-3).

Любоў церпіць доўга, міласэрная, любоў не зайздросціць, любоў не заносіцца, не ганарыцца, не вывышаецца, не шукае свайго, не раздражняецца, не замышляе благога, не радуецца з крыўды, але цешыцца з праўды: усё пакрывае, усяму дае веры, усяго спадзяецца, усё трывае. Любоў ніколі не чэзне, нават калі прароцтвы перастануць збывацца, нават калі мовы змоўкнуць, нават калі розум спустошыцца (1 Кар. 13, 4-8).

Што карысці, браты мае, калі хто кажа, што ён мае веру, а ўчынкаў не мае; хіба можа

вера збавіць яго? Калі брат або сястра будуць голыя і пазбаўленыя будуць штодзённай ежы, а нехта з вас скажа ім: ідзіце ў спакоі, грэйцеся і насычайцеся, але не дасць ім патрэбнага для цела: што за карысць? Гэтак і вера, калі не мае ўчынкаў, сама па сабе мёртвая (Як. 2, 14-17).

Хто не любіць брата, трывае ў смерці (1 Ін. 3, 14).

Калі хто любіць Мяне, слова Маё выконвае: і Айцец Мой палюбіць яго, і Мы да яго прыйдзем і створым у Ім жытло (Ін. 14, 23).

Хто мае Запаведзі Мае і выконвае іх, той любіць Мяне, а хто Мяне любіць, таго і Айцец Мой любіць будзе, і Я палюблю яго і з'яўлюся яму Сам (Ін. 14, 21).

Бо калі народы, што не маюць закону, па прыродзе законнае робяць, яны, законаў не маючы, самі сабе закон: бо выяўляюць рэчы законныя, напісаныя ў сэрцах сваіх, у суладным з імі сумленні, і між сабою думкамі абвінаваўчымі або апраўдальнымі (Рым. 2, 14-15).

Запаведзі Закону Божага

Палюбі Госпада Бога твайго ўсім сэрцам тваім, і ўсёю душою тваёю, і ўсім разуменнем тваім: гэта ёсць першая і найвялікшая запаведзь: другая ж падобная да яе: палюбі бліжняга твайго як са-

мога сябе: на гэтых дзвюх Запаведзях грунтуецца ўвесь закон і прарокі (Мц. 22, 37-40).

Бо ніхто ніколі не меў нянавісці да свайго цела, але жывіць і грэе яго, як і Госпад Царкву (Эф. 5, 29).

Хто хоча ісці за Мною, няхай зрачэцца сябе, і возьме крыж свой, і ідзе следам за Мною (Мк. 8, 34).

Няма любові большае за тую, калі хто душу сваю пакладзе за сяброў сваіх (Ін. 15, 13).

Хто любіць бацьку або маці больш за Мяне, не варты Мяне; і хто любіць сына ці дачку больш за Мяне, не варты Мяне (Мц. 10, 37).

Запаведзі Закону Божага

(1) Я — Госпад Бог твой: няхай не будзе ў цябе іншых багоў, апрача Мяне.

(2) Не рабі сабе куміра, ані чагось падобнага да таго, што на небе ўгары, што на зямлі ўнізе, і што ў вадзе ніжэй за зямлю: не пакланяйся ім і не служы ім.

(3) Не кажы імені Госпада Бога твайго марна.

(4) Шануй дзень суботні, яго святкуй: шэсць дзён працуй і парабі ўсе справы свае: а сёмы дзень — субота [належыцца] Госпаду Богу Твайму.

(5) Шануй бацьку свайго і маці сваю, каб добра табе было і каб доўга жыў на зямлі.

*(6) **Н**е забівай.*

*(7) **Н**е пралюбадзейнічай.*

*(8) **Н**е крадзі.*

*(9) **Н**е сведчы ілжыва супраць бліжняга свайго.*

*(10) **Н**е пажадай сабе жонкі бліжняга свайго, не пажадай дому бліжняга свайго, ані поля яго, ані нявольніка яго, ані нявольніцы, ані вала яго, ані асла, аніякае жывёлы яго, анічога, што належыць бліжняму твайму.*

1-ая запаведзь Закону Божага:

Я — Госпад Бог твой: няхай не будзе ў цябе іншых багоў, апрача Мяне.

__П__азнае вол таго, хто яго набыў, і асёл яслі Гаспадара свайго; Ізраіль жа не ведае [Мяне] (Іс. 1, 3).

__Б__о нябачнае Яго, ад стварэння свету праз разважанне аб творах бачнымі робіцца, і вечная сіла Яго і Боства (Рым. 1, 20).

__К__азаў дурны ў сэрцы сваім: Няма Бога (Пс. 13, 1).

__У__ благую душу не ўвойдзе прамудрасць (Мудр. 1, 4).

__Б__о сэрцам верыцца дзеля праведнасці, а вуснамі вызнаецца дзеля збаўлення (Рым. 10, 10).

Усё мне можна, але не ўсё карысна: усё мне можна, але авалодаць мною не дам нічому (1 Кар. 6, 12).

Крываажэрнымі і ліслівымі гідзіцца Госпад (Пс. 5, 7).

Бо калі б я яшчэ людзям дагаджаў, дык не быў бы слугою Хрыстовым (Гал. 1, 10).

Пракляты чалавек, які спадзяецца на чалавека і ўзвядзе апірышча сваё на ім, і ад Госпада адступіць сэрца яго (Ер. 17, 5).

Хто хоча ісці за Мною, няхай зрачэцца сябе, і возьме крыж свой, і ідзе следам за Мною (Мк. 8, 34).

Бо, паводле таго, як памнажаюцца ў нас пакуты Хрыстовыя, гэтак памнажаецца Хрыстом і пацеха нашая (2 Кар. 1, 5).

2-ая запаведзь Закону Божага:

Не рабі сабе куміра, ані чагосьпадобнага да таго, што на небе ўгары, што на зямлі ўнізе, і што ў вадзе ніжэй за зямлю: не пакланяйся ім і не служы ім.

Бо калі народы, што не маюць закону, па прыродзе законнае робяць, яны, законаў не маючы, самі сабе закон: бо выяўляюць рэчы законныя, напісаныя ў сэрцах сваіх, у суладным з імі сумленні, і між сабою думкамі абвінаваўчымі або апраўдальнымі (Рым. 2, 14-15).

Ахвяру заўсёдную, з пакалення ў пакаленне, з роду ў род, перад дзвярыма намёта сходу перад Госпадам, у іх буду адкрывацца табе там і прамаўляць да цябе (Вых. 29, 42).

І асвячу намёт сходу і алтар, і Аарона, і сыноў яго асвячу, каб сьвяшчэннадзейнічалі Мне (Вых. 29, 44).

Ідал на свеце нішто, і што няма іншага Бога, апрача Адзінага (1 Кар. 8, 4).

Кажа Яму Піліп: Госпадзе, пакажы нам Айца, і годзе з нас. Кажа яму Ісус: гэтулькі часу Я з вамі, і ты не пазнаў Мяне, Піліп? Хто бачыў Мяне, бачыў і Айца; як жа ты кажаш: пакажы нам Айца (Ін. 14, 8-9)?

Сябе спустошыў, вобраз раба прыняў (Флп. 2, 7).

Хцівасць, якая ёсць ідаласлужэнне (Кал. 3, 5).

Ім жа скон — загуба, ім жа бог — чэрава, і слава ў сораме іх, тых, што думаюць аб зямным (Флп. 3, 19).

3-ая запаведзь Закону Божага:

Не кажы імені Госпада Бога твайго марна.

Жыву Я! Клятву Маю, якую ён зняважыў, і запавет Мой, які ён зламаў, абрыну на галаву яму: і закіну на яго мярэжу Маю, і заблытаецца ён ў ёй, і прывяду яго ў Вавілон, і там буду судзіцца

з ім за крывадушша яго, якім ён падмануў Мяне (Ез. 17, 19-20).

А Я кажу вам: не прысягай зусім: ні небам, бо яно — пасад Божы; ані зямлёю, бо яна — падножжа нагам Яго; ані Іерусалімам, бо ён — горад вялікага Цара; ані галавою сваёй не прысягай, бо не можаш ніводнага воласа зрабіць белым ці чорным. Але няхай будзе слова вашае: але, але, ні, ні, а што больш за гэта, тое ад няпрыязі (Мц. 5, 34-37).

Бо людзі клянуцца вышэйшым, і кожнае спрэчкі між імі канец — на сцвярджэнне прысяга. Дзеля гэтага і Бог, хочучы далей паказаць наследнікам абяцання нязменнасць волі Сваёй, ужыў прысягу (Яўр. 6, 16-17).

4-ая запаведзь Закону Божага:

Шануй дзень суботні, яго святкуй: шэсць дзён працуй і парабі ўсе справы свае: а сёмы дзень — субота [належыцца] Госпаду Богу Твайму.

У поце аблічча свайго будзеш есці свой хлеб, пакуль не вернешся ў зямлю, з якой ты быў узяты: бо ты ёсць зямля, і вернешся ў зямлю (Быц. 3, 17-19).

І суботы Мае святкуйце: каб быў знак паміж Мною і паміж вамі, каб ведалі вы, што Я Госпад Бог ваш (Ез. 20, 20).

Шануй дзень суботні (Друг. 5, 15).

Дык няхай ніхто не асудзіць вас за ежу, або за пітво, або за ўдзел у свяце, або за маладзікі, або за суботы: гэта цень таго, што мае быць, цела ж Хрыстовае (Кал. 2, 16-17).

У першы ж дзень тыдня, калі вучні сабраліся, каб пераламіць хлеб, Павел гутарыў з імі, хочучы выйсці назаўтра, і зацягнуў сваё слова да паўночы (Дзеі 20, 7).

Я быў у духу ў дзень нядзельны, і чуў за сабою голас вялікі, нібы трубы, які казаў: Я ёсць Альфа і Амега, Першы і Апошні (Аб'яўл. 1, 10).

У першы ж дзень пасля суботы Марыя Магдаліна прыйшла на досвітку, яшчэ ўпоцемках, на магілу, і бачыць — камень адвалены ад магілы (Ін. 20, 1).

У першы ж дзень пасля суботы вельмі рана прыйшлі яны на магілу, несучы прыгатаваныя пахі, дый іншыя з імі (Лк. 24, 1).

І вось, двое з іх пайшлі таго ж дня ў вёску, што за шэсцьдзесят стадый ад Іерусаліма, званую Эмаўс (Лк. 24, 13).

І ўвечары таго ж дня, першага пасля суботы, калі дзверы, дзе былі сабраныя вучні (Яго), былі замкнёныя са страху перад Іудзеямі, прыйшоў Ісус і стаў пасярэдзіне і сказаў ім: мір вам (Ін. 20, 19).

І праз восем дзён ізноў былі ў доме вучні Яго, і Фама з імі. Прыйшоў Ісус пры зачыненых дзвярах, і стаў пасярод (іх) і сказаў: мір вам (Ін. 20, 26).

5-ая запаведзь Закону Божага:

Шануй бацьку свайго і маці сваю, каб добра табе было і каб доўга жыў на зямлі.

Усім сэрцам тваім ўслаўляй бацьку твайго і матчыных радзільных пакут не забывай (Сір. 7, 29).

Учынкамі і словам шануй бацьку твайго і маці (Сір. 3, 8).

Бо слава чалавеку з гонару айца яго, і ганьба дзецям маці ў бясслаўі (Сір. 3, 11).

Жанчына, гэта сын Твой, (...) вось, Маці твая (Ін. 19, 26-27).

Бо калі даруеш ім грахі іх, даруй: калі ж не, дык выкрэслі мяне з кнігі Тваёй, у якую ўпісаў (Вых. 32, 32).

На шлях язычнікаў не ідзіце (...), ідзіце ж найперш да авец дому Ізраілева, што загінулі (Мц. 10, 5-6).

Бо я хацеў бы сам быць адлучаны ад Хрыста за братоў маіх (Рым. 9, 3).

Бойся Бога, сыне, і цара, і ніводнаму з іх не праціўся (Прып. 24, 21).

Усякая душа няхай падпарадкоўваецца вышэйшым уладам, бо няма ўлады, каб не ад Бога, існуючыя ж улады ад Бога пастаўленыя. Тым жа, хто праціўіцца ўладзе, праціўіцца Божаму загаду

(...). Дзеля гэтага трэба слухацца не толькі з боязі, але і добрасумленна (Рым. 13, 1-2, 5).

Тады аддайце кесару кесарава, а Богава Богу (Мц. 22, 21).

Бога бойцеся, цара шануйце (1 Пят. 2, 17).

Слухайцеся ўсіх настаўнікаў вашых і выяўляйце пакору: бо яны над душамі вашымі чуваюць, як абавязаныя здаць справу аб іх (Яўр. 13, 17).

Перад сівым ўстань і ўшануй старога чалавека, і пабойся Госпада Бога твайго (Ляв. 19, 32).

Старому не рабі паскудства, але суцяшай, як бацьку; малодшых, як братоў; старых жанчын, як матак (1 Цім. 5, 1-2).

Мяркуйце, ці справядліва перад Богам слухацца вас болей, чым Бога (Дзеі 4, 19)?

... І вы, айцы, не раздражняйце дзяцей вашых, але выхоўвайце іх у напамінанні і навуцы Гасподняй (Эф. 6, 4).

Бо бацькоўскае благаслаўленне ўмацоўвае дамы дзяцей, кляцьба ж матчына разбурае дашчэнту (Сір. 3, 9).

Пасвіце Божы статак, які ў вас, наглядаючы за ім не пад прынукаю, але з добрае волі і па-Божы, ды не дзеля несправядлівае карысці, але стаўранна, і не пануючы над спачынай, але даючы прыклад статку (1 Пят. 5, 2-3).

Дык аддавайце кожнаму належнае: каму падатак — падатак, а каму мыта — мыта, каму страх — страх, а каму гонар — гонар (Рым. 13, 7).

6-ая запаведзь Закону Божага: *Не забівай*

Хто пральe кроў чалавечую, таго кроў пральецца рукою чалавека: бо чалавек створаны паводле вобразу Божага (Быц. 9, 6-7).

А калі хто спакусіць аднаго з гэтых малых, што вераць у Мяне, лепш бы яму было, каб павесілі жоран млынарскі на шыю яму і ўтапілі ў бездані марской (Мц. 18, 6).

Дык аддайце кесару кесарава, а Божае Богу (Лк. 20, 25).

Усякі, хто ненавідзіць брата свайго, ёсць душагуб (1 Ін. 3, 15).

А Я кажу вам, што ўсякі, хто гневаецца на брата свайго дарэмна, падлягае суду; а хто скажа брату свайму: «раќа» [пусты чалавек], падлягае сінедрыёну; а хто скажа: «вырадак», падлягае геене вогненнай (Мц. 5, 22).

Гневайцеся, ды не грашыце (Эф. 4, 26).

Няма любові большае за тую, калі хто душу сваю пакладзе за сяброў сваіх (Ін. 15, 13).

Гневайцеся, ды не грашыце: няхай сонца не зайдзе ў гневе вашым (Эф. 4, 26).

Не помсціце за сябе, любыя, але дайце месца гневу. Бо напісана: Мне помста, Я аддам, кажа Госпад (Рым. 12, 19).

Мяркуйце, ці справядліва перад Богам слухацца вас болей, чым Бога (Дзеі 4, 19)?

7-ая запаведзь Закону Божага: *Не пралюбадзейнічай*

А блуд і ўсялякая нячыстасць і прагавітасць няхай і не згадваецца ў вас, як і належыць святым. І лаянка, і благія жарты або блюзнерствы непатрэбныя, а лепш падзяка: бо, каб вы ведалі, што ніякі распуснік, ці нячысты, ці хцівец, які ёсць ідалапаклоннік, не мае спадчыны ў Царстве Хрыста і Бога (Эф. 5, 3-5).

А я кажу вам, што кожны, хто глядзіць на жанчыну з распуснымі думкамі, ужо блудзіць з ёй у сэрцы сваім. Калі ж правае вока тваё спакушае цябе, вырві яго і кінь ад сябе, бо лепей табе, каб загінуў адзін член цела твайго, чымсьці ўсё цела тваё будзе ўкінутае ў геену (вогненную) (Мц. 5, 28-29).

Мужы, любіце сваіх жонак, як Хрыстос палюбіў Царкву і выдаў Сябе за яе, каб асвяціць яе (Эф. 5, 25).

Жонкі, пакарайцеся сваім мужам, як Госпаду, бо муж ёсць галава жонкі, як і Хрыстос галава Царквы, і Ён жа збавіцель цела (Эф. 5, 22-23).

Уцякайце ад распусты: усякі грэх, які робіць чалавек, не закранае цела, а распуснік грашыць супраць уласнага цела. Ці ж не ведаеце, што целы вашыя ёсць храм Духа Святога, што жыве ў вас, Якога вы маеце ад Бога (1 Кар. 6, 18-19)?

8-ая запаведзь Закону Божага: *Не крадзі.*

І сказаў ён мне: што ты бачыш? І я адказаў: я бачу — ляціць світак, у даўжыню дваццаць лакцей, і ў шырыню дзесяць лакцей. І сказаў ён мне: гэта праклён, які сыходзіць на твар усёй зямлі; бо на кожнага злодзея падзе помста ад гэтага нават да смерці, і на кожнага, хто прысягаў крыва, ад гэтага падзе помста да смерці. І вынесу яго, кажа Госпад Саваоф, і ўвойдзе ў дом злодзея і ў дом таго, хто маніць, прысягаючы імем маім, і аселіцца пасярод дому яго, і знішчыць яго, і дрэва яго, і каменне яго (Зах. 5, 2-4).

Няхай срэбра тваё будзе з табой на загубу, бо дар Божы ты маніўся за грошы прыдбаць (Дзеі 8, 20).

Задарма дасталі, задарма давайце (Мц. 10, 8).

Дарункаў не прымай, бо дарункі асляпляюць вочы відушчым і пераварочваюць словы справядлівых (Вых. 23, 8).

У поце аблічча свайго будзеш есці свой хлеб (Быц. 3, 17-19).

Бо смутак па Богу неруплівае пакаянне ў збаўленне ператварае (2 Кар. 7, 10).

Калі хочаш быць беззаганны, пайдзі, прадай маёмасць тваю і раздай бедным; і будзеш мець скарб на Небе (Мц. 19, 21).

9-ая запаведзь Закону Божага:

Не сведчы ілжыва супраць бліжняга свайго

А ўтаймаваць язык ніхто з людзей не можа: гэта — нястрымнае зло, напоўненае смяротнаю атрутаю (Як. 3, 8).

Бо хто хоча жыццё любіць і бачыць добрыя дні, няхай паўстрымае язык свой ад зла, і вусны свае, каб крывадушна не гаварылі (1 Пят. 3, 10).

Крыважэрнымі і лісלівымі гідзіцца Госпад (Пс. 5, 7).

Не судзіце, каб не былі асуджаныя (Мц. 7, 1).

І што ж ты ўгледзеў сучок у воку брата твайго, а бервяна ва ўласным воку не заўважаеш (Мц. 7, 3)?

Калі хто сярод вас думае, што ён багабойны, ды не закілзае языка свайго, але ашуквае сэрца сваё, у таго багабойнасць пустая (Як. 1, 26).

Дзеля гэтага, адкінуўшы хлусню, гаварыце кожны праўду бліжняму свайму, бо мы члены адзін аднаму (Эф. 4, 25).

10-ая запаведзь Закону Божага:

Не пажадай сабе жонкі бліжняга свайго, не пажадай дому бліжняга свайго, ані поля яго, ані нявольніка яго, ані нявольніцы, ані вала яго, ані асла, аніякае жывёлы яго, анічога, што належыць бліжняму твайму.

Госпад гідзіцца думкамі няправеднымі (Прып. 15, 26).

Бо з сэрца зыходзяць благія думкі, забойствы, чужаложства, распуста, крадзяжы, крывадушныя сведчанні, ганьбаванне (Мц. 15, 19).

У спакусе няхай ніхто не кажа: Бог мяне спакушае; бо Бог не спакуснік благім, і Сам нікога не спакушае. Але кожны спакушаецца, захоплены і прываблены ўласнай пажадаю: а тая пажада, зачаўшы, спараджае грэх, а ўчынены грэх спараджае смерць (Як. 1, 13-15).

Калі ў вашых сэрцах маеце вы горкую зайздрасць і зацятасць, не хваліцеся і не брашыце на праўду: гэта не тая мудрасць, што з гары зыходзіць, але зямная, душэўная, дэманічная: бо дзе зайздрасць і сваркі, там няма ладу і ўсялякія благія рэчы (Як. 3, 14-16).

І цяпер ты пракляты (Быц. 4, 11).

ВЫСНОВЫ

Слуга ж той, які ведаў волю гаспадара свайго і не быў гатовы, і не рабіў паводле волі яго, будзе моцна біты (Лк. 12, 47).

Бо, уцёкшы ад поскудзі свету праз пазнанне Госпада і Збавіцеля нашага Ісуса Хрыста, зноў, заблытаўшыся, паддаюцца ёй, дык апошняе для іх горш за першае (2 Пят. 2, 20).

Вось, палову маёмасці маёй, Госпадзе, аддам убогім, а калі каго чым пакрыўдзіў, аддам учацвёра болей (Лк. 19, 8).

Ачысцім сябе ад усякага бруду цела і духа, здзяйсняючы святасць у страху Божым (2 Кар. 7, 1).

Калі зробіце ўсё, загаданае вам, гаварыце: мы рабы нічога не вартыя (Лк. 17, 10).

Калі гэта ведаеце, шчаслівыя вы, калі гэта рабіць будзеце (Ін. 13, 17).

Сэрца маё пераліваецца ад словаў прыемных, гавару я справы мае Цару, язык мой — стыло спрытнага пісара (Пс. 44, 2).

Залатая сярэдзіна – большага не жадаць, ад малога не адмаўляцца; у весялосці не буяць і не маркоціцца ў журбе.

Вызвалі навакольных ад тыраніі добрых спраў і старайся зрабіць тое, аб чым цябе просяць.

71.000 A87

Глухов Иван Александрович

ПРАВОСЛАВНЫЙ КАТИХИЗИС

На белорусском языке

Глухаў Іван Аляксандравіч

ПРАВАСЛАЎНЫ КАТЭХІЗІС

Просім прабачэння за хібы ў перадачы лекцыйнага матэрыялу і стылістычныя недакладнасці.

ТАВАРЫСТВА ПАМЯЦІ ІГУМЕННІ ТАІСІІ
Санкт-Пецярбург
2013